










ЯН СКРЫГАН













Ян Скрыган

ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ



ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ Ў ДВУХ ТАМАХ

ЯН СКРЫГАН

1

КРУГІ

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1985

Бел 2
С 45

С $\frac{4702120200-125}{М\ 302(05)-85}$ 128—85

© Прадмова. Каментарыі. Афармленне. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

РОДНАСЦЬ ЛЁСУ І ПЕСНІ

«Лёс кожнага — гэта свой лёс, але без лёсу народа няма і свайго лёсу»,— напісаў у сваёй аўтабіяграфіі Ян Скрыган, азіраючыся на пражытыя гады, на зробленае ў літаратуры. І яшчэ: «...Цяпер я гляджу на сваю біяграфію, як на далёкі сон. Мая біяграфія здаецца мне вельмі доўгай, і я дзіўлюся, як многа ў ёй змешчана. Я зазнаў і трагізм, і роспач, зведаў цану радасці і надзей...»

Сын селяніна са Случчыны Іван Аляксеевіч Скрыган вучыўся ў Слуцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме, з 1924 года пачаў працаваць у слуцкай акруговай газеце «Вясковы будаўнік», потым у «Чырвонай Полаччыне». Затым зноў вучоба, ужо на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта, работа ў рэдакцыі «Літаратуры і мастацтва», на заводах Ферганы і Эстоніі, зноў рэдактарская праца — ужо ў Дзяржаўным выдавецтве БССР, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», загадчыкам аддзела ў БелСЭ. Гэтак пункцірна можна памеціць жыццёвы шлях Яна Скрыгана.

Адтуль, з 1924 года, пачынаецца і другая ягоная біяграфія — біяграфія пісьменніцкая. Пачатак яе пазначаны вершамі, змешчанымі ў зборніках «Слуцкія песняры», у альманахах «Наддзвінне», «Росквіт», «Зарніцы», удзелам у кіпучым жыцці літаратурнага аб'яднання «Маладняк», у «Літаратурна-мастацкай камуне». Потым нарысы, прысвечаныя бурным падзеям у жыцці рэспублікі на канцы дваццатых — пачатку трыццатых гадоў, удзел у стварэнні кнігі пра гісторыю Магілёўскай шаўковай фабрыкі. У 1929 годзе выходзіць кніга апавяданняў і аповесцей «Затока ў бурах», за ёй «Сустрэчы», «Апавяданні», «Наталя», «Няпрошаная сляза», «Скажы адно слова», «Свая аповесць», «Кругі. Выбранае» і выбраныя творы ў двух тамах...

Нібы падсумоўваючы зробленае ў літаратуры, Ян Скрыган многія свае раней напісаныя апавяданні ўключыў як састаўныя часткі ў аповесць «Кругі». Дзякуючы гэтаму «ўпісанню» аўтабіяграфічная аповесць набывае гучанне мастацкага сведчання пра чалавечыя лёсы на гістарычнай дарозе ад дакастрычніцкага часу да сённяшніх дзён.

Мы ўжо гаварылі, што на пачатку жыццёвага шляху Ян Скрыган многа працаваў як нарысіст. Таму не дзіўна, што і першыя

празаічныя творы нясуць на сабе характэрныя адбіткі таго імклівага, бескампраміснага часу заснавання і сцвярджэння новага сацыялістычнага ладу жыцця.

Аповесць «Затока ў бурах» ахоплівае значны адрэзак у жыцці народа: гэта і імперыялістычная вайна, рэвалюцыя, потым грамадзянская вайна, станаўленне і мацаванне новага сацыялістычнага ладу. У цэнтры твора лёс дзвюх жанчын — Наталі і Алесі. Па-рознаму выходзяць яны з выпрабаванняў, якія выпадаюць на іхнім жыццёвым шляху. Наталя, якую займае толькі клопат пра сябе, прага лёгкага жыцця, канчае свой шлях тым, што звязваецца з бандытамі і губіць гэтым сябе канчаткова. Другую дарогу выбірае Алеся. Яна аддае сябе змаганню за новае жыццё, яе найперш турбуе клопат пра будучае ўсіх людзей, за агульную справу. На гэтай дарозе яна знаходзіць і сваё асабістае шчасце. І хоць Наталя ў апошняе імгненне пры разгроме банды страляе ў каханага Алесі, аповесць канчаецца аптымістычна.

Пісьменнік імкнецца паспяваць за імклівасцю часу. Адсюль і «тэлеграфнасць» стылю, месцамі квяцістасць, патэтычнасць, рамантычнасць, якая выступае на падмену псіхалагізму, філасофскай заглыбленасці вобразаў. Сюжэты нібыта ўзяты з газетных паведамленняў тагачасных рабселькораў, крыху аздобленыя мастацкімі прыёмамі. Гэта адчуваецца ў апавяданнях і замалёўках «Па дарозе», «Ядавітая кроў», «Зноў па дарозе», «Зялёныя шкарпэткі», «Начны рэйд», «На выселках», «Шчаслівая літара», «Скажы адно слова»...

Аднак адметнасць свайго голасу, свой стыль, уменне ўбачыць і трапна перадаць характар, дэталь словам, моўным ладам праступаюць ужо і ў першых апавяданнях і аповесцях Яна Скрыгана. І цяпер, праз многа гадоў, сучасным чытачом з пранізлівым болем успрымаецца апавяданне «Таіса», навеянае рамантыкай рэвалюцыйнага змагання, успамінам аб першым юнацкім каханні, самае «неаўтабіяграфічнае», як потым прызнаваўся пісьменнік, ягонае апавяданне. Побач з ім па тэматычнай накіраванасці стаіць апавяданне «У Кірылы на хутары» — пра падпольшчыкаў, якія змагаюцца супраць белапольскіх акупантаў. Апавяданне напісана ў строгай рэалістычнай манеры, нават заземлена, з дакладнымі дэталямі, няспешнасцю разгортвання сюжэта, з псіхалагічна выпісанымі вобразамі і падпольшчыкаў, і самога гаспадара хутара. Побач з ім стаіць і апавяданне «След гумовых шын». Героі яго — дырэктар гімназіі, маладая настаўніца Кася, гімназісты. Лірычна, стрымана, але з усёй глыбінёй раскрывае пісьменнік антынародную сутнасць палітыкі Пілсудскага праз вобраз Касі, такой прыгожай і мілай на першы погляд і гэтакай лютай, эгаістычнай на самой справе.

Увага да духоўнага вобліку чалавека, сцверджанне чалавечнага ў ім, непрыняцце душэўнай чэрствасці, эгаізму, вера ў тое, што чалавек нараджаецца на зямлі дзеля шчасця — вось той накірунак пісьменніцкіх памкненняў Яна Скрыгана, які прынёс яму нямала творчых удач, такіх як «Месячная ноч», «Наталя», «Пусты кошык», «Конны двор», «Паваротак каля хвоі», «Над гаем кружылі буслы»...

Гэтыя творы пазначаны знакам майстэрства, імкненнем да дэталі, моўнай інтанацыі, што агульнапрызнана і літаратурнымі гранічнай праўдзівасці мастацкага вобраза, дакладнасцю слова і крытыкамі, і чытачамі. Новае выданне твораў не толькі яшчэ раз пацвярджае вядомую ісціну. Калі акінуць позіркам сабраныя разам першыя, па-юнацку наіўныя і рамантычныя аповесці і апавяданні, і сённяшнія, рэалістычна строгія, па-мастакоўску стрыманыя і выверанья, узнікае адчуванне, што чытаеш адзін вялікі твор, які пісаўся на працягу многіх гадоў. У ім і першая закаханасць, і барацьба за новы сацыялістычны лад, і сённяшні трывожны і неспакойны чалавечы лёс з усімі радасцямі і бедамі ў гэтым неспакойным часе, нястомнае жаданне асэнсаваць лёс свайго народа і сябе як мастака... Адчуванне гэтае ўзнікае таму, што амаль у кожным творы Яна Скрыгана адметна пастаянная ўнутраная задача, засяроджанае імкненне ад апавядання да апавядання сказаць слова пра душэўную прыгажосць роднага народа, пра ягоны нялёгкі, трагічны і гераічны лёс, сказаць шчырае слова любові да бацькаўшчыны. Вышыня пастаўленай задачы абавязвае не сфальшывіць ні ў думцы, ні ў пачуцці, ні ў адзіным слове. Гэта забірае дні і дзесяцігоддзі паўсядзённай напружанай работы, пошуку, уласцівага людзям не толькі таленавітым, але і самааддадзеным.

Але кола клопатаў для кожнага сапраўднага пісьменніка не можа замыкацца на нечым адным. Таму Ян Скрыган не толькі піша аповесці і апавяданні, ён займаецца і перакладамі. Многае ў нашай літаратуры за адносна кароткі тэрмін яе развіцця стала ўжо прыналежнасцю гісторыі. Блізкае, але ўсё ж гісторыі. У нас не стае кніг пра пачынальнікаў нашай культуры і літаратуры, пра выдатных прадстаўнікоў беларускага народа, пра вядомых вучоных, падарожнікаў, палкаводцаў... У гэтым плане несумненную каштоўнасць маюць напісаныя Янам Скрыганом старонкі пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Кузьму Чорнага, Цішку Гартнага, Платона Галавача, Міхася Зарэцкага, Васіля Каваля, Лукаша Калюгу, Міколу Нікановіча, Міхася Лынькова, Івана Мележа, Змітрака Бядулю і іншых.

І яшчэ ёсць у пісьменніка адзін пастаянны клопат — родная мова. Ён умее напісаць пра яе з глыбокай зацікаўленасцю, з ве-

даннем і шанаваннем, з гаспадарскай заклапочанасцю. Моўная культура бачыцца ім як неабходная перадумова развіцця культуры наогул, як першаснова пісьменніцкага майстэрства, пра якое неабходна чуць няхай і суровае, але справядлівае слова, каб здолець вось так зірнуць на сябе самога: «Здагадаўся, чаму я не люблю аднаго моднага, даволі вядомага пісьменніка. Нечым ён падобны на мяне ў пару мае літаратурнае маладосці. Ад тых маіх твораў мне цяпер аж нядобра, лепш бы іх не было». Гэта, мабыць, неабходна, каб зноў садзіцца да стала з клопатам пра новую сваю работу.

«Вечар. Цішыня. Кнігі за шклом на паліцах. Што пачытаць? Адны даўно перачытаныя, другія — нават не пачатыя. Дзіва: і чытаць іх не хочацца. Спрабую каторы раз — не ідуць яны. Нікуды цябе не завуць.

І тады зноў бяруся за тыя самыя, па многа разоў чытаныя, перачытаныя, колькі разоў кратаныя, варочаныя — і зноў чуеш у іх нешта вечна патрэбнае тваёй душы.

Мабыць, таму, што пісаліся яны даверліва, як споведзь перад табою. Як жа мала трэба мець вялікаму пісьменніку, каб да яго ўсе гарнуліся — толькі самога сябе. І як многа — каб у ім кожны бачыў таксама самога сябе».

Кнігі Яна Скрыгана з тых, што не асядаюць мёртвым грузам на кніжных паліцах. Яны патрэбны як разумны і добры субяседнік, які дапамагае ўгледзецца ў самога сябе і які расхінае перад табой адначасна па-мастакоўску шматфарбны свет людскога жыцця ў імя сцвярджэння дабрыні і прыгажосці.

Алесь Жук

КРУГІ

АПОВЕСЦЬ З АДСТУПЛЕННЯМІ

БІЯГРАФІЯ Ў ПЕСНІ МАЕЙ І Ў МЯНЕ — АДНА.

Максім Танк

ПАМЯЦЬ ЗЯМЛІ

На маёй радзіме ёсць невялікі гарадок Слуцак. Як і кожны горад з паважнай біяграфіяй, ён меў тое месца, якое было асяродкам эканамічнага і гандлёвага жыцця акругі — рыначную плошчу па самай сярэдзіне. Гэта была даволі вялікая, выцягнутая наабапал Маскоўска-Варшаўскай шашы, выбрукаваная плошча і звалася ў нас местам. На адной палавіне яе размяшчаліся будкі гандляроў гузікамі, пернікамі, карункамі ды істужкамі, на другой — стаялі фурманкі з сёл, і тут панаваў тлум, пах конскага поту, ішоў гандаль гуркамі, цыбуляю, садавіною, збожжам, бандарскім і сталярскім вырабам і на вазах часамі распівалася кварта гарэлкі. Асабліва тлумна і маляўніча было ў кірмашовыя дні, калі цвілі рознымі колерамі дзявочыя даматканыя строі і на цвінтары каля сабора хлопцы як мага больш набок збівалі свае шапкі, каб выпусціць чуб. На дарожцы да сабора сядзелі старцы — сляпыя, бязрукія, бязногія, з лямцаватымі барадамі, з тонкімі шыямі, што выцягваліся з перахопленых жычкаю каўняроў зрэбных кашуль, з паднятымі ў неба невідушчымі тварамі. Часамі разам з імі сядзелі і хлапчукі-павадыры і тонкімі дзіцячымі галасамі цягнулі песні, такія балючыя і беспрасветныя, што ад іх разрывалася сэрца.

У 1923 годзе на гэтай плошчы, на той палавіне, дзе стаялі фурманкі, каля самай дарогі работнікам сувязі спатрэбілася выкапаць яму пад тэлеграфны слуп. Два чалавекі ламамі ўзадралі брук, пачалі ўзбіваць цвёрдую, стагоддзямі ўпляскануюю, конскай жыжкай набрынялую рудую зямлю. Менш як на метровай глыбіні грабары наткнуліся на дамавіну. Каб не пачапаць яе, грабары згрэблі з века зямлю, адступілі трошачкі ўбок і пайз яе пачалі прабівацца далей уніз. І якое ж было дзіва, калі пад гэтай труной паказаліся яшчэ дзве: яны ляжалі наўскасяк пад першай, вытыркаючы набраклымі зямлянай вільгаццю дошкамі.

І тады здалося цяжкім грахом трывожыць прах продкаў — грабары засыпалі дол і пачалі ўзрываць брук на новым месцы.

Там жа ў Слуцку, на Падвальнай вуліцы, гаспадыня, у якой я стаяў на кватэры, увесну ў кутку свайго саду за-

хацела выкапаць яму, каб схаваць нечыстоты, як гэта было заведзена ў гарадскіх гаспадароў. Рыдлёўка наткнулася на нешта непадаткае і зашархацела: пад першым чорным, урадлівым пластом слуцкай зямлі ляжала вуголле — знак далёкіх, датла вынішчаных пажарам сядзіб. Пасля пачалі пападацца струхлелыя косці, і нарэшце ў кутку гэтага саду быў выкапаны зямлёю забіты ў сваіх пустотах чалавечы чэрап.

Вось гісторыя твая, Беларусь. Па землях тваіх праходзілі з агнём і мячом тэўтонскія псы-рыцары, мангола-татарскія орды, шведы Карла XII, палкі Напалеона; разбуралі і нішчылі цябе свае ж князькі і магнаты, аддаючы твае гарады і сёлы ў пасаг ці прагульваючы ў карты, а пасля адваёўваючы і дзелячы іх зноў між сабою. Не пыталі ў цябе, у народа твайго, з кім хоча ён быць, а палілі, спусташалі, знішчалі аж да таго, што ад гарадоў і сёл тваіх не аставалася і знаку. Гэта ж напэўна, што толькі пасля карэннага вынішчэння, калі ад паселішчаў асталіся адны папялішчы, можна было на месцы колішніх могілак рабіць базарную плошчу, не баючыся граху перад богам, а на касцях людзей засаджваць сады. А колькі па землях тваіх прайшло вялікіх і малых войнаў нават на людской памяці ўжо, калі крамсалі і рвалі цела тваё на кавалкі. І кожны прышэлец стараўся скарыць цябе. Колькі ж сыноў тваіх загублена з пахаваннем і без пахавання, невядома кім і калі, колькі сцерлася іх слядоў, колькі іх касцей прыняла і ўкрыла ад гора людскога ты ў зямлі сваёй...

І я люблю цябе, маці мая. І схіляю галаву перад усімі тваімі папялішчамі. Перад усімі курганамі. Перад магіламі. І тымі, старадаўнімі, і ўчарашнімі, што асталіся як памяць найлюцейшага змагання з самай страшнай пачварай — чорнай свастыкай. Гэтыя ахвяры — святыя. Лепшыя людзі твае прынялі смерць, каб жыць нам далей.

Бацькаўшчына!

ПАРОГ

ПАРОГ

1

Не шанцавала майму бацьку на сыноў. Выжывалі адны дочкі. А што гэта за гаспадар без наследніка. Добрыя людзі параілі: калі народзіцца зноў сын, трэба ранічкаю выйсці на дарогу і, хто першы пападзецца, узяць яго за хрышчонага бацьку. Гэта паможа.

І вось як толькі я нарадзіўся, бацька досвіткам выйшаў за сяло. На якую ж дарогу павярнуць? На Сцяпкоў, на Падлужжа, на Сунаі? Лепш на Сунаі: яны ляжаць за нізовінай, далёка відно наваколле. А восень ціхая, усё кругом пуста, аж свіціцца.

Нарэшце на той бок нізовіны нехта паказаўся. Едзе. Няйначай як шпарка — пыл хоць волкі, а каціўся клубамі. Усё бліжэй і бліжэй, перасігнуў цераз масток; стала відно, што коціць на гнядым жарабцы. А як параўняўся, бацька ўтрупянеў: пукаўскі пан Ёдка. Аднак жа, доўга не думаючы, зняў шапку і бразнуўся перад ім у паклоне. Жарабец стаў.

— Што такое, чалавеча?

— Паночку, родненькі, памажэце!

— А што ў цябе за бяда?

— Сын нарадзіўся.

— Ха-ха, пацешны ты чалавек!

Бацька расказаў просьбу: будзьце хросным, то можа бог і змілуецца.

Казалі, што наш пан быў ліберал, не надта каб людзі яго клялі.

— Адкуль жа ты?

— З Тру́ханавіч.

— А як зваць цябе?

— Аляксей.

— Ну, то давай, Аляксей, чалавек божы. А дзе ж твой сын?

— Дома.

Так і выйшла, што маім хрышчоным бацькам стаў абшарнік. І колькі ад гэтага было мне пакуты: за ўвесь час,

пакуль я вучыўся ў Труханавічах, мяне так і звалі Ёдчыкам. Горшай мянушкі, мне здавалася, нельга было і прыдумаць. Доўга я не ведаў, чаму мяне так дражняць.

І брала горкая крыўда: другія ведаюць сваіх хросных, часамі хоць на вялікія святы маюць ад іх гасцінцы, а я свайго ніколі нават не бачыў. Ды гэта ўжо бог з ім, куды горш, што мянушка як бы папікала мяне ў нечым нядобрым, як бы насцярожвала проці мяне маіх аднагодкаў.

2

Першае, што я памятаю, нават не вельмі падобна на праўду. У святочнай хаце, цеснай ад людзей, твары і абрысы якіх зліты ў адну невыразную масу, жаночыя рукі трымаюць кволае дзіця. У белай кашульцы, бледнае і ціхае, яно сядзіць пакорліва, як бы сілячыся зразумець, што тут робіцца. А робіцца нешта незвычайнае, стаіць насцярожана-ўрачыстая хвіліна, і людзі, што тут сабраліся, у маўклівай немаце як бы чакаюць вялікага цуду.

Пазней, праз многія гады сталасці і вандраванняў, я расказаў пра гэты эпізод Ульяне, нямала яе здзівіўшы. Расказаў яго як выпадак, у якім не магу разабрацца: быў ён ці не быў. Можа я яго прыдумаў, можа чуў ад каго ці бачыў у сне і неўпрыкмет пачаў лічыць за яву. Але Ульяна сказала, што гэта самая чысцюткая праўда, толькі я не павінен быў бы яе памятаць, бо век мой тады быў не вельмі вялікі. Аказваецца, у той час, калі на шчасце мне шукалі хрышчонага бацькі, у мяне быў жывы яшчэ старэйшы брацік, такі нездараўчаны, што на добры лёс не даваў ніякай надзеі. І недзе перад апошняй яго хвілінаю было спраўлена набажэнства — з бацюшкам, з царкоўнымі песнямі, з кадзільным дымна-салодкім пахам: можа як самы звычайны людскі абавязак, а можа ўсё-такі з тайным спадзяваннем на цуд.

3

Потым, праз даволі вялікі час, калі памяць нічым не адзначыла майго існавання, ужо ярка я памятаю наш двор, адгароджаны парканам ад бацюшкавага агарода, вымашчаныя абгладжаным каменем прыступкі перад парогам, у сенцах камору з вузкімі дзверцамі, за якімі заўсёды стаяў гаркаваты пах мучнога пылу і мышыная кісліня. Памятаю вуліцу з выезджанай вузкай, як жолаб, сярэдзі-

най, у якую пасля дажджоў сцякала вада, на той бок калодзезь з прыкованым да пругла вядром і вечна мокрым пляскатым каменем, паложаным пад нагамі. Цераз двор ад калодзезя на высокім падмурку стаяў вясёлы дамок дзядзькі Сяргея з жоўтымі аканіцамі, а за ім, прытыкаючы к плоту, атуленая цёмнымі кустамі бэзу,— школа. Далей, наводшыбе, царква з шырокім цвінтаром, абнесеная мураванаю агароджаю, з высокаю белаю званіцаю. За царквою канчалася маё ўяўленне пра той канец сяла. Яно цягнулася бог ведае як далёка, і ўсё, што там рабілася і жыло, было мне невядома. Памятаю, мне вельмі хацелася там пабываць, паглядзець, ці такія самыя і там двары, ці такія людзі. І аднаго разу спраўдзілася маё жаданне. Хавалі яшчэ не надта старога чалавека, недалёкага нашага суседа, ці то ў насмешку, ці з пашаны празванага Каралём. Па вуліцы ішоў невялікі гурт людзей, неслі пратэсы і запаленыя тоненькія свечкі, нехта зацягваў жалобныя песні, нехта нясмела спрабаваў галасіць. Паперадзе ішоў бацюшка ў блішчастай рызе, полымя свечак хісталася, з пратэсаў учэпіста глядзелі аблічча святых. Я таксама ўціснуўся ў гурт, перш ззаду, а тады прашыўся бліжэй да труны і пайшоў да самага канца, забыўшыся, што гэта далёка і што варочацца дадому будзе страшна. Гэтага дня я адкрыў, што ў тым канцы сяла, на косым пагорку з чубком рэдкага беразняку, сціснутага невысокім плотам, адзінока і вусцішна стаяць могілкі. Бачыў, як апускалі ў магілу труну, чуў, як стукаюцца аб яе века свежыя гліняныя камякі зямлі...

4

Гэты канец нашага сяла быў мне куды мілей. На той бок вуліцы, за плотам, лявей ад калодзезя, стаяў стары клён; шырокімі шатамі свайго лісця ён прыкрываў тугі, куп'істы мох на страсе падслепаватай хаты Рыжковых, жылаватае ж карэнне выходзіла на вуліцу, па ім штодня хадзілі жалезныя шыны калёс — і ўсё роўна яно сплятала ся ў яшчэ больш тугія вузлы. За мастком, у нізіне, патроху запускаўся шырокі двор дзяковай сядзібы, бо пасля смерці гаспадара тут не было каму пільнаваць парадку. Сын, начытаны ў чужых кнігах, свайго лёсу не знайшоў, вандраваў бог ведае дзе па свеце і на сяле памятаўся тым, што ў часе пажару, выскачыўшы ў споднiках, прасіў кожнага, хто збягаўся сюды, каб ён выратаваў яму з агню

гальштук. Далей, на горцы, памятаю манапольку; на яе паліцах уздоўж сцен цеснымі радамі стаялі пляшкі лядзяна-празрыстай вадкасці з белымі ці чырвонымі шапачкамі сургучу на халодных рыльцах. Няйначай як сядзелец прыехаў не так даўно: дом на высокім падмурку, тварам на вуліцу, не меў яшчэ ганка, аднак званок, прымайстраваны ўсярэдзіне над дзвярыма, кожны раз весела апавяшчаў гаспадара, што нехта прынёс яму можа апошні свой грош.

За сялом, аддзеленая жоўтымі палосамі намытага з гарыстых палеткаў пяску, стаяла цёмная кузня з яе чарадзейным звонам, з іскрамі ў горане, з раздумна-бяспечнымі, трохі выхвальнымі размовамі тых, хто тут збіраўся, пакуль каваўся конь, наварваўся сашнік ці перацягвалася кола. Закураны, у дымна-каляным фартуку, каваль пастукваў тоненькім малатком па кавадле, паказваючы, дзе ў зырка-агністы метал павінен ударыць памагаты. Трохі направа ад кузні, на косым узгорку, стаяў макгазын з чорна-смаловага абветранага бярвення, з шырокім рыпучым прыклетнікам, з дзвярыма, акованымі жалезнымі палосамі,— у ім хавалася гуртавое збожжа, каб на выпадак навалы, пажару ці якога другога няшчасця, можна было запамагчыся. Вартаваць макгазын хадзіла ўсё сяло, заступаў чаргу той, каму ў хату прыносілі булаву.

З гэтага канца сяла, ад крыжа, на якім вісеў распяты алавяны Хрыстос, разыходзіліся дарогі ў свет. Усю найпершую мудрасць жыцця, няхай сабе пазнейшым усведамленнем спасцігаў я адсюль, з гэтага канца сяла...

5

У школу я пайшоў на сёмым годзе жыцця. Хоць яна была недалёка, але мне, як і другім, канцавым, пашылі палатняную торбу. Было весела складваць туды кнігі, дошку з грыфелямі, новы, выдзеўбаны з дзерава яшчык (гэтак у нас зваўся пенал), і, павесіўшы яе цераз плячо, ісці на ўрокі.

Потым трывожная тайна літараў. Потым першая радасць, калі з літараў склалася слова. Памятаю гэтую хвіліну. Дома я стаў на лаве, каб адарваць лісток у календары, што вісеў на сцяне каля стала. Перад тым як адарваць, пачаў складаць на ім літары. І на вялікае дзіва прачытаў: «Сре-да».

— А як будзе разам? — папыталася Ульяна. Яна цікавала за гэтаю хвілінаю.

— Среда,— адказаў я.

— А што гэта значыць?

— Серада.

Гэта было адкрыццё. Толькі дзівіла, чаму слова няправільна напісана: не «серада», а «среда». Але Ульяна растлумачыла, што напісана яно правільна, але мы няправільна гаворым. Мы мужыкі, і ў нас мова мужыцкая, а я на тое і вучуся, каб выйсці ў людзі. Сказала, што вучыцца мне трэба многа і старанна, бо іначай так мужыком і астануся.

Не скажу, каб тлумачэнне надта памагло мне вучыцца, але гаворка такая ўпершыню натыкнула на думку, што людзі не роўныя. Прыгледзеўшыся, і папраўдзе я сам убачыў, што калі на сяле хто больш-менш выбіваўся ў людзі, то гаварыць стараўся іначай — па-гарадскому. Ён іначай і выглядаў — акуратна, чыста, і людзі з ім іначай віталіся — яшчэ здалёк і вельмі пашаноўна.

Уласна, з гэтае першае прачытанае «среды» я пачынаю памятаць і сябе і сваё наваколле.

Памятаю высокі школьны ганак, глухі цёмны калідорчык, направа дзверы ў клас. Нешта прыемна-трывожнае і ўрачыстае было ў тым, калі мы садзіліся за чорныя лакаваныя парты з адкіднымі векамі, расстаўленыя пад наш рост: меншыя, на першы і другі клас — спераду, большыя, на трэці і чацвёрты — ззаду. Памятаю нашу настаўніцу Лідзію Сулкоўскую, стройную маладую жанчыну з пакорлівымі, як бы вінаватымі вачыма. Ад яе заўсёды ішла нейкая строгая добрасць, святочная чысціня і далёкая тайнасць. Тайнасцю была яе манера адзявацца проста і дасціпна, здавалася, у самы звычайны крамны гарнітур, з-пад жакеткі якога, аднак, вельмі спакусліва выбіваліся бялюткія брыжыкі блузкі; гаварыць прыгожаю, не селавою, а гарадскою моваю; быць бацюшкаваю дачкою, жыць невядомым нам жыццём у вялікім доме з высокімі чыстымі вокнамі, з кустамі густога бэзу перад ганкам, з тугім змрокам саду ў глыбіні і быць нашай настаўніцай. Мы любілі і пабойваліся яе. Любілі за тое, што ў вачах яе была як бы вечная трывога за нас, за цярплівасць, з якой яна кожнаму з нас аднолькава спакойна ўдзёўбвала ісціны навучання, а пабойваліся, што часамі добрасць саступала месца строгасці, калі трэба было станавіцца ў кут на калені. Пад такую кару падпадалі най-

больш байбусы з чацвёртага класа, якія да таго ж у кожным класе заседжваліся па некалькі гадоў, але і на нас гэта наганяла страху.

6

Бацюшка нас навучаў закону божаму, царкоўна-славянскай мове і граматыцы. Нам трэба было лёгка разбірацца ў цітлах, ведаючы, якія літары пад імі схаваны. Мы вучыліся парадку царкоўнага набажэнства, чыталі псалтыр, часаслоў, актоіх, вучылі малітвы і псалмы. Як не дзіва, але найцяжэй нам давалася чытанне.

Бацюшка прыходзіў у сваёй доўгай чорнай расе, вузкай у паясніцы, шырокай у падоле, з маленькаю рудою барадкаю, з доўгімі рэдкімі, па каўняры раскіданымі валасамі, з ліхаманкавым агнём у вачах, і палахліва агляdaў клас. Высокі, худы, ён здаваўся яшчэ худзейшы, бо нёс перад сабою выслізганы да жоўтага бляску тонкі кій з рагулькаю наверсе, у якой заўсёды ляжаў вялікі палец яго рукі. Мы прывыклі адказваць урокі бегма, спяшаючыся, глынаючы апошнія гукі, бацюшка ж патрабаваў кананічнага вымаўлення. Мы чыталі: «Блажені плачушчі, яко ті утешатся. Блажені алчушчі і жаждушчі правды, яко ті насытятся».

— Ка-ак? Повтори! — перабіваў бацюшка.

Мы паўтаралі, але вымаўлялі гэтак жа, як і першы раз.

— Остолоп, зачем же ты «і» в каше съел? Говори за мной: «Блажені плачушчі-і, яко тіі утешатся. Блажені алчушчі-і і жаждушчі-і правды, яко тіі насытятся». Блажені нішчі-і духом...».

Мы гаварылі за бацюшкам як бы і правільна, але як толькі паўтаралі самі, уся правільнасць знікала: у нас аніяк не выходзіла двух «і» на канцы.

Бацюшка крывіўся, як ад болю, уставаў з крэсла, вочы шалёна акругляліся, ён хапаў сябе за валасы, ірваў іх, падымаў кій, аддаваў яго таму, хто гаварыў урок, і крычаў:

— На, бей меня, терзай меня, жги на костре, только не издевайся над божьей молитвой. Безбожники, богохульники, вам бы только распинать Христа на кресте...

Ён крычаў высокім, тонкім голасам, у вачах блішчалі слёзы, нам рабілася страшна...

7

Памятаю, як Ульяна выходзіла замуж за Данілу. Ён таксама быў з Каралёў. Мабыць, усім Каралям давалася гэтая мянушка не за дастатак, а за спакойны розум. Даніла быў з бедных. Ён ездзіў у Амерыку на заработкі, прабыў там сем гадоў. Прыехаў адзеты, з чамаданамі, аздобленымі бліщчастымі спражкамі, абцягненымі рыпучымі рамянямі, загадаваў рыжыя вусы, навучыўся збольшага тамашняй мове, і з таго часу пачалі зваць яго амерыканцам. Невысокі, негаваркі, ён нават сваім амерыканствам не надта быў відзён, выхваляцца не ўмеў, але Ульяна падмеціла ў ім добрую, чулую душу. Сама ж Ульяна была рослая, статная, у меру ў ёй было і хараства, і талкавітасці, і жаночага такту. Славы прыбаўляла яшчэ і тое, што на клірасе ў царкве яе голас даваў красу ўсяму хору.

Памятаю, як пачалася імперыялістычная вайна і ўсё сяло стагнала ад плачу, калі забіралі навабранцаў. Ульяна асталася адна з дваімі малымі на руках, бо Данілу таксама забралі ў салдаты. Памятаю пісьмы, над якімі яна плакала, бо пісьмы прыходзілі з фронту, дзе была смерць. Аднаго разу ў пісьме Даніла прыслаў фотакартку. Ульяна абрадавалася, што бачыць яго, але тут жа загаласіла ў слязах. У вайсковай гімнасцёрцы, падпяразаны шырокім рамянём, Даніла стаяў на ўвесь свой невысокі рост, нават відны былі бліпічастыя боты: не жарты — унтэр-афіцэр Усць-Дзвінскай берагавой артылерыі. Праваю рукою ён апіраўся на вузкую, збітую з пруцікаў падстаўку, а левую залажыў за спіну. Гэтая рука і стала прычынаю трывогі і слёз: няйначай як яна адарвана, бо навошта ён хаваў бы яе ззаду...

Памятаю ўдоў і салдатак, якім Ульяна пісала пісьмы на фронт.

І неўзабаве на сяле пачалі паяўляцца першыя калекі: то на мыліцах, то з пустым рукавом, то з хрыпучымі грудзямі. І пачалі хадзіць трывожныя чуткі: з фронту людзі ўцякаюць, немец прэ на ўсю сілу, зараз будзе тут. Адале пайшлі бежанцы, на худых пазамульваных конях, з рыззём на вазах, з дзецьмі на руках, адыходзячы ўсё далей на ўсход, просячы хлеба і пакідаючы пасля сябе пры дарогах невялічкія курганкі з бярозавымі неакоранымі крыжамі на іх. А фронт набліжаўся, вечарамі чутно было, як глуха стагнала зямля...

Вельмі доўга гэтыя ўражанні пяклі маю памяць. Намнога пазней, калі я збіраўся стаць пісьменнікам, я злажыў з іх апавяданне, назваўшы яго «Шорсткая дарога». Не памятаю, хто з пісьменнікаў рабіў тады на мяне найбольшы ўплыў, але напісалася яно не сваім голасам. І праз тое я ніколі не ўключаў яго ў пазнейшыя кнігі, як вучнёўскае практыкаванне. Але аднаго разу пры нейкай выпадковай нагодзе Іван Грамовіч успомніў гэтае маё апавяданне, сказаўшы, што колісь яно зрабіла на яго вялікае ўражанне, што ён нават плакаў. І я падумаў, што не будзе ніякага граху, калі я ўключу яго ў гэтую кнігу, трошачкі прайшоўшыся алоўкам па наўмыснай манернасці тагачаснай стылістыкі.

ШОРСТКАЯ ДАРОГА

Час вайны. Час наступлення немцаў. Час адступлення рускіх.

Бежанцы.

І от — цягнуцца дарогі беларускія, вузкія і шырокія, роўныя і выкручастыя, гарачыя і пыльныя, брукаваныя і прасёлкавыя. А па іх — з вялікімі даліжанамі, з рыззём, з астатнім скарбам, упакованым і прывязаным; з дзецьмі, змарнелымі і балеснымі; з старымі дзядамі і бабулямі, з жанкамі, выпетралымі і знябытымі,— нескангчоным цугам цягнецца абоз.

Грукаюць прывязаныя да білаў вядзёрцы. Грукаюць падкованыя конскія капыты. Шлёпаюць атопкі і босыя, патрэсканыя, з запечанай крывёю, ногі.

Ідуць.

Паганяюць.

Хістаюцца.

А дарога далёкая, шорсткая і ўпартая, як шорсткае і ўпартае жыццё чалавека.

*

Ён выехаў з Віленскае губерні. Не хацеў ехаць, але казакі выгналі гарапнікамі. Тады злажыў свае пажыткі — можа патрэбныя, а можа і непатрэбныя,— запрог коніка і пакінуў родны куток, вёску і могілкі, дзе маці яго,

двое дзетак пахаваны, дзе ўся радня. Разрывалася сэрца, калі за гарою і вечарам зірнула апошнім доўгім поглядам яго радзіма.

Тады суняўся. Азірнуўся. Уцёр рукавом слязою налітыя вочы і доўга глядзеў на тую сіняватую палоску пакінутых гумнаў і хат, пакуль сінь не змяшалася з вечарам, пакуль не змяшалася неба з зямлёю.

— Бывай, родная... Бывайце, палеткі, можа больш не давядзецца бачыць вас, каб радавацца і плакаць з вамі. Бывайце, доўгія вузкія палоскі, можа больш не давядзецца хадзіць па вас...

Гэтак ціха шапталі яго засмяглыя вусны. Гэтак ціха ныла яго сціснутае горам сэрца.

А побач стаяў запрэжаны конік.

А побач тулілася да даліжана сям'я.

— Не плачце, дзеткі, можа дасць бог нічога і не здарыцца. Можа вернемся. І ты, жонка, не гаруй. Нічога не зробіш. Каб асталіся — горш было б. А так — хоць жывы мо будзем.

Ачужэлымі рукамі ўзяўся за лейцы.

— Но, Гняды!

Нічога не бачыў больш.

І не чуў.

Кругом стаяла ноч, а ўперадзе ляжала далёкая, упартая і шорсткая дарога.

*

Многа грукалі калёсы. Многа міналася дарог і ўзгоркаў. Ехалі. Многа ехалі. Сустракалі гаркату і пыл, спёку і ўтому, гора і адчай, голад і роспач у адчуванні свае бездапаможнасці і непатрэбнасці. А каму яны патрэбны? Хіба мала іх такіх — бяздомных, галодных, згібелых? Хто будзе карміць іх? За што?

Пасля яшчэ большае гора прыйшло: бяскрайняе, непапраўнае. Каля шашы, на высмаленай сонцам мураве ён пахаваў жонку і сына. Ціха сканалі яны, без дакору, без слёз. Плакаць не было чым. І гаварыць не было чаго. Навошта?

Тады паставіў на магілках два бярозавыя — белыя, з карою — крыжы, памаліўся, пацалаваў курганкі, і — далёкая, упартая і шорсткая дарога ляжала грознаю непераможнасцю перад яго жыццём.

Астаўся з апошнім сынам, шасцігодкам.

*

І от грукаюць колы па шашы. Марудна накручваюць яе на шыны. Панура ступае з нагі на нагу Гнедка. Ідзе. Многа ўжо ўвайшоў ён. Многа пакінуў сілы і сёл ззаду. І не бачыць канца адшліфованым каменням шэра-белай шашы.

Навокал пякельная цішыня. Падае расплаўленае сонца ў густую гарачыню. Сочыцца пот. Есца пыл. Высыхаюць патрэсканыя губы, і смагне нутро. Вочы гараць вар'яцкім бляскам роспачы і адчаю.

Побач сядзіць шасцігодак. Тонкімі ручкамі ўшчаперыўся ў біла. Ножкі яго ўкручаны ў лахманы, галава знясілена падае на плячо.

— Татка, о татка, есці хачу.

Нашто ён гаворыць гэтыя словы? Хіба ён ведае, што ў іх змешчана ўсё жыццё яго, маленькае, дашчэнту спакутаванае? Хіба ён ведае, што гэтыя словы як на крыжы распінаюць дзень?

А маленькія вочкі глядзяць у самае дно душы, каб нічога не знайсці там, каб яшчэ больш глядзець і прасіць.

— Няма, сынку, даедзем — папросім.

— Куды даедзем, татка?

— Да людзей. Папросім — дадуць можа.

— А мамка наша таксама едзе?

Што адказаць яму? Навошта глядзяць з такою вераю гэтыя вочкі? Хіба могуць яны ведаць пра законы чалавечага права на жыццё?

— Но-о-о-о!

*

Калі прыглушыла ноч гаркату і смагу, калі пахавала ў сабе пыл і спякоту — над галовамі рассыпаліся халодныя зоры. Можа была мяккая ноч, можа маўчала яна, але звінела напятымі струнамі чалавечай знямогі.

Тады звярнулі ў прылесак. Адпрэглі коніка. Прыпялі яго, каб знаць, што ён не можа ўцячы. Невялікі агеньчык калаціў тугую цемень.

Падсмажылі маленькі драбочак абмененай на апошняе дабро скваркі.

— Ежма, сынку, заўтра можа яшчэ дзе дастанем. Коніка прадамо. Ён не можа ісці ўжо. Можа хто купіць...

— А куды мы гэтак доўга едзем, татка?

— Куды? Хто яго ведае, сынку. Вайна, бачыш. Выгналі нас. Едуць усе.

— А дадому мы паедзем?

Ён не адказаў. Ён не ведаў, што адказаць. Лавіў доўгі сіні піск галавешкі, гледзячы ў вогнішча. Глыбока ўздыхнуў. Ноч пахавала гэтае ўздыханне ў сваёй гушчыні.

Тады доўга сядзелі так і, калі патухалі галавешкі,— заснулі гэтак жа ціха, як у шалёнай стромасці ціха падае зорка.

*

Зноў звонкае неба і бясконцая далячынь.

— Но-о-о-о!

Але панура перастаўляюцца са збітымі падковамі канячыя ногі. Паволі перакідаецца з аглоблі на аглоблю сухі Гнедкаў крыж. Цяжка даецца кожная цаля абглоданае коламі шашы. Кружацца, звіняць, джаляць авадні.

— Но-о-о-о!

А далячынь звініць немым сінім бляскам. А сонца сочыцца смагаю, каб яшчэ больш звінела далячынь, каб рэзаліся потам вочы і згасала апошняя сіла.

— Но-о-о-о!

*

Яго не хацелі браць. Каму ён патрэбен? У гэтакі час? Нашто? Сваё, нажытае можа пакідаць давядзецца. Таксама можа прыйдзецца пускацца ў дарогу. Хіба ўсё возьмеш з сабою? Нашто каму Гнедка?

Яго не хацелі браць. Ён не мог ужо ісці. Далёкаю шорсткаю дарогаю ён добрасумленна служыў чалавеку, каб не знаць, што дарогам няма канца.

Нехта зжаліўся, узяў-такі. Залатоўка — не грошы. А конь няхай пастаіць, можа і паправіцца.

А яны — у далёкую звінючую сінь пайшлі пехатою.

*

Дзве постаці. Адна — высокая, худая, як шкілет, з начэпленымі на плечы лахманамі. Другая — маленькая, кволенькая, з тонкімі ручкамі і патрэсканымі нагамі,— баесны камячок жыцця.

Многа пройдзена дзён. Многа адмерана дарогі, але бясконца паўстае яна перад вачыма — шорсткая, упартая,

каменная. Шырока раскідаецца далячынь. Яна ўпіраецца ў сінь, каб не відно было, дзе край яе, дзе канец. Зямля гарачая і цвёрдая.

Мяшаюцца крокі і дні, гарката і смага, сонца і пыл. Верставыя слупы мінаюцца нехаця, і кожны з іх як новая, страшная наканаванасць. Мінаюцца бежанскія магілкі з бярозавымі неакоранымі крыжамі на іх.

*

Неба навісае блішчастым трымценнем. Гарачым, шэра-белым каменем шаша забягае ў смугу. Наабапал выпаленая сонцам, іржавая, сухая трава. Хоць бы дыхнуў маленькі ветрык. Хоць бы дзе ручаёк.

А дзве постаці ідуць, адна адну трымаюць за рукі.

— Татка, о татка, ногі баляць. Ці зараз мы дойдзем?

І гэты кволы галасок бязлітасным, няўмольным ударам адсякае нітку дарогі. Як бы лопнула спружына заведзенага механізма. Тады паднялася рука, каб абцерці пот з учарнелага твару. Але яна бяссільна апала, прайшоўшы толькі па адной шчацэ. Сухімі вачыма ён зірнуў удалячынь па верставых слупах, а тады ўзяў гэты маленькі камячок жыцця на рукі і ступіў зноў наперад.

Плечы яго горбяцца. На шыі напінаюцца дзве жылы. Праз дзіркі злінялай, спарахнелай шапкі вытыркаюць паблытаныя валасы, спераду яны кладуцца на ліпкі лоб. У прыжмураных вачах адчай, а наперадзе каменная бель шашы з яе верставымі слупамі, за якія ён сіліцца зрабіць усё новы і новы крок. Сын. Дзеля яго ён павінен зазнаць да канца ўсю бязлітаснасць свайго лёсу.

*

Падгінаюцца ногі. Глуха сапуць грудзі. Яшчэ адзін крок — адзін дзень... А маленькія сынавы ручкі бяссільна выпускаюць край бацькавай світкі. Збялелыя, сухія губкі чуць шэпчуць:

— Татка, піць хочацца, піць... Дзе мама наша?

А ён ідзе. Ён прагне ступіць яшчэ адзін крок, пераступіць яшчэ адзін верставы слуп.

Пасля сынаў голас змаўкае, а ручка ападае ўніз і трэплецца, якададраны рукаў.

Цельца зрабілася цяжкае, чужое.

Ён спыняецца і глядзіць на сына. Вочкі закрыты нямшчыльна стуленымі павекамі, на твар беллю шашы лягла смерць.

Тады галава яго паднялася ў налітае сонцам неба і з грудзей глухім адчаем вырвалася:

— Г-госпадзі!

Ногі яго падагнуліся, ён ціха апусціў на зямлю сваю ношку, каб не знаць, што, палажыўшы яе, яшчэ цяжэйшаю зробіцца ношка жыцця.

*

Яшчэ адзін крыж стаў на свежай маўклівай магілцы. І ён падняўся ад яе, азірнуў наваколле. Вочы туманіліся сухімі слязамі.

*

Неба наліваецца расплаўленым сонцам і трымціць спёкаю. Шаша ўядаецца ў далёкую сінь смугі. Наабапал высмаленая душным паветрам іржавая, сухая трава. Ён ідзе і ідзе.

— Г-госпадзі!

Няма куды больш ісці яму, але заведзеная спружына бытнасці хоча адкруціцца да канца, каб змераць сілу чалавечай роспачы і адчаю. У вушах глухі звон. Навокал гарката і смага, а перад ім — далёкая, шорсткая і ўпартая дарога, як шорсткае і ўпартае чалавечае жыццё...

ПРЫ ВОГНІШЧЫ

Я еду па вузкай дарозе сярод жытоў. Глыбока ўрэзваюцца каляіны ў аксамітную мяжу-дарогу. Часам наабапал пападаюцца ямы, і, пераязджаючы іх, я гойдаюся на сваіх драбінах, як у калысцы.

Конь бяжыць. Пырхае і патрэсвае грываю. Пуга ляжыць у драбінах, і калі мне хочацца паддаць каню больш духу, дык я крышку сцебану ляйчынаю ды гукну:

— Но-о!

Тады зноў пырхне, страсяне грываю, грукне капытамі мой буланы, і я адчуваю прыемную дрыготу.

Нагнаў фурманку. Падняў галаву, каб паглядзець, што за чалавек такі. Конь штурхануў яго мордаю ў спіну.

— Но, пайшоў, ваўкі на цябе!

Па голасе я пазнаў, што гэта ўжо стары чалавек. Неўза-

баве ён азірнуўся, і я разгледзеў шырокую белую бараду і — у руцэ — пугу.

— Далёка едзеце, дзед? — гукнуў я.

— Як кажаце?

— Далёка едзеце, пытаю?

— Далёка, дзеткі. Но-о! — і тузануў каня.

Калёсы затрабашчалі. Я чакаў новай зручнай хвіліны.

— Адкуль самі будзеце, дзядуля? — папытаўся я, калі нагнаў зноў.

— Здалёк. Старыцу ведаеце?

— Чуў.

— От я адтуль і буду.

— Ага,— сказаў я больш для таго, каб пагадзіцца, што гэта сапраўды далёка.— Дзе ж начаваць будзеце? Можа заедзеце куды?

— Як кажаце?

Я паўтарыў.

— А от выедзем з жыта, прыпынімся ў ляску і пераначуем. Ноч жа, богу дзякаваць, мае быць добрая.

І папраўдзе, усё дакляравала добрую ноч: неба чыстае, звонкае, а ў вечар асядае ўжо дзяняшняя гарачыня і смага.

З дарогі завярнулі на поплаў. Дарога схавалася ў сутонні змроку, а калёсы, як па абрусу, ціха пайшлі па мураве. Неўзабаве мы пад'язджалі пад ніштаваты гай. Дыхнула вільгаццю і пахам сапрэлага лісця.

Абраўшы месца, мы паадпрагалі коні, папуталі іх і, абганяючыся ад камароў, пачалі раскладаць агонь...

1

— Э, дзеткі, ды што і казаць: бывала, як я быў хлопцам, дык нічога не баяўся. Ніякіх ні страхаў, ні забабонаў не ведаў...

Агонь патрэскваў. Іскры падымаліся над полымем і ціха знікалі, дрыготка расплываючыся ў цемры. У бляску вырысоўваўся маршчыністы дзедаў твар. Шырокая белая барада лажылася на грудзі. Старэнькая каўтунаватая шапка была нахлабучана нізка, і з-пад яе абвісалі цяжкія і таксама белыя бровы. Вочы свяціліся кволым, як бы нейкім вадзяным бляскам.

— А якія ж страхі вы бачылі, дзядуля?

— Якія страхі? Э, на маім вяку давялося паглядзець усякае ўсячыны.

— Не баяліся?

— Чаго ж баяцца? Я — быў дуж! Бывала, на ўсім сяле са мною ніхто не мог пабарацца. У лесе шулы — адзін клаў і на траіх конях вывозіў.

— Уперад, кажуць, усе людзі былі дужыя,— пагаджаюся я.

— Дужыя! Мой бацька нябожчык на сваіх плячах з лесу сенцы вынасіў. Ого, даўней былі людзі!

Гаворка пайшла не туды, куды мне хацелася. Я зноў папытаўся:

— А ці здаралася з вамі што-небудзь страшнае, дзядуля?

— А як жа, здаралася.

— Гэта, мабыць, вельмі цікава?

— А хто яго ведае... От іпюў гэта нешта раз я з воласці. Ноч цёмная, хоць вока выкалі. А дарога была паўз могілкі, што там у нас каля Карачоўшчыны. Падыходжу — страшна стала: здаўна людзі баялі, што там нешта пужае. Чую, што аж сэрца заходзіцца, а — іду. Ну, параўняўся з могілкамі, слухаю: мармыча нешта. Хоць ты ўцякай, і — не магу. Яшчэ слухаю — грукаціць. І сэрца, чую, тукоча: тук-тук. Але перасіліў сябе: не можа, думаю, быць, каб Зарубчык не дазнаўся, што за трасца там такая. Сціснуў свой кій і — туды. Падыходжу, гляджу, і — што ж вы думаеце? Ляжыць на магіле дурны Тадэвушаў Яўхім, мармыча сабе пад нос нейкую пакасць і барабаніць нагамі ў крыж.

Дзед слаба засмяяўся, паправіў шапку і пачаў набіваць люльку.

Агонь патухаў. Я падкінуў галля і, калі шугнулі ўгору дробныя іскры і полымя выхапіла з цемры абрысы кустоў, папытаўся:

— А паляваць ці прыходзілася, дзеду?

Дзед зірнуў на мяне, нібы я сказаў нейкае несусветнае глупства.

— А як жа! Бывала, як скажа Вароніч — пан такі быў у нас, што ў Рэчышчы маёнтак меў,— бывала, як загадае аблаву — хто з ім паедзе? Я, Зарубчык! Хто скарэй воўка загоніць ці кулю пад лапатку яму ўсадзіць? Зарубчык! Мяне пан паважаў. Бывала, скажа: «Зарубчык, заўтра на паляванне збірайся!» — і ідзеш. Нават стрэльбу сваю падараваў мне. І цяпер на сцяне вісіць. Добрая пістаноўка...

Агонь то ўспыхваў, прабягаючы па сухіх прупінках галля, то патухаў. Я думаў пра дзеда, пра яго жыццё, што

пачыналася недзе ў днях сівой мінуўшчыны: які гэта багаты скарб жывых чалавечых сузіранняў. А дзед пруцікам варочаў вуголле і, здавалася, слухаў, як там доўга і высока пішчаў нейкі адзін тоненькі гук.

2

— То от жа слухайце, калі маеце ахвоту. Была ў пана дачка Аміля. Бялявенькая такая, маладзенькая, жвавая. Такое вясёлае дзяўчыны за свой век я яшчэ не бачыў. Як званок які: вечна, бывала, у песнях ды ў кветках. А душы якой добрай!

Дзед уздыхнуў і пачаў пасля паўзы:

— Бывала, толькі і бачыш, што яна бегае. То ў садзе, то ў полі, то ў лесе чутна яна. Любіла пужаць мяне. Падкрадзецца спадцішка ды — скок мне на плечы. Я, ведама, злякаюся, а яна — адскочыць і смяецца. Або ў бараду мне ўчэпіцца. А то — нарве кветак, перабірае іх і пытаецца, ці харошыя. А яно ўсё ў яе руках было харошае. Ці казку папросіць расказаць ёй. А ў мяне казак гэтых было, як у сявеньцы. «Як добра вы гаворыце, дзеду»,— скажа яна. А казкі мае — усё найбольш пра гаротнага мужыка якога і лютага пана. А ёй — падабаецца. Што за душа была... Ды толькі нядобрая выпала ёй доля. І сама, як тая кветка, зачахла...

— А што з ёю здарылася? — не ўтрываў я папытацца, калі дзед на якую хвіліну змоўк.

— От слухайце ж. Быў у пана парабак, ладны хлапчына, што дуж, што харош, што разумнік — залюбавацца можна. Ігнатам звалі. Песню зацягне — не можаш наслухацца. Не часта каму адразу даецца так многа багацця на зямлі. Але ж не на добрае гэта пайшло: пакахаліся яны з Аміляю.

Пан, канечне, не ведаў. Дый ніхто, апрача мяне, не ведаў пра гэта. Толькі адно, што адразу ўсім кінулася ў вочы: надта перамянілася яна. Не відаць яе стала ні ў полі, ні ў садзе, і голас адразу замоўк. Ціхая, маўклівая стала і ўсё як бы пра нешта думае. Прыпільнуе дзе ўпотай мяне і толькі шапне, каб ніхто не пачуў:

— Мілы дзедка, скажы Ігнасю, што прыцемкам я буду чакаць яго за вішняком.

— Добра,— кажу,— скажу ўжо, а як жа.

— Глядзі ж, не схлусі, дзедка.

— Ды што вы, паненка, хіба ж можна...

Аднойчы, памятаю, туды недзе пад прачыстую, добрае ўсталявалася надвор'е. Выйшаў пан з пакояў, пахадзіў па сядзібе, адале паклікаў мяне дый кажа:

— Сёння, Зарубчык, на паляванне паедзем. Кажуць, там пад Замурожжам многа дзічыны аб'явілася.

— Што ж,— кажу,— можна з'ездзіць.

— Ты там скажы, няхай кабыліц абсядлаюць, ды так, неўзабаве, мы і скокнем туды.

— Добра,— кажу.

Неўзабаве мы так, гуляючы, і паехалі. Праязджаем паўз арэшнік, аж паненку спаткалі. Гуляла.

— Доўга,— пытаецца,— ты забавішся, тата?

— Да вечара,— адказаў пан.— А калі што, то і заначуем.

— Ні пуху вам ні пяра,— кажа.

— Разумніца. Толькі ты, дачушка,— кажа,— дахаты ідзі. Мама цябе там шукае.

Ну, паехалі мы ў Замурожжа. Правалачыліся там ладнавата, але, як на тое ліха, нічога людскага не ўпалявалі. Падстрэлілі аднаго зайца, дый таго ўшчэнт папсавалі. Хацелі ўжо дахаты брацца, але пан падумаў дый кажа:

— А ці не падскочыць нам на Байдзіна? Няёмка ж з пустымі рукамі дома паказвацца. Можа там хоць штонебудзь падстрэлім?

— Што ж,— кажу,— можна.

Ну і пагарцавалі мы. Пан — паперадзе, я — ззаду. Трэба было даць немалога круку, але сонца яшчэ стаяла высока і можна было з гадзіну пашвэндацца па байдзінскіх нетрах.

Ну, от і паехалі мы ў гэтае Байдзіна. Абагнулі пералесак, праскочылі прагаліну і апынуліся ля балотца.

— От тут,— кажа пан,— мы мусім хоць качак трохі папужаць. Толькі трэба да рэчкі прабірацца: што самі не ўходаем — сабакі падсобяць.

— Але,— кажу,— падсобяць, чаму ж не. Што ж то былі б,— кажу,— за сабакі, каб яны і птахі не задушылі.

Блізу рэчкі пан і кажа:

— Ты,— кажа,— паставіш каня ды ад таго канца зойдзеш, а я буду цябе ля чыстага плёса чакаць.

Ну і пайшоў я. Палазіўшы па лазняку і ўпэйкаўшы штук чатыры гэтай птахі, я ўжо думаў і варочацца. І толькі гэта выняў люльку, каб закурыць, як чую — як бы на некага пан сварыцца. Няўжо, думаю, мяне заждаўся? Але чаго ж бы ён, думаю,— гукнуў бы, калі што якое.

Не прайшоў і гоней, як чую — нехта стрэліў. А паля — нехта пачаў крычаць і плакаць. Нядобра сашчамілася ў мяне сэрца. Бягу і думаю: злавіў, мусіць, нейкага абармота пан. Будзе клопату на ўсю дарогу.

Ажно калі падбег, дык аж не паверыў сваім вачам. Не паспеў апамятацца, як пан закрычаў:

— Даставай!

А даставаць трэба было човен, што гойдаўся на рэчцы. Насмерць падстрэлены ляжаў у ім Ігнат. Паненка, мабыць, не верачы сабе, яшчэ ўсё сілілася падняць яго, але Ігнатава галава выпадала з рук і стукалася аб днішча лодкі. Паненка нічога не разумела, у вачах яе быў толькі жах.

Калі дасталі човен, паненка кінулася на труп і закалацілася над ім. Пасля яна падняла галаву і паглядзела на нас. Нічога не было страшней за яе вочы. І валасы раптам сталі доўгія, раскіданыя.

— Нашто вы забілі яго? — папыталася яна вельмі ціха.

Пасля як бы нешта ўспомніла, жахліва расплюшчыла вочы і крыкнула:

— Не дам! Не дам! Зладзюгі! Драпежнікі! Не чапайце яго!

Паненка зноў кінулася на труп, а пан размахнуўся і пашчапаў сваю стрэльбу аб хвою.

— Адвязі дахаты, а па яго заўтра прыедуць! Не ўцячэ! — загадаў ён мне, а сам сеў на каня.

От так і скончылася нядоўгае шчасце ў іх... Ох, якія цвёрдыя сэрцы бываюць: як камень магільны... Нечалавечыя сэрцы.

Зноў дзед замоўк, я нават не заўважыў гэтага, і толькі, калі ўжо доўга пастаяла цішыня, апамятаўся. Дзед нанатаксама тупа глядзеў на свае калені і, мусіць, нанава ўспамінаў сваё жыццё. Вочы яго задуменна свяціліся, і мне здавалася, што ў іх прабягалі цені ўспамінаў.

— Ах, якая залатая дзяўчына была,— нарэшце сказаў дзед і ўздыхнуў.

— Ну, а што ж з ёю пасля было? — не вытрываў я.

— Э, дзеткі, так яна і зачахла. Дзе ўсё яе хараство дзелася: схуднела, выцягнулася, сама як смерць стала. Пад вечар, бывала, мо калі выйдзе на хвілінку ў сад пасядзець і ўсё думае, думае... Нядоўга пражыла, пахавалі яе на цвінтары...

Дзед пачаў даставаць торбачку. Паволі развязаў, выняў кавалак сала, адрэзаў нажом-цыганком скібачку, нанізаў на пожаг і пачаў падсмажваць.

— Усяго давялося мне пабачыць у жыцці,— сказаў дзед, яшчэ думаючы нешта сваё,— бо, як кажуць, я заўсёды быў на прыкмеце. Параіцца каму дзе трэба — да Зарубчыка ідуць. У воласць, бывала, трэба: хто пойдзе? — Зарубчык. Да спраўніка паехаць — Зарубчык. Раз нават аж у Вільні ад вобчаства пабываў...

— А чаму гэта, дзядуля, вас Зарубчыкам завуць? Што — пан даў такое прозвішча, ці як?

— Як кажаце?

— Зарубчыкам чаму вас завуць? Адкуль у вас такое прозвішча?

Ён коратка зірнуў на мяне, а пасля перавёў вочы на смалячок. Доўга думаў. Паправіў ламачча. Пабіў пруцікам па вуголлі, ад чаго высока ў цемру гайсанулі іскры.

— Э, дзеткі...

Ён падняўся, крактануў, як ад холаду, і падаўся ў цемру. Я таксама дагадаўся, што трэба паглядзець каня, і пайшоў за дзедам. Твару кранулася лёгкая вільгаць. Цемра была такая густая, што яе хацелася распіхваць рукамі. Я свіснуў. Конь абазваўся, і на яго голас я пайшоў вобмацкам.

Конь сустрэў мяне па-дружбацку, ласкава ткнуўшы мордаю ў плячо. Я злавіў гэту морду, пагладзіў яе, зграб камароў, што паналіпалі ў яго каля воч. Конь пырхаў і цёрся аб маё плячо. Ад яго пахла потам і перажованаю духмянаю травою.

3

Абняўшы калені, дзед сядзеў ля вогнішча і глядзеў, нібы сузіраючы свае думы. І калі недзе скончылася чарада гэтых дум, як бы ўслед ім, сказаў:

— Даўно гэта было, дзеткі. Не пан даў мне такое прозвішча, а людзі...

Я ўсеўся зручней, каб пасля не варушыцца ўжо.

— А было гэта так. Некалі паны давалі мужыкам балоты на расцяроб. Хто больш выцерабіць балота, таму і аставалася пасля сенажаць гэта. А ў дзеда майго было трое сыноў: Макарка, Базыль ды Якуш. Макар — самы старэйшы, жанаты быў, жыў на аддзеле, а Базыль з Якушом — пры бацьку. Работнікі з іх былі ўдалыя, от яны

і прыдбалі гэтае сенажаці дзесяцін, мусіць, са тры. Ніштаватая была сям'я: быў хлеб і да хлеба.

Але і тут без няшчасця не абышлося. Надалі чэрці Якушу звязацца з муляроваю дачкою, Марынаю. Здаровая дзеўка была, грудастая такая. Шчокі — як макаў цвет гарэць. Пройдзе, бывала, па вуліцы — аж зямля, здавалася, стогне. Работніца, праўда, залатая, але ж распусніца несусветная. На начлезе, бывала, толькі з хлопцамі і круціцца. Чорт ведае чым яна Якуша прывязала, а ён жыць без яе не можа. Надумаў жаніцца. Бацькі і так і гэтак — сынок, пашкадуй сябе, не бяры на сябе ганьбы такое — куды там, і слухаць не хоча: жанюся! Што ж, дубінаю не ўломіш: лезь у шыбеніцу.

Пачалі пакрысе рыхтавацца да вяселля. Як бы там ні было, а парадак справіць трэба. Але раптам — прапаў Якуш, як камень у воду праваліўся. Дзень чакалі, другі — няма чалавека. Аблазілі ўсюды — мо ў студню праваліўся ці павесіўся — не знайшлі. Ну, што ж, парашылі: значыць, ад Марыны збег. Хто хваліць за гэта пачаў, а хто — ганіць.

Але тут пачалі наўкруга прападаць коні ў людзей. То з начлегу не вернецца, то з хлява згіне — што за пракуда? Пачалі на Якуша грашыць: няйначай нячыстаю справаю займацца пачаў. Клянуць яго, а баяцца як агню. Вельмі ж адчайны быў чалавек. А аднае ночы суседняе сяло ўсё прахам пайшло, ні аднаго гуменца не асталося. Тады ўжо вобчаствам парашылі ў воласць ісці прасіць заступіцца.

Пасля гэтага ўсё пацішэла, а аднойчы і сам Якуш заявіўся. Адзеты, прыбраны. Паясы дарагія на ім, кашуля з манішкаю, боты — зіхацяць, а порткі дык, мусіць, проста з князя якога. Ну, вядома, першым дзелам гарэлка ракой палілася. Усё сяло гуляй — у Якуша грошай хопіць!

Ліпнуць дзяўчаты да Якуша, але толькі адна для яго царыца: Марына.

Ажаніўся-такі. Жывуць пры бацьках Базыль з Якушом — усё нібы ладна. Хто яго ведае, можа вінавата была ў тым і Марына, але такую думу надумаў Якуш, каб уся гаспадарка — і сенажаць тая — яму аднаму асталася.

4

— Скасілі яны сенажаць сваю: добры луг там быў, трава расла, як чарот. Месца ўдалае, роўнае, разложыстае. А тут і лясок недалёка.

Нешта раз Базыль з Якушом і паехалі гэта туды па сена. Панакладалі вазы — ладныя, шырокія,— і пакуль паўціскалі ды абхарошвалі, і ноч надышла. А дарога далёкая — вёрст з дзесяць, мусіць, будзе. Якуш і кажа Базылю:

— А што, калі б нам заначаваць тут?

— Чаго гэта?

— А навошта мучыцца ноччу? Думаеш, добра качацца па гэтых ямах?

— Знайшоў чаго баяцца. Дзе аб'едзеш, дзе плячом падапрэш. Што гэта — упершыню? А заўтра вунь трэба ў Дзятлішча па бярвенне ехаць.

— Паспееш з сваім бярвеннем, нікуды яно не дзенецца.

— Як хочаш,— нібы пагадзіўся Базыль.— Толькі ж бацька казаў...

— Ат, што там — бацька! Сам бачыш — ноч!

Так і не паехалі. Папрыпіналі коні, разлажылі агонь, перакусілі чаго было дый пачалі на начлег майстравацца. Якуш доўга ляжаў, гледзячы ў неба, курыў ды сплёўваў. Месяц паказаўся над ляском. Якуш падняўся, пастаяў, як бы прыслухоўваючыся да нечага, дый кажа:

— Базыль?

— Га.

— Ты спіш?

— Не. А што?

— То спі сабе, а я прабягу ў лясок ды вязкоў пару высеку. Балазе і месяц не надта яшчэ свеціць.

— Ну ідзі.

Палазіў Якуш каля воза, выцягнуў рыдлёўку, узяў сякеру дый падаўся.

У лесе пакружыў крыху, выбраў мясціну, згроб зверху лісце і пачаў капаць яму. Пакапае, пакапае дый азірнецца, прыслухаецца. Даволі доўга важдаўся там.

Спаў Базыль, калі вярнуўся Якуш. Коні, сытоўшыся, зрэдку маталі хвастамі ды церліся галовамі адзін аб аднаго.

Якуш нагнуўся над Базылём. На месяцы ясна было відно, як у паблытаныя валасы на галаве яго паўлазілі каліўцы сена. Якуш выпрастався, падняў сякеру і з усяго маху спусціў яе. Базыль не сцепануўся нават.

Абцёр Якуш сякеру сенам, папіхнуў нагою Базыля, каб пераканацца, што той нежывы, узваліў на плечы і

навалок. А месяц добра свяціць пачаў. Заваліў Якуш яму, зараўняў, нагроб наверх сухога лісця, згладзіў яго і, вытершы з ілба пот рукавом, цяпер ужо крадком падаўся да вазоў. Перш ішоў, адале пабег. Ці то ад страху, ці папраўдзе гэта, але яму здавалася, што краўся і перабягаў з ім нейкі цень.

А гэта быў палясоўшчык. От жа бывае так: як ні хавайся, а ўсё роўна нехта змеціць цябе.

А Якуш пазаціраў сляды, абхарашыўся сам і глыбей закапаўся ў сена. Мабыць, самаму страшнаму злодзею не лёгка забіць чалавека: так і не заснуў ён. Што ён бачыў перад сабою, што думаў — хто гэта скажа? Толькі на золак пачало брацца, а ён ужо быў у дарозе.

Ці то каб смеласці больш прыдаць сабе, ці каб людзям не падаць знаку, але нават песню заспяваў, нягоднік. Едзе, залівaецца — аж лес звініць. Яму ўжо гэта не грэх, дзе там! Ой, да чаго звер чалавек бывае... Аж вёрст за чатыры яго ўжо чакаюць стражнікі.

— Куды едзеш, чалавеча? — пытаюць.

— Сена вязу дадому — бачыце ж.

— А адкуль сена?

— З Забалацця. Там жа сенажаці нашы.

— Адзін ездзіў?

— Адзін.

— А можа з братам?

— То брат жа пайшоў недзе.

— І ты не ведаеш куды?

— А што я — пастух яму? Яшчэ звечара пайшоў недзе. Можа ўжо дома.

— Дома? А можа ў лесе?

Пачуў Якуш, што будзе бяда. Стрыжэ вачыма: як бы ўцячы.

— Злазь з воза!

А ён другое дзяўбе:

— Не ведаю, дзе ён.

— А мы ведаем — хадзем!

Адкапалі тую свежую яму. Ну, што ж: стаіць Якуш, усмешку крывую састроіў, як бы гаворачы: скора ж вы мяне ўпэйкалі, нягоднікі.

...Так і прапалі абодва браты праз зайздрасць чалавечую. Толькі ад Макара пасынкі пайшлі. Але ўжо ўсіх пасля пачалі празываць Зарубчыкамі. От, дзеткі, таму і мяне Зарубчыкам завуць... Не пан даў мне такое прозвішча, а людзі...

5

Цёмная, глыбокая цішыня стаіць на ўвесь свет. Агонь наш даўно патух, ледзь высвечваючы апошнімі вугалькамі белую дзедаву бараду. І дзед мне здаецца маленькі і вельмі скурчаны і далёкі, і мне не верыцца, што я толькі што чуў яго голас. Можа гэта нехта другі гаварыў з цемры, а дзед толькі слухаў яго, а цяпер глядзіць у вуголле і яшчэ ўсё чуе той голас. Яшчэ раз я сабраў і падкінуў на вогнішча сухога ламачча, і аганёк перш зусім захліпнуўся, а пасля заскакаў, хапаючыся за тонкія пруцікі сушняку.

— Што ж Якуша — засудзілі?

— Як кажаце?

— Што ж з Якушом пасля зрабілі?

— З Якушом? — перапытаў дзед.— Пакаралі.

Наўрад ці трэба было распытваць далей. Усё было скончана, ад далёкай мінуўшчыны астаўся стары сведка яе — Зарубчык: я думаў цяпер пра яго. Як цяжка, мабыць, яму несці на сабе памяць чалавечых учынкаў.

— Прывялі Якуша ў места,— між тым гаварыў далей дзед,— чыніць над ім суд. Пасярэдзіне места стаяў высокі памост: на ім і караў кат злачынцаў. А кара, дзеткі, была такая: браў кат вялікі гарапнік, аж на сем сталак, кожная з драцяным канцом, і пачынаў біць. І за кожным разам, свіснуўшы бізуном, прыказваў: «Гэта за тое, што не слухаўся бацькі», «Гэта за тое, што не паважаў цара і бога», «Гэта за тое, што засек свайго брата».

І от у нядзелю ў места паназганялі людзей з усяе воласці, каб глядзелі яны, што чакае чалавека, які пераступіў меру чалавечага, падняў руку на кроўнага. Божкаюць людзі ды ўздыхаюць. На памост падняўся кат, свіснуў гарапнікам, усе прымоўклі. Мажны такі, у чырвонай сарочцы, пахаджае ён з закасанымі рукавамі. А тады моцна стаў, растапырыўшыся, бо пачалі ўзводзіць на памост Якуша. Людзі загулі: хто крычыць, хто плача. Якуша прывязалі к слупу, з голаю спінаю на людзі...

Так і біў кат яго па гэтай спіне, пакуль не дайшоў ён. Усе разышліся ўжо, а Марына яшчэ валялася на бруку ды стагнала: ужо і галасіць не магла...

Коні бразнулі цуглямі, мабыць, абганяючыся ад камароў.

— Усякі грэх караецца, дзеткі, от як,— скончыў дзед

сваю страшную быліцу.— А нас з таго часу і пачалі празываць Зарубчыкамі.

Дзед пачаў ладкавацца спаць. Агонь наш даўно патух, цяпер у небе відны сталі зоры, і мы адразу адчулі, што намнога пахаладала ноч...

ПАРОГ

(працяг)

8

Бацька мой, як і ўсякі грэшны чалавек, вельмі ж хацеў забагацець. Ён залез у даўгі — у людзей, у зямельным банку — і купіў сабе пад Слуцкам кавалак зямлі. Няўдобіцы — пяскі, балоты ды імшарнік — самай таннай, абы толькі больш. Спадзяваўся на сваю цягавітасць і сілу: што ўсё гэта можна будзе пакарчаваць, выцерабіць, пазрэзваць куп'ё, асушыць.

Доўгім вузкім балотам зямля дзялілася на дзве палавіны: з гэтага боку Хваевіца, з таго — Саладухі. Назвы, мабыць, вельмі добра перадавалі сутнасць: Хваевіца — што калісь гэтыя пясчаныя ўзгоркі былі ўкрыты нізкарослым хвойнікам; Саладухі — што бралі многа поту, марнай работы, а вылезці з нішчымніцы не давалі. З імі і звязаны мой першы ўспамін.

Ціхі веснавы, яшчэ даволі халаднаваты і хмурны, дзень. На нізкім грудку стаіць наша маленькая, з тонкіх хваёвых вяршалін, на адно акно зрубленая хатка. У ёй няма сянец, яны намечаны толькі першым вянцом, паложаным на круглякі, і кожны раз, ідучы ў хату, іх трэба высока пераступаць. Страха не дакрыта, па столі ходзіць вецер, голыя кроквы глядзяць у неба, на гэты канец, дзе будуць сенцы, выходзяць канцы лат. Двор адным канцом упіраецца ў імшарыну, поўную з краю зялёнай збраснявелай вады, у якой увесь дзень заходзяцца жабы, другім — у канаву, выкапаную бадай што перад самым акном. За канаваю праз маладыя лазінкі відзён слабенькі след дарогі, толькі нашай дарогі, бо, апроч нас, па ёй больш ніхто не ездзіць.

І двор, і хату, і беспрасветнае наваколле я памятаю толькі таму, што ўсё гэта звязана з зусім невялічкай па-

дзеяй. Няйначай як я ў нечым правінаваціўся — ці то не зачыніў дзвярэй у хату і там, убегшы, мог нашкодзіць сабака, ці не ўпільнаваў накрытай сухім ламаччам ускапанай пры сцяне градкі і яе маглі разгрэбці куры,— але памяць трымае хвіліну, калі я, босы, у кашулі, з-пад якой мільгаюць мае голыя белыя ногі, уцякаю ад бацькі, які, зняўшы папружку, збіраецца мяне ўшчунуць.

— Ах ты абармот! Ах ты разбойнік! — ціха грозіць, даганяючы, бацька, і мне, памятаю, не так страшна папруга, як душыць крыўда і горнасць, што я не вінаваты: проста захацелася было спаць...

Першы ўспамін пра Хваевіцу таксама кароткі, як міг бліскавіцы. І таксама абрывак нейкай падзеі.

Рэдкі, чысты лясок, пакінуты пасля росцерабу на патрэбу гаспадаркі. Тыльнаю сцяною да яго стаіць хлеў з нізкаю саламянаю страхою, тоўстая хваіна падымае над ім свае цяжкія пакарабачаныя сукі. На ледзьве значной дарожцы, што праходзіць паміж хлявом і лесам, лена разваліўся параконны плуг, выпражаны, мабыць, зусім нядаўна, бо тут жа раскінуты хамуты, вераўчаныя пастронкі, і нават грудок зямлі, выхаплены сашнікам з травою, яшчэ не абветраў. За канцом хлява вароты ў двор, і там, у яго глыбіні, я ведаю, стаіць хата. Наша хата, але я ў ёй ніколі не быў, бо там жывуць чужыя людзі. Па нейкай патрэбе туды пайшоў бацька, а я чакаю яго, і мне здаецца, што ён бавіцца немаведама як доўга.

Толькі намнога пазней я ўведаў, што труханавіцкую сядзібу бацька намерыўся пакінуць у пасаг старэйшай дачцэ Ульяне. Але яна была яшчэ ў дзеўках, рабіць, такім чынам, прыходзілася на дзве гаспадаркі. І, высіліўшыся, збольшага забудаваўшыся, бацька здаў хваевіцкае гнездзішча ў арэнду слуцкаму кавалю Лейбу, а сам выселіўся ў Саладухі. І няйначай як сюды прыходзіў нечага пазычаць, можа нават коней, каб завезці ламачча на грэблю, якую штогод трэба было гаціць цераз балота, каб не зусім адцурацца ад свету, жывучы ў тых Саладухах.

9

Хваевіца прывучыла мяне к лесу, к жадобе да людзей, к раздумнай адзіноце. Помняцца найбольш зімовыя, бясконца доўгія вечары. Бывала, гарыць лучнік, бо газы не заўсёды стае да нядзелі, яе трэба прывозіць з Слуцка, а гэта бывае не так часта. На дварэ круціць снег, у коміне

шалёпа скавыча вецер, за марознымі шыбамі апраметная цемень. Бацька нешта майструе — з гэблем ці са стругам,— маці сядзіць за прасніцаю, сёстры робяць рукавіцы ці шыюць. Пад лучнікам стаіць цэбрык з вадою; перад тым як упасці туды, пляскатае вуголле на канцы лучыны кокурчыцца і сіпіць тонкім сінім піскам, а калі ўпадзе, ратка хруснуўшы, радасна ўспыхне агонь, на хвіліну высветліўшы і бацькаву бараду, і кудзелю ў прасніцы, і марозныя ўзоры на цёмных шыбах. І на душы расце трывога, і ўсё нечага чакаеш, нечага чакаеш: ну няхай бы здарыўся цуд і хоць нехта зайшоў бы...

І аднаго разу цуд такі здарыўся.

Памятаю, там, у цемры, у завірусе, за акном, раптам нема зайшліся сабакі. Потым ціхі стук у шыбу. Накінуўшы кажух, бацька выходзіць на двор. Яго там доўга няма, потым разам з марозам, што шэрым валам перакаціўся цераз парог і расплыўся па доле, увальваюцца тоўста апраненыя мужчыны, абіваюць валёнкі, атрэпваюць каўняры, авечыя шапкі. Адзін мажны, з рыжаю злямчанаю барадою, другі ніжэйшы, шыракатвары, аднавокі. Я не ведаю, як выглядаюць разбойнікі, але мне здаецца, што ён падобны іменна на разбойніка.

— Добры вечар,— кажуць яны, расхінаючыся.— Коні збіліся з дарогі, прысталі, просімся пераначаваць.

Маці коле распал, раскладае на прыпечку пад трыножнікам агонь. Пасля вячэры размовы — прыгоды, здарэнні, выдумкі — бадай што на ўсю ноч. Тут і тапельцы, і разбойнікі, і нячысцікі, і насланнё. Мяне даўно прагналі спаць, ды дзе тут заснеш, калі ад страху баішся заплюшчыць вочы...

А вось яшчэ хваевіцкая карцінка. Зіма. Таксама доўгі калядны вечар. Пара класціся спаць. Сунуўшы ногі ў атопкі і накінуўшы адзевак, я выходжу па малой патрэбе на двор. Вецер расхінае крыссе, пякучым снегам б'е ў шчокі. І раптам недзе далёка ў бяскрайняй снежнай цемрадзі пачынаюць выць ваўкі. Перш адзін на нізкай доўгай ноце, а тады да яго недзе яшчэ далей абзываецца другі, нават трэці, і гэтыя два ці тры галасы будуць то чаргавацца, то зліваецца ў адзін, наганяючы ў душу магільны вусцішны холад. Мне пачынае здавацца, што галасы падступаюць блізка, вось яны ўжо недзе ў нашым ляску, вось за варотамі, за хлявом, зараз на двары заблішчаць ваўчыныя вочы. Мяне працінае холад і страх, я калачуся, але не магу скрануцца з парога і не спяшаюся бразнуць клям-

каю, сілячыся пастаяць яшчэ хоць з хвілінку, як бы яна мне нарэшце павінна адкрыць нейкую вельмі вялікую тайну...

А вось цёплае веснавая раніца. Я прачынаюся, чую, як маці тупае каля прыпечка, па хаце разносіцца такі смачны пах блінцоў, што мне хочацца тут жа з'есці хоць адзін.

— То папрасі тату, каб памаліў цябе.

Я выбягаю на ганак босы, лёгкі ад свежай вады, якой толькі што прамыў вочы, і крычу: — Тата, памалеце мяне!

Бацька нешта майструе на канцы двара пад паветкаю і, не перастаючы рабіць, загадвае мне хрысціцца. Потым, аддзяляючы слова ад слова, цераз увесь двор гаворыць малітву: «Отча наш, іжа ясі на небясі...» Я паўтараю за ім словы ўсяе малітвы, потым, ужо завучана, скоранька канчаю: «Ва імя аццa, і сына, і святога духа, амін», зноў хрышчуся і весела бягу ў хату, пераскокваючы высокі парог. Блінец ужо ляжыць у місцы, цёплы, духмяны, зверху бліщчаста намазаны здорам.

10

Пазней я пасвіў кароў. На лета, пасля школы, я прыязджаў ад Ульяны, і на мне ляжала пастухоўская работа. Нам прывозілі сваю жыўнасць — авечак, выпусткаў цялят — і Ульяна з Труханавіч, і Аўдоцця з Нівы, і добрыя суседзі па купленых дзялянках з Гарадзішчаў: у вас тут прытачна, вялікая лясная разлегласць, няхай палетуюць у чарадзе. Пасвіць было цяжка, але такая ўласцівасць дзяцінства, што нават яго слёзы памяць пасля ператварае ў хвілінкі мілай далёкай красы. Бывала, на золку, калі будзіць маці, здаецца, немаведама што аддаў бы, каб яшчэ кропельку падрамаць, аднак помніцца толькі асалода, з якой цягнецца гэтая кропелька. Асабліва цяжка выплысці са сну, калі гудуць жорны, і хочацца глыбей і глыбей на сябе нацягнуць коўдру і бясконца знікаць у тым рытмічным гудзенні. Або якая мілата хадзіць за статкам босымі нагамі па лужах пасля дажджу, ступаць па свежай халаднаватасці травы. Або ляскаць пугаю-дратаванкаю так, што па лесе коціцца пошчак, а на траве астаецца тугая выбрытая палоса.

Або якая смаката, калі маці ў торбу з сабою паложыць драбок цукру і ты яго грызеш з чорным хлебам, ці спелы яблык, ці пляшку малака, заткнёную драўляным коркам, і яно пахне домам, матчынымі рукамі...

Пазней, калі я ўжо вучыўся ў Слуцку, на той пастухоўскай пасадзе прычыніўся выпадак, які мог бы каштаваць мне жыцця. Я схапіўся з двума ваўкамі.

Невялічкая мая чародка — каровы і авечкі — пасвілася на ўзлеску сярод кустоў арэшніку, маладога беразняку. Восень, кругом ціха, бязлюдна, даўно пакошана і звезена сена, на кустаўі пачынае жаўцець і аблятаць лісце. Я стругаю дужку — пляту кош. І раптам з-за шырокага куста выскачыў вялікі жоўта-шэры звер. Я ведаў, што тут недалёка будуецца яшчэ адзін пасяленец, Змітрок з Васілінак, і ў яго ёсць вось такі ж брудна-шэры сабака. Не паспеў я падумаць, чаго сабака бегае тут без гаспадара, як ён з разгону кінуўся ў авечкі. Авечкі шуснуліся ўбок, але ён управіўся схапіць адну і сіліўся закінуць яе за спіну. У руках у мяне была толькі недаструганая дужка. Я расперазаў папругу з меднаю замашною салдацкаю бляхаю і кінуўся ратаваць. Бачу, як ашчэранымі зубамі звер клычыць авечку, бачу яго страшныя вочы, але лезу на яго і перад гэтымі вачыма махаю бляхаю і крычу: «Ага, воўка!» Што гэта не сабака, а воўк, я, мабыць, ужо здагадаўся, бо тут жа нейкім другім бакавым зрокам бачу, як з-за другога куста выскачыў яшчэ адзін такі ж самы звер і мчыць у гурт авечак. Усё рабілася само, ніякага страху я не чуў, не было калі яму паявіцца — махаў і крычаў нема і апантана, налазячы на гэтую ашчэраную зяпу,— і дзіва: воўк выпусціў авечку і адскочыў. Авечка падхапілася і пабегла за ім, але воўк ужо забягаў за куст. Я кінуўся наперарэз другому, махаючы тою ж спражкаю, як агнём, усё гэтак жа нічога не памятаючы.

Толькі тады, калі яны адбеглі, мне стала страшна, і я ўбачыў, што ўвесь калачуся.

11

Бацька быў патомны труханаўскі мужык. (Дарэчы, увесь час мяне не пакідае перакананне, што ўсе Скрыганы паходзяць толькі з Труханавіч. Дзе б ні былі. Ёсць яны і ў Маскве, толькі ўжо з перайначаным канчаткам — Скрыгановы). Ён ведаў усе прафесіі, што патрэбны на сяле, умеў хадзіць каля зямлі, пілаваць на сталюгах дошкі, шчапляць і гадаваць сады, пакладаць малых кныроў; любіў сталярыць, бандарыць, рабіць калёсы і сані, саломаю ці гонтамі крыць стрэхі, цяслярыць, будавацца. Будоўля асабліва была яму па душы. Сёлета ён мог паста-

віць хату, але на той год перадумаць, што не тымі вокнамі яна глядзіцца на сонца або стаіць не на тым месцы двара, і тут жа раскідаць яе і пачаць будаваць нанава. Самая вялікая бяда, што не было яму памагатых. Дочкі — ці ж гэта работнікі? Але ён камандаваў імі, ніколі нават не задумваючыся, што ў іх не мужчынская сіла. Ён не любіў і не ўмеў хварэць, усякую хваробу пераносіў на нагах, маючы найглыбейшае перакананне, што самы лепшы лекар — работа. Чужую хваробу лічыў за прытворства, глядзеў на яе як на спосаб пагультаяваць. Набожны, ён спраўляў усе святы, маліўся, ставіў свечкі, біў да самага долу паклоны ў царкве, але не лічыў за грэх у любое свята зграбці і пакласці ў копы сена, звезці ў гумно снапы, асабліва калі надвор'е гразілася дажджом.

У яго былі паломаны абедзве нагі. Адну раструшчыла ў галёнцы, калі ён, будуючыся ў Труханавічах, вазіў з лесу бярвенне і яго на ўхабе з размаху заднімі санькамі — як у нас звалі, сучкаю — прыціснула да хвоі. Другую паламаў, калі будаваўся ў Хваевіцы. Зруб ужо быў высокі, напарнік цягнуў вяроўкаю новае бервяно, бацька памагаў яму знізу падпораю. І вось, калі канец ужо быў паложаны на сцяну, а вяроўка знята, бервяно слізганула, палявцела ўніз, ён не паспеў адскочыць. Пасля ўсё жыццё ён хадзіў не вельмі складна, адною нагою ступаючы карацей, другою даўжэй.

Пра сябе ён ніколі нічога не расказваў. Ён быў не надта вялікі ростам, але дужы. Я заўсёды адчуваў прыліў гонару, калі ад каго чуў пра яго сумленнасць, працавітасць і сілу. Мне здавалася, што ад яго нешта перадалося і мне, бо я ніколі не паддаваўся сваім аднагодкам ні ў спрыце, ні ў дужанні.

Памятаю, расказвалі, што некаму гуртам яны будавалі гумно. Ставілі шулы. І якраз тады, калі мужчыны сабраліся спусціць шула ў яму і паднялі яго верхні канец, бацьку здалося, што яма не так добра зачышчана ў дне, ён скочыў туды з рыдлёўкаю, а шула камлём шуснула яму на плечы. Ён напяўся, кракгануў, і шула, толькі што ачэсанае, сырое, дубовае, выскачыла наверх.

Ён быў двойчы жанаты. Першая жонка памерла, нарадзіўшы толькі адну дачку Аўдоццю. Я памятаў яе ўжо дарослаю жанчынаю, калі яна, выйшаўшы замуж у Ніву за Хведара Лапца, прыязджала да нас у госці. Ён — красун, весялун, майстра на ўсе свае залатыя рукі, з светлымі валасамі і лёгкім голасам — заўсёды прывозіў з сабою

нейкую адмысловую, вельмі чалавечую лагоду. Нам, малым, ён нарываў самых спелых вішань, спрытна лазячы па дрэвах; з бацькам за сталом гаварыў пра гаспадарку, з маткаю на прызбе пра сваіх дзяцей — Марылю і Зосю. Усім было добра ад яго. Аўдоцця, белатварая, высокая і зграбная, уся свяцілася сваім шчаслівым лёсам. Толькі намнога пасля ўжо, калі быў дарослы, я дазнаўся, што маме яна няродная дачка, і дзівіўся той дружнасці, якая ляжала між імі. На ад'езд ёй стараліся як больш накласці ў воз гасцінцаў — яблыкаў, груш, а маці неўпрыкмет ўкручвала ў анучкі скаромнага. У імперыялістычную вайну Хведара забралі ў салдаты, а праз два гады ён ехаў дадому на пабыўку. За ўвесь час на франтах яго не зачапіла ні адна куля, а калі садзіўся ў цяплушку, поўную салдат, учапіўшыся ўжо на хаду, нехта, брыдкі душою, піхнуў яго ногцам, і рука папала пад колы. Памятаю, колькі я плакаў, калі, пасля выздараўлення, ён зноў прыехаў да нас з Аўдоццяю, і ў яго, схуднелага, бледнага і пацішэлага, востра падымалася ўверх сухое плячо.

— Што там рука,— сказаў ён бацьку спакойным голасам,— магла і галава папасці пад колы... Ну не той гаспадар ужо я буду, дык што ж зробіш.

Памятаючы пра нас, малечу, і, мабыць, не хочучы, каб мы думалі пра яго як пра калеку, ён, чапляючыся адною рукой, зноў залез на дзерава, каб нарваць нам самых спелых вішань.

Адною рукою ён спрабаваў і араць, і касіць, і сталярыць, але на скорым часе прыкінуўся пастаянны боль галавы, не стала ні спрыту, ні сілы, так і патухаў ён паволі і доўга.

12

Другую жонку бацька ўзяў з Грэска, пасля чаго ў Труханавічах нас і празывалі Грэжанчыкамі. У мацеры нас было адзінаццацера; трое памерла да мяне, двое — пасля мяне, я памятаю іх страшную смерць.

У Хваевіцу старэйшаю дачкою прыехала Таццяна. Ёй вельмі не пашанцавала. Недзе, яшчэ ў малыя гады, яна цяжка перахварэла на залатуху, асталася глухою. Невысокая сабою, ціхая, пакорлівая, пакорліва яна несла і свой лёс, нідзе не выстаўляючыся, усім саступаючы, не замінаючы малодшым выходзіць замуж, стараючыся, каб ад яе ішло толькі дабро. Гаворку з людзьмі ёй замяньвалі кнігі, на якія яна выбірала святочныя дні ці часіны між

сну. Можа ад адзіноты, а можа спадзяючыся на палёгку, яе пацягнула ў набожнасць: я ніколі не бачыў, каб хто другі з такою гарачаю вераю і самазабыццём шаптаў перад абразамі свае малітвы і каб у каго другога ў вачах было столькі адданасці.

Яе паказвалі дактарам (вядома, калі было позна ўжо), вазілі да шаптух, але спадзяванні на папраўку ўсё гаслі і гаслі. Яна звыкалася з сваёю адзінотаю маўкліва і пакутліва. Памятаю, аднаго разу, зайшоўшы з палявання і будучы пад вясёлым настроем, палясоўшчык з Зарачанкі, нястомны жартаўлівы заляцальнік да чужых жонак, Корбут Палікар пры ўсіх пацалаваў яе, і можа з месяц пасля гэтага я бачыў, як на яе губы, калі яна заставалася адна, набягала ціхая шчаслівая ўсмешка, як цень таго беглага жартоўнага пацалунка. Якое ж дарагое яно, гэтае чалавечае шчасце, калі пра яго толькі марыш. І наўрад ці завуць яго гэтым добрым словам, калі яго надта многа.

Потым ішла Лізавета з характарам зусім непадобным. Паказная ростам, з некідкой, але асаблівай, трохі цяжкаватай прыгажосцю, яна любіла непакорства, мела незалежны погляд на законы сям'і і гэтым як бы вылучала сябе над другімі. Бацьку з яго гаспадарскім характарам камандаваць Лізаветаю было нялёгка; аднаго разу, калі яна сабралася ўпрочкі, прыйшлося даганяць яе конна і варочаць сілком. Гэтая падзея доўга ў нашай сям'і не забывалася. І было падобна на дзіва, што да яе раптам схіліўся самы самавіты і самы прыгожы на ўсё наваколле дзяцюк Есіп Шыманскі з Гарадзішчаў. Ён быў высокі, увесь светлы — светлавалосы, светлавусы, светлабровы,— спакойны і рахманы, як звычайна бываюць людзі яго рослай пароды. Аднаго разу ён ішоў на спатканне, на рэчцы сарвала мост, ён перакідваў з палі на палю кладкі, паслізнуўся, да берага дабраўся плыўма. На ім былі новыя шаўровыя боты, што на той час лічылася вялікаю раскошаю, і першае, што сказаў Лізавеце, выплыўшы: «Ах, якое недарэчнае ўтрапенне, боты ж, мабыць, прападуць!» Гэта была хвіліна разгубленасці, шкадавання дарагой прыгожай рэчы, бо Есіп ніколі не быў скупы, наадварот, меў натуру добрую і шырокую. Нават пасля ўжо, выйшаўшы замуж, калі Лізавета паяўлялася ў нас, то ўсё роўна адчувалася нейкая падкрэсленая ёю зверхнасць, што вельмі замінала жаданай цеплыні гасцявання.

Аксеня і Тэкля ў некаторай долі паўтаралі Таццяну памяркоўнасцю, добрым ладам душы, зычлівым, чулым

паслушэнствам. Толькі ў Аксені надзіва лёгка спалучалася хараство ўнутранага свету з мяккай, сонечнай адкрытасцю твару, Тэкліна ж даверлівасць душы была скупей на адкрытасць; Тэкля як бы задыхалася ад немагчымасці свабодна сказаць пра сябе ці бляскам воч, ці парывам дыхання, ці ўсмешкаю — гэтымі гіпнатычнымі знакамі ўнутранай чалавечай мовы. Не ведаю, ці ёсць навуковыя даследаванні да таго, але мне часта думаецца, што вонкавае аблічча чалавека мае самую цесную сувязь з яго ўнутранай арганізацыяй.

І замужоўства Аксеніна праходзіла лёгка, як бы яна пра гэта ніколі не думала. Усім сваім залётнікам яна адмаўляла з самай мілай прастатою,— што ёй яшчэ не пара выходзіць замуж,— і не мала здзівіла ўсіх, калі выбрала Івана Сасноўскага з Набушава, чалавека не так ужо і паказнога, сухатварага, страгавокага, з чорна-паджарымі вусамі, якія рабілі яго намнога старэйшым.

13

Пасля мяне былі Ганна і Мікалай. Я не магу гаварыць пра іх спакойна, бо ў мне жыве пераканапне, што з іх смерцю ў нашай сям'і страцілася нешта вельмі важнае, можа нават галоўнае. Ганна была нечым падобна на Ульяну: жвавая, быстрая на розум, рашучая, праўдзівая і адкрытая,— такая натура фармавалася ўжо ў яе дванаццаць гадоў. Мне часта здаецца, што калі б яна была жывая, выпрамяненне яе натуры пакінула б нейкі добры след на лёсе ўсяе нашае сям'і ці па крайняй меры іначай скіравала б мой лёс. Можа так думаць антылагічна, але ці кожная ісціна станавілася адразу бясспрэчнай.

Мікалай быў здаравяка, рос апошні ў сям'і. Ён быў прысадзісты, плячысты, на свае восем гадоў меў не малую сілу, і я ведаў тайныя бацькавы спадзяванні, што сваім памагатым і наследнікам на гаспадарку ён меціў не мяне, а яго. Ён так і прывучаў яго да працавітасці, да гаспадарнага ладу, змалку беручы з сабою і на сенакос, і на карчаванне, дбаючы, каб ён разбіраўся і ў цяслярскай справе, і ў бандарцы.

Але ў тысяча дзевяцьсот дваццатым годзе прайшла па нашых мясцінах страшная хвароба — крываўка. На адным тыдні памерлі перш Ганначка, а тады Мікалай. Бяда заўсёды шукае сабе апраўдання: нехта пусціў думку пра накапаванасць, бо смерць адзін раз падступалася ўжо да

іх. Я памятаў тую далёкую ноч. Была позная восень, пад нізкім шэрым небам цягнула волкімі халадамі. І аднаго разу, прыцемкам ужо, хапіліся, што дзяцей няма дома. Здагадацца было няцяжка: за варотамі пачынаўся лес. Усю ноч мы шукалі іх, з сабакамі, з ліхтарамі заглядаючы ў лаўжы, ва ўсе канцы падаючы галасы, завучы па імёнах і з заміраннем сэрца чакаючы, што яны абзавуцца. Якраз гэтага вечара закружыў першы калюча-востры снег; абое яны босыя; Мікалайку толькі тры гады. Чым магла прытуліць іх лясная чорная глушэча ночы? Іх маглі разарваць ваўкі; змогшыся, яны маглі прысесці пад любое дрэва, задрамаць і замерзнуць; маглі залезці дзе ў імшарыну і загразнуць у багне. Ноч праходзіла, круг пошукаў замыкаўся, і ўжо калі не аставалася ні каліва надзеі, нехта ў Гарахоўцы сказаў, што ўчора позна ўвечары бачыў, як на ўзлеску пад Прашчычамі снегам заносіла дзіцячыя босыя сляды. Іх там і знайшлі ў Прашчычах у першай хаце: добрыя людзі адагравалі іх на печы.

І вось цяпер Ганначка ляжала на покуце тоненькая, уся прасвечаная нейкаю празрыстаю незямною чысцінёю, а ў абяскроўленых губах так і асталася непатушаная гарэзнасць, усё роўна як ёй было смешна, што мы лічым яе за мёртвую.

Каля Мікалаевай труны памятаю толькі бацьку, як ён стаяў увесь дзень на каленях перад абразамі, просячы цуду.

— Божухна мой міласэрдны, пачуй жа ты малітву маю, зрабі хоць раз божацкае дабро,— прасіў ён.— Можа калі я зграшыў перад табою, дык пакарай мяне самога, адбяры ў мяне рукі, ногі, мову, зрабі мяне невідушчым, глухім. Але нашто ты забраў дзіця, яно ж нічым не саграшыла перад табою. Вярні яго, ты ж усясільны, не дай захлынуцца веры. Ты навучаеш, каб мы любілі адно аднаго, рабілі толькі дабро, дык чаму ж сам...

Ён змоўк, раптам як бы апамятаўшыся, што гэта ўжо не малітва, а спрэчка. І застыў на каленях у немым маўчанні, і гэта было страшней за крык. Трэці раз на маім жыцці паўтараўся выпадак, калі людзі прасілі цуду ў бога, а ён маўчаў. Трэці раз я бачыў, якія глыбокія раны рабіла чалавеку трагічная вера ў падман. Першы раз там, на самым пачатку майго паяўлення ў свет, калі чынілася набажэнства. Потым Таццяніны малітвы з такім святым чаканнем справядлівасці. І вось цяпер, калі чалавечая вера пераходзіла ў адчай.

Калі медыцына па сваёй схільнасці да цікаўства, бывае, пытаецца, на якія хваробы хварэў, я называю дзве: іспанку і крываўку. Першую з такой рамантычнай назвай цяпер ведаюць як грып і не вельмі баяцца, а тады, маладая, гуллівая, занесеная к нам з далёкіх краін, яна лютавала страшна. Я першы год тады вучыўся ў Слуцку, нейкі зусім кароткі час меў кватэру каля Плашчадкі (так звалася ў нас рынак, дзе прадавалася бандарка, сталярка і жыўнасць), адкуль заўсёды несла вострым духам конскага гною. Лепш будзе сказаць, што я там не кватараваў, а туліўся, бо ў малюсенькай, чорнай ад старасці хатцы, што па вокны ўрасла ў зямлю, месціўся толькі адзін ложак гаспадароў, яшчэ маладых, але нейкіх гіблых людзей, занятых вечнымі клопатамі пра беглую чарку. Я масціўся на нізкай, шырокай, таксама чорнай лаве пры сцяне, галава мая ўпіралася ў халодны покуць. Хваробу я памятаю толькі ў тыя часіны, калі вярталася прытомнасць і я чуў гарачы агонь свайго дыхання, якое, аддаючыся ад коўдры, пякло мне твар. Тады не было ніякіх лекаў, і тэрмометр нейкі час паказваў тую апошнюю рысу, за якой настае небыццё. У гэтай цёмнай хатцы і яшчэ раз я быў блізка каля тае рыскі, калі гаспадары, пайшоўшы з начы на беглае сваё прамышлянне, зачынілі заўчасна юшку, нарабіўшы чаду, і, вярнуўшыся выпадкова, адратавалі мяне ўжо толькі вынесшы на вуліцу, на снег.

Крываўка ж лютавала, аднак, куды страшней. Калі хавалі Ганначку, а тады Мікалая — іх вазілі на могілкі да прыпірышча ўсяе радні, у Труханавічы, за дваццаць вёрст,— я таксама ляжаў ужо хворы. Памятаю цвёрдую, улежаную пасцель у апусцелай каморцы, адгароджанай няструганымі дошкамі, саладкавы, млява-задушлівы пах паветра, кволую цішыню, у якой звінелі неадчэпныя чорна-сінія мухі, місачку схаладзелага аўсянага ўзвару, цягучы боль у нізе жывата то панылa-глухі, то такі вострый, што, здавалася, там ірве вантробы клубок агню. І ўсюды мярцвяны пах нядобрай, успенена-слізкай крыві...

На шостым тыдні я падняўся з пасцелі. Дома не было нікога. На двары так ярка лінуўся на мяне шырокі свет, так многа раскрылася нада мною неба, што я зажмурыўся. Вочы пазнавалі ўсё нанава, як бы дасюль усё гэта бачылі толькі ў сне. На прыгуменні, адразу за пералазам, расла маладая, яшчэ прывязаная да калка слівіна, яна толькі

сёлета дала свой першы плод. Вельмі захацелася дайсці да яе, там жа ўнізе такая мяккая, шаўковіста-ласкавая трава. Ногі ступалі бог ведае як доўга, цела трымцела нейкай празрыстай, салодкай слабасцю, я баяўся, каб, барані божа, не пахіснуцца, бо калі буду падаць, разаб'ецца ўся гэтая толькі сёння нарэшце знойдзеная мною краса навакольнага свету. На кволенькай галінцы, сярод рэдкага, як бы неасцярожна прыпаленага клінаватага лісця, вісела адна-аднюсенькая слівіна, такая буйная і такая набрынялая сваёй тугой сінізною, што край яе аж лопнуў і з расколіны выцек і застыў камячок шыза-ашклянелай сукравіцы. Я быў згаладалы, схуднелы да таго, што рукі мае на сонцы прасвечваліся, і мне нічога цяпер так не хацелася, як зараз жа сарваць і з'есці гэтую слівіну.

І можа з таго часу мне няма нічога спакуслівейшага за сліву і нічога мілейшага за яе тугі, шыза-сіні, набрынялы колер...

У ХРОСНАГА БАЦЬКІ

Правучыўшыся колькі часу ў Слуцку, я наведаўся да Ульяны. Каб паказаць, які з мяне стаў грамацей, я ўзяў з сабою падручнік французскае мовы — першыя параграфы з яго я мог чытаць як мае быць. Няхай там падзіяцца на сяле.

Наша сяло за час вайны вельмі збяднела. Землі неўрадлівыя, гліністыя, далёкія, дый рабочых рук не ставала. А яшчэ колькі людзей адрывалі на вайну — ганялі ў абозы, папраўляць дарогі.

Вельмі спадзяваліся на рэвалюцыю, чакалі зямлі. Першыя часы, як толькі ўладу ўзялі бальшавікі, думалі падзяліць фальваркі ды маёнткі, але скора прыйшлі немцы, аднекуль паявіліся польскія легіянеры. Паны зноў паварочаліся ў маёнткі.

Ульяна бадай што нічога не сабрала з поля — чым жыць, чым будзе засявацца на вясну? Спарахнелі шулы ў браме, паразвальваліся платы, усё ідзе на згібенне. Нават калодзеж, што насупраць двара, засыпала зямлёю — згніў тын. І от, ці то яна сама надумала, ці людзі наўмілі, але маім гасцяваннем яна захацела запамагчыся.

— Схадзі ты, братка, да пана Ёдкі. Ён жа твой хросны, то можа ўспомніць дый паможа.

У нядзелю яна звязала матузком за ногі калашматага гарластага пеўня, ткнула мне яго пад паху і адправіла ў дарогу.

Шэсць вёрст да таго Пукава — дарога невялікая, але яна здалася мне вельмі доўгаю. Ішоў і ўвесь час думаў — як сустрэнуся з тым хросным, што скажу? І што скажа ён? Ці не прагоніць адразу, не захацеўшы нават паглядзець? І які ён — стары ці малады, ганарысты ці просты?

Нарэшце от ужо і маёнтак. Дарога паварочвае ў браму. Шырокі двор у зялёнай ласкавай траве. За брамаю справа невялікая хатка, прыперлася задам у садок. Далёка, у глыбіні, на канцы двара вялікі дом, аслонены густымі, шырокімі ліпамі і прыціснуты да саду,— пакоі. Што ж мне цяпер рабіць? Куды ісці? Але з гэтай хаткі каля брамы выскачыла сухарлявая маладзіца, распытала, што мне трэба, забрала пеўня і сказала: «Ідзі». У мяне апалі рукі: а пеўень? Як жа я скажу сваю просьбу без пеўня? Але жанчына, мабыць, здагадалася: «Ідзі, я пану скажу, што ты гасцінца прынёс».

Прыступкі, ашклёны ганак; я падымаюся, адчыняю дзверы. У гэтым ганку — аказалася, што ён шырокі,— некалькі мяккіх крэслаў, невялікі столік з залачонымі абадкамі, на ім грамафон з выкручастаю трубою. У кутку — пляцёная этажэрка, поўная кніг. Яны то стаяць густымі радамі, то ляжаць адна на адной, абы-як. Адчынены, таксама шкляныя, дзверы ў шырокія пакоі, але там нікога няма. Я кашляю, каб мяне пачулі.

Адчыняюцца дзверы з левага боку, і ўваходзіць чалавек у чорным гарнітуры з белай манішкай, не так-то і высокі, танклявы, сухі, добра пабрыты і надушаны. І вясёлы.

— Ты да мяне, хлопчык?

— Але. З Труханавіч.

Пасадзіў, распытаў, чаго прыйшоў. Калі даведаўся, хто я, павесялеў, зарагатаў: «Ого, дык ты ўжо вялікі!» Я сказаў, што сястра просіць дубу на калодзеж, трохі ячменю, трохі аўса. Ад сябе я дадаў яшчэ і грэчкі. На гэта пан прамаўчаў, як бы не пачуў. Я ўстрывожыўся, але паўтараць не стаў: можа ён яшчэ думае.

Неўзабаве ён павёў мяне ў сад, цераз другі шырокі ганак, абвіты дзікім хмелем, але запушчаны; цяпер дык я знаю, што гэта завецца верандаю. Сад пуставаў ужо, прасвечваўся, але сям-там віселі яшчэ і яблыкі. Пайшлі па дарожцы, усыпанай жоўтым лісцем, вузенькай і пакручастай. На канцы саду, у глухім кутку, стаяла нейкая будка,

як вянглярня, толькі нізкаватая, уся ababітая кацёлкамі. Звычайнымі кацёлкамі, такімі, як мы качалі па вуліцы, але вельмі густа, адна пры адной. Нават патрэсканымі. Што ж гэта за праява такая?

— Па патрэбе не хочаш схадзіць? — папытаўся пан, кіўнуўшы туды галавою.— Збегай, я пачакаю.

Я пачырванеў: «Не».

Пасля мы абедалі. За невялікім столікам, удваіх, у тым жа першым вялікім пакоі. Падавала крамяная круглявая жанчына ў белым фартуху. Крупнік, такі рэдкі, што я не ведаў — есці яго ці піць. Мяса з нейкай падсалоджанай кашай. І ўсяго гэтага вельмі патрошкі — як жа мала паны ядуць! А на закуску, на сподачку, па вялікім печаным яблыку, румяным, у цукровай жыжцы. Смачна.

Адпачыць пайшлі ў ганак. Пан сеў у крэсла, паказаў мне на другое.

— Дык ты вучышся ў Слуцку, кажаш? Малайчына.

Сюды я таксама ўзяў французскую кніжку. Яна ляжала ў кішэні, балазе была без абкладак і лёгка згортвалася ў трубку, і ўвесь час мне карцела, каб дабраць часу і паказаць яе. А цяпер якраз было зручна. Я сеў у крэсла, пакруціў яе ў руках і палажыў сабе на калені.

— Што гэта за кніжка ў цябе?

— Французская.

— Чытаеш ужо?

— Ага.

— Ну, то пачытай.

Я адгарнуў другі ці трэці параграф.

— Бойка чытаеш. Усю ці толькі спачатку?

— Мы не ўсю яшчэ прайшлі.

Пан Ёдка падняўся, папоркаўся ў этажэрцы і даў кніжку ў чорнай цвёрдай абкладцы.

— Сваю то ты чытаеш бойка, а от пачытай маю.

Я разгарнуў. Такія ж самыя лацінскія літары. Пан глядзеў на мяне чакаючы, а я аж умлеў: саб'юся, зблытаюся, прападу. І тут жа здзівіўся, не верачы сваім вачам: літары чужыя, а напісана па-нашаму — «Вучоны бык». Вось яно што! Падман! Стала весялей. Ну, тут я і пайшоў рэзаць, складна, гладка — любата!

— Ну што, добра? — папытаўся пан, хітра ўсміхаючыся.— Усё панятна, праўда? І перакладаць не трэба. Не чытаў раней такіх кніжак?

— Не.

— Ха, то-та ж! Дык і такія кніжкі трэба чытаць. Для

каталікоў напісаныя, каталіцкімі літарамі. Але па-нашаму, па-беларуску, бо беларусы бываюць і з каталікоў.

Прызнаюся, я ніколі не думаў, што могуць быць кніжкі, напісаныя на той самай мужыцкай мове, як казала Ульяна, і мне стала радасна. Я гатоў быў чытаць яе далей, усю, да канца, але пан перапыніў.

— А цяпер пайграем,— сказаў ён.— Ты любіш музыку? Таксама трэба любіць.

З этажэркі ён дастаў чорны блішчасты кружок, палажыў яго на мяккую суконную палічку ў грамафоне і пакруціў корбу. Пасля на кружок спусціў чорную галоўку на выгінастай доўгай шыі і адступіўся. Грымнуў хор, ды такі, што ў гэтым ганку стала цесна ад гукаў — нейкіх чырвоных, харальных, урачыстых. Спявалі «Осанна в вышних», а пасля «На реках вавилонсцих». Гэтыя спевы я часта чуў у царкве.

Грамафон круціў магутныя чырвоныя гукі, але я іх бадай што не слухаў, а глядзеў, што робіць пан. А ён тым часам з тае ж этажэркі ўзяў маленькі складанік, выняў яго з замшавага футарала і пачаў чысціць пазногці. От сюды была прыкована ўся мая ўвага. Божухна, каб мне такі ножык! Невялікі, з перламутравым тронкам, што пераліваецца вясёлымі колерамі, з цэлым скарбам усякіх прычындалаў у ім: ножык меншы і большы, нажнічкі, шыльца, яшчэ бог ведае колькі ўсякіх спакус. Як бы ён мне спатрэбіўся! Плясці кашы: калоць ракіту або стругаць дужкі ці парэбрыны. Або спускаць лазовыя дудкі. А колькі гаворкі было б сярод хлопцаў, як бы дзівіліся! Ну што было б хроснаму здагадацца і падарыць мне гэты ножык? Яму ж гэта нічога не значыць, а мне колькі было б радасці. Але пан скончыў абчышчацца, зноў засунуў ножык у футарал і палажыў на этажэрку. Не здагадаўся.

— То, мабыць, табе пара ўжо і дадому ісці,— сказаў нарэшце пан.— Па дуб і збажыну, скажы, няхай у пятніцу прысылае падводы.

Я сышоў з ганка. У клумбе кветак, якую я толькі цяпер заўважыў, стаяў невысокі, як бы спілаваны, мармуровы слупок з высечаным на ім кружком цыферблата. «Сонечны гадзіннік»,— здагадаўся я, хоць раней такіх і не бачыў. У дзірку пасярод цыферблата замест шпянька быў уторкнуты лазовы пруцік. Грэшна прызнацца, але я падумаў: вельмі ж малы знак пакінула тут рэвалюцыя.

Без пеўня дадому ісці было куды лягчэй. Я быў цяпер сам па сабе, сярод поля і сярод дарог, і мог думаць, што

хацеў. «Чаму ж гэта ў аднаго чалавека так поўна ўсяго? — думаў я.— І навошта яму, аднаму, і такі дом, і такі сад, і ўсё багацце двара і зямлі? Няўжо яму не цяжка, калі ён бачыць, што гэта несправядліва? І такі скупы — нават ножыка не падараваў». І яшчэ мне думалася, што ў гэтым доме жыць яму ўсё-такі, мабыць, страшна.

ДВА НЕМЦЫ

У дзевяцьсот васемнаццатым годзе да нас прыйшлі немцы. За мой невялікі век гэта быў першы сапраўдны вораг на нашай зямлі: маўклівы, узброены ў халоднае жалеза, з чужымі парадкамі і з чужой моваю.

Мы жылі на хутары, далёка ад бітых дарог, да нас мала хто заходзіў. І бацька, сціснуты агульнай людской трывогай, стараўся мала дзе патыкацца. Бывала, кожнае нядзелі ён ездзіў у наш невялікі гарадок Слуцак, каб што прадаць, а што купіць у гаспадарку — касу-літоўку, пераплётнага дроту на гаршкі, і прывезці які ласунак — паўфунта ці фунт селядцоў. Гэтыя ж часы ён сядзеў найбольш дома. І ці то памагала такая перасцярога, ці прычынай была наша балотная аддаленасць ад свету, але вельмі доўга немцы да нас не зазіралі.

І вось аднаго разу яны прыйшлі. У нядзелю. У майскі ціхі і сонечны дзень.

Я спутаў каня ў ляску, што краем прытыкаўся да самага двара, і варочаўся дахаты. Але суняўся і насцярожыўся, стуліўшыся пры бярэзіне: каля варот стаялі двое, цераз плот глядзелі на двор. Адзін — кароткі і таўсматы, з вельмі шырокім задам, другі — танклявы, высокі, з доўгаю шыяю, выцягнутаю з каўняра. За плячыма ў іх карабіны, на поясе цесакі. Абодва ў касках, у шэра-зялёных мундзірах з распоркамі ззаду, у ботах з кароткімі шырокімі халявамі, моцных, усё роўна як жалезных.

Як бы пераканаўшыся, што ўсё так, як належыць, яны адчынілі вароты, зайшлі. Пасярод двара таксама пастаялі, агледзеліся. З аднаго боку варыванька, агародчык і сад, з другога — хлеў, дрывотнік, там каношацца куры, выграбаючы сабе ямкі ў зямлі і млява купаючыся ў іх з параспусканымі крыламі. Няйначай як куры найбольш і кінуліся ў вочы ім; яны нешта сказалі адзін аднаму і пайшлі к хаце: таўсматы наперадзе, танклявы ззаду.

Звычайна калі да нас хто прыходзіў, то гэта была навіна, і я скарэй бег у хату. На гэты раз ісці не хацелася. Але на ганак выйшла маці, пазвала:

— Ідзі, дзеткі, скарэй сюды!

На покуці, пад абразамі, мнучы ў жмені кончык не вельмі густое свае барады, панылы і ўвесь нейкі нясмелы, сядзеў бацька. На лаве, на канцы стала — яны, узяўшы карабіны між ног.

— Садзіся, сынку,— сказаў бацька,— можа што паможаш. Чаго яны хочуць?

Гэтыя два, устаўшы, прапусцілі мяне за стол. Зноў селі: танклявы, з доўгаю шыяю — каля мяне, таўсматы, кароткі — за ім, з краю.

Помач мая была ў тым, што на свае дванаццаць гадоў я ўжо лічыўся грамацеем: год вучыўся ў Слуцку, збольшага разбіраўся ў нямецкай мове. А прыйшлі яны апісваць жыўнасць.

Таўсматы дастаў аловак, паперы, пачаў пытацца. Танклявы трошачкі ведаў некалькі польскіх слоў, але вымаўляў іх вельмі па-нямецку. Ён памагаў мімікай, жэстамі, паўтараў па некалькі разоў адно і тое ж слова, рысаваў пальцам на стале.

— Колькі кароў? — папытаўся таўсматы і схіліўся над паперамі, каб запісаць.

Танклявы пачаў тлумачыць, і я пачуў, як ён разы два торкнуў сваім каленам маё. Я зірнуў уніз. Апусціўшы руку пад стол, ён паказваў мне адзін адстаўлены палец. Я збянтэжыўся, бо не ведаў, як мне думаць: вораг гэта ці не?

Гэтак жа ён паказваў мне, колькі трэба запісаць коней, свіней, авечак і нават курэй. Таўсматы пісаў, унурыўшыся ў паперы. Танклявы стараўся сядзець упрыцён да стала, каб не відно было, як за кожным разам ён падае мне знакі.

Пасля таўсматы сказаў, што ім трэба абедаць. Маці схадзіла к дрывотні; пакуль яна смажыла на прыпечку, таўсматы ў сваіх паперах паправіў курэй: на адну паменшыў. Абедалі немцы доўга і моўчкі, не спяшаючыся, са смакам.

Гэтак жа не спяшаючыся яны выйшлі з хаты, перайшлі зноў цераз двор — з карабінамі, з цесакамі, у глухіх шэрых касках і ў жалезных ботах з кароткімі халявамі — цвёрда, маўкліва, самавіта.

За варотамі, перад тым як павярнуць на дарожку направа, што вяла па ўзлеску на слуцкі гасцінец, таўсматы суняўся каля старой карабатай бярэзіны па сваёй невялікай патрэбе. І трэба ж было, каб на гэты час на суседнім хутары, што добра відзён быў адгэтуль за нізкім пералогам, з двара выйшла жанчына. Яна адышлася метраў за дваццаць у поле, нешта высыпала з каша. Мабыць, попел. І толькі яна павярнула назад, як таўсматы зняў карабін з пляча, пачаў мерыцца.

— Як ты думаеш, Ганс, я пападу ў тую жанчыну? — сказаў ён танкляваму.

У мяне сэрца зайшлося крывёю. Я ведаў, што гэта Пракопіха. Муж яе яшчэ нядаўна тут ваяваў, адступіў разам з бальшавікамі. У яе поўны двор белагаловых дзяцей, хлапчукоў. Я любіў яе за добрае сэрца, за адзіноту, за гордую высокую постаць, на якой так складна сядзелі і вышываны кгарсэт, і спадніца з густымі фальбонамі, нават за тое, што яна мякка і вельмі працяжна выгаворвае «ць» на канцы слова — жаньсь,— як бы гэтаму «цьсь» найдаўжэй хацелася пабегаць па яе белых вясёлых зубах. Як жа зрабіць, каб гэтай жанчыны не забілі?

У танклявым я ўжо не бачыў свайго ворага — я схапіў яго за рукаў. Ён зірнуў мне ў вочы — у яго вачах я таксама ўбачыў спалох.

— Карл! — раптам ляпнуў ён па плячы немца з шырокім задам.— Хлопчык хоча стрэліць у гэтую птушку,— паказаў ён на варону, што села вельмі блізка на раскірачыстай хвоі.— Дай яму стрэліць.

Карл злосна плюнуў і вылаяўся. Вядома, карабіна ён мне не даў. Але і сам пацешыцца ўжо не мог: Пракопіха схавалася ў двары. Тады ён стрэліў у варону. Тая трапятліва падскочыла над суком, крутнулася і, падмінаючы крылы, цяжка грымнулася на дол.

ТАІСА

1

Так я і не ведаю, кім ты даводзілася пану: наймічкаю ці сваячкаю, пакаёўкаю ці ахмістрыняю, ведаю толькі адно — у цябе было многа свавольства, якое вылучала цябе ад усіх. Мяне не дзівіла нічога: ні тое, што ты любіла

песні, ні тое, што магла гарцаваць на жарабцы, як сапраўдны казак, ні тое, што паўнюткую ноч магла кружыцца на ігрышчы і жартаваць з парабкамі. Дзівіла толькі тое, што ў нас з табой пачалося каханне.

Дай прыгадаць, як сталася гэта.

Мы касілі шырокі панскі луг за ракою. Неяк пад вечар выйшла ты з лесу, у белай сукенцы, і сказала:

— Добры вечар, харошыя хлопцы!

— Добры вечар нехарошай дзяўчыне,— сказаў я за ўсіх.

— Чаму ж нехарошай? — папыталася ты, і ўсмешка, з якой падышла ты да нас, паволі знікла. Я памятаю, што ў руцэ ў цябе была адна толькі дзіўна прыгожая кветка на тонкім доўгім сцябле. Ты махала гэтаю кветкаю, як стусінкаю, і за кожным узмахам у паветры аставаўся след пялёсткавай чырвані, нібы ты развейвала безліч танюткіх істужак. Папытаўшыся: «Чаму ж нехарошая?», ты перастала кружыць гэтаю кветкаю і можа знячэўку пераламала тонкае яе сцябло.

І ў той вечар, мабыць упершыню, мы асталіся з табою ўдваіх. Ужо даўно пайшлі дахаты касцы. Даўно апусцілася ноч, высыпаўшы на небе поўныя зоры, а нам добра было з табою стаяць каля той высокай кладкі, перакінутай цераз ручаіну за садам, па якой ты нават удзень баялася хадзіць.

— Памятай, што ты сёння пакрыўдзіў мяне,— гаварыла ты, так блізка стоячы каля мяне, што я чуў, як пахнуў твой волас.

— Я не пакрыўдзіў цябе,— казаў я,— бо сказаў праўду. Хіба мог я іначай сказаць, калі да гэтага часу ненавідзеў цябе?

— Чаму ж так, Пятрусь?

— Можа таму, што вельмі даўно кахаю.

— Навошта ж маўчаць было?

— Я і цяпер не рад, што пра гэта сказаў. Бо мы розныя людзі. Хіба ты калі-небудзь як след зразумееш мяне? Я ў гэта не веру. Ты навучылася жыць лёгка. Ты ўмееш кружыцца, сваволіць, не ведаць ніякіх турбот — як птушка. Мне можна кахаць цябе толькі здалёк. Ты ніколі не падзеліш са мною свайго лёсу.

— Ты вельмі не ведаеш мяне,— сказала ты ўзрушана. А пасля памаўчала і дадала: — І сама сябе я не ведаю. Я толькі ведаю, што мне добра з табою. Толькі чаму мы так доўга маўчалі адзін ад аднаго?

— Можа гэта было лепш для нас.

— Ты ўсё не верыш, што нам будзе добра? Хочаш, скажу нешта?

— Гавары.

— Думаеш, чаму я заўсёды і кружыла, і сваволіла, і ўсюды старалася, каб чулі і бачылі мяне? Усё я рабіла дзеля цябе. Мне трэба было, каб ты ўсюды чуў і бачыў мяне.

Ці ведаеш ты, як было добра мне тады? Як многа было тады шчасця? Ноч берагла цішыню, можа, каб паўней мы маглі адчуваць яго. Мабыць, тады спаў ужо ўвесь свет — я нікога не бачыў, нічога не ведаў, апроч цябе. Мне пахлі тады адны твае валасы. Я чуў тады цяпло адных тваіх губ. І ўсё ж такі мне было цяжка: як і раней, мне здавалася, што я павінен ненавідзець цябе.

Мы не маглі б тады перайсці цераз кладку: было цёмна, хоць ясна свяціліся зоры. Я ўзяў цябе на рукі — аж да гэтага часу я памятаю, як прыхінулася ты, абвіўшы маю шыю,— і я панёс цябе па вадзе. Больш ніколі так блізка я не чуў цябе. Мне хацелася, каб была не маленькая ручаінка, а каб цякла шырокая рэчка і каб я нёс цябе, не выпускаючы з рук.

— Як добра мне з табою,— сказала ты.— Мы больш ніколі, ніколі не будзем сварыцца. І ты больш ніколі не крыўдзь мяне.

І тады я папытаўся:

— А ты заўсёды будзеш са мною? Што б ні здарылася — ты ніколі не пакінеш мяне?

— Ніколі! — адказала ты.

Ці памятаеш ты гэтае слова?

2

Дай я крышку напомню. Да пана прыехаў яго далёкі сваяк: малады чалавек у форме паручніка польскай арміі, Гжэцкі. Ён прыехаў у добрым мундзіры, перапаясаным накрыж рамянямі, з бліскучаю аздобаю на казырку канфедэраткі, у брыджах і ў бліштчастых са шпорамі ботах. За ім цягалася па доле крывая тонкая шабля с парчовымі кутасамі на тронку. Малады пан паручнік пахнуў духамі, меў тонкі далікатны твар, умеў прыемна гаварыць і ўсміхацца, робячы павароты на зграбных нагах, і міла прасіць прабачэння, прыстаўляючы два пальцы рукі да бліскучага казырка канфедэраткі. Ён ездзіў на падгалі-

стай гнядой кабыліцы, замест гарапніка навесіўшы на руку стэк, абвіты палоскамі чырвонай лакіраванай скуры. Калі малады пан паручнік камандаваў салдатамі, то гэты стэк падымаў над галавою, што азначала: «увага».

Малады пан паручнік засцерагаў акупацыйныя парадкі свае дзяржавы і спакой старога пана, бо вельмі ж развучыліся паважаць дабрачыннасць няўдзячныя мужыкі. Сям-там яны пачалі нават пускаць чырвонага пеўня ў маёнтках. І вельмі дарэчы прыйшлося, што пан Гжэцкі быў не толькі сваяком, а яшчэ і паручнікам: лёгка спраўляючы абавязкі шаноўнага госця, ён выконваў і цяжкія абавязкі службы, што называлася карнай. Але маладому пану было сумна без паненак, і ты вельмі хутка кінулася яму на вочы.

Мне цяпер рэдка прыходзілася сустракацца з табою, бо ў мяне была таксама свая работа. Я цяпер жыў больш па лясах, хоць пра гэта ты і недагадвалася. Калі ты пыталася ў мяне, чаму я так часта надоўга прападаю, то я прыдумваў што-небудзь больш верагоднае: хадзіў да сваякоў ці ездзіў у горад. У гэтым таксама была доля праўды: я такі часта бываў і ў горадзе, і ў «сваякоў», бо так было трэба для мае работы. Ці варта было ведаць табе пра гэта? Я часта думаў над тым і чакаў, калі настане час, што можна будзе раскрыць табе ўсю маю душу. У той рабоце маёй не хапала цябе. Мне цяжка было ведаць, што не да канца я магу перад табою адкрыцца.

З тае ночы, як упершыню мы асталіся з табою ўдваіх, я палюбіў тую гарбатую кладку, высока перакінутую цераз ручаіну, за якой пачыналіся кусты арэшніку. Колькі там было самых непрыкметных сцежак, вядомых толькі нам з табою!

На гэты раз мне здалося, што ты вельмі доўга не ішла. Ужо месяц падняўся над лесам і, пераходзячы з хмаркі ў хмарку, разліваў сваё бледнае, ціхае святло. У вадзе паволі пагойдваўся маўклівы цень кладкі і адсвечвалася цёмная бясконцасць неба. Нарэшце паявілася ты, і я не мог дачакацца — так доўга ішла ты ў тым маўклівым месячным святле. На кладцы ты спынілася, паглядзела ўніз і сказала:

— Як страшна, калі падумаеш, што можаш упасці і будзеш ляцець і ляцець без канца, бо не відаць жа ніякага дна. Можа так і ў жыцці, Пятрусь? Кінешся, не ведаючы, што зусім блізка дно, і можаш разбіцца.

— Навошта ж кідацца?

— А я ўжо кінулася, Пятрусь. Хіба ты не чуеш гэтага? І так мне добра ляцець у бездань, што можа нават і разаб'юся. Ты беражы мяне.

Колькі аставалася яшчэ не выхаджаных намі сцежак? Колькі кустоў чакала, каб ад усяго свету ўкрыць наша шчасце! А можа — ці трэба было ўкрываць яго?

Не, у гэты вечар ты была вельмі трывожная.

— Пятрусь, мне цяжка робіцца, калі я цяпер вельмі падоўгу не бачу цябе. Можа я стала табе не патрэбна? Ты трошкі чужы стаў, Пятрусь. Апроч мяне ў цябе на душы ёсць яшчэ нешта другое.

Гэта была бадай што праўда. Я сам адчуваў, што не ўсе свае думы дзяліў з табою, насіў іх толькі ў сабе. Думаеш, гэта мне было лёгка? Я ж хацеў, каб ты ішла са мною поруч, а ты, часамі, стаяла ў асобку. Ты была вельмі патрэбна мне як сябар, як памочнік, як аднамыснік. І таму, што гэта было вельмі важна, я зноў гаварыў сабе: а ці да канца я магу верыць табе?

— Ці помніш, Таіса,— папытаўся я,— як ты сказала, што ніколі не пакінеш мяне, што б са мною ні сталася? Што ты заўсёды будзеш са мною?

— Помню,— сказала ты.

— Дык ты павінна ўсё прабачыць мне. Слухай жа...

Я расказаў табе вельмі не многа з таго, што займала мае думы. Самыя звычайныя рэчы: што ёсць раскоша і беднасць, сіла і бяспраўнасць і што ў той спрадвечнай барацьбе класаў ёсць адна найвышэйшая мара: здабыць шчасце для абяздоленага чалавека. Адабраць яго ў тых, хто карыстаецца ім, не маючы на яго права. І што ўдзельнічаць у такой барацьбе — гэта самы святы абавязак кожнага добрасумленнага чалавека.

— Дык гэта ж будзе кроў, Пятрусь. Гэта ж будзе многа, многа крыві,— сказала ты з жахам.

— А хіба ж дагэтуль не лілася яна? Шчасце багатых заўсёды здабывалася крывёю бедных.

— Як страшна.

— Хіба ж наша з табою шчасце можа быць, калі кругом будуць несправядлівасці і пакуты?

— Страшна, Пятрусь... Я цяпер буду больш баяцца за цябе. Ты цяпер ніколі не пакідай мяне надоўга,— сказала ты і задумалася.

Ты не захацела стаць поруч, ці можа не так я тады зразумеў цябе? Можа занадта асцярожна я гаварыў з табою? Ці занадта нячула прыслухаўся да цябе?

Месяц перабягаў з хмаркі ў хмарку, спяшаючыся абысці ўсю кароткую летнюю ноч. Пушыстыя валасы твае серабрыліся яго халодным святлом. Ты доўга сядзела задумаўшыся, і па прыжмураных вачах я бачыў, што ты глядзела ў самую сябе.

— Пятрусь,— сказала ты, недзе яшчэ ходзячы ў сваіх думах.

— Што, Таіса?

— Я хачу табе нешта сказаць.

— Я слухаю цябе, Таіса.

— То ты вельмі слухай.

— Гавары, Таіса.

— І не сварыся на мяне.

— Хіба ж ты ў чым вінавата?

— Да мяне пачаў чапляцца паручнік гэты... Гжэцкі.

— Ну? — папытаўся я трывожна.

— Каб ты ведаў, які ён нахабны... агідны...

Сэрца маё сціснулася. Толькі адно ўяўленне, што гэты вылашчаны нягоднік мог апаганіць цябе адным сваім поглядам... толькі ад аднаго ўяўлення мне захаладала ў грудзях. Я ўзяў тваю галаву ў свае рукі так, каб глядзець проста ў вочы, і сказаў:

— Ён не павінен нават дакрануцца да цябе, Таіса.

— Абнімі мяне мацней, Пятрусь,— сказала ты і ўся прыціснулася да мяне.— Мне страшна... Я буду толькі цябе, толькі цябе аднаго буду кахаць...

3

Давай успомню яшчэ.

Памятаеш? У садзе стаяла альтанка — круглая, з балясамі — у самым канцы бакавой дарожкі. Яна стаяла ў самай гушчыні бэзу і шырокіх старых ліп, і там заўсёды было многа глыбокага ценю. Часамі на якую хвілінку асцярожна я забягаў туды, каб пабачыць цябе, калі ты не магла прыйсці на нашу высока перакінутую кладку. Я доўга не бачыў цябе і, як толькі пачало вечарэць, заспяшаўся да тае альтанкі. Мне добра вядомы былі ўсе патаемныя сцежкі да яе, бо гэта былі нашы з табою сцежкі.

Я не дайшоў да альтанкі: там пачуўся твой голас.

«Мабыць, яна чакае мяне,— падумаў я,— але ёй нехта перашкаджае. Мне прыйдзецца трошкі забавіцца».

— Таіса,— пачуў я другі голас.

— Што, пане Гжэцкі?

Ты, мабыць, нечым была занята ці можа здавалася няўважлівай, бо голас зноў паўтарыў тваё імя:

— Панна Таіса.

— Я ўжо чула. А што?

— Чаму вы такая прыгожая?

— Каму гэта шкодзіць?

— Мне.

— Чым жа?

— Бо я люблю ўсё прыгожае.

«Навошта яна гаворыць з ім? Няхай бы хутчэй сказала што-небудзь рэзкае, каб ён ведаў, што не мае права нават блізка стаяць каля яе»,— падумаў я.

— Панна Таіса не чуе, што я кахаю яе?

— Не надта прыемна.

— Каму?

— Вам.

— Толькі? А можа і яшчэ каму?

— Быць можа.

— Разумею. Але ж гэта не варта жаднай увагі.

— Чаму ж так?

— Не думаю, каб панна Таіса сур'ёзна думала пра нейкага... хама.

Ты нічога не адказала. Мне было крыўдна за цябе, ты не чула, як калацілася маё сэрца. «Чаму ты не можаш быць гордай?» — хацелася крыкнуць табе. Я яшчэ спадзяваўся, што не страціў цябе, што ты яшчэ недзе са мною.

— Прашу прабачэння,— сказаў Гжэцкі, і мне ўявілася, што ён узяў двума пальцамі пад казырок.— Цяпер я буду верыць і таму, што гавораць людзі. Значыць, папраўдзе панна Таіса кахала...

— Глупства,— сказала ты вельмі лёгка.— Не ўсякія жарты можна называць каханнем.

Да гэтага часу я не магу дараваць сабе таго, што зрабіў тады. Мне трэба было адразу выкінуць цябе з сэрца свайго, як атруту, і знікнуць, нават не даўшы паглядзець на сябе. Я ж выйшаў на чыстую дарожку проста перад вашай альтанкай і сказаў, можа занадта спакойна:

— Дзякую, панна Таіса.

Вы абое ўсхапіліся, і ў вачах тваіх я ўбачыў жах. Мабыць, па шляхетнай прывычцы рука пана Гжэцкага рванулася да пояса, дзе звычайна носяць далікатную зброю, але ты ўспела крыкнуць: «Не трэба!»

— Прэч, бальшавіцкая поскудзь! — грэбліва сказаў пан Гжэцкі і ўзяў цябе пад руку.

Вы пайшлі па дарожцы ў пакоі. Крывая тонкая паручнікава шабля валачылася па зямлі. Можа табе было брыдка ці страшна — ты ні разу не азірнулася, толькі плечы твае, як у вялікі холад, былі высока падняты і сціснуты.

Я праклінаў цябе, Таіса, і праклінаў наша каханне. Ты не ведаеш, што тварылася ў маім сэрцы.

4

Я мог застрэліць цябе, мог забіць пана Гжэцкага, мне было вельмі зручна зрабіць гэта, але — я не дазволіў сабе.

Была нядзеля. Стаяла восень, толькі пачыналі жаўцець і ападаць лісты. У такую пору нягорача свеціць сонца і далёка відаць спакойная сінь далёкіх нябёс. Добра марыць у такія часіны! Я бясконца хадзіў са стрэльбаю, і на ўсіх сцежках нябачна была са мною ты. Я то развітваўся з табою, то зваў вярнуцца. Колькі ў сэрцы маім у той дзень было пяшчоты і гора! Я ўсё кахаў цябе, Таіса, і мне цяжка было адчуваць, што назаўсёды страціў цябе. Але ў гэта не хацелася верыць. І тады мне здавалася, што ты ходзіш разам са мною і шэпчаш:

— Божа мой, Пятрусь, як доўга мы не бачыліся з табою. Ты прабач мне за ўсё, я ніколі не забывалася пра цябе, а тое, што было,— гэта толькі табе здалося.

Тады перада мною ўставалі, як у вялікі холад высока паднятыя і сціснутыя плечы, але ты пераймала мае ўспаміны і казала тое, чаго чакала маё ўяўленне:

— Ты ж мне не гаворыш, што робіш недзе там без мяне. А хіба ж я не магу зрабіць без цябе таксама нечага добрага? Можа я выпытвала гэтага Гжэцкага. Не верыш? Хочаш, я заб'ю яго? А калі трэба для твае справы, то Гжэцкі будзе заўтра ў цябе. Можа я дзеля цябе ўсё гэта рабіла.

Я цалаваў цябе ў губы, цалаваў твае вочы, лоб, валасы: нарэшце ты стала мне самай дарагой і патрэбнай.

І вось у гэты час па дарожцы, што вывівалася паміж высокіх хвой, па дарожцы, усыпанай шышкамі і пераплеценай крутымі карэннямі, на дзвюх кабыліцах прагарцавалі вы з панам Гжэцкім. У вас за плячыма былі стрэльбы, вы рабілі невялічкую пагулянку, далікатна называючы яе паляваннем. Чароўная здань расплылася, мары спалохана зніклі, асталася горкая ява праўды. Я ўскінуў стрэльбу. Я мог паставіць кропку адразу на ўсіх пачуццях — нянавісці, крыўды, болю,— але ўстрымаўся.

«Гэта занадта многа ёй, занадта многа»,— сказаў я сам сабе і апусціў стрэльбу.

Можа і дрэнна, што так я зрабіў тады, але не раскайваюся: няхай ты сама цяпер паглядзіш на сябе, на тыя далёкія нашы дарогі і можа жахнешся ад болю сумлення. І калі асталося ў цябе тое сумленне, то ты можа паплачаш добрымі слязьмі дакору і роспачы...

5

Чакай, я прыпомніў не ўсё.

Мы вельмі доўга не бачыліся з табою. Я нават пачынаў забываць пра цябе. Ты памятаеш, як вечарамі пачалі далятаць да нас далёкія стрэлы гармат? Гэта гарэў усход полымем найвялікшай чалавечай праўды. Пан Гжэцкі вельмі адчуваў гэта: мы пачалі змагацца з ім ужо настойліва і адкрыта. Мы выступалі супроць яго цяпер як вялікая народная сіла. Пану Гжэцкаму прыходзілася займацца не лёгкімі справамі аховы парадку, а сапраўднай вайной.

Нам трошкі не пашанцавала. Мы не ведалі, што пан Гжэцкі атрымаў свежае падмацаванне, і напалі на яго ў той час, калі ён абучаў новых жаўнераў, як трэба наводзіць парадак. Памятаеш цётку Палуту, што жыла ў Замосці на самым канцы сяла? Яна валялася ў нагах пана Гжэцкага, просячы, каб жаўнеры не забіралі апошняга парсючка. Смешна? Ці жахліва? Цётка Палута поўзала каля ног і прасіла літасці, бо ў яе была поўная хата дзяцей. Калі застрэлілі парсючка, цётка Палута крыкнула:

— Драпежнікі! Крывапіўцы!

Тады жаўнер стрэліў цётцы Палуце ў спіну. Яна не паднялася больш з калень, а пан Гжэцкі сказаў: «Добра!» — і пацёр рука аб руку ў пальчатках, як бы сціраючы з іх бруд.

Мы трошкі спазніліся, каб не даць загінуць цётцы Палуце. Схватка была вельмі жорсткая і расплата дарагая. Мне тады не пашанцавала: я папаўся ў палон. Не, я не здаўся б, каб не тыя недарэчныя раны. Ты ж іх памятаеш...

6

Мяне прывялі ў пастарунак. Допыт рабіў сам пан Гжэцкі. Ён быў далікатны: нават цяпер не скінуў сваіх тонкіх пальчатак.

— Якое неверагоднае спалучэнне,— сказаў пан Гжэцкі, выгінаючы ў руках стэк, як стусінку: — палюбоўнік і паўстанец. Але мы не будзем гаварыць на лірычныя тэмы. А лес вас цяпер не схавае. Я не ўмею быць далікатным у справах гонару — гэта вам няхай будзе вядома адразу...

Што яму трэба было? Каб я назваў яму сябе? Ён мяне ведаў і так. Каб сказаў, хто мае сябры і хто аднамыснікі? Хто мой начальнік і як яго залучыць? Колькі нас, дзе нашы сілы і якія нашы планы? Наўрад ці гэта трэба было яму. Бо ён добра ведаў, што мы — гэта цэлы народ і нас нават цяжка пералічыць. Яму трэба было, каб я скарыўся. Каб я валяўся каля яго ног і прасіў літасці. Гэта было б яму перамогай.

Дарэмна стараўся пан паручнік, прызваўшы на дапамогу нават жаўнераў, калі ўжо не памагаў да самай пальчаткі акрываўлены стэк. Я плюнуў у твар гэтаму напышліваму вылюдку, сказаўшы адзінае слова «нягоднік!».

Ён не пачуў майго стогну, калі паласавалі і калечылі цела, бо нават стогн быў бы яму перамогай.

Чаго ты прыйшла тады? Ці можа гэта мне толькі здалося ў непрытомнасці? Ні жаўнерам, ні пану Гжэцкаму я быў больш не патрэбен: я валяўся ў сваёй крыві, прагна шукаючы запечанымі губамі хоць кроплі вады. Можа ты прыйшла паглядзець на гэтую кроў? Ці можа прыйшла пашкадаваць, ці сказаць, што кахаеш? Ты ж некалі лічыла ўдары майго сэрца і казала, што б'ецца яно дзеля цябе. Не, мне не прытрызнілася: я чуў, як за дзвярыма твой голас настойліва паўтараў слова «пусціце!».

— Нельга,— сказаў голас пана Гжэцкага,— такія рэчы не для паненак.

— Нашто вы забілі яго! — крычала ты.— Пусціце! Я павінна бачыць сама!

Я чуў, як ты плакала.

Можа гэта быў сон. Я не чуў цяпер ні болю, ні крыўды. Была млявая стома. Я хацеў адпачыць. Як добра, што да чалавека прыходзяць харошыя, спакойныя сны...

7

...Шырокая, залітая сонцам палянка. Восень; сцелецца і слаба паблісквае павуцінне, чапляючыся за тонкія, агаленыя сцяблінкі высокіх траў. Далёка разлягаецца неўмірučы блакіт нябёс. Недзе на краі зямлі стаіць лес, я ўгадваю яго толькі па цёмным крайку гарызонта. Але раптам ён наўкруга абступіў мяне; я чую, як шумяць яго хвоі, як

падаюць шышкі, і ногі нячутна ступаюць па мяккай слізгоце ігліцы. Вельмі слізка: я ўжо не іду, а плыву. Ну вядома, як я мог не заўважыць: гэта ж вялікая рэчка! Лес адшумеў, расступіўся: перада мною бясконцы ясны прастор. Рэчка падымаецца над берагамі, я высока стаю над вадою і плыву, і плыву, толькі недзе ўнізе мінаюцца кусты чырвоных ракіт. Наперадзе кладка, яна не дастае канцамі да берагоў; ты стаіш на ёй і не можаш перайсці. Я бяру цябе на рукі.

— Дзе ж ты быў? Я так доўга чакала цябе,— кажаш ты, абнімаючы мяне.— Я ўсюды шукала цябе. Табе было цяжка? Я б магла памагчы табе...

Шчакі кранаюцца твае валасы, рукі гладзяць плечы, абмацваюць голаў.

— Пятрусь... Петрусёк... Ты можаш сказаць мне хоць слова? Прачніся...

Я прачнуўся ад болю. Гэта была ты, Таіса. У цемнаце я знайшоў тваю руку, пазнаў твой голас, пазнаў цябе ўсю. Ты перавязвала раны, змывала запечаную кроў, выцірала сваёю тонкаю хустачкаю.

— Чаго ты прыйшла сюды? — папытаўся я ў цемру.

— Я не пайду адсюль. Я цябе не пакіну. Родны, дарагі мой, устань. Падыміся, хадзем...— шаптала ты над маімі губамі.

— Чаго ты хочаш?

— Хадзем! Я пайду з табою, я памагу табе... Трэба вельмі спяшацца. Я не пакіну цябе, Пятрусь...

— Ідзі! — мог я толькі сказаць табе.

— Пятрусь, дарагі, я прыйшла па цябе... Няхай ты больш не будзеш кахаць мяне, але ты павінен жыць. Хутчэй... Хутчэй, Петрусёк...

Ты плакала. Твае слёзы мачылі мой твар і пякліся, як іскры.

— Я кахаю цябе, Пятрусь, дарагі мой. Хіба ты не бачыш, што даражэй за цябе больш нікога няма, што мне больш ніхто не патрэбен...

Гэта быў самы вялікі боль, самы страшны. Я адштурхнуў цябе...

8

Цябе не было, калі я прачнуўся. Была густая, цягучая, чорная ноч. Ліпкая, як мае губы, запечаныя ў смазе.

На падлозе, у крыві, рука абмацала маленькі, пакінуты табою як апошні паратунак мне браўнінг...

СЛЕД ГУМОВЫХ ШЫН

Гэта быў, можна сказаць, ужо край горада, і называўся ён Калоніяй. Крута спусціўшыся з узгорка, шырокая гарадская вуліца нечакана канчалася і разбівалася на вулкі і вулачкі. Пакручаста яны разбягаліся то ўлева, то ўправа, ішлі то ўдоўж, то ўпоперак так, што цяжка было разабрацца. Аднак жа да аднаго будынка, нізкага, шырокага і просторнага, як гамарня, што рассунуў сабе даволі ладнае месца сярод гэтай мітусні, вёў драўляны тратуар, асланы на тоўстых лежаках. Ён таксама выкручваўся то ўлева, то ўправа, але ясна паказваў, што будынак гэты стаіць тут як бы выпадкова, што ён — гарадскі. Нават двор яго, таксама шырокі і просторны, быў аслонены маладымі таполямі і абсаджаны кустамі бэзу.

Гэта была наша гімназія. Лепш кажучы, не наша, бо мы былі ў падсуседзях. Мы, рэалісты, не мелі свайго будынка, дый наогул мы не ведалі, што мы за школа. То былі часы першых гадоў рэвалюцыі, калі Савецкую ўладу ў Беларусі душылі перш салдаты кайзера, а тады легіянеры Пілсудскага, і пры кожнай новай уладзе школы пераасоўваліся, мяняліся назвы, пераасоўваліся і вучні. Не ведаю, якія школы на гэты раз былі зліты і як дакладна мы называліся, але займацца нам прыйшлося на Калоніі. Цяпер тут асталявалася новая навучальная ўстанова — Слуцкая беларуская гімназія. Мы ад яе залежалі не толькі як падсуседзі, а яшчэ і таму, што дырэктар яе меў сілу і над намі. Ён вывешваў у калідоры загады, якім мы павінны былі падпарадкавацца, мог заходзіць у нашы класы і ўвесь урок праседзець на задняй парце, правяраючы не то нас, не то нашых настаўнікаў. Ён быў членам гарадской управы і, мабыць, лічыў, што яго права хапае на абедзве школы і што свайго дырэктара нам не трэба.

Аднаго разу не прыйшла выкладчыца нямецкай мовы. Мы былі рады, што можна будзе ўвесь урок прашлындаць па калідорах, падслухваючы, што робіцца ў другіх класах, або збегаць на рэчку, якая працякала тут жа за Калоніяй. Але празвінеў званок, і ў клас увайшоў дырэктар.

— Настаўнікі вас не крыўдзяць? — папытаўся ён.— Крыўдзіць не павінны. Калі што, то вы скажыце мне, я крыўдзіць не дазволю. Але вучыцца вы павінны добра, бо нам патрэбны маладыя здольныя сілы. І з мужыкоў могуць выйсці вучоныя, інтэлігентныя людзі.

Мы глядзелі на яго як бы ўпершыню, бо толькі цяпер маглі як след разгледзець. Ён увесь зіхацеў дасціпнасцю: невялікая клінаватая бародка згладжвала крыху рэзкія рысы твару; цёмна-карычневы гарнітур ляжаў шчыгульна і ладна; бялюткая манішка з гутаперчавым каўнерыкам і такія ж бялюткія манжэты, на якіх з-пад рукава на нейкае малюсенькае імгненне паблісквала зялёная іскарка спонкі, рабілі яго прывазным, нетутэйшым. Увесь ён быў акуратны і начышчаны. Нават гладка прычэсаныя валасы былі начышчаны нейкім пахучым, недасяжным бляскам. Няўжо вось так павінны будзем выглядаць і мы, калі станем вучонымі, інтэлігентнымі людзьмі, як на тое спадзяецца дырэктар? Не, гэта незбытэчныя спадзяванні.

— А цяпер трошкі пазаймаемся вашым прадметам. Як бачу, вы нямецкую мову не надта любіце. На чым мы спыніліся? — папытаўся ён так, як бы скрозь быў нашым настаўнікам, і пачаў іменна з таго параграфа, на якім мы спыніліся перад гэтым.

Настаўніца па нямецкай мове была старая, часта нядужала, мы нават шкадавалі яе. Не прыйшла яна і назаўтра. Мы чакалі, што зноў яе заменіць дырэктар, і былі рады, калі ў клас увайшла новая настаўніца, маладая, вясёлая і прыгожая. Яна нам адразу ўсім спадабалася. Павіталася не як з вучнямі, а як з сваімі сябрамі ці аднамыснікамі, ласкава ўсміхнуўшыся і акінуўшы ўсіх трошачкі велікаватымі круглымі вачыма. У яе былі светлыя пышныя валасы, нейкія вельмі цёплыя. І мілая манера здзіўляцца з усяго самага звычайнага: «Ой, як вас многа, і ўсе такія харошыя!» Ды ўсё ў ёй было мілае, нават сукенка, тонка-галубовая, з лёгкімі брыжыкамі, якія так нясмела прыкрывалі трывожныя грудзі. Нават пальцы з вузкімі ружовымі пазногцікамі. Цяпер мы ведалі, што нямецкую мову будзем любіць. Нават двойкі будзем любіць ад такой настаўніцы.

— Дзень добры, хлопчыкі,— сказала яна чыста па-беларуску, уся свецячыся маладым хараством.— Будзем знаёмы: завіце мяне панна Кася. Я буду выкладаць у вас польскую мову.

Гэтага мы не спадзявалі, і радасць наша адразу згасла. Мы пачулі трывогу, можа не зусім ясную, але вельмі вострую: значыць, мы належым цяпер да другой дзяржавы. І панна Кася адразу стала не тая: яна не наша аднамысніца, а гаспадыня.

Прайшло тыдні два, панна Кася акуратна прыходзіла на нашы заняткі, кожны раз вясёлая, прыгожая і простая.

Калі мы былі перш збаяліся яе, то гэта скора прайшло. Цяпер мы ні ў чым не вінавацілі яе, а нават спачувалі: не кожнаму дадзена рабіць толькі тое, што хочаш і любіш. Панна Кася нам зычыць дабра, гэта мы бачылі па ўсім. Яна на нас не крычыць, не сварыцца, не ставіць сябе высока ці ганарыста. Можа падысці да парты і пажартаваць, пакудлаціўшы каго за чуб. Можа пахваліць, нават пагладзіўшы па валасах.

— Добжэ. Бардзо добжэ,— скажа яна і тут жа дадасць па-беларуску: — Вы ўсе, хлопчыкі, разумныя, і мы скора навучымся не толькі пісаць, а нават размаўляць.

Вучыліся мы і папраўдзе нядрэнна. Трошкі цяжка было з граматыкай: мы не заўсёды разумелі, дзе трэба было пісаць «о» простае, а дзе краскаванае, каб яно чыталася, як «у»; дзе «е» і «а» звычайнае, а дзе з крывулінкаю, каб чутно было ў ім «н». Дзівіліся яшчэ, што «ш» і «ч» трэба пісаць праз дзве літары кожную. Але чыталі і разумелі мы вельмі лёгка. У гэтым не было ніякага дзіва, бо зрэдку падабенства на польскую мову мы чулі. Мясцовая шляхта, маючы каталіцкае веравызнанне, на фэстах ці на кірмашах лічыла за найбольшы гонар пры сустрэчах сказаць адзін аднаму хоць некалькі слоў па-польску. «Як се маш, пане?» — «Да ніц собе, хвала богу. А пан, слышалэм, цурку выда́е замуж?» — «А так, проша пана, хлопец папаўся ладны, то нех собе выходзі».— «Чым прэндзай, тым лепей».

Гэтыя невялікія пазнанні і выручалі нас. Вельмі скора мы налаўчыліся не толькі перакладаць, а нават і самі скласці падобную фразу. Панна Кася была давольна. Яна прыпісвала гэта нашай стараннасці, не ведаючы, што мы нават і не думалі старацца. На ўроках яе мы займаліся чым папала: перапісваліся, шапталіся, робячы выгляд, што памагаем адзін аднаму яшчэ больш зразумець тое, чаму навучае нас панна Кася. Урокі яе праходзілі весела, з жартамі. Кожны раз яна гаварыла нам «да пабачэння» і скоранька выходзіла, дробна грукаючы абцасікамі, а мы яшчэ доўга глядзелі ёй услед.

Мы такі любілі панну Касю, бо яе прадмет нам не замінаў. Але аднойчы ўсё гэта адразу як згінула. Ходзячы каля дошкі, панна Кася дыктавала нам практыкаванне. Час ад часу яна спынялася каля стала, каб зазірнуць у кніжку. Словы, на якіх мы маглі зрабіць памылку, яна падкрэслівала тонам або працяжным вымаўленнем. Яна як бы памагала нам у нейкай тайнай змове, як бы папраўдзе была нашым аднамыснікам.

— Польска — наша ойчызна. Юзэф Пілсудскі — наш начэльнік паньства,— прадыктавала панна Кася сказ і пайшла паміж парт, паўтараючы і падкрэсліваючы асобныя словы. І здзіўлена спынілася каля Міхаля Пісарыка.— А чаму ж ты, хлопчык, не пішаш?

Міхаль Пісарык быў невысокі, таўсматы хлопец з Грэска. Ён быў аднарукі. Правую адарвала яшчэ недзе ў малыя гады прывадам малатарні. Пісаў ён левай рукой вельмі лёгка і спрытна, куды спарней за нас. Але нас дзівіла не гэта, а тое, што почырк у яго быў куды харашэй за самыя лепшыя ўзоры ў прапісі Гарбача. І націскі, калі пяро апускаецца ўніз, і танюсенькія лініі ўгору, і завітушкі ў вялікіх літарах, размашыстыя і смелыя, і роўны, акуратны радок. Такім почыркам пісаліся толькі царскія ўказы. Мы жартавалі, што почырк у яго ідзе ад самога прозвішча і што калі б ён радзіўся на паўвека назад, то быў бы самы знакаміты пісар на ўсю імперыю.

— Чаму ж ты не пішаш, мой хлопчык? Можа ты хворы? — перапытала панна Кася.

Міхаль Пісарык устаў. Сшытак, разгорнуты перад ім на парце, быў чысты. Чубок жоўтай чупрыны спаўзаў на лоб. Ён глядзеў на панну Касю вельмі даверліва.

— Нашто вы гэтаму нас вучыце, панна Кася? Майго ж татку застрэлілі легіянеры.

Панна Кася пачырванела і на хвілінку злякалася. І тут жа твар яе стаў суровы і злосны. Скрывіўшыся ў гэтай злосці, яна схапіла Пісарыка за вуха і пачала круціць.

— Нягоднік! Хам! — крычала панна Кася.— Усе вы тут такія ваўчаняты! Вас трэба ўсіх перадушыць!

Правае бязрукае плячо ў Пісарыка паднялося высока. Ён выбавіў гэтым плячом вуха з пальцаў панны Касі. Тады яна пачала яго біць па шчаках — у адну, у другую, з размаху, з асалодаю, з пошчакам на ўвесь клас, крычучы і задыхаючыся і адразу стаўшы старой і страшнай, як вядзьмарка:

— Перадушыць! Перавешаць усіх, бандытаў, бальшавіцкіх вырадкаў!

Панна Кася выскачыла з класа, дробна застукаўшы абцасікамі і моцна бразнуўшы дзвярыма. Ах, як нам было шкода чагосьці, як нечакана абарвалася і знікла назаўсёды нешта вельмі дарагое — мабыць, гэта мы развітваліся з даверлівым і бесклапотным дзяцінствам, бо ўведалі, што жыццё куды складаней, як здаецца на першае вока.

Не паспелі мы разабрацца ў гэтай нашай журбе, як у дзвярах паказаўся дырэктар. Мы ўспомнілі, як ён абяцаў нікому не даваць нас у крыўду, і акрыялі. Але ён гнеўна асадзіў нас, назваўшы басурманамі і бунтаўшчыкамі. Мы ніхто яму не сказалі ні слова, калі ён дапякаў і гразіўся ўсіх паразганяць. Нас — няхай разганяў бы, мы нават хацелі б гэтага, але каб толькі не чапаў Міхаля Пісарыка. Ён цяпер быў нам — як наша сумленне.

Выходзілі мы з гімназіі гуртам, нам не хацелася пакідаць Пісарыка аднаго. На высыпанай жвірам дарожцы, што загінала з вуліцы да ганка, стаяў дырэктараў фаэтон. Фурман за лейцы стрымліваў сытую жарабіцу.

Да фаэтона прайшла панна Кася з дырэктарам. Яна ішла скоранька, як бы ўцякаючы ад яго. Але ён паспеў паднагнаць, каб падаць руку, калі панна Кася ступіла на падножку. На нейкае малюсенькае імгненне з-пад рукава ў яго бліснула зялёная іскарка спонкі.

— Божа мой, якія яны хамы. Навошта ты вёз мяне сюды, у гэтае балота, лепш бы я была ў Вільні,— гаварыла панна Кася, і мы цяпер не бачылі на твары тае прыгажосці, якой яшчэ нядаўна любаваліся.

— Няхай панна Кася не зважае, на тое яны мужыкі.

— Ты ў мяне сёння будзеш?

— А як жа, мая каханая панна. Адразу пасля ўправы, я там забаўлюся не доўга.

Дырэктар загадаў фурману, каб вёз паволі, і неўзабаве вярнуўся, бо ён яшчэ на якую часіну тут астаецца. Стаенная кабыліца нецярпліва рванула з месца, і на жвіры астаўся след тонкіх гумовых шын.

ДНО ДУШЫ

У Слуцку я кватараваў на ціхай Надрэчнай вуліцы ў пані Стрыжэўскай. Штонядзелі да мяне прыязджаў бацька. Мой тапчан стаяў на кухні. Пані Стрыжэўская выходзіла сюды, бацька кланяўся ёй і пытаўся пра мяне: ці добра вучуся.

— Ды скардзіцца не магу, увесь час сядзіць, чытае.

— То і дзякуй богу. А гэта вам...

Не разумеў я, чаму лычка кілбасы бацька аддае гаспадыні. Ці яму дома не жадны або ці я сам не з'еў бы яго?

— За турботы, панечка,— тлумачыў бацька. І калі за-

бірала гаспадыня тую кілбасу, бацька ўздыхаў, і я зноў не разумеў: ад радасці гэта ці ад смутку.

— Дзякую, Аляксейка, а за сына вы не бядуйце: я за ім пагляджу.

Таго, што мне прывозілі з харчоў, павінна было хапіць на тыдзень. Але да конаўкі масла я баяўся дакрануцца; так, хіба толькі скраечку тоненька паскрабу ножыкам, каб пакаштаваць. Вельмі ж добра пахла яно — домам, сонцам, палямі ды лугамі з кветкамі, подыхам вятроў, матчынаю ласкаю. Гэтая конаўка масла была мне святым скарбам, я яе бярог.

На базары мне добра былі вядомы сцежкі да будак, дзе на століках, сярод рознай старызны і хламу, ляжалі і перакупленыя ў некага кнігі. Я часта прастойваў каля іх то здалёку, то зблізку. Часамі асмельваўся ўзяць якую ў рукі і пагартаць. Не, мне не ўсе падабаліся. Былі там спеўнікі з удалым Хаз-Булатам, соннікі, аракулі, пісьмоўнікі — кожная з іх на свой лад дакляравала пакупніку разгадку тайнаў і шчасце. Але рука мая цягнулася да вельмі непрыкметных, надрукаваных найбольш на шэрай ці жоўтай паперы, з маркамі выдавецтваў Клецкіна, Марціна Кухты ці суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца». Бо сярод іх маглі быць кніжкі Якуба Коласа і Янкі Купалы.

І пасля таго, як масла з конаўкі было многа разоў пераважана і перакаштавана будачнікам, я ішоў на кватэру самы шчаслівы. Няважна, што цэлы тыдзень я буду есці нішчымны крупнік і бульбу, гэта няўзнак, затое колькі наслухаюся я чужое душы, колькі дум і пачуццяў абудзяць дарагія радкі.

Пані Стрыжэўская не хлусіла бацьку, кажучы, што на маё гультайства не мела права скардзіцца: я чытаў. А што чытаў — які клопат да таго быў пані Стрыжэўскай. А от куды горш, калі дома, на летніх ці зімовых канікулах, замест таго каб раненька легчы і раненька ўстаць, я сядзеў за поўнач у сваім кутку, прыкрыўшы ад усіх газоўку. Бацька раз прачнецца, другі і ўжо не можа вытрываць, каб не крыкнуць:

— Лажыся спаць, кажу! Заўтра не дабудзішся цябе!

Аднаго разу ў нядзелю, калі чытаць можна было не хаваючыся, ён сказаў:

— То хоць бы ты пахваліўся, пра што там чытаеш увесь час.

Я не ведаў, ці можа гэта быць, каб стары чалавек ды

знайшоў уцеху ў вершах. Але тут жа перагарнуў назад старонкі.

Што я мужык, усе тут знаюць,
І, як ёсць гэты свет вялік,
З мяне смяюцца, пагарджаюць,
Бо я мужык, дурны мужык.

— Чакай, чакай,— перапыніў бацька.— Вось так і напісана, як чытаеш?
— Так і напісана.
— От так, як мы гаворым?
— Так, як гаворым.
— А божа мой! То што ж гэта за кніжка?
— Янка Купала.
— Хм! Дык жа здорава!

Чытаць, пісаць я не умею,
Не ходзіць гладка мой язык,
Бо толькі вечна ару, сею,—
Бо я мужык, дурны мужык.

— Скажы ты, да чаго складна! — паддаў ахвоты мне бацька.— Ну, давай далей.

Я чытаў і быў рад, што не толькі маю душу кранаюць гэтыя радкі, што ў гэтым мужыку бацька бачыць самога сябе, а значыць будзе і пратэставаць і бунтаваць разам з Янкам Купалам.

Галеюць дзеці век без хлеба,
Падзёрты жончын чаравік,
Не маю грошы на патрэбу,—
Бо я мужык, дурны мужык.

Бацька ўздыхнуў і зацісвуў у жменю вусы. З найбольшаю сілаю я прачытаў апошнія радкі, дзе Янка Купала горда заяўляе права мужыка быць чалавекам.

— Ты, сынку, добрыя кніжкі чытаеш,— сказаў пасля одуму бацька.— Правільна пішацца ў іх.

Ці трэба гаварыць, што тут жа я прачытаў усю кніжку адным духам. Чытаў і бачыў, як бацька слухае, то ўздыхаючы, то падпіраючы галаву рукою, то недзе ціха ходзячы ў сваіх думах. Асабліва гнеўна насупіліся ў яго бровы, калі я чытаў «А хто там ідзе?», дзе, здаецца, нават фізічна чуеш, як рушыць грозным паходам людскі натоўп, несучы напаказ усяму свету сваю крыўду.

А чаго ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім? —

пытаўся я словамі Янкі Купалы, і нехта нябачны і непад-

купна справядлівы адказваў словамі такой святой і нечакана простай праўды, што аж ледзянела сэрца:

— Людзьмі звацца.

Бацька доўга маўчыць, і я знаю, што ён сам вось цяпер ідзе ў гэтым адвечным людскім паходзе і не можа апамятацца. Падумаўшы трохі, ён кажа:

— Ой, якая гэта праўда, дзеткі.

У хаце стаіць цішыня. На прымурку дрэмле кот, пахне свежападмеценым долам, за акном у агародчыку відно, як у венчык вяргіні торкаецца ацяжэлая пчала.

Бацька сядзіць задумаўшыся, доўга, і я не чапаю гэтых дум, бо не часта даецца, каб чужое слова кранулася самага дна душы.

НАСТАЎНІК

У маленстве маім ёсць адна вельмі яркая дата. Недзе ў пачатку дваццатых гадоў у Слуцку, на Манастыршчыне, на беразе рэчкі я суняўся каля чалавека, які паволі адзяваўся, толькі што пакупаўшыся. Я стаяў і глядзеў на чалавека аж да таго часу, пакуль ён не пайшоў — яшчэ малады, з невялікімі вусікамі, здаецца, у саламяным капелюшы, з чорным пакамечаным партфелем.

Пайшоў чалавек, а я не ведаў, як нарадавацца, што ўбачыў яго,— гэта быў Якуб Колас.

Да таго часу я ведаў Якуба Коласа толькі па кнігах, якія купляў як мог і дзе мог. Гэта былі часамі вельмі ўжо зачытаныя кнігі, з паабдзіранымі вокладкамі, з паразрыванымі лістамі; я перш за ўсё склейваў іх, папраўляў, як нешта самае дарагое. Звычайна ў іх пісалася пра беднага гаротнага чалавека і пра пошукі шчасця. Я чытаў і перачытваў гэтыя кніжкі па некалькі разоў — без канца. Які харошы, шырокі, прывабны і поўны хвалявання быў свет ад тых кніжак — простых, напісаных моваю, самаю блізкаю сэрцу! Як уздымалі, трывожылі душу і некуды звалі гэтыя кніжкі! Як хацелася любіць чалавека і нешта рабіць дзеля яго! І можа ад тых дарагіх старонак я сам злажыўся пісаць...

За светлыя часіны ў маладосці ад вашых кніжак, за чалавечае фармаванне душы вашым словам — шчыры, сардэчны дзякуй вам, дарагі і любы настаўнік, дзядзька Якуб.

ПАРОГ

(працяг)

15

Калі набіралася некалькі святочных дзён і не было куды дзявацца ад безрабоцця, бацька, пасядзеўшы які час на покуці, пытаўся:

— Мар'я, дзе ключы?

У чыстай палавіне стаяла скрыня з пукатым векам, пафарбаваная жоўта-зялёнаю фарбаю, акаваная палоскамі цёмнай бляхі. З сярэдзіны скрыня была выклеена квяцістымі шпалерамі. У ёй ляжала матчына святочнае адзенне, спраўленае яшчэ ў дзеўках: сачак, спадніца з густымі фальбонамі з чырвона-чорнымі шырокімі палосамі ўпоперак, белая кужэльная кашуля з вышыванымі рукавамі, кгарсэт, цесна скроены ў стане і расшыраны на клубах, каптур, аблямаваны зялёнаю стужкаю ў зборкі. Усё гэта я няраз бачыў на маці ў святочныя дні, калі выпраўляліся дзе на кірмаш ці на фэст ці проста збіраліся да каго ў госці, і мне было весела глядзець на яе, бо яна сама рабілася тады ўся святочная і маладая. У скрыні ж зберагалася ўсё тое, што адкладвалася на пасаг дачкам: абрусы, ручнікі ды коўдры, вытканыя доўгімі зімовымі вечарамі; пад сподам ляжаў туга скручаны, каляны сувой палатна з дзірачкамі на беражках ад пругоў, якімі напіналася палатно пры тканні. Памятаю мацерыны ўздыханні, калі час ад часу прыходзілася вымаць са скрыні то абрус, то коўдру, то зляжалы халодны сувой, адрэзваць ад яго ладны канец і пускаць на абыходак.

Бацька ў скрыні нічога гэтага не чапаў, а адчыняў прыскрынек, даставаў з яго паперы і нёс на стол. Ён разгортваў зляжалыя квіткі на сплату пазыкі, разгортваў няроўны і пакамечаны лісток са сшытка, у якім хімічным насліняўленым алоўкам неслухмянымі літарамі былі запісаны імёны нябожчыкаў. Гэты лісток зберагаўся як прымернік, каб кожны раз з яго можна было напісаць новы, не баючыся каго прапусціць ці ўпісаць не таго, каго бацюшка павінен упомніць у сваёй памінальнай малітве ў царкве. І нарэшце з прыскрынька даставалася і на стале разгортвалася самая галоўная папера — купчая. Наверсе, на ўсю яе шырыню, светлымі падвоенымі літарамі паведамлялася, што пазначаная ў гэтым плане зямля з коліш-

ніх уладанняў князёў Гагенлоэ пераходзіць у поўную ўласнасць пакупніка Аляксея Скрыгана, сына Самуілавага. У верхнім правым кутку, у рамцы, такімі ж светлымі, штукаванымі, толькі меншымі літарамі было напісана слова «эксплікацыя». Што азначала гэтае слова, я не ведаў, і тым больш магічна яно на мяне ўплывала. На той час я ўжо трохі знаўся з кнігамі, усюды шукаў іх, і кожнае чытанне ў душы маёй праходзіла як набажэнства. Самае значнае ў тайнах пазнання таілася іменна за незнаёмымі словамі, такімі, як пірат, ізгой, юдоль,— за імі ўсплывалі і невядомыя краіны, і прыгоды, і нязнаныя хваляванні, і салодкія няясныя жаданні. Слова «эксплікацыя» аднак страціла сваю таямнічасць адразу ж, як толькі ўгадаўся яго сэнс. Пад ім у слупку было напісана, колькі ў плане мае быць зямлі ворнай, удобіцы, няўдобіцы — балот, хмызнякоў, імшарын,— колькі пад лесам. На карце ўсё гэта пазначалася знакамі — кружочкамі, круглымі ці даўгаватымі, часам паспляатанымі ў брыжыкі, рыскамі і малюсенькімі кропкамі.

Чым трывожыла бацьку гэтая купчая? Можа тым, што за зямлю яшчэ не ўсё сплачана, і калі б, крый божа, не ўтрымалася новая ўлада, то прыйшлося б адразу за ўсе ра́ты аддаваць і грошы і працэнты? А можа хацелася паглядзець, як змянілася тая эксплікацыя: ці намнога паменшала за час гаспадарання рысак і кропак, што азначала ў купчай балоты і пяскі. А можа...

Я ні разу не даходзіў да канца гэтага свайго трэцяга «можа», у ім было нешта вельмі трывожнае мне. Я ўжо ведаў, як зачароўвае людзей зямля. І няраз бачыў, як маці з дому ўцякала ўпрочкі.

16

За навуку я дзякую бацьку. На сабе вельмі добра адчуўшы, як цяжка быць непісьменным, ён намысліў мяне вучыць. Падабраўся і хаўруснік, наш далёкі сваяк Есіп Скрыган: у яго таксама быў сын, мой аднагодак, Алесь. Як толькі мы скончылі царкоўнапрыходскую, бацькі пайшлі да нашага папа Сулкоўскага і папрасілі, каб ён падрыхтаваў нас куды-небудзь у Слуцак. Поп ахвотна згадзіўся памагчы, стаў, як тады казалі, рэпетытарам.

Мы з Алесем апынуліся ў Слуцку. І толькі цяпер адкрылася, што бацюшка нас падрыхтаваў у духоўнае вучылішча. Ну, але якраз наспела Кастрычніцкая рэвалюцыя,

яна скасавала не толькі духоўнае вучылішча, а ўсе гімназіі, камерцыйнае і рэальнае вучылішчы, парабіўшы свае школы першай і другой ступені. Праўда, вучыўся я крыху і ў гімназіі, пры польскай акупацыі.

Першыя гады вучыліся спакваля. Ішлі войны, усюды стралялі, было вусцішна і весела. Мы, хлапчукі, тайком бегалі на станцыю, збіралі параскіданыя там патроны і, сабраўшыся дзе ў зацішным месцы, стралялі, разбіваючы іх на камені. Або кідалі ў вогнішча, а самі разбягаліся. Вельмі было хораша, калі страляніна пачыналася бязладная, а кулі вішчалі, усё роўна як злуючыся.

А неяк раз, пры немцах, падкраліся, адчапілі некалькі вузкакалейных ваганетак і пусцілі іх па рэйках уніз, да вадакачкі, што стаяла каля рэчкі. Ваганеткі, дамчаўшыся да насыпу на беразе, з размаху перасігалі той насып і боўталіся ў ваду, карэжачы адна адну і падымаючы страшэнныя пыркі. Панадзіўшыся, мы займаліся гэтым няраз, слушна даходзячы розуму, што гэта не толькі за́баўка нам, а і кепства немцам. Ну, але не доўга: пакуль нас не папужалі з вінтовак.

Вучэнне мне давалася лёгка, асабліва гуманітарнае. Вучыў я ўрокі найбольш не сам, а слухаючы, як іх вучыць Алесь, з якім мы разам і кватаравалі ў пані Стрыжэўскай. Мы масціліся на кухні, Алесь чытаў учуткі, а я штонебудзь рабіў і слухаў. А тады паўтараў. Так і завучваў.

Аднойчы быў выпадак, пасля якога я дзівам астаўся жывы. Школа наша была на Трайчанах, за рэчкаю, хадзіць туды трэба было цераз Чортаў мосцік. Доўгі такі, вузкі, пешаходны. Узімку мы хадзілі напрасцяк, цераз рэчку.

І от, напрадвесні ўжо, вада паднялася, толькі на сярэдзіне пучыўся лёд. Алесь зірнуў на бакі, згледзеў укараэлы кусок ладнай леташняй дошкі, палажыў яго з берага, перайшоў цераз зябкую шэрань вады. Хлопцы за ім, паглядзелі — страшнавата, можа нават лепш вярнуцца ды пайсці цераз мосцік? Так бы і зрабілі, але як жа Алесю: таксама варочацца ці далей аднаму пераходзіць рэчку? Не, пускаць яго аднаго нядобра. Каб прыдаць храбрасці, я захацеў паказаць, што лёд яшчэ моцны, разагнаўся і скочыў, мерачыся далёка за дошку. Усё далей сталася нечакана і лёгка: здавалася, што я не паспеў яшчэ дакрануцца да лёду, як пачуў, што шуснуў пад яго. Што рабілі хлопцы на беразе, не ведаю, мне яны пасобіць не маглі. Перш за

ўсё я пастараўся вынырнуць, але над галавою быў лёд. І я зрабіў шчаслівае адкрыццё: лёд пад нізам шурпаты, з дзіркамі. Памятаючы, што вадою мяне магло аднесці ад палонкі, я, засоўваючы пальцы ў гэтае сітавінне, пачаў брацца ўбок. І дзіва — пацэліў на палонку. Першае, што я ўбачыў: хлопцы стаялі аслупянеўшы. Але тут жа нехта першы здагадаўся падаць канец тае дошкі. Я ўхапіўся за яе, выскачыў на бераг; з мяне цякла вада, а я рагатаў. Рагатаў дзіка, не могучы стрымацца, і не ведаю, што гэта было: ці ўсё тая ж бяздумная зухаватасць, ці падсвядомая радасць, што астаўся жывы.

Каб вярнуцца дадому, я нават і не думаў. Трэба было спяшацца, каб не спазніцца ў школу. Хлопцы павярнулі і пабеглі на мосцік. Я ж не саступіў: у другім месцы цераз ваду палажыў дошку, пераскочыў і пайшоў лёдам. Разам з Алесем.

Пакуль прыбег у школу, усё на мне зледзянела. Я стаў да грубкі і пачаў абагравацца, паварочваючыся да гарачае кафлі то грудзямі, то спінаю, то бокам. Так увесь дзень: на ўроках ляскаў зубамі, а на перапынках грэўся каля грубкі. А ўвечары, калі клаўся спаць, то ўбачыў новае дзіва: зверху на мне была чорная кашуля, цяпер жа такая самая чорная стала і споднее.

У нядзелю прыехаў бацька: як было заведзена, на ўвесь тыдзень прывёз харчы — хлеба, круп, сыру і конаўку масла. Вядома, пані Стрыжэўская адразу расказала пра мяне. І, на маё дзіва, звычайна сярдзіты і строгі, бацька нават не накрычаў.

— Калі гэта было? — папытаўся ён у Стрыжэўскай.

— У чацвер, Аляксейка.

— Значыць, богу так было ўгодна,— сказаў ён, пакорліва ўздыхнуўшы.

Аказваецца, у той жа чацвер бацька ехаў з Труханавіч дадому і таксама тапіўся. За Вынісцамі рэчку разліло вельмі шырока, уся доўзазная грэбля была пад вадою, цераз яе ішлі крыгі. І ўжо недзе на сярэдзіне ад вялікае быстрыні, што аж зносіла калёсы, кабылу збіла на канаву, калёсы перакруціла; аглоблямі і хамутом паваліла і кабылу. Вада віравала, а памагчы не было як і не было чым, каб хоць перарэзаць гужы. Кабыла захлынулася, ледзьве выратаваўся і сам бацька.

— Значыць, богу трэба было ўзяць некага з нас траіх, і ён выбраў самае лёгкае для мяне,— сказаў бацька.

17

Гады навучання прайшлі вельмі скора, можа таму, што перасыпаны яны былі падзеямі больш значнымі. Я памятаю, як паявіліся легіянеры Доўбар-Мусніцкага, у казакінах і англійскага сукна, аблямаваных смушкаю, на сытых, выкармленых конях і з крывымі шаблямі. Памятаю немцаў васемнаццатага года: яны прыйшлі ў ціхі, пакінуты нашымі войскамі горад на саменькім ранку. Іхнія грузавыя машыны з шэра-зялёнымі салдатамі, што стаялі адзін пры адным за бартамі, прайшлі па галоўнай вуліцы вельмі паволі, дэманструючы сілу; ад шырокіх касак, насунутых на самыя вочы, і ад цесакоў, панадзяваных на вінтоўкі, што паблісквалі цьмяным металам, рабілася жудасна.

Але найбольш раз'юшана і драпежна трымалі сябе жаўнеры Пілсудскага. Лёгка, з нейкай бессаромнай зухаватасцю, яны маглі рабаваць, катаваць, падпальваць і арудаваць бізуном, гаворачы пры гэтым «проша пана», як бы рабілі паслугу. У легіянерах гэтай арміі былі смаркачы гадоў па чатырнаццаць, насілі не вінтоўкі, а карабіны, пад свой рост, і па сваёй блазноце аднолькава лёгка маглі і пагуляць у цацкі і пальнуць з карабіна. У Слуцак пілсудчыкі прыйшлі не мірна, а зрашэціўшы горад кулямі; доўга на вуліцах ад гэтых куль не загойваліся раны на дрэвах і папрабіванымі дзіркамі svіціліся аканіцы. За легіянерскімі спінамі гойсалі булак-балахоўскія банды ў вялікіх авечых шапках і таксама ў заморскіх зялёных сукнах. Па нядзелях, калі было асабліва людна, на пляцы яны гаварылі крыклівыя прамовы і ў гэты ж час, за сотню крокаў ад прамоўцы, рабавалі крамы.

Памятаю нямую сцяну людзей уздоўж Бабруйскай вуліцы, калі вялі на могілкі расстрэльваць чатырнаццаць слуцкіх паўстанцаў. Якая гэта была страшная карціна: вязні ідуць на расстрэл сярод натоўпу, што кідае ім кветкі, і спяваюць «Вы жертвою пали в борьбе роковой». Натоўп маўчыць, і толькі гэтыя кветкі гараць агнём. Не, гэта быў не расстрэл партызанаў, гэта ішлі пераможцы ў сваю славу, у сваю вечнасць.

18

Ішлі гады, ішлі падзеі, усё гэта ў душы пакідала свой след. Я вучыўся, мяняліся назвы школ, і жыццё прымушала сталець.

Я многа чытаў, асабліва пасля таго, як на рынку, у будачнікаў, знайшоў кнігі Янкі Купалы, Якуба Коласа і Змітрака Бядулі. Праз іх я ўбачыў народ куды глыбей, і ў душы варушылася патрэба самому гаварыць. Я пачаў шукаць паэтычнага слова.

Да таго ж у мне рос нейкі крызіс: я пачаў не вельмі шчаслівай бачыць сваю сям'ю.

Да самай рэвалюцыі бацька выплачваў грошы ў банк за зямлю. Значыць, ад тае зямлі радасці яшчэ і не было. І ўсё наша жыццё было — гэта работа на капейку: аддаць даўгі. А пасля гэтага — зноў на капейку: нешта прыдбаць, нешта агараць, каб відна была гаспадарка, каб «выбіцца ў людзі». Гэта перарасло ў прагнасць і скупасць, скварка ці мяса былі нам у навіну, уволю маглі есці толькі квас, капусту, зацірку ды бульбу. І работа, работа, з цямна да цямна. Калі прыбрана ўжо поле і сенажаці — трэба церабіць кусты, раўняць куп'ё, зрэзваць пясчаныя пагоркі і звозіць іх у нізіны, капаць канавы, гаціць грэблі.

Але не гэта пужала, не ў гэтым была беспрасветнасць. Я бачыў, як у сясцёр — а яны ж былі маладыя! — парабіўшыся ў крукі, не разгіналіся пальцы. Маладзеж недзе мог хадзіць на кірмашы, збірацца на вячоркі, скакаць, весяліцца, а яны — у гэтым балоце — зналі толькі работу. У людзі ім паказацца не было ў чым. Маці плакала разам з імі.

І мы рабілі нядобра. Калі бацькі не было дома, мы намалочвалі мяшок зерня — аўса, ячменю ці жыта — і хавалі яго ў запеўру. У нядзелю сусед з другога хутара, Пракоп, ехаў у Слуцак, мы падкідалі яму гэты мяшок у воз. І гэтак цішком, сёстры маглі сёе-тое купіць: хустку ці крамніны на кофту. Каб недзе, тайком жа ад бацькі, і надзець.

Не мірылася з гэтым душа. У сям'і — два светы. Як жа гэта можна? Дзеля чаго ж тады жыць, каб быць толькі рабамі зямлі? І я ўзненавідзеў зямлю, узненавідзеў скнарасць і прагнасць. Бацька рыхтаваў мяне ў наследнікі, а я ведаў, што гаспадара з мяне не будзе. І ўсё рос і падымаўся пратэст. І я пісаў вершы. Гэтак жа, як у тых кніжках, што выменьваў у будачнікаў, я пісаў пра цяжкую чалавечую долю. Складаў іх за бараною або за плугам. Ідзеш за роўнаю баразною, перад вачыма мільгаюць і мільгаюць адрэзаныя скібкі зямлі, а ў галаве ткуцца радкі.

Якраз у гэты час пад рукі папаўся Байран. Вялікі, у добрай абкладцы том з «Парызінай», «Абідоскай няве-

стай», «Яўрэйскімі мелодыямі», «Аблогай Карынфа», «Чайльд-Гарольдам» — ён акурат прыйшоўся мне па душы настроямі бунту і расчаравання.

19

І як ні дзіва, але, скончыўшы школу другой ступені, я падаўся ў сельскагаспадарчы тэхнікум. Чаму? Проста ў Слуцку больш не было куды.

Тэхнікум адкрыўся толькі нядаўна, размяшчаўся на Трайчанах, у былых манастырскіх будынках. Ух, якія ў іх былі тоўстыя сцены і якія змрочныя скляпенні! Бывала, калі ідзеш па каменнай падлозе, на калідоры не замірае глухі, нейкі халодны і жудасны гул. Там жа мы і жылі ў колішніх келлях, мясціліся чалавек па чатыры, у жалезных чорных круглых грубках па чарзе варылі кашу; калі яна была на сале — пах разносіўся па ўсіх памяшканнях.

Паўз манастыр працякала Случ. На яе беразе, пад вербамі, я ўпершыню ўбачыў Якуба Коласа.

На цвінтары былі пахаваны знакамітыя духоўныя асобы, тут расло многа язміну, бэзу. Наогул, увесь бераг быў у зяляніне, начамі спявалі салаўі, а я быў у самай той пары, калі пачынаеш здагадвацца, што ёсць каханне. Я пакахаў сваю аднакурсніцу, чарнавокую Зіну Андруковіч, але ў мяне быў сябар Аляксей Шаплыка, куды віднейшы за мяне і ростам, і ботамі, і белымі зубамі, што рабілі яго ўсмешку проста царскаю. За гэтую ўсмешку можна было пайсці на скрут галавы, і я ўпаў у адчай.

Няйначай як з гэтага адчаю я і хапіўся за прапанову пайсці на вечарынку на Магільную вуліцу. Хто там будзе на той вечарынцы, я не пытаў, абы загаіць душу. Толькі адна бяда — не было ў мяне ботаў.

Не, боты былі, але ў такіх на танцы не пойдзеш — на дзеравянай падэшве. Проста да старых халяў швагер падбіў ачэсаныя асовыя калодкі, яны рабілі на цэлую вярсту груку, ступак у іх не згінаўся — што гэта за кавалер.

Выручыў усё той жа Алесь. Толькі ў нядзелю яму бацька прывёз новыя, хромавыя, на іх не было яшчэ нават добрага бляску, і я ведаю, што не лёгка далася майму земляку такая велікадушнасць.

На вечарынцы я станцаваў першы вальс з тоненькай, русявай і вельмі ласкавай Анютай Васілеўскай; прысеў з ёю поруч на крэслах, у гаворцы нашы валасы дакрануліся блізка-блізка, па мне прабег ток невыказнай пяшчо-

ты. І з таго часу я хадзіў глухі, нямы, невідушчы, не ведаючы — каго ж мне любіць.

Калі стала вядома, што з чацвёртага курса сельскагаспадарчы тэхнікум з Слуцка пераязджае не то ў Мар'іну Горку, не то ў Красны Берагг, я не паехаў. З год быў дома, не знаходзячы сабе быту.

Бацька бачыў маю нуду, разумеў па-свойму: ці не пара ажаніць хлопца? Ужо нават нагледзеў і маладую — шляхцянку з-пад Забушоўя: вельмі ж хацелася яму парадніцца з шляхтаю. Аднаго разу я нават убачыў яе: ну што ж, дзяўчына як дзяўчына, няхай гадуецца.

Часамі хадзіў у Слуцак: пааставаліся ж там сябрукі. А аднойчы бацька даў нават заданне: прынесці свянцонае вады.

Бывае пад восень недзе такое свята, калі свенцяць ваду, ці не макавей адно. Я знаў, дзе гэта: каля сабора, у калодзежы. У горадзе на лета бадай што ўсе параз'язджаліся, надта добрых знаёмых я не знайшоў, прашлындаў увесь дзень па Трайчанах, па Калоніі, каля таго сабора нават не быў. А вады — што ж, набяру па дарозе ў любым калодзежы. І от іду дадому. Мінаю Магільную вуліцу. Не, тут нязручна, едзе многа людзей, угледзяць, што наліваю пустую пляшку, здагадаюцца. Набяру ў Васілінках. Але ж кажуць, што на злодзеі шапка гарыць: прайшоў і Васілінкі, а набраць не асмеліўся. Наперадзе Гарадзішчы — ну, там абавязкова. Але Гарадзішчы — гэта ж наша суседняе сяло, тут ужо ўсе мяне ведаюць. Прайшоў міма. Падыходжу ўжо да дому, а пляшка пустая.

Зусім недалёка ад нас, у чаротах і асацэ, працякала Случ. Ледзьве відна з тых зараснікаў. Я перайшоў грэбельку, нізкі, з крывога верхавіння злеплены мосцік, спусціўся к броду, азірнуўся і апусціў у цёплую ваду пляшку. Набралася па самае рыльца. Старанна абцёр, хацця б не выглядала свежа, сунуў у кішэню. Але падумаў, што вельмі поўна набраў, можна здагадацца, што не ў калодзежы, адліў бадай што напалавіну.

Дома бацька наліў з тае пляшкі ў конаўку, дадаў яшчэ трохі з вядра, звязаў з жытніх каласкоў пучок, перахрысціўся і пачаў крапіць хату, вуглы, шэпчучы малітву. Пасля з гэтаю конаўкаю пайшоў у хлеў, у гумно, у свіран.

Бог ведае колькі прайшло часу, бацькі даўно няма, а мне і дагэтуль нядобра, калі ўспамінаю. Няхай сабе я і не вераваў, але ж не перад нейкім там богам, а перад бацькавай памяццю ў чымсьці як бы вінаваты.

У КІРЫЛЫ НА ХУТАРЫ

1

У пачатку красавіка тысяча дзевяцьсот дваццатага года на хутар да Кірылы Якубоўскага зайшоў чалавек. Быў ён росту даволі ладнага, у чорным, з крамнага, але таннага сукна гарнітуры, з забранымі ў боты порткамі, у шапцы-варшаўцы, моднай на тыя часы, з маленькім блішчастым казырком, і з вусамі. Відаць, што тут ён быў першы раз, бо, зачыніўшы веснічкі, пастаяў трохі, агледзеў двор — хату, хляўчук, свіронак, асабліва спыніўся вачыма на варывеньцы, што стаяла тут жа пры варотах, а ўжо тады, паправіўшы шапку, накіраваўся да сянец.

Кірыла быў пад паветкаю. Хоць і нядзеля і праваслаўнаму чалавеку грэх у святы дзень займацца якою работаю, але ён збіраўся забіць у баране павыпаданыя зубы, мяркуючы, што такая малаважная работа не можа лічыцца за грэх.

— Ці не Мікалай гэта Красуцкі адно? — абазваўся ён, углядаючыся ў чалавека.— То праходзь сюды, чалавеча.

Ён выйшаў з-пад паветкі, пачакаў госця, павітаўся з ім за руку. Супроць Красуцкага ён быў невялікі і ад хатняй будзённай апранахі нейкі таўсматы. Ды тым часам і гады прызямлялі Кірылу і рабілі яго, з яго лямцаватай барадой і зімовай шапкай у пагодлівы веснавы дзень, падобным на раскарачысты, але яшчэ здаровы смаловы корч.

Павітаўшыся, і госць, і гаспадар прыселі на бервяне, прыгрэтым не так сонцам, як земляной парнасцю. Зірнуўшы зблізу, Кірыла падумаў, што Красуцкі яшчэ зусім малады, гадоў недзе за трыццаць, але выглядае куды старэй праз свае вусы. Праўда, яны надаюць яму нейкай самавітай строгасці, асабліва тым, што адгадованы без фасону, толькі з кончыкаў трошкі закручаныя ўгору.

— То куды ж ідзеш, чалавеча? — папытаўся ён.

— Ды можна сказаць, што проста да вас, дзядзька Кірыла.

— Хіба ж інтэрас які маеш?

— Прафесію мяняю.

— От табе маеш. Як гэта?

— Хачу пачаць галяндэрскія сыры рабіць.

— То чым жа я табе памагу?

Кірыла зірнуў на Красуцкага. Той глядзеў недзе за прыгуменне, як бы аглядаючы мясцовасць і нешта прыкід-

ваючы ў галаве. Кірылаў хутар стаяў далёка ад бітых дарог, сярод хмызняку, ручаін ды балот, на невялікім грудку, расцярэбленым пад сядзібу ды поле. Відаць, нямала палажыў тут сілы Кірыла, каб зраўнаваць пагоркі, павыкопваць канавы, спусціць гнілую балотную ваду ды павыкарчоўваць імшары. «Ураджаяў вялікіх тут не збярэш,— падумаў Красуцкі,— нават хутаранства ў такім пекле, мабыць, абыходзіцца дорага». За хутарам пачынаўся лес, цягнучыся на далёкія вёрсты, па якіх сям-там у прагалінах параскіданы сёлы — Заброддзе, Нівішча, Караніцы. Паўз гэты лес і ляжала тая сцежка, па якой ішоў сюды Красуцкі ад бітай дарогі на Слуцак.

— Мне здаецца, дзядзька Кірыла, у вас тут вельмі прытачнае месца,— сказаў Красуцкі, паказаўшы рукою на наваколле, якое толькі што бачыў перад сваімі вачыма.— Жывяце вы ў зацішку. Хоць зямля ў вас і не надта каб сказаць што людская, але ж у лесе пашы колькі хочаш. Ва ўсіх тутэйшых сёлах, мабыць, хапае малака, а вазіць яго да Слуцка далекавата. То я падумаў, каб адкрыць тут пактарню. Штодня ці праз дзень звозіў бы з сёл гэтае малако і пачаў бы грошы рабіць. Хопіць і мне па чужых кутках аціраццa.

«Гм»,— падумаў Кірыла. Ён папытаўся ў сябе, чаму гэта яму самому не прыйшла ў галаву такая думка. Але тут жа пагадзіўся і з другім: не, мабыць, на дзве гаспадаркі не пацягнеш — або зямля, або камерцыя. А ад зямлі як жа ты адарвешся?

— А што, гэта — мудрая штука? — папытаўся, аднак, каб мець пэўны спакой.

— А якая там мудрасць,— адказаў Красуцкі.— Перагнаць, заквасіць, напакаваць у формы, адціснуць, палажыць, каб выспелі,— вось табе і галяндэрскі сыр. Ну, там, вядома, сякія-такія рэцэпты трэба ведаць: колькі парашку, колькі солі, колькі вылежвацца.

— Думаеш — выгадна? — яшчэ ўсё не стаўшы на пэўным спакоі, папытаўся Кірыла.

— А хто ж яго ведае, трэба папробаваць. Вы ж ведаеце, мне выбіраць няма з чаго. Зямлі свае не маю, па людзях хадзіць надакучыла. Улада цяпер у нас панская, то я і надумаў панскаю справаю заняцца, а можа праз яе і сам панам стану. Капітал які зараблю нарэшце...

Цяпер ужо Кірыла глядзеў на прыгуменне і за ім уяўляў тыя свае гоні. Н-але, капітал... Кожнаму тых капіталаў хочацца мець, каб яно спуставала. От і ён збіраўся

забагацець, выбіраючыся на гэты хутар. Аддаў свае чатыры дзесяціны ў сяле, памяняўшы на водруб. Думаў, што яго працавітыя рукі ды здароўе зробяць тут залатое дно. Аж от пятнаццаць год ужо, як гарбее тут, а спадзяванні і асталіся спадзяваннямі. А ці на тое мерыўся ён? Хацелася ж быць чалавекам. Думалася, от пройдзе колькі часу, ён прыкупіць яшчэ дзесяцін з дзесяць, хоць бы от тут, гэтай палянкачкі, што мяжуе з яго хутарком, ад пана Мельнікава, завядзе жняярку, малатарню, як гэта бывае ў добрых людзей на свеце, а ў Слуцак паедзе на жарабцы, у размалёванай каламажцы, як той Ястрэмскі, і людзі яшчэ здалёк будуць паважна вітацца з ім: «Здароў, Кірыла, як жывешмаешся?» — «Ды дзякую, з божае ласкі не горш за другіх...» От як думалася, бывала. Капітал... А Красуцкі от другім спосабам на тыя капіталы ўзбіцца хоча.

— Я ў вас ужо і варывеньку вашу змеціў,— між тым гаварыў Красуцкі.— Стаіць ля самых варот, можна сказаць — як наводшыб ад сядзібы. Калі б вы яе пусцілі мне на лета, дзядзька Кірыла, то я б сюды прывёз свае прычындалы дый пачаў бы круціць. Клопату вялікага вам не зраблю, гаспадаркі тае і будзе ў мяне, што бітоны ды цабэркі якія. Ну, конь пастаіць часам запрэжаны, то ўсё гэта я прыбяру... Памяркуемся грашыма ці якім другім спосабам.

Пэўнасць даўно ўжо прыйшла да Кірылы, і ён сказаў:

— Ды яно што ж, да восені яна ў мяне пустуе,— і нават сам неяк па-новаму зірнуў на сваю варывеньку.— Бяры, няхай бог памагае.

2

Каб ведаў Кірыла, чаму Красуцкі робіць у яго пактарню, то яшчэ невядома, ці згадзіўся б аддаць пад яе сваю варывеньку.

Знаў Кірыла, што Красуцкі з недалёкага ад Слуцка сяла Агароднікаў, што невялікае свае гаспадаркі на тры дзесяціны зямлі з братам не дзяліў, а пакінуў яму ўсю, сам пайшоўшы зарабляць па людзях. Ён служыў у царскай арміі, быў у палоне ў немцаў, але ўцёк і змагаўся супроць іх у тыя першыя некалькі месяцаў, калі была тут Савецкая ўлада, нават паранены. Пакінуўшы брата, ён рабіў у Слуцку брукаром, кавалём у Лейбы, калеснікам у Карповіча, бляхаром на Школішчы, пільнікам на пільні ў Гуцайта. Кірыла заўважыў Красуцкага здаўна, маючы патрэбу па

гаспадарцы бываць у ўсіх гэтых людзей, то наварваючы сашнік у плузе, то перацягваючы колы, то распускаючы калоду на дошкі ці набываючы новыя драбінкі. Красуцкі яму падабаўся тым, што быў спакойны характарам, разважлівы і неяк па-добрасуседску памяркоўны. У яго былі, як казалі, залатыя рукі, і Кірылу дзівіла толькі адно: як жа можна, каб з такім характарам і з такімі рукамі нельга было ўжыцца на адным месцы?

— Ці ты сам, Мікалай, перабягаеш ад аднаго гаспадара да другога, ці цябе праганяюць? — папытаўся ён аднаго разу ў Красуцкага.— Такія залатыя рукі — і нідзе не задзержышся.

— От бо то і бяда ўся ў тым, што з гэтых залатых рук кожнаму хочацца мець больш золата. А мне яно і самому патрэбна, дзядзька Кірыла,— адказаў Красуцкі так, што Кірыла ўсяк мог думаць пра такі адказ. Але сам сабе падумаў: «Разумны, кадук на яго,— нічога не хоча на людзі выносіць».

Гэты адказ пра залатыя рукі яму прыгадаўся і цяпер, калі Красуцкі загаварыў, што хоча сабраць капіталы. «Ну што ж, і пара чалавеку да якога берага прыбіцца,— падумаў Кірыла.— Не век жа яму галетнічаць».

А між тым Красуцкі заявіўся да Кірылы таму, што жыць у Слуцку яму стала нельга. Польскія ўлады, падмяніўшы сабою немцаў, прывезлі на Беларусь сваё права на яе як на калонію. Пачаліся прыгнёт, рабункі, здзекі, і гэта ўжо не толькі па праву заваёўніцтва, а і як помста за разбураныя ў рэвалюцыю маёнткі. Народ пачаў барацьбу, пайшоўшы ў партызаны, арганізаваўшы падпольныя групы ў гарадах, мястэчках ды сёлах.

Ад разгрому такой падпольнай групы Красуцкі выратаваўся выпадкова. Цяпер трэба было хавацца, бо правакатары ведалі яго ў твар. Але ж нельга было спыняць і барацьбы. У падполлі аставалася яшчэ многа людзей, як з цывільных, так і сярод салдат войска польскага. І такім чынам Красуцкі выбраў сабе новую прафесію, якая давала магчымасць вельмі добра, пад той час, замаскавацца і мець сувязь з горадам праз сваю камерцыйную дзейнасць.

Назаўтра ж пасля гаворкі на хутар да Кірылы на дзвюх фурманках прывёз Красуцкі ўсё сваё начынение: цэнтрыфугу, як гаварылася тады на сепаратар, бітоны, цабэркі і поўны воз точаных дзераўляных формаў, падобных на вазоны, нават з такімі ж дзірачкамі ў дне. Ён прыехаў з памочнікам, зусім маладым яшчэ хлопцам Пятром, бялявым,

з вельмі весела паднятымі брывамі. Так і здавалася, што ён зараз зацягне песню, ды такую, што тут разляжацца ўсё Кірылава наваколле. Ён шустра паадпрагаў коні, вывеў за вароты ў лясок і спутаў іх, яшчэ шустрэй паздымаў з вазоў паклажу і навёў у ёй імгненны парадак: што занёс адразу ў варывеньку, што палажыў каля сцяны, што панавешваў на шчыкецінь ў плоце. Тут жа аднекуль знайшоў сякеру і пачаў майстраваць, добра ведаючы толк, дзе трэба паставіць тую цэнтрыфугу, дзе посуд, як збіраць кружкі ў ёй, куды накручваць корбу. Пасярэдзіне варывенькі быў лаз у скляпок. Якраз на тым месцы ён паставіў шырокую дзежку, падмайстраваўшы так, што ад таго лазу не асталося і знаку. Не паспеў Красуцкі, седзячы з Кірылам на прызбе, дакурыць свае самакруткі, як ён ужо выйшаў і аб'явіў:

— Гатова, дзядзька Мікалай, можна пачынаць... А вы, дзядзька Кірыла, давайце ваша малако, адразу і сыру пакаштуеце.

— Іч, які шустры ён у цябе,— кіўнуў галавою Кірыла.— Малайчына, дзе ты яго толькі спаймаў такога?

— Кампаньёнам будзе,— адказаў Красуцкі.— А па рабоце — памочнікам. Ён са сваім канём далучыўся.

Красуцкі сёння быў ужо ў сваім звычайным адзенні, у якім бачыў яго Кірыла не раз: у рудым паношаным палітоне, у залапленых на каленях портках — і ад гэтага быў як бы прасцейшы і нават ніжэйшы. Нават вусы нібы адразу трохі абвіслі.

— Пачынаць будзем заўтра, Пятрок,— сказаў ён хлопцу.— А сёння адгані адну фурманку назад і заўтра раніцаю каб быў тут.

З хаты выйшла дзяўчына, уся круглявая, варушкая, яна таксама падышла сюды, каб зірнуць не так на пактарню, як на Пятра, на якога ўжо кінула вока з акна. Пятрок ускінуў бялявыя бровы, бліснуў вясёлымі вачыма і крыкнуў ёй так, як бы даўно быў самым найлепшым сябрам:

— Падыходзь, падыходзь, сястрыца, смялей, тут памочнікі трэба, пакуль ніякае работы няма.

— Тата, ідзеце есці, мама казала,— пастаралася не заўважыць дзяўчына Пятра і пайшла, панёсшы з сабою, аднак, хітраваты бляск яго воч. Ох, абармот, і слова ж якое знайшоў — «сястрыца!» — самае ласкавае і небяспечнае з усіх ласкавых слоў.

Пактарня папраўдзе пачала жыць назаўтра. Зранку Красуцкі разам з Пятром паехалі па сёлах. На першы раз

не так многа набралася ахвотнікаў здаваць малако. Але Пятрок вельмі скора мог пераканаць, што тут многа выгады: за малако яны плацяць добрыя грошы, самі яго забіраюць без клопату, калі хто хоча, то можа спажываць сыроватку. Дзе там чалавеку катораму збіраць па гладышыку, каб завесці нарэшце ў Слуцак той фунцік масла, калі можна адразу атрымаць жывыя грошы. Першы ж вечар загула ў варывеньцы цэнтрыфуга. А на другі дзень не толькі Пятрок вярнуўся з поўным возам бітонаў, а нават хто і сам прывёз, каб на свае вочы ўпэўніцца, што ў Кірылы Якубоўскага такі і папраўдзе адкрыўся завод.

Пад вечар і Кірыла зайшоў у варывеньку паглядзець на тую хітрасць. Ён агледзеў прыладдзе, паспрабаваў пакруціць за корбу, падзівіўся, як праз гарлякі белаю цягучаю гумаю вылівалася малако. Нават пакаштаваў на смак.

— Псота,— сказаў ён.— Адна псота, толькі дабро пераводзіце. Ды ці я б такую дрэнь еў, паглядзеўшы, як вы яе тут квэцаеце?

— Ну, бо вы ж яшчэ не пан, дзядзька Кірыла,— весела абазваўся Пятрок.— А каб былі панам, ды яшчэ гжэчным, то толькі тыя б сыры і паядалі.

Кірыла сеў на парозе. Ці то ад гэтых слоў, ці ад чаго другога задумаўся.

— Вы скажэце, хлопцы,— нарэшце сказаў ён,— скажэце вы мне, хлопцы, то што гэта і папраўдзе ў нас гэтая панская ўласць адсталюецца? Надоўга яна?

— Хто ж яго ведае, дзядзька Кірыла,— адказаў Красуцкі.— Можа доўга, а можа і нядоўга.

Пятрок паглядзеў на Красуцкага і здагадаўся, што той не хоча гаварыць пра гэта з Кірылам. Яму гэта было важна, каб самому ведаць, што можна гаварыць, а што не.

— Немцы, балахоўцы, белыя палякі, а нашаму ж, рускаму, чалавеку куды брацца? Усюды вешаюць, страляюць, а як гэта можна, каб свая ўласць ды сваіх жа людзей страляла?

— Калі вешаюць ды страляюць, то, мабыць, не сваіх, дзядзька Кірыла,— абазваўся зноў Пятрок, зірнуўшы на Красуцкага, як бы пытаючыся, ці добра тое, што ён сказаў.— Сарока сароку бачыць здалёку, то кожны сам добра ведае, куды яму брацца.

Такі адказ Кірылы не заспакоіў. Як гэта можна ад самага галоўнага адкручвацца? Быццам яму, катораму, усё вельмі ясна. А дзе ж тая яснасць? Ну, пра немцаў, вядома, і гаварыць не прыходзіцца — народ чужы, прышлы,

дзякуй богу, што іх і след прастыў. Балахоўцы гэтыя, шмалахоўцы — проста басата, бандзюгі. Ну, а от бальшавікі, скажам, народ жа свой, рускі, да іх і душа павінна гарнуцца, але ж толькі за беднату! Дый то не зусім ясна — Ленін жа падпісаў дэкрэт, што ўсю зямлю ад памешчыкаў трэба адабраць і аддаць мужыку? Значыць, беднаты быць не можа? Ну, а цяпер от палякі — гэтыя супраць пана нічога не маюць, калі ласка — паней, але ж панець будзе толькі памешчык?

— Ты гэта добра надумаў, Пятрок, пра сароку,— сказаў Кірыла і падняўся з парога.— Але ж ці далёка тая сарока бачыць? А мы ж людзі, чалавеча, людзі...

Кірыла пайшоў, Пятрок паглядзеў яму ўслед і сказаў са шкадобаю:

— Мабыць, пакрыўдзіўся вельмі... А чаму вы яго баіцеся, дзядзька Мікалай?

— Трэба асцерагацца, Пятрок, нам з табою асабліва,— адказаў Красуцкі.— Ні ты, ні я чалавека як след не ведаем. А ён жа як-ніяк хутаранец...

3

Пакуль не было яшчэ тых сыроў, Пятрок звычайна кожнае нядзелі або нават і два разы на тыдзень вазіў у Слуцак малако.

Гэтае нядзелі ён таксама паехаў, настаўляўшы поўны воз бітонаў. Не памыліўся Кірыла, адгадаўшы па высока ўскінутых брывах песенны характар у Пятра.

Ці свет, ці світае,
Ці на зоры займае,—

зацягнуў Пятрок, толькі выехаўшы з двара. Дарога ішла ўздоўж лесу. Песня ўзлятала высока, а лес падхопліваў яе і нёс бог ведае куды, нібы каб паказаць і пахваліцца, што тут едзе самы вясёлы на свеце хлопец Пятрок.

А мой міленькі,
Голуб шызанькі,
Коніка сядлае,—

звінела песня і плыла і плыла без суцішку, пакуль Пятрок выязджаў на бітую дарогу. Тут ён сустракаў звычайна якога падарожніка і яшчэ здалёк крычаў: «Добры дзень, дзядзечка!» Пачыналася размова, ды такая ліпучая, што або падарожнік падсаджваўся ў воз да Пятра, або Пятрок перабіраўся да падарожніка.

Нядзеля была цёплая, сонечная. Дарога, павіляўшы паплавамі, між кустоў, ручаін ды балотцаў, якія аддзялялі Кірылаў хутар ад свету, нарэшце за рэчкаю выходзіла ў поле, усланае зялёным шоўкам руні азімых жытоў. У паветры трымцелі песнямі жаваранкі, між каляін і на ўзмежках яркла яшчэ маладым, але туга набрынялым сокам трава. У галубовае неба падымаў крылы вятрак, нібы перадаючы сваё ранішняе прывітанне далёкаму, яшчэ не ўдужэламу воблачку. Пятра абганялі фурманкі з больш лёгкімі паклажамі — мяшком бульбы, пеўнем, заціснутым між калень у маладзіцы, дзесяткам яек, пастаўленым у кошыку ў перадку, і Пятрок, свецячыся сваім ясным тварам і песеннымі брывамі, толькі паспяваў гаварыць: «Добры дзень, дзядзечка!», «Добры дзень, цётачка!», хоць трошкі скіроўваючы ўбок свайго гнедку, каб даць абмінуць.

Як гэта часта бывае, нават невядома па якіх прыкметах — ці то па фурманках, якія спехам і нязвычна рана варочаліся ўжо з горада, ці то па тым, што людзі або забываліся адказваць, або вельмі скоранька адказвалі на яго «дабрыдзень», ці яшчэ па чым — але, пад'язджаючы пад горад, Пятрок адчуў нейкую няясную трывогу. Гэтая трывога пабольшала, калі, уз'ехаўшы на Кладовую, ці, як яе звалі яшчэ, Магільную вуліцу, каля могілак ён убачыў многа народу. Людзі не то сыходзіліся на нейкае відовішча, не то разыходзіліся з яго. Трывога стала зусім ужо ясная, калі ён убачыў, што сярод гэтых людзей многа легіянераў і паліцыянтаў — і пеша, і конна — і яны наводзяць нейкі парадак, мабыць, разганяюць людзей ці не даюць збірацца ім або, наадварот, зганяюць у кучу, бо жэсты ў іх энергічныя, раз-пораз відаць, як яны падымаюць угору то шапкі, то нагайкі, паказваючы кірунак.

Найбольшы натоўп варушыўся ля кальвінскіх могілак, а ў глыбіні іх людзі ўсціскаліся нават на агароджу, і там недзе, аж з-пад таго краю, чуўся плач і галашэнне. Пятрок не памятаў, ці сказаў яму хто, ці ён сам гэта зразумеў, але зразумеў ясна — гэта тут толькі што расстралялі паўстанцаў, партызан, якіх не так даўно паарыштоўвалі ў Слуцку, у Грэску, у Пукаве і сярод легіянераў самога войска польскага. Каго ж расстралялі? Хто астаўся жывы? Шмат каго з іх Пятрок ведаў. Божа мой, гэта ж сярод іх мог быць і дзядзька Мікалай Красуцкі, які там, на хутары, цяпер варочае і перасушвае свае сыры! Сярод іх мог быць і дзядзька Нічыпар, якога ён сёння павінен убачыць, маглі быць і ўсе тыя, што яшчэ асталіся ў падполлі, дзеля якіх ён

ездзіць вось з гэтай фурманкай і якія тайком можа ходзяць вось тут, сярод натоўпу.

— Там пастралялі іх, ляжаць над ямаю. Зганяюць усіх, каб людзі самі паглядзелі ды страху набраліся, ка́ты! — сказаў чалавек, у якога папытаўся Пятрок, доўга праехаўшы з ім поруч.

— Колькі іх?

— Чатырнаццаць. Ды вунь пачытай, на ўсіх платах ды сценах абвесткі вісяць. Па вуліцы вялі ад самай турмы, закаваўшы ў кайданы, і зганялі народ, каб глядзеў з тратуараў. Думалі, народ радавацца будзе, а ён плакаў ды кветкі кідаў, нянавісці больш набіраўся. А яны песні спявалі, на смерць ідучы, толькі падумаць трэба, якая сіла. «Мы жертвою пали в борьбе роковой...» — і не даліся, каб ім вочы завязвалі перад расстрэлам... А цяпер там на могілкі бацькоў ды мацярок пазганялі, любуюцца на іх пакуты. Унь, бачыш, нават паненка нейкая гарцуе на жарабцы разам з легіянерам, ёй весела, усё роўна як на фэст прыехала.

Вельмі хацелася Пятру злезці з воза, схадзіць туды, адкуль чуўся плач, каб, можа, пазнаць каго там ды хоць перад мёртвым зняць шапку, перадаць зямны паклон ад жывых. Але ён памятаў, што ў яго ёсць свая задача, свая вельмі адказная роля, якую ён павінен іграць, нягледзячы ні на што.

Мінаючы людзей, чуючы галашэнне і плач з таго краю могілак, не бачачы людскіх твараў, не заўважаючы паліцыянтаў, што конскімі капытамі, гарцуючы сюд-туд, выбівалі іскры з камення, Пятрок паволі паехаў далей па Кладавой вуліцы, грукочучы па бруку і спрабуючы свяціцца на ўвесь свет сваімі яснымі вачыма бестурботнашчаслівага чалавека на зямлі. Песенныя бровы, як размахнутыя крылы ў птушкі, хацелі падняцца і распасцерціся на ўвесь свет.

Сёння бадай што не было на рынку людзей, і дзядзька Нічыпар не прыйшоў купляць малака. Пятрок падкінуў гнедку сена і сеў на біле воза. На той бок вуліцы, што разбівала рынвчную плошчу папалам, каля сваіх будак стаяла некалькі гандлярак. На століках у іх ляжалі гузікі, шпількі, грабянцы, шпулькі нітак; на матузках да перасолак пападвешваны ў адных абаранкі, тараны, сушаныя ўюны, пернікі, у другіх — жычка, карункі, шнуркі ў чаравікі, прошва. Збоку, бліжэй да дарогі к сабору, што высіўся на гары за рынкам, стаяла кабеціна, у складзеных руках тры-

маючы свежы сыр з адтуленымі крайкамі палатнянага кліна. На рагу, каля аптэкі, на чырвонай цаглянай сцяне крамы ярка бялела паперка з яшчэ непавысыханымі плямамі клею з таго боку і з загнутым правым ражком. Што ж, яна павешана тут, каб людзі чыталі, значыць, павінен прачытаць і ён. Паліцыянтаў тут куды менш, як на Кладавой вуліцы, бо адсюль жа паразыходзіўся і народ. Пятрок падышоў да паперкі, літары на ёй былі выдрукаваны чытэльна, каб самі кідаліся ў вочы.

«**Абвестка**»,— прачытаў самыя буйныя літары Пятрок. «Солдаты,— ішло пасля больш дробнымі, светлымі: — Яромолицки Петр, Емильянчик Михаил, Камински Александр и цивильные: Симонович Антон, Выченко Михаил, Грачук Еухим, Красуцки Степан, Солодуха Петр, Реутович Михаил, Тишкевич Максим, Тишкевич Миколай, Тишкевич Михаил, Степанович Петр, Бенько Никифор.

Постановлением полевого суда Камандзира Окружного Этапа Минска Литоускага дня 24 красавика 1920 за,— далей ішло чорнымі літарамі,— **здраду и змову против войска польского приговорены на кару смерти через разстрел.**

И геты приговор,— зноў было надрукована светлымі літарамі,— через две гадины после абвестки 25 гетае же красавика о 10 гадзине рано у Слуцку быу выполнен».

Пятрок чытаў гэтыя радкі, збіваўся, пачынаў спачатку зноў, нібы ўсё не верачы, што ўсіх, пра якіх тут сказана, ужо няма. Можа, гэта папраўдзе толькі нядобры сон або жарт, бо яшчэ ж нядаўна ён спяваў песні і ўсім па дарозе ўсміхаўся, расказваючы вясёлыя прыгоды, а як жа гэта пагадзіць адно з адным? Пятрок не чытаў далей, дзе ішло паведамленне, што за тую ж самую віну цяжкай турмой каралася яшчэ многа людзей, салдат і цывільных. Не, гэта быў не сон і не жарт, а самая страшная праўда, бо пад нізам абвесткі стаяў подпіс, самі літары якога, здавалася, напісаны крывёю: «*Шемет*. Палкоуник и командер Окружного этапа». Ах, якія цяжкія сталі ногі, калі ішоў Пятрок назад да свайго воза. Нібы толькі вось цяпер, пасля гэтай абвесткі, стала ясна, якое непапраўнае здарылася гора.

Можа, гэта адтуль, ад могілак, пачалі паяўляцца трохі людзі — мужчыны, жанчыны. Праехала адна, другая фурманка. Крыкнула адна, другая гандлярка, зазываючы пакупнікоў. Праехаў верхам па самай сярэдзіне вуліцы паліцыянт, паблісківаючы аздобай свайго мундзіра.

— Ці ваша малако яшчэ не пракісла? — папыталася

нямоцна жанчына, стоячы каля Пятровага воза з гладышыкам у руках.

Пятрок порстка і пільна зірнуў у твар. Жанчына была яшчэ маладая, куды маладзей, як хацела здавацца, і таксама глядзела яму ў вочы.

— Кіслым малаком не таргуем,— весела адказаў Пятрок.— Можаце пакаштаваць.

— Ну, то налейце,— сказала жанчына і паставіла гладышык, стаўшы вельмі блізка.— Дзядзька Нічыпар сказаў, што сёння яго бачыць няможна.

— Як буду даваць здачы,— адказаў Пятрок,— то там будзе маленькая паперка. Дзядзька Мікалай сказаў аддрукаваць яе як найбольш, забяру ў тую нядзелю. Яшчэ дзядзька Мікалай сказаў, што карабіны і патроны трэба даставаць скарэй, і гэта трэба рабіць праз таго паручніка, якога ведае дзядзька Нічыпар. Не бойцеся, знайду спосаб вывезці. Буду па нядзелях і чацвяргах.

Жанчына пайшла, а Пятрок ажывіўся і пачаў зазываць людзей, ды так галасіста і звонка, што, здавалася, ніколі не мог бы журыцца гэты найвесялейшы чалавек.

— Гэй, каму малака — падыходзь і суседачку падводзь! Прадаю напавер, за грошы, бо хлопец харошы! Пан капрал, ідзеце пачастуйцеся, на ўсякай жа рабоце трэба падсілкавацца...

Па дарозе назад у самым канцы Кладавой вуліцы, на кузні ў Лейбы, таксама вісела абвестка. Яна вісела на адным крайку — мабыць, нехта адляпіў яе. Пятрок сарваў яе і палажыў у кішэню. Хоць гэта вельмі цяжка — даведацца, што загінуў родны брат,— але ж трэба паказаць яе Красуцкаму.

4

Зброю і патроны, перад тым як пераправіць іх у партызанскія атрады, Пятрок не давозіў да хутара. Было ў яго вельмі многа зручных мясцін у лесе, хапала і ламачча ды моху, каб прыкрыць іх. А адтуль ужо самі людзі, каму гэта было вядома, разбіралі і разносілі, найбольш ноччу, па атрадах. А лістоўкі часамі трэба было мець пад рукамі, і ненадоўга Пятрок хаваў іх у варыўеньцы, у тым самым скляпку, да якога так ёмка замаскаваў лаз.

У горад Пятрок ездзіў рэгулярна. У яго там завялося вялікае і добрае знаёмства сярод легіянераў, нават з паліцыянтамі. Хоць яны часта мяняліся, але гэта не надта бян-

тэжыла Пятра: вельмі скора, то зняўшы яшчэ здалёк шапку, то сказаўшы якое прыемнае слова, то ўчаставаўшы добраю квартаю малака, ён заводзіў зноў не толькі знаёмства, а нават дружбу. Як толькі саспелі сыры, ён павёз іх прадаваць і ў першую ж чаргу абдарыў па цэлай галоўцы і пана Стасека, які меў абход па Кладавой вуліцы, і пана Збышку, што наглядаў за парадкам на цэнтральнай шашы, і паноў Габруся і Казімежа, пад наглядам якіх быў сам рынак.

— Няхай паны ведаюць, што ёсць не толькі дрэнныя людзі,— гаварыў ён кожнаму з гэтых паноў.

Панам было вельмі прыемна, калі Пятрок кожны раз, весела ўсміхаючыся, яшчэ здалёк вітаўся з імі:

— Шанаванне пану Стасеку!

— Шанаванне пану Збышку!

— Шанаванне пану Казімежу!

А ў варывеньцы тым часам работа ішла. Гула цэнтрыфуга; Пятрок ездзіў па сёлах, заўсёды возячы з сабою песню, без якой лес, здавалася, цяпер нават не мог абысціся; Мікалай Красуцкі даглядаў сыры, падціскаючы іх у клешчах, а пасля сушачы ў пацярусе ці ў сене. У сёлы часамі выязджаў і Красуцкі разам з Пятром, але варочаўся звычайна без Пятра, куды пазней, а бывала, што і начамі. І да Красуцкага пачалі прыходзіць людзі, можа нават нетутэйшыя ці далёкія, бо Кірыла раней іх не прымячаў. Чаго прыходзілі? Бог іх ведае, можа каб паглядзець на пактарню ды самім пераняць тую навуку.

Адзін такі госць вельмі запомніўся Кірылу і трохі збянтэжыў яго спакой. Ён прыйшоў у суботу надвечар, даволі плячысты, рослы, ладны, у светлым даматканым палітоне наапашкі. Пад палітонам белая вышываная кашуля, лёгка перахопленая паяском з кутасамі; рабыя порткі забраны ў боты. Акурат вось такія хлопцы ходзяць да дзяўчат на вячоркі, калі юрує маладая кроў. Але найбольш запомніўся твар — з левага боку ад губы і недзе пад сківіцу ішоў шрам. Можа, ён не так і відзён быў бы, гэты шрам, але калі чалавек гаварыў, то рот у яго трошкі крывіўся, нібы шрам адцягваў губу ўніз. Дзе ён бачыў гэты твар? Вельмі ж памятаюцца яму пакрыўленыя ў гаворцы губы.

Чалавек нядоўга быў у варывеньцы, Красуцкі правёў яго за вароты, а тады ў лясок, і яны доўга там недзе бавіліся. Не бачыў, вядома, Кірыла, як Красуцкі злазіў у скляпок і на адыходзіны даў чалавеку скрутак паперак. Не чуў і размовы, якая была ў Красуцкага з чалавекам у лесе.

— Важна, каб акупанты не адчувалі сябе гаспадарамі,— гаварыў ён чалавеку.— Трэба трывожыць іх усюды, у армію да іх пралазіць, знішчаць ваенныя склады, не даваць асталёўвацца.

— Якая наша бліжэйшая задача, таварыш Красуцкі?

— Урэчча. Трэба там знішчыць усё іх дабро на станцыі. Заадно, вядома, і гарнізон. Зброю і патроны — з сабою. На бліжэйшы час нам трэба будзе вельмі многа зброі.

— Добра, таварыш Красуцкі.

Кірыла зайшоў у варывеньку папрастарэкаваць з хлопцамі на пытаннях жыцця. Ці не ведае Красуцкі, чаму гэта легіянеры пачалі так часта падпальваць сёлы і чаму зноў пачаўся такі неспакой? Раней быццам не было так многа гэтых карных атрадаў. Ды нешта і сам Красуцкі стаў не такі, як быў: скупы на словы, на гаворку. Можа і папраўдзе пачуў смак у грашах і ўвесь кінуўся ў сваю камерцыю? А можа таксама баіцца пярэтрусу? Але ж чалавек гэты — адкуль ён узяўся і чаго прыходзіў?

Кірыла такі ўспомніў яго. У той кароткі час, калі тут былі бальшавікі адразу пасля рэвалюцыі, на хутары ў яго стаялі салдаты, можа больш за ўзвод. Немцы стаялі на тым баку рэчкі, і цераз Кірылаў хутар з тугім завываннем пераляталі снарады, разрываючыся то справа, то злева, то, здавалася, над самаю галавою. Салдаты ляжалі ў акопах, тымі акопамі было зрыта ўсё яго поле, нават у агародзе. Гэты чалавек быў у бальшавікоў за камандзіра. Усюды ішла страляніна, а ён быццам нічога не заўважаў ці абвык, можа, спакойна стаяў на ганку, пазіраючы ў бінокль, і час ад часу падаваў каманду то аднаму, то другому салдату ў бліжэйшых акопах. Неяк пад вечар, ужо прыцемкамі, калі сціхла страляніна, ён сабраў салдат і загадаў адступаць.

— Будзь здароў, дзеду,— сказаў ён Кірылу, узяўшы яго за абедзве рукі.— Калі нашкодзілі табе тут трохі — прабач.

— А цяпер жа куды — дадому? — трывожна папытаўся Кірыла, яшчэ ўсё не верачы, што яны і папраўдзе пойдуць і што пасля іх сюды прыйдуць немцы.

— Не, дзеду, дадому мне далекавата, я сам з Петраграда. Ды і няма калі — ваяваць трэба: немец тут пабудзе нядоўга, вернемся, гэта ты будзь спакойны. А цяпер — дзякуй табе за хлеб, за бульбу, за прытулак. Ад усіх чырвонаармейцаў,— сказаў ён і паціснуў рукі. І калі гаварыў, то шрам трошкі крывіў яго рот, нібы адцягваючы губу ўніз.

От цяпер Кірыла прысеў на парозе.

— Ну, як жа, рахубу ад свайго інтэрасу маеш? — папытаўся ён у Красуцкага.

— Ды як вам сказаць, дзядзька Кірыла, не рахаваў яшчэ.

— Раскідаешся надта, збыткуеш,— гаспадарліва сказаў Кірыла.— Пятрок твой, я гляджу, шырокае натуры чалавек. Бачыў я, як ён прадае — за цаною не стаіць, кожнаму, які трохі з начальства там ці з чыноўнікаў іхніх, услугоўвае — і перадасць, і гасцінчыка ткне. Так робячы, не забагацееш. А сыроватку тую, ці, як вы кажаце, пахту, дык ён жа проста за бесцань выкідае.

— Ну, часамі ж трэба і рэкламу зрабіць,— памяркоўна не згадзіўся Красуцкі.— Без гэтага не бывае.

— Ракла-аму,— пераказаў Кірыла.— Бачыў ты, ужо і слоў мудрых нахапаўся. Ну што ж, можа твая і праўда... А скажы ты, што гэта за чалавек быў у цябе надоечы? Гэты, з губою пакалечанаю.

Красуцкі тут жа падняўся з парога, пачаў разбіраць цэнтрыфугу, каб перамыць ды высушыць за ноч.

— З Амгавіч, лесніком там робіць,— адказаў ён, стоячы да Кірылы плячыма.— Мы з ім даўно знаемся, дык от прыбег праведаць. А родам з Агароднікаў, але таксама на гаспадарцы не жыве.

— А-а,— працягнуў Кірыла, як бы сказаўшы: «Ну, вядома, што ж тут такое», але сам сабе здзівіўся. «Нешта ён выдумляе. То з Петраграда, а то з Агароднікаў — нешта тут не тое»,— падумаў ён.

5

Неяк у чэрвені, пасля паўдня, Пятрок варочаўся з горада ў добрым настроі. Ён вёз адозву, надрукаваную падпольным камітэтам, у якой растлумачвалася, што камуністы і савецкая ўлада ваююць не супроць Польшчы, а супроць польскіх магнатаў, памешчыкаў, буржуазіі ды пілсудчыкаў, якія акупавалі Беларусь паміма волі свайго народа, каб прыгнётам і эксплуатацыяй толькі павялічваць свае багацці. У адозве гаварылася, што сялянства і рабочы клас Польшчы добра самі разумеюць гэта і спачуваюць працоўнаму народу Беларусі, бо нават сярод салдат польскай арміі ёсць многа людзей, якія працуюць падпольна і як могуць памагаюць партызанам, часам нават пераходзяць да іх са зброяй. «Падымайцеся ўсе супроць паме-

шчыкаў і капіталістаў, змагайцеся за ўладу рабочых і працоўнага сялянства! Прэч акупантаў з нашай зямлі!» — гаварылася ў адозве.

Бываючы рэгулярна ў горадзе, Пятрок вельмі добра вывучыў салдат, з якімі звычайна стыкаўся за час тае дарогі. Не дзіва, што і адозвы тыя вёз сёння без асаблівай асцярогі — проста палажыў у сядзенні пад сена, наверх спакаваўшы штук колькі нераспраданых сыроў ды пасудак — два парожнія бітоны. Ён нават песні сёння не спяваў, пусціўшыся ў добрыя дарожныя мары.

І не паспеў уз'ехаць на двор і распрэгчы каня, як ля варот паказаліся карнікі.

Не было асаблівай падставы Кірылу баяцца карнікаў, бо яны звычайна наязджалі і распраўляліся ў сёлах, дзе сустракалі сабатаж або сляды партызанскай дзейнасці. Кірыла ж быў у баку ад дарогі, на адзіноце, ціха, хоць крэкчучы, плаціў падаткі і кантрыбуцыі, нікому нічым не гразіў і ніякае небяспечнае сілы сабою не станавіў. Аднак жа ён вельмі спужаўся, убачыўшы вайскоўцаў гэтакай вялікай чарадой, і, стоячы недалёка ад варывенькі, нямоцна крыкнуў:

— Мікалай, салдаты прыехалі!

Красуцкі стаяў каля парога, ён перш як бы сцепануўся, намерваючыся куды кінуцца, а пасля стрымаў сябе, глыбока, на ўсе грудзі, удыхнуў паветра і выйшаў на двор. Пятрок так і астаўся стаяць пры аброці ў каня. Кірыла, босы, у расхрыстанай сарочцы, папраўляючы ўскамлычаныя валасы, бо толькі выйшаў з хаты пасля полудня, пайшоў адчыняць вароты.

Карнікі ўз'ехалі на двор. Пад пярэднім, паручнікам, аж гарцавала танканогая, бліштчастай гнядой масці кабыліца. Паручнік саскочыў з сядла, крывая шабля бразнулася канцом па доле. Ён падвёў кабыліцу да плота, зачапіў повадам за шчыкецціну і папраўіў на сабе перш шапку з доўгім лакавым казырком, тады мундзір, абцягваючы яго наўкруга і выпінаючы грудзі. Пазлазілі і астатнія і таксама пачалі, хто дзе мог, прывязваць коні.

— Пан гаспадар будзеш? — папытаўся паручнік у Кірылы, падазваўшы да сябе. Ён папраўіў рамянёк нагайкі, зачэпленай на правай руцэ.

— Але, гаспадар, паночку.

— Бальшавікоў хаваеш? Прыходзяць да цябе партызаны? — паляпваючы нагайкаю па халяве шчыгульнага бота, аж два пытанні адразу задаў паручнік.

— Ды што вы, паночку, я іх у вочы ніколі не бачыў.

— Патроны, зброю маеш?

— Бронь божа, я ж чалавек мірны.

— А то хто такія ў цябе? Што за людзі? — папытаўся паручнік, тою ж нагайкаю паказваючы на Красуцкага і Пятра.

— Ды як вам сказаць,— замяўся Кірыла.— Інтэрас невялікі людзі маюць, пактарню абсталявалі, на продаж сыры робяць тут.

Карнікі і папраўдзе заехалі да Кірылы, можна сказаць, выпадкова. З самага рання яны былі ў глыбокіх лесавых сёлах, папалі ў партызанскую перастрэлку, спалілі дзве хаты, арыштавалі за бунтарства трох чалавек і адправілі ў пастарунак. Цяпер, злосныя і галодныя, яны варочаліся ў горад і па дарозе ў Кірылы проста хацелі падсілкавацца. Але непрадбачаная акалічнасць з гэтымі нетутэйшымі людзьмі прымусіла пусціць у работу сваю прафесію.

— Пактарню? — злосна перапытаў паручнік.— А вось мы зараз пабачым, якая ў цябе тут пактарня. Салдаты! — крыкнуў ён і падняў тронак нагайкі ўгору.

Салдаты кінуліся хто ў варыўеньку, хто ў хату да Кірылы, хто палез на гарышча. Двое абступілі Красуцкага, двое схапілі Пятра, пачалі трэсці, абмацваючы за пазухаю, выварочваючы кішэні. Пятроў конік, бачачы, што яго больш не трымаюць за аброць, матнуў галавою і пайшоў да сяброўства — да салдацкіх коней, якія ўжо натапырвалі вушы.

— Тпру, каб ты здох! — крыкнуў на яго Кірыла, якога ніхто не кранаў, бо ён стаяў каля самага паручніка, і кінуўся напярэсцігі.— Ііч, ваўкарэзіна, упынку на цябе няма, неўстаенны. Но, зараза! — крыкнуў ён яшчэ мацней, шлёгнуў ляйчынаю і пагнаў воз цераз двор на прыгуменне.

Ён загнаў каня на ток, выпраг, выпусціў за вароты ў лясок, спутаў. Калі вярнуўся на двор, вобыск ужо скончыўся. На двары валяліся паперакулены бітоны, цабры, відаць было, што ў варыўеньцы ссунута дзежка з лазу ў скляпок. Паручнік дапытваўся ў Мікалая і Пятра, хто яны, адкуль і чаму заняліся пактарствам.

— Мы, пане паручнік, правільна жыць хочам, за сваю сумленную працу. Самі абжыцца стараемся і дзяржаве карысці зычыць хочам. Вашай арміі мы сыры нашы збываем, вось, маеце паглядзець,— тлумачыў Пятрок, паказваючы квіткі, весела свецячыся тварам і высока падымаючы свае бялявыя пясенныя бровы.

Аднак пана паручніка вельмі цікавіла тое, чаго ён сюды прыехаў:

— А ці не ведае пан гаспадар, што гасцей трэба пачаставаць? — папытаўся ён у Кірылы, як толькі той зноў стаў каля яго.

— То гэта можна, паночку, зараз скажу... Тэкля! — крыкнуў ён у хату.— Волька! Зараз жа згатуйце панам чаго паесці смачнейшага... Я зараз, паночак,— і Кірыла падаўся ў хату, ступаючы так, як заўсёды, калі спяшаўся: адной нагой карацей ступаючы, другой — даўжэй.

З варывенькі роўна і глуха загула цэнтрыфуга. Паручнік пачаў аглядаць двор. На страсе ў хляве зацвярдзелымі грудкамі зелянее мох. Дрывотня з калодаю, і поўна нацягана карчоў. А што ж, няхай і карчуе, бо хто ж будзе разрабляць зямлю, калі не мужык.

Сонца парыла. Аднекуль цягнула густым, настоеным водарам кветак, траў, збажыны. Загула пчала, пакінуўшы за сабою выгнуты след гудзення, нібы яна блыталася ў гэтых густых мядовых пахах. Пан паручнік успомніў, як сёння гулі кулі, толькі след у тых быў роўны і пякучавостры.

Бразнулі дзверы, з сянец выскачыла дзяўчына — мабыць, Волька! — і скоранька пайшла цераз двор, стукаючы загарэлымі пяткамі і лёгка пагойдваючы круглымі клубамі. Стаўшы на адно калена, яна пачала набіраць на бярэмя дровы, і вельмі трошкі з-пад падолу прасвечвалася галёнка нагі. Выйшла жанчына — мабыць, Тэкля! — несучы перад сабою многараджалы жывот, перахоплены матузком фартуха. Суняўшыся каля хлеўчука, яна пасыпала хлебных крошак па доле, ззываючы «ціп-ціп-ціп», прыцікаваўшы, злавіла дзвюх кур і падалася ў дрывотню. Прыгасеўшы і заціснуўшы адну ў прыполе, яна прыціснула галаву другой да палена і нямоцна стукнула сякераю. Курыца млява трапянула крылом, асела назад, і з кароткага ашыйка ў яе выціснулася палахлівай кропляй, а пасля цурком пацякла цёплая кроў...

Пан паручнік вельмі хацеў есці і, каб перабіць нецярплівасць, дастаў цыгарэту і закурыў...

6

Зноў усталявалася Савецкая ўлада, ужо навечна.

Быў канец лета. У Слуцку, на рыначнай плошчы, зрабіўшы ўсе справункі, сядзеў Кірыла на сваім возе і пера-

кусваў, збіраючыся дадому. Народу было поўна, вазы стаялі густа, з пападвязванымі ўгору аглоблямі, каб па іх не ступалі чужыя капыты і каб не замінаць чужым фурманкам. Кірыла надломваў пальцамі ад кавалка хлеба столькі, колькі трэба было адкусіць, адрэзваў маленечкі кавалачак варанага мяккага сала і доўга мусліў у роце, стараючыся пераважваць бяззубымі дзёснамі. Па торбачцы яго прайшоў і суняўся нечы цень.

— Добрага здаровейка, дзядзька Кірыла!

Перад Кірылам стаяў Красуцкі, зусім не такі, як ён яго бачыў яшчэ зусім нядаўна — паблажэў і разам з тым пахарашэў, збрыў вусы, твар адразу стаў нейкі вельмі адкрыты і добры,— толькі цяпер Кірыла ўбачыў, што ў яго такія ясныя вочы. Шапка на ім сядзіць лёгка, адкрываючы лоб, на плячах хоць паношаная, але блішчастая скуранка, галіфэ з абшытымі каленямі.

— Божа мой, Мікалайка, ці цябе толькі я бачу? — заварушыўся Кірыла, адграбаючы торбу, выціраючы губы і працягваючы абедзве рукі.

— Ды, мабыць, мяне,— адказаў Красуцкі, смеючыся нейкімі вельмі цёплымі іскаркамі ў вачах.— От, пазнавайце.

— Даўно ж не бачыліся, чалавеча.

— Ды не так і даўно, гэта ж месяцаў з два, мусіць, толькі.

— Два? — перапытаў Кірыла.— От бачыш, а мне дык здалося, што можа ўжо год, як выкурылі тых яснавяльможных паноў. Але ж і здорава яны беглі. Толькі шкода, што бяды многа нарабілі, от Нівішча ж дашчэнту спалілі.

— Ну што ж, нічога не зробіш... Як жа пажываеце, дзядзька Кірыла?

— Ды пажываю так сабе, нішто, а ты от давай разам будзем падсілкоўвацца. Садзіся ў воз, от сюды, тут у мяне старая сала, як ведала, не на аднаго палажыла.

Кірыла пасунуўся на калёсах. Красуцкі торкнуў рукою па казырку, яшчэ больш адкінуўшы шапку, правёў пальцамі па тым месцы, дзе былі вусы, мабыць, яшчэ не адвыкнуўшы ад іх, і гарцануў на біла.

— Давайце, дзядзька Кірыла, бо без сала яно і папраўдзе трохі занудзіўся я.

Красуцкі еў смачна, у ахвоту, і ўвесь час не сыходзіла ў яго з твару нейкая шчаслівая рыска.

— От за што не пахвалю савецкую ўласць вашу, Мікалай,— сказаў Кірыла, сам адчуваючы на сабе і гэты

смак, і ахвоту, і радасны подым, так, як гэта бывае, калі ты сам нават не верыш, што з табою нешта добрае здарылася.

— А за што? — перастаў нават жаваць Красуцкі.

— Што гарэлкі не дазваляе. От бы нам з табою сёння да гэтага сала ды па чарачцы. На што ўжо я не надта важнецкі піток, а сёння, як у добрых людзей заведзена, не пашкодзіла б яна.

— Дурман,— адказаў Красуцкі.— Рэлігія і гарэлка — дурман для народа. Гэта правільна, і я піць не мог бы ўсё роўна.

Кірыла падумаў.

— Што да гарэлкі, то можа яно і дурман,— сказаў ён,— а от на лерыгію, то я з табою не пагаджуся. Лерыгія — гэта, брат Мікалай, спрадвеку ідзе, і чалавеку без яе няможна. Лерыгія — гэта... ну, як табе сказаць...

— Другім разам, дзядзька Кірыла, і пра рэлігію пагаворым, а сёння некалі. Вельмі дзякую за пачастунак, спяшаюся.

— Ты от што — забяры з сабою, што асталося. Забяры, забяры, спатрэбіцца, кажу. Бачу, што не надта зажыўся ты на той камерцыі... Дык дзе ж цяпер, што робіш, скажы?

— Па дзяржаўнай лініі, дзядзька Кірыла, работы хапае,— сказаў Красуцкі і злез з воза.

— Па дзяржаўнай лініі, іч ты, па галіфэ тваім бачу, рассмяяўся Кірыла.— А калі ж чарапкі свае пазабіраеш? Там жа і формы гэтыя твае валяюцца, парасяты іх лычамі качаюць па двары, і вёдры, і цабэркі. Так ты скоранька ўсяго адцураўся, што я думаў — можа няшчасце якое табе надарылася: знік, нават цэнтрыфугі тае не разабраўшы.

— Некалі было ўжо: вельмі ж моцна Чырвоная Армія націснула. Нам трэба было памагаць. Але я што хацеў сказаць: я перад вамі вінават, дзядзька Кірыла,— сказаў Красуцкі, папраўдзе гледзячы вінавата-прыязна.— Пактарня ж тая ў нас была толькі для прыклёпу, падпольшчыкамі мы былі. Каб вы ведалі, то, напэўна, і не пусцілі б нас.

Кірыла нахмурыўся. Бровы сталі строгія, і з твару збеглі маршчынкі тае весялосці, што ўвесь час свяцілася каля воч.

— Ты от што скажы, Мікалай: дзе цяпер Пятрок твой? — пачакаўшы, папытаўся Кірыла.

— А што,— затрывожыўся Красуцкі,— можа ён чаго натварыў?

— Ды не. Але ж пасля тае калатнечы я яго больш і не бачыў.

— Адразу ж тады я паслаў яго на сувязь з Чырвонай Арміяй. Там і астаўся, ваюе цяпер недзе пад камандаю ў таго, як вы казалі, з губою пакалечанаю.

— Шустры быў хлопец.

— Не кажыце, дзядзька Кірыла. І смелы. Ён жа пад тымі сырамі ды бітонамі зброю ды лістоўкі вазіў. І тады, як карнікі наскочылі, я проста быў утрупянеў. Але ён, мабыць, перахітраваў іх: недзе скінуў па дарозе. От і гэтага вы не ведалі, дзядзька Кірыла.

Кірыла ўздыхнуў. Задумаўся.

— То вы ўжо нам за ўсё прабачайце,— вінавата папрасіў Красуцкі.— А цяпер бывайце здаровы, бо я спяшаюся.

Красуцкі аберуч націснуў Кірылаву каструбаватую руку, торкнуў пальцам у казырок, збіўшы шапку на патыліцу, і пайшоў, прабіраючыся між вазоў, пераступаючы аглоблі. Кірыла з любасцю глядзеў у гэтую шырокую, ладную спіну.

«Ідзі, чалавеча, рабі сваю леваруцыю,— думаў ён.— Падпольшчыкі... Значыць, Пятрок табе нічога не сказаў. Ну, то і я не скажу, калі ён сам не прызнаўся. Няхай сабе, як ты кажаш, я нічога і не ведаў... Але калі б тады я не загнаў каня ў гумно пад носам у карнікаў ды не пахаваў у заперы ўсіх вашых і бонбаў і цыдулек, якіх повен воз было ў Пятра пад сядзеннем, то і ён не ваяваў бы, і ты наўрад ці стаяў бы сёння перада мною. От як, мой дарагі Мікалайка...»

СВІТАНАК

СВІТАНАК

1

У слуцкую газету «Вясковы будаўнік» паслаў свае вершы. І неўзабаве атрымаў запрашэнне з'явіцца ў рэдакцыю. Што ж там такое? З'явіўся. На мяне паглядзелі, пагаварылі. Запрасілі на работу.

У маленькім пакойчыку, на другім паверсе дома на Пралетарскай вуліцы, якраз над кіно «Эдысон», я ўпершыню ўбачыў, як робіцца газета, і пачуў, як добра пахне фарба, калі яна лажыцца на аддрукаваныя старонкі. Я апрацоўваў заметкі, збіраў падпіску, фальцаваў газеты, хадзіў на вёрстку ў друкарню. Часамі друкаваліся і мае вершы, але мне хацелася, каб не ведалі, што пішу іх я. Мабыць, памятаючы ўсё таго ж Байрана, я выбраў сабе страшнае прозвішча — Пірат.

Рэдактар Паўлюк Шукайла арганізаваў слуцкую філію «Маладняка». Часамі мы рабілі калектыўныя чыткі, наладжвалі вечары, і тады збіраліся ўсе маладнякоўцы — Апанас Атава, Язэп Сукала, Іда Чырвань.

Паўлюк Шукайла быў чалавек агнявой натуры, добрага, шчырага сэрца, партызанскай зухаватасці і бунтарства. І ў вершах ён прызнаваў толькі бунт і таму адразу пачаў кіраваць нас на футурызм. Мы ў ім не разбіраліся, але Шукайлава энергія перадавалася і нам, і мы выпіналіся як маглі, каб толькі папасці ў той футурызм. Ён з'ездзіў у Мінск і дамогся, каб выдаць у кніжніцы «Маладняка» слуцкіх філіяльцаў. Што ў нас ёсць сілы, і не абы-якія,— запрасіў прыехаць і паглядзець. І аднаго разу пад восень прыехалі-такі два знакамітыя пісьменнікі.

Пасля мы ездзілі ў Мінск на першы з'езд «Маладняка». З гэтае нагоды я напісаў быў апавяданне «Гасцініца «Бельгія», але яно прапала. На з'ездзе я ўпершыню ўбачыў Міхася Чарота, Міхася Зарэцкага, Алеся Дудара, Андрэя Александровіча, Кандрата Крапіву, Міхася Лынькова, Уладзіміра Дубоўку і вельмі маладых і прыгожых Зіну Бандарыну, Яўгеню Пфляўмбаўм, Наталю Вішнеў-

скую. І гасцей — Сасюру, Гадзінскага, Ягансена — ад Украіны.

За час, што працаваў у газеце, я пашыў сабе карычневы гарнітур. Справіў боты, а да іх і галіфэ. Адразу ж налажыў і леі — і мацней, і харашэй, дый фасон нешта значыць. Словам, я станавіўся на ногі, служба ішла няблага, а футурыстычныя вершы не выходзілі. Шукайла цярпліва чытаў Маякоўскага і сябе — не гаруй, вучыся.

Але ўсё гэта нечакана скончылася. Акругу скасавалі, закрылася і газета. Шукайла паехаў сакратаром райкома партыі ў Расоны, філія распалася.

Зноў колькі часу я гаспадарыў дома. Але ўсё гэта было ўжо зусім чужое. Намысліў ехаць у тыя ж Расоны. Тым больш што Шукайла зваў у лістах: абавязкова прыязджай, работа знойдзецца.

На дарогу бацька даў восем рублёў.

ГОСЦІ З МІНСКА

Неяк раз ішлі мы з Паўлюком Шукайлам па Пралетарскай вуліцы ў Слуцку. Была хмурная гразкая восень 1925 года. Я, памятаю, стараўся ісці асцярожна, каб не надта мясіць ботамі гразь, а Шукайла, надушаны, элегантна адзеты, у лакавых чорных туфлях, ішоў абы-як, ступаў дзе папала, і мне шкада рабілася гэтых туфляў. Але пасля я забыўся на іх, бо пачуў ад яго вельмі важную навіну: да нас у Слуцак прыязджаюць Кузьма Чорны і Язэп Пушча.

Дзён колькі я толькі і быў заняты гэтаю навіною. Жарты сказаць — я пабачу сапраўдных пісьменнікаў. А што яны былі сапраўдныя пісьменнікі, я ўжо ведаў. Не раз чытаў у газетах. А маленькія кніжачкі з бібліятэкі «Маладняка», тоненькія, з партрэтам аўтара на светлай вокладцы, цаною ў 20 капеек, заўсёды аж хвалявалі.

Нецярпліва чакаючы гасцей, я зноў перачытваў гэтыя кніжачкі і думаў: якое гэта вялікае шчасце — быць пісьменнікам.

І вось яны прыехалі. Абодва маладыя, абодва невысокія ростам, у чорных політах. Памятаю, як яны распраналіся ў вузенькім калідорчыку на кватэры ў Шукайлы, доўга прымайстроўваючы шапкі, бо яны ўсё падалі, не трымаючыся на кароткіх цвіках.

— О, дык у цябе, браце мой, кватэра нішто сабе,— сказаў Кузьма Чорны, увайшоўшы ў пакой.— Жывеш ты, можна сказаць, як слуцкі князь.

На тыя часы і папраўдзе была неблагая кватэра: адзін пакой, але прасторны, крэслы, абабітыя аксамітам, на канапе плюшавыя падушачкі. Усё гэта было, вядома, гаспадарскае,— відаць, што гаспадары жылі ў свой час раскошна.

Кузьма Чорны агледзеўся, пацёр адна аб адну рукі.

— Калі ў цябе такая важнецкая гаспадарка ў доме, браце Паўлюк, то, мабыць, і літаратура ў случакоў павінна быць нішто сабе,— сказаў ён, як бы падаючы знак, што можна пачынаць гаворку.

І гаворка пачалася адразу са спрэчак. Шукайла вельмі хацеў паказаць, што і ўсе мы, тутэйшыя маладнякоўцы, яго паслядоўнікі, самыя чыстакроўныя футурысты. Сам сябе ён лічыў правадыром новай плыні ў маштабе ўсяго «Маладняка» і цяпер меў выпадак пахваліцца гасцям, што і мы ў Слуцку не лыкам шыты. Ён адразу заявіў, што мы ломім усе старыя літаратурныя традыцыі і каноны, робім літаратуру новай рэвалюцыйнай фармацыі, і, каб давесці гэта практычна, пачаў чытаць свае вершы, напісаныя і папраўдзе так, што ў іх разбуралася рытміка і ўся прывычная вершаваная форма.

Язэп Пушча сядзеў у крэсле каля стала, склаўшы адна на адну свае прыгожыя рукі. Кузьма Чорны — каля задняй сцяны на канапе; ён сядзеў, адкінуўшы галаву назад і раскінуўшы рукі, як бы проста адпачываў. Ён, здаецца, нават не глядзеў, як ходзіць па пакоі Шукайла, чытаючы свае вершы, жэстыкулюючы і то гнеўна падымаючы голас, то спускаючыся да ледзьве чутнага шэпту. Нічога нельга было разабраць па твары ў Чорнага: думаў ён ці папраўдзе адпачываў, падабаецца яму гэта ці не. Поўны спакой у вачах, у чутачку адстаўленай ніжняй губе, у круглаватым падбародку. І ўсё ж такі па нечым другім, невядомым і не распазнаным, было відаць, што ён слухае.

Пасля я няраз пераконваўся, як хораша ўмеў слухаць Кузьма. Алесь Дудар, напрыклад, калі з ім гаварылі, пачынаў свістаць. Ідзеш з ім або сядзіш каля яго, ты яму гаворыш, а ён нешта насвіствае. Табе аж нядобра робіцца. А Чорны слухаў так, што ты забываўся на сябе, на яго, на ўсё, што вакол цябе робіцца, а жыў толькі адчуваннем патрэбы падзяліцца з ім.

Шукайла кончыў чытаць. Язэп Пушча паспрабаваў запярэчыць, процістаўляючы футурыстычнай грамавітасці радкі з імажынісцкай паэзіі. Ён чытаў плаўныя строфы, суправаджваючы мяккую рытміку жэстамі свае пластычнае рукі, але Шукайла перабіваў і ўвесь час позіркам адрасаваўся да Чорнага. А Чорны маўчаў. Спакойна ляжалі на спінцы канапы яго раскінутыя рукі. Мы, чалавек колькі, запрошаных сюды для паўнаты аўдыторыі — маладнякоўка Іда Чырвань, дзяўчына з Надрэчнай вуліцы Стася Шпакоўская (што стала Пушчавай жонкаю),— моўчкі сядзелі па кутках і заміралі ад шчасця, што нам давялося пабыць на такой сапраўднай літаратурнай гаворцы.

Нарэшце Чорны зняў рукі са спінкі канапы і палажыў іх на сядзенне.

— Вельмі добра ты робіш, браце Паўлюк, што пішаш,— сказаў ён.— Усё трэба пісаць, абы толькі людзі чыталі, бо гэта вельмі важна. Але ж ці варта ў вершах крычаць?

Паўлюк трохі збянтэжыўся. Але ненадоўга. Праз хвіліну ён пачаў даводзіць, што рэвалюцыя павінна гаварыць голасам мужным, што народ, які скінуў з сябе ярмо прыгнёту, не можа цярпець мярцвячыны і мяшчанскага пошапку.

— Ды яно, браце, у кожнага бывае такая часіна, што хочаш пакрычаць,— лёгка згадзіўся Чорны.— Няўдача якая ці пасварышся з кім. Але ж яно скора і праходзіць. Так што, панечку мой, можаш сабе і пакрычаць, калі табе так хочацца.

Спрэчка не выходзіла. Гэта было ясна. Чорны нават не спрачаўся, ён нейкім другім, бакавым ходам пераводзіў гаворку, калі яна была не ў яго плане. І каб зусім адчапіцца ад футурызму, ён пачаў пытацца пра нейкага Шлёму, які таргуе мясам на ятках, пра нашы літаратурныя справы — ці многа мы пішам і ці можна падабраць, каб выдаць кніжачку нашай філіі ў бібліятэчцы «Маладняка».

Нам вельмі хацелася, каб Чорны што-небудзь пачытаў, але ён сказаў, што на памяць чытаць не ўмее, а з сабою нічога няма.

— Няхай Пушча чытае,— сказаў ён,— у яго добра выходзіць. А Паўлюку не трэба. Ён ужо і начытаўся і нагаварыўся, хопіць з яго.

Неўзаметку гаспадыня, з высокай прычоскаю і ў сукенцы з пышнымі зборкамі, пачала насіць і стаўляць на стол пачастунак. Чорны падышоў, нагнуўся над сталом, паглядзеў.

— А пан гаспадар жыве-такі заможна.— Ужо тады Чорны як бы практыкаваўся ў дыялогах, якія меўся даць сваім героям.— То гэта ў пана сваё ці куплёнае? — І тут жа вельмі сур'ёзна папытаўся: — Ты, можа, і папраўдзе, Паўлюк, хочаш нас пачаставаць?

Пасля зноў чыталі вершы і гаварылі да позняй ночы. Мяне ніколі не цягнула душой да футурызму, а тут гаварылі пра розныя кірункі. Я слухаў і не ведаў — які ж з іх лепшы, дзе шукаць самога сябе...

Не ведаю чаму, але я прыслухоўваўся больш да Чорнага. Хоць ён гаварыў мала, але мне здавалася, што ва ўсім — як ён гаварыў, як слухаў і нават як маўчаў — было нешта патрэбнае, нейкая вельмі блізкая мне праўда.

СВІТАНАК

(працяг)

2

Я думаў, Расоны — мястэчка, аж гэта невялікае сяло. І цэнтр размяшчаецца не ў ім, а ў колішнім маёнтку пана Глазкі. Будынак з чырвонай цэглы, над самым возерам, як замак, з вымудрамі — з порцікамі, з бельведэрам. Залезшы туды, як на званіцу, можна далёка аглядаць наваколле. Тут былі выканком і райкомы — партыі і камсамола.

Хачу трошкі адхіліцца. Колькі часу таму назад Генадзь Бураўкін, будучы карэспандэнтам «Правды», сабраўся паехаць на Расоншчыну. У гэтую дарогу ён запрасіў Васіля Вітку, Алеся Асіпенку і мяне, ведаючы, што я з ахвотаю згаджуся. Расоны цяпер вялікае, шырока разбудаванае мястэчка. Але яны далі мне не радасць спаткання, а боль. Самога сяла Расонаў я не знайшоў, яно спалена і знішчана фашысцкімі дзікунамі. Расоны рассяліліся на новым месцы, якраз каля Глазкавага замка, увабраўшы яго ў сябе. На месцы ж старога сяла стаіць толькі адна мураваная царква з чырвонымі ранамі на зрашэчанай кулямі тынкоўцы. Я стараўся аднавіць у памяці, дзе стаяла там школа, у старэйшых класах якой вучыліся вечна ласкава здзіўленая дзяўчынка Тайба і другая — надзвычай яркай, але строгай і халоднай прыгажосці Усвайская. Стараўся ўявіць, дзе стаяла там пошта, начальнікам якой быў бела-

брысы, з высокаю прычоскаю, стройны юнак Красоўскі. У школе працаваў такі ж малады і белабрысы, толькі заўсёды маўкліва-задуменны, як бы расчараваны настаўнік Драгілеў, ён да самазабыцця любіў музыку. Аднаго разу на пошту прыйшоў баян, некім выпісаны з раёна. Ён ляжаў на пошце і тыдзень, і два, запакаваны, абшыты і змацаваны сургучнымі пячаткамі. Драгілеў страціў сон, ён хадзіў на пошту кожны дзень пасля ўрокаў у школе, просячы, каб Красоўскі даў пайграць. Як жа дасі пайграць, калі на ім ляжаць пячаці? І ўсё ж не мог сцерпець Красоўскі, гледзячы на пакуты свайго таварыша, распячатаў-такі пасылку. І ўвесь вечар Драгілеў разводзіў мяхі і плакаў самымі шчаслівымі слязамі.

Не знайшоў я і чыгункі, што ішла за Расонамі. Па лініі, дзе ляжалі рэйкі, разросся бярэзнік. Не знайшоў і станцыі, што стаяла ў густым ельніку ў кірунку на Пскоў, дзе быў сакратаром камсамольскай ячэйкі...

Я працаваў загадчыкам нардома. Ён мясціўся ў тым жа замку, у зале колішняй дамавой царквы. Гэты час я вельмі люблю, мне здаецца, што тады мы многа рабілі і дружна жылі — рабацiністы сакратар Макар Шалай, загадчыкі аддзелаў Ліда Іванова, Паўлючэнка, Ткачэнка.

Мяне пасылалі па сёлах праводзіць сходы, наладжваць культработу, рабіць даклады, асабліва па міжнародным становішчы. Ездзіць надта не было на чым, найбольш хадзіў пехатою.

Памятаю, ішоў у Сакалішча. Гэта было далёкае сяло, кіламетраў за дваццаць з гакам. Па дарозе былі лясы. Агітпроп Паўлючэнка даў мне свой наган — на ўсякі выпадак. Ісці было весела: то сёлы з павыгароджванымі выганамі, то палі і сенажаці, то пералескі і лясы. І ўсюды гэтыя фарбы восені з жаўтаватым лістам, з нітачкамі павуціны, з нейкім летуценна-блакітным небам.

А пасля абступіў мяне лес з ціхім трывожным шэлестам, з павілястаю дарогаю, што на кожным павароце то звужвалася, то расходзілася на многа каляін, то стульвалася, што аж было цёмна, то рассцілала вясёлыя палянкі. У мне брадзіў нейкі хмель радасці; не ведаючы, што б зрабіць, я выняў з кішэні той наган, падняў угору і стрэліў. Нават рэха не магло абазвацца: тут жа прыглушыла яго лістота. У Сакалішчах мяне ўжо чакалі: у нейкай самай шырокай хаце сядзелі не толькі камсамольцы, а старыя дзяды, маладзіцы. З ходу распрануўшыся і кінуўшы плашч на крэсла, я пачаў рабіць даклад.

А ў Матулёва я пайшоў з біноклем. Не памятаю, у каго ўзяў: цэйсаўскі, з цвёрдым чорным бляскам, з чыстым далёкім прыёмам — вельмі ж гаспадар прасіў яго берагчы. «Ну што ты, дзе ён дзенецца!» Усю дарогу я толькі і рабіў, што глядзеў у яго: усё перад вачыма — далёкі хутарок і жанчына, што развешвае бялізну на плоце і не ведае, што за ёю наглядаюць; фурманка, што выехала з лесу і завярнула на вузкую палявую дарожку; сцежачка, што на варотах то абрываецца, то зноў паказваецца, выбегшы на ўзгорак; заяц, нечага спужаўшыся, ашалела сігае з боку ў бок. Любата!

У Матулёве я павесіў плашч за кулісамі невялічкай сцэны. Пасля даклада мне апладзіравалі і запрасілі на песні. А калі сабраўся ісці і надзеў плашч, у кішэні бінокля не было...

3

З Расонаў паслаў сшытак вершаў у «Маладняк». Неўзабаве мне іх вярнулі. Алесь Дудар пісаў, што слабыя. Я іх спаліў, а Дудару напісаў паштоўку, не зусім згаджаючыся з яго ацэнкай «новай плыні». Напісаў і задумаўся. Няўжо мае вершы такія благія? І можа папраўдзе было лепш, калі я пісаў пад Янку Купалу і Байрана? Але ж не, рэвалюцыйная паэзія павінна адкрываць нешта новае! Не заўважыў, як у такіх разважаннях скрэмзаў усю паштоўку рознымі завітушкамі, жаночымі галоўкамі, чорцікамі. Але перапісваць не стаў. І вельмі скора прыйшло паведамленне, што за хуліганства з «Маладняка» я выключаны.

Праўду сказаць, дык і я сам бачыў, што вершы ў мяне выходзяць нейкія не свае, нават мне самому чужыя. Пачаў пісаць прозу. Апавяданне «Таіса» паслаў у «Чырвоную Полаччыну». Надрукавалі.

Але не факт надрукавання абумовіў канчатковы паварот да прозы, а цёплыя людскія словы. Неяк да нас у Расоны прыехаў загадчык акруговага аддзела народнай асветы Васіль Мухін. Ён быў чалавек вельмі непасрэдны, сам любіў літаратуру і, пазнаёміўшыся са мною, пацiснуў руку.

— Ну, вось добра, што я вас убачыў. Цяпер усім раскажу, што ніякага шрама ў вас няма,— сказаў ён.

Аказваецца, якраз у той час, як была надрукавана «Таіса», у Полацку праходзіла настаўніцкая канферэнцыя. Апавяданне стала прадметам размовы сярод настаўнікаў. У Мухіна пыталіся пра аўтара: хто ён такі, стары ці ма-

лады, і ці праўда, што на твары ў яго астаўся шрам. Рэч у тым, што апавяданне пісалася ад першай асобы, шрам быў у героя апавядання, і ўсім думалася, што аўтар піша пра самога сябе.

Неўзабаве я пераехаў на работу ў «Чырвоную Полаччыну». Горад, газета, зноў друкарскія фарбы — гэта было больш па душы. Дый рэдактарам быў найдабрэйшы чалавек — Сцяпан Сямашка. А сакратаром рэдакцыі — Пятрусь Броўка. Наогул, мне шанцавала на добрых людзей. Былі і дрэнныя, але яны неяк скора забываліся. Можа такая ўласцівасць чалавечай памяці, што благога яна доўга не хоча трымаць. А можа тут проста ўмоўнасць, бо вельмі часта благое ідзе не ад самой душы чалавека, а ад яго пасады ці абавязку. Бывае ж так, што людзям не пад сілу іх абавязак, і яны вельмі стараюцца не паказаць гэтага.

Найбольш мы любілі Сямашку, мабыць, за тое, што ён нам верыў. Мы рабілі газету з нейкім святым адчуваннем. Броўка пісаў вершы. Простыя, даступныя, і мне было шкода, што я ад гэтага адступіўся. Вакол газеты гуртаваўся літаратурны актыў. У Валынцах настаўнічаў Сымон Хурсік, ён ужо быў вядомы пісьменнік, меў кніжку ў маладнякоўскім выданні — «Першы паўстанак», і калі прыязджаў, то мы бачылі ў ім старэйшага. Да нас час ад часу наязджалі з Мінска — Андрэй Александровіч, Алесь Дудар, Анатоль Вольны. Наставала патрэба выдаць свой альманах. Разам з мінскімі пісьменнікамі выдалі два альманахі: «Наддзвінне» і «Росквіт».

Але перад намі паўстала і другая задача — вучыцца. Адзін за адным мы пацягнуліся ў Мінск. Шукайла ўжо быў там і нас заахвочваў.

Памятаю, калі мы з Шалаём прыехалі, ва універсітэце ўжо ішлі заняткі, а нам вельмі не хацелася траціць года. Шукайла быў не такі чалавек, каб бядзе не даць рады: ён пайшоў з намі да наркома асветы таго часу Антона Баліцкага. Нарком жыў у архірэйскім доме супроць сквера, дзе цяпер стаіць Дом афіцэраў. Вялізны, нізкі і цьмяны пакой, бадай што пусты. Масіўны стол, высунуты траха не на сярэдзіну, некалькі старадаўніх крэслаў, і на адным з іх ускінуты на спінку пінжак. Быў ранак, нарком выйшаў з другога пакоя, здавалася, яшчэ нават не выспаны, у карычнева-паласатай піжаме, з вялікімі акулярамі на буйным нізкавокім твары. Стаўшы каля крэсла, ён выслухаў Шукайлу і нахмурыўся. Але Шукайла не даў доўга ду-

маць наркому: ён сказаў, што нам конча трэба вучыцца, бо мы будаўнікі новай культуры.

— Дык жа спазніліся! Як жа будзе з залікамі?

— Уся сіла ў вас, дзядзька Баліцкі. Калі трэба, то, значыць, трэба: залікі здадуць, стаўшы студэнтамі.

Крэкчучы, упіраючыся, нарком прыгнуўся да стала, каб стоячы напісаць запіску рэктару універсітэта.

Пазней годам прыехаў Пятрусь Броўка. Здаецца, нарком напісаў і яшчэ адну запіску.

4

У Мінску мы адразу апынуліся ў сапраўднай літаратурнай атмасферы — сходы, дыспуты, літаратурныя вечары і выступленні. У асноўным полацкім зямляцтвам арганізавалі сваё аб'яднанне — «Літаратурна-мастацкую камуну», на так званай мясцовай футурыстычнай платформе.

Арганізацыя гэта заснавалася не ад духу часу і творчай патрэбы, а ад зухаватасці і пратэсту: «Ах, вы нас у «Маладняку» не прызнаяце? Ну дык мы зробім сваё згуртаванне». А ў згуртаванні тым шмат хто нават яшчэ не спрабаваў пісаць.

Цяпер дык я проста дзіўлюся, як мы асмеліліся з такім актывам ісці да ўрада і прасіць, каб нас зацвердзілі як творчую арганізацыю. Мы ледзьве набралі дзесяць чалавек, патрэбных па статуце, загадзя ведаючы, што добрая палавіна з іх уключана ў спісак толькі дзеля нормы. І з гэтым спіскам пайшлі да старшыні Саўнаркома таго часу Мікалая Галадзеда. Гэта на плошчы Свабоды, у будынку, дзе цяпер музычная школа, і ў пакоі, дзе вісіць таблічка «клас № 1». Праўда, пасля надбудовы там усё, здаецца, парушана.

Галадзед сядзеў за шырокім сталом, у ваеннай гімнасцёрцы, з гладка зачэсанымі назад валасамі. Ва ўсёй яго постаці, прамой, акуратнай, адчувалася прастата і ўнутраная дысцыпліна. Толькі не стасавалася з прастатой дзелавітасць, з якой ён адразу неяк усё бачыў і разумеў. Прагледзеўшы наш спісак, ён запытаўся:

— Усе пішуць? Усе пісьменнікі?

— Будуць пісаць, Мікалай Мацвеевіч,— адказаў Шукайла.— Гэта ўсё новыя, маладыя сілы.

— Бачу,— сказаў Галадзед і ўсміхнуўся.— Думаеце, ваша аб'яднанне патрэбна літаратуры?

— Абавязкова! — Шукайла цвёрда ткнуў у падлогу кіем і сцяў губы, што азначала таксама, што ён гаворыць бясспрэчную ісціну.— Рэвалюцыйная літаратура павінна шукаць новых шляхоў. Мы будзем змагацца супроць усякай традыцыйнай гнілаты і сентыментальнага мяшчанства. Мы — за росквіт жыцця!

Такая агульная дэкларацыя нічога не гаварыла пра наша творчае аблічча. На адну хвіліначку я ўбачыў ваганне, калі Галадзедава рука ўзяла і крутнула ў пальцах асадку. Ён падпісаў наш спісак.

— Паспрабуйце. Пабачым,— сказаў ён, палажыўшы асадку.

Цяпер настала самае цяжкае — грошы. Бо што значыць аб'яднанне без свайго друкаванага органа? Нам трэба часопіс. Але Галадзед, мабыць, гэта прадбачыў.

— Колькі? — папытаўся ён.

Мы паказалі калькуляцыю на рэгулярнае штомесячнае выданне.

— Не, пакуль што дам толькі на адзін нумар. А там пабачым, што ў вас выйдзе.

Тут жа ён выклікаў маладога высокага чалавека і распарадзіўся з асабістага фонду выдаць «Літкамуне» дзесяць тысяч рублёў.

Пакуль ішла арганізацыйная мітусня, мы яшчэ адзін аднаго трымаліся. Цешыла вонкавая старана і арыгінальнасць. Памятаючы прыклад футурызму, што трэба нечым вылучацца, мы хадзілі бадай што ўсе з кіямі і ў капелюшах, што на той час было навіною. Трымалі сябе ваяўніча і задзёрыста. На літаратурных вечарах і дыспутах чыталі крыклівыя вершы, траха не хапаліся загрудкі ў спрэчках. Я гавару «мы» вельмі ўмоўна, бо ўсё гэта за нас рабіў Шукайла. Мы былі як фон: калі было трэба — мацней крычалі і грукалі ў падлогу кіямі.

Але як толькі справа дайшла да практыкі, то адразу ўбачылі, што ўсе мы розныя, што ў нас няма ніякага творчага адзінства. Выявілася, што па душы нам куды бліжэй традыцыі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Пушкіна ды Талстога. Разбіўка нашых вершаў на сечаныя радкі ішла сілком, была не арганічная. Крык наш і пратэст быў наіўны, голас надрываўся і фальшывіў. Асабліва гэта выявілася, калі пачалі складаць першы нумар «Росквіту». Вершы былі традыцыйныя, сялянскія, з лірыкай і подыхам ніў, радкі прасілі напеўнасці, а мы ламалі і настаўбурчвалі іх. Проза прасіла роздуму, каларыту, можа, нават нейкага коласаў-

скага спакою, а мы рвалі яе на кавалкі, перабівалі нервознымі паўзамі, клічнікамі, шматкроп'ем, каб надаць ёй футутэйшы выгляд. За ўзор мы бралі часопіс украінскіх футурыстаў «Новая генерацыя», дзе з набору рабілі пеўнікі, зоркі, розныя рамбічныя і кубічныя фігуры. Раздзел крытыкі не толькі граміў класіку і традыцыі — ён абвяшчаў вайну наогул усяму таму, што ляжала па-за межамі «Літкамуны». Як я бачу, дык і цяпер многія «наватары» ідуць не далей вось такога зухаватага крыку, думаючы, што адкрываюць яшчэ адну Амерыку.

Памятаю, у Шукайлы, на яго пустой кватэры па Чырваназорнай вуліцы, парассцілаўшы паліты і кажухі, мы ляжалі на падлозе, перабіралі рукапісы, крэмсалі і спрачаліся. І патроху пачыналі цверазець. Нешта ў душы было неспакойна. Мы бачылі, што вайну абвяшчаем сур'ёзную, а шаблі ў нас з трэсак. Дзеля чаго мы ўсё гэта робім? Чаго хочам? Хто і дзе нашы ворагі? Навошта і каму гэта трэба? І да чаго дойдзем? Дарогі гэтай ніхто з нас не бачыў.

Сяк-так склалі нумар. Як у людзей, паявілася ў ім дэкларацыя, напісаў яе Паўлюк Шукайла, і мы яе ўбачылі толькі тады, калі трэба было падпісваць нумар часопіса ў свет. Гэта было ў друкарні, мы стаялі між друкарскіх машын — Броўка, Шалай і я,— чыталі яе, і нашы сэрцы сціскаліся болем. Такая дэкларацыя была процi нашых перакананняў, яна як бы адбірала ў нас права на тое, што мы любілі, чым жылі: на Купалу, на Коласа, на тую манеру, якой мы дагэтуль умелі пісаць. Нам вельмі не хацелася, каб такая дэкларацыя рабіла нас адшчапенцамі. Абараняў яе толькі Шукайла, і калі з ціхага, спакойнага наш пратэст пачаў пераходзіць на раздражненне, калі выявілася наша аднадушная трывога ў выпадку яе паяўлення ў свеце і каб палажыць канец спрэчкам, я з нецярплівай асалодай вырваў гэтую старонку, набраную адразу за тытулам сечанымі радкамі, як верш.

Ужо дома я знайшоў яе, пакамечаную, у сваёй кішэні. Я падумаў: дзякуй богу, што ні ў кога яе не асталося і ніхто пра наша дзівацтва нават не будзе ведаць. Але потым падумаў іначай, не знішчыў: ніколі не трэба папраўляць час, праўда астаецца заўсёды за ім.

Некалі гэтую дэкларацыю я пераказваў у апавяданні «Смага». Але цяпер падумалася, што ёй куды лепшае месца вось тут:

Беларуская Літаратурна-мастацкая Камуна
выйшла ў паход
на палёх, па шляхох
барацьбы
за росквіт!!!
(вызваленне чалавецтва
ад прытухлых,
заскарузлых
конанаў,
традыцый
архіўных
вякоў).
Ідзе ў наступ,
руйнуе!
літаратурна-мастацкія
плецяні
і забарыкаджанні,
сплеценыя,
нацяганыя
з трантаў
і гануч
стар'ёўшчыны.
У шэрагах фронту
няма
плякатаў,
шыльдаў,
маскіравання
ад сапраўднасці.
У руках
не сцяг,
а вытворчасць!
Сябры камуны
работнікі фабрыкі
літаратуры
і мастацтва;
вытворчасць —
акорд жыцця.
Пад лязг
фабрычных машын,
спеў жняярак і кос
чуецца жыцця гудок —
пачынаецца
наша праца!..

Пасля другога нумара «Росквіту» мы зноў сабраліся на Шукайлавай, цяпер ужо больш абжытай, кватэры па вуліцы 11 ліпеня (цяпер Кірава) і большасцю галасоў парашылі, што далей нам рабіць няма чаго.

Вядома, і маладнякоўская «бурапеннасць», і «Літаратурна-мастацкая камуна», і іншыя розныя акалічнасці пакінулі на мне свой глыбокі і доўгі след. Самы цяжкі і доўгі — ад нашага наіўнага ўяўлення, што новая рэвалюцыйная літаратура павінна пісацца зусім іншай мовай і

іншым стылем. Іх было вельмі многа — стыляў таго часу, я іх і баяўся, і цягнуўся да іх. Свежа, па-свойму, вельмі непадобна на класічную спакойнасць пісалі многія савецкія пісьменнікі — Барыс Пільняк, Усевалад Іванаў, Ісак Бабель, Юры Алеша, Арцём Вясёлы. У іхняй манеры было многа квяцістасці, метафарычнай смеласці, дынамікі, зухаватай настаўбурчанасці, якая часам ішла насуперак логікі нават. І з болем у душы, любячы і шануючы тых жа Янку Купалу і Якуба Коласа, я з усяе сілы намагаўся, каб папасці ў самы найноўшы лад. Мабыць, найбольшы ўплыў на мяне зрабіў Барыс Пільняк сваім стылістычным бунтарствам.

Да гэтага часу я стараўся не ўключаць у свае кнігі тых сваіх апавяданняў, ды неяк падумалася, што гэта несправядліва. Яны ж нясуць на сабе маю літаратурную маладосць. «Смага» — гэта як бы споведзь на часе роздуму аб лёсе горада і вёскі, спроба асэнсаваць нейкую гістарычную супярэчнасць паміж імі, зразумець і прыняць новую рэвалюцыйную рэчаіснасць для сяла. «Запіскі майго суседа» — знак майго захаплення філасофіяй на той час, пошукі непасрэдных адносін грамадскага сужыцця; на апавяданні, мабыць, можна распазнаць цень чыіхсьці ўплываў.

«Старасць» таксама пошук: свежасці, маладосці, дабра. Яна прысвечана Заіру Азгуру, бо, па сутнасці, ён як скульптар, як выразнік прыгожага гарманічнага цела, па сутнасці, ён даў мне і тэму і спосаб яе скульптурнага вырашэння.

Няхай сабе ў тых далёкіх пошуках і ў роздуме было многа наіўнага, але ж перад сённяшнім днём заўсёды быў учарашні.

СМАГА

1

Магістраль...

На трамваях, на аўтобусах, на рамізніках, пехатою — рупна спяшаюцца некуды людзі. Гар, пыл, спёка. Гулкая, душная мітусня. Горад грыміць: рухам, жалезам, чалавечым жыццём. Адрываюцца, чмякаюць па тратуарах падэшвы. Даганяюць, крыжуюцца — па бруку — машыны.

Жалезнымі бэлькамі грузна грымяць балаголы. Раскацісты гул мяшаецца з аўтамабільнымі сірэнамі, з падэшвамі, з тварамі, з пылам, з крыкам газетчыкаў — у вэрхале, у тлуме бясконцай імклівасці. Вуліцы разбягаюцца, нырцаюць у завулкі, абгінаюць кварталы — ад цэнтра, магістралямі, нервамі — на ўскраіны, на заводы, на фабрыкі.

Гар, пыл, спёка.

Чалавечая душная мітусня.

Разарваўшы няроўны шар камяніц, падымаюцца рыштаванні. Пахне цэментам, дошкамі, вапнаю. Калаўротамі, машынамі, між драўляных крокваў — наверх, на паверхі — падымаецца цэгла. І ў гуле, у стукаце, у шоргаце, у звоне — падымаюцца сцены. І там ужо — наверсе, на паверхах, між крокваў, між рыштаванняў — чалавек здаецца маленькаю часткаю вялізнага механізма. Нават здаецца яшчэ на хвіліну, што чалавека няма, што ім камандуе жалезная воля машыны. Сістэма.

Так: горад — сістэма. І ўсё ж такі ў гэтай сістэме — над ёю — самая складаная сістэма — чалавек.

А едучы ў Рудзенск, да Лёлі, праз шыбы вагона відно было, як узораная загонамі ўвосень адпачывала зямля. Чорным драпам выгіналася яна па ўзгорках, па нізінах. І відно было: да шырознага драпу зямлі недарэчна, кучкаю прылеплена старадаўняе сяльцо. Пярэстыя, саламяныя, убогія, атуленыя дзічкамі хацінкі выглядаюць пакрыўджана. І, здаецца, калі падняць край чорнага драпу зямлі, калі махнуць ім — разбырзнуцца недалужныя хацінкі, здзьмухнецца нарокам прылепленае сяльцо.

Якая вялікая трагедыя зямлі, калі ёю не можа камандаваць чалавек! І якая вялікая трагедыя чалавека, калі душыць, панствуе над ім зямля!

І тады, гледзячы ў акно вагона, можна было думаць: тысячагоддзі налічвае вось гэтая букалічная форма жыцця; тысячагоддзі праходзілі бурамі, войнамі, рэвалюцыямі, бунтамі з пахам чалавечага поту, крыві, каб так і астацца сялу ў букалічнасці, не сцерці бур'яністых межаў. Як доўга — ажно дагэтуль — дарогамі крывавымі блудзіла зямля. Ажно дагэтуль ліпее — шнурамі, дзядзінцамі, лапцямі, горам, нястачаю, смыкам сахі — старасветчына...

І ўсё ж, можна бачыць крывую дарогу сяла — старадаўняга, недалужнага — не любіць яго, уцякаць — і хва-

рэць з ім. Можна бачыць кіпучую імклівасць горада, сістэму, рытмічную стройнасць, ісці да яго — і крывіць дарогамі.

Так.

Але гэта апавяданне пра сябе.

2

Залетась на рагу вуліц Свярдлова і Карла Маркса я нагнаў чалавека. На чалавеку была шэрая даматканага сукна старэнькая світка, даматканыя, з асцюкамі на лёнках і ўкручаныя лапцямі порткі. На спіне чалавек нёс дзіцянё. Ногі яго на тратуары станавіліся па-старэчы, няўпэўнена, і відно было, што яму цяжка несці сваю ношку. Нагнаўшы яго, я знарок прыцішыў хаду. Збоку відна была зусім сівая паблытаная барада. Твар — у густа пераплецеиых маршчынах — сіняваты, бяскроўны. Хрыплае дыханне вырывалася цяжка, выкідаючы белыя пукі ў халоднае зімовае паветра. На тоўстых брывах ляглі танюсенькія іскаркі інею, на лоб вылазіла мокрая плойка рэдкіх валасоў.

Куды ён нясе гэтую ношку і няўжо не холадна гэтай дзяўчынцы голымі рукамі трымацца за плечы? Можа яму трэба памагчы, можа параіць што трэба?

Але стары прыцішыў хаду, як бы шукаючы чаго, і, урэшце, угледзеўшы мяне, сам папытаўся:

— Скажэце, чалавеча таварышу, дзе тут Дом селяніна знайсці ці больніцу якую?

Я паказаў Дом селяніна і больніцу. Але не хацелася адыходзіць ад яго.

— Здалёк, дзед?

— З Аршаншчыны. Можа чулі? От я адтуль і прыехаў.

— Чуў. А куды дзяўчынку несяце?

— Так вот жа ў больніцу і нясу. Захварэла яна ў мяне, там дахтары не лечаць, а паслалі от каб сюды прывёз,— рыпеў у марозе голас.

Пасля ён расказаў, што дзяўчынка гэта даччына, унучка, што каторая пара як захварэла на нейкую зацяжную хваробу і яму даводзіцца з ёю пакутаваць, бо дачка таксама нездарова, а мужа ў яе няма — аж пад Кітай паехаў у заработкі.

— Цяжка мне старому. Чуць ліпею, а падмяніць няма каму,— і ён накаса папраставаў пад Дом селяніна.

У расшчэрбіне Міхайлаўскае вуліцы, у доме № 10, як і заўсёды, іграў раяль. Пад нагамі ўтоптаным снегам глянцаваўся тратуар. Беглі людзі, скоранька семянілі нагамі. З каштаноў асыпаўся іней. Раяль далятаў ужо толькі абрыўкамі, і абрыўкамі — хрыпам, барадою, дзяўчынкаю на спіне — астаўся ў памяці дзед.

Недзе ў Аршаншчыне яго сям'я, гаспадарка. І ён, якому даўно пара адпачываць, едзе ў свет з хвораю дзяўчынкаю, бо больш няма каму. Такая ж невясёлая, мабыць, і яго гаспадарка, ад якой трэба ехаць — аж пад Кітай — у заработкі. Вось як. Але чаму такі знаёмы здаўся гэты стары з сваёю цяжкаю ношкаю. Значыцца, іх шмат і спатканне толькі разварушыла памяць? І хіба не такімі я памятаю Макарчука, Рыжка ды дзеда Амельку? Калі не памерлі, дык яны, мабыць, асталіся такімі і дагэтуль. Гэта там — у памяці — яны сядзяць з люлькамі на прызбах або на печы і таксама хрыпяць пасушанымі грудзямі. І таксама яны могуць гаварыць толькі з болем, з векавым нагарам, стоячы толькі на сваёй векавой дарозе. Я там вырас, але адтуль з'ехаў і цяпер от хаджу ў пальчатках і ў капелюшы. Яны не пазналі б цяпер мяне. Не пазналі б вось гэтых — некалі мазалямі абкіданых шырокіх рук, што карчавалі зямлю, часалі бярвенне, цягалі падоўжную пілу. Яны не прызналі б мяне за свайго...

І ў гэтым дакоры, недзе ў глыбіні, я пачуў, як заварушылася нядобрая мулкасць: мне стала невядома чаго шкода.

3

Чалавек мае найвялікшую здольнасць — смяяцца з самога сябе. Можа гэта і не надта справядлівы занятак — здзек з самога сябе,— але затое патрэбны.

І тады з самога сябе мне стала смешна. Народніцтва, Глеб Успенскі. Інтэлігенцкае ўслаўленне капелюша і памытых рук. Але гэта хутка прайшло, схавалася ў жыццёвай мітусні. Трэба было быць складанаю часцінкаю механізма сталіцы, круціцца ў віры імклівых дзён, бо ў чалавека вялікая прага жыцця і любові, і не можа — не павінен — чалавек не аддаваць жыццю сябе.

Толькі летась, праходзячы паўз новы Дом селяніна, успомнілася пра Музей. Усходы паднялі на другі паверх.

Ці праўда, што музеі дэманструюць чалавечую культуру? І ці не дэманструюць яны ў гэтай культуры ўбогасці? Недасяжнасць грэчаскага мастацтва? Рафаэлева Мадонна

і непаўторнасць ліній Геркулеса Фарнэскага? Безумоўна. Але гэта і не павінна паўтарацца, бо ўсякі, нават геніяльны, паўтор — гэта ёсць бяссілле непаўторы. Даганяць Грэцыю — гэта значыць, бегчы назад па забытую торбу.

Але ў першых пакоях сціпла да сцяны прытулілася карціна. На кавалку палатна простымі, роўнымі фарбамі — сіняе, нізкае пабегла ўдалячынь неба. Туды ж, удалячынь, пад небам — шырокаю разлегласцю паслаўся пясок. Гладкая, пустэльная роўнядзь. Без канца. І на гэтай пустой, бяскрайняй роўнядзі прыкархнулі два кусты, як бы нехта праходзіў па пустэчы і забыўся — згубіў іх. І такія адзінокія гэтыя два кусты, што, здаецца, яны павінны крычаць або плакаць.

А збоку другая карціна. З больш багатымі фарбамі — з зялёным, раздумным Палессем. У гушчэчу ліставога лесу пабегла, занырцала грэбля. На грэблі суняліся калёсы, чалавек злез з воза, дастае закурваць, а да яго з балота ідзе другі чалавек — палатняны ў капелюшы паляшук — з касою на плячы, топчучы высокую па пояс балотную траву. Здаецца: гэтыя два чалавекі зараз сыдуцца, знойдуць доўгую селавую гаворку, а на грэблі, абганяючы аваднёў, чакацьме буланы, і, трымаючы лейцы, моўчкі на возе сядзецьме жонка. Спакваля ляжа змрок, і тады коратка заляскочуць па грэблі калёсы.

Ціхім адвячоркам яшчэ доўга чуцён будзе гэты запозьнены лёскат.

Карціны зроблены проста, і, сціпла прытуліўшыся да задняй сцяны, яны не прэтэндуюць на лепшае месца.

Пасля пайшлі аддзелы этнаграфіі: жабрачая, галецкая Беларусь з жорнамі, з сохамі, з абечкамі, з лучнікамі, з берасцянкамі — у зрэб'і, у кастрыцы. Які вялізны крок зроблены на тое, каб усё гэта выглядала помнікам. І які кароткі пройдзены час, каб усяго гэтага астацца сведкам. Чарадою праходзіць у памяці лыкавая, лучніковая Беларусь. І тут вось, у гэтых смыках, у нацягічах, у берасцянках, усё яе славутае багацце, а ў кіях, на якіх пастухі рабілі зарубкі,— уся культура. Славутая, сляпая самабытнасць! Хто можа варочацца назад па забытую торбу? І хіба не з'яўляецца сімвалам усяе дарэвалюцыйнае Беларусі вось гэтая непрыкметная карціна з двума сіратлівымі кустамі ў пустэчы, у бяскрайняй тужлівай сіні? Што каму паможа тая забытая торба?

...А чалавечая памяць багатая. Ёй трэба насіць усё тое, чаму не трэба — чаму нельга — зноў паўтарацца. І добра

бывае апынуцца ў прыемным ад перажытасці хваляванні. Успомніць забытае, але знаёмае, чапаць яго пальцамі памяці.

Трэба будзе з Лёляю... прыйсці, каб разам паглядзець. Няхай... што скажа яна.

Але Лёля не спынілася так доўга на карціне. Яна мелькам прабегла і па іншых пакоях, дзе так надоўга спыняўся я. Яна нешта нават сказала, і я здагадаўся: аднакава мы можам разумець жыццё, але неаднакава мы яго бачылі.

— Чаго ты задумаўся? — пыталася яна ўжо на вуліцы.

— Так неяк... Мне хочацца пабываць на сяле. Даўно я не бачыў, як спее, як калышацца шырознымі хвалямі жыта. І хочацца пахадзіць па лесе, па мяккай разложыстай сенажаці...

Мне здалося, што Лёля тады нядобра на мяне паглядзела. Расшырыўшы вочы. Так глядзяць на нездаровага чалавека.

4

Сябры не набіраюцца гадамі. Іх ніколі не бывае так многа, каб сказаць, што сяброў ужо досыць. Людзі сустракаюцца, дружбуюць і часта разыходзяцца, каб не звацца сябрамі.

І ў гадах — пасля дзяняшняе сумяціцы — у мяне збіраюцца сябры. У зімовы адвячорак — разам з інеем, з холадам у каўнярах — яны прыносяць з сабою добрую таварыскую цяплынь.

Чалавечая памяць багатая. Ёй трэба насіць усё тое, чаму не трэба — чаму нельга — зноў паўтарацца. І якімі доўгімі сходкамі ўніз астаецца пройдзеная дарога. Але назад гэтымі сходкамі ісці нельга — можна толькі азірнуцца, каб змераць, як доўга яшчэ трэба ісці наперад. І як бы ні была вялікая дарога назад, а, азірнуўшыся, чалавек на ёй заўсёды ўбачыць самога сябе, бо, праходзячы праз жыццё, ён заўсёды аставаўся ў ім. А сходкі, якімі ён падымаўся ўгору, праходзячы сваю дарогу — завуцца яго біяграфіяй.

У чалавечым жыцці — у біяграфіі — ёсць вясна. Яна пачынаецца там, дзе няма яшчэ чалавека, а ёсць разлітая лужа смеху і воч. Бесклапотнасць. Дзяцінства. Там няма яшчэ ніякіх дарог і свет не ўпіраецца ў мысль, каб выціскаць на лбе маршчыны. І ўжо толькі тады, калі пачынаюцца дарогі — канчаецца вясна і пачынаецца чалавек. Але

і ў дарогах чалавек будзе насіць сваю вясну, каб знаць, што ён носіць памяць.

Вечарамі горад гарыць тысячамі агнёў. Узімку, калі апускаецца ноч — марозным туманам асядае яна на горад. Тады горад здаецца захутаным у сонную вату снягоў. Ад вуліц угору невысока тады падымаецца бляск, а зверху — таўшчэзнымі белымі вяроўкамі апускаюцца аб'інелыя драты антэн. Глуха. Спакойна. І калі з туману пакажацца раптам тады чалавек, то здаецца — ён не дае гораду спаць.

У расшчэрбіне Міхайлаўскае вуліцы, у доме № 10, як і заўсёды, іграў раяль. Пад нагамі, праз каштаны збіраючы электрычныя блікі, тужэў асфальт. Хадзілі людзі, павольна, як вечар... Раяль далятаў ужо толькі абрыўкамі, і абрыўкамі — гарам, утомаю, тлумам — аставаўся ў памяці дзень.

За Віленскім мастом апошнімі агнямі адплыў вакзал. Тут, у завакзальным раёне, ужо цемень. Толькі высокія таполі верхавінамі ловяць яшчэ рэдкі, халодны водсвет. Цішыня. Мая сцежка дахаты спіць таполямі праз Зборны пункт ды вішнямі, што паапускалі цяжкія галовы на платы Вакзальнае вуліцы.

І тут, ідучы, стала трывожна. Нешта асталося там, ззаду, у горадзе, і рупіла. Там астаўся яшчэ чалавечы кіпень, гулянне ў «Прафінтэрне», аркестры. Адтуль вось сюды, адбіраючы спакой, яшчэ далятаюць абрыўкі музыкі... Падняўся, заварушыўся, трывогаю зашчымеў сум. Сумота! Нядобра быць аднаму ў такі вечар. Пачулася нескончоная адсутнасць некага. Тады захацелася бачыць, мець добрую, цёплую прысутнасць друга, жанчыны — і тады не было яшчэ Лёлі, каб пасля горш адчуць яе адсутнасць, так, як у бунінскай «Адзіноце»...

У вечары адзіноты на чалавека находзяць думы. Яны апаноўваюць чалавека так, што чалавек — спрэс мысль. І тады трэба не спаць, трэба пераступаць гадзіны, ночы, стомленасць і адчуваць толькі даўкую духату свае мыслі. Ломяцца законы біялагічных нормаў. Чалавеку мала сябе, мала часу, мала рэчаіснасці і — мала сілы. І тады чалавек можа трызніць і можа пісаць такія лісты:

Здароў L!

Самая вялікая праблема, якую я цяпер разбіраю,— праблема чалавечае дурасці. Дурасць чалавечая не мае граніц; паспрабуй вымерай яе — сам дурнем станеш. Каланіяльная палітыка, план Юнга — пародыя на геніяль-

насць, і ўсё-такі гэта не глупства, а малаціць боб — значыць, самавызначацца. Лічу парадаксальным сцвярджэнне, што чалавечая галава мае чэрап: гэта мазгі. А ў любой сталоўцы ты можаш убачыць у меню, што мазгі даюцца на другую страву. Калі ты іх з'еў, значыцца, ты можаш выйсці на вуліцу і ўсім заявіць, што ты з'еў глупства, і канстатаваць факт, што жывёла таксама мысліць, бо мазгі ўвайшлі складанаю часцінаю твае самастойнае мазгаўні.

Ага: я ўспомніў адну рэч, але — калі паставіў коску — забыўся, а кожны чалавек можа вар'яцець, і яму здаецца, што ён тады самы шчаслівы, і верыць такому чалавеку ніколі нельга.

Між іншым — табе паклон. Гэта я ўспомніў, што я мог бы перадаць паклон. А з бібліі мне сама лепш падабаецца месца пра Іскарыёта і 30 срэбранікаў. Ну, і ўсё. Пахавальны марш, па-мойму, трэба іграць не пасля смерці, а перад смерцю, каб знаў чалавек, што яму аддаецца пашана. Пасля смерці ставіцца кропка, і тады пачынаюць працаваць мазгі.

...А ўвосень на Зборным пункце — таполі асыпаюць лісты. Ідучы дахаты, я кожны раз прыслухоўваюся, як шамацяць гэтыя лісты пад нагамі. Тут я нават прыцішаю хаду, каб надаўжэй пакінуць у сабе гэтае шамаценне. У ім нешта да болю знаёмае падымаецца ўнутры, такое, што хочацца гладзіць яго.

І я ведаю ўжо — мне трэба ў лес. Трэба вёрстамі прайсці па апалых лістах так, як рабілася гэта ў дзяцінстве. На пашы кароў.

Гэта ўстала, замулелася памяць.

Трэба паехаць. Аўтобусам да Грозава ці да якіх Амгавіч. А там — па лістах — пехатою да Слуцка.

Хіба можна знайсці сілы, каб не азірнуцца назад?

Ад гэтае паездкі выйшла ў мяне «Па дарозе» і мінус у графу сацыяльнае ўстойлівасці.

5

А ўсё ж добра праз гады апынуцца на прасторнай зямлі. На палях узгоркамі перагінаецца восеньская ралля. Дарога бяжыць неяк крадучыся, паволі — упіраецца ў сінь, у лясы, у сёлы. Павуцінне. На ўзмежку ўжо дрэмле аголены куст дубняку. Пахне з загонаў зямлёю ды выаранаю бульбаю. І многа разлегласці. Куды ні зірні — трэба кідаць далёка вочы, каб нагнаць засінелую далеч.

І добра вось гэтак мякка, прасторна прайсці пасля цвёрдага, даўкага горада.

Ціха. Пад Камораю — здалёк яшчэ паказаўся чалавек. Па загоне ён ішоў за плугам, нагінаўся, з-пад ног даставаў камяні, адкідаў на мяжу і зноў паганяў каня. Конь упінаўся, горбіўся, ледзьве цягнуў за сабою плужок. Калі мы сустрэліся — давялося здзівіцца старасці чалавека. Змарнелы, выпетралы, ён, здавалася, ледзь дыша. Сухія грудзі, сухія ў лапцях і зрэбных майтках ногі. У вачах нейкі вільготны, даўно патушаны бляск.

— Ці прайду я, дзядок, судэю на Падлужжа?

Ён цяжка падняў руку і выцер рукавом не то слязу, не то вус.

— Пройдзеш, дзеткі. Толькі тут нацянькі балота. Мабыць, босаму прыйдзецца пераходзіць.

Закурылі. Ад дыму ён хрыпла закашляўся. Пастаялі. Разоў колькі ён хапатліва яшчэ зацягнуўся, зняў шапку на розвіт і патупаў да плуга.

— Н-но!

Плуг зашоргаў па каменні, затузаўся ў старэчых руках. Вузкі загончык у межах падымаўся на ўзгорак. Вось ён — музей. Гэта тут не здала яшчэ свае каманды над чалавекам зямля. Букалічная форма жыцця. Тысячагоддзі праходзілі бурамі, войнамі, рэвалюцыямі, бунтамі з пахам чалавечага поту і крыві, каб так і астацца ў букалічнасці, не сцерці бур'яністых межаў.

І ў Труханавічах, расказала сястра, цяжка жывецца. Палеткі за тры вярсты. Не нацягаешся гною, а там і ўраджай — як ласінец. Бядота, нястачы. Калгасы баяцца пачынаць, дый няма каму. Толькі цяпер пачынаецца барацьба і, вядома, штосьці-небудзь выйдзе. А пакуль што — пакута. Адсталі. У суседнім сяле забілі камуніста за тое, што зваў за калгасы. От і знай, куды кінуцца...

І тады ж сястра запрэгла кабылу, каб падвесці мяне з сяла. Па дарозе пад'ехаў калгаснік. Яны будуюць калгас на карчах, на балотах — на лядах абшарніка Мельнікава. Сястра слухае, як горача расказвае гэты непазорны, суконны чалавек пра адчайную схватку людзей з зямлёй.

— Думаеш, лёгка было пачынаць? — кажа ён да сястры.— Не лёгка. Валаводзілі колькі нас, колькі цкавалі, пужалі, бэсцілі — а не паддаліся. Казалі: сабраліся абібокі, гультаі, а гэтыя абібокі зямлю ракам паставяць! Вядома, было цяжка. Бывала, станеш — глядзіш, глядзіш,— і

страх бярэ: як пачынаць, з кім пачынаць і з чым... Цяпер асталяваліся. Людзі самі прыходзяць, просяцца, каб прынялі.

Чалавек расказвае, а я лаўлю сябе на тым, што не знаходжу таго, чаго прыехаў шукаць. На Зборным пункце пад нагамі шамацела апалае лісце. Гэтак жа шамацела яно некалі ў дзяцінстве, калі ўвосень цэлы дзень па лесе трэба было хадзіць за каровамі. Тады нізка поўзалі хмары, і на паплавах далёка ўядалася глухая сінь. Трэба было, каб лягчэй адтупаць дзень — гнуць арэхавыя дужкі, на балотах шукаць ракіты і выплятаць пукатыя кашы. Пасля сівернага мокрага дня добра было заснуць пад цяжкаю коўдраю, асабліва калі гудуць жорны...

— Цяпер, галоўнае, нам з будоўляю канчаць трэба,— перадумаўшы, гаворыць чалавек.— Гады два пагаруем, папакутуем, а там — жыць будам, як лепш не трэба.

Я прыйшоў, каб у лісці знайсці сваю вясну, якую чалавек павінен насіць у памяці,— і не знаходжу яе. Нават нічога не можа нагадаць яе. Па дарозе мінаюцца новыя, дасюль мною нязнаныя — а можа забытыя — сёлы. Шырокімі сядзібамі паўсядалі яны ў зямлю. Вялізнымі будынкамі, новым абліччам чалавечае сілы парушылася спрадвечная ідылія цішыні. Парушылася пустэльная, бяскрайняя роўнядзь, дзе павінны былі плакаць або крычаць згубленыя адзінокія два кусты — у музеі. Відзён малады смелы размах. Калгасы. Па дарозе мы праязджаем паўз іх. Чорныя, з трактарным следам палеткі раллі. І многа шырыні. Куды ні зірні — трэба кідаць далёка вочы, каб нагнаць зарунелую далеч. Але па дарозе мінаюцца таксама і дасюль мною нязнаныя — а можа забытыя — хутары ды пасёлкі. Глухія платы, абгароджаныя сядзібы кажуць за тое, што тут мог расці, рос моцны фермер — нацыянал-дэмакратычны трамплін да буржуазнае рэстаўрацыі.

Не, не пазнаць мае бацькаўшчыны.

Парушылася ідылія цішыні.

Чалавек расказвае пра барацьбу людзей з людзьмі, людзей з зямлёю — за сацыялізм. Ён да таго захапляецца сваёю гаворкаю, што кожнаму слову хочацца верыць — няма як не верыць яму. Гэты невялікі суконны чалавек зусім непазорны, а як хочацца слухаць і слухаць яго.

І тады хацелася думаць так: —

У гарадах магістралямі вуліц — на фабрыкі, на заводы, на ўскраіны, у цэнтр — падаецца чалавечы ток.

Горад — сістэма. Як жа далёка ад яго асталося сяло. Як доўга — ажно дагэтуль — блудзіла яно: балотамі, межамі, сохамі, шнурамі, валокамі, жорнамі, абечкамі, транамі, трасцаю, фальваркамі, завеямі, жабрацтвам, пахам чалавечага поту і крыві,— каб толькі цяпер стаць на дарогу. Стаць, каб даганяць з вякоў! Парушылася спрадвечная ідылія цішыні. Відзён смелы, разумны размах — калгасы. Прасторы памаладзелай зямлі.

Зямля здала сваю векавую каманду над чалавекам.

Пачалося змаганне людзей з людзьмі, людзей з зямлёю — за сацыялізм. Машынамі, воляю, смагаю, тэхнікаю, новымі нормамі правоў — шырока чалавек наступіў на зямлю. Над стагоддзямі стаў чалавек, каб падаваць сацыялістычную каманду. І адгэтуль пачынаецца новая вясна чалавека.

Гэтак.

НЕПАТРЭБНЫ ЧАЛАВЕК

Я жыву на краі горада. На вуліцы тут ласкавым замшам расце трава. Ляжаць драўляныя тратуары са шчылінамі паміж хісткіх маснічын. На платы звешваюцца кусты пахучага бэзу і вішні. Спяваюць пеўні, лопаючы крыламі перад тым, як пачынаць свае выступленні. Брэшуць сабакі. Словам — горад чуецца толькі здалёк: сігналамі аўтамабіляў, працяжнымі гудкамі чыгункі, грукатам балаголаў, што перавозяць недзе жалеза. Многа неба, сонца, свежага ветру, пахаў кветак і траў.

Яшчэ з поўдня надвор'е гразілася дажджом. На тое былі ўсе прыкметы: душнае сонца, парнасць зямлі, смуга ў паветры, млявасць і — сабачыя высалапленыя языкі.

Дождж пайшоў з громам, з шалёным посвістам ветру і з бліскавіцаю. Па вуліцы адразу пацяклі ручаі. Пад стрэхамі дамоў запляскаўся капеж. Вымыты кусты бэзу. Любата!

У такія часы я неспакойны. Незвычайныя з'явы прыроды мне па душы.

Гром аддаліўся, толькі часамі далятае яго прыглушаны грукат з далёкага цёмнага краю неба.

Я адчыняю акно на вуліцу. У пакой урываецца свежы подых паветра, востры пах зямлі і зеляніны, шкляны звон кропель і — радасць.

Я стараюся як мага больш удыхнуць і гэтае свежасці, і радасці. Высоўваюся. Падстаўляю пад капеж галаву, лаўлю кроплі рукамі. Кроплі халодныя і казычуцца. Яны зацякаюць у рукавы, за шыю. Нарэшце я чую, што хопіць — мокры дашчэнту. Атрэпваюся і выціраюся ручніком.

Праходзіць навальніца — цішэйшы раблюся і я. Я ўжо спакойна гляджу, як за акном плывуць у ручайках трэскі, саломінкі, недакуркі, пакуль не пападаюць у пену. Мне лёгка, добра, ні пра што не хочацца думаць. Я — адпачываю.

— Можа рэзнем?

Гэта пытаецца мой сусед Толя. Ён жыве ў другім пакоі, за пераборкаю. Я ведаю, што ён толькі што палажыў падручнік «Эканамічная палітыка СССР» Сараб'янава і цяпер таксама хоча адпачыць. Ён будзе іграць, а я буду акампаніраваць.

— Давай,— згаджаюся я.

Мы садзімся перад адчыненым акном. Адсоўваем фіранку — нам трэба не толькі ўдыхаць, а і бачыць вачыма ўсю гэту паслядаждджовую свежасць. І каб чутно было, як ходзяць машыны, як плёхкаюць па мокрым тратуары падэшвы чужых ног, як брэшуць сабакі.

Толя дае мне гітару. Сам бярэ мандаліну.

Я ўмею акампаніраваць дзве рэчы: беларускую польку і вальс «Бярозка».

— Пачынай!

Пальцы мае не надта могуць чым пахваліцца: то грыф ім тоўсты, то далёка адзін ад аднаго лады, то рэжуцца струны. Выходзіць фальшыва. Толя злуецца.

— Ты чысцей бяры!

— А чорт яго — не выходзіць.

— Дай сюды... Ну, от так!

Ён паказвае.

У яго — чыста.

Зноў пачынаем. Я стараюся патрапіць так, як паказаў Толя. Пальцы не могуць паспець, я спяшаюся, і мне робіцца душна. Чортава штука гэтая музыка: яе лёгка слухаць, але не так-та лёгка рабіць.

Нарэшце, здаецца, я пачаў пападаць у лад. І от калі мне здавалася, што ўсё ўжо ідзе як мае быць,— пачуў, што нехта стаіць каля акна. Падымаю галаву і бачу чужую, незнаёмую фігуру. Звяртаю ўвагу, што чалавек выглядае нязвычна. З-пад даматканай сіняга лінялага коле-

ру кашулі вытыркаюць вострыя вузкія плечы. Каўнер расшпілены, а з яго высока падымаецца тонкая худая шыя, да таго худая, што відаць, як на ёй напінаецца скура. На вузкай галаве глыбока надзета пакамечаная шапка з брылём, расколатым напал. Шапка надзета так глыбока, што з-пад яе ледзь відны шэрыя, вельмі рэзкія, але з цьмяным бляскам вочы. Чалавек даўно не стрыжаны — у бакі тарчаць пасмы рыжых валасоў. Гарбаты і як бы цяжкі нос лажыцца проста на верхнюю адтапыраную губу, укрытую густым жоўтым пушком. Носам чалавек заўзята сапе, хоць у яго разяўлены даволі ладны рот. Твар канчаецца трыма рыжымі валасамі на вострай, клінаватай барадзе. З усім гэтым выглядам не пасуе тое, што на левай грудзіне зіхаціць яркім свежым колерам значок КІМ.

З першага погляду можна было падумаць, што чалавек некуды вельмі спяшаецца і суняўся, каб можа чаго папытацца. Але ўпартыя шкляныя вочы адчуваюць сябе як дома.

— Вы можа чаго хочаце? — пытаецца мой сусед.

— Не. Так сабе.

Мы іграем далей. Толя злуе, што ў мяне тупы слых і дубовыя пальцы. Але хіба ж магу я гэта паправіць? Цвёрдасць на пальцах можа яшчэ ад бацькавай нагрузкі: каса, плуг, малацьба ды бярвенне.

— Сыграйце польку, дзядзькі!

Калі чалавек гаворыць — жоўты пушок на верхняй губе ў яго варушыцца, як бы там ходзіць невялікі вецер.

— Што? — пытаецца Толя.

— Польку сыграйце. Я польку люблю. У нас дык ого! — толькі яе і скачуць.

— А сам жа адкуль?

— Не тутэйшы — з-пад Апчака. Можа ведалі Сініло? Чатыры вярсты ад Апчака будзе.

— Чуў.

— Дык я адтуль. Гэта далёка — вёрст пад трыццаць адсюль будзе. Але я дарогі не баюся. Уга! Хаця б кожнаму столькі аб'ездзіць...

Мы іграем польку. Пасля Толя нечаму спрабуе мяне навучыць. А тады — яму трэба некуды спяшацца — ён пайшоў.

У пакоі астаюся я адзін, а за падаконнікам — верхняя палавіна палатняных плеч і галава з рэзкімі шкелкамі воч і з жоўтым пушком на губе.

Маўчым. А пасля падымаюцца і кладуцца на падаконнік рукі. Вочы шукаюць, за што б зачапіцца. Знайшлі. Тады рукі бяруць спонкі, што ляжаць у куточку акна, і пачынаюць скрабці іх кіпцямі. Варочаюць. Мацаюць. Кладуць асцярожна назад. Бяруць ланцужок ад каўнерыка. Круцяць. Вяжуць вузлік. У другім куточку акна ляжыць бронзавы алень. Шкляныя вочы заўважаюць гэта. Тады рукі кладуць ланцужок і бяруць аленя. Спрабуюць, ці моцна трымаюцца ногі. Скрабуць, стукаюць. Зноў асцярожна кладуць у куток.

Шкляныя вочы больш нічога не знаходзяць на акне. Тады перакідаюцца ў пакой і пачынаюць мацаць столь, сцены.

— А кадрылю ці іграеце вы, дзядзька?

Я кажу, што не ўмею. Што добра іграе мой прыяцель.

— А-а! — сапе носам чалавек.

Зноў маўчым. Ён мацае сцены, а я гляджу на яго. Хто ён?

— Прыязджаў чаго сюды? — пытаюся.

— Я?

— Ага.

— Малатарню купляў! — Ён рэзка глядзіць на мяне.— Трыста рублёў аддаў. Адправіў людзьмі, бо што я сам буду валэндацца з ёю... З шваграм быў, то ён паехаў ужо, а я астаўся... Добрая малатарня.

Я асякаюся. Такая аперацыя не пасуе да яго. Ён не падобен на гаспадара. Так — недарэчнасць. Але хто яго ведае — можна часам і памыліцца. Такому павароту думкі памагае значок КІМ на грудзях.

— На калектыў купляў?

— Уга! Што я — дурны на калікцівы купляць? Я ў калікцівах не жыву.

Яшчэ больш бянтэжуся. Ні гаворка, ні ўвесь выгляд чалавека ніяк не могуць мірыцца з КІМам. КІМ адцягвае кашулю ўніз і, здаецца, хоча адарвацца.

— У нас абрэзку зрабілі,— пачынае чалавек пасля паўзы цішэйшым голасам.

Я адразу складаю новае ўяўленне пра яго, але і гэта мне ўдаецца цяжка. Той, за каго я хачу цяпер яго палічыць, не павінен быць такі балбатлівы. Можа — дурны? Ці надта нахабны?

— Трыццаць дзесяцін было! Цяпер пакінулі толькі дванаццаць, але чорт яго забяры — хопіць... А можа яшчэ так павернецца, што зноў надзяляць будуць.— Ён мнага-

значна прыжмурвае халодныя шкелкі воч, як бы гаворачы: «Я таксама сёе-тое разумею, не думай. Не такі я дурны...»

Такая акалічнасць прымушае мяне зусім падазрона зірнуць на КІМ, і я пытаюся:

— Ты — камсамолец?

Чалавек адразу як бы пужаецца і сам глядзіць на свой значок. Пасля ўсміхаецца і гаворыць:

— Не, не камсамолец, але ў нас ёсць камсамол. Я і на сходы да іх часта хаджу. Паступіць збіраюся... Так сабе — купіў дый нашу. Няхай вісіць — гэта ж не цяжка.

Я не ведаю, што сказаць яму. Такое адчуванне, што перада мною нешта лішняе і непатрэбнае. Што перада мною стаіць не чалавек, а нешта плюгавае і слізкае. І што нават ён гаворыць не свае думкі. Хочацца зачыніць акно.

— Я з жонкаю прыехаў,— між тым гаворыць чалавек.— І вы не паверыце: от прайшоў дождж, гразішча кругом, а, дальбог, праз дзве гадзіны буду дома. Ого, у мяне коні! Не нарадзіўся яшчэ той, хто абгоніць мяне, я вам кажу!.. А жонка — на ўсёй аколіцы такой бабы не знойдзеш! Я от ехацьму сюдэю — паглядзіце... Паліто купляла. Таксама багатая была — абрэзалі, трасца іх мацеры... Жыць без мяне не можа...

Нічога не разумею. Стаіць чалавек у палінялай кашулі, у шапцы з лопнутым брылём, а ў яго ёсць «ого, у мяне коні», «жонка на ўсю аколіцу», малатарня...

— Не хацела ісці за мяне, але бацькі прымусілі.

— А ты ж кажаш — жыць без цябе не можа?

— Мала што,— папраўляецца ён,— а дзе яна дзенецца? Ёй сказалі, і — кончана! Жыць будзем багата...

— Дык ты яшчэ не жаніўся?

— Не. Толькі запісаліся. На Пятра вяселле будзе. Не спіць яшчэ разам, зараза. Баіцца ці агонь яе ведае. Але ўламлю — нікуды не дзенецца. Доўга не будуваждацца. От паглядзіце — я ехаць сюдэю буду. Паліто купляць прыязджала, але ж дарага — семдзесят рублёў просяць, на іх утрапенне. А абрэзваць было не дарага? Парадкі цяпер...

Чалавек шворыць шклянымі вачыма па хаце. Там нічога не знайшлося новага, на чым можна было б сабраць увагу. Вочы зноў спыніліся на бронзавым аленю. Тады рукі адграблі яго ў самы куточак акна, нібы ён тут мяшаўся без дай прычыны.

— А пажыву я яшчэ, быць таго не можа! От няхай толькі каб маці скарэй памерла. Тады я зажыву! Куплю хромавыя боты, добрае галіфэ, палітон, шапку закіну к

чортавай мацеры от гэту! — тут ён сарваў сваю шапку і пляснуў ёю па падаконніку так, што аж пыл падняўся і заіскрыўся на сонцы.— Усё спушчу, напакую кашалёк грошай і — на Урал! Эх, там жыць, кажуць, можна — любата! Я не загіну. Не дастануць можа абрэзваць!

Ён адвярнуўся на вуліцу, моцна сплюнуў і зноў надзеў шапку. Брыль яшчэ ніжэй насунуўся на лоб.

— Дык сыграйце што-небудзь, дзядзька... А, вы бо не ўмееце. От у нас ёсць музыкі, на іх страх на іх. Як расцягне гармонік, як утне — не ўстоіш... Мы часта на ігрышча ходзім. Пабяром, гэта, шворнікі ў халявы дый пайшлі.

— Навошта ж шворнікі?

— Як навошта? От, не ведае чалавек — біцца! Не будзеш жа ўсякай басаце спускаць. Я аднаго неяк аддубасіў, што дзесятаму закажа. За жонку надаваць хацелі... А гэта от іду на пошту, каб тэлеграму дзядзьку адбіць — на вяселле каб прыехаў.

— То ты ідзі,— кажу я чалавеку, каб, нарэшце, адчапіцца ад яго,— бо спознішся.

— Паспею. Вы от, дзядзька, вады, можа ў вас ёсць, дайце напіцца.

Ён п'е вялікімі глыткамі. У горле ў яго квохча і булькае.

— То прыязджайце да мяне на вяселле, яй-богу, га? От пагуляем! У мяне самагонкі будзе — шэсць затораў выгнаў,— хопіць на ўсіх. Думаеце, я баюся, што міліцыя дазнаецца? Пляваць на гэта. Анупрэем мяне завуць, а прзываюць Кундзіч — знойдзеце. Пакуль мы жывём, то трэба пагуляць яшчэ!

Ён папраўляе шапку і развітваецца. Я высоўваюся ў акно і гляджу яму ўслед. Цяпер я заўважаю, што плечы ў яго няроўныя: адно вышэй за другое. Ногі шлёпаюць па мокрым тратуары, больш як трэба згінаючыся ў каленях. Шапка глыбока налазіць на галаву, і здаецца, што насіць яе чалавеку вельмі цяжка.

Пахне свежаю вымытаю зямлёю, і ў лужынах паблісквае сонца.

Праз месяц я праязджаў паўз Сініло. Назва вёскі нагадала мне пра сустрэчу. Я папытаўся ў мужчын пра Анупрэя Кундзіча. Тое, што я пачуў, не здзівіла мяне. Перад самым вяселлем, адцураўшыся бацькоў, маладая збегла з дому і прапала немаведама дзе, а Анупрэй паехаў яе шу-

каць, ды так і не вярнуўся. Напіўся, а конь жа ў яго спраўны, от недзе спудзіўся і — размазджыў усю галаўню яму.

— Ат, сабаку сабачая і смерць,— сказаў нехта з мужчын.— Дурня строіў з сябе, каб усё другіх перахітраваць. Не думайце, што ён быў дурны, яму так выгадней было. Ваўкалак.

Тады мне зноў успомнілася, як, нагаварыўшыся ўволю, ён пайшоў ад майго акна, шлёпаючы нагамі ўсё далей і далей, і як мне тады падумалася, што нядоўга ён будзе хадзіць па зямлі.

ГОРДАСЦЬ

1

Я часта думаю пра пакаленне, якому суджана прыйсці пасля нас. Доўгімі гадзінамі я праседжваю ў скверах, каб паглядзець, як на сваіх пляцоўках у пяску забаўляюцца дзеці. Захопленымі вачыма я праводжу піянерскія калоны, калі дружна, весела, з песнямі і бесклапотнаю гаманою яны адпраўляюцца ў лагеры. Які прыгожы час чалавечае пары! У празрыстай перспектыве гадоў я бачу іх дарослымі. Я стараюся разгадаць іх духоўны свет. Якія ў іх будуць адчуванні дружбы, любові, нянавісці, рэўнасці, страху, адвагі? Які будзе рупесак адзін за аднаго, за людскасць, за дзяржаву, за свет? Гэта не паддаецца майму ўяўленню. Але я цвёрда ведаю і веру ў адно: у іх будзе гордасць. Гордасць за рэвалюцыю і за тых людзей, якія яе здабывалі.

Часамі я ўяўляю, што ў мяне ёсць сын. Трывожна і радасна я бачу яго зусім непадобным да мяне. Ён уваходзіў у жыццё новымі шляхамі, каторых не ведалі да яго людзі. Вось ён стаіць перада мною, і ў вачах яго свеціцца свой свет невядомага мне дзяцінства.

— Тата, раскажы мне што-небудзь пра рэвалюцыю,— просіць ён.

Гэтая просьба напаўняе мяне гордасцю: я, яго бацька, памятаю рэвалюцыю. Я магу пра яе расказаць.

Я расказваю. Сын слухае, але яго ўяўленне шукае нечага большага.

— Тата,— пытаецца ён,— а якія ты маеш заслугі?

Ён нецярпліва глядзіць у вочы, і я бачу, як яму гэта важна: ведаць, ці мае ён права ганарыцца мною, як сваёй біяграфіяй.

2

Мы таксама ганарымся: блізкімі, таварышамі, знаёмымі, нават тымі, каго не ведаем.

Гэты чалавек аднаго разу зайшоў да мяне, назваўся земляком, і з таго часу мы сталі сябрамі. Ён вучыўся на рабфаку. Ён прыходзіў, каб падзяліцца сваімі заўсёды нялёгкімі, нікому яшчэ не расказанымі думкамі.

Ён быў інвалід. У яго была пакалечана правая рука: яна вісела цяжка, бездапаможна, часамі квола патузваючыся ў рукаве. Я так прывык, што нават не заўважаў яе, і ніколі не папытаўся пра прычыну калецтва. Мы праседжвалі цэлыя вечары, знаходзячы заўсёды патрэбную нам гаворку. Я круціў яму папяросы, даваў прыкурыць; на хвіліну перарываўся яго спакойны, глухаваты голас, каб тут жа, з першай зацяжкай дыму, загучаць зноў. Нашы гаворкі былі нам найлепшым падарожжам па нашай краіне. Пачынаючы ад яго калгаса, яны заводзілі нас у Кіраўск, падымаліся над Кубанню, смаглі ў гарачых пясках Каракумаў, купаліся ў хвалях рэк, плылі палявымі дарогамі, абвейваючыся ласкавым шэптам спелых ніў чарназем'я.

Нешта раз мы ўзгаварыліся пра грамадзянскую вайну. Гэта быў вечар успамінаў і стоеных у памяці хвалявання. І толькі тут выявілася, што ён чапаевец. Як знак тых далёкіх паходаў і асталася ў яго гэтая пакалечаная рука. Прыяцель хваляваўся. Я бачыў гады геройства і мужнасці. Яны грымяць у памяці стрэламі, сеюць пажары і смерць і свецяць агнямі надзей, тыя гады. Яны неўміручыя і будуць звінець у вечнасці, як песні, тыя гады. Прыяцель хваляваўся. Я глядзеў на яго і не пазнаваў. Толькі цяпер як след яго ўбачыў. Я пачуў яго як чалавека, які даўно стаў самым блізкім. Як дзіўна пазнаюцца людзі. Я чуў, як падымаецца ў мне гордасць. Зусім іначай я цяпер глядзеў і на руку. Мне здалося, што я пачуў яе боль, і захацелася з самаю вялікаю пяшчотаю дакрануцца да яе. У яе калецтве я бачыў вялікі сэнс — цану чалавечае мужнасці.

3

Яшчэ ніколі ніхто не забываў свайго дзяцінства. І якое б ні было яно — добрае ці лядайкае,— яно заўсёды жыве ў нас, як светлае імгненне нашай вясны. Яно саткана з дзён непаўторнае прыгажосці. Ніякіх бядот — ні гора, ні крыўд, ні сцюжы і беспрыветнасці — не хоча яно несці ў сталасць. У ім многа сонца, чысціні, веры, першых непаўторных узіранняў у свет і першых нестуханых уражанняў. Слаўная пара чалавечага нараджэння — дзяцінства!

Яно прайшло ў мяне крыкамі імперыялістычнай мабілізацыі. Недзе ў сутонні памяці бачу, як плачуць мацяркі, развітваючыся з сваімі сынамі. І нейкія недарэчныя, як вар'яцтва, песні. Потым — далёкія, ледзьве чутныя стрэлы гармат на фронце. Адступленне рускай наэлектрызаванай рэвалюцыйнай падпольнай работай арміі. Людзі прыслухоўваюцца трывожна да выбухаў. Прыпадаюць да зямлі, каб прыложаным вухам пазнаць, набліжаюцца ці аддаляюцца гэтыя выбухі. Адале — несціханы лёскат калёс па шашы, нясканчоныя бежанскія фурманкі. Колькі гора, няшчасця, плачу! Наабапал шашы пасля гэтых уцёкаў павырасталі адзінокія курганкі, паўстаўляныя бярозавымі крыжамі і абгароджаныя калючым дротам. Памятаю і далей: мітынгі, бальшавіцкі спісак на выбары, немцаў, палякоў, балахоўскія банды, партызаншчыну — яркімі, як успышкі маланкі, эпізодамі. Грамата мне была вельмі ясная: што любяць бальшавікоў і ненавідзяць буржуяў. Я ведаў яе як малітву. Я насіў у лес пастухам паесці і па дарозе завітваў да чырвонаармейцаў, што сталі на блізкім хутары. Яны мне давалі патрымаць вінтоўку, давалі патроны, каб я стрэліў у зроблены на бярэзіне знак. Мне стукнула прыкладам у плячо, я рагатаў, рагаталі чырвонаармейцы. Калі прыйшлі франтаватыя і фарсістыя заваёўнікі з Жэчы Паспалітай, упершыню я пачуў прыклад не ў плячо, а ў грудзі.

Час вельмі не любіць, каб без яго перараблялі гісторыю. Заваёўнікі ў канфедэратках, памятаю, уцякалі за Нёман. Наўкруга пачалі паляць пажары. Як жудасна, калі здаецца, што падпалена сама ноч, і яна зіхаціць і шугае ў цемры. І наўкруга зноў далёкія і блізкія, далёкія і блізкія выбухі. Толькі раніца прыносіла тоненькі краёк цішыні.

Я выходзіў з лесу на палянку, да абгарэлага дуба, каб

з яго дупла забраць перахаваныя для партызан патроны. Я ўглядаўся ў прасветліны ўзлеску, усё, здаецца, было спакойна і ціха, крок мой смялеў. І раптам яго абарваў, проста перад вачыма бырзнуўшы, стрэл. Я кінуўся назад, стрэлы засакаталі з усіх бакоў. Насустрач мне нёсся лес, б'ючы па твары, абдзіраючы рукі, ірвучы сарочку, колючы ў ногі сваім няроўным, усыпаным ігліцаю і сухім ламаччам долам. У дрыгвяністай імшарыне я кінуўся між куп'я. Я ляжаў, чуючы, як бзыкаюць у сухім высокім сіўцы кулі. Я ляжаў, пакуль не сціхлі стрэлы, і тады зноў кінуўся бегчы, не чуючы сваіх абраненых ног. Не, гэты раз не прынёс я партызанам патронаў, але, дзяцінства, як люблю я цябе за тое, што ўсё гэта ты пакінула мне на памяць, як дату майго нараджэння.

4

Аднаго разу, перад святам Кастрычніка, прыяцель зайшоў да мяне ва ўсім новым, па-святочнаму адпрасаваным. Ён паздароўкаўся леваю рукою, правая бездапаможна прыціскалася к боку. Я памог распрануцца. Гімнасцёрка, ваенная, чыста-зберажоная, была туга абцягнута пад шырокім рамянём. Я павесіў паліто і, зірнуўшы на прыяцеля, застыў у здзіўленні. На левай грудзіне ў яго свяціўся ордэн Чырвонага Сцяга. Прыяцель расказваў мне бог ведае колькі з таго, што зазнаў, а пра ордэн не расказваў ніколі.

— Чаго ж ты маўчаў? — сказаў я з папрокам і крыўдаю.

Прыяцель паспрабаваў усміхнуцца, але замест усмешкі на твары сабралася безліч маршчын. Тарганулася і вяла абвісла параненая рука.

— А ты хіба не ведаў? — яшчэ сіліўся ён жартаваць.

— Чаму ж ты яго не носіш?

Раптам маршчыны на твары ўкрыла суровасць. Прыяцель уздыхнуў, дастаў кісет з тытунём. Я ўзяўся круціць папяросу.

— Правільна,— сказаў ён,— не нашу. Тут нават цяжка патлумачыць табе, чаму не нашу. А от чаму — брыдка мне. На грудзях ордэн Чырвонага Сцяга, а сам невук. Як жа на гэта паглядзяць людзі? Ты ж ведаеш, я патомны парабак, не было калі і не было як набірацца тае навукі. І толькі цяпер от вучуся, пачаў з рабфака. Стараваць, як бачыш, але ж не можа быць, каб не адолеў. Ду-

маю дабрацца да інжынера па якой-небудзь горнай справе. Прырода, зямля, горы, вецер — прывык да вятроў. І от, калі выб'юся ў людзі, не брыдка будзе насіць і ордэн. А так, што ж гэта: ганарыцца не тым, што маеш, а тым, што было... Не магу, бо гэта нядобра...

Што я мог сказаць? Значыць, слава, геройства — толькі ўмоўнасць. Самі носьбіты іх не чуюць сваіх заслуг. Значыць, ёсць нешта вышэйшае, што вызначае меру чалавечае годнасці. Няма гордасці за самога сябе, ёсць гордасць за другіх, каб, гледзячы на іх, ніколі не таміцца жыць.

5

Нядаўна я зноў хадзіў у сваім дзяцінстве. Быў сцюдзёны вечар зімы. На вуліцы ў людзей дыханне вырывалася клубамі белай пары. Дрэвы ў парках стылі ў сваіх белых снах, сплеценых у іскрыстыя карункі з абледзянелай імжы. Людзі ішлі скоранька, як бы баючыся, што некуды не паспеюць дайсці.

У зале таксама было сцюдзёна. Рыпела навошчаная падлога, і здавалася, што гэта ў людзей яшчэ рыпеў пад нагамі халодны снег. Паляпвалі і рыпелі адкіднымі сядзеннямі крэслы.

Экран паволі пачаў ажываць імглою і шэраю муццю. І з імглы, з шэрае муці — з экрана — у залу ўварваліся гукі шамкоў. Яны пачуліся недзе здалечыні. Яны імкліва раслі і набліжаліся. Яны мацнелі, каціліся, як выбух, напаўняючы залу. Людзі не ведалі, адкуль і навошта гэтыя гукі. І от, калі здавалася, што гукам ужо няма куды дзецца,— з імглы паявілася тройка. Запрэжаная ў тачанку, яна шалёна неслася па дарозе, крута паварочвала то ўправа, то ўлева, падымаючы пыл, знікаючы ў пыле і ў чалавечых крыках. Відна была паднятая на тачанцы рука — яна паказвала ўдалячынь: туды неслася дарога, ірваліся коні і страчыў кулямёт. Гэтак пачыналася карціна «Чапаеў».

І пасля — нельга было сядзець спакойна. Ты не быў тут у зале, ты быў разам з чапаеўцамі. Уся напружанасць падзеі праходзіла праз цябе. Тут нельга было быць аднаму і нельга было быць спакойным. Я чуў каля сябе тонкае плячо Ліны. Мы сядзелі, дыхаючы адным дыханнем. Мы да болю сціскалі адно аднаму рукі, не чуючы гэтага. Мы былі далёка ад саміх сябе. Я жыў хваляваннямі, якія пакінула мне ў падарунак дзяцінства.

Потым я нёс усё гэтае бачанае жыццё з сабою. Перада мною нестухана стаяў вобраз чалавека, каторы быў мне як сумленне. У памяці гучала яго імя.

На дарозе дахаты я нёс чужое жыццё, каторае стала даражэй, як сваё...

НЕКАЛЬКІ ХВІЛІН ЧУЖОГА ЖЫЦЦЯ

Ужо каторы месяц, як у шуфлядзе майго стала ляжала гатовае апавяданне, але я не асмельваўся, каб надрукаваць ці каму-небудзь паказаць яго. Я нават баяўся яго.

То мне здавалася, што гэта самае лепшае з усяго, што мною напісана: яно самае строгае, самае стройнае і душэўнае; кожнае слова ў ім не толькі стаіць на месцы, а стаіць важка, значна, нясе на сабе найбольшую нагрузку; тут поўна чалавечых хваляванняў, самых трапяткіх адзнак нашага часу. Калі я яго перачытваў, то ўсё перажываў зноў з абвостранай сілай і быў проста шчаслівы, што мог нешта людскае зрабіць.

То раптам усё гэта мянялася. Варта было хоць трошачкі паддацца сумняванням, хоць у нечым адным не пачуць упэўненасці, як усё адразу выглядала іначай. Ужо здавалася, што ўсё гэта напісана няздарна, наіўна і бездапаможна, што тут няма ні думак, ні пачуццяў, што я не падняў і не вырашыў ніякага пытання і нічым тут не крану чалавечае душы. Зноў я перачытваў гэтае апавяданне і з гаркотаю крыўды і болю на сэрцы клаў яго назад у шуфляду. Няхай паляжыць. Можа пасля, як усё перадумаю, дык напішу яго нанава.

Я заўсёды не меў веры ў тое, што пісалася мною. Гэтак было і гэтак, мабыць, будзе скрозь. Ніколі не будзеш справядлівым суддзём самому сабе. А можа ўсё-такі каму-небудзь паказаць яго? І такая думка падбіла на смеласць пашукаць другога — строгага і больш справядлівага суддзю. Аднаго разу ранкам, памятаю, у святочны дзень, я і пайшоў да яго. Не вельмі гэта вясёлая рэч — панесці напаказ чалавеку тое, чаму ты сам не рад.

Ён жыў за рэчкаю, уніз ад Траецкае гары, недзе паблізу цяперашняе вуліцы Янкі Купалы. Дзень быў хмурны, пад восень. Я пайшоў цераз сад Прафінтэрна, даўшы вялікага круку, каб даўжэйшая была дарога. Сям-там пажаўцела ўжо лісце. Людзей тут мала, не так, як пад

вечар, па такой цішыні можна прайсціся павольі, падумаць. Зараз будзе паваротка налева, а тады помнік Першага з'езда РСДРП, а тады яшчэ налева. Нарэшце вось і яна, ціхая, малаязджалая вуліца, што канцом упіраецца ў рэчку. Нізкі драўляны дом, ганак, цёмны калідорчык і — направа яго пакой, як цяпер кажуць, кабінет, хоць тады так і не гаварылі.

— А братачка, от добра, што ты зайшоў,— сустрэў мяне гаспадар без здзіўлення, так, як бы даўно чакаў.— Ну, то распранайся. Якраз мне і пагаварыць не было з кім.

Гэта было бадай што самае характэрнае ў яго — знайсці такое слова, каб ты адразу пачуў сябе проста.

Пакой быў невялікі, поўны мяккага змроку, здаецца, ад таполевага ценю на вуліцы, і ціхі, як бы знарок зроблены так, каб у ім хацелася думаць. Як вядома, характар чалавека кладзецца і на яго рэчы: мала іх ці многа, якавы яны, як пастаўлены. Пісьмовы стол, палічка з кнігамі, канапа і пара крэслаў. Таксама толькі тое, што памагае сабраць і прагледзець думкі. На стале, з краю, адна на адну пакладзеныя кнігі, а пасярэдзіне разгорнуты том Бальзака: мабыць, толькі што я адарваў ад чытання.

— Сядай,— сказаў гаспадар, паказаўшы на канапу. Невысокі, трошачку кучаравы, у пантоплях і ў чорнай рабочай кашулі, ён быў увесь нейкі хатні, даступны.— Мабыць, маеш нешта добрае сказаць?

Ведама, я прызнаўся, чаго прыйшоў.

— Ну, то давай пачытаем.

Ён любіў, каб чыталі самі аўтары. Мне здаецца, што гэта была яшчэ адна яго характэрнасць: слухаць, як з чужога голасу гучыць слова, гэтая найпершая акраса любога твора. Прыткнуўшыся плячом да спінкі канапы поруч са мною, ён выбраў зручную позу і за ўвесь час, пакуль я чытаў, нават не зварухнуўся. Я чакаў, што ён мяне дзенебудзь перапыніць, перапытае, як гэта бывае, калі, слухаючы, страціш на якую хвілінку ўвагу і захочаш аднавіць яе. Або што ўбачу, як на твары ў яго паявіцца цень душэўных зрухаў, як гэта бывае, калі цябе нечакана ўразіць нешта вельмі ўдалае ці бездапаможнае і фальшывае. Але твар быў абсалютна спакойны. Здавалася, што ён нават не слухаў, а думаў нешта сваё.

Калі я скончыў, ён падняўся, пахадзіў па пакоі.

— Скажу табе, братачка, што мы з табою вельмі розныя пісьменнікі. Таго, што ты сказаў у апавяданні, мне хапіла б на цэлы раман. Я пайшоў бы тут не ад думкі, каб

яна мяне скоўвала, а ад самога чалавека. Тады я мог бы разгарнуць і пачуцці і паказаць душэўныя зрухі, словам, тут бы ў мяне ўсё разраслося вельмі шырока. А ты зрабіў гэта, братачка, як злодзей: сам сябе абакраў.

«Як жа нядобра я зрабіў, што прыйшоў сюды з такім нялюдскім апавяданнем,— думаў я сам сабе.— Як я мог дазволіць сабе такую смеласць?»

— Але ж можна сказаць, што гэта я гавару пра сябе, а не пра цябе,— перачакаўшы трохі, сказаў гаспадар.— Я гавару пра тое, як бы я напісаў. А тут жа не я, а ты. То павінен сказаць табе, братачка, што ты вельмі добра робіш, што так пішаш. У цябе другі план. І трэба, каб кожны пісьменнік быў падобны толькі на самога сябе.

Яшчэ трошкі перачакаўшы, сказаў ужо жартаўліва, у той манеры, якую любіў надаваць сваім персанажам:

— Так што, панечку мой, можаш смела пускаць яго ў людзі.

Ён пахадзіў па пакоі, шлёпаючы пантоплямі і хмурачы лоб, як бы нешта ўспамінаючы. Відаць, яму нешта карцела, нечага да канца ён яшчэ не сказаў. Падышоў да стала, стаў перад разгорнутаю кнігаю Бальзака і паказаў у яе пальцам.

— От, братачка, дзе сіла дык сіла!

Я ведаў, што гэта было яго новае глыбокае захапленне. Не так даўно вышэй за ўсіх ён ставіў Дастаеўскага. Пра гэта я яму і сказаў.

— Скажы, ты ляжаў калі ў бальніцы? — папытаўся гаспадар.— Дык от, калі ляжыш у бальніцы, то табе здаецца, што ўвесь свет хворы. Думаеш, што на зямлі толькі і жывуць людзі то з болькамі, то з немачамі, то з пакалечанаю душою, то яшчэ з якою трасцаю. Проста аж страшна робіцца, што кругом нікога здаровага і не асталося. То я табе скажу, чалавеча, што праз Дастаеўскага толькі от такі хворы свет і бачыш. Але ж гэта няпраўда.

Гаварыў гаспадар ціха, без жэстаў. Відаць, ён выносіў новае, вельмі важнае для сябе перакананне і, каб яшчэ больш усталявацца ў ім, хацеў перадаць яго і другому. Святасць гэтага пераканання жыла ва ўсёй паставе, калі ён раптам супяўся і павярнуўся да мяне, ва ўсім аблічча — у спакойным высокім ілбе, у падаткай упартасці воч пад крыху прыўзнятымі брывамі, у поўнай, трошачкі пухлявай ніжняй губе, у мяккай ямачцы на круглым падбародку.

— Магу сказаць,— гаварыў ён далей,— што я лічу

Дастаеўскага найвялікшым пісьменнікам, але цяпер яго чытаць, братачка, трошкі пабойваюся. Лёс нашага краю быў такі цяжкі, і так многа было калецтва і духоўных пакут у нашага народа, што, пішучы пра ўсё гэта, вельмі лёгка можна скаціцца да замілавання пакутамі. Пачаць пісаць пад Дастаеўскага. Але гэта будзе парушэннем праўды і гісторыі. Наш народ здаровы і мужны, гэта мы самі з табою бачым. То пра яго і пісаць трэба мужна.

Памаўчалі. У гэтым маўчанні было нешта вельмі харошае, нават патрэбнае. За акном прайшоў чалавек, моцна і доўга грукаючы абцасамі па дзераўляным тратуары. Гаспадар, здавалася, слухаў, калі скончыцца гэты грукат, але няйначай як слухаў яшчэ нейкую думку ў самім сабе.

— То бачыш, браце мой, я вельмі рад, што перахварэў на Дастаеўскага, каб гэта ўсё зразумець.— Падышоў да стала, узяў разгорнуты том Бальзака — гэта быў «Бацька Гарыо»,— перагарнуў колькі старонак, як бы збіраючыся пачытаць, але тут жа палажыў назад, прыкрыў рукою і сказаў: — От у каго трэба вучыцца, як пісаць. Вялікі пісьменнік. Тут, братачка, нічога не скажаш. Увесь падыспад выверне табе. Усё ўбачыш.

А праз колькі хвілін дадаў:

— От каб з такою сілаю напісаць пра гісторыю нашага народа. Гэта ж, можна сказаць, спрэс белая пляма ў літаратуры — наша гісторыя.

І ён пачаў гаварыць, што гэта вельмі ўдзячная і патрэбная тэма. Колькі тут нікім не кранутага, найбагацейшага матэрыялу. На працягу доўгіх вякоў наша краіна з'яўлялася скрыжаваннем чужых захопніцкіх інтарэсаў. Няраз тут праходзілі спусташальныя войны, шугалі пажары. Хто толькі меў сілу — і заваёўнікі, і свае дамарослыя князькі-магнаты,— усе гаспадарылі тут, паліваючы нашу зямлю крывёю і потам простага чалавека, рабуючы, здзекуючыся і прадаючы яго, як быдла. А народ жыў і змагаўся. Ён уваскрасаў з папялішчаў і раскіданых гнёздаў і шукаў праўды, дамагаючыся яе непакорствам, бунтамі, паўстаннямі, уцёкамі ў чужыя землі. Наша зямля поўная касцей, крыжоў, курганоў і крыўды. А народ такі выжыў. Пра гэта проста нельга не пісаць.

Я расказаў, што быў сведкам, як у Слуцку ў дзевяцьсот дваццаць трэцім годзе далакопы, капаючы па рынку яму пад тэлеграфны слуп, выкапалі пад брукам адна на адну зложаныя тры труны. Гаспадар сказаў:

— От бач, і ніхто не памятае, калі гэта было. І нідзе не напісана. То я от і кажу: калі б гэта хто знайшоўся ды напісаў вось такую мастацкую энцыклапедыю ўсяго таго, што рабілася на нашай зямлі. Тут трэба не адна якая кніга, а многа раманаў, каб умясціць усе галоўныя этапы гісторыі аж да нашых дзён. Бальзак раскрыў толькі адну філасофію буржуазнага класа: чалавек чалавеку — воўк. А мы, братачка, ужо стаімо на парозе новае філасофіі, калі чалавек чалавеку становіцца братам. От якая тут разлегласць і ў часе, і ў людзях...

Такое гаворкі ад яго да гэтага я не чуў ніколі і быў вельмі здзіўлены. Мяне дзівіла не тое, што наогул можна асмеліцца падумаць пра такую вялізазную работу, а што планы яе носіць у сваёй галаве іменна ён і што, як мне здалося, нікога не чакаючы, усю гэту работу бярэ ўжо на свае плечы. Тут жа я ўбачыў, што ў яго і папраўдзе шмат чаго ўжо прадумана. Ён зрабіў некалькі пейзажных накідаў, відаць, свае цімкавіцкае мясцовасці, у гэтых малюнках часта ўпаміналіся крыжавыя дарогі, стары дуб, карчма. Накінуў і некалькі ліній скрыжавання чалавечага лёсу і характараў, даўшы ім свае жэсты і якую-небудзь сваю фразу, накшталт таго, што: «Каб ты ўчарнеў, дай божа, мой паночак, як ты мне запамог» альбо: «Дык можа, пане егамосцю, на гэтым і схаўрусуемся?»

Шмат каго з іх я пасля пазнаваў у вобразах герояў, калі ён, нават не канчаючы іх, адзін за адным пускаў у свет свае раманы.

Інтанацыю, жэсты ён перадаваў так ярка, што ўсе гэтыя тыпы перада мною стаялі як жывыя. Мне здавалася, што я іх або недзе бачыў, або ведаў.

— Здорава! — не ўтрываў я.— І дзе толькі ты іх бярэш?

Сеўшы ў крэсла, гаспадар сказаў вельмі сур'ёзна, як гэта заўсёды любіў рабіць, калі хацеў надаць жартаўлівасці:

— Я, панечку мой, маю сваю акадэмію, то там яны ў мяне і гадуюцца. Праўда, сама акадэмія ў Цімкавічах, але філіялы працуюць і тут. Як-небудзь я звяджу цябе, чалавеча, туды. Можа ты і сабе каго там нагледзіш, то я лёгка саступлю. От бы ў тваю «Смагу» чалавек колькі адтуль перасяліць.

Падрабляючыся пад гаворку сваіх персанажаў, ён пажартаваў:

— То колькі б вы, пане егамосцю, узялі, каб я захацеў у вас купіць гэтую назву? — І тут жа сказаў ужо сур'ёзна: — Не, напраўдзе, вельмі добрая назва. Я нават не ведаю, чаму да яе сам не дадумаўся. А яна мне вельмі спатрэбілася б. На адно гэта слова можна напісаць цэлы раман. А можа прадасі? — І хітравата ўсміхнуўся ніжняю пухлявою губою.

Не памятаю, з якога выпадку я пачаў расказваць пра бабку, у якой кватараваў у Слуцку на Падвальнай вуліцы, займаючы куткавы пакойчык.

— Чакай, чакай,— перапыніў мяне гаспадар,— як ты сказаў — куткавы пакой? А божачка мой, якое слова! Як жа гэта я да гэтага часу абыходзіўся без яго? А гэта ж самае наша слова. Дай-тка я запішу яго.

Сярод сваіх папер на стале, акуратна складзеных у стосік з левай рукі, ён знайшоў запісную кніжку і запісаў. Але гэта было, мабыць, не надта цімкавіцкае слова — не памятаю, каб пасля я сустрэў яго дзе ў ягоных творах.

Я сабраўся пайсці, але гаспадар сказаў:

— Давай пойдзем разам, браце. Раз я падакляраваў, то без ніякае мітрэнгі мы зараз з табою і сходзім у тую акадэмію. Балазе яна тут у мяне недалёка.

На вуліцы ён павярнуў пад Траецкі рынак. Я адразу зразумеў у чым рэч. Там было заўсёды поўна народу, а сёння, у святочны дзень, усё аж гуло. Гандлявалі з латкоў, з крамаў, з будак, а старызнікі раскладвалі свой тавар проста на зямлі. Чаго толькі там не было: паржаўленыя замкі, клямкі, шасцеранькі ад насценных гадзіннікаў, драбкі каніфолі, віншавальныя паштоўкі, рамкі да фотакартак, самавары, старыя кнігі з паточаным шашалем рыжым скураным пераплётам. Тут было сваё, вельмі каларытнае царства. Але найбольш маляўнічая карціна была каля вазоў, дзе прадавалася збажына, агародніна, жыўнасць. Тут стаяла гамонка больш вясёлая, бо ў кірмашовыя дні, пасля ходнага продажу якога свінчаці, на возе мужчыны збіраліся каля пляшкі гарэлкі. Як на тое, траплялася кума ці сваццял або проста добрая суседка, яе таксама частавалі, а тая перш цырымонна аднеквалася, а пасля, перакуліўшы чарку і выліўшы цераз галаву недапітыя кроплі, уся ружавела і налівалася буйнаю весялосцю так, што іскры яе воч аж апякалі другога, падкага на жаночыя звады. Тут нельга было не суняцца ды не паслухаць і сакавіты жарт, і ўспамін, і якую селавую прыгоду. От ён і любіў патаўчыся каля гэтых вазоў. Ён сам

мог стаць і прадаўцом, і купцом, пахваліць або прыцаніцца да чаго і доўга таргавацца, пераходзячы на мову сваіх персанажаў: «То нешта ж, васпане, дарагавата просіце». Або стаць руплівым гаспадаром і, успёршыся на біла воза, доўга гаварыць з чалавекам пра яго гаспадарку і душэўныя клопаты.

Да Траецкае гары было недалёка. Мы ішлі, то мінаючы людзей, то саступаючы ім дарогу. Але, нагнаўшы чалавека ў чорным паношаным паліце, па хадзе відаць, што старога, ён прыпыніўся.

— Давай трошачкі пройдзем за ім,— сказаў ён.— Як ты думаеш, хто гэта такі? — І тут жа сам адказаў: — Няйначай як стары гандляр, і яму цяпер трудна без разгарнення. Але ж падрахоўвае ў галаве нейкі гешэфт. А хітры: ты паглядзі на яго хаду.

Праз хвіліну, агледзеўшы яго спіну, трохі ўгнутую галаву, сказаў:

— Трэба адразу, нават паглядзеўшы ззаду, пазнаць, што гэта за чалавек. Можна ўгадаць і яго прафесію, і характар. І нават манеру гаварыць.

Я ўспомніў, што часта бачыў, як ён, робячы па горадзе свае вячэрнія праходкі, от гэтак жа падоўгу мог неўзаметку хадзіць за чалавекам, які чым-небудзь кінуўся яму ў вочы. Пастукваючы кульбаю або павесіўшы яе на руку, ён мог забыцца на сябе ў гэтым сваім падарожжы. Аднаго разу я напаткаў, калі ён ішоў за маладою жанчынаю, ён мне паказаў на яе. Лініі яе плеч, фігуры былі проста невыказнага хараства.

— От, браце, пекната,— сказаў ён.— А я ўсё шукаю, каб хоць па чым-небудзь угадаць, якая ў яе душа.

Гэтак я і памятаю яго, Кузьму Чорнага, у вечным разгадванні людзей — іх аблічча, характару, лёсу, каб пасля жывыя абрысы іх пераносіць у свае кнігі.

ДЗЯДЗЬКА ЦІШКА

Даволі доўгі час мне думалася, што Цішка Гартны і Змітрок Жылуновіч — два чалавекі. І нават калі ўжо ведаў, што гэта няпраўда, усё роўна кожнае прозвішча выклікала свой вобраз. Цішка Гартны — паэт, пышнавалосы, тонкі, высокі і стройны, з кволым пявучым голасам; Змітрок Жылуновіч — грузны, мажны мужчына, малага-

варкі, з цяжкім паглядам воч, строгі і нават суровы, прывучаны, каб яго слухаліся. За кожным прозвішчам замацоўвалася пэўная вобразная мадэль. З Цішкам Гартным звязваліся «Урачыстасць», «Песні працы і змагання»; з Змітром Жылуновічам — чарада ўсякіх тытулаў: публіцыст, дзяржаўны і грамадскі дзеяч, арганізатар і кіраўнік самага слыннага літаратурнага аб'яднання «Полымя», якое выдае і свой часопіс, дырэктар кнігавыдавецкіх спраў такога размаху, што друкуе беларускія кнігі аж у Лейпцыгу. Удзельнік рэвалюцыі і першы старшыня нашага ўрада. Такі чалавек папраўдзе павінен выглядаць як асілак.

Па невялікім часе пасля майго прыезду ў Мінск, на вуліцы, Паўлюк Шукайла паказаў на купку людзей:

— Вунь Цішка Гартны.

Купка людзей стаяла каля будынка з шыльдаю ўстановы, я не паспеў прачытаць якой. Сярод іх я пазнаў высокага, у шэрым паліце і ў шэрай нізкай кепцы Міхася Зарэцкага і нахмуранага, у скураной рыжай тужурцы Алеся Дудара. Трэці чалавек кідаўся ў вочы тым, што быў невялікі і апранены неяк так, што ўсё на ім не мірылася між сабою. Паліто, чорнае, навюсенькае, занадта шчыгульна аблягала фігуру, танчыла і меншыла яе, а хацелася наадварот, каб яно было прастарнейшае, тады больш самавіта выглядаў бы і сам чалавек; круглыя, вялікія, у чорных тонкіх кружках акуляры займалі многа месца на твары, драбнілі яго і надавалі яму непатрэбнай круглявасці; цвёрды, з жалабаватым брылём капялюш і гальштук-матылёк, не вельмі затулены каўняром паліта, выглядалі занадта нетутэйшымі, зрысаванымі з дзікенсаўскіх персанажаў. У паставе ж і манеры трымацца, астрымана і незалежна, было нешта і зусім простае і такое, што надта блізка да сябе не падпускала. А найбольшая недапасаванасць была да майго першага ўражання: як гэта, каб Цішка Гартны ды быў такі невялікі!

*

Недзе на пачатку 1929 года панёс я ў выдавецтва сваю першую кніжку. Назваў яе па аповесці — «Затока ў бурах»: назвы з бурамі былі вельмі модныя на тыя часы. Выдавецтва мясцілася на рагу Савецкай і Камсамольскай вуліц у даволі ладным будынку. Будаваўся ён, відаць, раскошна, з вялікімі заламі, з высокімі вокнамі, але пасля, калі рабілі выдавецтва, залы гэтыя дошкамі паразбівалі на пакоі, выгарадзіўшы пасярэдзіне вузкі, цёмны, пакру-

часты калідор, дзённае святло ў які даходзіла з кабінетаў праз закураныя шыбіны, паўстаўляныя над кожнымі дзвярыма. Я пахадзіў па гэтых калідорах з сэрцам, як бы падвешаным на валасінцы: з кожным стукам яно гатова было абарвацца. За перагародкамі ішло не вядомае мне жыццё, там людзі займаліся бог ведае якімі вялікімі і важнымі справамі, а я прыйшоў з такім несусветным глупствам: з скруткам сваіх, нікому не вядомых, на шурпатай шэрай паперы ад рукі перапісаных апавяданняў. Па калідоры прайшоў невысокі, даволі пажылы чалавек, з рэдзенькай рыжай бародкай. Я не пасмеў у яго папытацца, куды мне зайсці. Выйшла з адных дзвярэй і скоранька пратупала ў другія маладая жанчына, весела намармытваючы нейкую песеньку. У чорных лакавых туфлях, прыкрытых зверху светла-жоўтымі гетрамі, прайшоў нехта тонкі, вузкалобы, яшчэ малады, але, мабыць, ужо знакаміты, пакінуўшы пасля сябе густую хвалю парфумнага паху. Я нікога не ведаў, і гэта мяне супакойвала: прынамсі, ніхто не здагадаецца, чаго я тут тарчу. Але вось, шырока ступаючы, паволі праходзіць высокая фігура ў шэрым крапчастым гарнітуры, з гладкай бліпчастай прычоскай, з даволі вядомым імем. Ён рослы, з выцягнутаю спінаю, доўгім тварам і ладным носам; на ім ляжыць пячаць нейкага нетутэйшага дасціпнага шляхецтва. За ім ходзіць слава, што ён вучоны, дзеяч заходнебеларускага руху, але мне заўсёды здавалася, што прыехаў ён вельмі здалёк і як бы толькі ў наведзіны. Раптам я востра ўсведамляю нейкую небяспеку сабе ад таго, што тут ходзіць гэты чалавек.

Каб мне папасці да Цішкі Гартнага, я нават і не мысліў, але цяпер, прачытаўшы на адных дзвярах шыльдачку «Дырэктар», тут жа пастукаўся.

Гартны сядзеў за вялікім сталом, адзін на ўвесь прасторны пакой. За яго спінаю было акно ў двор, святло біла ў вочы, яно шкодзіла мне бачыць Гартнага. Я стаў трошкі ўбаку, бліжэй да сцяны, не даходзячы да стала. Гартны быў заняты чытаннем паперак, якіх было поўна, то ў папках адна на адной, то разложаных лісткамі. Пасля майго павітання ён падняў свае круглыя акуляры і доўга глядзеў, як бы стараючыся прыпомніць, хто я такі.

— То ты ж так да мяне не зайшоў, пешта маеш? — папытаўся ён нарэшце замест павітання.

— Зборнік прынёс. Апавяданняў.— Я падышоў бліжэй да стала і пачаў круціць у руках свой скрутак.

— Гм, апавяданняў... Нешта я твайго нічога не чытаў. Як прозвішча, кажаш? Хаця, чытаў, мусіць, гэта ж ты быў у літкамунаўцах?

— Я.

— То-та ж, ваякі... Ды нешта невялікі дождж пакапаў з вашага грому... То давай сюды, чаго ты камечыш у руках гэтыя свае апавяданні. Зойдзеш дзён цераз тры.

Тры дні былі мне найгоршаю пакутаю. Рэч у тым, што калі выйшаў першы нумар літкамунаўскага часопіса «Росквіт», дык пра яго ні адна газета, ні адзін часопіс не адгукнуліся ні словам. Мы палічылі гэта за змову і ў другім нумары надрукавалі карыкатуру Уладзіміра Бохана «Вежа маўчання». З гэтай вежы, на ўсёй яе вышыні, то з акна, то проста са сцяны, у маўклівай і змоўніцкай позе выступала чыя-небудзь фігура ці аблічча: тыя, хто быў вінаваты ў маўчанні. Была там і фігура Цішкі Гартнага, як рэдактара «Полымя». Ведама, як і ва ўсякім шаржы, там было трохі перакрыўленасці і насмешкі. І цяпер я быў упэўнены, што Гартны нездарма папытаўся, ці не быў я ў літкамунаўцах. Мне прыгадаліся раптам усякія чуткі, што ён чалавек ганарысты і памятлівы на зло. Раней я такім чуткам не верыў, а цяпер усё гэта магло павярнуцца на праўду.

Праз тры дні я пастукаўся ў тыя самыя дзверы, зайшоў у той самы кабінет. Гартны доўга не адрываўся ад рукапісу, мне стала непамысна: няўжо мой? Але не, папера добрая і пісана больш буйным почыркам.

— Ну што, герой, прыйшоў? — нарэшце, дачытаўшы старонку, папытаўся Цішка Гартны сваім насавым голасам.— Ты вучышся дзе, ці як? — раптам папытаўся зусім пра другое, кругла гледзячы на мяне.— І, мабыць, бедна жывеш? То зайдзі ў бухгалтэрыю, няхай скажуць, калі табе могуць даць грошай, бо рукапіс твой я ўжо аддаў, каб пускалі ў друк.

Ішоў я з выдавецтва і не мог разабрацца, у чым была мая радасць. Ці ў тым, што ўхвалены рукапіс, ці ў другім — што не спраўдзіліся пра дзядзьку Цішку тыя нядобрыя чуткі.

*

Яшчэ запомнілася некалькі імгненняў і думак, звязаных з Цішкам Гартным. Памятаю, гэта пасля таго ўжо, як ён прайшоў чыстку, як пачалі пісаць і гаварыць пра яго пядобра.

Пісалі і гаварылі не толькі пра яго, але на ўсім шырокім фоне тых падзей відзён быў больш за ўсё ён. І, памятаю, у маім уяўленні ніяк не стасавалася, каб гэтак лёгка і непашаноўна можна было гаварыць пра Цішку Гартнага. Каб у яго былі нейкія там нелюдскоты. Маглі быць толькі заслугі! Але вось аказваецца, што і ў сваіх творах, і ў літаратурна-крытычных артыкулах, якія ён пісаў пад прозвішчам Сымона Друка, і ў высокай дзяржаўнай дзейнасці наробленa нямала памылак. Усё гэта было да таго нечакана і нова, што не хацелася верыць. Думалася, што няйначай як з Цішкам Гартным чыніцца нейкая несправядлівасць. Можа хто нават злы на яго і цяпер, карыстаючыся выпадкам, помсціцца, выдумляе ўсякую несусвеціцу. Нездарма ж і тон абгаварэння такі — куслівы, ахвочы, замест шкадобы і павáжання.

Гэтакай хадой думак мне хацелася абараніць Цішку Гартнага, не даць раскідацца вобразу, мне дарагому, звязанаму з уяўленнем рэвалюцыі, бацькаўшчыны, нейкай высокай чалавечай людскасці. І таму кожны раз, убачыўшы, я глядзеў цяпер на Цішку Гартнага іначай. Няхай сабе ён кімсьці і абгавораны, але сумленны. Няхай і незразуметы — але герой. Гэтыя новыя якасці я бачыў ва ўсім: у тым жа адзенні, цяпер, як здавалася, якраз на яго скроеным і падабраным, у няскорай хадзе, у маўклівай нахмуранасці. Здавалася, я нават бачыў плынь яго думак. І, на маё дзіва, думак гэтых я трохі баяўся. Яны мне здаваліся занадта строгімі. Нават не строгімі, а гордымі. Яны як бы не любілі, каб да іх хто блізка датыкаўся. Здалёк — калі ласка, нават з ахвотаю яны давалі сабою палюбавацца здалёк, а зблізу — барані божа. Можа, гэтае ўяўленне асталося ад той першай сустрэчы, калі на вуліцы ён стаяў разам з Зарэцкім і Дударом, і тады пра яго я так падумаў. А можа... ну што рабіць, каб гэтак не думалася?

Уяўленне вяло і далей. Я ніколі не бачыў, каб Цішка Гартны жартаваў, смяяўся, каб у яго быў нейкі другі, не той, што заўсёды, маўклівы настрой. Ніколі не бачыў, каб ён радаваўся ці смуткаваў, быў нечым здзіўлены ці ўражаны. Я казаў сабе, што я прыдзіраюся, што выдумляю нейкую непатрэбшчыну, бо зусім чалавека не ведаю. Не ведаю, як ён жыве дома і як на людзях, сярод тых, хто яму блізкі ці жаданы.

— Ты нядобры чалавек,— гаварыў я сам сабе,— ты кажаш, што любіш Цішку Гартнага, як бога, і сам жа гэ-

тага бога скідаеш з яго вышыні. Нашто табе займацца гэтым? А, от бачыш: табе трэба ведаць прыроду багоў. А тады пойдзеш і далей: пачнеш разбірацца, што ім трэба — тое, што ты пра іх, ці тое, што яны думаюць пра сябе. І што яны больш любяць: цень, каторы кладзецца ад іх на зямлю, ці сонца, якое дае гэты цень. Ну от бач, якая гэтая хітрая філасофія, пакінь яе. Не разбурай п'едэсталаў, усё роўна на іх нехта павінен стаяць...

І аднаго разу я ўбачыў Цішку Гартнага ў зусім простай яго хвіліне. З Сымонам Баранавых мы зайшлі ў Дом пісьменніка, маючы нейкі кніжны інтарэс. Бібліятэка была зачынена, мы селі за столік і расставілі шахматы. Неўзабаве ў пярэдняй пачуўся вясёлы голас Зарэцкага. Адчыніліся дзверы, і ён сам паказаўся ўсёй сваёй высокай фігурай, прапускаючы перад сабою Цішку Гартнага. Зарэцкі, разахвочана жэстыкулюючы, вёў нейкую, яшчэ на вуліцы пачатую, гаворку. Занятыя ёю, яны адышліся ўбок, да акна, нават не зірнуўшы на нас. І тут я з радасцю ўбачыў, што Гартны такі ж просты і непасрэдны, як і ўсе мы. Як і ўсе мы, грэшныя, забыўся павітацца. І з Зарэцкім гаворыць проста, як мы з Баранавых, не саромеючыся і запальчывасці, і ўсмешкі. Што сталася? — пытаўся я ў самога сябе.— Ці я чалавека папраўдзе не ведаў і не бачыў, як жыве ён сам-насам, ці... няўжо прастата ажывае толькі пасля таго, як небяспека затуліць славу?

Мабыць, яны зайшлі сюды, каб некага прычакаць, але не дачакаліся, сабраліся ісці і толькі цяпер кінулі ўвагу і павіталіся з намі. Няйначай як адчуўшы няёмкасць за такую познюю ўвагу, яны падышлі да нашага століка.

Зарэцкі заўсёды ўмеў міла пажартаваць.

— Давайце пагледзімо, дзядзька Цішка, як галагуцкія пеўні схапіліся.

Гартны паглядзеў на дошку з даволі рэдкім ужо войскам на ёй.

— А гэты большы, мабыць, абгульвае меншага, — сказаў ён Зарэцкаму, кіўнуўшы на Баранавых, стараючыся далей павесці жарт.

Хаваючыся за хітраватую сваю прастату, Сымон Баранавых не пагадзіўся:

— Ай, дзе вы бачылі, дзядзька Цішка.

Пайшлі яны, і мне здалося, што я зрабіў вялікае адкрыццё. Што чалавек — заўсёды бог. Але тады, калі ён падобен толькі на самога сябе.

НАДПІС НА КНІЗЕ

За вочы я ведаў яго даўно, але асабіста пабачыцца не шанцавала. У гэтым не было ніякага дзіва — яго пасада першага сакратара ЦК камсамола Беларусі не давала магчымасці надта раскідацца часам. Дзівіць магло хіба толькі другое: як ён пры такой пасадзе выбірае хвіліну, каб яшчэ і пісаць. І пісаць не абы-як: і сур'ёзна, і па-чалавечы глыбока, і многа. Яго кніга «Дробязі жыцця» на той час у параўнанні з кніжкамі другіх маладнякоўцаў выглядала як добры том. А колькі ўсякай грамадскай і службовай работы — пасяджэнняў, выступленняў, дакладаў! А новыя апавяданні ў свежых нумарах часопісаў! І ўсё гэта па-гаспадарску ўдумліва і па-грамадзянску мужна. Глыбока ў душы я паважаў яго, і нават імя — Платон — было як бы апраўданнем гэтае павагі. У такім старадаўнім імю было нешта надзіва простае і народнае, з ім звязвалася ўяўленне нечага спакойнага і разважлівага. А прозвішча — Галавач — як бы дапаўняла гэтае ўяўленне. І хацелася думаць, што ён пажылы, бо іначай адкуль у яго творах было б столькі сталасці.

І от недзе раз на пісьменніцкім сходзе, сярод тых, што былі ў прэзідыуме, я ўбачыў незнаёмага чалавека гадоў дваццаці шасці. Ён сядзеў на заднім плане, за спінамі, паміж Міхасём Лыньковым і Андрэем Александровічам. Валасы пышныя, вельмі светлыя і, відаць, мяккія, як кужаль. І бровы зусім светлыя, што іх аж не відно. У твары многа простай і даступнай дабраты. І сціпласці. Ён як бы пачуваў сябе няёмка, што яго запрасілі на такое пачэснае месца, і стараўся быць у цяньку. Але раз ад разу да яго паварочваўся то Александровіч, то Лынькоў, то яшчэ хто з прэзідыума. І кожны раз, калі ён нагінаўся да іх, кужэльныя валасы ападалі на лоб, і ён шырокай рукою адкідаў іх назад. Часамі ён спрабаваў усміхнуцца, але ўсмешка не ішла яму і зараз жа згасала, паблукаўшы якое імгненне каля тонкіх губ. Усмешка занадта маладзіла яго, рабіла юнаком і як бы сама ведала, што робіць не вельмі выгадную паслугу.

Мяне здзівіла, што Галавач быў мала падобны на маё ўяўленне пра яго.

Пасля ён выступаў, выйшаўшы на трыбуну. І тут выявілася яшчэ большае непадабенства на загадзя нарысаваны вобраз: што ён любіць глядзець трошачкі спадылба, што гаворыць вельмі спакойна і ціха і што голас у яго

мяккі, з малюсенькім насавым гучаннем. І здалося зусім нечаканым, што няма ў яго ні рэзкага жэсту, які звычайна выпрацоўвае прафесія, ні строгага позірку, ні павышанай камандзірскай ноты — усё па-чалавечы проста і душэўна.

З гэтага часу і пачалося наша добрае знаёмства. Я сказаў бы, нават сяброўства, каб не баяўся гэтага слова ў дачыненні да Галавача. Бо мне здаецца, што сябравалі з ім усе, і ён нікога не вылучаў і не дзяліў на лепшых і горшых. З кожным ён быў роўна чулы і блізкі, знаходзіў хвіліну і сустрэцца на вуліцы, і пасядзець на канапе ў Доме пісьменніка, і ахвотна ўзяць пачытаць рукапіс, каб не пазней як назаўтра ж пабачыцца з аўтарам, бо ён можа чакае і хвалюецца. Ён знаходзіў нейкае сваё душэўнае слова, па-свойму раскрываў рэчы і з'явы. Не скупіўся некага пахваліць, нечаму парадавацца ці сказаць у вочы праўду, калі яму што не падабалася.

Я меўся паехаць на калектывізацыю з брыгадаю работнікаў ЦК. Прызнаюся, ехаў з неспакойным сэрцам, хоць па сваёй ахвоце. Прадбачыў, што будзе цяжка: на свае вочы бачыць, як будзе ламацца спрадвечны лад сялянскае душы; тут жа можа не абыдзецца без глыбокіх чалавечых трагедый. Ведаючы, што Галавач ужо быў у такой паездцы і цяпер на гэтую тэму піша аповесць «Спалох на загонах», я захацеў пагаварыць з ім. Мне хацелася загадзя быць падрыхтаваным да нечаканасцей, прыйсці як бы ўжо на гатовыя пазіцыі. Доўга мы сядзелі з ім, і ў голасе яго я чуў боль.

— Платоне, дарагі, але ж гэта трэба? Іначай нельга? — папытаўся я з трывожным чаканнем.

— Трэба, іначай нельга, браце Янка. І можа самае важнае, няхай сабе з душэўным болем, мець іменна вось гэтую ўпэўненасць. Бо ніколі ніякія гістарычныя пераломы не рабіліся лёгка. А мінаць іх нам няма як.

Я ведаў, што Галавач ніколі не крывіць душою. І быў вельмі рад, што ў дарогу ён даў мне не толькі сваю, але і маю ўпэўненасць.

Ён не ведаў ніякіх вонкавых і пабочных меркаванняў, апроч сумлення. Памятаю, пасля таго як я вярнуўся з «Гомсельмаша», дзе тры месяцы працаваў з брыгадаю «Звязды» па ліквідацыі прарыву, у мяне была даволі непрыемная гісторыя. Я напісаў серыю нарысаў і надрукаваў іх у «Маладняку». Неўзабаве паявіўся артыкул пра гэтыя нарысы пад назваю «Паклёп на завод». Назва страшная, і папрок цяжкі. Але Галавач адразу ўбачыў тут

несумленнасць і без ніякіх ваганняў стаў на абарону. Ён увайшоў у камісію па вывучэнню справы і не адступіўся да таго часу, пакуль не дамогся, каб давесці, што ў рэцэнзента былі нячыстыя рукі. Выйшла вельмі простая рэч: рэцэнзентам, што схаваўся за псеўданім, быў чалавек, які прэтэндаваў стаць сааўтарам нарысаў, хоць сам не напісаў ні радка.

Не памятаю чаму, але нейкі пэўны час Платон Галавач жыў у гасцініцы «Еўропа», займаючы ў ёй невялікі пакой. Неяк з Петрусём Броўкам мы сустрэлі яго на вуліцы, ён спяшаўся.

— Куды?

— Атрымаў новую кватэру. Некага трэба пашукаць, каб памог перабрацца.

Мы адразу ж павярнулі назад. Каля гасцініцы ўжо стаяў грузавік. Лёгка мы пагрузілі ўсю немудрашчую гаспадарку — ложак, стол, шафку, усякую драбязу. Усё ўмясцілася ў адну машыну. Галавач сеў з шафёрам у кабіну; нам з Броўкам не хацелася тарчаць у кузаве сярод паперакульваных табурэтак, мы паехалі трамваем, балазе ён тут жа і праходзіў паўз гасцініцу.

Кватэра была ў новым доме на Маскоўскай вуліцы. Выйшаўшы з трамвая, я захацеў паглядзець, колькі цяпер часу. Гадзіннік з рукі я зняў перад пагрузкаю і заткнуў яго ў верхнюю кішэньку пінжака, знарок пакінуўшы кончык раменьчыка наверсе, каб можна было лёгка выняць. Торкнуўся цяпер я ў гэтую кішэньку, а гадзінніка няма. Ну ясна — я ўспомніў, як пры выхадзе з вагона, у самых дзверцах, мяне сціснула кампанія падшывальцаў, вельмі спяшаючыся вылезці.

Броўка, вечна вясёлы і жартаўлівы, разрагатаўся.

— Будзеш знаць, як блізенька класці. Ах, як жа далікатненька ты яго засоўваў, цяпер толькі ўспамінаць будзеш.

Кватэра была на тры пакоі. Мы наўпошвалі ўсё ў дом, наскладалі абы-як і дзе папала. Не паспелі спаласнуцца, паліваючы конаўкаю адзін аднаму ў кухні, як у Галавача ў руках бліснула паўлітэрка, адна, а тады другая. Размясціўшыся як дзе хто мог — на зэдліку, на перакуленым чамадане, на зложаным слупку кніг,— мы весела выпілі, закусваючы цвёрдаю кілбасою і храбусткою цыбуляю, макаючы яе ў кучку солі, насыпаную пасярод стала на газету. Галавачова жонка Ніна ўсё толькі прасіла прабачыць за такую імправізацыю.

Мабыць, Броўка некуды спяшаўся і, забыўшыся, што трэба маўчаць, папытаўся, каторая гадзіна. Машынальна я зірнуў на руку і тут жа апамятаўся, але было ўжо позна: Галавач заўважыў, як я скаранька абцягнуў рукаў і апусціў гэтую руку. Ён паглядзеў на аднаго, на другога.

— Што такое, хлопцы?

Прыйшлося расказаць. Галавач адразу ж спахмурнеў. У тым, што я астаўся без гадзінніка, ён вінаваціў толькі сябе. Тут жа ён пачаў здымаць свой гадзіннік, каб аддаць яго мне. Я выкручваўся як толькі мог: што мой быў стары і ўжо нікуды не варты, што я рад такому выпадку, бо цяпер куплю новы, і бог ведае чаго ні выдумляў я, каб толькі супакоіць. Але ўпэўнены, што так і не супакоіў. Нават ад тае кватэры ў яго не было цяпер радасці.

Аднаго разу я паскардзіўся Галавачу на самога сябе: наш час патрабуе жыццесцвярджэння, светлай бесклапотнай усмешкі, аптымізму, а ў мяне часта нават самыя найсённяшнія вобразы носяць у сабе гучанне нейкага душэўнага неспакою, далёкай тугі.

— Дык гэта ж вельмі правільна,— сказаў Галавач,— бо іначай не будзе чалавека. Лёгкая радасць, лёгкае гора, лёгкі аптымізм — гэта ўсё роўна як пусты смех. Ад яго і няёмка, і крыўдна, і бачыш няпраўду.

Пісаў Галавач з нястомнаю прагаю, але скрозь яму здавалася, што піша дрэнна, і мучыўся гэтым. Супрацоўніку Дзяржаўнага выдавецтва ў Маскве Яфіму Кантару, які меў дачыненне да выдання на рускай мове рамана «Праз гады», ён пісаў: «...мяне вельмі моцна хвалюе пытанне: ці ёсць у кнізе тое, што мы называем мастацтвам... Ці змагу я быць патрэбным у літаратуры, ці павінен ёй аддаць свае сілы, ці будзе гэта апраўдана?..»

Неяк я даў яму прачытаць рукапіс свайго апавядання. Назаўтра ён вярнуў яго, а пагаварыўшы, выняў з-пад пахі і даў мне загорнутую ў паперу кнігу. Гэта быў новы яго зборнік. У надпісе, памятаю, былі такія радкі: «...за тое, што ўмееш упарта працаваць». Мне стала няёмка: няўжо ён не ведае, што я хварэю на тую ж хваробу, як і ён, што мне пакутліва даецца кожнае слова, кожны раз, калі сяджуся за стол, я адчуваю сябе бездапаможна, як першакласнік? Я сказаў яму пра гэта. Галавач усміхнуўся сваёю светлаю, заўсёды нейкаю нясмелаю ўсмешкаю.

— То можа яно так і трэба,— сказаў ён.— Тады яшчэ з большым правам я даю табе такі надпіс.

РАНІШНІЯ РОСЫ

1

Прыехаў я ў Мінск як самы глухі правінцыял: нясмелы, непаваротлівы, сарамяжы. Усюды я сам сабе здаваўся лішнім, усюды замінаў. З людзьмі загаварыць мне было няёмка; калі са мною гаварылі — не ведаў, як адказаць. На мне быў кароткі кажушок з аблямаванаю распоркаю ззаду. Праўда, пад кажушком відзён быў ужо знак першай інтэлігентнасці — гальштук, а на галаве — лёгкая фасоністая кепачка. Пад той час я працаваў у газеце і паспеў справіць боты і галіфэ. Словам, адзеўся я ў самае лепшае, што меў, бо прыехаў на вельмі вялікае ў маім жыцці дзіва: на першы з'езд «Маладняка». Было гэта ў канцы лістапада 1925 года.

Слова «прыехаў» сказана занадта смела, бо, па сутнасці, мяне прывёз Паўлюк Шукайла. Калі я мог нешта значыць, то толькі пры ім. Як правінцыяла ён пракаціў мяне з сталічным фасонам і на фаэтоне — ад вакзала да гасцініцы «Бельгія». Знаў ці не знаў ён тае гаспадыні з «Бельгіі», але адрэкамендаваўся так, што тая закруцілася, як уюн. Мажная, шырокая ў плячах і ў твары, па рыпучых сходках яна пратапталася на другі паверх, нешта некаму там крыкнула, і тут жа перад намі паявілася такая ж дзябёлая, уся накрухмаленая пакаёўка. Крутнуўшы клубамі, яна сказала «хадзем» і павяла цераз цёмны калідорчык налева. У куткавым пакоі з квяцістымі шпалерамі і скасабочанай падлогай яна паправіла капу на ложку, абцягнула на стале абрус, пачапала графін з вадою і моўчкі выйшла. У пакоі пахла састаялаю духатою, сухою раструшчанаю вапнаю і скочкамі. Шукайла заняў ложак з высока настаўбурчанаю падушкаю, мне паказаў на цыратовую канапу і, прыхарашыўшыся перад люстэркам, знік, сказаўшы, што пойдзе шукаць свайго земляка Валынца.

Я пабыў адзін, паляжаў на той канапе і таксама пайшоў. Горад мне здаўся вялізным, людным. На тратуарах было цесна, я баяўся, каб знячэўку каго не зачапіць, і стараўся ісці асцярожна. Вуліцы — адна, другая, упоперак, наўскасяк, але я трымаўся толькі галоўнай, каб не заблудзіць. Вітрыны крамаў былі застаўлены бог ведае якім багаццем тавараў: футры, гузікі, чамаданы, гальштукі, шапкі. Шыльды з цьмянымі залачонымі надпісамі, часамі

яшчэ з цвёрдымі знакамі і яцямі, старанна абвяшчалі, што за аднымі дзвярыма знаходзіцца майстэрня гадзіннікаў, за другімі — бакалея, за трэцімі — зубны лекар, за чацвёртымі... Ад адных надпісаў магла закружыцца галава. І людзі то беглі міма гэтых дзвярэй, то заклапочана нырцалі ў іх. Па бруку, лёгка пацярушаным снегам, раз'язджалі рамізнікі з настаўленымі будамі; пасля іх яшчэ доўга чуцён быў стукат конскіх падкаваных ног. Зрэдку праходзіла конка; з гары коні гоцкалі трухам, а пад гару напіналіся як маглі, і фурман, падпяразаны і строгі, пакручваў над імі пугаю і торгаў за лейцы. Нарэшце ўсе гэтыя дзівы зніклі, калі я ўбачыў краму з надпісам: «Кнігарня».

Доўга я не мог перадыхнуць, гледзячы на паліцы, да столі напакаваныя кнігамі. Гэта мне было даражэй за ўсё...

2

Зала ў будынку Інбелкульта запомнілася толькі тым, што ў ёй было многа народу. Чаго збіраўся з'езд, што на ім гаварылася, гэта прайшло міма ўвагі. Запомніліся людзі. І запомніліся найбольш тым, што былі ўсе вельмі розныя і ў той жа час вельмі аднолькавыя. Аднолькавыя, што пераважна ўсе маладыя, а розныя — што апранены былі хто ў што мог. І кажухі, кароткія і доўгія, і суконныя даматканыя світкі, і шынялі або перароблены з шынялёў бравэркі. На галовах — клінаватыя кепкі з гузікамі наверсе, аблавушкі, стаўбуны, будзёнаўскія шлемы з слядамі спораных зорак або яшчэ і з зоркамі. Не пазнаць, хто сабраўся: селавыя настаўнікі ці студэнты, пастухі ці аратыя. Трохі было і чыста гарадскіх, гэтыя адразу відны і па адзежы, і па асвойтанасці. Яны і трымаюцца купкамі, і гаворка ў іх бойкая, смелая. А тыя, даматканыя, туляцца дзе ў кутку, гаворацць асцярожным пошапкам або моўчкі накурваюць.

Людская стракатасць найбольш відна ў перапынках, калі ўсюды стаіць гамана. Я стараюся, каб не прапусціць міма ўвагі тых, каго ведаю па літаратурнай папулярнасці. Вунь Міхась Чарот. Я абгледзеў яго яшчэ ў прэзідыуме, калі ён сядзеў паміж смаляна-чорным, порсткім і акулярыстым Гэсенам, прадстаўніком ЦК, і Уладзімірам Сасюрам. У яго кучаравая галава, скупая ўсмешка і нясмелы жэст. Ён вельмі прыгожы, як дзяўчына. І гэтая прыгажосць нейкая простая, даступная і добрая. На гэтым сходзе ён цэнтр, гэта відаць і ў перапынках, калі яго тут жа

акружае то адна, то другая група. Ад яго як бы ідуць нябачныя ніці ўсіх тутэйшых падзей.

А вось Міхась Лынькоў, высокі, спакойны, бадай што вечна з папяросаю ў руках. Ён гаворыць мала, больш слухае другіх, бо таксама не тутэйшы, з Бабруйска. За плячыма ў яго, мабыць, ужо добры стаж нейкай немалой работы, бо выглядае ён стала, спрактыкавана, дый шынель, што сядзіць на ім вельмі ж па-цывільнаму, проста як знак біяграфіі, дадае гэтай сталасці.

Такі ж спакойны, але зусім іначай, з філасофскай сузіральнасцю і ціхім сялянскім роздумам, Кузьма Чорны. Ад селяніна ў яго ўжо нічога няма, ён апранены па-гарадскому, нават з кульбаю ў руках. Невысокі, павольны, ён быў бы непрыкметны, каб не гэты вельмі шырокі спакой на яго твары. На ім не прачытаеш ні смутку, ні ўзрушанасці, ні радасці, ні трывогі.

Затое адразу відзён другі чалавек, што стаіць разам з Чорным,— Адам Бабарэка. Ён вельмі добры і ад гэтай дабраты свае нават крыху меланхалічны. Ён любіць слухаць, трошачкі набок схіліўшы галаву, гаворыць ціхім, кволым голасам, як бы баючыся, каб не пакрыўдзіць цябе. І ў яго ў руках кіёк, але таўсцейшы, сукаваты. Ён крытык, маладнякоўскі Бялінскі, і відаць, што яго не баяцца, а паважаюць.

А вось, моргаючы вачыма (у яго такая прывычка, ці што,— штораз моцна зажмурвацца), у скураной тужурцы дзелавіта прабягае Алесь Дудар. За ім, у пярэстай кепцы, збітай на самую патыліцу, увесь нейкі румяна-празрысты і агніста-кучаравы Анатоль Вольны. Яны вечна ўдваіх, гэтыя два чалавекі, я ўжо заўважыў, і вечна некуды спяшаюцца: Дудар паперадзе, а Вольны ззаду.

У фрэнчы з даматканага сукна, з нашытымі вісячымі кішэнямі з бакоў і на грудзях зрэдку паяўляецца рослы, з высока-здзіўленымі брывамі чалавек — Кандрат Крапіва. Ух, як ён не падобен на свае байкі! У байках столькі рогату, весялосці, нават здзеку, а сам ён строгі, каменнамаўклівы, скупы на слова, на жэст, на ўсмешку. Проста дзіва.

І запомніўся яшчэ адзін чалавек — ваенны. Самы ваенны з усіх ваенных. Праўда, іх было тут нямнога — ён ды Рыгор Мурашка. Але Мурашка ўвесь быў паходны, франтавы, адчувалася, што ён тут як госць: і прасторны шынель, і будзёнаўская шапка з нашытаю зоркаю, і хада, і калючы позірк — усё было ў ім як бы напагатове, а гэ-

ты — падкрэслена элегантны, акуратны, пачынаючы ад абмотак і канчаючы тугім рамянём і яркімі нашыўкамі на пятліцах гімнасцёркі,— быў парадны, як адшліфаваны. Але дзівіў ён іменна тым, што менш за ўсё быў падобны на ваеннага. Аблічча, жэсты, манера гаварыць, стаяць, усміхацца неяк вельмі ж па-цывільнаму не маглі стасавацца да формы, пярэчылі ёй.

Як толькі канчалася пасяджэнне, каля яго збіралася асабліва цесная група людзей. Тонкі, высокі і стройны, ён быў абавязкова відзён, але не ростам, а іменна вось гэтай сваёй асаблівай манерай трымацца: і свабодна, і разам з тым скавана. Гаворыць ён весела, ахвоча. Ён хоча памагчы сабе жэстамі, але жэсты вельмі ж стрыманыя: увесь час ён як бы нешта круглае сціскае перад сабою ў далонях. Здаецца, яму цяжка выйсці з нейкай завоенай нормы прыстойнасці руху. І раптам, забыўшыся на гэтую норму прыстойнасці, ён раскіне рукі і зарагоча так непасрэдна, што аж прысядзе. Або, забыўшыся, возьме дый пачэкаецца на назе. З той жа нормай прыстойнасці ён слухае чужую гаворку, трохі ўгнуўшы галаву, пільна гледзячы ў вочы, але тут жа паспее павярнуцца, каб з некім павітацца, усміхнуцца яму, кіўнуць галавою.

Стрыманасць і непасрэднасць як бы вечна ваююць у ім. Ваюе і другое: то халодны, то цёплы тон шэрых воч, то строгія, рэзкія лініі поўных губ, то мяккая і даверлівая ўсмешка на іх.

Гэта быў Міхась Зарэцкі. Ужо тады, з першых апавяданняў, ішла за ім слава рамантыка. Гэтая рамантыка акружала і яго біяграфію, як жа: гадаванец духоўнай семінарыі — і чырвонаармеец, сын дзяка — і камуніст, спявак тонкіх пакут кахання, душэўнага разладу — і камісар. Не дзіва, што я, правінцыяльны хлапчук, глядзеў на яго як зачараваны.

3

У 1927 годзе, калі я прыехаў у Мінск вучыцца, Міхась Зарэцкі выглядаў зусім іначай. Гэта быў ужо ў поўным сэнсе слова пісьменнік і інтэлігент. Папулярнасці і славе яго адпавядаў і вонкавы выгляд. Апрануты ён быў, як тады казалі, чыста па-еўрапейску: самае моднае элегантнае паліто, блішчастыя пальчаткі і капялюш. А капялюш на той час мала хто насіў, гэта было нават вельмі смела.

Бачылі мы яго найбольш ва універсітэце і найчасцей

разам з Александровічам і Дударом. Яны сталі студэнтамі на год ці на два раней. Бывала, на перапынках, калі мы ўсе высыпалі на калідор, нехта першы заўважаў і абвяшчаў нямоцна: «Зарэцкі ідзе!» І праўда, у канцы калідора паяўляўся цёмна-шэры капялюш і над усімі галовамі праплываў у гардэроб.

Мы тады зачытваліся Зарэцкім. Пісаў ён многа, горача і ярка. Лёс яго герояў і гераінь быў заўсёды складаны, у рэвалюцыю яны ішлі шляхамі пакутліва-цяжкімі. Былі ў іх і спады, і пад'ёмы душы, надзеі і безнадзейнасць, каханне і роспач. Адна за адной выходзілі яго кнігі: «У віры жыцця», «Пела вясна», «Пад сонцам», «На чыгунцы». Паявіўся першы яго раман «Сцежкі-дарожкі». Тут жа ён быў перакладзены на рускую мову, з нумара ў нумар, друкаваўся ў газеце «Рабочий».

І раптам да славы Зарэцкага далучылася і няслава: у друку паявіўся вядомы тады «Ліст трох» [1]. Зарэцкі пакінуў універсітэт.

Пасля гэтага даволі доўгі час я не бачыў Зарэцкага. Час ад часу толькі сустракаў яго прозвішча ў друку: або пісаў ён, або пісалі пра яго. Асабліва шырокая гаворка была пра яго нарысы «Падарожжа на новую зямлю».

З усіх пісьменнікаў, што, пакінуўшы «Маладняк», пайшлі ў другія літаратурныя згуртаванні, Зарэцкі ў душы, мабыць, аставаўся маладнякоўцам. Калі старэйшыя, палымянцы ці ўзвышэнцы, вельмі рэдка зазіралі ў Дом пісьменніка, то Зарэцкі бываў там найчасцей. Кузьма Чорны ды ён. Бывала, адчыняцца дзверы і, як заўсёды, акуратны і падкрэслена далікатны, пакажацца ён. Проста зойдзе пабачыцца ды пасядзець з таварышамі.

Прыблізна на гэты час прыпадае і наша больш-менш блізкае знаёмства. Бо дагэтуль яно было больш афіцыйнае, ці, як кажуць, шапачнае.

Памятаю, аднаго разу, пры такой вось сустрэчы, неўзабаве пасля таго як выйшла яго кніга «Ракавыя жаронцы», я сказаў, што не зусім разумею назвы. Па-першае, яе цяжка адразу прачытаць правільна: можна чытаць і «ра́кавыя» і «ракавы́я». Па-другое, не вельмі ясны сэнс: якія ў рака могуць быць жаронцы? Дый эмацыянальна яна нічога не гаворыць, а ў яго назвах я перш за ўсё прывык бачыць эмацыянальную фарбу.

---

[1] А. Александровіч, А. Дудар, М. Зарэцкі. Нязгода з сістэмаю выкладання.

Зарэцкі ўсміхнуўся, кіўнуў галавою, як бы ў знак падзякі за заўвагу (мы сядзелі на канапе, павярнуўшыся адзін да аднаго), але не згадзіўся ні з адным пунктам маіх меркаванняў.

— Па-першае,— сказаў ён мне ў тон,— ніхто не прачытае «ракавы́я», бо па-беларуску пакуль што такога слова няма. Па-другое...

І ён расказаў доўгую гісторыю, дзе ўпаміналася дзяцінства, яго бабка ці маці, іхняе сяло, народныя павер'і, прымхі і чары, звязаныя з нейкай таямнічай костачкай у галаве ў рака, якая называецца жаронцамі. Калі знайсці тую костачку, то яна, як тая папараць-кветка, можа адкрываць людзям таямніцы шчасця...

— Так што, як бачыш, усё на месцы, толькі трэба сёетое ведаць з народнага побыту. Можа я напісаў зусім не тое, што чуў, або не так, як чуў, але мне запала ў памяць вось гэтая вера народа ў сімвал і захацелася абавязкова нешта напісаць і назваць яго такой назвай. Ну, а ў мяне часта бывае так, што якая-небудзь ідэя-фікс муляе ўвесь час, пакуль ад яе не адчэпішся.

Дарэчы, тое, што мы гаварылі адзін аднаму «ты», тлумачыцца не нашай асаблівай блізкасцю, а, мабыць, завядзёнкаю. На «вы» мы звярталіся вельмі мала да каго: да Купалы, Коласа, Бядулі і Гартнага. І па бацьку нікога не называлі. Калі старэйшы або далёкі ці вельмі паважаны, то да імя дадавалі «дзядзька»: дзядзька Янка, дзядзька Колас. Прычым цікава, што ў Купалы і ў Гартнага «дзядзька» прыстаўляўся да імя, а ў Коласа і ў Бядулі да прозвішча. А да астатніх звярталіся проста: Міхась, Рыгор, Платон. Толькі цяпер з літаратурных крыніц я ведаю, што Зарэцкага па бацьку звалі Яўхімавічам. І калі ў мяне цяпер часам пытаюцца, як звалі па бацьку Каваля, Мурашку, Хадыку ці каго другога з маіх сучаснікаў, то я паціскаю плячыма — не ведаю.

Тады ж я сазнаўся Зарэцкаму, што з'яўляюся, як кажуць, яго паклоннікам, што вельмі люблю яго чытаць. І адну рэч нават напісаў пад яго ўплывам. І сапраўды магу сказаць, што яго кнігі я насіў у кішэні. Мала таго, што яны пахлі друкарскаю фарбаю і дражнілі нейкаю трывожнаю і прыгожаю зайздрасцю, дык яны пякліся жарам аўтарскага неспакою. Мне здавалася, што «Паэму пра чорныя вочы» можна спяваць, над «Кветкаю пажоўклаю» — плакаць. Пратэст, абурэнне, прагу змагання падымалі «Голы звер» і «Двое Жвіроўскіх». Рэвалюцыйным запалам ды-

хала ад кожнай тэлеграмы, загаду, запіскі, газетнага паведамлення з «42 дакументаў». Усё гэта адпавядала маёй натуры, майму настрою няўрымслівага бунту і пошукаў, якімі я паспеў напакавацца з літаратуры, пачынаючы ад байранаўскай расчараванасці і канчаючы агністым пафасам рэвалюцыі ў кнігах Фурманава, Іванава, Фадзеева і Лібядзінскага. Зарэцкі мне быў блізкі, мабыць, тым, што ў ім лёгка спалучаліся і тыя і тыя настроі. Вось я і не вытрываў, каб не сказаць пра сваю слабасць да яго.

Мы сядзелі блізка каля дзвярэй, часта тут праходзілі людзі, і Зарэцкі апасліва азірнуўся. Я зразумеў: ён не хацеў, каб такую занадта захлёбістую гаворку пачуў хто другі.

— Ну, ты пра гэта перастань,— сказаў ён цішэйшым голасам, нават з дакорам.— Калі вучыцца, то трэба ў сапраўдных пісьменнікаў. Ну, хоць бы ў Тургенева, калі хочаш...

4

Не памятаю дакладна, ці то быў ужо заснаваны Саюз, ці існавала яшчэ БелАПП, але за намесніка старшыні рабіў Андрэй Александровіч. І от неяк сустрэўшы мяне ў Доме пісьменніка, ён папытаўся, ці не хачу я зрабіць экскурсіі на Маскоўскі электразавод. Я з ахвотаю згадзіўся.

— А хто яшчэ паедзе? — папытаўся я.

— Міхась Зарэцкі.

Не ведаю, па чыёй ініцыятыве была наладжана гэтая паездка. Можа яе хацеў сам Зарэцкі, а можа яна была надумана кіраўнікамі Саюза, каб памагчы яму душэўна супакоіцца. Рэч у тым, што ў апошнія часы яго вельмі сур'ёзна крытыкавалі. І за няўдачы ў ранейшых творах (бакавы паказ рэвалюцыі, няяснасць ідэйна-мастацкіх рашэнняў, як у «Кветцы пажоўклай»), і за «Вязьмо», і асабліва за раман «Крывічы».

Электразавод нас здзівіў многім. Па ўсіх цэхах, як па вуліцы, бегалі электракары, усюды была чысцюткая чысціня, нейкі святочны парадак, і галоўнае, што за людзей рабілі аўтаматы. Асабліва ў першым цэху. За кожным агрэгатам наглядала адна жанчына. Яе задачай было залажыць у першы аўтамат порцыю шкляных трубак, а потым станкі самі забіралі тую трубку, перадавалі адзін аднаму далей, паварочвалі яе, распальвалі на агні, рэзалі, сціскалі, надзімалі, а на самым канцы цэха ў скрынку

падалі ўжо гатовыя электралямпачкі з усімі іх прыпаямі, цокалямі, вальфрамавымі нітачкамі ўсярэдзіне, навешанымі зігзагамі ці дужкамі на рагульні. Было так ціха, што мы нават баяліся моцна гаварыць.

Аглядалі завод мы дзён тры. Апроч лямпачак на ім выраблялася яшчэ бог ведае колькі ўсякага начыння. І кожны раз я бачыў, што Зарэцкага цягне іменна ў гэты першы цэх. Там пры акне гаспадарыла жанчына з крайняга агрэгата. Белы халат рабіў яе падобнай да медыцынскай сястры. Час ад часу яна праходзіла каля станкоў, правяраючы рытм працэсу, а ў вольную хвіліну садзілася за столік і чытала кнігу. Аднак дзівіла ў гэтай жанчыне не падабенства да медыцынскай сястры, а больш падабенства да Лізы Каліцінай з «Дваранскага гнязда» Івана Тургенева. Нешта ў ёй было стомленае, зняверанае і разам з тым вельмі прывабнае. У чым яно было — нават цяжка сказаць: можа ў задуменнай адчужанасці, можа ў пакорлівых складках губ, а можа ў нейкай даверлівай тузе воч. І от Зарэцкі ўсе дні лічыў за свой абавязак падысці і пабыць з ёю якую часінку.

Ад'язджалі мы з самым лепшым настроем. У нас было многа ўражанняў і ад завода, і ад Масквы, бо мы паспелі агледзець і музеі.

На цягнік мы селі ўвечары і, успомніўшы, што яшчэ не абедалі, адразу пайшлі ў вагон-рэстаран. Народу тут было не многа, мы выбралі сабе столік у кутку. Зарэцкі прагледзеў меню і, сцепануўшыся і пацёршы адна аб адну рукі, як ад вялікага холаду, заказаў пляшку «Карданахі». І ці то яшчэ жыў у нас той добры настрой, ці мы згаладаліся па гаворцы, ці можа таму, што ўпершыню нам давялося так блізка пабыць адзін з адным, але прасядзелі мы ўсю ноч. Перагаварылі бог ведае колькі.

— Ты думаеш, я вельмі давольны тым, што зрабіў? — пытаўся Зарэцкі.— Не, ганарыцца няма чым. Яшчэ далёка да таго, каб можна было сказаць самому сабе, што ты пісьменнік. А нам дык асабліва цяжка, бо мы не маем ні школ, ні традыцый. А значыць, не маем і прафесійнай культуры. І якое дзіва, што пішам яшчэ не зусім зграбна, што і памыляемся часам. Шкода толькі, што крытыка лічыць, што яна не памыляецца. А яна ж таксама яшчэ ў пялёнках.

Мы згадалі Янку Купалу і Якуба Коласа. Пра тое, што традыцыі ў нашай літаратуры якраз закладваюць яны. Што гэта наш гонар і слава. Што яны сапраўды народныя

і пачатак нашай сучаснай літаратуры будзе лічыцца ад іх. Дзівіліся з Змітрака Бядулі, што ён, будучы яўрэем, так любіць патрыярхальную Беларусь і так ведае прыроду сялянскай душы. Успомнілі Платона Галавача — што шчыры мастак і найсумленнейшы чалавек. Кузьму Чорнага — што ён надзвычай самабытны, сапраўды нацыянальны і што яму суджана стаць нашым Дастаеўскім ці Бальзаком. Але Зарэцкі неўзаметку вярнуўся да старой тэмы.

— Мяне многа крытыкавалі, і часта гэта было правільна, нічога не скажаш. Мая бяда ў тым, што я паказваю інтэлігентаў, якім прыйшлося самім разбірацца ў рэвалюцыі і або ад яе гінуць, або прыйсці да прызнання яе. Гэта давалася нялёгка, адсюль і трагізм і надломы душы. Але ж я мастак і не маю права выбіраць, што выгадна ці нявыгадна, не ўважаючы на гістарычную праўду. Нарэшце трагічнае заўсёды давала найлепшыя і самыя велічныя ўзоры мастацтва, калі можна так сказаць, адлюстроўвала самыя высокія намаганні чалавечага духу. Можна прыгадаць хоць бы Шэкспіра, Пушкіна, Талстога. А рэвалюцыйны час наогул нельга ўявіць без калізій.

Мякка стукалі колы, за акном была цёмная ноч. Часамі вельмі блізка за шыбаю ў святле нашага акна паяўляўся клубок шызага дыму, ён то сіліўся прыліпнуць да вагона, то раптам адкочваўся, падхоплены ветрам. Людзей стала многа, вагон напоўніўся гаманою, звонам кілішкаў, папяросным дымам. Наша пітво аказалася вельмі слабое, афіцыянтка спагадліва прынесла каньяку.

— Ты бачыў тую жанчыну на заводзе? — раптам папытаўся Зарэцкі.— Ну, што адразу, калі ўвойдзеш, стаяла пры акне, трохі пажылая ўжо. Бачыў твар яе? Які цудоўны твар! На ім напісана ўсё: і яе духоўная прыгажосць, і пакуты. Аказваецца, яна таксама была ў арміі, нават трохі ведае мяне. Ну, а цяпер у яе двое дзяцей, трагедыя ў сям'і, яна адна. Я вельмі шкадую такіх жанчын.

Мне здалося, што Зарэцкі жыве нейкім новым замыслам. І што нездарма гаворыць пра тую жанчыну: няйначай як ад яе вобраза нешта ўвойдзе ў яго новую кнігу.

— Вось бачыш,— гаварыў Зарэцкі,— зноў трагедыя. Я б хацеў напісаць кнігу, ад якой у людзей было б светла і хораша на душы. Так, як у мяне было хораша ўсе гэтыя дні. Усё здавалася так гарманічна там, так разумна. Я абрадаваўся гэтай жанчыне. Першае ж вока бярэ ўсё непасрэдна. Аж, аказваецца, няма чыстага хараства, чыстай радасці, чыстай чысціні, каб яны іспавалі самі па са-

бе. Ёсць жыццё, а яно тым і харошае, тым і дарагое, што ў ім можна і радавацца, і плакаць, і траціць надзею, і вечна шукаць усё большага шчасця. Гэта закон. Калі яго пачнеш абыходзіць, астанецца адна пазалота, а каму гэта трэба? Вялікія ідэі ў творы можа несці на сабе толькі чалавек з усімі яго супярэчнасцямі, слабасцямі і сілаю духу. Уся рэч толькі ў тым, каб відно было, дзеля чаго гэта, дзеля якіх ідэалаў.

Час бег неўзаметку. Наш столік даўно быў пусты. Афіцыянтка падыходзіла і раз, і другі, мабыць, хочучы напомніць, што мы толькі займаем месца. Цягнік недзе спыняўся, стаяў па нейкіх станцыях, дзе больш, дзе менш, паціху кранаўся з месца і зноў ішоў далей, усё стараючыся ззаду пакінуць ноч. Паступова меншала людзей, сціхала гамана, толькі ў дальшым ад нас кутку нейкія трое ўсё пацяшаліся моднай на тыя часы песенькай:

Румба — большие ноги,
Румба — большой живот,—

і пасля кожнага куплета з завываннем, на розныя галасы выцягвалі доўгае, канвульсіўна нудотнае «а-а-а — ля-ля-ля-а-а».

Мне ўвесь час карцела, што за ўсю дарогу мы ні разу не загаварылі пра тое, што, мне здавалася, больш за ўсё павінна было трывожыць Зарэцкага. Нарэшце я такі папытаўся:

— А чаму ўсё ж не ўдаліся табе «Крывічы»? Што ты думаеш з імі рабіць?

Зарэцкі пералажыў відэльцы з месца на месца, пальцамі сагнаў крошкі на настольніку ў адну кучку, прыціснуў іх і пачаў качаць, як гарошыну.

— Тут, бачыш, ёсць многа і мае віны, што, не закончыўшы, не адпрацаваўшы як след і не параіўшыся з таварышамі, аддаў друкаваць. Але не менш вінавата і тэорыя аўтагеннасці, калі крытыка загадзя, па інерцыі ўжо не верыць мне. А там жа ўвесь эфект якраз у канцы.

Тэорыя «аўтагеннасці», што бытавала тады, сцвярджала, па сутнасці, фатальнасць. Па гэтай тэорыі выходзіла, што ўся дзейнасць чалавека абумоўлена класавай і сацыяльнай прыродай. Выхадзец, напрыклад, з дваранства не мог мець прагрэсіўных поглядаў, тым больш не мог быць рэвалюцыянерам; ён мог быць толькі класавым ворагам. Гэтак жа і пісьменнік: правільна ён мог стварыць толькі аўтагенны вобраз, гэта значыць, вельмі вузкі во-

браз свайго сацыяльнага асяроддзя. Па гэтай тэорыі рабіліся і літаратурныя героі: радаслоўная клалася ў аснову іх светапогляду і дзейнасці.

— «Крывічоў» мне прыйдзецца перарабіць,— сказаў Зарэцкі.— Бо хочацца, каб гэта было лепшае з усяго, што я напісаў да гэтага часу. Ёсць там і памылкі, і недагляды. Але ўсё гэта можна паправіць. Паглыбіць той самы тэзіс — у імя чаго. Якраз менш за ўсё я крыўдую на крытыку за гэты раман. Тут была прынцыповая гаворка.

За акном шарэў ранак. Перш зблізку, а тады ўсё далей і далей адкрываліся лугі, сенажаці, даўно паскошваныя, з аголенымі, прысмірэлымі кусцікамі на іх. Па нізінах хадзіў туман, спелючы за сабою сінія халодныя росы.

Набліжаўся Мінск. Мы пайшлі ў купэ па рэчы.

СЯРГЕЙ ФАМІН І ЯШЧЭ НЕХТА

Вершы гэтага чалавека ў друку паяўляліся не вельмі часта. Нават самога паэта рэдка хто бачыў. Ён не хадзіў ні на літаратурныя дыспуты, ні на вечары. Дый у Доме пісьменніка ён, здаецца, ніколі не бываў.

Сярод студэнтаў універсітэта яго невысокая фігура вылучалася нейкаю мілаю дваістасцю. З аднаго боку кідалася ў вочы паэтычная прыналежнасць яго: доўгія, густа зачэсаныя валасы; тоненькі гальштук на кужэльнай, здавалася, занадта памятай кашулі, пашытай, мабыць, мацераю ці сястрою роўненькім, аднак не машыновым, а ручным швом; хада такая, што як бы не яна слухалася гаспадара, а гаспадар ішоў туды, куды вялі яго ногі. З другога — нейкая яшчэ не страчаная вясковасць: зухавата адкінутая на самую патыліцу кепка так, што відзён быў толькі задраны ў неба казырок; загарэлы, ціхі твар; нясмеласць, нават нейкая крыўда ў вачах. Думалася, што яму цяжка быць сярод людзей.

Але гэтак выглядаў Сяргей Фамін да таго часу, пакуль маўчаў. Варта ж было яму загаварыць, як вам пачынала здавацца, што вы гэтага чалавека ведаеце ўсё жыццё. І голас, і таварыскасць, і раптам весела ажывелы твар, і яшчэ бог ведае якія няўлоўныя рухі чалавечае душы вас забіралі пад свой уплыў адразу. Вам хацелася пабыць з ім найдаўжэй, не толькі паслухаць яго, а расказаць яму пра сябе, нават усё тое, што было як бы вашаю далікатнаю тайнаю.

Я часта думаў, што такіх людзей аднойчы спасцігае самае апантанае каханне нейкай невядомай жанчыны. На жаль, найбольш трагічнае.

Словам, Сяргей Фамін не ўкладваўся ў рамкі будзённай прывычнасці. Памятаю адзін выпадак, які не раз уваскрашаў мне яго забыты вобраз. Мы сустрэліся выпадкова, даўно не бачыўшыся, і, як звычайна, ён мяне тут жа загаварыў. Як заўсёды — узнёсла, ахвоча, шчыра. У мяне не так даўно выйшла першая кніга, і я сказаў:

— Калі хочаш, Сяргей, давай зойдзем да мяне і я дам табе сваю «Затоку ў бурах». Бо іначай зноў ты прападзеш і я цябе надоўга не ўбачу.

Зноў слухаў я Сяргея — вершы Міхася Чарота, яго «Босыя на вогнішчы» ў нейкім летуценна-ўзвышаным чытанні, потым Максіма Багдановіча, Канстанцыю Буйла, Паўлюка Труса́. Сваіх вершаў ён чытаць не захацеў.

Пайшоў ён ад мяне недзе пад поўнач. Я доўга яшчэ не спаў, было такое адчуванне, што я пабываў на нейкім свяце ці са мною здарылася нейкае дзіва. Усё гучалі і гучалі ў памяці чужыя радкі. Нарэшце я праваліўся ў сон, але ў чатыры гадзіны ночы прачнуўся ад стуку ў акно.

Сяргей увайшоў узрушаны, без шапкі, каўнер кашулі расшпілены. У вачах нейкая шчаслівая вінаватасць.

— Ты, братка, не гневайся і не сварыся на мяне,— сказаў ён, аберуч загладжваючы назад цяжкія свае валасы.— Што сярэдначы прыбег ды разбудзіў цябе. Разумееш, прачытаў засаб усю тваю кніжку і гэтак развярэдзіў сябе, што падумаў: калі зараз жа не выгаваруся, то захварэю. Ты ж ведаеш, абы-як чытаць я не ўмею... Не, не, ты маўчы, я буду гаварыць...

Гэты выпадак успамінаючы, кожны раз я думаю, што ў ім адлюстравана нейкая трапяткая рыса часу: непасрэднасць і чысціня нашых памкненняў, можа нават наіўнасць і абмежаванасць духоўнага зроку, і гэтакая ж наіўнасць, непасрэднасць і абмежаванасць, маладой нашай літаратуры, у якой мы, аднак, бачылі самую дасканалую сталасць і маглі да слёз расчульвацца ў замілаванні ёю.

*

Потым Сяргей Фамін знік.

*

Праз колькі немалога часу мяне спакусіла рамантыка лесасплаву, і я напрасіўся ў камандзіроўку. На беразе Ле-

пельскага возера ішла нарыхтоўка лесу, там жа стаяла прасторная будыніна для рабочых, а ў выгараджанай каморцы жыў начальнік канторы, які з ахвотаю прытуліў і мяне. Мы з матарыстам пераганялі плыты на другі, дальшы канец возера. Буксір быў нямоглы, не цягнуў, матор задыхаўся, матарыст у прамазучанай да слізгаты ватоўцы абліваўся потам, раз-пораз заводзячы яго топкім рамённым паскам. На сярэдзіне возера часта ўсходжваўся вецер, пачынаў ганяць плыт ва ўсе непатрэбныя нам бакі. Часамі заганяў у нейкія азызлыя сінія чараты, часамі плыт разбівалі ашалелыя, валавяна-цяжкія хвалі, і мы з матарыстам ледзьве дабіраліся да берага ў нашай даўно ненадзейнай лодцы.

Начальнік канторы з ласкавым імем Яўгень і нязвычным прозвішчам Абарбанэл увесь дзень матаўся то па лесапавале, то на тралёўцы, то на вязанні плытоў. Увечары, нагаварыўшыся з рабочымі на гаманкой нарадзе, ён заходзіў у нашу каморку і яшчэ гадзіны дзве не даваў мне заснуць.

За тыя дні, што мы пражылі разам, я дазнаўся пра яго гора. Яго пакінула жонка — разумніца, красуня, найласкавейшай душы чалавек, як гаварыў пра яе Яўгень Абарбанэл. Закахана і шчасліва яны жылі ў добрым горадзе, рабілі ў нейкіх блізкіх да мастацтва ўстановах, і толькі пасля ўжо, каб забыцца, ён з'ехаў на гэтае возера. Прывёз з сабою той самы навюсенькі гарадскі, строга сіняга колеру шаўётавы гарнітур, насіў пад ім тыя самыя бялюткія крухмаленыя кашулі, завязаныя вішнёвым гальштукам, гэтаксама акуратна штораніцы брыўся, старанна прычэсваўся, выштукоўваючы роўненькі левы прабор у чорных, да бляску гладкіх валасах. Было такое адчуванне, што ён збіраецца ў тэатр або толькі што вярнуўся з яго. Ніяк не стасаваўся з пракаветнаю лясною глушэчаю гэтакі досціп.

У каморку ён уваходзіў імкліва, садзіўся на свой тапчан, тут жа падымаўся, вешаў кепку на доўгі цвік у сцяне і пачынаў хадзіць, бясконца віхаючыся перада мною. І гаварыў, гаварыў — усё пра сябе, пра свой нешчаслівы лёс. Нядаўна ад збеглае жонкі ён атрымаў ліст, у якім яна пісала, што памятае яго, усё роўна кахае і можа вернецца. Гэта яшчэ больш вярэдзіла яго памяць. Ён любіў паэзію, прывёз з сабою самыя блізкія сэрцу кніжкі і шукаў спатолі ў чулліва-зняверaных вершах. Шнуруючы перада мною па каморцы, ён чытаў іх, даходзячы да такой экзальтацыі, што аж бялеў.

Не говорите мне — он умер. Он живет!
Пусть жертвенник разбит — огонь еще пылает,
Пусть роза сорвана — она еще цветет,
Пусть арфа сломана — аккорд еще рыдает,—

дэкламаваў ён, на хвіліну супяўшыся і жэстам рукі перадаючы трагічныя, рваныя рытмы.

— Вось гэтак і ў мяне,— уздыхнуў ён,— і «жертвенник разбит», і «арфа сломана». Нічога не асталося, апроч рыдання. Фініта ля камедыя!

Ад меланхалічных вершаў ён мог перайсці да бравурных. Аднаго разу мне здалося, што ён прачытаў не чужы, а свой верш:

Вы всем одарены — умом и красотою,
И жало есть у вас, достойное эстета,
Чтоб жалить поэтичней. Как вендетта,
В своем движенье вы красиво-леденящи.
У древних были б вы богиней настоящей.
Но жаль, даже улыбка не смягчает глаз:
Такого пустяка, как сердце, нет у вас.

Мне падумалася, што напісана было гэта пра жонку. Тым больш што, сажмурыўшы вочы, ён двойчы помсліва пасмакаваў радкі: «Как вендетта» і «В своем движенье вы красиво-леденящи».

Аказалася, што ён няблага дасведчаны і ў беларускай паэзіі: з замілаваннем прачытаў класічныя дубоўкаўскія радкі: «О Беларусь, мая шыпшына, зялёны ліст, чырвоны цвет!» І ўжо зусім здзівіў, прачытаўшы надзвычай паэтычны верш Сяргея Фаміна «Рамонкавы пыл». Чалавек ідзе па лугавых красках, і на халявах яго ботаў астаецца пылок ад іх. Цудоўны вобраз гаспадара добрай зямлі! Я сказаў, што Фаміна даўно выпусціў з вока, не ведаю, дзе ён, і шкадую. Сімпатычны хлопец.

— А ён у Горы-Горках,— сказаў Яўгень Абарбанэл.— Выкладае ў сельскагаспадарчай акадэміі.

Я падумаў: а чаму б мне не заскочыць туды, там жа і мой зямляк Юрка Гаўрук. А можа хто астаўся яшчэ і з сяброў, што давучваліся там пасля слуцкага сельскагаспадарчага тэхнікума, у якім вучыўся і я, ды пакінуў яго, не спакусіўшыся перспектываю аграназмічнае дзейнасці. І скончыўшы камандзіроўку, узяў білет на Мінск цераз Горкі.

*

Горада я не бачыў, ён пачынаўся за пыльнаю дарогаю, чамусьці перагароджанаю доўгім праслам, туды я не пай-

шоў. Ад акадэміі запомніўся шырокі двор з двухпавярховымі муравапкамі шэрага, казённага тыпу, астаткі старога ліпавага ці кляновага парку за імі, а далей ішло поле з зялёнымі доследнымі дзялянкамі. Юрка Гаўрук быў у адлучцы, сяброў-землякоў нікога не асталося, а Фаміна я напытаў у адной з гэтым муравапак. Усё ў іх было змрочна-саліднае: прысадзістасць, гáматныя вокны ў глухіх гладкіх сценах, высокія, у закасцянелай чырвонай алівавай фарбе дзверы, глухія, размашыстыя калідоры. І Сяргееў пакой быў вялікі, мабыць, выгараджаны з яшчэ большага, падобна было, што адна сцяна збіта з дошак, яна дрыжала, калі адчыняліся дзверы. Але Сяргей быў не адзін. Я адразу ўспомніў, што некалі, на апошнім курсе універсітэта, пры выхадзе вельмі часта чакала яго дзяўчына стройнай постаці, з адухоўленым тварам, і вочы ў яе загараліся, як толькі ён паяўляўся. Таксама студэнтка.

Сустрэў мяне Сяргей вельмі радасна. І яна пазнала мяне і трошкі нахмурылася, заўважыўшы, што я можа даўжэй як трэба на яе паглядзеў, бо зразумела, што ў гэтым была міжвольная хвіліна параўнання.

Сяргей пасля першых абдымкаў схапіў са стала скрутак папер і некуды пабег, сказаўшы: «Прабач, на хвілінку, неадкладныя справы». Я цяпер зноў зірнуў на жанчыну, у якой ад колішняй красы мала што асталося. Хіба толькі той жа ўзрушаны бляск воч. А ў абліччы нейкі стомлены спакой і прыцішанасць. Нейкае зацятае, непакорнае прымірэнне.

— Сядзьце,— сказала яна,— Сяргей зараз вернецца, яго выклікалі ў дэканат.— І тут жа загаварыла пра тое, што было ёй, мабыць, важней за ўсё.— Я ведаю, чаго вы на мяне паглядзелі. Сама скажу, каб не пыталіся: нешта не выйшла ў нас гэтак, як хацелася. Не скажу, што з ім цяжка, можа горш — што вельмі лёгка. Нейкі ён раскіданы, усяму адкрыты, вечна спяшаецца некуды паспець... Гэтак і ў вершах, гэтак і ў рабоце. Гэтак і ў сям'і. Праўда, мы яе і не маем, я дзяцей нават не асмелілася заводзіць. І калі задумаешся — то ў нас жа няма і заўтрашняга дня...

Я зноў успомніў тыя нашы не так і далёкія гады, калі кожны з нас збіраўся выбраць самую шчаслівую пуцявіну і пайсці па ёй з каханым чалавекам праз усё жыццё. І як тады я падумаў пра Сяргея, што нейкая жанчына безаглядна пакахае яго. За юначую, няўрымслівую красу яго летуценняў. І што тое каханне можа стацца трагічным.

Усё гэта цяпер вельмі блізка датыкнулася мяне. Як бы я быў вінаваты, што некалі бачыў іх шчаслівымі. І я слухаў жанчыну і думаў, як жа цяжка мне будзе гаварыць з Сяргеем, калі ён вернецца з дэканата.

ПАБІТАЯ ШАШАЛЕМ КНІГА

Па Валадарскай вуліцы, адціснуты ў двор гасцініцай «Мінск», стаіць мураваны, на тры паверхі, даволі ладны, са слядамі колішняй велікапышнасці дом. Ніжні паверх яго заняты пад гастраномію, калісь жа тут мясцілася букіністычная кнігарня, у якой я бываў частавата. Загадвала кнігарняй маладая жанчына з цёплаю ўсмешкаю на вінаватым твары, нечым падобная на народніцу.

Я ў той час вучыўся ў універсітэце, грошай лішніх у кішэні не вадзілася, але нават калі аставаўся апошні рубель, то я перш за ўсё ішоў з ім у кнігарню.

Напачатку загадчыца не вельмі верыла ў маю змілавапасць да кнігі. Майго паяўлення ў кнігарні яна бадай што не заўважала, на вітанне адказвала ледзьве-ледзьве; калі я прасіў паказаць якую кнігу, то яна рабіла гэта не сама, а маўкліва загадвала сваёй памагатай, маладой бледнатварай дзяўчыне, кіўком галавы паказаўшы на мяне як на дакуку. Мяне брала вялікая крыўда: тады не было моды пускаць пакупнікоў да паліц, за столікі маглі заходзіць людзі толькі, мабыць, вельмі блізкай катэгорыі; часта я бачыў, як яны, прыставіўшы лескі, поўзалі па паліцах, а часамі заходзілі нават у самае святое: у каморку за вузкімі дзвярыма, дзе кнігі, яшчэ не пастаўленыя ў парадак, валяліся абы-дзе і абы-як, высвечваючы цвёрдым лакам сваіх скураных спінак, найчасцей парудзелых і пабітых ужо шашалем. Туды мне доступу не было. І толькі пазней я здагадаўся, што ў гэтым намнога вінаваты быў сам.

Не так даўно собіла мне набыць кажух, доўгі, прасторны, з шырокім каўняром, з пляцёнымі круглымі гузікамі. Гэты кажух служыў мне вераю і праўдаю: дома, калі да мяне заходзілі сябры-красамоўцы, такія, як Заір Азгур, я рассцілаў яго на падлозе мае каморкі, і мы без канца маглі бавіць на ім час у нашых спрэчках; зімою на вуліцы, калі, бадай што ўдвая захінуўшы крыссе і наставіўшы глухі каўнер, я хадзіў у ім як пан, не баючыся ніякіх ні вятроў, ні маразоў. У гэтым кажусе я хадзіў і ў кнігар-

ню, дзеля большай зручнаты часамі нават падперазаўшыся і ўзяўшы ў рукі да бляску выслізганы арэхавы кій. Усё гэта ішлося трохі ад майго нядаўняга футурызму, а трохі ад не заглушанай яшчэ і нечым дарагой інерцыі сялянскасці.

І от аднаго разу, разам з Броўкам, Нікановічам і, здаецца, Хадыкам, мы зайшлі ў кнігарню, апранеtable на той час элегантна: у добрых палітах, у капелюшах, у гальштуках. Я бачыў, як загадчыца ні то збянтэжана, ні то разгублена зірнула на мяне, мабыць, не верачы, што я магу быць чалавекам сваім у гэтай кампаніі пісьменнікаў. Мне вельмі добра ўспомнілася, як няраз усякімі хітрыкамі яна старалася, каб кніга, вартая нейкай асаблівай увагі, не папала мне на вока. Ясна, чалавека ў сялянскім кажусе наўрад ці вядзе сюды нейкая інтэлектуальная патрэба. І вось цяпер я быў бясконца рады, што яна пачувае сябе няёмка, знарок яшчэ больш стараўся падкрэсліць, што ў такой кампаніі не выпадковы: з усімі свабодна, на «ты»,— гэта была як бы мая невялікая помста ёй.

Але тут гаворка ідзе не пра крыўду, а пра добрую нагоду. Пасля гэтага ў кнігарні я таксама стаў сваім чалавекам. Цяпер і мяне прывячалі хоць стрыманаю, але ветлаю ўсмешкаю. Як і тыя, каму нядаўна зайздросціў, цяпер я сам лазіў па паліцах, дыхаў старым, кнігамі прапахлым пылам. Заходзіў я і ў каморку, і тут было найцікавей. Грудамі наваленыя кнігі таілі ў сабе трывожную неспадзяванасць адным тым, што былі толькі што прывезены. Да іх яшчэ не дакраналіся чужыя рукі, і магло стацца, што сярод іх знойдзецца нешта незвычайнае, рэдкае. Чым незвычайнае і чым рэдкае, я не ўяўляў, асалода была ў самім спадзяванні. Што можа быць спакуслівей за таямніцу чалавечага духу, якая жыве вось тут, сярод маўклівых, пажоўклых ад часу старонак, і якая можа адкрыцца толькі табе? Ні з чым не параўнаная мілата!

Дык вось аднаго разу гэтая таямніца чалавечага духу такі кранулася мяне. У той жа каморцы я развязаў стос кніг, толькі што сюды занесеных. Не ведаю, чым кінуўся мне ў вока томік у цвёрдым пярэстым пераплёце з паабдзіранымі бакамі, з патрэсканаю на спінцы рудою скураю. Гэта было «Уваскрэсенне» Льва Талстога. Я меў Збор твораў Талстога і гэты томік хацеў ужо адлажыць, але на адной з старонак заўважыў дапіскі. Чорным чарнілам на полі старонкі было напісана некалькі слоў і рыскаю пазначана, куды яны павінны стаць у тэксце. Я адгарнуў

далей — і яшчэ натрапіў на такія ж папраўкі. Іх аказалася вельмі многа, большых ці меншых, вынесеных на поле або ўпісаных у тэкст, а часамі дапіскі былі, мабыць, такія, што на старонцы не месціліся, і тады стаяла памета: глядзі сшытак такі ці такі. Сэрца ў мяне закалацілася: у руках у мяне была тайна. Чые гэта папраўкі? Хто іх рабіў? Почырк тонкі, літары доўгія, косыя, цесна папрыціскаготыя адна к адной — няўжо рука самога Талстога? Ці можа пасля яго сюды дапісваў нехта другі? Але хто? А можа гэта цэнзурныя выкідкі? Якімі шляхамі кніга апынулася тут, у Мінску, і хто той чалавек, што прадаў яе сюды, у кнігарню? І ці зберагліся сшыткі, дзе яны і як іх пачаць шукаць?

Дома я паставіў гэты томік асобна, каб на паліцы ён не асабліва вытыркаўся. Я збіраўся напісаць пра сваю знаходку ў Ясную Паляну, у Інстытут літаратуры,— у мяне было перакананне, што ў руках я трымаю рэч унікальную. Паказваў я кнігу толькі самым блізкім сябрам, на такую знаходку яны шчыра дзівіліся, а Мікола Аляхновіч на прамілы бог прасіў перастуніць кнігу яму, крытыку і літаратуразнаўцу, у каторага яна павінна быць па закону.

Не памятаю, якія турботы занялі мой час і ўвагу, але калі я сабраўся пісаць, то кнігі ў схованні не знайшоў. Не было ўжо і Аляхновіча, каб папытацца, ці не зрабіў ён сяброўскага жарту. Так я і не ведаю, што загінула ў мяне тады: можа чые выпадковыя практыкаванні, а можа самыя жывыя сляды ніколі не ўтаймаванай думкі Талстога.

І ўсё не веру, што гэта здарылася ўпраўду. Увесь час мяне не пакідае адчуванне, што ў нейкую часіну яна возьме дый акажацца, гэтая пабітая шашалем кніга.

СВІТАНАК

(працяг)

5

У той час ва універсітэце мы былі як вольныя слухачы — на лекцыі лепшых выкладчыкаў хадзілі, на лекцыі горшых — не, займаліся самастойна. Гэта давала магчымасць выбраць часіну і для літаратурнай работы.

Я жыў з Макарам Шалаём, чалавекам нястрымнага запалу спрэчак. Ён назубок ведаў класікаў марксізма, Чарнышэўскага, Герцэна, Дабралюбава, Пісарава, Пляханава і логікай іх мыслення збіваў з ног любога працаўніка. Ён не мысліў сябе без спрэчак і шукаў толькі такога асяроддзя. Мы з ім і лекцыі дзялілі: я хадзіў на гуманітарныя навукі, а ён на сацыяльна-эканамічныя, а дома адзін аднаго мы знаёмілі з тым, што праходзілі па курсе. У той час, калі яго не было дома, я найбольш і выбіраў часіну, каб пісаць.

Памятаю, узапар чатыры дні не выходзіў з дому, пішучы «Затоку ў бурах». Гэта быў спецыяльны заказ для першага нумара «Росквіту», бо прозы ў нас не хапала. Скончыў у шэсць гадзін раніцы, выпрастаўся над сталом — пакой сіні ад дыму. Я пацягнуўся, і пакой захадзіў у мяне перад вачыма, закружыўся так, што я зноў прысеў і ўхапіўся за стол.

Наогул у маладыя гады пісалася лёгка і скора. Вядома, гэта тлумачыцца ў першую чаргу маладосцю. І тым, што пісалася абы-як: цяпер жа смешна глядзець на тое, што тады зроблена. «Таісу» напісаў за адну ноч. А цяпер на кожнае апавяданне ідзе не адзін месяц.

У 1929 годзе занёс у Дзяржаўнае выдавецтва першую кнігу — «Затока ў бурах». Прачытаў сам Цішка Гартны, нешта за тры дні, і адразу пусціў у друк, не зрабіўшы ні аднюсенькай заўвагі. Проста дзіва: на цяперашнія часы дык колькі там бездапаможнасці.

У тым жа дваццаць дзевятым годзе з брыгадай партыйных работнікаў паехаў на Магілёўшчыну па калектывізацыі. Памятаю адзін сход. У цеснай накуранай хаце паўнютка людзей, стаяць за дзвярыма — у сенцах, на двары. За сталом прэзідыум. Усю ноч спрэчкі: а як жа будзе ў тым калгасе? Тыя, што за парогам, час ад часу выкрыкваюць злосныя рэплікі: «Пралетарамі нас хочуць парабіць?», «На жонак камунія будзе?». І калі, нарэшце, пацягнуліся да стала пісаць заявы, нехта шпурнуў камяком снегу і патушыў лямпу. Усё загуло, затрашчала, дзынкнулі вокны, на двары нехта стрэліў. Нашай камісіі стала цяжка.

Але тут жа ў многіх руках загарэліся запалкі, лямпа зноў зацяплілася над сталом.

На раніцу я пайшоў да чалавека, які раней парабкаваў у пана, быў гаспадарлівы і аўтарытэтны на людзях, і нам хацелася, каб ён пайшоў у калгас, бо на яго глядзелі дру-

гія. Ён якраз снедаў — жонка і двое падлеткаў. Выслухаўшы мяне, ён сказаў:

— Ты, мабыць, галодны, чалавеча, то садзіся ды паеш. Калі хочаш, дык і з сабою дам кусок сала, толькі адчапіся ад мяне.

У 1931 годзе з брыгадаю «Звязда» ездзіў на «Гомсельмаш». Там мы жылі каля трох месяцаў — Брайнін, Паваротны і я. Днём ішлі на завод, а ўвечары, у гасцініцы, усеўшыся за круглым сталом, пісалі карэспандэнцыі ў газету.

Здаецца, у тым жа годзе, разам з Платонам Галавачом, Васілём Кавалём і Цодзікам Даўгапольскім, быў на Магілёўскай фабрыцы шоўку. Пісалі яе гісторыю. Кніжка называлася «На Цішоўскай пустэчы».

6

Спалучаць паездкі, літаратурную работу і вучобу было, вядома, цяжка, але на ўсё ставала часу. Нейк паказалася была Зіна. Яна вучылася ў сельскагаспадарчай акадэміі, тут была нядоўга часу і вельмі абрадавалася нечаканай сустрэчы. У мяне жыло да яе ўсё самае харошае, але на душы асталася трывога і нейкая даўняя туга. І мне здаецца, што я яе вельмі пакрыўдзіў, аднаго разу не адказаўшы на парыў яе шчырасці, бо ўжо не яна хадзіла каля майго сэрца. Пасля лекцый ва універсітэце я любіў, калі цесным гуртком мы збіраліся ў невялікай аўдыторыі і Мішка Гольдберг, што пасля стаў Златагоравым, гіпнатычна размахваючы кучараваю чупрынаю, іграў Брамса, бо тут і была тая, што напаўняла мяне новаю трывогаю. Я чакаў, каб пасля гэтай музыкі поруч з ёю, такою ўтульнаю і непазнана ласкаваю, прайсці да веснічак яе дома.

Сваё сяброўства, часамі вельмі блізкае, а часамі проста патрэбнае для душы, было і сярод пісьменнікаў. Я вельмі добра пачуваў сябе ў асяроддзі Платона Галавача, Уладзіміра Хадыкі, Васіля Каваля, Рыгора Мурашкі. Не парывалася старая цесная дружба з Петрусём Броўкам. Наладжвалася і больш маладая — Юлі Таўбін, Сымон Баранавых, Барыс Мікуліч. З Заірам Азгурам нейкі час мы былі проста як спарышы. Роздуму і спрэчак у нас хапала без меры; нахадзіўшыся па горадзе ці па парку, мы прыходзілі да мяне, укладаліся на падлозе і да самай раніцы не стульвалі воч. Гэты чалавек гарэў нестуханаю прагаю ўсё знаць. Сёння ён начаваў у мяне, заўтра ў дру-

гога, паслязаўтра ў трэцяга, ад кожнага пакрысе нечага набіраўся і ішоў далей, каб гэтае назбіранае і раздаць жа людзям. Так ён і багацеў душою.

Я гавару вельмі бегла пра падзеі і сустрэчы з людзьмі. З часам я збіраюся вярнуцца, каб сёе-тое пашырыць, знарок расказаць хоць бы пра таварышаў, якіх толькі што згадаў. А ў памяці асталіся і другія імёны і даты. Як, напрыклад, сустракалі Максіма Горкага, калі ён з Італіі праязджаў праз Мінск.

На вакзале было паўнютка народу. У дзвярах вагона паказаліся перш яго вусы, а тады ён сам, высокі, худаваты, з коратка падстрыжанымі і настаўбурчанымі валасамі. Стоячы на прыступках, ён азірнуў натоўп, што запоўніў увесь перон, у адказ на кветкі і вітанні хацеў сам сказаць прамову. «Вот вы, все молодые»,— пачаў ён, акругляючы сваё волжскае «о», ды так і не дагаварыў да канца, на вачах паказаліся слёзы. Ён сціснуў далоні рук, патрос імі перад сабою, замяньваючы гэтым жэстам усе словы.

Памятаю японскага пісьменніка Акіта Такудзо (Удзяку), кароценькага, жвавага, бронзавага ад свайго ўсходняга сонца, з тварам пабітым на танюсенькія маршчынкі. Гэта было ў часы «Літкамуны», і нам вельмі імпанавала, што ён, левы, у першую чаргу завітаў да нас, таксама «левых».

Памятаю венгерскіх пісьменнікаў Бэлу Ілеша, Матэ Залку і Антала Гідаша. Літаратурная грамадскасць сустракала іх вельмі цёпла, бо мы бачылі ў іх прадстаўнікоў рэвалюцыйнай Венгрыі, выгнаннікаў з свае радзімы пры дыктатарскім рэжыме Хорці.

Яшчэ больш цёпла сустракалі Бруна Ясенскага, і не дзіва. У адказ на пасквільны французскі раман таго часу «Я палю Маскву» Ясенскі напісаў раман «Я палю Парыж». З Польшчы яму прыйшлося эміграваць. На антрэсолях у рэстаране «Еўропа» ў яго гонар быў тады дадзены банкет. Вядома, пілі чаркі, гаварылі прамовы. Высокі, энергічны, з тонкім, тыпова польскім профілем твару, Ясенскі дзівіў элегантнай пластычнасцю рухаў, культураю жэсту і слова. Здаецца, з ім тады быў і Стандэ; запомніўся высокі бліщчасты лоб, няйначай як гэты лоб належаў яму.

Выпала на маю долю паказваць Мінск Іаганесу Бэхеру. Вялікі, мажны, у круглых акулярах, ён гаварыў паволі, у рухах быў скупы. Памятаю, даехаўшы да вуліцы Энгель-

са, я не ведаў, куды сказаць, каб павярнуў шафёр. Не было чаго тады паказваць у Мінску. Гарбатая, прысыпаная парошай першага снегу, Савецкая вуліца спускалася ўніз да электрастанцыі. Ну, а далей што? Камароўка з яе пакрыўленымі хатамі. Паказаў домік Першага з'езда РСДРП і сказаў павярнуць налева, каб паказаць хоць сляды гісторыі — Траецкую гару, Замкавую вуліцу, Нямігу, звязаўшы яе з «Словам аб палку Ігаравым». Завяршыў азнаямленне паказам першых нашых будоўляў — Дома ўрада і Універсітэцкага гарадка.

Памятаю характэрны твар Давіда Бергельсона, не такі падмалоджаны, як у «Литературной энциклопедии», а больш будзённы, з рэзкімі лініямі маршчын, з паўней акрэсленымі губамі; здаецца, ён якраз тады вярнуўся з-за мяжы, і яму было дзіва гаварыць з савецкімі пісьменнікамі.

Памятаю сустрэчу ў Доме ўрада з Леанідам Лявонавым, тады маладым і вельмі папулярным па раманах «Барсукі» і «Злодзей»; ён прыязджаў з Дз. Пятроўскім. І ў Мінску і ў Маскве меў шчасце бачыць Уладзіміра Маякоўскага і Анатоля Луначарскага. Разам з вялікай дэлегацыяй рускіх і замежных пісьменнікаў выпала пабываць у Яснай Паляне. Больш за ўсё мяне цягнула да Барыса Пільняка, я тады быў пад уплывам яго прозы. І дзівіла, што ён такі стыхійна рускі, а паходзіць з немцаў, што ён русы. Я ўяўляў яго чорным, а ён — русы. Гаварыў скупа, важка, перш падумаўшы. І яшчэ нязвычна было бачыць, што патыліца ў яго была нябрытая, рыжы мяккі пушок клаўся аж на каўнерык, а на той час гэта было нямодна. Пільняк быў чалавек вельмі дапытлівы: усё, пра што пісаў, павінен быў бачыць сам. І ў Туле, калі мы, заняўшы ўсю залу на вакзале, збіраліся перакусіць, ён знік — пайшоў аглядаць металургічныя заводы. Ужо ў вагоне выціраў запэцканыя мясціны на сваім пінжаку.

Запомніўся Барыс Пастарнак. Твар цяжкі, скасабочаны, парушаны ў прапорцыях так, што здавалася, ён зроблены з многіх твараў, не зусім дапасаваных адзін да аднаго. Мы ехалі з ім у трамваі. Сказаўшы слова ці два, ён тут жа замкнуўся ў самога сябе. Стаяў на праходзе, узяўшыся за пачапку ўверсе, і ўвесь час варушыў губамі і пагойдваўся, ловячы нейкія рытмы. Людзі на яго з дзівам глядзелі і абыходзілі, стараючыся не зачапіць і не парушыць гэтага набажэнства.

7

Канчаўся універсітэт, і рабілася шкода добрых настаўнікаў. Мы любілі Замоціна, Вальфсона, Піятуховіча, Фохта, Саўсуна. Саўсун прыязджаў з Масквы, у аўдыторыю з'яўляўся проста з цягніка і, без ніякіх канспектаў і выпісак, пачынаў тут жа лекцыю. Тоўсценькі, кругленькі, ён хадзіў перад кафедраю, дробна тупаючы кароткімі нагамі, і па памяці чытаў тэксты з Тургенева, адкуль хочаш і колькі хочаш, дзівячы нас фенаменальнасцю свае памяці. Чытаючы, ён на ўсё забываўся і нават ніколі не чуў званка.

Пасля універсітэта я працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Месцілася яна ў Доме пісьменніка. Аднаго разу ў рэдакцыю прыйшло вельмі нядобрае пісьмо з Любаншчыны. У ім пісалася, што Янка Скрыган быў у іхніх мясцінах, выступаў на вечарах, чытаў свае творы і груба, зняважліва трымаў сябе. Настаўнікі патрабавалі абмеркаваць неэтычныя паводзіны Скрыгана і пакараць яго. Рэдактар, Ілья Гурскі, трывожна і здзіўлена папытаўся:

— Што ж ты там нарабіў?

Я сам быў здзіўлены не менш за яго, бо на Любаншчыну ніколі не ездзіў.

Праз колькі часу, спусціўшыся на ніжні паверх, я расказваў пра гэта таварышам. Усе абураліся.

— Трэба напісаць ліст у рэдакцыю, сказаць, што гэта быў не ты, а нейкі шарлатан,— параіў Васіль Каваль.

Воддаль ад нас сядзелі двое, таксама пра нешта гаварылі. Аднаго я бачыў толькі спіну. І раптам угледзеў, што патыліца ў яго ўся naліта крывёю. Я ведаў гэтую патыліцу, гэтую спіну — мне стала нядобра і вельмі брыдка за яго. Я пачуў, як мне самому стала горача. Абарваўшы гаворку, я ціхенька ўстаў і неўзаметку выйшаў. Павярнуў дадому, ішоў і спінаю адчуваў, што за мною ідзе ён. Гэтак жа ціха, як і я, але неадступна. Вось ён набліжаецца, вось ён ужо за маім плячом. Я баюся азірнуцца, каб упэўніцца, што гэта праўда. І толькі калі павярнуў на менш людную вуліцу Урыцкага, ён паказаўся з-за пляча.

— Я чуў вашу гаворку,— сказаў ён.— Вам не трэба нікога шукаць і дазнавацца, бо гэта быў я.

— Нашто ж вы гэта зрабілі?

— Не ведаю. Я вельмі люблю літаратуру, вы ж знаеце. Быў у камандзіроўцы ад газеты і падумаў, што нічога

благога не зраблю, калі прачытаю вашы рэчы. Я ведаю іх напамяць. А нагрубіяніў, бо не выцерпеў, што яны вас не разумеюць. Чаму бо вы пішаце з вымудрамі.

Ён правёў мяне да самага дома, просячы толькі аднаго: каб я не пісаў у газету ліста. Бо тады можа ўмяшацца пракуратура, а ён жа сам спадзяецца стаць пісьменнікам.

Я паабяцаў. Пісьменнікам, ведама, ён не стаў. Праз дваццаць з лішнім гадоў я сустрэўся з ім: ён быў на добрай пасадзе, дырэктарам школы, а пра літаратуру нават не загаварыў.

За час работы ў газеце я падмеціў адну характэрную рысу ў Янкі Купалы. Ён ніколі ці бадай што ніколі сам не прыносіў сваіх вершаў і не браў за іх ганарару. Усё гэта рабіла за яго цётка Уладзя. Ён жа звычайна заходзіў проста пасядзець, пагаварыць, папытацца, як пажываем. І тут жа каля яго збіраўся цэлы гурт.

— То можа сходзім ды хоць па куфлю піва вып'ем? — скажа ён напаследак.— А то вы нешта тут вельмі запчыраваліся.

Ну, і ішлі. Цугам за ім. Я ніколі не бачыў, каб Купала хадзіў адзін — вечна за ім цэлы хвост маладых. А на руцэ ў яго вісіць кіёчак. А ён наперадзе. Твар шчаслівы, харошы, сяды-тады прабяжыць па ім усмешка. Павернецца, што-небудзь скажа каму цераз плячо, трошачкі крывячы ўніз губу. І зноў з кіёчкам наперадзе.

Калі прыехаў з кангрэсу ў Чэхаславакіі — не абмінуў запрасіць у госці. Сымона Баранавых і яшчэ не памятаю каго. Стаміўся, занудзіўся па доме. Відаць, што быў закаханы ў Аляксея Талстога, пра яго гаварыў найбольш. Паказаў падарункі: зімовыя чаравікі на фетравай падкладцы, маленечкі патэфон. Прайграў некалькі пласцінак. А напаследак участаваў чэхаславацкаю мятнаю гарэлкаю ў кантовай пляшцы.

— Надта многа не піце, і другім жа трэба пакаштаваць,— жартаваў ён, а сам падліваў і падліваў.

Асталося адно і цяжкае ўражанне. Невялічкай брыгадаю — памятаю, што быў Васіль Каваль — мы выступалі на Барысаўскай запалкавай фабрыцы. На той час у крытыцы вельмі ўпэўнена адчуваў сябе вульгарны сацыялагізм, і Бэнда кружыў над літаратураю, як коршак. У бэндаўскай крытыцы імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа былі сінонімамі палітычнага рэнегацтва. І от як толькі Янка Купала прачытаў свае вершы, нехта з залы кінуў зласлівае запы-

танне, нават не запытанне, а сцвярджэнне, што ён адступнік. Зала зашумела, загула ад абурэння і тут жа сціхла, бо з-за стала падняўся Янка Купала. Трошачкі больш як звычайна дрыжала губа, трошачкі глушэй як звычайна ён сказаў, што ніколі, ні на якім этапе, не адступаўся ад свайго народа.

Залу страсянулі воплескі, але ўжо ўвесь вечар Купала быў хмурны і маўклівы.

Крытыка таго часу нямала шкодзіла: яна хацела спрасціць літаратуру, выкінуць з яе душу. Я сам быў у адчаі: як жа навучыцца пісаць так, каб было правільна? Здаецца, і тэму браў самую сучасную — калгасы, але не: дробна-буржуазны ўхіл, корпанне ў чалавечай душы. А як жа напісаць без душы, без чалавека? Спрабаваў, і выйшла дрэнь — «Недапісаны профіль» або другія апавяданні, падобныя на фактаграфічныя нарысы. Праўда, я сам на сабе пераканаўся, як асцярожна трэба пісаць, каб табою не пакарыстаўся зламыснік, і асцерагаўся гэтай «душы», аб'ектывізму. Пасля таго як выйшла «Шугае сонца», з тае ж Магілёўшчыны ў ЦК быў прысланы яе экземпляр. Увесь тэкст скрэмзаны, затушаваны радкі і цэлыя абзацы. Закрэслена ўсё тое, што гаварылі або думалі добрыя людзі, аўтараў розум, а пакінуты думкі і размовы нехацімцаў, кулакоў і падкулачнікаў ды тое, дзе сказана, як не па-гаспадарску выглядае колішні панскі маёнтак. З такой «дапрацоўкай», мая кніжка чыталася зусім іначай. Так што і гэта трэба было мець на ўвазе.

Тым не менш у спадарожніках хадзіць было не вельмі весела. Шукаючы спосабу знайсці тую правільнасць, я падумаў, што, можа, мне шкодзіць рамантыка, у якую часам любіў пусціцца, і з свае творчасці надоўга выгнаў жанчыну і каханне. А тады яшчэ падумаў, што, можа, мяне падводзіць тэма. Як ні кажы, а сялянская душа складаная, у ёй вельмі блізка суседзяць бядняк і кулак. Калгасы — таксама новая форма: сэрцам і розумам я даходжу, а можа дзе чаго недачувае душа? І захацеў паспрабаваць сябе ў новым матэрыяле. У Гістпарце мне далі дакументы пра козыраўскіх партызанаў. Я здзівіўся: якая гераічная старонка барацьбы за рэвалюцыю! Пад свежым хваляваннем бегла накідаў аб гэтым у «Праўду» нарыс «Восем смертнікаў». Пачаў пісаць раман, але скончыць не ўдалося, а матэрыялы загінулі.

ВОСЕМ СМЕРТНІКАЎ

Нядаўна я атрымаў ліст. У ім аказалася выразка з газеты, вельмі старой, бо папера пажоўкла, злубянела, на перагібах аж пачала ламацца. Разгарнуўшы гэтую выразку, я ўбачыў свой нарыс «Восем смертнікаў» і ўспомніў акалічнасці яго напісання.

Калісьці дырэктар гістпарта Пассэ даў мне магчымасць пазнаёміцца з архіўнымі матэрыяламі пра козыраўскіх партызан, расстраляных белапольскімі інтэрвентамі ў 1920 годзе. Я знайшоў і жывога сведку падзей таго часу — сакратара штаба мінскай падпольнай арганізацыі Веру Пагірэйчык. Ёй удалося пазбегнуць кары смерцю, але яна была да таго знявечана дэфензівай, што хадзіла з кіёчкам.

Пагірэйчык узбагаціла мяне матэрыяламі, якіх не было ў архіўных дакументах: карцінамі дзейнасці арганізацыі, жывымі рысамі людзей, іх характарамі, слоўнымі партрэтамі. Я ведаў, хто з кім быў звязаны, каго падазравалі ў правакацыі і правале.

Пра маю работу даведаўся тагачасны карэспандэнт «Праўды» Фёдар Вігдаровіч. Ён папрасіў напісаць невялікі нарыс для газеты. Вось так і паявіліся ў «Праўдзе» гэтыя мае беглыя накіды недзе, мабыць, у трыццаць другім ці трыццаць трэцім годзе.

Ліст прыслаў дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея Міхал Мельнікаў. «Сярод папер былога начальніка пагранвойск СССР А. Кавалёва,— пісаў ён,— майго земляка, па-бандыцку забітага здраднікамі ў сакавіку 1942 года ў сваім вагоне ў Горкім, чалавека, які з 1925 года па розных граніцах вазіў з сабою беларускія кнігі, я знайшоў і выразку вашага нарыса. Як ні шкода, але перасылаю яго вам. Кавалёў нарадзіўся ў 1900 годзе, быў героем грамадзянскай вайны».

Я схіляюся перад светлым вобразам А. Кавалёва, які зберагаў гэтыя накіды сярод папер пра гераічнае мінулае нашай зямлі, і асмельваюся перадаць іх чытачам.

*

Чыгуначны пераезд Козырава. Глухое мінскае прадмесце. Ноч. Цёмная, ціхая. На стрэлках толькі пад самымі ліхтарамі цьмяна паблісквае каляя.

Пахне маладою зелянінаю, мокраю зямлёю. Над платамі дрэмле вішнёвае вецце. Са станцыі, з Мінска, сяды-

тады даносяцца кароткія гудкі паравозаў. Недзе за трактам азываецца сабака. Брахне, як спуджаны, і зноў — цішыня. Усё спіць.

Але два чалавекі прабіраюцца крадком: Васіль Пагірэйчык і Уладзімір Шумскі. Яны варочаюцца з задання, якое даў ім начальнік партызанскага атрада Васіль Шаранговіч: па лініі Мінск — Асіповічы рваць тэлеграфныя правады, узрываць масты.

Абодва натаміліся, прабіраліся прыцемкам, абыходзячы сёлы, бітыя дарогі, усё больш па кустах ды карчэўі.

Пагірэйчыкі — уся сям'я падпольшчыкаў. Бацька — машыніст паравоза. Гэта вельмі зручная прафесія, бываючы ў дарогах, ён перадаваў загады партызанскага атрада, прывозіў весткі. Сястра Вера — сакратарка штаба. На яе абавязку было трымаць сувязь з Баранавічамі. Карыстаючыся правам бясплатнага праезду па чыгунцы, яна перавозіла туды літаратуру, інструкцыі, адтуль — зброю, піраксілін.

Але галоўным падпольшчыкам у сям'і лічыўся Васіль. Нягледзячы на свае дзевятнаццаць гадоў, ён ужо ўдзельнічаў у баях з Калчаком, быў у падпольнай арганізацыі, што змагалася супроць Сямёнава. І ў мінскім падполлі стаў памочнікам начальніка падрыўнога аддзела. Спакойны, маўклівы, заўсёды як бы нечым задуманы, ён ніколі не мог выклікаць падазронасці, што займаецца такой небяспечнай справай.

Не выклікаў падазронасці і Шумскі. Селянін з Калядзіч, сціплы, памяркоўны, вечна на людзях у сваёй фасоністай шапачцы, напятай пруцікам у донцы, каб дзярката стаяла, у сівым фрэнчыку, перарobленым з шыняля, ён таксама быў пры падрыўным аддзеле: купляў зброю і вёў агітацыю.

Яны ішлі агародамі. Каля сядзібы Пагірэйчыкаў развіталіся.

— Будзь здароў, Уладзімір.

— Добрай ночы, Васіль. Папытай у Веры, можа што прывезла з Баранавіч ды трэба дзе перахаваць.

— Заўтра пабачымся, скажу.

Шумскі пайшоў далей, а Васіль пералез цераз паркан, адчыніў веснічкі ў двор. Каля хаты пастаяў, па прывычцы прыслухоўваючыся, чым жыве ноч.

Вельмі хацелася спаць.

Спаў ён моцна, але ўражанні дня ўвесь час урываліся ў сон. То звінелі правады на слупах, то ехала фурманка

і печым бразгала ў возе. А тады пачалі біць у бубен. Б'е і б'е нехта ў бубен, і ўсё мацней і мацней. Прачынаючыся, Васіль чуе, што гэта б'юць у дзверы, і чутны раз'юшаныя галасы:

— Пся крэў, адчыняй!

Пачынала світаць. У вокны відно, што на вуліцы салдаты. Многа салдат. Яны ходзяць па чужых дварах, на некага замахваюцца, на некага крычаць. Поўна людзей, але яны больш цiснуцца каля сваіх платоў. Плачуць дзеці, галосяць маткі. Падганяючы прыкладамі, трое вядуць Мяленту Процкага, тэлеграфіста, адзетага ў форму, але без шапкі, і Вячаслава Васілеўскага. Васілеўскі хваравіта прыгнуты, бо на фронце быў атручаны газамі, а ў дзесятым авіяатрадзе пад Петраградам пераламаў ключыцу і яшчэ не паправіўся. Далей, у цеснай кучы, абкружанай салдатамі, стаіць колішні шафёр інжынерных часцей, а цяпер слесар мінскага дэпо, камуніст Лявон Путырскі. Там жа, мабыць прывезеныя з Калядзіч, абодва Плашчынскія — ветэрынарны фельчар Сямён і яго сусед, нядаўні рабочы Абухаўскага завода Сяргей. На ім сёння няма ні гальштука, ні капелюша, а ён жа так любіў гэтую сталічную адзнаку.

У сям'і ў Пагірэйчыкаў забралі пяцярых: Васіля, бацьку, матку і дзвюх сясцёр. Дома астаўся трынаццацігадовы Міця. Заплаканы, ён стаяў на парозе і бачыў, як салдаты білі арыштаваных нагайкамі і прыкладамі карабінаў. У Васіля ўвесь твар быў заліты крывёю, і, звязаны, ён сіліўся выцерці шчаку плячом.

Вера, стройная, маладая і прыгожая, гідліва глядзела на афіцэра, што распараджаўся і памахваў бізуном. Мабыць, і тут афіцэру здавалася, што ім любуюцца. Ён падышоў да Веры, ласкава ўсміхнуўся:

— Скажыце, красуня, а дзе яшчэ хаваюцца бальшавікі?

— Я толькі ведаю, дзе нягоднікі,— адказала Вера.— І з нягоднікамі не размаўляю.

— Ах, так!

Афіцэр загадаў Веры адысціся да плота і стрэліў ёй у спіну. Вера ўздрыганула, прыслухалася — ці не паранена? Тады павярнулася і сказала:

— Хоць вы і афіцэр, а страляць не ўмееце. Калі б мне ваш рэвальвер — не прамахнулася б.

Штодня іх вадзілі ў камеру катаванняў. Акуратна прыходзіў кат са страшнай, аскаленай усмешкай на закасцянелым твары. Ён і катаваў з гэтай усмешкай, мабыць, каб выглядаць героем. У яго былі памагатыя, аж цёмныя ў сваёй нялюдскай рабоце. Білі шампаламі па пятах, па спіне, білі зацягнутымі ў гуму спружынамі; пад пазногці заганялі іголкі, праколвалі пальцы; ставілі пад ледзяныя кроплі вады, каб яны метадычнымі ўдарамі, як цвікі, уганяліся ў галаву; растопленым сургучом аблівалі цела; заціскалі дзвярыма і ламалі рукі; прапускалі электрычны ток. Людзі корчыліся, чарнелі, кусалі сабе губы і — маўчалі.

На суд прыехаў майстар крывавых спраў палкоўнік Шэмет. Толькі што ў Слуцку ён расстраляў чатырнаццаць паўстанцаў. На стале перад ім распяцце. Поруч з ім начальнік дэфензівы Красуцкі і мажны, сівы, увешаны ордэнамі генерал Шаптыцкі. Тут жа паверанuя ад госпада бога — поп і вядомы пасля садыст і шпіён ксёндз Усас.

Суд ішоў тры дні, з трэцяга да пятага мая. Але і ў часе суда не спыняліся катаванні ў дэфензіве.

У апошні вечар выклікалі Веру Пагірэйчык. Камеры допытаў яна не пазнала: за сталом, устаўленым вінам і наедкам, весяліліся паненкі і афіцэры. Калі яна паявілася, п'яная гамана сціхла.

— Панна Вера,— гасцінна падняўся насустрач афіцэр,— вы шчаслівая: заўтра вас выпускаюць на волю. Давайце піць і весяліцца разам з намі.

— Я ніколі не сябравала з панамі.

— Пакіньце, панна Вера. Вы такая слаўная.

— Не дакранайцеся! — крыкнула яна, калі нехта захацеў абняць яе.

У адно імгненне са стала ўсё было прыбрана і пакой набыў знаёмы выгляд камеры катаванняў. Веру раздзелі, паставілі на стол. Яе калолі відэльцамі, аб цела тушылі папяросы, падпякалі запалкамі пад п'яны рогат і віск паненак...

Прысуд быў абвешчаны сёмага мая. Восем чалавек — Васілеўскі Вячаслаў, Кепа Андрэй, Пагірэйчык Васіль, Пуцырскі Лявон, Працкі Мялента, Плашчынскі Сяргей, Шумскі Уладзімір, Плашчынскі Сямён — за «прыгатаванні да збройных выступаў процi збройнай сілы Дзяржавы» прыгавораны да расстрэлу. Шэсць чалавек, у тым ліку і Вера

Пагірэйчык,— «на кару цяжкай цюрмы праз 10 год кожны», як пісалася ў прыгаворы. Калі абвяшчалі прысуд, Веры сярод вязняў не было: на тым апошнім допыце з п'янымі папенкамі яе навечна зрабілі калекаю...

*

І вось іх вядуць на расстрэл на Камароўку, у лес пана Ванькавіча. Закаваных у кайданы. Абкружаных салдатамі ў шэра-зялёных мундзірах, з карабінамі напагатове. Кароткія цесакі цьмяна льсняцца начышчанай сталлю. І следам за гэтай працэсіяй расце і ціснецца натоўп людзей. Іх адганяюць, адціскаюць ад вязняў, наязджаючы коньмі, махаючы шашкамі. На якую хвіліну натоўп адступае к тратуарам, забягае наперад і зноў абступае цеснай сцяной. Раптам узвіваецца над галовамі і падае к нагам вязняў букет кветак. І пачынаецца песня. Яна пачалася сярод вязняў, вельмі паціху, і вось да яе далучаецца натоўп, і ўжо нічога не могуць зрабіць крыкі і шашкі афіцэраў, песня расце, шырэе, лунае над вуліцай, над горадам як гімн мужнасці і бяссмерцю.

У натоўпе ішоў і стары Пагірэйчык, незадоўга перад гэтым выпушчаны з турмы. Калі пачалася песня, ён не вытрываў, разарваў ланцуг канвоя і кінуўся да сына. Песня не змоўкла, толькі дамяшаўся да яе звон кайданаў, калі бацька схапіў скаваныя імі Васілёвы рукі. Салдат хацеў адцягнуць старога, але афіцэр не даў.

— Няхай ідзе з намі стары сабака і паглядзіць, як будзе канчацца яго сын.

На расстрэле яго паставілі ў сямі кроках ад смертнікаў. Ён бачыў загадзя выкапаную яму, свежы, яшчэ сыры пясок, выкінуты з яе на траву. На гэтым пяску і паставілі восем чалавек. Салдат — ці не той самы, з весела ашчэранымі зубамі, знаёмы па камеры катаванняў — накінуў мяшок на галаву Сяргею Плашчынскаму. Падбеглі другія салдаты. І вось знікла кучаравая галава Андрэя Кепы. Не паспеўшы выкрыкнуць «Няхай жыве!..», задыхнуўся голас Уладзіміра Шумскага. Ірвануўся, каб апошні раз зірнуць на свет, Вячаслаў Васілеўскі. Накінулі мяшок на светлы, зусім хлапечы твар Путырскага. Процкі чакае сваёй чаргі з горда паднятай галавой. Хоча смела глядзець смерці ў вочы і не дае накінуць мяшок Сямён Плашчынскі. Спакойна, як кожны раз ідучы на заданне, махнуў галавою старому Пагірэйчыку на розвіт сын Васіль.

Глухая, як у сне, каманда, і стары Пагірэйчык бачыць выцягнутыя карабіны з цьмяным бляскам цесакоў на іх. Кароткі выбліск агеньчыкаў. Стрэлаў ён не чуе, а бачыць толькі, як падгінаюцца ногі ў тых, што стаяць на пяску. Упаўшы, некаторыя спрабуюць падняцца, і тады зноў відны кароткія агеньчыкі. Сын... Нават пасля другога стрэлу ён сіліцца ўстаць, і тады афіцэр выпускае ў яго запар некалькі куляў.

Нават тут афіцэр не можа абысціся без сваіх шляхетных жартаў.

— Пся крэў! — крыкнуў ён старому Пагірэйчыку.— Ты зачараваў свайго бандыта: толькі шостая куля ўлажыла яго.

*

Як толькі прыйшла ў Мінск Чырвоная Армія, гэтую магілу раскапалі, каб пахаваць партызан, як герояў рэвалюцыі. Калі паднялі труп Андрэя Кепы, ён калоўся, у ім пааставаліся іголкі. У сціснутых кулаках у Васілеўскага былі шматкі матэрыі: яго закапалі жывога, і, задыхаючыся, ён ірваў на грудзях кашулю...

ФАКІР ІЯМА

1

У рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва» зайшоў пажылы чалавек і папытаўся, ці можа ён бачыць Скрыгана. Я падняўся яму насустрач, запрашаючы прайсці далей, але чалавек канфузліва прызнаўся, што хоча гаварыць адзін на адзін.

Рэдакцыя мясцілася на другім паверсе Дома пісьменніка ў пакоях цесных, непрыветных. Мы выйшлі ў невялічкую нашу пачакальню. У ёй стаялі чорная патрэсканая канапа і руды столік з выцертым бляскам колішняй густой алівавай фарбы.

— Прашу прабачыць, што адарваў вас ад работы,— сказаў чалавек, хвалюючыся.— Не важна, хто мне параіў, але я прыйшоў да вас як да пісьменніка. Хачу прадаць вам свае дзённікі.

— Як так?

— Я артыст,— сказаў чалавек,— факір Іяма. Прыехаў у ваш горад на гастролі. Тут няма ніякае спекуляцыі.

Я ўспомніў, што напраўдзе бачыў парасклейваныя ў горадзе афішы з імем гэтага чалавека. Вялікімі чорна-сінімі літарамі пасярэдзіне напісана «Факір Іяма», а ў левым кутку наверсе партрэт. Нетутэйшае аблічча: загарэлы бронзавы твар з строгім бляскам воч; чалма, перакрыжаваная на лобе белымі складкамі, сярод якіх чорнымі прамянямі гарыць дарагі камень; тонкае колца завушніцы ў вуху. Міжволі ўяўленне заводзіць у далёкія, гарачыя, нязнаныя краіны, дзе поўна самых пякучых таямніц, дзе жывуць чараўнікі, адгадчыкі лёсу, і дзе змеі танцуюць пад музыку... Я зірнуў па Іяму: з партрэтам не было ніякага падабенства. Вельмі пажылы чалавек невысокага росту, шчуплы, стомлены, нават нездараўчаны, нават разгублены. На вузкіх плячах кароткая даха, рудою, лямцаватаю шэрсцю наверх.

Не стасавалася такое аблічча ні з афішным партрэтам, ні з іншаземным прозвішчам, ні з прафесіяй. Усяму гэтаму хацелася знайсці прымірэнне.

— Я многа паездзіў па свеце,— між тым гаварыў чалавек,— многа чаго бачыў і ўсё, што было вартае ўвагі, запісваў. Я бачыў вялікія гарады — Парыж, Вену, Ніццу, Дэлі, Бэйпін. Ведаў славутых і знакамітых людзей свету — французскіх класічных барцоў, італьянскіх спевакоў, індыйскіх факіраў, драматычных артыстаў, такіх, як Сара Бернар, танцорку Айседору Дункан. Словам, мне было што запісваць у свае дзённікі. Ведама, найперш за ўсё ў іх расказана маё жыццё. Прафесія факіра не такая ўжо частая, і мне здавалася, што вам як пісьменніку яны спатрэбяцца.

Не, мне яны не былі патрэбны. Па-першае, зусім нядаўна паявіліся ў друку «Прыгоды факіра Бен-Алі-Бея» Усевалада Іванава, і я не мог нават памысліць, каб узяцца наўтараць тэму, ды яшчэ з чужых рук, не знаючыся з матэрыялам. Па-другое, гэта было вельмі далёка ад маіх замыслаў: я збіраўся пісаць пра козыраўскіх партызанаў. Я сказаў, што дзённікаў узяць не магу.

— Шкода,— уздыхнуў Іяма.— А ў мяне была такая надзея...

Прымірэння супярэчнасцей не знайшлося, і таму я сказаў:

— Дзённікі — гэта тое, што пішацца пра самога сябе. Такое інтымнае, што яго нават найлепшаму сябру не асме-

лішся паказаць. А тут — на людзі. Што вас прымушае прадаваць іх?

Іяма ўцягнуў галаву ў вузкія плечы. Мы сядзелі на чорнай прашмуленай канапе, паміж намі ляжала яго рудая, пад колер дахі, шапка-вушанка.

— Я спадзяваўся, што з часам на іх аснове напішу кнігу, збіраўся стаць пісьменнікам. А цяпер бачу, што і не здолею і не паспею. Але не гэта галоўнае. Я жанаты, мая жонка маладая жанчына, і я не магу... Таксама не галоўнае... Вам добра вядома, што маё мастацтва цяпер не ў модзе. Нават з вамі вось тут гаворачы, я не спакойны, бо не ведаю, як пройдуць гастролі. Мае заработкі страшэнна няпэўныя. А я нават у думках не магу дапусціць, каб яна за мною зазнала... Я думаю, вы разумееце, пра што я гавару.

Я разумеў. Факірскай прафесіі на той час было цяжка. Дзяржава змагалася проці папоўства, выкрывала рэлігійны падман, усякае шальмоўства, а факіры сваю работу будавалі пераважна на тайнах, на тым пастулаце, што яны валодаюць надпрыроднаю сілаю, знаюцца ні то з богам, ні то з нячысцікам. І звычайна праграмы фокуснікаў правяраліся, патрабавалася, каб усё залішне мудрагелістае было тут жа раскрыта. Рамеснікаў гэта не абыходзіла, іхнія прымітыўныя праграмы вытрымлівалі ўсякія праверкі, а вялікія артысты трацілі многае. Як, напрыклад, можна было раскрыць трэніроўку памяці, дапытлівасць мыслі, тайны гіпнозу? Усё тое, што галоўным чынам уласціва высокаму мастацтву. І многія, можа самыя лепшыя, нумары з іхняга рэпертуару часам да сцэны і не даходзілі.

І раптам майго ўсведамлення крапулася здагадка, што перада мною адзін з такіх вось вялікіх артыстаў. Што яго, як і многа каго ў жыцці, напаткалі трагічныя хвіліны, пра якія ён стараецца мужна маўчаць. І мяне пагарнула да яго.

— Чым яшчэ я мог бы вам памагчы? — папытаўся я.

— Нічым. Хоць не, я гавару не зусім праўду. Першае, я разумею вас як мастака, калі вы адмаўляецеся ад дзённікаў. Можа і я зрабіў бы гэтак на вашым месцы. Але мне хочацца, каб вы іх усё ж пачыталі. Я не чакаю пахвалы ці літаратурнай ацэнкі, я вельмі далёкі ад самазахаплення, але ўсё ж хочацца паслухаць вашу думку. І другое, вы добра ведаеце, як многа значыць нават самы маленькі водгук у прэсе. Асабліва пра маё мастацтва. Сёння ўве-

чары я даю першы адкрыты паказ і быў бы вельмі рад, калі б вы пабывалі на ім і адгукнуліся ў вашай газеце. Вы, ведама, жанаты, запрашаю вас з жонкаю. У клубе харчавікоў. Туды я прынясу і дзённікі.

2

Быў канец трыццаць пятага года. Цёмным вечарам мы з Лінаю спускаліся па Камсамольскай вуліцы ўніз да Нямігі. Пашчыпваў добры марозік. Мы ледзьве знайшлі той клуб харчавікоў, нізкі, шырокі, як бы ўціснуты ў начны рыпучы снег. У зале таксама было холадна, людзі сядзелі ў palітах, пацепвалі плячыма, хукалі ў рукі. Гарэла некалькі нізка спушчаных лямпачак, святло іх то ажывала, то замірала, грозячы зусім патухнуць. Я вельмі не люблю вытыркацца ці дакучаць сабою, асабліва ў выпадках, калі ты нейкім спосабам спрычыняешся да чужых інтарэсаў. Не паказаўшыся Іяму, мы знайшлі сабе месца недзе ў апошніх радах.

Ці то ад холаду, ці ад чакання людзі пачалі тупаць нагамі. Паднялася заслона, і на сцэну з невялікім столікам пасярэдзіне, накрытым цёмным покрывам, імкліваю хадою выйшаў Іяма. Майму здзіўленню не было мяжы: гэта быў той самы заморскі чараўнік з партрэта — бронзавы, маўкліва-замкнёны твар, магічная зорка ў складках чалмы над самым лобам, танюткае колца завушніцы. Ён паклаціўся публіцы, зрабіў некалькі мяккіх крокаў назад і ўспляснуў рукамі. На сцэну выйшла новае дзіва — жанчына невыказнага хараства, убраная ў лёгкія квяцістыя шаўкі, хадою, у якой поўна і стрыманасці, і ўлады, і пакорлівай адданасці. Яна таксама пакланілася ў публіку, адышлася да століка і зняла з яго цёмнае покрыва...

Як мне здалося, усё ішло звычайна і нармальна. Але нешта ў паказах было такое, што трымала ўвагу ў трывожнасці. Іяма глытаў доўгую гнуткую шпагу, піў газу і пасля выдзімаў яе над сабою чырвона-дымным факелам; рабіў фокусы з хустачкамі, з вадою; доўгім прутам пратыкаў аголеную да локця левую руку, і з ніжняга боку, дзе выходзіў канец прута, скура непадатліва напіналася і праколвалася з ціхім хрустам. Было многа і іншых дасціпных выдумак. Аднак жа асабліва запомніліся два нумары. Адзін — калі Іяма, адышоўшыся ў далёкі канец залы і стаўшы да сцэны спінаю, клаў на плячо стрэльбу руляю назад, цэліўся праз антычнае вочка перад сабою

і страляў. На сцэне гарэла пяцілінейная лямпа са знятым і паложаным перад ёю на чорным аксаміце шклом. Шрацінка, не пачапаўшы шкла, прайшоўшы праз яго вузкі камінок, цаляла ў самы агеньчык і тушыла яго.

Другім нумарам завяршаўся паказ. Яго памочніца выходзіла на сцэну ў спрэс сінім шоўку, станавілася на калені і ўгінала галаву. Іяма клаў ёй на шыю яблык і высокім, бліскучым узмахам шаблі рассякаў яблык з такою сілаю, што палавінкі яго разляталіся далёка ў бакі. Па зале прабягаў ток жаху, нехта ўскрыкваў, нехта ўскокваў з месца, але жанчына падымалася з каленяў і, міла ўсміхнуўшыся, спакойна ішла за кулісы.

Можа таму, што незвычайнасцю нашай сустрэчы я быў настроены зычліва, усё бачанае імпанавала мне. Гэтак я сказаў і Іяму, калі мы з Лінаю падняліся за заслону. Іяма быў ужо ў карычневым пінжаку, выглядаў стомлена, збіраў і ладкаваў рэквізіт.

— Мар'янка! — крыкнуў ён за кулісы.— Ідзі сюды, я цябе пазнаёмлю з добрымі людзьмі... Калі ласка,— сказаў ён, калі ўвайшла тая прыгожая, у сінім шоўку, жанчына,— вось мая жонка...

Апроч прыгажосці ў жанчыны была нейкая вельмі мілая мяккасць — у вачах, у голасе, у светлых валасах, у манеры даверліва глядзець, у гатовасці вас зразумець і ісці насустрач. Сказаўшы адна адной некалькі фраз, яны з Лінаю тут жа сталі сяброўкамі.

— Хадзем, Ліначка, вы мне паможаце пераадзецца, бо я мерзну.

Нечым з Лінаю яны былі падобныя, проста, мабыць, непасрэднасцю і маладосцю. І памятаю, якімі замілаванымі вачыма Іяма глядзеў услед Мар'яне, калі яны пабеглі за кулісы.

— А мне, на жаль, прыходзіцца займацца вось такім тандэтам,— паказаў ён на сабраны рэквізіт, адразу стаўшы сумным.— Як шкода, што вы не бачылі мяне ў маіх каронных нумарах...

3

Чатыры даволі ладныя агульныя сшыткі, спісаныя дробным, цесным почыркам,— гэта і былі Іямавы дзённікі. Апроч ханалагічных падзей у іх запісваліся ўспаміны, апавядаліся чужыя гісторыі, многа месца аддавалася роздуму. Даваліся характарыстыкі і знакамітым гарадам, і славутым людзям. Але з усяго напісанага найярчэй вы-

ступаў партрэт самога Іямы. Гэта быў чалавек строгі да сябе, удумлівы і разважлівы. Ён не любіў марнатраваў, выскаляк, людзей пустых і легкадумных, няхай сабе за імі бегаў цень славы. Па ўсіх дарогах ён вазіў з сабою кнігі. Няблага разбіраўся ў філасофіі і псіхалогіі, дасканала ведаў фізіялогію і анатомію чалавека, трэніраваў волю і памяць. Высока ставіў чалавечую годнасць і з агідаю пісаў пра двух барцоў, з якімі ў Рыме міжволі давялося жыць поруч у гасцініцы. На сцэне яны дэманстравалі прыгажосць класічнай барацьбы, а ўвесь вольны час паласкаліся ў віне і цынічна выхваляліся, дзе, у якіх паклонніц і пры якіх акалічнасцях мелі найбольшы поспех і за якія дастаткі іх любілі.

З дзённіка можна было дазнацца, што ніякі ён не чужаземец Іяма, а самы звычайны рускі Красікаў з добрым рускім жа імем Уладзімір. Што родам з Сібіры. Быў сельскім пастухом, бадай што сам навучыўся грамаце і «захварэў» на штукарства з таго часу, як праз іхняе сяло прайшоў вандроўны цырк. Пачаліся пошукі кніжак пра хірамантыю, чорную магію, чарадзеяў, ёгаў, тайны жывёльнага магнетызму. Каб прывучыць сябе не баяцца болю, ён падпяразваўся пад адзеннем цвёрдымі тугімі вяроўкамі, насіў паўтыканыя ў цела вострымі кручкамі гіркі — увесь дзень у такім самаастракізме ходзячы за чарадою. Падзываў сабаку, які быў яму памагатым у пастухоўстве, і глядзеў яму ў вочы з такою ўпартасцю, што той лажыўся яму ў ногі і пачынаў вішчаць. Словам, яго біяграфія нечым як бы пераклікалася з бен-алі-беeўскай, мне нават падумалася, ці не мае факірская прафесія ў сваім узнікненні нейкай заканамернасці.

Потым знік — таксама падобна на заканамернасць.

Потым вандраваў з цыркам.

Потым на многа гадоў апынуўся ў Індыі і адтуль вярнуўся ўжо з вядомым на ўвесь свет імем факіра Іямы.

4

Не памятаю, ці даваў я водгук у газеце. Мабыць, даваў. І не ведаю, ці гэта стала прычынаю, ці тое, што пасябравалі між сабою жанкі, але ў нас з Іямамі завязалася добрае сямейнае калегаванне. Яны сталі бываць у нас як жаданыя госці.

Звычайна, калі збіраліся, мы прасілі Іяму што-небудзь расказаць. З яго вандроўнага жыцця ці нешта з прафесіі, якая нам заўсёды ўяўлялася як далёкая трывожная тайна.

Ён не вельмі ахвотна на гэта згаджаўся. Усё як бы баяўся, каб не надта раскрыцца. Аднаго разу Ліна нават сказала яму пра гэта. Яна сказала, што папраўдзе факірская прафесія любіць недамоўленасць і што глядач мае рацыю, калі сяму-таму не верыць, бо часамі надпрыродная сіла надаецца самаму звычайнаму штукарству.

— У мяне абсалютна ні ў чым няма штукарства,— сказаў Іяма.

— Можа і няма, але так выглядае, бо вы любіце скрытнасць. Не вы, а ваша прафесія.

— Калі ласка, можаце пераканацца!

Іяма падняўся з крэсла, ступіў крок назад і агаліў да локця левую руку. На смуглай тугой скуры з іскрыста-жоўтым мяккім пухам валаскоў мы ўбачылі сляды праколаў. Яны ружавелі бледнымі, тоненька паморшчанымі плямкамі, як гэта бывае на свежазагоеных ранах.

— Як бачыце, сляды, зверху і знізу, старыя і свежыя. А многія думаюць, што гэта таксама ашуканства. Што і прут не жалезны, і я не праколваю рукі. Усё штукарства, як вы кажаце, у тым, што я ведаю, дзе калоць і як калоць. Каб прут прайшоў паміж локцевай і прамянёвай косцю, не закрануўшы іх; каб ён не пачапаў мышцаў, а найдакладнейшым чынам прайшоў паміж іх слаямі. І трэба ведаць, як трымаць пальцы: калі сашчапіўшы ў кулаку, калі расшчапіўшы і колькі. У мяне ніколі не бывае ні крыві, ні разрыву тканак, няма болю. А можа боль і ёсць, толькі я прывучыў сябе не чуць яго.

Другі раз Іяма здзівіў нас, можна сказаць, самаю нечаканаю нечаканасцю. Была нядзеля. Пасля лёгкага чаю мы сядзелі хто за сталом, хто на канапе. Іяма стаў каля кафлянае нашае грубкі, прыціснуўшыся да яе спінаю. Выпала хвіліна нейкае ціхае паўзы, і ніхто не заўважыў, як ён дастаў з кішэні ў пінжаку губны гармонік. Я ўбачыў яго ўжо толькі тады, калі пачуліся першыя гукі. Гэта былі чары. Было ўражанне, што зайграў цэлы аркестр. Я чуў адначасова і высокія галасы і ўторы да іх. Я глядзеў на рукі — здавалася, што ўсё дзіва было ў іх. І ў губах. І яшчэ ў нейкай тайне, якая раздзельна на розныя таны падавала дыханне.

Скончыў Іяма гэтак жа нечакана, як і пачаў. Абцёр хустачкаю гармонік, прадзьмуў яго. І зірнуў на Мар'яну. Яна падышла і стала каля яго, радая і шчаслівая.

— Мы не ведалі, што ў вас ёсць яшчэ адзін, такі шчаслівы талент,— сказала Ліна.

— У яго было дванаццаць штук такіх, канцэртных. Праўда, Валодзя? — не стрывала Мар'яна, каб не паказаць, што ўсё Іямава ёй люба і міла.

— Праўда, Мар'янка,— усміхнуўся ёй Іяма. І, дапаўняючы яе, паясніў: — Я іх некалі купіў у Германіі, цэлы набор. І мог даваць канцэрты на цэлы вечар. А цяпер вось астаўся толькі адзін, і нечым ён мне вельмі дарагі... І музыку закінуў зусім.

Апошнім часам ён паправіўся, пасвяжэў, памаладзеў, на твары паменшала маршчын. І на душы як бы ўсталяваўся нейкі трывалы спакой. Нават гарнітур карычнева-балотнага колеру сядзеў на ім неяк акуратна і зграбна, падкрэсліваючы стрыманую паважнасць і станавітасць.

5

На нейкі час Іяма выехаў у раёны. Паколькі праграма на раёны была скарочаная, ён паехаў без памочніцы. Бадай што ўвесь свой вольны час Мар'яна цяпер бавіла з Лінаю. Ведама, былі расказаны ўсе самыя задушэўныя тайны.

Зусім маладою дзяўчынаю Мар'яна выйшла замуж за інжынера-будаўніка. Здарылася нейкая сур'ёзная правінка на рабоце, і ім прыйшлося разлучыцца. Мар'яна вярнулася да мацеры. Па невялікім часе маці сабрала яе ў Мурманск: едзь, дачушка, пабачышся, будзе лягчэй і яму і табе. Тры дні яна дзяліла з ім і радасць і слёзы. На ад'ездзе прачытала афішы, што ў тэатры дае апошнія паказы факір Іяма. Пайшла. З залы на сцэне бачыла смуглага пажылога чалавека ў стракатым нетутэйшым адзенні, з мяккімі, але строгімі жэстамі. Некалькі разоў ён зірнуў на яе, як бы пазнаючы ці даючы знак, што вылучыў яе сваёю ўвагаю. Калі спатрэбіўся яму ў нейкім фокусе ні то памочнік, ні то сведка, што ўсё робіцца без фальшу, ён пазваў ахвотнікаў з залы. Без хвіліны развагі ці вагання яна паднялася і пайшла на сцэну. І пачула, што з гэтага часу яна будзе пакарацца толькі яму. І больш не вярнулася: ні ў свой нумар у гасцініцы, ні дадому.

Яна стала яму памочніцаю, ездзіла з ім па гарадах, вандравала па гасцініцах і заезных дамах, ніколі не думаючы, цяжка гэта ці лёгка, і не ведаючы, дзе край і дзе пачатак шчасця. Усё было хораша і міла, і самым найдаражэйшым чалавекам на свеце быў Іяма. Даходзілі да яе чуткі, што ў Іямы была ці можа і ёсць нейкая другая жанчына, але гэта яе ані крошкі не трывожыла.

І вось нарэшце яны прыехалі ў яе горад. Матцы дакучаць не сталі, бо тая яшчэ памятала даччыны нялюдскія ўцёкі, нанялі на Койданаўскім тракце палавіну дамка — пакой і каморку, перавезлі туды два жоўтыя скураныя чамаданы і акварыум з чатырма рыбкамі, кожная рознага колеру. У гэтую пару Мар'яна была асабліва шчаслівая: неўзабаве яны збіраліся на гастролі ў Манголію.

— Ты ведаеш, што я адтуль прывязу? — гаварыла яна Ліне.— Стракаты цёмны халат з залатымі іскрамі і зуб ад нейкае куслівае рыбы. Крывы такі, вялікі, як шабля, я ў аднае бачыла, яна таксама прывезла з Манголіі...

Вярнуўся Іяма з раёнаў не вельмі вясёлы, удачы вялікае паездка не дала. Ён заняўся нейкім дадатковым клопатам, бываць у нас стаў рэдка. Аднаго разу, калі мы з ім сядзелі ў маім невялікім пакойчыку, абмяркоўваючы яго невясёлыя справы, а ў гасцінай на канапе, падняўшы светлыя бровы, Мар'яна пра нешта шчасліва шчабятала Ліне, ён сказаў, зачаравана гледзячы на яе:

— Яна адна толькі і радуе мяне. І не ведаю, як аберагчы яе ад злых нечаканасцей майго лёсу. Я вельмі люблю яе.

Я зірнуў на яго. Зноў мне здалося, што ён вельмі стары: стомлены, суха паморшчаны твар, палахлівы бляск у вачах, востра паднятыя плечы. Мяне кранулася нейкае трывожнае прадчуванне.

І папраўдзе, па невялікім часе раненька прыбегла Мар'яна, расхрыстаная, з раскіданымі валасамі і, горка плачучы, кінулася Ліне на шыю: знік Іяма.

— Як знік?

А вось так: учора пад вечар ён хадзіў на пошту, даваў нейкую тэлеграму. Дома яны спакойна павячэралі, пагаварылі зноў пра Манголію. А ўранні, калі Мар'яна прачнулася, у доме стаяла ціхуткая цішыня і не было ні чамаданаў, ні акварыума, ні Іямы.

— Пастой, не гарачыся, Мар'янка,— спрабавала супакоіць яе Ліна, заводзячы ў пакой і абціраючы слёзы з яе твару.— Можа ён паехаў на гастролі, ён жа хадзіў, недзе дамаўляўся, а табе не паспеў сказаць. Вернецца, і ўсё будзе добра.

— Ах, пачакай,— раптам расшырыла вочы Мар'яна, нешта ўспомніўшы.— Мне ж нездарма гаварылі пра нейкую жанчыну, я ведаю, дзе ён.

І тут жа з непрыбранаю галавою, з мокрым тварам выбегла з дома.

Мар'яна памятала ў Маскве адзін дом каля Сеннага рынку, гаспадыню яго, даволі поўную жанчыну, у якой яны чамусьці часта бывалі. На гэты раз яе сустрэла не гаспадыня, а другая жанчына, пажылая, але стройная і, відаць, калісьці прыгожая, з высокаю прычоскаю, у сукенцы, падперазанай тугім замшавым паяском, што яе вельмі маладзіла.

— Каго вам? — папыталася яна.

— Мне, Іяму. Валодзю,— папраўілася яна, хочучы паказаць, што той, каго яна пытаецца, блізкі ёй.

— Такога тут няма.

— Якраз ёсць, вось яго чамаданы. І акварыум. Так што, не маніце.

— Ах, чамаданы? Ну, чамаданы ёсць, а самога няма. І не будзе.

— Усё роўна я пачакаю,— сказала Мар'яна і села на большы, такі знаёмы ёй чамадан.

Жанчына пайшла ў бакоўку. Мар'яна пазнавала гэты пакой, цяпер ёй такі страшны і чужы. Нізкая столь, змрок ад густых фіранак, жалезны ложак адразу пры дзвярах, адгароджаны стаячаю шырмаю. Сядзела і ўспаміпала Мурманск. Нават не ведала, колькі прайшло часу. І раптам увайшоў Іяма.

— Ты? — здзівіўся ён. І не паспела Мар'яна апамятацца, як ён сказаў: — Ты зараз паедзеш назад, дачушка. Абавязкова паедзеш назад, праўда ж? Ты мяне заўсёды слухалася, слухайся і цяпер: ты зараз паедзеш назад. Я цябе правяду на вакзал, вазьму білет. Ты разумніца і ўсё зробіш так, як я кажу. І не плач, і не бядуй, і будзь вясёлая — чуеш? Ну вось і хадзем.

Мар'яна пакорліва пайшла, пакорліва на вакзале з рук у яго ўзяла білет і паднялася ў вагон. І праз колькі хвілін, як крануўся цягнік, пра ўсё забылася, як бы ніякага гора ў яе і не было. Нечакана аднекуль наплыла лёгкасць і вясялосць. З адчуваннем гэтай лёгкасці і весялосці, шустрая, нейкая зусім бесклапотна новая, яна прыйшла і да нас.

— Ну? — нецярпліва папыталася Ліна.

— Усё! — бесклапотна сказала Мар'яна.— Усё кончана, я адна, мне спакойна і лёгка.

— Не, чакай, раскажы толкам.

— Што ж расказваць: вярнулася і сяджу ў цябе. І як

бы нічога і не было ў мяне, як бы ўсё толькі прыснілася. Мне хочацца нешта рабіць — смяяцца, радавацца, плакаць,— даўно я не чула вакол сябе гэтулькі волі...

7

Па сутнасці, на гэтым апавяданне можна было б і скончыць. Але ёсць акалічнасці, якія маюць да яго непасрэднае дачыненне.

Пасля першага, закрытага паказу за кулісамі да Іямы падышоў элегантна адзеты малады чалавек і папрасіў яго схадзіць у бухгалтэрыю і атрымаць ганарар. Мар'яна асталася з чалавекам адзін на адзін. Ён назваўся Артурам, сказаў, што яна самая прыгожая і самая пікантная жанчына на свеце і што ён быў бы шчаслівы, калі б яны маглі заўтра сустрэцца.

— Я буду чакаць вас каля Чырвонага касцёла раніцаю роўна ў дзесяць гадзін,— сказаў гэты чалавек.

— Што вы,— запярэчыла Мар'яна.— Я замужам, і ніякія спатканні мне не патрэбны.

— Не веру,— сказаў чалавек.— Вы маладая, прыгожая, перад вамі трэба стаяць на каленях. Хочаце, стану?

— Перастаньце,— гнеўна запярэчыла Мар'яна.— Вы вельмі нядобры чалавек.

— Зараз прыйдзе ваш муж, і нам нельга будзе гаварыць. Памятайце, роўна ў дзесяць я чакаю вас.

Паказаўся Іяма, элегантны чалавек галантна раскланяўся і знік.

А назаўтра ўранні Іяма разбудзіў Мар'яну.

— Уставай, дачушка, а то спознішся.

— Куды, Валодзя? — папыталася Мар'яна.

— Ён жа чакае цябе. Хіба ты забылася, што на дзесяць гадзін у вас назначана спатканне?

У Мар'яны захаладала сэрца...

Цяпер, вярнуўшыся з Масквы, яна пачала ўспамінаць і іншыя рэчы. Што часта, прачнуўшыся ўранні, ва ўсім целе яна чула знясіленне і стому, і на руцэ ў яе, недзе каля запясця, як бы аставаўся след чужога настойлівага крануння. Раптам ёй падумалася, што і жанчыну, якую застала ў Іямавай гаспадыні, яна ведала недзе раней. І ўспомнілася ні то праўда, ні то послых, што першая Іямава жонка была таксама ў яго памочніцаю, і аднаго разу, намовіўшы на сцэне ёй сон, ён не разбудзіў яе. І што пасля гэтага ён больш не меў права на такія паказы. І акварыум-

ных рыбак ён вазіў з сабою проста як памяць, бо пасля таго таксама не меў права глытаць іх і адрыгваць колерам, які закажа публіка. Ён адрыгваў зусім не той колер, але ўсе бачылі іменна той, што заказвалі.

Упершыню яна горка падумала і пра тое, што ён ёй ніколі не быў мужам, а проста як добры бацька, і гэта, мабыць, страшэнна перажываў.

— Перад маімі вачыма як бы развеяўся нейкі сіні туман, і я ўсё ўбачыла зусім іначай,— стаўшы раптам сур'ёзнаю, сказала Мар'яна.— Мне лёгка і свабодна, але ж нешта і трывожна. Мне шкода яго. Ён быў вельмі добры і вельмі любіў мяне. І я ўсё думаю: чаму ён так зрабіў?..

Гісторыя гэта праўдзівая. Але прайшоў вялікі час, сёетое ў памяці размылася і пры аднаўленні магло парушыцца. Нешта набыло больш акрэсленыя формы, нешта прыглухла або зусім страцілася. Апавядальная манера пісьма таксама вымагала свабоднага рысунку. І таму я дазволіў сабе трошкі змяніць імёны персанажаў. Тым больш што Мар'яна, шчаслiва жыве, не так даўно я яе бачыў і не мала падзівіўся, што гады бадай не пачапалі ні яе прыгажосці, ні абаяльнасці.

Колькі добрага часу таму назад давялося пачуць і пра Іяму. У адным з літаратурных часопісаў я прачытаў успаміны вядомага тэатральнага дзеяча, у якіх ён, згадваючы імёны майстроў савецкае сцэны, сярод вялікіх артыстаў назваў і факіра Іяму. Я ад душы пасмуткаваў, што імя было ўпомнена сярод нябожчыкаў.

Я таксама часта пытаўся ў самога сябе: чаму ён так абышоўся з Мар'янаю? Ні на хвіліну я не прымаю намёкаў на нейкую пабочную жанчыну: такую здагадку магло спарадзіць толькі хваравіта-ўзрушаная тады Мар'яніна фантазія. Мне куды бліжэй думка, што ён быў па-рыцарску высакародны і пакінуў яе толькі таму, што вельмі любіў.

ТРЫВОГІ

ТРЫВОГІ

1

Даволі доўгі час я не займаўся літаратураю. Я пабываў у Сібіры, Узбекістане, Эстоніі, бачыў розныя землі і гарады.

І ўсюды на сваім шляху сустракаў і добрых і благіх людзей. Найбольш добрых, і найбольш гэта помніш, бо на добрым вучышся сам. Я маю на ўвазе не якую дабрачыннасць, а чуласць, сумленнасць і праўду, няхай сабе жорсткую, чалавечыя ўчынкі. А благія — гэта як памылкі друку.

Добры быў Васіль Аркадацкі, бухгалтар па прафесіі, які ўзяў мяне з земляных работ і не выпусціў з вока, пакуль не дабіўся толку. Узяў ён мяне на падмогу ў часе гадавой справаздачы — проста чарціць бланкі, а выпусціў бухгалтарам, даўшы неблагую спецыяльнасць.

Добры чалавек быў галоўны бухгалтар завода Мікалай Воранаў. Я змогся, ходзячы па Фергане і шукаючы работы больш-менш блізкай па душы. У снежні, у самую тамашнюю зіму, як толькі наставала ноч, я выходзіў за горад, выбіраў месца, дзе расло больш тутоўніку, награбаў лісця пад сябе і лажыўся спаць. Раз заначаваў у чайхане, але якраз была праверка дакументаў, мяне западозрылі, запрасілі ў міліцыю, і толькі назаўтра выпусціў пракурор Вавілаў. Страціўшы ўсякую надзею, я пайшоў бадзяцца па вуліцах і натрапіў на новы завод, што стаяў недзе на краі горада. У недабудованай канторы проста на ўтрамбованай зямлі стаялі сталы, а за самым дальшым сядзеў галоўны бухгалтар, відаць, нядаўна дэмабілізаваны. На шафе вісеў яго шынель, на стале, казырком на кантору, ляжала яго шапка. Не выпускаючы з зубоў чорнай прасмаленай люлькі, ён спакойна і неяк хваравіта-ціха распытаў, што я знаю па сваёй прафесіі, і сказаў:

— Пішыце заяву.

— Толькі я...— Недагаварыўшы, я красамоўна паказаў на свой бушлат.

— А я бачу,— сказаў Воранаў.— Пішыце заяву.

Тут жа з заявай ён пайшоў да дырэктара, да начальніка аддзела кадраў. Выклікаў каменданта Сёміна і распарадзіўся, каб мяне пасялілі ў інтэрнат.

— Пакуль што кватэры асобнай няма,— растлумачыў ён.— Але скора будзе, будуем цэлы гарадок.

За ўвесь час работы на заводзе я ўпэўніўся, што такі душэўны і чулы быў ён да ўсіх. Характар і лёс гэтага чалавека, удзельніка іспанскіх падзей, патрабуе цэлай кнігі.

Добры чалавек быў дырэктар гэтага ж завода Уладзімір Кучарэнка. Інжынер, чалавек з дзвюма вышэйшымі адукацыямі, вучоны, ён не надта любіў сваё дырэктарства, але яго любілі літаральна ўсе. Дабрата яго была справядлівая і строгая. Ён нават ніколі не загадваў, ён прасіў, і выканаць просьбу Кучарэнкі было за гонар. Бадай-што ўсіх сваіх людзей ён ведаў, і не толькі ў твар, а як жывуць, якія ў іх сем'і і ў чым маюць патрэбу. І чым толькі мог — памагаў, бо час быў цяжкі, толькі што скончылася вайна. У сваім «козліку» ён ніколі не ездзіў адзін: ці з работы, ці на работу падбіраў па дарозе, каго найперш сустракаў. Яго шафёр Віця ведаў ужо гэтую прывычку, і як толькі на тратуары пазнаваў свайго рабочага, сунімаўся і зваў — сядайце. З дырэктарства Кучарэнка такі адпрасіўся, бо адначасна спраўляў і другую работу — галоўнага інжынера. Пасля яго прыйшоў новы дырэктар, Курзін. Ён прынёс з сабою і новы, вельмі модны на той час стыль кіравання: хмуры, цяжкі погляд, цвёрды, халодны голас, жалезную беспярэчнасць і манументальную недаступнасць — усё, што павінна было ўвасабляць волю і сілу. Кантакт з людзьмі ён наладзіў толькі праз загады: даць вымову, папярэдзіць, звольніць. Тып такога кіраўніка з голай, аскетычнай суровасцю на нейкі час стаў узорам і для літаратуры. Кабінет у Курзіна стаў пуставаць. Інжынеры, начальнікі аддзелаў і цэхаў пачалі разбягацца.

Аднойчы на тэрыторыю завода прыйшлі цыстэрны з сернаю кіслатою. Іх трэба было разгрузіць, каб не плаціць за прастой вагонаў. Ноч, на заводзе лішніх рабочых рук няма. Курзін абзваніў усе тэлефоны, разаслаў па бліжэйшых кватэрах усіх вахцёраў і вартавых, каб сабраць людзей, але ніхто не прыйшоў. На кацельнай у інжынера Канстанцінава працавалі дзяжурныя і падсобныя рабочыя, Курзін загадаў ім, але яны сказалі, што кацельнай



Ян Скрыган. Полацк,
1926.

З іншых аўтараў асабліва вызначаецца сваёй самабытнай мастацкасцю Відук[1], але можна думаць, што ён яшчэ не знайшоў уласцівых сабе і памысных у беларускай літаратуры жанраў. Відук — моцны мастак слова, і ад яго, калі ён зусім аформіцца, шмат чаго можна чакаць.

...Што да прозы, дык у Янкі Відука — яна мацнейшая за вершы і вызначае яго паміж празаікаўмаладнякоўцаў...

МАКСІМ ГАРЭЦКІ

---

[1] *Колішні псеўданім Яна Скрыгана.*

Літаратурная спадчына старэйшага беларускага празаіка Янкі Скрыгана даволі вялікая... Але ў серыю «Бібліятэка беларускай прозы», якую выпускае выдавецтва, пісьменнік адабраў усяго 18 аркушаў сваіх твораў... І кніга атрымалася надзвычай цэльная. Больш таго, атрымалася рэдкая і дзівосная карціна: апавяданні, нарысы, замалёўкі, належным чынам арганізаваныя і як бы асветленыя аўтарскімі развагамі, пастаяннай прысутнасцю аўтара, яго вельмі разумнай ненавязлівай гутаркай з чытачом, стварылі шырокую мастацкую панараму жыцця беларускага народа

на працягу значнага гістарычнага перыяду — ад грамадзянскай вайны да нашых дзён.

«Кругі» — гэта тая рэдкая кніга, у якой кожны чытач знаходзіць для сябе сваё, тое, што цікавіць яго, што адпавядае яго душэўнаму настрою. Яна не можа пакінуць абыякавым і юнака, якога захапляе сюжэт, і чытача з багатым жыццёвым вопытам, які шукае ў кнізе псіхалагічнай глыбіні і праўдзівасці чалавечых характараў, і таго, хто любіць філасофскія адступленні і аўтарскі роздум над з'явамі жыцця, і маладога пісьменніка, якому вельмі важна адкрыць яшчэ адну заслону над сакрэтам творчасці.

ІВАН ШАМЯКІН

1924 год даў нам празаіка Рыгора Мурашку і трох паэтаў — Тодара Кляшторнага, Ю. Лявоннага і дарагога нам Янку Відука, які цяпер з высокай годнасцю працуе пад слаўным імем Янкі Скрыгана.

ІВАН МЕЛЕЖ



Ян Скрыган і Пятрусь Броўка. Мінск, 1929.



Маладнякоўцы трыццатых гадоў.
У другім радзе трэці — Ян Скрыган.

...Ёсць у гэтага празаіка адно ўлюбёнае вызначэнне чалавечага стану — «смага». Гэта — і калі ты прагнеш выпіць глыток вады, і калі імкнешся спасцігнуць самога чалавека — хто ён?

Мабыць, іменна вось гэтае, апошняе імкненне і з'яўляецца чалавеказнаўчым пафасам, які вызначае творчасць Яна Скрыгана.

. . . .

Лірычна задуменны і ўважна наглядальны празаік Ян Скрыган запрашае да чытання сваіх твораў дакладнасцю карцін, што паўстаюць з-пад яго пяра, і нечаканасцю становішча, у якім мы як бы знянацку застаем персанажаў ягоных навел, апавяданняў, аповесцей. Ці не таму старонкі ягоных твораў гэтак уражваюць, што ён валодае чарадзействам рэльефнага слоўнага відарысу!

ЗАІР АЗГУР

Як пісьменнік Ян Скрыган народжаны рэвалюцыяй, а больш дакладна — бурнымі дваццатымі гадамі. Гэта быў час нечуванага духоўнага пад'ёму, абуджэння творчай сілы народа, што выйшаў на будаванне новага свету.

Ёсць у яго невялічкая рэч — «Памяць зямлі». Яна — пра драматызм і велічнасць лёсу роднага краю, пра бязмежную любоў і замілаванасць да свае зямлі. Трапяткія, поўныя хвалявання словы знаходзіць пісьменнік, гаворачы пра Беларусь. «І я люблю цябе, мая маці. І схіляю галаву перад усімі папялішчамі. Перад усімі курганамі. Перад магіламі. І тымі, старадаўнімі, і ўчарашнімі, што засталіся як памяць найлюцейшага змагання з самай страшнай пачварай — чорнай свастыкай. Гэтыя ахвяры — святыя. Лепшыя людзі твае прынялі смерць, каб жыць нам далей.

Бацькаўшчына!»


Любоў да савецкай Радзімы, да савецкага чалавека з'яўляецца ўнутранай духоўнай крыніцай творчасці пісьменніка, пра што б ён ні пісаў... Справядлівасць і чалавечнасць у Скрыгана — не штучная дэкларацыя, не выпадковая лірычная ўспышка. Яна спароджана асабістым вопытам. Пісьменнік меў маральнае права напісаць: «І ўсюды на сваім шляху сустракаў і добрых і благіх людзей. Найбольш добрых, і найбольш гэта помніцца, бо на добрым вучышся сам».

За ўсімі жыццёвымі цяжкасцямі, за ўсёю складанасцю чалавечага лёсу Скрыган знаходзіць і сцвярджае чалавечнасць, дабро, пекнату.

СЕРАФІМ АНДРАЮК



Ян Скрыган. Мінск,
1935.



Алесь Пальчэўскі і Ян Скрыган
у Доме творчасці «Дубулты».
Юрмала, 1958.

Будучы вялікім майстрам, Ян Скрыган не дазваляе сабе, як кажуць, ласавацца яркімі метафарамі. Часамі яго стрыманасць у апісаннях выглядае як недагаворанасць, якая падганяе наша ўяўленне, і мы як бы дарысоўваем партрэт ці далейшы лёс персанажаў апавяданняў («Надпіс на кнізе», «Дзядзька Цішка», «Пабітая шашалем кніга», «Каляровы аловак», «Рэквіем»). Своеасаблівы феномен гэтакіх твораў заключаецца ў тым, што для блізкіх да літаратуры людзей яны з'яўляюцца і папраўдзе бадай што дзённікавымі ці мемуарнымі запісамі пісьменніка Я. Скрыгана, паскапіраванымі з аблічча і падзей канкрэтнай пары; для шырокага ж чытача яны астаюцца сапраўды лірычнымі фрагментамі вялікай прозы аўтабіяграфічнага характару. Нарысная дакладнасць у іх арганічна злучана з мастацкаю манераю апавядальнасці.

. . . .

Гаворачы пра мастацтва мовай лагічных сілагізмаў, мы звычайна карыстаемся і празмерна ўзнёслымі вызначэннямі. Мабыць, і мае высновы могуць выглядаць (асабліва на фоне празрыстай і маляўнічай палітры Яна Скрыгана) занадта ўрачыстымі. Але гэта так і ёсць. Той, хто ведаў раней апавяданні «След гумовых шын», «У Кірылы на хутары», «Як спявалі песню», «Дакументальная

рэвізія», «Месячная ноч», «Развітанне», «Наталя», перачытваючы іх у кнізе «Кругі», успрымае іх па-новаму. Зноў жа не ўстрымаюся і скажу празмерна прыгожа, але яны цяпер, размеркаваныя на старонках «Выбранага» ў строга прадуманай паслядоўнасці і ўперамешку з лірычнымі споведзямі і аўтабіяграфічнымі старонкамі, набываюць арыгінальныя адценні і свежае якаснае гучанне: гэта як кавалкі каштоўных каменьчыкаў у мазаічным творы, дзе кожны дыямент ці аметыст не толькі ззяе сам, а яшчэ і служыць падсветкай ці кантрастам суседу.

Мяне даўно дзівіць зусім простая па словах і па рытму мова апавядання «Як спявалі песню» — гэтая невялікая паэма, якая славіць хараство людзей і хараство жыцця, што толькі здаюцца звычайнымі. Быццам вышываная дыяментамі тканіна.

Наўрад ці я перабольшу, сказаўшы, што і напісаныя на такім вось «пісьменніцкім дыханні» мініяцюры, накшталт філігранна адточанага «Над гаем кружылі буслы»,— гэта маленькія шэдэўры прозы.

БАРЫС БУР'ЯН



На абмеркаванні матэрыялаў
у часопісе «Полымя».
Ян Скрыган, Алесь Бачыла, Іван Чыгрынаў,
Іван Пташнікаў, Анатоль Вялюгін,
Анатоль Клышка, Рыгор Шкраба.
1965.



На Данбасе.
Мікола Аўрамчык, Ян Скрыган,
Уладзімір Корбан, Васіль Вітка.
1957.

Яшчэ сваімі даваеннымі кнігамі Ян Скрыган запомніўся мне як цікавы пісьменнік, майстар невялікага апавядання, добры знаўца мовы. Яго пісьменніцкае аблічча ў істотных рысах сфармавалася ў кнігах «Недапісаны профіль» і «Сустрэчы». Відушчасць да нязначных, здавалася б, з'яў жыцця, трапны псіхалагічны аналіз, пошукі хараства ў радавым, звычайным чалавеку — вось тое галоўнае, што вызначае пісьменніцкі почырк Яна Скрыгана... Яго апавяданні асветлены і сагрэты шчырай, высакароднай верай у чалавека.

ЯНКА ШАРАХОЎСКІ

«Кругі» — з тых кніг, якія завуцца галоўнымі. Уласна кажучы, гэта кніга, у якой злучылася многа кніг: Кніга Юнацтва і Кніга Любові, Кніга Цярплівасці і Кніга Прызнанняў, Кніга Набыткаў і Кніга Страт...

З самага пачатку кнігі і да апошніх яе старонак, аб чым ні ішла б гаворка, мы ўвесь час адчуваем прысутнасць аўтара, чуем голас чалавека, які шмат чаго бачыў і шмат перадумаў, нямала зазнаў гаркаты, але ніколі не траціў свае годнасці, свайго чалавечага прызвання, здольнасці да спагады, да адчування чужой бяды і радасці, да высокага роздуму аб жыцці.

Ян Скрыган належыць да таго пакалення, якое разам з векам перажыло столькі, колькі хапіла б на некалькі пакаленняў: рэвалюцыю, тры вайны, дзве акупацыі, попел руін, боль страт... і ўсё ж агалоўным у таго пакалення было невычэрпнае адчуванне маладосці свету, радасць абнаўлення, шчасце будаваць асновы новага грамадства — грамадства вялікай справядлівасці і братэрства.

СТАНІСЛАЎ МЯДОЎНІКАЎ

Творы Яна Скрыгана час ад часу трэба перачытваць. Толькі ў такім выпадку можна адчуць усю глыбіню зместу, усю прыгажосць мастацкай формы яго твораў.

Кругі... У жыцці кожнага чалавека можна іх знайсці. Свае асабістыя кругі Ян Скрыган змацаваў з эпохаю, з часам, таму яны блізкія і дарагія ўсім, каго хвалюе гісторыя Айчыны, яе будучыня.

УЛ. КУЗЬМІЧ



У гродзенскім літаратурным гуртку.
Злева направа:
Аляксей Карпюк, сакратар абкома ЛКСМБ
С. Каткоў, Васіль Быкаў, Ян Скрыган.
1956.

пакінуць не могуць. Ён пазваніў Кучарэнку, гнеўна папікнуўшы, да чаго ім разбэшчаны на заводзе людзі. Кучарэнка з кватэры звязаўся з Канстанцінавым:

— Дарагі Канстанцін Сяргеевіч, там прыйшлі цыстэрны. Трэба іх разгрузіць, памажы, калі ласка.

Тут жа сабралася брыгада і пайшла на разгрузку. Але толькі таму, што «Уладзімір Арсеневіч просіць».

2

Ферганскі клімат аказаўся не па мне. Горача, скрозь млявая спёка, нават арыкі, што цякуць пад ценем густых прысад, не памагаюць. На рабоце я ўвесь абліваўся потам, бегаў у кацельную пад халодны душ, але пакуль даходзіў да свайго стала ў кантору, зноў млеў ад духаты і плёхаўся ў крэсла як нежывы. А тут яшчэ падступіла туга, ад якой не мог знайсці быту: я нудзіўся па нашых палях, лугах, лясах і зеляніне. Выходзіў за горад, а там бясконцыя голыя пяскі, распражаныя сонцам, і наўкруга горы. Я пачаў бачыць сны — як налівае і ходзіць хвалямі жыта, як па лузе растуць кусты, як віюцца ў полі дарогі, і думаў: няўжо ж гэта ўсё я цяпер буду бачыць толькі ў снах?

Як на тое шчасце, у Эстоніі аказаўся знаёмы, і на маё пісьмо, што хацелася б перамяніць геаграфічнае месца, я атрымаў афіцыйнае запрашэнне на работу ад сланца-хімічнага камбіната. «Прапануем месца старшага бухгалтара механічнага завода, выплачваем пад'ёмныя, забяспечваем кватэрай, тэлеграфуйце згоду»,— пісалася ў тэлеграме. Са мною ў дарогу пусцілася жонка з пяцімесячнаю дачкою, а па чыгунках таго часу гэта была не лёгкая адвага. Добра, што сябры зварылі з медзі каністру, палудзілі яе з сярэдзіны і ўсю напоўнілі спіртам. Сям-там гэта памагала.

Мяне прызначылі на зусім другую работу — на сланцавую шахту. Толькі што ўцёк адтуль галоўны бухгалтар Каракіёз, захапіўшы з сабою трынаццаць тысяч рублёў. Не вельмі было мне весела: гэтай вытворчасці я не знаў, уся дакументацыя ішла па эстонскай мове, уліку, як высвілася, бадай што не было — нездарма ўцёк Каракіёз.

Адступацца было нельга. Задача двайная: авалодаць мовай, чытаць самому ўсю дакументацыю, каб людзі не лічылі мяне чужым, і другое — знайсці недзе пачатак, каб цвёрда ад яго ступаць. На цэлага паўгода я засеў у кан-

торы, не вылазячы з яе бадай што круглыя суткі. І калі, здавалася, усё пайшло ўжо на лад, пазванілі, што выклікае галоўны бухгалтар камбіната Пятроў.

У Пятрова сядзелі дырэктар камбіната Фердынанд Меттус і яго намеснік Абрам Пеўзнер. Яны паглядзелі на мяне вельмі падазрона. Што магло здарыцца?

Пятроў прыехаў да нас нядаўна з апарату міністэрства. Мы ведалі, што не па сваёй ахвоце. Проста ён там надакучыў сваімі строгасцямі і старэчым фармалізмам, ад яго хацелі збавіцца і знайшлі пачэсную прычыну: вы, Мікалай Мікалаевіч, чалавек спрактыкованы, з характарам, едзьце і папраўце справы на камбінаце «Ківіылі». Бо камбінат немалы, займае саліднае і вельмі пачэснае месца ў сістэме сланцава-хімічнай прамысловасці, і няхай ён нам не псуе агульнае карціны ў балансе міністэрства. Пятроў прыехаў чыста выбрыты, сівавусы, у вельмі добрым макінтошы, з маладою жонкаю рыжага, агністага колеру і з невялікім чамаданчыкам на ўсю пяціпакаёвую кватэру. Ну што ж, чалавек ва ўсім хоча выглядаць маладым. Дай божа.

І неўзабаве Пятроў так заціснуў цуглі, што дырэкцыя не магла павярнуцца. Нічога нельга было зрабіць: ні аплаціць грузаў, ні купіць што па неадкладных патрэбах, ні афарміць лімітавай чэкавай кніжкі, ні паслаць каго ў камандзіроўку. Ва ўсім ён бачыў шальмоўства і круцельства, усіх падазраваў у злачынствах. На сваім стале ён паставіў машынапіску «Алімпію», корпаўся ў дакументах і пісаў дакладныя і даносы ва ўсе канцы: у міністэрства, у рэвізійна-кантрольнае ўпраўленне, у райфінаддзел, у дзяржаўны банк. На нас панакладалі санкцыі, пазбавілі пазык, арыштавалі бягучы рахунак. Уся дзейнасць камбіната аказалася скованай. Дырэкцыя званіла ў міністэрства, але там пакуль што нічога не маглі зрабіць: Пятроў нічым не парушаў законаў.

У шальмоўстве ён западозрыў і мяне і пазваў абодвух дырэктараў, каб яны самі пераканаліся, якія тут кадры, на гэтым камбінаце.

— Ну, дык расказвайце, малады чалавек, што вы там натварылі,— сказаў ён, пасадзіўшы мяне перад сабою на другі бок стала. «Алімпія» на суконнай падкладцы была ссунута на край, але ўсё роўна як бы не давала мне бачыць усяго Пятрова.— Раскажыце, які цуд вы зрабілі ў сябе там са сланцам. Здорава, здорава! Вы падаяце вялікія надзеі! Ха-ха!

Меттус, чалавек светлабровы, душэўны, праўдзівы, глядзеў на мяне вачыма шчырай шкадобы: як жа так здарылася? — і нейкай падзеі: а можа гэта няпраўда? Пеўзнер, маленькі, настаўбурчаны і калючы,— вачыма з'едлівай асалоды: ага, папаўся, зладзюга!

А выйшла самая простая рэч. Увесь час на шахце высока каштаваў сланец, куды даражэй, як гэта прадугледжвалася планам. Па маёй справаздачы ён стаў, наадварот, куды дзешавей. Я паказаў Пятрову ўсе дакументы, дакладна расшыфраваў калькуляцыі. І Меттус, і Пеўзнер павесялелі.

А ніякага цуду я і не зрабіў, проста — паставіў усё на сваё месца. Не прыняў выдаткаў другіх аддзелаў камбіната, якія звычайна спісваліся на шахту, бо нават аддзел забеспячэння паняў такую моду: бог ведае каму выдасць камплект спяцовак (гумавых ботаў, плашчоў, ватовак і адавізуе [1] на шахту — там знойдуць, куды ўсё гэта дзець. Ачысціў ад чужародных затрат падземны і наземны транспарт, праверыў нормы цэхавых выдаткаў, папярэдзіўшы начальнікаў участкаў, што прыму строгія захады, калі яны будуць перавышаны. Апрыходаваў (а значыць, паменшыў затраты на сланец) вернутую з выпрацаваных штрэкаў руднічную стойку. Не абышлося і без канфліктаў: не прыняў некалькі ліпавых нарадаў. Адзін з іх проста нахабны: тры тысячы рублёў за ачыстку ўсходняга зумфа. Я праверыў — ніякай ачысткі не было. Інжынер Уладзімір Зон стаў маім лютым ворагам.

3

Прайшоў яшчэ нейкі час, і зноў на стале маім зазваніў тэлефон.

— Куўс кюменд куўс? — папытаўся нямоцны, але страгаваты голас.

Гэта быў нумар майго тэлефона — шэсцьдзесят шэсць.

— Йя, куўс кюменд куўс,— адказаў я.

— Вас просяць зайсці да дырэктара камбіната,— прашчабятаў галасок дырэктаравай сакратаркі.

У дырэктара сядзеў Абрам Пеўзнер. Напярэкрыж яны пачалі мяне ўгаворваць, каб згадзіўся стаць галоўным бухгалтарам камбіната. Гэта было неверагодна. І страшна.

Неверагодна, бо я быў упэўнены, што мая біяграфія

[1] Ад слова «авіза» — паведамленне, што адпраўлены груз, тавар або грошы.

не падыходзіць да такой пасады. Страшна, бо гэта ж вялізная гаспадарка, прадукцыя якой мае бог ведае якую складаную наменклатуру. Па-сутнасці, гэта некалькі заводаў, патрэбных адзін аднаму. Не, не магу я згадзіцца.

Выклікалі і назаўтра.

На трэці дзень я ішоў ужо вагаючыся, бо ў душы спакушаў і захапляў размах творчасці. Але ні спрачацца, ні вагацца не было ўжо ніякай патрэбы — мне паказалі загад міністра на прызначэнне.

4

Зноў пайшлі дні, калі я мог прыходзіць дадому толькі ўночы. Не буду гаварыць, што і як мне прыйшлося рабіць, каб дамагчыся зрухаў. Мабыць, відно ўжо, што і тут былі каля мяне добрыя людзі,— я маю на ўвазе Меттуса. Неяк увечары, калі на ўсім камбінаце свяцілася толькі маё акно, ён зайшоў да мяне, сеў на канапу і папытаўся:

— Цяжка?

Што цяжка, то ён бачыў сам. Падумаў трохі, дадаў:

— Можа што трэба, каб я чым памог? Нашы начальнікі аддзелаў дысцыпліны не вельмі любяць. Вы скажыце, дык мы іх абавяжам загадам.

І памагаў. Усім, чым мог: і ўвагаю, і чулым словам, і загадам.

Зусім іначай разбіраўся ў душы другі чалавек, парторг Назараў. У аповесці «Скажы адно слова» я расказаў пра выпадак з двума рабочымі, што сабраліся ехаць у адпачынак. Я там не ўсё дагаварыў да канца.

Вельмі доўга цягнуўся такі час, што я мог даваць людзям толькі сякія-такія авансы, і то ў выпадку вялікай патрэбы. І вось усё гэта мінулася, у касе ляжалі мільёны грошай, апарат спешна рыхтаваў ведамасці, каб разлічыцца з даўгамі і выдаць чарговую зарплату — усім, адразу. У гэты час і зайшлі два рабочыя — з гнеўным патрабаваннем, каб ім выдалі ўсе грошы, бо яны едуць адпачываць аж на Украіну. Нават паказалі даведку аддзела кадраў, што едуць іменна туды. Я паслаў іх у касу.

Неспадзявана атрымаўшы больш як па восем тысяч на кожнага, неўзабаве яны зноў зайшлі да мяне, прызналіся, што ашукалі, што ні на якую Украіну не едуць, і з гэтае нагоды прасілі пайсці з імі і выпіць хоць па куфлі піва. Я ніколі не рабіў гэтага, мне было смешна і дзіка нават падумаць, каб так зрабіць, і адмовіўся. Але да канца ра-

бочага дня я бачыў, як адчыняліся дзверы ў кабінет то з памяшкання бухгалтэрыі, то з калідора і гэтыя два чалавекі ўсё цікавалі, каб застаць мяне аднаго.

— Таварыш галоўбух, няўжо вы намі грэбуеце? Пасядзіце з намі паўгадзінкі, толькі па адным куфлі піва! Просім вам ад шчырага сэрца. Калі няма часу, то мы будзем чакаць вас аж да вечара. Вось тут, у калідоры, і будзем чакаць, а вы сабе працуйце. Просім вас на аднае паўгадзінкі.

І тут я падумаў: а чаму, папраўдзе, я не магу пасядзець з імі? Чым гэта блага? Іх радасць — гэта ж і мая радасць, можа нават большая, бо нарэшце я ўбачыў плён свае працы. Але Назараў атруціў гэтую хвіліну радасці.

Назаўтра, як толькі я прыйшоў на работу, зазваніў тэлефон.

— Галоўбух? Безабразія! — крычаў Назараў.— Як вы маглі дапусціцца, каб вас бачылі разам з рабочымі ў рэстаранах? Дарваліся да чужых грошай? Сваіх не хапае? Хто вам дазволіў? Сорам! Які ж вы галоўбух пасля гэтага!

Я слухаў і не верыў сваім вушам. Што я мог сказаць? Дый ці варта было гаварыць? Нават калі б я зрабіў якую правінку, дык хіба нельга па-чалавечы разабрацца ў ёй, і не па тэлефоне? Не, ніякія парыванні душы гэтаму чалавеку невядомы. Я чуў, як у мяне спірае дыханне, і, каб не нагаварыць грубасцей, кінуў трубку.

Тут жа зноў зазваніў тэлефон.

— Што, не хочаце са мною гаварыць?

— Не хачу,— сказаў я.— Калі такім тонам — не хачу. І не буду,— і зноў палажыў трубку.

Хвілін праз дваццаць зайшоў Меттус. Пасядзеў, пагаварыў, параіўся, ці варта пасылаць чалавека ў Ленінград на прыёмку новага абсталявання. І ўжо адыходзячы, як бы няўзнак, стоячы ў дзвярах, спагадліва сказаў:

— З вамі гаварыў Назараў. Не зважайце, з ім гэта бывае.

Прайшло з год часу. Усё ішло як мае быць, я меў права як бы нават ганарыцца ўсім, што зроблена. Неяк пасля абеду вярнуўся з тэрыторыі камбіната — такія праходкі сталі маёй патрэбай — і толькі паспеў распрануцца, як дырэктарава сакратарка папрасіла зайсці да Пеўзнера. Звычайная рэч, а от не магу зразумець, чаму на гэты раз нешта трывожнае кальнула ў сэрца. У Пеўзнера сядзелі два чалавекі. Адзін з іх папытаўся, ці з сабою ў мяне пашпарт...

КОННЫ ДВОР

Нам з Аляксеем Піваваравым выпала на долю стаць конюхамі. Не надта ўзрадавала нас гэтая навіна. Мы думалі, што спатрэбімся калгасу толькі на гарачую пару, на восень. І мы ўдосталь папрацавалі: па сенакосах, калі пачыналі работу нацямку і лажыліся з зорамі тут жа ў копах, у душныя, шалёныя іх пахошчы; на полі, калі дзень, пранёсшыся як адно імгненне, аставаўся ў памяці маўклівай сінечай зжатых прастораў, шорсткім, сухім бляскам іржэўніку з уціснутымі на ім слядамі грузавікоў, гулам малатарні, у пражэрлівую зяпу якой заімшэлы машыніст піхаў цяжкія снапы пшаніцы, ледзьве паспяваючы ўспорваць тугія перавяслы блішчастым узмахам нажа. Увесь дзень тугім, плаўкім золатам лілося з лёхаў зерне; увесь дзень віхаліся жанкі, гладкімі, выслізганымі віламі перамахваючы над сабою ахапкі саломы, а басаногі, шустры хлапчына верхам на гнедым кані адцягваў яе валакушаю ўбок, да сцірты, якую вяршылі трое мужчын. Малатарня нікому не давала перадыхнуць, мы спыняліся толькі на перакуску, і тады кожны даставаў свой хатулёк і шукаў месца, каб дзе зручней прысесці.

Аднаго разу ў такі перапынак пазвала Аляксея Паліна, жанчына яшчэ яркай, але стомленай, нейкай задуменнай красы, салдатка, муж якой не вярнуўся з вайны.

— Сядайце да мяне,— сказала яна, разгарнуўшы на саломе свой хатулёк.— У мяне тут хопіць прыпасаў, усё свежанькае, сваё, не тое што ў вас: скарынка хлеба з гурком.

Аляксей быў дабёр што з постаці, што з твару, увесь шырокі, круглы, з вузенькімі шчылінкамі воч і надзіва ціхім, нясмелым голасам. Здавалася, ён саромеўся ўсяго на свеце, гэта рабіла яго бездапаможным, падобным на вялікае дзіця.

— Што вы,— сказаў ён,— дзякую. Вы, мабыць, вельмі добрая.

— Як для каго,— блiснула Паліна вачыма. І, калі ён сеў, прымяўшы настаўбурчаныя камялькі саломы, дадала спагадліва:— Вы, мабыць, не прывыклі да нашай работы. Я глядзела на вас, і ў мяне сэрца заходзілася. Давайце, калі хочаце, памяняемся: я буду падаваць на палок, а вы станеце на салому, да нашых жанок, бо ў гурце можна і не спяшацца.

— Не ляжыць у мяне душа да ўсяго гэтага, Паліна,

які з мяне тут работнік,— уздыхнуў Аляксей.— У мяне гіне свая спецыяльнасць, я ж кравец. Уся Вятка стаяла да мяне ў чарзе, шыў і ваенным і цывільным. І на Яі ўсё начальства хадзіла ў маіх кіцялях.

— Ой,— пляснула рукамі Паліна,— дык вы можа і жанкам шылі?

— Шыў, чаму ж не.

Гарачы, заружавелы стаў твар у Паліны.

— А ў мяне так многа шытва,— сказала яна раздумна.— Заходзьце да мяне, а? Маглі б нават і на кватэры ў мяне стаць.

У лёгкіх драбінках на ўзмакрэлым папялястым жарэбчыку ў гэты час падкаціў брыгадзір Сяргей Чаркашын. У мультановым пінжаку наросхрыст, з адкрытай разлахмачанай галавой, нізкі, камлюкаваты, ён падыходзіў да нас самавіта, паважна, але мы ведалі, што гэта не ад фанабэрыі. З вайны ён прынёс прастрэленыя грудзі і яшчэ незагоеную рану на назе. Ён абышоў пляц нашае работы, суняўся каля малатарні, набраў плывучага зерня ў рукі, пакаштаваў на зуб.

— Аддыхаем! — сказаў ён замест прывітання, але ў голасе пачулася больш не папроку, а пахвалы.

— Аддыхні і ты з намі, брыгадзір! — крыкнуў нехта з-за валка саломы.— А можа ты і пляшачку з сабою прывёз?

— Ідзі, Сяргей, перакусі,— без жартаў сказала Паліна.— Тут хопіць і табе.

Брыгадзір матаўся па полі зрання, абедаць не было калі, і ён ахвотна прыняў запрашэнне. Нізкае, стомленае сонца свяціла млява, недалёкі чубок бярэзніку гарэў ціхім золатам восені, павуцінне паблісквала на ржэўніку. Надрэсіраваны жарэбчык, без прывязі, з закінутымі на спіну лейцамі, стаяў як укапаны, чакаючы гаспадара.

— Прывучаеш патроху? — папытаўся ў Паліны Чаркашын, кіўнуўшы на Аляксея.— Правільна робіш. От бяры сабе ў прымы, няхай асталёўваецца. Мужчына ён рахманы, спакойны, а без сям'і нядоўга і зачахнуць.

Даўно хацелася Аляксею пагаварыць і з брыгадзірам пра сваю трывогу. Нашто ён тут мадзее, які з яго толк? Няхай яго адпусцяць, ён пойдзе шукаць сабе работы, ад якое была б карысць і яму і людзям.

— Пачакай,— сказаў Чаркашын.— От уходзімся ў полі, з агародамі, а тады і пагаворым. А пакуль што памагай калгасу. Сам ведаеш, людзей у нас мала.

Выбіралі мы і бульбу, увіхаліся і на агародах. Пачыналіся халады, сцюжа, цяжкія, разлезлыя хмары плылі над галавою, крапілі дажджамі. З слізкага, цягучага бульбоўніку мы раскладалі вогнішча, садзіліся ў густы яго дым, каб пагрэць гразёю пазлепваныя рукі. Ужо ў замаразкі выдзіралі з зямлі буракі і бручку, складалі іх у бурты, абгортвалі саломаю і насыпалі капцы. І калі зусім закруцілі завеі, усе палявыя дарогі пазамятала, нас з Аляксеем разлучылі. Хто рабіў на кароўніку, хто ездзіў у лес па дровы, хто ў свірне перавейваў зерне.

Недзе ў сярэдзіне зімы Сяргей Чаркашын пазваў нас з Аляксеем да сябе. Ён самашто паснедаў, сядзеў за сталом у сподняй кашулі. Я толькі цяпер угледзеў, што ў яго зусім белыя бровы. Ён зірнуў на нас з-пад гэтых белых броваў такімі ж белымі вачыма.

— Вось што, хлопцы,— сказаў ён,— у мяне пустуюць добрыя палаці: вунь, бачыце, пры печы, над дзвярыма. Нас толькі двое, старая маці ды я. Увесь яе клопат — згатаваць паесці, то што ёй значыць заадно згатаваць і вам. Перабірайцеся да мяне. За пастой я не вазьму нічога, хіба толькі прынесяце ў хату вады ці з лесу прывезяце возік дроў. На двары ў мяне свая лазня, штосуботы можаце мыцца колькі хочаце. Бо гэта ж я мяркую і на работу вас паставіць разам: на конны двор.

— Таварыш брыгадзір! — аж пабялеў Аляксей.— Вы ж дакляравалі мяне адпусціць.

Чаркашын вылез з-за стала. Аказалася, што ён сядзеў босы. На пальчыках, каб не ўсёю нагою ступаць па халодных маснічынах, ён пратэпаў да табурэткі, пачаў абуваць валёнкі.

— Не магу,— сказаў ён.— Гавін не пускае. А свае майстэрні, як ты ведаеш, у нас няма.

Гавін — гэта старшыня. Я сам разоў колькі хадзіў да яго прасіцца на работу ў кантору, назваўшыся бухгалтарам,— нічога не памагло. Казалі, што ён добры, а я не верыў гэтаму. «А свайго я куды дзену? — сказаў ён.— Вунь жа сядзіць, з работаю спраўляецца, а двух мне не трэба». Ён нават не глядзеў мне ў твар, калі гаварыў, то я так і не ведаю: ад дабраты гэта ці ад таго, што дабрату трэба скрываць.

— Я хацеў вам зрабіць як лепш,— гаварыў далей Чаркашын.— Работы, ведама, знойдзецца ўсякай, але ж гэта будзе і на ветры, і на марозе, дык на яе трэба мець і моцны пуп і добрую адзежыну. А я думаў, што на конным

двары вы будзеце, можна сказаць, у зацішку ды ў цяпле. Дагледзеў, падчысціў, управіўся — можаш і дадому падскочыць, па-чалавечы і абагрэцца, і перакусіць. Самі і чаргуйцеся як хочаце: хто ўночы, хто ўдзень. Я мыслю, што і жыць вам разам будзе зручней, калі вы станеце на адной рабоце.

На конны двор вёў глухі, чорным, скасабочаным плецением выгараджаны завулак. Выйшаўшы з яго, на самым пуку гладкага ўзгорка можна было ўбачыць шырокі загарад з нізкаю абораю пасярод яго. І загарад, і абора пабудаваны былі нядаўна. Тут была свая спрадвечная завядзёнка: як толькі наставала зіма, коней выпускалі з двара, яны ішлі на лугі, на ўзрэчышчы, дзе з восені аставалася нечапаная, па пояс трава, і, капытамі разрываючы снег, самі сябе кармілі да вясны. Не вельмі многа мяняў і конны двор. Добрая палавіна жыўнасці стаяла пад адкрытым небам, горбячыся на ветры, інеем абрастаючы на марозе, і я не раз гаварыў брыгадзіру Сяргею Чаркашыну, што гэта дзіка і бессардэчна.

— Ты сам інтэлігент і хочаш, каб і коні нашы парабіліся інтэлігентамі,— гаварыў Сяргей Чаркашын.— Не плач, ад гэтага яны будуць толькі здаравей. Сама прырода патрабуе гэтага.

У стайні мясціліся жарэбныя кабыліцы, маткі з сысункамі, гадунцы ды экземпляры нетутэйшай крыві, завезеныя сюды для расплоду. Ну і тыя, што кожны дзень былі ў рабоце і якім трэба было даць лепшага покарму.

Чаргу мы з Аляксеем папраўдзе ўстанавілі самі: тыдзень на дзяняшняй змене, тыдзень на начной. І спалі на цёплых палацях. І штосуботы мыліся ў лазні, парачыся душнымі венікамі. У калгаснай кладоўцы бралі харчы, за якія разлічваліся працаднямі; брыгадзірава сухенькая маці гатавала нам есці. Усё ішлося так, як гаварыў Сяргей Чаркашын.

Мой дзень пачынаўся з таго, што яшчэ пацямку, падперазаўшыся па бушлаце, па самыя вочы надзеўшы шапку і цясней завязаўшы пад барадою матузкі, узяўшы з пячуркі цёплыя рукавіцы, я ішоў на конны двор. Першнаперш я аббіваў ад наледзі бочку, што стаяла на санях пасярод двара, запрагаў у гэтыя сані старога, вечна лінючага каня і ехаў на рэчку. За маім следам вецер вырываў снег, гнаў яго са свістам бог ведае куды. На рэчцы я ставіў сані пры самай палонцы, прабіваў начны лёд і чарпаком, прыбітым да доўгага дзяржальна,наліваў у бочку ваду.

Вада на ветры расплёсквалася, пырскі яе застывалі ў мяне на валёнках, на ватовых штанах, на крыссі бушлата; увесь перад на мне рабіўся цвёрды і слізкі. На двары я пераліваў гэтую ваду ў другую, куды большую, бочку, нізкую і шырокую, як чан. Ад таго, што наледзь на ёй прыходзілася адколваць абухом, верхні абруч лопнуў, адну клёпку выперла, вада цурчэла, пакуль шчыліну не зацягвала новым лёдам. Коні лена падыходзілі, скрозь зубы смакталі гэты пякучы вадкі холад, падымалі морды, як бы раздумваючы — хопіць ці можна пасмактаць яшчэ, і на валасінках іхніх губ застывалі ледзяныя кроплі. Я ездзіў на рэчку да таго часу, пакуль не здавольваліся ўсе: і гэтыя, з двара, і тыя, што ў стайні, якіх я выпускаў то па адным, то невялікім гуртам, баючыся за матак.

Потым я пачынаў чысціць. Больш за ўсё даваў мне клопату двор. Бадзяючыся па загарадзе, коні за ноч раскідалі гной дзе папала, ён умярзаў у натупаны снег як камень, я паламаў не адну совалку, выбіваючы яго. Яшчэ добра, калі стаяў мароз, тады было ціха, я спакваля варушыўся, гонячы перад сабою валок у кучу на канец двара. Горш, калі круціла завіруха. Тады здавалася, што ўвесь наш двор гарыць белым пажарам і полымя шалее, то б'ючыся ў сцены, то гойсаючы цераз паркан, то віхрам узлятаючы на вільчак страхі. Ветрам пранізвала наскрозь, нават не значно было, што ты ў нешта адзеты.

У стайні было іначай. Тут пахла цяплом, густым конскім духам. Я ішоў з праварыны ў праварыну, падбіраў з-пад ног расцярушанае сена, клаў яго ў яслі, а гной і цырбунне выграбаў на сярэдзіну. Коні мяне знаді, абнюхвалі рукавы, як бы дазнаючыся, ці не прынёс ім якога гасцінца. І я прыносіў тым, каго асабліва любіў. Жыватастай Мушцы з весела настаўленымі вушамі, бо яна вось-вось павінна была ажарабіцца; папялястаму жарэбчыку, на якім усю восень ездзіў брыгадзір і якога загнаў дашчэнту. Брыгадзір не любіў ціхай язды. Па доўгіх палявых дарогах за дзень ён выязджаў бог ведае колькі прастору, і на кожны ўзгорак конь павінен быў выносіць брыгадзіра як птушка. Ён быў запалоханы да страхаты, калі я падыходзіў да яго, дрыжаў усім целам. Мне асабліва хацелася быць да яго ласкавым, каб ён не думаў, што людзі могуць быць толькі злыя.

Яшчэ я любіў зайсці да Маёна. Цёмна-гнядой масці, статны, пародзісты, ён не рабіў, аднак, уражання цяжкай сілы, як гэта бывае з ардэнамі ці біцюгамі, наадварот, яго

вылучала нейкая самавітая, спакойная ладнасць. Ён рахмана абнюхваў мяне, нагінаючы сваю галаву з сухой, тонкай скурай, на якой відны былі ўсе выпукліны, усе жылкі. Шорсткай цёплай губой ён кранаўся мае рукі, правяраючы, ці няма там якога ласунку. «Не важна, што ты нічога не прынёс, важна, што не забыўся праведаць»,— як бы гаварыў ён, гледзячы сваім добрым слівавым вокам.

Нашы з Маёнам дачыненні мелі сваю, толькі нам вядомую інтымнасць. Да таго як папасці на конны двор, мне собіла-такі пабываць на тых розных работах, пра якія гаварыў Сяргей Чаркашын. На вывазцы сена. Нялёгка было ў полі, на дзікім ветры, аднаму навяршыць воз, утаптаць яго, уціснуць, абхарашыць, а яшчэ не лягчэй давезці да канбазы. Прывучаны недзе да добрых дарог, Маён не ўмеў намацваць занесенага следу, збіваўся на цалік і, будучы грузным, правальваўся ў снег па самыя грудзі. Воз з сенам зарываўся, не раз клаўся набок так, што прыходзілася яго распускаць і перакладваць нанава. Калі ж бядзе можна было яшчэ памагчы, я падыходзіў да Маёна. Ён не тузаўся ў аглоблях, не біў у хамут, як некаторыя порсткія стрыкулісты, а вінавата чакаў, гледзячы сваімі добрымі вачыма і як бы гаворачы: «Ты ж бачыш, я хацеў як лепш, а выйшла чортведама што». Я абтоптваў перад Маёнам снег, пазначаў след да дарогі, тады ішоў назад, падстаўляў пад воз плячо і казаў: «Но, Маён!» Сіла ў Маёна была немалая, трашчалі аглоблі і заваратні, рыпелі гужы і падсядзёлачныя рамяні, але ён не аслабляў пляча, вывозіў на біты троп і тады суніматўся і чакаў. «Што будзем рабіць далей?» — як бы пытаўся ён. Распазнаўшы такі Маёнаў грэх, я ведаў, што рабіць далей. Я сам, правальваючыся, ішоў наперадзе, намацваў валёнкамі пад снегам цвёрды тор, а Маён стараўся пільнавацца майго следу. Гэта ў мяне брала нямала поту, бо вецер, такі ж белы і панылы, як гэтае поле, і аднекуль гнаныя ім па шарпаку танюткія, палахлівыя блікі парошы самога мяне высільвалі і збівалі з арыенціру.

Затое я быў спакойны, калі выязджаў на тракт. Тут Маёнам лепш было не кіраваць. Ён знаў правілы дарожнага руху, як самы размудраны інспектар. Сярод раз'езджанай машынамі каламесы ён сам выбіраў сабе найлепшы след, дбаючы, каб спакойна прайшоў за ім і воз. Зглядзеўшы наперадзе машыну, адразу забіраў управа, даючы размінуцца. Нічога не бачачы за возам, ён, аднак, ведаў, што могуць быць машыны і ззаду, і па першым жа гудку

адтуль саступаў ім дарогу, няхай сабе дзеля гэтага яму трэба было залезці ў сумёт. Гэта дзівіла не толькі мяне, а ўсіх шафёраў па трасе ад Краснаярска да Енісейска. Тут, на тракце, я спакойна залазіў наверх, зарываўся ў сена і мог, заплюшчыўшы вочы, памарыць. Мары мае былі далёка і ад Маёна і ад гэтай дарогі, яны лёгка заносілі мяне на той канец зямлі, што называўся бацькаўшчынаю.

Люба мне было сустрэцца і з Ластаўкаю. Разам з ёю стаяў яе гадаванец, ужо ладны жарэбчык палавой масці Бутон. З гэтай Ластаўкі я дзівіўся больш як з каго. Бутону даўно пара было даць сваю праварыну, гэта не раз і рабілі. Але Ластаўкі было тады не пазнаць. Беспярэстанку рэгчучы, шаленцам наліўшы вочы, яна кідалася па стойле, разбівала персі, ламала праслы і вырывалася да Бутона. Прыйшлося раскідаць іхнія загарадкі і даць поўную волю: цэлы канец стайні.

Быў і яшчэ адзін экземпляр, якога я не мог абысці ўвагаю. Не таму, што любіў, а таму, што ён быў мне нямілы. Гэта быў проста бандзюга, яго так і звалі — Раскол. Яму не было ні пярэгарадак, ні праслаў, ён дняваў і начаваў у чужых праварынах, падчышчаючы чужыя жалабы і яслі. Куртаты, віслазады, нейкай няпэўнай бруднай масці, ён не даваўся нават падысці да яго. Агідна нахмылены, з налітымі злосцю вачыма, ён кідаўся на цябе з капытамі або пачынаў сігаць па праварынах, падымаючы пярэпалах і грукат на ўсю стайню. Як я ненавідзеў гэтага злодзея!

Нарэшце ўсе праварыны былі падчышчаны, гной выграбены за вароты, я здымаў шапку і выціраў пот. Можна было перакурыць. Але ўжо і не было надта часу: надыходзілі людзі, трэба было збіраць іх на работу.

На маім дзяняшнім клопаце было знаць, куды занараджаны які конь, якая на яго збруя — хамут, падсядзёлак, набадры, лейцы, якія каму даць сані; прыняць прывезенае на канбазу сена і скідаць яго ў малой загарадцы за канцом стайні; ведаць, каго напаіць і накарміць удзень, каго ўночы; глядзець, каб не прычынілася дзе якога няшчасця ці траўмы.

Часам забягаў на маё дзяжурства Аляксей, ці то памагчы што, ці проста пасядзець. На слова ён быў скупы. Адно, пра што ён мог гаварыць без канца, дык гэта пра сваю прафесію. Ён глядзеў на мой бушлат.

— Ён на табе як пудзіла,— гаварыў ён і ставіў мяне перад сабою.— Не важна, з чаго пашыта адзежына, важ-

на, як яна пашыта, на ўсё трэба вока мастака. От стой, я б табе даў вось такія лініі...— і пачынаў паварочваць мяне.

У сваёй справе ён быў паэт. Мяне дзівіла, што ён ніколі не гаварыў пра сябе, пра сваю сям'ю, хто ён і адкуль, мелькам неяк абкінуўся словам, што ў яго ёсць два хлапчукі-сыны. А пра моды, лініі крою і сілуэты я знаў бог ведае колькі. Неяк я папытаўся:

— Скажы, а Паліне ты пашыў?

— Пашыў.

— Часта ты не начуеш дома.

— Яна просіць, каб перайшоў да яе. Але я не магу. Тады я ўжо не вырвуся адсюль, я ведаю.

Мне шкода рабілася ўжо не Аляксея, а Паліны. І ёй жа трэба жыць нейкімі спадзяваннямі.

Аднаго разу прыйшоў Аляксей на конны двор чыста выбрыты, прычасаны, адзеты ў сваю адмыслова пашытую масквічку з хлясцікам ззаду, з косымі кішэнямі на грудзях. Сказаў, што можа сёння ўвечары прыйсці на дзяжурства забавіцца, і прасіў пачакаць яго. І прыйшоў папраўдзе позна. Я сядзеў з ліхтаром у збруйні, што была выгараджана пры варотах у стайні. Тут пахла сырамяццю, на сценах віселі хамуты, аброці, новыя і пасшываныя. Аляксей, увесь светлы, ажыўлены, сеў на зэдлік, на якім мы звычайна крышылі тытунь.

— Быў у Шылé,— сказаў ён шчасліва,— здаецца, нарэшце знайшоў работу. Там жа прамкамбінат і кравецкі цэх вялікі. Ну, майстар сказаў, каб праз тыдзень прыходзіў. Цяпер трэба толькі ўпрасіць Гавіна. Ой, братка, як убачыў я ўсё гэта — і распараны прас на сукне, і машыны, што стаяць у радок, і закройшчыка з метрам на шыі, дык думаў, што ў мяне самлеюць ногі. Сёння позна ўжо, дый няма як на рабоце, а заўтра мы з табою вып'ем, я нават пляшку з сабою прынёс.

Але выпіць не давялося.

Назаўтра раненька, яшчэ дома ўсе спалі, спаў і я, як прыбег Аляксей. Будзіць мяне, падняўшыся к палацям, трывожным шэптам:

— Хадзем, братка, памажы, няшчасце ў мяне. Усё прапала, не патрэбны будуць ніякія мае клопаты. Давай скарэй, толькі ціхенька...

У стайні, у далёкім канцы яе, павешаны на слупку, гарэў ліхтар, кідаючы вакол сябе слабы бляск. Ластаўка стаяла сцішаная, за ёю ў яслях відно было недаедзенае

сена, а ніжэй, у жолабе, заваліўшыся туды спіпаю, ляжаў Бутон. Я зразумеў, чаго хацеў Аляксей: хутчэй выбавіць Бутона з жолаба. І мы заспяшаліся: не дай божа, каб хто цяпер зайшоў. А гэты ліхтар зырчыць, як бы знарок паказваючы, што тут нешта нядобрае робіцца. Аляксей хацеў патушыць яго, зняў з слупка, але перадумаў: яшчэ горш страшна. Мы рабілі злачынства, дзялілі яго папалам. Бутон ужо быў халодны, здранцвелы. Рукі ніяк не маглі падчапіць яго, ніхто не падумаў бы, што ён такі цяжкі. Нарэшце спусцілі ўніз, адцягнулі далей ад жолаба, стараючыся, каб ні на доле, ні на ім не асталося знаку. Дол прыхарашылі і сталі як скамянеўшы, кожны ўсярэдзіне пачуўшы жах.

— Хто б думаў. Здаецца, усю ноч быў тут, не чуў ніякага груку, і от, калі ласка. Хоць размудрыся, не магу даўмецца, як гэта здарылася. Няйначай як Раскол ноччу шворыў па ўсіх праварынах, а Бутон стаяў пры жолабе, і той штурхнуў яго. А я агледзеў, калі ён ужо астыў. Ніштo сабе конюх! Думалася, што можа настане якая прасветліна, а тут, бачыш, зноў турма. Можа не трэба было, каб ты мне і памагаў, усё-такі я быў бы вінаваты адзін.

— Перастань,— сказаў я Аляксею.— Ідзі далажы старшыні ці брыгадзіру.

Аляксей вярнуўся з Чаркашыным і заатэхнікам. Заатэхнік аказаўся тут выпадкова, ехаў з раёна, заначаваў. Высокі, у доўгім паліце з настаўленым каўняром, ён адразу пайшоў на канец стайні. Бутон ляжаў з адкінутаю галавою, пярэдняя нага яго, адубянеўшы яшчэ ў жолабе, не дакраналася зямлі, тарчала праўцом, мы нават не здагадаліся яе прыгнуць.

— Як жа так здарылася? — папытаўся Чаркашын.

Аляксей сказаў, што нічога не ведае. Пайшоў правярацъ і агледзеў, што Бутон ляжыць нежывы.

— Захацеў, дык узяў дый здох. Скончыў самагубствам. Здорава прыдумана! — з'едліва сказаў заатэхнік.

Ён нагнуўся над Бутонам, абмацаў усяго рукамі, агледзеў вочы, ноздры, расчапіў рот і выцягнуў язык. Нічога нідзе не пазнаць.

— Ну што? — нецярпліва папытаўся Чаркашын.

— Давай адцягнем к варотам,— сказаў заатэхнік.

Каля варот, ля збруйні, дзе святла стала больш, заатэхнік дастаў з-за валёнка нож і прысеў над Бутонам. Чаркашын вынес са збруйні зэдлік, сеў на яго, закурыў.

Усё агледзеў заатэхнік — сэрца, лёгкія, печань, вывaрочваў і назад упіхаў вантробы, нечага шукаючы, нечага дазнаючыся. Нарэшце пачаў аддзяляць шкуру.

Паявіўся і стаў у дзвярах Гавін. Ён ні з кім не павітаўся, толькі кінуў цяжкім вокам на нас з Аляксеем.

— Ну што тут? — папытаўся ён у заатэхніка.

— Ды от шукаю прычыны.

— Ён нічым не хварэў? — папытаўся ў Чаркашына.

— Не відно было.

Колькі часу ўсе памаўчалі. Глядзелі, як пад нажом у заатэхніка напінаецца плеўка і ўсё далей і далей пад шкураю агаляецца бок. Я ведаў, што зараз, бліжэй к спіне, пакажацца пляма: Бутон жа біўся ў жолабе доўга. Нарэшце от яна і паказалася, на пярэдняй лапатцы, сінявaтая, налітая кропелькамі мёртвай крыві. Мне здавалася, што ў сэрца маё нехта ўнізвае распалены агнём прут і вось яшчэ хвіліна, яшчэ хвіліна і яно замрэ.

— Ды што тут шукаць, усё ясна,— сказаў Гавін.— Словам, я пайшоў, пішыце акт, каб усё было па форме. Хадзем і ты, Чаркашын, няма чаго табе бавіць час.

Вядома, чаго ж ім тут быць, думаў я пра Гавіна і Чаркашына, яно ж і папраўдзе ўсё, мабыць, вельмі ясна. Аж да таго, што ў нас ніхто ні пра што не папытаўся, як бы гэта зусім лішняя непатрэбшчына.

Заатэхнік устаў, выцер рукі шматком сена, што падсцелена было пад калені, выцер і засунуў за валёнак нож.

— Дык расказвайце, хлопцы, як было. Хто з вас вінаваты? — папытаўся ён, усё яшчэ сціраючы парушынкі сена з рук, насуха абгладжваючы іх.

Аляксей пацiснуў плячыма, цяжка ўздыхнуў.

Заатэхнік яшчэ раз схадзіў на канец стайні, зноў агледзеў стойла, праслы, абмацаў край жолаба. Мабыць, шукаў, ці не застраміўся дзе там шматок шэрсці. Вярнуўся, сеў на зэдлік і, апусціўшы галаву, задумаўся. Надоўга. Я ведаў, чаго ён думае: каго яму ратаваць — сябе ці нас. Сябе яму ратаваць было лёгка: проста ўсё запісаць, як бачыў. Але ж тады — што будзе з намі?

Вельмі доўга аддалялася яго фігура, перш па двары, а тады па дарозе ў завулак, высокая, угнутая на ветры.

Аляксей павінен быў даўно пайсці дадому, адпачываць пасля дзяжурства — не пайшоў. Мы былі ўсё яшчэ як аглушаныя.

— От яшчэ і Паліне нарабіў гора,— сказаў Аляксей, і я здзівіўся: я грашыў на яго за эгаізм і чэрствасць,

а ён у цяжкую хвіліну падумаў перш за ўсё не пра сябе.

Увесь дзень мы былі з Аляксеем разам, раптам адчуўшы, што нечым вельмі звязаны, можа прадчуваннем немінучай ростані. І было шкода і гэтага сяла, і канбазы, і марознага сіняга неба, і ветру. Не хацелася ніякіх прасветлін, абы аставалася тое, што маем. Мы нават не ўзрадаваліся, калі ў завулку, глыбока западаючы ў снег, паказалася Паліна. Мабыць, не першы раз яна надбягала сюды, калі дзяжурыў Аляксей, я толькі цяпер падумаў пра гэта. Ну што ж, мы часта чаго не заўважаем, пакуль не страцім яго.

— Я была ў канторы,— сказала Паліна, адкінуўшы рог хусткі, заружавелая і задыханая,— чула, як яны там складалі акт, і Чаркашын, і Гавін, і заатэхнік гэты. Доўга яны не ведалі, што рабіць, усё гаманілі ды спрачаліся. Але заатэхнік кажа: Бутона ж, кажа, усё роўна мы не падымем, а людзям яшчэ раз пакалечым жыццё, яно ў іх і так пакалечанае. Ну, словам, запісалі там нешта другое, я ўжо не ведаю што...

Па вуліцы праехаў высокі воз сена, я ведаў, што яго вязуць на канбазу, і здагадаўся, што дзень павярнуў на вечар.

З лагчыны ад рэчкі ўсё дужэй і дужэй дзьмуў вецер. Як жа ён добра асвяжаў твар.

МОЙ ДЭПУТАТ

Пасля таго як Аляксея Півавара адпусцілі ў Шылу́, я перабраўся на другую кватэру. Да Чаркашына прыехаў з горада яго брат з маладою жонкаю і дзіцем, стала шумна і цесна. На пастой мяне пусціла Ганна Бараўлёва, гадоў пад сорак жанчына добрай сібірскай уроды, з грубаватым голасам і дзёрзкімі чорнымі вачыма. Муж яе, спіўшыся і разбасячыўшыся дашчэнту, каторы год быў у безнадзейных прочках, яна была ні ўдава, ні замужніца. З таго часу як на сяле паявіліся паездкыя людзі, якія маглі тут астацца і за гаспадароў, удовы ахвотна іх бралі сабе ў дом. У Бараўлёвай было два сыны, адзін дапрызыўнік, рослы і надзіва сімпатычны хлопец Мікола, другі, Толік, пяты год хадзіў у школу, але так і не вылазіў з трэцяга класа. Хлопцы спалі на палацях, якія тут звычайна

рабіліся пад самаю столлю пры печы, па іх можна было залезці, як у шчыліну, толькі паўзком. У адгароджанай вузенькай каморцы, у яе цёмнай глыбіні, стаяў ложак Бараўлёвай, а пры дзвярах, завешаных фіранкаю,— мой тапчан.

Я снедаў варанаю бульбаю з чаем і ішоў на работу. Днём або ўвечары выбіраў хвілінку, каб забегчы на пошту, што мясцілася на тым канцы сяла за калгаснаю кантораю. Кожны раз я ішоў туды з трывогаю: будзе ці не будзе ліст. Звычайна мяне сустракала сама загадчыца пошты, непрыгожая тварам, але вельмі мілая жанчына з рэдкім цяпер імем Матруна. Яна была негаваркая, нават строгая, але калі я паяўляўся, яе твар святлеў. Калі не было пісем, яна ўздыхала і паціскала плячыма; калі ж яны былі, яна радавалася можа не менш за мяне.

— Вы, мабыць, вельмі любіце сваю сям'ю? — аднойчы папытала яна.

— Ну а як жа,— сказаў я, нават здзівіўшыся, што пра гэта трэба пытацца.

Вайна пакінула бог ведае колькі ўдоў. І яна была ўдава, і дзіва: не маючы свайго шчасця, яна радавалася чужому.

— У вас можа ёсць яе карткі?

Я ведаў, што яна пытаецца пра жонку. І калі аднойчы прыйшло пісьмо, і па тым, што яно было пакаўное, здагадваючыся, што там, мабыць, карткі, яна стала пры бар'ерчыку, чакаючы, калі я разарву канверт. Задумная жанчына пастава і двое малых — хлопчык і дзяўчынка, што прыпалі да яе спадніцы і глядзелі гэтак чыста на свет,— нагналі на яе вочы слёзы.

— Які вы шчаслівы, яны ж вас любяць,— сказала яна.

Аказваецца, што можна зайздросціць нават мне. Якая ж умоўная рэч гэтае шчасце, і як кожнаму не хапае яго!

І вячэраў я бульбаю з чаем. Я не ведаў, што гэта не так і блага. Пяцілінейная лямпа, пастаўленая на дно гаршка, кідае на стол жаўтаватае дрыготкае святло, ад міскі ідзе пара. Перакідваючы ў руках гарачую бульбіну, я абіраю яе; яна да таго сопкая, што рассыпаецца ў пальцах. Бараўлёва, у лёгкім ватовым кабаціку і ў хустцы, завязанай каптурыкам, узлакаціўшыся, сядзіць насупроць, чакаючы, каб прыбраць стол.

— Дзе ж сёння рабіў, што так позна прыйшоў? — пытаецца яна.

— На дрывах,— кажу я.— Бярэзнік жа намёрзлы, цвёрды, цяжкі, як жалеза. Пакуль наспускаў ды павыцягваў з снегу, наладаваў воз, от і сцямнела на трэцім рэйсе.

— Сёгады снег глыбокі,— пагаджаецца яна.

Я прыслухоўваюся да гэтага слова. Дзіва, якое падабенства: па-нашаму сёлета, а тут — сёгады. Чамусьці мне вельмі прыемна ад гэтага нечаканага адкрыцця: хоць зямля мая далёка, але і тут адчуваю, што я не ў чужых.

— Нешта ты ўсё адзін ды адзін,— кажа Бураўлёва, пачакаўшы.

Яна са мною на «ты» з першага дня. Не ведаю, ці такая тут завядзёнка, ці можа таму, што я ёй такі ж, як і ўсе,— свой селавік.

— Як гэта — адзін?

— Ну, другія ж неяк і пройдуць да каго, і пасядзяць, і павесяляцца часамі, ды яно ж і жанок у нас многа, можна было б і сюды пазваць, але ты ўсё нешта пішаш ды кніжкі чытаеш.

Гэта праўда. За пятнаццаць гадоў маё жыццё складалася так, што і ад пісання, і ад кніжак я быў далёка. Не ставала часу. Не надта ставала яго і цяпер, але памагала тое, што я быў на адзіноце. Звычайна ўвечары Бараўлёвых хлопцаў не было дома. Мікалай меў дзяўчыну, увішную і шчабятлівую Граню, і бадай што ўвесь свой вольны час бываў у яе, а меншы падшыванец прападаў бог ведае дзе. Бараўлёва ішла ў каморку, клалася спаць, а я, укруціўшы ў лямпе кнот, садзіўся к сталу. Чытаў кнігі, якія нялёгка мог тут даставаць, пісаў пісьмы дадому. Гэта былі цяжкія пісьмы. На развітанне Аня сказала: «Памятай, дзе б ты ні быў, я прыеду да цябе». Куды ж яна прыедзе? Што будзе тут рабіць? Тут няма ні праектных інстытутаў, ні чарцёжнай работы — чым яна будзе займацца, якую знойдзе сабе спецыяльнасць? Я прасіў пачакаць з пераездам, пакуль нейкім чынам не вызначыцца больш пэўна мой лёс. Напісаў яшчэ адну заяву ў райвыканком.

Нарэшце я тушыў лямпу і, блытаючыся ў фіранцы, ціхенька пераступаў у каморку. Упоцемку, каб не грукаць, намацваў свой тапчан, табурэтку. У бляклым святле, што ішло з намарожаных шыб знадворку, я бачыў край прасці666адла, што спускаўся з ложка ў Бараўлёвай.

— Чортведама навошта ты губіш сябе. Заўтра досвета ўставаць, а яму гэтая грамата патрэбна.

Няўжо яна не спала? Ці можа яе прабудзіў скрып майго тапчана?

— Нічога, сну мне хопіць.

У галаве ў мяне ішла свая, яшчэ прынесеная ад стала, плынь думак. За вокнамі ляжала чуйная цішыня, калі хто праходзіў па вуліцы, чутно было, як пад валёнкамі рыпіць снег. У кухні пачынаў сваю работу цвыркун. Абодва хлопцы яшчэ не варочаліся дадому.

— Табе не холадна там пры акне? — па немалым часе маўчання пыталася Бараўлёва.

— Не.

— А то можа на кухні яшчэ кажух вазьмі накрыцца,— паясняла яна свой клопат.

Я разумеў гэты клопат. І адкрыў яго для сябе зусім нядаўна. Я ішоў на пошту. Каля чужога двара стаяла Бараўлёва з суседкаю. Вуліца на сонцы блішчала наезджаным марозным снегам. Яшчэ здалёк я бачыў, што суседка працінае мяне вачыма. Ясна, што гаворка ў іх пра мяне. «Гэта твой? Ну дай хоць паглядзець на яго»,— чыталася ў суседчыным паглядзе. Шэптам яна пра нешта папыталася. І ўжо калі я праходзіў міма, пачуў, як Бараўлёва сказала сваім грубаватым голасам:

— Паскардзіцца не магу...

З дня на дзень я чакаў адказу з раёна. Трэба, мабыць, схадзіць самому, падумаў я. Заява — гэта паперка, яна нікому не баліць, калі пра яе забыліся, то пра сябе не напомніць. Папрасіўся ў Чаркашына, каб адпусціў хоць на дзень.

— Што ж зробіш, схадзі,— сказаў ён.— Або пачакай, пакуль праб'юць дарогу, пойдуць машыны, падвязуць, бо цяпер хадзіць не так і лёгка.

Я не чакаў ніякіх машын. Назаўтра ж раненька, надзеўшы падсушаныя валёнкі, цяплей ухутаўшыся і падперазаўшыся, яшчэ прыцемкам пусціўся ў дарогу.

Праўда такі, яна аказалася нялёгкаю. Першыя кіламетры, пакуль падымаўся на пагорак, пакуль мінаў лясок, дзе след дарогі быў цвёрды, ішліся ў ахвоту. Але далей, калі выйшаў у стэп, карціна перамянілася, след дарогі пазначалі толькі тэлеграфныя слупы. З золкам пачынаўся ўсё большы і большы вецер, па гладкім шарпаку то там, то там успыхвалі снежныя грывы, яны мітусіліся, пераганяючы адна адну, знікалі, зноў успыхвалі і плылі ў бясконцую, цяпер ужо прасвечаную сонцам далячынь. Ногі мае штохвіліны западалі ў нейкія ямы, вецер ззаду тут жа і замятаў мой след. Я стараўся намацаць валёнкамі хрыбціны ад каляін, нейкі час мне ўдавалася іх пільнавацца,

але ненадоўга, ногі саслізгвалі і зноў западалі ў ямы. Кіламетр за кіламетрам у белай прасторы перада мною пазначалі кірунак толькі тэлеграфныя слупы. Каб ведаць, што я ўсё-такі рушу наперад, я пачаў іх лічыць. Адзін, другі, трэці. Вунь за тым, наперадзе, дарога пойдзе гладзей, там нібы перакат, і след стане цвярдзейшы. Я мінаў і гэты слуп, і яшчэ, і яшчэ, але нічога не мянялася. Як бы я хацеў, каб наперадзе мяне ці хоць ззаду паказалася фурманка, няхай бы яна размінулася са мною, няхай бы абагнала, усё-такі я ведаў бы, што гэты стэп не мёртвы. Але наўкруга адна бясконцая снежная бель. Я ўспомніў, як часта спакойна слухаў расказы пра тое, як гінуць у дарозе людзі, і не верыў. Цяпер я бачыў, што гэта вельмі блізкая праўда. Ну от змагуся я недзе пасярэдзіне тропу, высілюся, прысяду адпачыць, і — усё. Толькі чуць-чуць дазволю сабе задрамаць і — не прачнуся. Лоб пад шапкаю, правы бок пад бушлатам у мяне прэў ад поту, а левы прамярзаў. Здавалася, што ён голы. На рабоце ў любы вецер я мог павярнуцца, стаць да яго або тым, або другім бокам, а тут я не мог зрабіць гэтага. Я спрабаваў ісці задам, каб хоць на якую хвіліну даць абагрэцца левай руцэ, але так можна было зрабіць якія два-тры крокі. Выходзячы з дому, па каўняры я павязаўся махрастым ручніком. Цяпер я падумаў, што ён хоць трохі можа мне памагчы. Я падышоў да слупа, скоранька скінуў бушлат, уваткнуў у рукаў яго ў дзве рэдзі зложаны ручнік. Апякаючы гузікамі пальцы, зашпіліўся, яшчэ цясней падперазаўся і рушыў далей. Паляжаўшы на снезе, паспелі астыць і рукавіцы.

Усё марудней і марудней міналіся слупы. Ногі сталі цяжкія, снег больш сыпучы, крок усё больш хісткі. Неба яснае, яркае, вочы аж слепіць бліішчастая далеч. Я не ведаю, колькі часу іду; тут, у гэтай стэпавай белі, нават сонца свеціць інакш, я не магу сказаць, якая гадзіна. А мне ж трэба дайсці, каб заспець старшыню. Дзеля гэтага ж я і пусціўся ў дарогу.

Нарэшце наперадзе паказаўся цёмна-алавяны дах цаглянага клуба, што стаіць на пагорку, ён пануе над усім наваколлем. Яшчэ якая часіна, і паказалася ўсё мястэчка з густымі дамамі пасярэдзіне і паадкіданымі наводшыб з краёў, як нарысаванае на белым палатне.

Можа таму, што мястэчка ляжала ў нізіне, атуленае з трох бакоў узвышшамі, вецер перад ім адразу аціх. Прывыкшы месяць снег і не паспеўшы прызвычаіцца да глад-

кай дарогі, ногі мае аж падгіналіся, калі я ступіў на цвёрдую вуліцу.

У райвыканкоме, што мясціўся ў нізкім драўляным доме за маладым паркам, жанчына цёмнага воласу і суровага, занадта дзелавога аблічча сказала, што Удавічэнка заняты. Пачакальня была невялікая, падобная на калідор, свежапабеленая па старой, павышчэрбліванай тынкоўцы. Двое дзвярэй наабапал вялі ў два кабінеты — старшыні і намесніка, наабапал жа са сцен круглымі чорнымі бакамі выступалі дзве жалезныя грубкі. Жанчына, увесь час нешта пішучы за сваім невялікім столікам, сказала мне пачакаць. Я сеў у крэсла, прыставіўшы яго да самых старшынёвых дзвярэй, і пачуў, як мяне пахіліла на сон. Я змагаўся з ім як мог, а вочы зліпаліся, і перад імі ўвесь час бялела дарога, круціла замець, і я ўсё мясіў і мясіў глыбокі снег. Сярод таго драмання я чуў, як нехта прыходзіў, пытаўся ў жанчыны, ці ў сябе Міхаіл Сямёнавіч. Прыходзілі і яшчэ людзі, заходзілі ў кабінет, выходзілі, а я ўсё трывожна думаў, хаця б не праспаць мае часіны. Добра грэла гэтае цяпло ад грубак, добра пахла свежаю крэйдаю ад сцен. Нарэшце стала вельмі ціха, і я прахапіўся; жанчына ўсё пісала, яна на мяне, мабыць, забылася, і Міхал Сямёнавіч не ведае, што да яго тут сядзіць яшчэ адзін наведнік.

Па нейкім часе з кабінета адчыніліся дзверы, і адтуль выйшаў чалавек у кіцелі без пагонаў, невысокі, з быстрымі шэрымі вачыма. Няйначай як ён збіраўся пайсці ўжо дадому і здзівіўся, што тут яго яшчэ нехта чакае.

— Вы да мяне? — папытаўся ён.

— Да вас.

— Ну давайце скоранька, што там у вас такое.

Ён вярнуўся за свой шырокі стол, я сеў насупроць і расказаў, хто я і чаго прашу.

— А, памятаю, памятаю, ёсць недзе ў мяне ваша заява.

З шуфляды ён дастаў апошні мой ліст, пачаў чытаць. У мяне сэрца тахкала так моцна, што, здаецца, аж чутно было на ўсім пакоі. Няўжо ён нічога не паможа мне? Летась у познюю восень я галасаваў за яго ў дэпутаты. У нашым драўляным нізкім селавым клубе, дзе было паўнютка народу, ён выступаў з прамоваю перад выбаршчыкамі. Толькі што звольнены з арміі ў запас у чыне падпалкоўніка, ён быў хоць без пагонаў, але ўвесь яшчэ чыста ваенны: дакладны, рухавы, быстры, у ім аж кіпела энергія. У зале з павыбіванымі вокнамі было холадна. На сцэ-

не — прэзідыум з трох чалавек, каля трыбуны — Удавічэнка ў накінутым наапашкі шынялі. Час ад часу хукаючы ў рукі і пацепваючы плячыма, ён гаварыў пра Сібір. Што гэта раздольны і найбагацейшы край, у якім жывуць цудоўныя людзі. Пад цудоўнымі людзьмі ён разумее і такіх, як я, думалася мне, значыць, чалавек справядлівы. Маючы стаць дэпутатам ад нашай акругі і ведаючы, што яго бачаць тут першы раз, ён, аднак, не паддобрываўся пад сход, а тут жа пасарамаціў, сказаўшы, што мы неахайнікі і нядбайлы, бо нават клуб маем такі, што ў ім можна ганяць ваўкоў. Ён падабаўся нам за адкрытасць і праўду, уся зала пляскала ў ладкі. І вось цяпер я сядзеў перад Удавічэнкам. Дык няўжо ж гэты чалавек, што стаў старшынёй райвыканкома, за якога я тады падаў свой голас, няўжо ён цяпер не палічыць мяне роўным сабе?

Не папытаўшыся ў мяне ані слова, Удавічэнка ўзяў з падстаўкі ручку і нешта напісаў на ражку мае заявы. Моўчкі перадаў яе мне. Я прачытаў: «Тав. Гулаку. З сённяшняга дня залічыце на пасаду бухгалтара райкамунгаса».

— Зараз жа ідзіце і прымайце справы,— дадаў ён, падымаючыся з-за стала.

Калі я выходзіў з кабінета, мне здалося, што і ў жанчыны быў не суровы, а вельмі добры твар.

ТРЫВОГІ

(працяг)

5

Сярод людзей, што займаліся маім лёсам, таксама былі добрыя і благія людзі. Нават у тыя далёкія гады, калі не толькі мяне напаткала бяда, я меў магчымасць пераканацца ў гэтым. Справаю маею займаўся вельмі строгі чалавек, Цімафееў. Ён быў нават жорсткі, але ўвесь час не пераставаў перасцерагаць: «Толькі нічога не выдумляйце, гаварыце праўду. Калі станеце выдумляць, вы нагаворыце на сябе, міжволі ўцягнеце і другіх, невінаватых, а савецкія законы не могуць дапусціць несправядлівасці». Мне часамі думалася, што вось такі, мабыць, быў Дзяржынскі: яму аднолькава важны былі і дзяржава і чалавек у ёй.

Ну і, вядома, за справу ўзяўся другі чалавек.

Цяпер я гляджу на сваю дарогу, як на далёкі сон. Мая біяграфія здаецца мне вельмі доўгаю, і я дзіўлюся, як многа ў ёй месціцца. Я зазнаў і трагізм, і роспач, зведаў цану радасці і надзей: быў па грані таго горкага адчування, калі чалавек астаецца без радзімы — не мае на яе права, і зразумеў, якое гэта вялікае і дарагое пачуццё — бацькаўшчына.

Лёс кожнага — гэта свой лёс, але без лёсу народа няма і свайго лёсу. Часта я думаю, у якой душэўнай спустошанасці жывуць тыя, што апынуліся на далёкіх, чужых землях. Я не гавару пра здраднікаў і палітычных злачынцаў, яны самі пазбавілі сябе бацькаўшчыны. А маю на ўвазе тых, што па волі часу і падзей, па якой невялікай правінцы або і зусім без правінкі — па прымусу — пакінулі сваю зямлю. Бацькаўшчына ім мроіцца толькі ў харошых снах. Я ведаю, што ім цяжка, што перад сабою летуценна яны бачаць бясконца дарагія родныя нівы, лугі, кветкі і травы, раніцы і вечары, вузкія сцежачкі сярод жытоў і хаты; што ім чутны нашы песні, што ім свеціць наша сонца, як надзея, як права аставацца людзьмі.

6

У горы таксама ёсць месца для любові. Аднакава яны жывуць надзеяй.

Я палюбіў Сібір і сібірскую зіму з яе сухімі, яснымі марозамі, калі стаіць такое чыстае і ціхае паветра, што ты нават не думаеш, што тут пяцьдзесят градусаў і трэба асцерагацца, каб не адмарозіць шчок, барады ці носа, бо нават і не заўважыш гэтага; з яе лютымі завеямі, калі ўвесь свет кружыцца вакол цябе ў шалёным, дзікім, белым, сляпучым танцы і ты ўжо не ведаеш, дзе права, дзе лева, нават дзе неба і дзе зямля. Палюбіў імклівае, але гарачае і нейкае ва ўсім спелае лета, за якое на вачах растуць і збажына, і травы, і кветкі, яркія і буйныя і ўсё-такі як бы нечым несапраўдныя, бо ў іх няма самага наймілейшага іх хараства — паху. Палюбіў нясмелыя вёсны і кароткую яркую восень, калі раптам аб адным дні загараюцца жоўтым лісцем бярозы і так і стаяць і гараць ціхім залатым полымем, падкрэсліваючы заспакайнелыя сінія далі з пералескамі, узгоркамі і лагчынамі. Пад сярэдзіну лета колькі ў тых пералесках ягад — буйных чырвоных трускалак, якіх можна набраць цэлы кораб на адным мес-

цы, лежачы бокам у высокай траве. Не раз усёй сям'ёй — з жонкай, дачкой і сынам — і з нашым вясёлым Бобікам, які аднойчы нарадзіў поўную будку шчанят, і мы вымушаны былі цяпер называць яго Бобіхай,— не раз вось з такой сямейнай кампаніяй, пабраўшы кашы, мы хадзілі па гэты промысел у нядзелю, знаходзячы ў ім і адпачынак і асалоду.

Я палюбіў сваё харошае сяло з яго ціхімі вуліцамі і завулкамі, з камунгасам, дзе працаваў і зазнаў таксама гора і ўдачы, з узгоркам за нізкім драўляным мастом, дзе стаяла наша зямлянка і дзе Аня спрабавала завесці і качанят і гусянят, а яны, голенькія яшчэ, пры першым халодным дажджы, папруцянелі на беразе невялічкай надшай рэчкі, што працякала тут жа пад гарою; з жалем душы я сабраў іх і безнадзейна прынёс у зямлянку, а Аня безнадзейна, у слязах, сама не ведаючы навошта, пакідала ў цёплую печ, а пасля, калі адчыніла засланку, яны, шэрыя, выкачаныя ў попел, страшныя і лупатыя, стаялі гуртам і ціўкалі, чакаючы, каб іх нарэшце адтуль забралі.

Я думаў, што я ўжо карэнны сібірак і нікуды мне не трэба. Але аднойчы на работу да мяне прыбегла Аня і, адчыніўшы дзверы ў кантору, дала знак, каб я выйшаў. У руцэ ў яе я ўгледзеў раскрыты канверт. Не ведаю, што я падумаў, але на гэтую хвіліну ўсё для мяне знікла. «Вось чытай,— сказала яна, з дрыжаннем рукі падаючы той канверт.— Толькі спакойна». Я яшчэ не паспеў прачытаць ні радка, як з розных пакояў зачохкалі дзверы і людзі падбягалі да мяне, віншавалі і ціснулі рукі. Ніхто не ведае законаў, па якіх так скора пазнаюцца добрыя весці. Гэта было паведамленне пракуратуры БССР, я атрымаў яго 17 студзеня 1955 года. Я зірнуў на Аню, яна ледзьве стаяла — бледная, раптам уся зняможаная, а ў вачах было шчасце.

Цяпер я адчуў, што не магу заставацца тут ні аднаго дня. Праўда, як гэта заўсёды бывае ў такіх выпадках, знайшліся раптам неадкладныя справы па службе, па доме, якіх нельга кінуць абы-як, прыйшлося затрымацца яшчэ па колькі месяцаў, але жыў я ўжо да часу. І нарэшце, распрадаўшы што мог і купіўшы гарнітур, пакуль што адзін, пусціўся ў дарогу.

Дзень за днём перастуквае па рэйках цягнік. Божа, якія прасторы, якая мілата! Гэта ўжо канец мая, за вокнамі ўсё жыве і красуе. Бок агаленай чырвонай скалы, пералесак, ручай, стэп, сіні вецер з далёкіх прастораў,

косае крыло птушкі. Сяло з дзёрнам на стрэхах ад ветру, з нафтавым складам пры станцыі і раз'езджанай да яго чорнай, бліпчастай ад нядаўняга дажджу дарогай. Лес, пільня, высокая і тонкая труба паравіка, штабелі дошак, бярвенне, трэскі, аполкі і ваганеткі на тоненькіх пітачках рэек. Лініі высакавольтавых перадач, дарогі ўсцяж чыгункі і грузавыя машыны, што то пакажуцца, то схаваюцца разам з печаканым паваротам гэтай дарогі. На станцыях саставы і саставы, нагружаныя цэглаю, вугалем, пяском, металам, машынамі, абсталяваннем. А за Новасібірскам, аж да самага Урала, спрэс зялёная кучаравая рунь. Ну што ж, бывай, Сібір, ад цябе я таксама ўзбагацеў душою.

У купэ ад Масквы са мною тры чалавекі. Маладыя. Адзін з іх палажыў на столік чырвоную скураную папку. Хто яны? Стараюся прыслухацца да гаворкі. Геолагі. Ну вось, новая, раней невядомая ў Беларусі прафесія.

Прайшла правадніца, забрала білеты. У яе голасе я чую новую і вельмі знаёмую і родную інтанацыю. Мова! З жахам я ўспамінаю, што яе зусім забыў. У мяне прапаў нават акцэнт — нідзе ніхто за ўсе гады не мог нават западозрыць, што я не рускі. А цяпер вось гэтае цвёрдае ш, ч, р і мяккае, дз, ц, с. І хочацца, каб даўжэй стаяла гэтая жанчына і больш гаварыла.

За Смаленскам бадай што ўсю дарогу не адыходзіў ад акна. Здавалася, што я памятаў тут любую бярозку. А ў Мінску, ступіўшы на Прывакзальную плошчу, ашаламіўся — нічога падобнага не чакаў, нічога не пазнаваў. І першае, што зрабіў,— здаў чамадан у камеру ручной клажы і пайшоў аглядаць горад...

ДОМ № 9

Вайна застала мяне ў камандзіроўцы па справах школы № 17, у якой я працаваў загадчыкам навучальнай часткі. Я не папаў больш дахаты, і апошні мой ліст да сям'і вярнуўся ў гасцініцу, паткнуўшыся ў дарозе на лінію фронту. Вайсковае жыццё маё пачалося з ваенкамата Масквы 24 чэрвеня, калі надзейным сябрам стаў аўтамат. За чатыры гады ў ваенных дарог была бясконцая даўжыня і свае справядлівейшыя законы. Але я скрозь памятаў,

што з Стасяй развітаўся ненадоўга. Яна правяла мяне па Маркаўскай вуліцы і сказала, як кожны раз гаварыла ў такіх выпадках:

— Толькі не баўся, а то — так доўга чакаць.

Сева не хацеў адарвацца ад шыі. Ён прасіўся ехаць разам са мною, і прыйшлося паабяцаць, што я прывязу яму з Масквы вялікага, на доўгіх нагах, каня.

— Не баўся,— яшчэ раз паўтарыла Стася.

Праз усе неспадзеўныя дарогі вайны я бачыў, як пайшлі яны тады па вуліцы і каля брамкі двара памахалі рукамі.

І нарэшце я зноў вярнуўся сюды. Мяне не пакідае адчуванне, што гэта ўсё цягнецца тая мая камандзіроўка. Здаецца, што ад'язджаў я зусім нядаўна, але от не пазнаю свайго горада і прагна прыглядаюся да ўсіх перамен.

Я агледзеў ужо прасторную, напоўненую блакітам нябёс Прывакзальную плошчу з яе ажурнымі дамамі-вежамі як брамаю для ўезду ў сталіцу мае рэспублікі. Бачыў найпякнейшую магістраль — усланы дыванамі жывых кветак, убраны густымі радамі задуменных ліп праспект з яго празрыстымі лініямі дамоў-палацаў. Хадзіў па велічна спакойнай і бясконца шырокай Цэнтральнай плошчы, аздобленай скульптурнай лепкай, ліццём і чырвоным гранітам. Схіляў галаву перад Круглай плошчай, збудаванай як помнік вечнай славы барацьбітам, што аддалі жыццё сваё за вызваленне і шчасце Радзімы; урачысты спакой беражэ бронза неўміручых вянкоў каля падножжа ўзнесенага ўвысь абеліска, увенчанага ордэнам Перамогі. Бачыў незлічоныя пераплёты будаўнічых кранаў, што намячаюць контуры новых дамоў і лініі будучых вуліц. І — паркі, паркі, шырокія плошчы садоў і прысадаў невыказнага хараства і дзіўнотаў. Дзівосныя казкі з кнігі нашых мараў пра Камуну. Слава табе, вялікі чалавек-пераможца і будаўнік! Слава розуму, волі, любові і працы залатых рук тваіх!

Новы Мінск мне незнаёмы. Кожны крок выклікае новае хваляванне. Але сярод усіх гэтых дзіўнотаў недзе ёсць непрыкметная Маркаўская вуліца і на ёй дом № 9, якога я не магу абысці. Мне трэба бачыць яго ці калі няма яго, то хоць пазнаць тое месца.

*

Апошні дзень жніўня. Цеплыня. Я праходжу каля велічна строгага будынка ЦК. Па спадзістых лесках, што перамяжаюцца шырокімі пляцоўкамі, спускаюся да Свіслачы.

Мінаю цяпер куды багацейшы і раскошнейшы парк імя Горкага. Я прыкмячаю тут усё, што мне нова і незнаёма. Магутныя дрэвы, кронамі зросшыся ўверсе, берагуць прахалоду і цень. Я спыняюся, бо заўважаю, што многа чаго тут не магу зразумець. Мне здаецца, што парк мае не тыя граніцы. Ну, вядома, увесь гэты малады зараснік стаіць на месцы, дзе некалі цягнуліся кварталы дамоў. Тут недзе жыў Якуб Колас. Я хачу хоць прыблізна знайсці тую мясціну і стараюся ў уяўленні аднавіць вуліцу. Вось тут былі вароты ў парк, і вось тут, у засені, стаяў той драўляны, што пахнуў хвояю, дом. Быў высокі з балясамі ганак. Слядоў руін яшчэ не паспела прыкрыць зеляніна, сярод травы відзён ад пажараў патрэсканы камень...

Я іду далей, мінаючы вуліцу за вуліцай. І ўсё раскрываецца перада мною новы і новы горад. Я пазнаю гэтыя мясціны толькі па старых Вайсковых могілках, што шумяць несціханым гоманам сваіх векавечных хвояў.

«Тая вуліца павінна быць недзе вось тут»,— кажу я сабе, гледзячы на пустку, што адкрылася перада мною справа.

Пустка падрыхтавана для забудовы, яна абнесена ўжо агароджаю. Кідаецца ў вочы, што на гэтым месцы было вялікае разбурэнне. Ямы, груды камення і цэглы пазараеталі травою і быльнягом. Сям-там пааставаліся дрэвы садоў, ад карэнняў якіх падымаюцца густыя пасынкі.

«Не, тая вуліца, мабыць, павінна быць трошкі управа,— мяркую я, прыпамінаючы, дзе павінен быў канчацца тупік Вайсковай і пачынацца завулак, што вёў да Маркаўскай.— Мабыць, якраз яна павінна была пайсці вось за гэты вялікі дом, каля якога я стаю! А можа якраз на ёй і стаіць гэты дом?»

*

...Бясконцыя дарогі вайны завялі мяне ў шырокі светла-жоўтага колеру дом у Фергане, на вуліцы Камуністаў, што называўся шпіталем. Я мог цяпер спакойна вымаць з партманета невялічкі пакецік з белай паперы, даставаць адтуль светла-бялявы лаканок, завіты ў няпоўнае колца,

і падоўгу глядзець на яго. Пакецік крайком сцёрся ад паходаў, лакапок у ім зляжаўся, а некалькі танюткіх мяккіх валаскоў ляжала асобна. Я баяўся, каб сваім дыханнем не развеяць іх.

Няраз мы дзівіліся са Стасяй, што ў Севы такія светлыя кудзеркі і на лобіку закручваюцца ў завіткі. Так бывае, мабыць, у кожнага дзіцяці, але нам здавалася, што такая пяшчотная льнянасць толькі ў Севы. Я сказаў, што калі Сева вырасце і можа будзе ўжо студэнтам ці інжынерам, то яму было б вельмі цікава паглядзець на свой волас. Не доўга думаючы, Стася ўзяла нажнічкі і адрэзала адзін завіток.

— На,— сказала яна,— схавай. Сам некалі яму і пакажаш.

Я загарнуў тады завіток у пакецік, вырваўшы лісток з настольнага блакнота, і палажыў сабе ў партманет.

— Дзе яны цяпер? Ці жывы? — не раз я пытаўся ў сябе, лежачы ў далёкім шпіталі, і кожны раз, здавалася, чуў тое апошняе слова: «Не баўся».

*

...Некалькі разоў я кружыў і кружыў вакол пусткі, дарэмна намагаючыся знайсці хоць маленькія прыкметы знаёмага мне месца. Нарэшце наткнуўся на абгарэлае збудаванне, на рагу якога асталася старая, пачарнелая шалёўка. На гэтай шалёўцы я ўбачыў шыльду з надпісам белымі літарамі па сінім эмаліраваным полі: «Фельчарская вуліца, № 3». У мяне сунялося сэрца: Фельчарская вуліца павінна быць поруч з Маркаўскай...

Я падышоў да гэтага дома. Толькі ён і астаўся як арыенцір таго месца, дзе развіталіся са мной дзве постаці.

Я пастаяў, уздыхнуў. Нарэшце я магу сказаць, што быў тут. Няважна, што я не знайшоў ні вуліцы, ні таго дома,— ясна, што іх няма,— але я быў тут і пакланіўся памяці...

*

Кожны раз з адраснага бюро ў Бугуруслане прыходзілі адны і тыя ж адказы, што прозвішча, якога я шукаю, у іх не значыцца. Вестак няма. Дарогі вайны ўжо даўно ляжалі цяпер на чужых землях. З трывогаю я чакаў адказу на свой ліст, яшчэ раз пасланы дахаты на адрас любога жыхара дома, з просьбай сказаць, што са Стасяй. Адказ я

атрымаў не з дома № 9; яго прыслала настаўніца мае школы, сказаўшы, што сям'і ў мяне больш няма.

«Паважаны Андрэй Сямёнавіч,— пісала настаўніца мае школы,— ваша пісьмо праляжала б на пошце ў вітрыне безадрасатных пісем бясконца доўга, калі б выпадкова не трапіла мне на вочы. Паведамляю, што ад вайны ў нас вялікія няшчасці. Мне не хацелася б рабіць вам балюча, паважаны Андрэй Сямёнавіч, але калі вы пытаецеся пра Стасю, то магу сказаць, што напэўна яны загінулі, бо пасля таго я больш не сустракала яе...»

*

Я пайшоў адсюль, каб сесці на трамвай ці аўтобус. З двума вёдрамі паўз мяне прайшла жанчына да калонкі, спускаючыся ўніз. Мне падумалася, што можа я магу больш праверыць сябе і больш упэўніцца, што быў на правільным месцы. Я нагнаў жанчыну ўжо тады, калі яна падстаўляла вядро пад кран, бразнуўшы дном яго аб цэментавы дол, і запытаўся — дзе тут была Маркаўская вуліца.

Жанчына падняла на мяне галаў — ёй было гадоў сорак пяць. Проста адзетая ў кляцістую блузку, цёмную спадніцу і павязаная белай у бобачкі хусткай, яна больш за ўсё была падобна на гаспадыню добрай рабочай сям'і. Вельмі светлы, адкрыты, крыху шыракаваты твар.

— Э, таварыш мой дарагі,— сказала жанчына, выпраставшыся,— цяпер вы яе не знойдзеце.

— Я гэта бачу. Але хоць бы ведаць, дзе тут была яна?

— А вось! — жанчына павярнулася тварам да пусткі і паказала рукою. У агароджы тут быў вялікі прасвет: на зямлі ляжалі добра ўтрамбованыя сляды аўтамашын, што, мабыць, многа ўжо тут хадзілі, завозячы на будоўлю матэрыялы.— Якраз от яна пачыналася ніжэй новага дома і ішла вунь туды, бачыце маленькі цагляны домік пад вішняй?

Тады я з трывогаю асмеліўся задаць яшчэ адно пытанне:

— А ці не скажаце, дзе, у якім месцы стаяў тут дом нумар дзевяць?

— Дзевяць? — перапытала жанчына. Яна паглядзела мне ў твар, а тады зноў паказала рукою.— А от! Вунь той, скіданы з абгарэлага бярвення домік пад вішнямі і ёсць нумар дзевяць. На ім нават і надпіс павешаны.

— Ды не,— кажу я.— Дом нумар дзевяць быў не такі.

Гэта быў добры асабняк на два паверхі; і сад такі быў яшчэ там. А пад вокнамі раслі тры клёны.

— Э, таварыш мой дарагі, я ведаю, што не такі ён быў, ды ад яго нічога не асталося. Бачыце, тут жа ўсё спустошана.

Мабыць, жанчыне цяжка было ўспамінаць пра гэта — яна пахмурнела, павярнулася і направіла вядро пад краном, хоць тое стаяла якраз вельмі добра. Ужо была ўзялася за ручку, каб націснуць яе, але можа таму, што я стаяў у задуменні, жанчына зноў выпрасталася і сказала:

— Цяжка гаварыць пра той дом, таварыш мой дарагі: загінулі ўсе, нікога жывога не асталося. І, памятаю, жыла там адна жанчына, маладая такая яшчэ. Хлапчуку яе гады чатыры было, часта яна хадзіла з ім па той вуліцы. Русавалосы, шустры хлопчык. Прабачце,— раптам сказала жанчына, зірнуўшы быстра на мяне,— а што, у гэтым доме можа вы каго ведалі ці быў хто вам блізкі?

*

...У партманеце ў мяне асталася яшчэ адна памяць. Якраз напярэдадні ад'езду ў камандзіроўку, у нядзелю, мы сядзелі ў нашым садзе і чыталі газеты. Скрозь лісце на дарожку, на лапіны цёмна-зялёнай травы падалі стракатыя сонечныя блікі. З кубікаў Сева складаў і разбураў свае незамыславатыя збудаванні, і сонечныя блікі ігралі ў яго на руках, на твары, іскрыліся ў пушынках яго валасоў.

— Вазьмі апарат,— сказала Стася.— Сфатаграфуй ты яго, гэта ж будзе ўсё роўна як у чароўным царстве.

У той момант, калі я здымаў, Стася гукнула, і Сева так і выйшаў з паднятай галоўкай і з выстаўленай убок ручкай, што была пацягнулася, каб дастаць новы кубік. На картцы, што асталася ў маім партманеце, Сева глядзеў, прыжмурыўшы вочкі, увесь у тых далёкіх сонечных бліках, што падалі скрозь лісце нашага саду...

Я не адказаў жанчыне, што ведаў тых жыхароў з дома нумар 9, што сёння прыходзіў сюды пакланіцца іх памяці.

— Бывайце здаровы,— сказаў я жанчыне.— Дзякую.

Я ішоў паволі, як гэта часта бывае, калі робіш спакойны агляд падагульненняў, ведаючы, што, нарэшце, скончана нейкая непакойлівая работа. Я праходзіў квартал за кварталам, сустракаючы ўсё новыя і новыя з'явы, прыглядаючыся да людзей, зноў думаў, то ўспамінаючы, то ўяўляючы тое, што называецца будучыняю.

Маё задуменне нечакана парушыў шумлівы гурт юнакоў, што выскачыў на вуліцу з брамы шырокага двара, ледзь не збіўшы мяне з ног.

— Прабачце, таварыш настаўнік,— сказаў юнак, адскочыўшы і яшчэ не разгледзеўшы мяне.— Прабачце, я думаў, настаўнік,— паправіўся ён, ужо ўбачыўшы мой твар. Ён хацеў быць сур'ёзным, але след гарэзнасці яшчэ іграў у яго вачах.

— Дык я і ёсць настаўнік,— сказаў я, даючы зразумець, што ён мяне нічым не пакрыўдзіў і што мне ад гэтага толькі добра.

— Не, я думаў, наш настаўнік. Тады яшчэ раз прабачце,— сказаў ён, ужо шырока ўсміхаючыся, і пабег даганяць сваіх сябрукоў.

Ён знік у натоўпе, а я яшчэ шукаў яго светлай ільнянай чупрыны. «Чым ён мне мілы?» — пытаўся я ў самога сябе, міжволі ўспамінаючы той завіток, што ляжаў у мяне ў партманеце. Мне было шкода, што так ненадоўга была наша сустрэча.

І я зразумеў, што цяпер усё жыццё, у любым натоўпе юнакоў буду шукаць светлавалосай чупрыны, усё яшчэ не верачы ў горкую праўду бяды, усё яшчэ спадзеючыся на нешта...

НЯСПРАЎДЖАНАЕ КАЛЕГАВАННЕ

Назва кнігі «Як вясну гукалі» да таго мне падабалася, што я карцінна бачыў Магілёўшчыну, далёкае, мілае ў ёй сяло з яго песнямі, карагодамі, варажбою, вячоркамі, купальскімі і начлежнымі начамі. І любіў невядомага мне, але добрага аўтара.

Потым выявілася, што ён таксама вучыцца ў універсітэце, гэты паэтычны пісьменнік Васіль Каваль. Ці вучыўся ды пакінуў, але як бы зноў хоча вярнуцца. Аказалася, што ён зусім не пявучы, не такі паэтычны і ласкавы, як назва яго кнігі, а наадварот, маўклівы, спакойны, з чорнымі і цвёрдымі, а не светлымі і мяккімі валасамі, трохі пасуплены, задуманы, трохі недаверлівы, з нізка апушчанаю галавою, з цяжкаю верхняю губою і як бы пужлівымі вачыма. Я паспрабаваў з ім падружыцца, але наткнуўся на стрыманасць і асекся. Потым зразумеў, што гэтая

стрыманасць была яго характарам. Нават усміхаўся ён скупа, як бы баючыся, каб чаго нядобрага не падумалі пра яго ўсмешку. Мы з ім часта сустракаліся, але толькі выпадкова, як бы не хочучы, каб хто падумаў, што мы можам калегаваць. Бо дружба, калегаванне — гэта нешта несучаснае, сентыментальнае, маладушнае, нават мяшчанскае. Сапраўднае калегаванне павінна быць строгае.

Памятаю, на семінарскіх занятках мне выпала для разгляду тэма «Творчасць Васіля Каваля». Праводзіў семінар Адам Бабарэка, чалавек, які вельмі паважаў думку другога. Маючы сваю думку на нейкі твор, ён ніколі не глушыў чужой. На занятці прыйшоў і Васіль Каваль. Памятаю, мяне гэта і радавала, і трошкі бянтэжыла. Я разглядаў тры кнігі: «Як вясну гукалі», «На загонах» і «Крыніца». У пазнейшых рэчах быў трохі чуцён уплыў Максіма Горкага, гэтак мне здавалася. Пра гэта я і сказаў, пашкадаваўшы, што Васіль Каваль пачынае аддаляцца ад самога сябе.

Семінар прайшоў нармальна. Адам Бабарэка разгляд ухваліў. Недавольны сабою астаўся толькі я сам: ці не пакрыўдзіў Васіля Каваля?

— Ды што ты, братка,— сказаў ён мне намнога пазней, калі мы ўмудрыліся на нейкую часіну астацца самнасам у Доме пісьменніка.— Я сам ведаю, што гэта праўда, ды хвароба невялікая, яна пройдзе.

Потым, таксама намнога пазней, пайшла часіна, калі Каваль яшчэ больш унурыўся, цёмны з твару ад прыроды, яшчэ больш пацямнеў, тое, што пісаў, не радавала яго. Часіна гэтая цягнулася даволі доўга, ён то раптам знікаў, то паяўляўся нейкі разгублены, устрывожаны, як бы ў чым вінаваты. Пісалася яму цяжка, ён кідаўся з тэмы на тэму, ні ў адной не знаходзячы патолі. Нешта ўсё ў яго выходзіла выпадковае, зусім не блізкае яго душы.

Аднаго разу я ішоў дадому з цэнтра, у сваё Завакзалле, і нагнаў Каваля. Ён ішоў угнуўшы галаву, на ім нізка сядзела яго чорная суконная кепка, і мне здалося, што ён быў рад сустрэчы. Мы так і пайшлі далей ціхаю хадою — праз малады скверык, за вакзал, цераз пешаходны масток над чыгуначнымі пуцямі, у мой Піянерскі завулак.

Прадуктовая крама ад мяне зусім блізка, на рагу. Па сумным Кавалёвым настроі я зразумеў, што мне трэба туды забегчы.

Гаворка наша ішла паволі, як бы нехаця. І разам з тым я бачыў, як рад Каваль, што можа пагаварыць. Даўно я заўважаў яго душэўны неспакой. Я разумеў, што прычына на той час была, мабыць, агульная: у літаратурнай крытыцы быў модны вульгарны сацыялагізм, на любы твор можна было чакаць суровага, але несправядлівага прысуду. Гэтым я тлумачыў Кавалёву разгубленасць і трывогу, і тое, што ў яго творах усё прыцішвалася хваляванне, усё меншала і меншала ў іх непасрэднасці і душэўнасці.

— Душэўнасць,— паўтарыў Каваль.— То якраз жа яна больш за ўсё і небяспечная. Іменна яна павядзе за сабою ўсякія перажыванні, ваганні, няпэўнасці, а гэта ж і будзе называцца дробнабуржуазным самакапаннем. А можна пайсці і далей: душэўнасць — гэта душа, а душа — паповства, ідэалізм. Вось паспрабуй і здагадайся, як трэба пісаць.

Каваль не любіў гаворкі з тэарэтычнымі ўхіламі, і я падзівіўся, што хапіла ў яго духу на такі доўгі маналог.

Я ніколі не быў вялікім ахвотнікам выпівання. Аднак убачыў, што пляшка ўжо апусцела, а ў нас і галовы яшчэ як бы зусім чыстыя, і ні пра што людскае мы як след і не перагаварылі.

На стале нудзіліся астаткі халасцяцкай закускі: разрэзаныя галоўкі цыбулі, абгладаныя хрыбціны нейкай сухой рыбіны; чарсцвее разламаны акраец хлеба; рассыпаны сінія крышталікі нядбайна растоўчанае солі.

Каваль гаворыць ціха, палажыўшы галаву на ўзлакочаныя рукі, на вочы яму напускаецца цвёрдая, чорная пасма густых валасоў, што так упарта не хочуць, каб іх зачэсвалі назад. Ён не можа доўга глядзець у вочы, толькі час ад часу з-пад ілба кідае на цябе позірк. І аніяк не развесяліўся. Нейкі глыбокі одум трывожыць яго. Я падумаў, што мне, мабыць, зноў трэба збегаць у краму.

Мы праседзелі з ім увесь вечар, і, мабыць, ні разу не было ў нас такой добрай і блізкай сустрэчы, як гэтая. Мы ўспомнілі і універсітэт, і мой разгляд яго творчасці, і сваіх сяброў і таварышаў. Гаварылі пра самастойнасць і ўплывы, зноў пра крытыку, сумленную і несумленную, глыбокую і павярхоўную. Пра тэмы, гістарычную і сучасную, пра тое, што стала нялёгка пісаць, бо літаратура набывае сталасць.

Каваль вельмі цяжка раскрываўся перад другімі. Нават калі ў яго было гора, няшчасце, нейкая крыўда, ён

перажываў усё гэта сам, адзін, ні ў кога не шукаючы спагады.

— Ты разумееш, самае страшнае, што я стаў не верыць сабе як пісьменніку,— сказаў Каваль.— Гэта не дае мне быту, я не ведаю, што рабіць з сабою. І калі жывеш з такімі думкамі дзень за днём і не бачыш прасветліны, можна звар'яцець...

Вельмі тонкая рэч — псіхалогія творчасці. Першыя кнігі Васіля Каваля — гэта паэмы пра зачараваны край, пра вёску і спрадвечны лад жыцця селяніна. Гора, бяда, нараджэнне і смерць, праца і ўслаўненне яе — паказу гэтага ладу жыцця падпарадкавана ўся паэтыка Кавалёвай творчасці.

І раптам усё гэта гіне. Калгасы. Яны бязлітасна перайначваюць базу, а значыцца перайначваюць і спрадвечны патрыярхальны лад жыцця. Свядомасць. Псіхіку. Пісьменніку трэба быць наперадзе часу, паказваць іменна вось гэтую перайначаную псіхіку, а вобразы не гатовы да гэтага, яны фальшывяць. Каваль як мастак добра ведае, што калі вобраз фальшывіць, то ён не можа быць мастацкім. І самая блізкая і родная тэма — вёска, яе побыт, паэтычны і песенны лад — робіцца непапулярнай, асучасванне яе выглядае падробкаю. Каваль шукае сабе іншых тэм, піша «Ільку», прымушаючы нават цыганоў шукаць сабе сацыяльнага выратунку ў сялянскасці. І непадкупная Кавалёва душэўнасць і лірычнасць штораз усё блякне і блякне.

— Я хачу з сабою нешта зрабіць,— кажа Каваль.— Можа на які час перастаць пісаць, можа дзе паездзіць па людзях, пабыць на будоўлях, нарэшце, на год ці на два стаць рабочым. І вось мучуся гэтым, маладушнічаю і перажываю. А пісьменніку быць нясмелым — проста няможна.

За акном змяркае. Стол наш пусты. Мы за ім і насядзеліся, і нагаварыліся.

І раптам я ўспомніў, што ў мяне два білеты на «Вясёлую ўдаву».

— Давай сходзім,— кажу я,— нельга, каб білеты прападалі.

Выняўшы з кішэні пінжака, гэтыя білеты я разгортваю перад Кавалём, каб ён перакапаўся, што і папраўдзе нельга прапускаць такога шчаслівага выпадку. І тым часам спрабую ўявіць, як нехта чакаў мяне на гэты другі білет. А можа як-небудзь удалося прайсці?..

Мы кіруемся к тэатру, я стараюся прыбавіць хады, бо гэта не так блізка — на вуліцы Валадарскага, але Каваль ідзе паволі, раздумна. І ўжо на шырокіх прыступках, перад самымі дзвярыма, ён спыняецца і кажа:

— Не, не трэба. Лепш я схаджу да Полі.

Я ведаю гэтую яго дзяўчыну, Полю Басінкевіч: толькі нядаўна быў прыемна здзіўлены (бо не верылася, што Каваль асмеліцца на заляцанне), убачыўшы, як прайшлі яны ўдваіх міма мяне, ён — павольны, унураны, лапцявата ступаючы, у глыбока насунутай чорнай суконнай кепцы; яна — невялічкая, складненькая, з ціхім, пакорліва-ласкавым тварам, нейкая ўся даверліва-ўтульная, яшчэ зусім дзеўчанё. Ну што ж, падумаў я, пасля нашай гаворкі яму якраз і трэба пабыць з ёю.

Кантралёрка здзіўлена паглядзела на мяне, зірнула ў білет, ціхенька, угнуўшыся, правяла мяне па цёмнай зале, ледзьве чутна шапнула «тут» і паказала на мой рад. Я праціснуўся, таксама ўгінаючыся, на сваё месца і адразу трывожна ўбачыў, што нікога на мой другі білет няма. Не дачакалася, прыйдзецца заўтра апраўдвацца, падумаў я, і пачаў збіраць увагу на тое, што рабілася на сцэне. Але хутка заслона апусцілася, залу заліло яркае святло.

Лепш я не буду падымацца, падумаў я, пераседжу антракт тут, бо нехта ў фае натрапіцца знаёмы, убачыць, што я выпіты. Лепш перачакаю тут... А можа яна не прыходзіла? Не, мабыць, вельмі чакала і пайшла адна дадому. Ох, і цяжкая ж будзе гаворка заўтра. Але ж у мяне і папраўдзе была важная прычына...

У часе вось гэтакіх горкіх разважанняў я пачуў, як нехта дакрануўся да майго пляча.

Я падняў вочы. Перада мною стаяла добрая, мілая жанчына, Жэня Семяняка, машыністка Дома пісьменніка.

— А вы чаго сядзіце?

— Хачу тут перабыць антракт,— кажу я.— Каб не надта мяне бачылі.

— Які антракт, гэта ж канец!

Я азірнуўся: праўда, на ўсёй зале, з канца ў канец, ні аднюсенькага чалавека.

— Хадзем,— сказала яна.— Я бачыла, як вы зайшлі, як селі. Ведама, трохі здагадалася. А тады гляджу, усе выходзяць, а вас няма. Бярыце мяне пад руку,— сказала яна,— не перажывайце, усё нармальна...

КАЛЯРОВЫ АЛОВАК

Памятаю, у «Узвышшы» я прачытаў аповесць Лукаша Калюгі «Ні госць ні гаспадар». Асабліва ўвагі мае гэтая аповесць не зачапіла. Была яна свежая па почырку, па рысунку, але прозвішча я сустрэў упершыню і падумаў, што за такі псеўданім схаваўся нехта з вядомых пісьменнікаў. Можа нават хто з маладнякоўцаў, каб у чужым часопісе не выступаць пад сваім прозвішчам. Занадта сталая рука адчувалася ў манеры пісьма.

Але праз год у тым жа «Узвышшы» паявілася аж чатыры апавяданні Лукаша Калюгі. А яшчэ праз трохі часу ў «Полымі» пачала друкавацца аповесць «Нядоля Заблоцкіх». І гэтае прозвішча, такое каларытнае, нечым вельмі тутэйшае, ні то лясное, ні то палявое, пачало мяне інтрыгаваць. Мне падабаўся гэты пісьменнік. Арыгінальны па стылі і самабытны. Глыбокі па роздуме, прычым роздум не наверсе ідэі, а недзе ў яе сутнасці, за тэкстам, як арганічны скутак тваіх адчуванняў. Культурны па мысленні і па філасофскай напоўненасці. Чараўнік па мове: так і бруіцца, так і зіхаціць яна ўсім багаццем народнай дасціпнасці. Усмешнік: не-не дый пакажацца яна, гэтая добрая ўсмешка, можа нават крыху хітраватая і таксама схаваная за тканінаю слоў.

— Хто такі ў вас Лукаш Калюга? — папытаўся я аднаго разу ў Кузьмы Чорнага.

— Пісьменнік,— адказаў ён, гэтым адным словам як бы вычэрпваючы ўсю характарыстыку. Але падумаў, дадаў:— І не абы-які пісьменнік, братачка. Богам дадзены талент. Як-небудзь я цябе пазнаёмлю, вы адразу з ім паразумеецеся, панечку мой.

Але пазнаёміў не ён. Недзе ўвосень 1932 года хмурнаватым днём я ціха брыў па вуліцы, кіруючыся ў кіно «Чырвоная Зорка». На рагу Савецкай і Ленінскай убачыў Заіра Азгура. Ён стаяў на крайку тратуара, моцна пастукваў кійком перад сабою і ў такт гэтаму пастукванню нешта горача тлумачыў высокаму, цыбатаму хлопцу. На хлопцу быў кароткі суконны курцік чорнага колеру і кепка з вельмі сплясканым верхам. Твар бледнаваты, з тонкім інтэлігентным профілем, вочы шэрыя з чутачку сінявым дымком, а губы ўвесь час як бы стрымліваюць трошкі скептычную ўсмешку.

— Знаёмся,— сказаў Азгур,— Лукаш Калюга.

У кіно я так і не пайшоў. Заведзеная Азгурам гаворка

перайшла і да нас. Як спраўдзіў Кузьма Чорны, мы тут жа паразумеліся. Галоўным чынам на тым, што яшчэ дрэнна пішам. Літаратура новага, вялікага часу, новых прастораў і далячыняў, як і сам час, яна шукае, у гэтых пошуках ёсць і ўдачы, і няўдачы. У аснову літаратуры трэба класці не здарэнне ці дробны факт, чым грэшыць большая частка маладой прозы, а грамадскую падзею, роздум, духоўны свет чалавека, яго інтэлект. Бо факт, выпадак — гэта адлюстровак аднаго дня, а не адлюстровак часу, эпохі. У такім прыблізна плане ішла наша гаворка. Мне яна імпанавала, бо я сам адчуваў, што ўсё, што раблю, трэба рабіць куды лепш.

Не скажу, што наша знаёмства перайшло ў сяброўства. Не, мы нават рэдка бачыліся. Сяды-тады, сустрэўшыся на вуліцы. Аднак жа кожная сустрэча была як бы працягам першай: яе хацелася чакаць. Плынь Калюгавай думкі заўсёды ішлася так, што ставіла або загадку, або антытэзу: трэба было пярэчыць. І манера гаворкі такая, што Калюга заўсёды нечага як бы недагаворваў, трымаў у запасе.

Бачыліся мы рэдка, мабыць, таму, што Калюга ніколі не бываў у Доме пісьменніка. Я думаў, што гэта ад залішняй сціпласці: чалавек ні з кім там не знаёмы, саромеецца. Аж аказалася зусім не тое.

— А што мне рабіць у тым вашым доме? Розуму ж там ні ад каго не набярэшся.

Гм... Ну што ж, характар у кожнага свой. І хто ведае, каму што памагае: самаўпэўненасць ці сціпласць. Кожны нешта думае і пра сябе, і пра другіх, дык што лепш: гаварыць ці маўчаць пра гэта? Новая Калюгава загадка.

Аднаго разу ён даў мне рукапіс свайго апавядання. Будзе час — прачытаеш. Ведама, я прачытаў яго таго ж вечара. Дасціпны майстар, жыццялюб, тонкі стыліст — усё калюгаўскае было ў тым апавяданні. І тая самая прыжмураная калюгаўская ўсмешка. Называлася яно «Цеснаватая куртачка».

Памятаю, я сказаў, што ў апавяданні не надта ўдалы канец. Ён цяжкаваты, загружаны манернай філасофіяй, не выцякае з сутнасці апавядання.

— Пагляджу, можа папраўлю, а можа і не,— як звычайна, загадкаю адказаў Калюга.

Здарылася так, што Калюгі я больш не ўбачыў. І «Цеснаватую куртачку» прачытаў больш як праз трыццаць гадоў. Выразаныя і сашчэпленыя старонкі з часо-

піса, пабытыя літаратурным архівам. Канец, вядома, той самы, я быў загадзя ўпэўнены, што так і будзе, бо ведаў, што Калюга слухаецца толькі свайго густу. Але па старонках заўзята і густа пахадзіў нечы каляровы аловак. У апавяданні хлопцы, падвыпіўшы, едуць сватацца, усю ноч блудзяць, не могуць папасці да маладой. Усё зроблена дзеля ўсмешкі, нават вёскі — Здарэнні і Анекдоты; нават конь, на якім едуць жаніхі, святочна-херувімскі — белы. У каляровым алоўку вельмі пазнаецца Бэнда.

І от прабег час і паставіў усё на месца. Нічога не страчана, усё зрабілася так, як трэба. Выходзіць Калюгава кніга, і я рад, што зноў сустрэнуся з ім.

БІЯГРАФІЯ

Вельмі хутка прыйшоў адказ на ліст, у якім я прасіў яго прысланы пра сябе сякія-такія весткі. Асноўныя этапы яго жыцця былі мне вядомы па нашай маладосці, але пасля таго прайшлі многія гады, і калі за іх нешта цікавае ці больш-менш важнае здарылася, то пра яго варта было ўспомніць: выдавецтва намервалася выдаць новы даведнік, у які было ўключана і яго імя.

— Дата нараджэння: 31 студзеня 1902 года, па новым стылі 13 лютага.

Я ведаў адну датклівую рысу яго характару: насцярожанасць да лёсу. Думалася, што нездарма ўпамянуты новы стыль, што зараз, праўдамі і няпраўдамі, за ўсю доўгую непрыветнасць свайго жыцця ён пачне наракаць на гэтую лічбу трынаццаць. Але ён сябе перасіліў.

— Вучоба: у 1925 годзе скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум. Два гады потым працаваў у Полацку (адзін год у Валынцах) настаўнікам, а першы год і загадчыкам аддзела ў газеце «Чырвоная Полаччына». Пісаў і друкаваў вершы і апавяданні пад псеўданімам С. Багун. У альманаху «Наддзвінне» змясціў апавяданне «Францішак Скарына».

Вось з гэтага часу я і памятаю яго. Я таксама працаваў у Полацку, у той жа газеце, годам пазней, разам з Броўкам. Часамі ён прыязджаў з тых сваіх Валынцоў у акруговы аддзел народнай асветы ці ў рэдакцыю, і гэта было добраю прычынаю, каб нам сабрацца ды пасядзець.

Ён ужо быў далёка вядомы: меў кніжку, выдадзеную ў «Маладняку» з аўтаравым партрэтам на белай, дубовымі галінкамі аздобленай вокладцы — «Першы паўстанак». Тую кніжку я чытаў, лежачы на верхнім палку ў вагоне па дарозе з Слуцка ў Расоны, пры агарку свечкі, што ўсю ноч капала ў закураным ліхтары. І, памятаю, увесь час дзівіўся ваяўніча абачлівай натуры Адама Залеса, якому ніяк не ўдавалася прымерацць сябе да рэвалюцыі. І вось ён, аўтар таго Адама Залеса, сядзеў і гаварыў з намі. Праўда, ён не любіў асабліва мірнай гаворкі, не прызнаючы за намі роўнага права разбірацца ў з'явах літаратуры.

Але нас гэта не надта і абыходзіла, мы прызнавалі за ім бясспрэчную зверхнасць старэйшага. Адзнакаю яго старэйшасці быў яго роўны, ціха настойлівы голас, сухі строгі твар з пільнымі цёмна-сінімі вачыма, гладка зачэсаныя на правы бок валасы, пад якімі ўжо тады, здавалася, прасвечвала лысіна.

Час і памяць не вельмі пагадняюць між сабою сваю работу: час усё мяняе, бязлітасна сцірае нават сляды ўчарашняга, а памяць толькі тыя сляды і зберагае. Толькі імі і жыве. І ўсё ж такі не ведаю, ці можна на яе паверыцца. Я, напрыклад, каб хто папытаўся, сказаў бы, што «Францішка Скарыну» ён друкаваў не ў «Наддзвінні», а ў «Маладняку». І што не пісаў ён вершаў і не было ў яго псеўданіма «Багун». І чаму ён не ўпамінае свае аповесці «Пільнікі»? Калі папраўдзе сказаць, то свае памяці варта найбольш асцерагацца. Мы любім чытаць чужыя ўспаміны можа таму, што ім таксама не вельмі верым.

— 1 верасня 1927 года паступіў на другі курс літаратурна-лінгвістычнага аддзялення Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Скончыў увесну 1930 года. У гэты ж час пісаў апавяданні і аповесці, друкаваўся ў «Маладняку». У 1930-м выдаў другі зборнік апавяданняў «Шляхамі навальніц». У «Маладняку» была змешчана мая аповесць «Чорны мост». 18 ліпеня таго ж года былі зроблены захады наконт майго новага месца жыцця...

Гэтая бяда напаткала тады не толькі яго. Але ўсё не верылася ў яе верагоднасць. Думалася, можа дзе паехаў — у госці, адпачываць — і скора вернецца. Але не вярнуўся. І гэта было аж вусцішна, бо калі мы сталі студэнтамі, наша становішча зблізіла нас. Мы нават падружыліся, калі сталі суседзямі па кватэрах; ён жыў у ціхім завулку за вакзалам, у пані Дыбзінскай. Пані Дыбзінская

была маладая ўдавіца з мяккім пышным воласам і ласкаваю даверлівасцю ў вачах, мела падлетка дачку, таксама ласкавую і пухлявую, нечым падобную на вярбовы каток, калі ўвесну ён укрываецца пухам. Дом быў ціхі, стаяў у глыбіні густога саду. У вузкім куткавым пакойчыку, які ён займаў, вечна панаваў халаднаваты змрок. Мабыць, ад халасцяцкага яго жыцця ў пакоі ўсё выглядала так, нібы пастаўлена выпадкова ці на пакуль што. Ложак з тонкіх металічных пруцікаў, з глыбока ўлежаным матрацам — засланы бегла. Падаконнік заняты бог ведае чым: эмаліраваная рудая конаўка з чайнаю лыжачкаю ўсярэдзіне, драбок счарсцвелага хлеба каля яе; разведзенае ў запас чарніла ў цёмнай высокай пляшцы, заткнёнай скручаным з паперы коркам; алавянага колеру спонкі на ланцужку. І абавязкова пляшачка адэкалону, гранёная, з тоўстага цьмянага шкла, з шэрым прыцёртым коркам — наводдаль, асобна: гаспадар любіў, наліўшы ў даланю, павесці ёю па твары, змачыць рэдкія, старанна і гладка зачэсаныя валасы.

На стале — даўнім, масіўным, з прысадзістымі тумбамі — ляжалі вузка нарэзаныя лісткі паперы, густа спісаныя дробным почыркам, па многу разоў перакрэсленыя, бязлітасна пакрэмзаныя; на палях, касяком і ўпоперак, напісаны новы тэкст: танюсенькія лініі паказваюць, куды ён павінен устаўляцца. Часамі яны ляжалі доўга, гэтыя лісткі, на іх пачыналі класціся знакі забытасці. Нешта рабілася з ім, здавалася, ён баіцца таго, што сам стварыў, запар па некалькі дзён ён не бываў дома. Сапраўднай творчасці, мабыць, і гэта патрэбна: перайсці цераз сумняванні. Пасля, выпетралы і пачарнелы, ён паяўляўся нарапкам, зноў прыкіпаў да стала і ўжо траціў адчуванне часу, перамешваючы дзень і ноч, зноў пісаў і перакрэсліваў, напаўняючы пакой сінім дымам і з рудое конаўкі пацягваючы густы ахаладзелы чай. Яго не было каму даглядаць, а пані Дыбдзінская сама шукала спагады.

— У 1936 годзе я прыязджаў у Мінск, але праз дваццаць чатыры гадзіны пакінуў радзіму. Жыў у Марыйскай і Чувашскай АССР і з 1937 г. перасяліўся ў Петрапаўлаўск Казахскай ССР. Выкладаў у сярэдніх школах і тэхнікумах нямецкую мову.

І тут я трошкі перапыню яго. Недзе ў тым жа 1936 годзе я атрымаў ад яго ліст. Невясёлы, поўны адчаю і душэўнага болю. У тым лісце ён скардзіўся на адзіноту і забытасць, параўноўваючы гэта з заўчасным скананнем,

бо наўрад ці ўдасца ўжо акрыяць, каб да прывычнай работы вярнуліся рукі. Я мала што разумеў у далёкіх і складаных тады акалічнасцях яго лёсу, не ведаў пра тыя яго дваццаць чатыры гадзіны і адказаў з бестурботнаю зухаватасцю: ты, бач, заўсёды любіў згушчаць фарбы, быў лёгкі на крыўды, а трэба ўмець паднявцца на вышыню часу і пакорна панесці нават ахвяры, калі яны патрэбны вялікім ідэям і справам.

Час не мае літасці нават да ідэалаў. Шмат чаго, зробленага калісьці з чыстаю душою, часамі не хочацца ўспамінаць. Не ведаю, ці патрэбны грахі, калі яны нават святыя.

— Як пачалася Вялікая Айчынная вайна, першы год я як настаўнік меў браню. Але ўжо 6 мая 1942 года мабілізаваны ў Чырвоную Армію... Наводчык мінамёта і ротны пісар. Пасля прарыву фронту мы рушылі к Бярэзіне. У бойках быў два разы кантужаны. На шчасце лёгка. Асколкам мне прагнула сталёвую каску, але я хутка апрытомнеў і з строю не выбыў. Пасля фарсіравання Бярэзіны рушылі на Чэрвень, Мінск, пад Баранавічы, Слонім... Беласток... Фарсіравалі рэчку Нараў, занялі плацдарм... Наскочылі на нас «тыгры». Папаў у палон. 29 красавіка 1945-га пад Берлінам з палону ўцёк. І адразу ж аўтамат у рукі... У сярэдзіне жніўня 1945-га быў дэмабілізаваны з Савецкай Арміі па гадах. З 1 верасня 1945-га пачаў працаваць у Петрапаўлаўску ў сярэдняй школе настаўнікам, а 18 ліпеня 1947-га дазнаўся, што «няправільна» ўцёк з палону... У 1956-м усё як след высветлена. Зноў пайшоў працаваць настаўнікам у сярэдніх школах.

Нічога гэтага я ўжо не ведаў. Я лічыў, што ён загінуў. Асабліва лёгка так магло стацца пры яго непадаткім характары. Але аднаго разу Рыгор Бярозкін перадаў мне ад яго прывітанне. Як? Адкуль? Яны недзе бегла бачыліся пасля вайны, у абодвух у іх былі свае «няправільнасці», за якія ім было нявесела, а цяпер сяды-тады яны перапісваюцца. Я адразу ж паслаў яму ліст. Ён быў вельмі рад, што не ўсімі забыты. Тым, хто жывы і хто яго памятае, перадаваў прывітанне.

— Пачаў хварэць на гіпертанію і стэнакардыю... І вось у 1964 годзе з сям'ёю з раёна пераехаў бліжэй да медыцыны — у Караганду. Адзін год працаваў, а потым цяжка захварэў, работу пакінуў і перайшоў на пенсію па старасці...

Эпічна, спакойна, як пра чужое жыццё. Памятаю, на першым часе нашае перапіскі я папытаўся, ці не думае ён

аднавіць у друку сваё імя: напісаць нешта новае, перагледзець ды перавыдаць старое. Ад перагляду старога ён тут жа адмовіўся: навошта яго пераглядаць, хіба тады я пісаў не так, як трэба? Але паслаў я яму яго ж апавяданне «Янка з Падлесся», перадрукаванае з колішніх выданняў на машынцы, збіраючыся ўключыць яго ў Антапогію. Ён здзівіўся: як многа чаго знайшлося паправіць. І паправіў.

І відаць, што гэтая работа была яму ў радасць, яна ўсхвалявала яго. Я быў упэўнены, што цяпер ён не астыне, што рукі самі папросяць работы. І праўда, ён пачаў пісаць аповесць, чарнавік яе ён прыслаў у «Полымя»,— тым самым дробным, крутым, мне добра вядомым почыркам. І аднак жа настае часіна, калі распараджацца сабою становіцца цяжка: давесці да ладу ён яе не паспеў.

— У 1968 годзе здарыўся прыступ інфаркту. Тры месяцы праляжаў у бальніцы і вось ужо цэлы год стараюся акрыяць... Часамі і выпіў бы, дык няможна...

Эпічна, спакойна, як пра чужое жыццё. А мне ўсё не верыцца, што гэта праўда. Усё здаецца, што ён той самы — малады, гардаваты і самаўпэўнены, і толькі хітруе. Ён і колісь умеў хітраваць: бывала, пра кожную яго новую рэч я дазнаваўся толькі пасля таго, як яна была надрукавана. І, бывала, заўсёды любіў ухапіць вокам яго кароткае тугое імя: Сымон Хурсік...

ПАДПРАЎЛЕНАЕ ПРОЗВІШЧА

Да арміі ў яго было прозвішча Баран. Дадому вярнуўся з новым канчаткам у ім — Баранаў. А калі стаў пісьменнікам, захацелася або вярнуцца да старога, або даць прозвішчу нейкую этнаграфічную акрасу.

Чамусьці пра гэтакі клопат ён захацеў параіцца са мною. Ведама, да старога прозвішча варочацца было нельга. Пачнуць зваць, як гэта скрозь заведзена,— Ба́ран, з націскам на першым складзе. А каму такая падробка патрэбна? Я стаў прыгадваць — як жа з прозвішчамі ды з мянушкамі абыходзяцца ў людзях?

У нас, у Труханавічах, быў вельмі маларослы чалавек Юрачка. Жонка ў яго, як на тое, была самаю высокаю жанчынаю, мабыць, на ўсім наваколлі. Бывала, у нядзе-

лю, калі ўсё сяло старэйшага веку богапашаноўна кіравалася на званы ў царкву, Юрачка з жонкаю стаяў у расчыненых варотах свайго двара, і кожны не мог, каб не зірнуць перш на жанчыну, што галавою траха не ўпіралася ў стрэшку над брамаю, а тады на мужчыну ў начышчаных ботах, у цёмна-сіняй шапцы, што стаяў недзе пры доле, ніжэй за локаць яе, паложанай на жывот, рукі. Няйначай як з-за гэтай мілай пацешнасці людзі далі ім сваё ласкавае празванне — Юрачкавы. І няйначай як з-за лагоды і любасці ў іхняй сям'і іх паважалі на сяле, і ніхто ніколі нават не падумаў, каб пасміхнуцца з іх.

Дык вось, у нас на сяле іх называлі толькі па мянушцы: Юрачкавы. У множным ліку. І гучала гэта так: «Да Юрачкавых госці прыехалі» або: «Юрачкавы ўжо адсеяліся».

Наш сусед меў прозвішча Рыжкоўскі, але людзі звалі яго Рыжок, а сям'ю — Рыжковы. І гаварылі: «У Рыжковых садрала ветрам страху». Другі наш сусед быў Бартошык, а людзі гаварылі: «Барташовы ў Слуцак паехалі», «Трэба пазычыць солі ў Барташовых».

Вось я і сказаў Сымону:

— Хіба ты забыўся, як у вас на сяле гавораць? Ты цяпер вучышся ў Мінску, а калі прыедзеш дадому, то суседзі скажуць: «У Якава Баранавых сын жа ў госці прыехаў». Так ці не? Гэта значыць, не хто прыехаў, а чый сын прыехаў. У аснове прозвішча ляжыць сям'я, гняздо, зборнасць, гурт. Адсюль ты і мяркуй, як табе пісацца.

Сымон падумаў, паўздыхаў, памеркаваў сам сабе.

— Кадук на цябе, мажа ты і праўду кажаш.

І ў друку паявілася прозвішча: Баранавых.

Праўда, мы тады не падумалі, што канструкцыя прозвішчаў з канчаткам на ых лічыцца сібірскай. Але ж у Сібір з'ехала нямала і нашых людзей, і ўсякая пераемнасць гаворыць і пра пэўную блізкасць. Вось жа па-нашаму сёлета, а па-сібірску сёгады.

То можа і з прозвішчам мы не нарабілі ніякае бяды.

ПАСЛЯ ДОЎГІХ РАЗЛУК СУСТРАКАЦЦА НЕ ТРЭБА

У свой час, памятаючы добрыя прыклады, мы з Пятром Багутам пакляліся: дзе б ні былі, як бы ні жылі, на якой бы рабоце ні рабілі, але роўна праз дзесяць гадоў у такі і такі дзень, у такі і такі час сустрэнемся ў Мінску на Пляцу Волі, як тады звалася Плошча Свабоды.

Вядома, наіўнасць ёсць наіўнасць. Ні праз якія дзесяць гадоў мы не сустрэліся, адзін пра аднаго нічога не ведалі і нават, мабыць, пачалі адзін аднаго забываць. Не, я ўспамінаў даволі часта, але проста як юначую незбытэчнасць. Студэнт апошняга курса універсітэта, трошкі спакушаны літаратураю, трошкі рамантык, трошкі адраджэнец, чысты і светлы юнак, улюбёны ў рэвалюцыю, у Леніна, у Расію. У Беларусь. Я любіў яго за гэтую чысціню ў дачыненні да самага святога — да Радзімы, вялікай і малой, як пра гэта пазней вельмі добра сказаў Аляксандр Твардоўскі. Сустрэліся мы з ім выпадкова, выпадкова рассталіся, прайшло не дзесяць, а больш за дваццаць гадоў пасля тае клятвы, і толькі чыстыя ўспаміны і асталіся.

І вось аднаго разу на званок у калідоры я адчыніў дзверы і атарапеў. Стаяў узмужнелы чалавек, з абветраным і строгім тварам, не той, а зусім іншы Пятро Багута. Вядома, былі рады сустрэчы, абняліся. Потым селі за стол, распілі пляшку віна, выйшаўшы ў калідор, Пятро выняў з кішэні свае курткі другую. Аказваецца, ён робіць на Барысаўшчыне, недзе па культурна-асветнай часці. Як вынік тае работы напісаў п'есу на антырэлігійную тэму. Не першую, сказаў Пятро, штукі тры ўжо недзе сушацца ў папках, яшчэ нікому не паказваныя, таксама на самыя пякучыя тэмы дня. Селі на канапу, пачыталі. Чытаў сам Пятро, робячы і свае паўзы, і націскі так, як гэта бачылася аўтару — і акалічнасці, і атмасфера, і вобразы. Я слухаў, глядзеў на яго, дзівячыся, як страшна кожнага з нас мяняе жыццё. Не толькі вонкава — з твару, з фігуры, а і духоўна — філасофію, светапогляд, манеры і прывычкі. Я глядзеў на незнаёмую мне агрубелую праставатасць, на разважлівую павольнасць, упэўненасць у інтанацыі і ўсё шукаў таго даўняга Пятра — непасрэднага, лірычна-ўзнёслага, нейкага западта раскрытага і мілага нават у сваёй неспрактыкаванасці.

— Ну, што скажаш? — папытаўся ён, зірнуўшы на мяне сваімі паўнаватымі, упэўнена цвёрдымі вачыма, ад-

кінуўшыся на спінку канапы.— Думаю схадзіць у ваш Дом народнай творчасці, пабачыцца з метадыстамі. Хачу паставіць, то можа яны параяць і на якіх сцэнах. Барацьба з рэлігіяй яшчэ не страціла свае актуальнасці, калі не пабольшала... А можа і ты маеш якія заўвагі?

Я сказаў, што п'есы пакуль што няма. Гэта яшчэ толькі тэма.

— Як так? — здзівіўся Пятро.

Найдалікатнейшым чынам я пастараўся сказаць, чаму гэтак думаю. У п'есе куды важней, як, скажам, у рамане ці ў іншым празаічным творы наогул, трэба, каб былі жывыя вобразы, праўдзівая атмасфера, верагодныя акалічнасці. І асабліва ў драматургіі — глыбокія чалавечыя канфлікты, бо без іх не выявяцца характары. Ды нават справа не ў гэтых стандартных прапісях, а ў тым, што літаратуру трэба рабіць так, каб ва ўсё, што ты робіш, верылася. У яго ж п'есе пакуль што ўсё ляжыць наверсе, загадзя відно, што ў ёй будзе рабіцца і чым яно скончыцца.

— Ну дык што?

Па тым, як цвёрда і строга паглядзеў на мяне Пятро, я зразумеў, што маіх меркаванняў ён не прымае. Мы пасядзелі з ім можа гадзіну, можа больш, то ад п'есы адыходзячы ў тэорыю, то варочаючыся назад да п'есы. Я адчуваў, што размова наша набывае ўсё больш вострыя формы, і нічога не мог паправіць. Мне здавалася, што нават дзеля колішняй нашай дружбы я не маю права гаварыць няпраўды.

Пятро пачаў хадзіць па пакоі. П'еса ляжала на стале, надрукаваная нястройнымі, featureзнастандартнымі літарамі райцэнтраўскай машынкі на лістках нестандартнай паперы.

— Ну што ж, дзякую,— сказаў Пятро, скручваючы лісткі ў трубку.— Зразумеў. Як след. Нават вельмі. Больш як трэба. Мы ж, вядома, глыбокая правінцыя. У літаратарах не ходзім, у творчым шаманстве не разбіраемся, не тое што ты, маэстра. Бачу, што стаў алімпійцам, табе цяпер давай толькі высокае мастацтва. І нават яшчэ больш: калі ад яго будзе несці мастацтвам дзеля мастацтва.

— Пятро, дарагі, пачакай...

— А барацьбу з апантаным цемрашальствам,— перапыніў мяне Пятро,— барацьбу з цемрашальствам сродкамі драмы,— а гэта іменна народная драма, калі хочаш,— ты называеш агіткаю. Ну і, вядома, калі агіткаю, то таннаю. Я не думаў, што ты так далёка зайшоў. Бывай здароў.

Ён пайшоў, паехаў на сваю Барысаўшчыну. Мне думалася, што ў гнявах ён доўга хадзіць не будзе, сам зразумее, што пагарачыўся, асабліва калі пераканаецца, што з п'есай і папраўдзе нічога не выйшла. Ён жа разумны, адукаваны чалавек, думаў я, і абавязкова вернецца, хоць бы дзеля таго нашага далёкага і чыстага юнацтва.

Але ён не прыйшоў, і я ўсё дакараю і дакараю сябе, што быў недалікатны, што як гаспадар не знайшоў такту пачакаць з сваімі меркаваннямі. Мы маглі пагаварыць аб гэтай датклівай старане эстэтычных катэгорый куды пазней, калі прыглядзеліся б адзін да аднаго і пабачылі, што сталі зусім не тымі, што былі.

Мне вельмі хочацца, каб ён усё ж зайшоў. Хоць бы нават дзеля таго, каб не думаць, што пасля доўгіх разлук сустракацца не трэба.

РУКІ НА КЛЯНОВЫМ ЛІСЦЕ

1

Койданаўскі тракт пачынаўся за Бетонным мастом. Цяпер гэта вуліца Чкалава.

Шкода, што мы, часамі, вельмі паспешліва з вуліц, гарадоў, паселішч сціраем знакі гісторыі. Я не супроць таго, што даюцца новыя назвы, якія ўвекавечваюць людзей і іх справы, але для новых назваў ёсць многа прастору: і новыя паселішчы, і новыя вуліцы або хоць старыя, але з выпадковымі назвамі, такімі, што нават не ведаеш, як яны маглі ўзяцца. Паселішчы, як і людзі, без біяграфіі не маюць свайго аблічча. Я не ўяўляю, напрыклад, Мінска без Нямігі. Здаецца, што нешта важнае адабралі ад яго, перайменаваўшы Лагойскі або хоць бы той жа Койданаўскі тракт, легенда пра які ўпіраецца ў век Залатой арды. Мне шкода, што знікла Траецкая гара, на якой дзень і ноч стаялі дазоры, ахоўваючы спакой старажытных мінчан. Што цяпер толькі старыя людзі памятаюць, дзе была Пярэспа, Старажоўка, Весялоўка, Ляхаўка, а яны ж гістарычна вызначалі характар раёнаў. Ходзяць чуткі, што нядоўга асталося жыць Даўгабродскай вуліцы, бо там даўно няма Доўгага броду, а ляжыць першакласная магістраль; што не будзе і Даўгінаўскага гасцінца, у які гэтак дзівосна ўплецена літаратурная дарога Змітрака Бядулі.

Я рад, што робяцца новыя гарады і новыя вуліцы, і засмучоны, калі назвы ім даюцца непрадумана. Ёсць у нас

два гарады з цудоўнымі паэтычнымі назвамі — Светлагорск і Салігорск, але я ўпэўнены, што іх хацелі назваць не гэтак. Іх хацелі назваць Светлаград і Саляград, ад самай звычайнай прыметы — горад, адкуль ідзе святло, горад, дзе здабываюць соль,— а назвалі ад другой прыметы — ад гор, а гэта ж няпраўда: абодва яны стаяць на раўніне...

Дык вось на Койданаўскім тракце, у першым дамку налева, жыў малады скульптар Заір Азгу́р. Домік стаяў за агародчыкам, сярод кустоў бэзу і кветак. Гаспадыня займала адну яго палавіну, Заір з сям'ёю другую: пакойчык і кухню. Сям'я была невялікая: ён сам, яго жонка Рыта, вельмі мілая, светлакудрая, нейкая ўся прасвечаная дабратою і праўдзівай ласкавасцю жанчына, артыстка Галубкоўскага тэатра, і зусім маленькі яшчэ сын Заірыт. Дарэчы, імя яго зроблена з двух: Заір і Рыты. Рыта загінула ў вайну.

Аднаго разу — Рыта з малым недзе пайшла, мабыць, да свае сястры Таццяны Шашалевіч, таксама артысткі,— мы з Заірам сядзелі ў яго дома і гаварылі пра мастацтва. Звычайна мы філасофствавалі і спрачаліся з ім да памарачэння галавы, па некалькі дзён запар. На гэты раз гаворка ішла мірна: мы дзівіліся на страшэнную архітэктурную веліч бальзакоўскай «Чалавечай камедыі».

— Трэба і ў скульптуры зрабіць такую галерэю вобразаў,— сказаў Азгур. У руках ён мяў пластылін і нешта ляпіў на фанернай дошчачцы, што ляжала ў яго на каленях.— Даць гісторыю Беларусі ў скульптурных вобразах. Пачынаючы ад Скарыны ці можа нават раней. А гісторыя ў нас багатая, толькі нікім яшчэ з мастакоў не пачапаная. Сымон Полацкі, Кірыла Тураўскі, Васіль Цяпінскі, Стахор, Будны, Багрым. А Кастусь Каліноўскі. А пасля дзевяцьсот пяты год. Алесь Савіцкі, Пуліхаў. Адзін Кастрычнік дасць якую галерэю. Ленін, без якога нямысліма рэвалюцыя, Маркс і Энгельс. А тады Алесь Чарвякоў, Жылуновіч, Адамовіч, Крыніцкі. А групавая кампазіцыя слуцкіх, дукорскіх ды козыраўскіх паўстанцаў. Я называю толькі тых, што ляжаць на паверхні памяці, а калі пагартаць кнігі...

Мне здалося, што я ўжо недзе чуў падобную гаворку. Ну, пэўна, іменна вось гэтую задачу ў літаратурным плане ставіў сабе Кузьма Чорны. Падабенства, аднак, мяне не здзівіла, бо я ведаў Азгураву натуру вандраваць па знаёмых і ад кожнага з іх нечага сабе набірацца. Значыць,

Чорны сваімі думкамі з ім падзяліўся. І я, ведама, падумаў, што тут ёсць проста паўтор добрага жэсту.

— На гэта, браце Заір, не хопіць чалавечага жыцця,— сказаў я.

— А я паспрабую! — нечакана ўпарта заявіў Азгур і з усёю табурэткаю павярнуўся да мяне.

Я зірнуў на яго і не на жарт здзівіўся, упершыню ўбачыўшы ў ім вельмі ўпартую сілу. Гэтая сіла была ў цяжкім навароце галавы на кароткай дужай шыі, у густой грыве смаліста-чорных валасоў, раскіданых, як у віхры, нават у шырокай чорнай істужцы, што замест гальштука была завязана пышным бантам, канцы якога лажыліся па камізэльцы на ўсю грудзіну, і ў адпушчаных пад Пушкіна бакенбардах. Невялічкую падробку пад Пушкіна я заўважаў і раней, але глядзеў на яе як на маладое дзівацтва. Цяпер жа мне здалося, што ў гэтым ёсць пэўная арыентацыя. Што ж, гэта не блага, сказаў я сабе.

Азгур варажыў над пластылінам, я хадзіў па пакоі. У адчыненае акно залятaлі пчолы, яны кружылі над букетам кветак, якія перад адыходам на стале паставіла Рыта. З агародчыка тугімі, густымі хвалямі ўліваўся млявы пах бэзу. На вуліцы стаяў бясконцы грукат: на сваіх біцюжных, прысадзістых конях, што саслізганымі падковамі з бруку выбівалі іскры, у цяжкіх фурах балаголы перавозілі лісты жалеза, цёмныя, іржавымі абручамі акаваныя бочкі, пустыя, звінючыя пляшкі, напакаваныя ў касабокіх скрыньках пад самае неба. Раз-пораз з недалёкае таварнае станцыі даносіліся дзяркатыя гудкі паравозаў.

Памаўчаўшы, кожны сам сабе абдумаўшы гэтакі нялёгкі праект, мы пачалі дапаўняць яго вобразамі з літаратурных твораў. Азгур пералічваў, што возьме з Янкі Купалы, Якуба Коласа — «Магіла льва», «Раскіданае гняздо», «Сымон-музыка», «Новая зямля», вобразы з якіх бачыліся вельмі скульптурна. Ну яшчэ Кузьма Чорны, бо ўжо тады нават першыя яго творы ішлі з глыбінь народнага лёсу.

— Ну як? — раптам папытаўся Азгур.

Я перастаў хадзіць і застыў, здзівіўшыся. На фанернай дошчачцы стаяла толькі што зляпленая фігура балагола. Такая яркая і жывая, што, здавалася, сапраўды я недзе бачыў гэтага чалавека. Няйначай як пасля вельмі добрай удачы ці можа пасля добрай чаркі, задраўшы голаў, падняўшы пугаўё і шырока раскінуўшы рукі, ён ішоў на прыгнутых п'янаватых нагах і вузенькімі шчылінкамі воч, разяўленым шчарбатым ротам, усімі маршчынамі твару,

чупрынаю, што вылезла з-пад збітай на патыліцу кепкі, і нават жыватом так заразліва смяяўся, што я сам разрагатаўся да слёз. І не паспеў я нарагатацца і нацешыцца, як Азгур стукнуў па ім кулаком, у адзін міг змясіўшы ў апрэснік усю гэтую іскрыстую чалавечую радасць.

— Што ты робіш! — крыкнуў я.

Мне было нядобра глядзець: нібы гэта жывога чалавека на вачахператварылі ў сплясканую бясформную масу. Здавалася, што такой фігуры больш не паўторыш, а яна ж магла ўвайсці найярчэйшым экспанатам у задуманую Азгурам галерэю.

2

Здарылася так, што я гадоў з дваццаць не бачыўся з Азгурам. Прайшла вайна, многа чаго перамянілася, не стала многа каго з сяброў. Сустрэўшыся, мы, ведама, прыглядаліся адзін да аднаго, стараючыся пазнаць, чым кожны стаў. Ён, мабыць, са шкадобаю думаў, што ў мне пісьменнік даўно скончыўся. Гэта трошкі бянтэжыла яго, і прывычную даўнюю шчырасць прыходзілася спалучаць з тактам. Я ж ведаў, што ён у вялікай славе, многа зрабіў і за гэта адзначаны людской і дзяржаўнай павагаю. Я баяўся, што такая рознасць у нечым пакажа сябе, але не пачуў гэтага. Сёе-тое, праўда, страцілася — непасрэднасць, ахвочая ўсмешка, бесклапотны жэст, але гэта лёгка можна было апраўдаць часам, калі мы не бачылі, як кожны з нас сам сабою мяняўся. І, прызнаюся, не без душэўнай трывогі я пайшоў у майстэрню да Азгура: там павінна быць тое святое святых, у якім выказваецца самы высокі дух чалавека.

Тое, што я ўбачыў, мяне ашаламіла. Мне здалося, што я зайшоў у залу, дзе сабраўся натоўп людзей самых нечаканых узростаў, нацый, настрояў, прафесій, адзення, жэстаў, пастаў. Адны — асілкі пад самую столь, другія — маленькія, як цацкі з-пад ног у Дзеда Мароза. Няйначай як у іх тут была вялікая бязладная гамонка ці нейкі невядомы рытуал, кожны рабіў што хацеў — палкаводцы аглядалі поле бітваў, кампазітары тварылі музыку, пісьменнікі і мысліцелі сядзелі ў задумных позах, маці калыхалі на руках дзяцей; нехта падымаў дырыжорскую палачку, у некага было гора, нехта адухоўлена марыў — і ўсе яны застылі ў тых позах, у якіх мы іх заспелі, адчыніўшы дзверы ў гэтую залу, напоўненую паўзмрокам ад іх

ценяў, ад заспакоенага гіпсавага пылу. Фігуры мясціліся на стэлажах уздоўж сцен, на падстаўках, у праходзе, на падаконніках, проста на падлозе, адны — белыя, як здані, другія — колеру стомленага, жаўтаватага або попельнага граніту. На самай сярэдзіне, на невялікім прагалку, на варштаце, збітым з абвапненых дошак, укрытая мокрым прасціradлам, высілася незакончаная фігура, доле ў кучы млела сырая гліна. Сям-там, па кутках і прагалках, ціснуліся і другія незакончаныя або кінутыя работы ці толькі эскізы да іх — тулава, ногі, галава — на гэта было няёмка, як бы грэшна, глядзець.

Пахла вапнаю, каменным друзам, нейкім пракаветным, застоеным нежытлом.

— Ну вось, аглядай,— сказаў Азгур.

Ён перш пачаў сам мне паказваць і тлумачыць замыслы, кампазіцыі, але ўгледзеў, што гэта мяне скоўвае, не дае дамысліць і пашукаць рашэння самому. Ён скінуў пінжак і, у камізэльцы, з такім жа самым шырокім бантам замест гальштука, з тою ж пышнаю шавялюраю, настаўбурчанаю і паблытанаю, як у віхры, толькі цяпер не чорнаю, а сіваю, нечым падобнаю на шэры граніт яго скульптур, сеў на табурэтку і пачаў, як некалі, варажыць над раскрытаю глінянаю фігураю, сям-там падмазваючы, сям-там раўняючы стэкаю, то падымаючыся і адыходзячы, то зноў прысаджваючыся на табурэтку.

Я доўга хадзіў ад стэлажа да стэлажа, ад групы да групы як заварожаны. Калі, думалася мне, у Азгура хапіла сілы і часу зрабіць усё гэта? Я не надаваў сур'ёзнага значэння таму даўняму Азгураваму паўтору бальзакоўскага воклічу: «Што не зроблена Напалеонам, у войнах, тое ў літаратуры зраблю я», з падменаю подзвігу ў літаратуры на подвіг у скульптуры, але бачыў, што юначы замысел Азгурам бадай што выкананы. Вось наша мінуўшчына: правадыры паўстанняў — Гаркуша, Стахор Мітковіч, Кастусь Каліноўскі; дзеячы асветнікі — Францішак Скарына, Васіль Цяпінскі; князі — Васілёк Мінскі і Уладзімір Полацкі. Вось мысліцелі, правадыры, дзяржаўныя дзеячы і рэвалюцыянеры — Маркс, Энгельс, Ленін, Чарнышэўскі, Дзяржынскі, Свярдлоў, Арджанікідзе. Вось пісьменнікі, пачынаючы ад Францішка Багушэвіча і канчаючы самымі маладымі сучаснікамі. Кампазітары, артысты, мастакі. Палкаводцы і партызаны, сталявары і даяркі.

Мне здалося, што ў майстэрні я прабыў увесь дзень, такі груз уражанняў лёг на мае плечы. А я ж ведаў, што

гэта толькі частка зробленага Азгурам: адны работы перададзены ў музеі, другія адліты ў помнікі, а многа загінула ў часе акупацыі Беларусі фашысцкімі дзікунамі. І многае знішчана самім Азгурам. Мне ўжо вядома была гісторыя, калі, паспрачаўшыся з Грубэ пра спосаб інтэрпрэтацыі вобразаў, Азгур прыйшоў у майстэрню, выставіў у рад і, як гаршкі, паразбіваў свае работы.

— Як жа ты мог асмеліцца на гэта? — папытаўся я.

— Ну як: пад гарачую руку. Ды можа і добра, што я іх паразбіваў.

Каб знішчыць сваю работу, мабыць, патрэбна такая ж сіла духу, як і на тое, каб зрабіць яе. Мне заўсёды здавалася, што маладушныя і нездары не здольныя на гэта.

Азгур ляпіў сваю гліняную жанчыну, забыўшыся на мяне, адказваў бадай што механічна. Адціснуты ўбок, на праходзе, на другім варштаце стаяў гатовы, мякка асветлены бюст Кузьмы Чорнага; успёршыся падбароддзем на летуценна пастаўленыя рукі, ён як бы сузіраў шляхі, па якіх разышліся яго героі.

Пасля я пачаў аглядаць закуткі, тое, што лічылася, мабыць, дапаможным, эскізным і стаяла ці ляжала абы-дзе. І вось каля самых дзвярэй, на палку за вёдрамі і швабраю, за рукамыйнікам, сярод чарапкоў і выпадковых накідаў, даўно забытых і ўкрытых замшэлым пылам, я ўгледзеў дзве рукі. Дзве кісці жаночых рук, вылепленыя з таніраванага гіпсу на танюсенькай, як кляновы ліст, пласцінцы. Я ўжо даўно быў стомлены, збіраўся адпачыць, але ўся стома адразу забылася. Рукі! Чые ж гэта рукі? Адна — гэта адразу было відно — пажылой жанчыны. Пальцы былі расслаблены, тон колеру такі жывы і мяккі, што, здавалася, на святле яны маглі прасвечвацца. Вось па гэтых жылках, па колеры і маршчынаватай скуры, па расслабленым дотыку да кляновага ліста, па нейкай вельмі жывой трапятлівасці мне здалося, што яны зараз падымуцца і пачнуць нешта рабіць. Па гэтых пальцах я бачыў самую жанчыну, усё ў ёй было: і матчына ласка, і цеплыня, і клопаты, у якіх яна жыла. Яна гадавала дзяцей, гэтымі пальцамі перадавала ім бясконцую трывогу і радасць свайго сэрца. Мне здалося, што яна была музыкантка, і калі нас не мала ў жыцці кранаалі мелодыі Бетховена, Баха, Моцарта, Грыга, калі мы пасцігалі разам з імі дух геніяў, дык гэта праз гэтыя пальцы. Хацелася прыпасці да іх шчакою.

А другая кісць зусім маладое жанчыны. Калі мы кахалі, калі самі шукалі кахання, калі тужылі нашы сэрцы,

дык гэта па іх, па дотыку гэтых рук. Калі мы цалавалі, дык цалавалі толькі гэтыя пальцы, вось такія ружова-празрыстыя, пяшчотна-ласкавыя і вечна падатлівыя. І вечна дужыя, бо гэта яны і нясуць нашу мару, і суцяшаюць у хвіліны няўдач ці адчаю, і робяць нас мужнымі. Усё ў іх, у гэтых руках,— і наша добрае сэрца, і замілаванасць у свет, у людзей, у заўтрашні дзень. З імі, з гэтымі рукамі, нам нічога не страшна, мы лічым сябе шчаслівымі, калі з імі праходзім да скону свайго жыцця. Хто яна, тая жанчына, што гэтак шчодра падаравала мастацтву свае рукі? Мне здавалася, што тую жанчыну я бачу і не магу адысці ад яе...

Мабыць, сонца павярнула з паўдня, у майстэрні пачалі блякнуць фарбы святла. Мы пасядзелі з Азгурам на табурэтках, мне было цяжка гаварыць — я яшчэ думаў. Як пасля вялікай дарогі, хацелася разабрацца, чым узбагаціла яна мяне. Азгур памыўся, пачаў апранацца. Я яшчэ раз абышоў усю майстэрню, і — не, мяне цягнулі да сябе тыя рукі. Я зноў суняўся каля іх...

— Ну, хадзем,— пазваў Азгур.

— Хадзем.

У скверы, што тут жа каля майстэрні працягнуўся на ўсёй Усходняй вуліцы, мы селі на лавачцы. Восень пачапала ўжо лісце — залацістае, жоўтае, часамі густа-чырвонае, яно млява трапяталася ў кронах, ападала на дол. Дзень ціхі, спакойны, чуць-чуць павявае халадок. Азгур зняў і палажыў на калені свой цёмна-шэры капялюш. У прагалінах між кустоўя бэзу, нізкіх падстрыжаных бардзюраў з язміну нам відна нізіна колішняга прыгарада, забудаваная новымі дамамі з чырвонымі дахамі, з антэнамі на іх. Расце і расце наш Мінск.

Азгур успомніў, як вярнуўся сюды пасля вайны ў салдацкіх ботах на яшчэ гарачыя папялішчы. Як застаў пустую майстэрню з павыбіванымі вокнамі, з паламанымі дзвярыма; па ёй гуляў вецер, лёталі вераб'і, на падлозе валяліся аскепкі ад бюста Змітрака Бядулі. Мяне здзівіла, як мог Азгур гаварыць пра гэта спакойна.

— А памятаеш, Заір, Койданаўскі тракт? — папытаўся я.— Нашы спрэчкі і твае планы?

— Ну, тады нам усё было лёгка. Мы ж былі юнакі.

Мне здалося, што гэта сказана хітравата, сказана няпраўда. Што Азгур адмаўляецца ад сябе толькі для прыклёпу. Ды гэта відно было і па агеньчыку, што весела ўспыхнуў у вачах, і па тым, як ён страсянуў чупрынаю —

упэўнена і ўпарта. Я б мог прачытаць сказанае інакш: «А што ж ты думаеш, тады гэта гаварылася на вецер? Не, браце, Азгур не такі чалавек».

Я так і сказаў яму: што ён хітруе. Бо сам ведае, што ім зроблена многа і па-грамадзянску высока. У тых юначых планах было багата наіўнасці, прыгожай, але ўтапічнай рамантыкі, псеўданародніцтва, а тое, што я бачыў,— гэта мужна, праўдзіва, сурова. І манументальна.

— Словам, Заір,— сказаў я,— я вельмі рады і па-чалавечы хораша зайздрошчу табе. Ты можаш шчасліва хадзіць па зямлі.

Азгур затрос сівою цяжкаю чупрынаю, трошкі ўвагнуўшы галаву, як бы дзякуючы за такую гаворку. І скупа, але таксама хітравата ўсміхнуўся. «А ты нічога новага мне і не сказаў,— як бы гаварыла гэтая ўсмешка.— Я сам добра ведаю ўсё тое, што ты гаворыш».

Ну і правільна, падумаў я. Так яно і павінна быць. Калі хочаш нечага дамагчыся, то будзь у сабе ўпэўнены.

3

Папраўдзе, гэты чалавек не ведаў стомы. Мала таго, што ён ляпіў, не вылазячы, здавалася, з майстэрні, дык ён паспяваў за дзень пабываць на сходах і пасяджэннях, у рэдакцыях газет і часопісаў, сустрэцца з сябрамі і нагаварыцца з імі, кожны раз пакінуўшы пасля сябе адчуванне буры, да таго неспакойны і настойлівы быў дух яго праяўлення. І паспяваў яшчэ пісаць.

Паспяваў ён пабачыцца і са мною. Ці на рабоце, ці на вуліцы, а часамі мы бывалі адзін у аднаго і дома. І вось, паявіўшыся неўзаметку, сцішка, усё больш і больш мяне пачынала трывожыць адчуванне нейкай няёмкасці. Як бы ў нашых адносінах нешта расло непатрэбнае, чужое. Як бы я павінен быў у нечым сазнацца перад Азгурам, але не адважваўся і ад гэтага адчуваў сябе вінаватым. Што гэта, пытаўся я ў самога сябе,— іншыя схільнасці і іншыя густы, якія прыйшлі к нам з гадамі, і мы цяпер стараемся маўчаць пра іх, каб не псаваць сяброўства? Але не, гэтага не было: не насароме́ўся ж я сказаць яму, што праект помніка Якубу Коласу мне не падабаецца. Што ў помніку з вобразам чарадзея нашай зямлі не хоча ставацца дэкарацыйнасць. Што натуралістычны камень-валун, на якім ён сядзіць, робіць Коласа штучным, бо так і відно, што не сам ён туды залез, а яго пасадзілі, і яму

там сядзець нязручна. Гавару пра першы варыянт, нават пра першыя накіды яго.

Дык у чым жа была прычына трывогі і неспакою?

Аднаго разу я праглядаў мастацкія альбомы, адгарнуў старонку з рэпрадукцыяй Ганса Гольбейна-малодшага «Труп Хрыста» і жахнуўся. Якая страшная сіла! На карціну нельга глядзець і нельга ад яе адарвацца. Яна гіпнатызавала. Не ведаю, чаму іменна цяпер мяне асабліва ўразіла гэтая карціна. Хрыстос ляжыць, толькі што зняты з крыжа, зусім не бог, а зямны, спакутаваны чалавек. І гэтаю пакутаю ўсё крычыць — выпучаныя грудзі, сухія рукі, адкінутая нежывая галава з выстаўленай угору рэдзенькай барадой, з раскіданымі валасамі, нема разяўленым ротам, расшыранымі ноздрамі, з застылымі, закочанымі пад павекі вачыма. Усё гэта ў перабольшаных формах, так, каб глядзеліся пакуты не Хрыстовы, а — людскія, цэлага народа, цэлай вечнасці, усяе зямлі. І каб, гледзячы на гэтую карціну, ні ў кога ў душы не асталося бога, а толькі боль па чалавеку, на долю якога выпала несці крыж сусветнай людской неўладкаванасці.

Я загарнуў карціну і не даў веры, што на душы ў мяне стала так лёгка і ясна. Я зразумеў, чаго не мог сказаць Азгуру. Да гэтага часу я дзівіўся працавітасці, вялікай велічы таго, што зроблена, мужным формам, яснаму зроку мастака, артыстызму, з якім выканана кожная драбніца, і не ведаў, што гэтага мала. Усё гэта дзівіла і захапляла, а хацелася трошкі больш: прастору для роздуму і хвалявання. Як ад карціны Гольбейна «Труп Хрыста», як ад радэнаўскага «Мысліцеля» ці «Грамадзян Калэ». Ці хоць бы як ад тых рук, ад якіх я так доўга не мог адарвацца...

ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ РЭВІЗІЯ

1

У свой час я працаваў рэвізорам КРУ і аднойчы атрымаў заданне абрэвізаваць адно даволі буйное прадпрыемства. Калі сказаць праўду, я быў рад, што іменна мне на долю выпаў гэты аб'ект. Завод гадоў два не правяраўся, дырэктар меў славу рызыкоўнага чалавека, якому, як ка-

жуць, законы не пісаны, а галоўны бухгалтар быў зняты за патуранне і бескантрольнасць. Дзейнасць новага бухгалтара не правяралася, і, вядома, маглі быць усякія нечаканасці.

Бяру пасведчанне, складаю ў партфель свае няхітрыя рэвізорскія пажыткі — паперу, карандашы, сякія-такія інструкцыі, мыльніцу, ручнік і — у дарогу.

На заводзе заяўляюся зранку, гадзіне а дзесятай. Афарміў паўнамоцтвы, зайшоў да галоўнага бухгалтара. Сярэдніх гадоў чалавек, невысокі, малагаваркі, быстры на вока. Собіч.

— Што ж, калі ласка,— сказаў ён, прыняўшы мяне як звычайнага наведніка, без ніякага ўзрушэння.— Марына Барысаўна! — гукнуў у прачыненыя дзверы.

Увайшла Марына, прыгожая маладая жанчына, і недаверліва зірнула на мяне.

— Будзьце ласкавы, падрыхтуйце таварышу рэвізору месца,— распарадзіўся ён.— І памажыце арганізаваць работу. Усе дакументы, любыя звесткі каб былі ў таварыша рэвізора пад рукамі. Калі трэба — парабіць выбаркі.

— Добра,— не адразу, як бы нешта прыкідваючы, сказала Марына і выйшла.

Тое, што намеснікам у галоўбуха была вось такая прыкметная жанчына, мне не зусім спадабалася. Здалося, што нездарма яна разгублена выслухоўвала распараджэнні, а пасля так скоранька выйшла: можа, каб нешта хутчэй там прывесці да ладу. А залішняя спакойнасць і дзелавітасць галоўнага выглядала ненатуральна.

«Цікава, як яно пойдзе далей»,— падахвоціў я сябе і тут жа ўзяўся за рэвізію.

— Пачнём з касы,— сказаў я.

Звычайна з касы пачынаецца ўсякая рэвізія.

2

Нам, рэвізорам, уласцівы свае прафесійныя слабасці. Першая слабасць, гэта калі мы едзем куды на рэвізію, то ўжо загадзя лічым сябе вышэй за таго, каго будзем правяраць. З'ява прыкрая, і прызнавацца не вельмі прыемна. Бухгалтар вытворчасці — гэта ўсё-такі камандзір. І камандзір даволі адказнай справы. На вытворчасці часта трапляеш у такія абставіны, што прыняць тое ці іншае рашэнне бывае цяжка, а прымаць яго трэба неадкладна. Бухгалтар павінен быць адначасова і кіраўніком, і фінан-

сістам, і юрыстам, і гаспадарнікам, і — прадстаўніком дзяржаўнага кантролю. Як бачыце, сутыкаюцца нават супярэчлівыя лініі, асабліва гаспадарніка і — дзяржкантролю.

Другая слабасць мае яшчэ больш далікатную ўласцівасць. Рэч у тым, што шмат хто з нас лічыць, што бадай кожны бухгалтар, якога мы едзем правяраць, хоць у нейкай ступені, а — шэльма ці прайдзісвет. Па-абывацельску мы часта спускаемся да разважанняў, што калі чалавек блізка стаіць да каштоўнасцей, калі праз яго рукі праходзіць безліч грошай, калі ў гэтых руках сабраны ўсе фінансавыя спляценні, то не можа быць, каб да іх чаго-небудзь ды не прыстала.

Прыблізна такіх поглядаў у той час трымаўся і я. Калі я пачынаў рэвізаваць, то быў загадзя ўпэўнены, што добра пераплеценыя і пакладаныя на палічках у шафах дакументы выглядаюць хораша і тояць спакой і цішыню да таго часу, пакуль іх не кранеш. Варта ж умеючы перагартаць ды прачытаць іх, як яны загавораць, ды яшчэ і як загавораць.

Рэвізія касы дала поўны парадак. Так таму і належала быць. Вельмі рэдка трапляюцца авантурысты, каб рабіць вялікае шальмоўства ў касе: там мала прастору. Зараз жа за гэтым я праверыў аперацыі з банкам. Тут поле дзейнасці бывае на вялікія дзесяткі, а то і на сотні тысяч рублёў. Давялося да ўсяго пільна прыгледзецца, прасачыць запісы і нарэшце схадзіць у банк, каб стыкнуць банкаўскія, ці, як кажуць, кантакарэнтныя выпіскі. І тут было ўсё спакойна.

Пасля беглага агляду штатнай дысцыпліны, каштарысаў пачалося тое, што ў поўным сэнсе называецца дакументальнай рэвізіяй. Трэба было браць том за томам акуратна пераплеценых дакументаў і — праводка за праводкаю, паперка за паперкаю — перагортваць, на кожнай спыняючыся, ад кожнай чакаючы ўсякай неспадзяванасці. Кожная паперка адлюстроўвае нейкую гаспадарчую, вытворчую ці фінансавую з'яву. А трэба паглядзець, ці з'яўляецца аперацыя законнай, ці аформлена яна ў адпаведнасці з юрыдычнымі нормамі. Ну і, вядома, гэта ўжо найпершая рэвізорская задача — паглядзець, ці няма дзе злоўжыванняў, а проста кажучы — шальмоўства.

Кожны дзень Марына кладзе мне на стол новы стос пераплеценых дакументаў. Я гартаю іх адзін за адным, усе заўвагі занатоўваючы ў свой рэвізорскі сшытак. Так ідзе

дзень за днём, я адкладваю том за томам. Не падабаецца мне, што ні ў чым я не магу знайсці больш-менш сур'ёзнай правінкі. І больш за ўсё не падабаецца, што я не веру ў гэта. Я глыбока перакананы, што грахоў тут безліч, я толькі не магу наткнуцца на іх. Ці не надта бегла я перагортваю гэтыя тамы?

Ведаючы, што часамі бываюць злоўжыванні ў дэпаненцкіх выплатах, я прашу даць мне выплатныя дакументы за два гады.

— Яны ж прайшлі рэвізію, таварыш рэвізор,— здзівілася Марына.

— Усё роўна, я прашу — дайце мне іх.

Марына пацiснула плячыма, але паднялася і пайшла. Хвілін праз колькі яна палажыла мне на стол новы стос тамоў, укрытых пылам. Я бачыў яе зграбныя рукі, а лёгкі, ледзьве чутны пах яе духоў да таго агортваў хваляваннем, што ў мяне кружылася галава. Не да твару рэвізору лірычныя адхіленні, але скажу, што я спужаўся ўсяе гэтае вабнасці. Я баяўся, каб Марына не пашкодзіла мне ў рабоце, не парушыла мае пільнасці.

— Нічога ў вас не выйдзе, таварыш рэвізор,— насмешліва сказала яна, адгадаўшы мае думкі.

— Дай божа.

— Доўга вы яшчэ будзеце нас мучыць? — папыталася яна, усё трымаючы свае зграбныя рукі на запыленых тамах.

— А пакуль не закончу.

— Гэта залежыць ад вас.

— Найбольш ад вас,— адказаў я, даючы зразумець, што яшчэ невядома, што пакажа рэвізія.

— Лядайкая ў вас работа,— заключыла Марына.— Усякаму трэба не верыць, ва ўсім бачыць шальмоўства. Так можна дайсці да таго, што чалавека трэба проста не любіць.

3

А між тым ішоў дзесяты дзень, і нічога таго, што вельмі варта было б рэвізорскае ўвагі, я не знаходзіў. Ну, усялякая драбяза, накшталт таго, што па авансавай справаздачы куплена ў краме тавару больш як на дваццаць рублёў ці, скажам, што ў рабочым нарадзе не прастаўлены параграф расцэнак. Я пачаў траціць надзею на поспех свае работы. То мне здавалася, што я маю справу з надта

хітрымі і лоўкімі прайдзісветамі і тут усё так добра і глыбока закопана, што я не маю сілы знайсці. То, наадварот, што я трапіў на такое прадпрыемства, на якім, можна сказаць, усё ідэальна. І ў бухгалтарскім уліку поўны парадак, і дакументальная дысцыпліна добрая, і поўны ажур у запісах, і прыемная спрацаванасць у рабоце. Што тут свой стыль, свая высокая школа.

Мне прыгадалася, як у самым пачатку мяне хвалявалі дачыненні дырэктара і галоўбуха. Мне тады здаліся яны вельмі лагодныя. А вядома ж, што ў большасці выпадкаў яны бываюць наадварот — напружаныя. Мне захацелася гэта праверыць. Я ведаў, што пры першым зручным выпадку дырэктар абавязкова скажа: ат, справы не важныя — бухгалтар у мяне не надта складны. Як кажа народная прымаўка: што каму рупіць, той тое й жупіць. Я пайшоў да дырэктара.

Якраз у дырэктара сядзеў начальнік аддзела забеспячэння і скардзіўся на галоўбуха за самаўпраўства. Гэта была самая найлепшая сітуацыя. Начальнік аддзела забеспячэння нейкай арганізацыі адпусціў сорак дзевяць кубаметраў кіслароду па сваёй волі, без візы бухгалтэрыі якраз у той час, калі гэтая арганізацыя мела ўжо запазычанасць. За гэты водпуск, з усімі накладнымі выдаткамі, галоўбух зрабіў налічэнне начальніку аддзела забеспячэння. Даволі строгая аперацыя.

— Значыць, вы лічыце, што налічэнне зроблена няправільна? — папытаўся дырэктар.— Што яно зроблена незаконна?

— Ну, вядома. Тады выходзіць, што мне і начальнікам быць не трэба, калі ў сваёй справе я не магу распарадзіцца. У мяне ж таксама ёсць меркаванні, бо тут жа не асабістая якая карысць, а я гляджу крыху глыбей. Нам гэты заводзік яшчэ не раз спатрэбіцца.

— Спатрэбіцца... гм,— падумаў дырэктар.— Усё гэта правільна, таварыш Галецкі,— сказаў дырэктар,— але ж і Собіч зрабіў правільна. Так мы пакуль што і пакінем гэта. А калі вы хочаце, каб з вас налічэнне знялі, то зрабіце так, каб гэты заводзік, як вы кажаце, найхутчэй сплаціў сваю запазычанасць. Каб на канец месяца ён не матляўся як дэбітор. От і ўсё. А каб вы маглі арыентавацца і надалей, то ведайце, што распараджэнні галоўнага бухгалтара — гэта тое самае, што і мае распараджэнні.

Больш мне нічога і не трэба было. Гэтай чужой размове я быў рад, як сваёй удачы.

4

На пятнаццаты дзень я напісаў акт рэвізіі. Ніякага крыміналу я, вядома, не знайшоў, але пастараўся, каб голас мой быў аўтарытэтны. У нас жа таксама ёсць свой апломб. Не можа быць, каб рэвізор нічога не знайшоў, і няма такога прадпрыемства, пра якое нельга было б скласці акта. А, як вядома, пра кожную рэч можна гаварыць розным голасам.

Схему акта я вытрымаў як найлепш, як таго патрабуюць усе правілы рэвізорскай тэхнікі. Тут быў і ўсебаковы агляд, і аналіз гаспадарчай і фінансавай дзейнасці, і вывады, і прапановы. Усё, вядома, ілюстравалася выбаркамі, табліцамі, параўнаннямі з нормамі, словам, мне здавалася, што сваю справаздачу я зрабіў з самай першакласнай рэвізорскай дакладнасцю.

Адзначыўшы, што злоўжыванняў не знойдзена, я грунтоўна націснуў на парушэнне касавай і фінансавай дысцыпліны, звярнуў увагу на сякія-такія выпадкі недагляду, патворства.

Сваёй работай я быў давольны. Было прыемна ўсведамляць, што ў ранейшых падазрэннях я памыліўся. Мне здавалася, што сваім актам я не парушаю добрай славы прадпрыемства і яшчэ больш умацоўваю Собічаў аўтарытэт. Не важна, што я адзначаю некаторыя другарадныя недахопы: Собіч павінен зразумець гэта як чыста прафесійную неабходнасць мае місіі. І яшчэ, калі я спрабаваў разабрацца, чаму мне было прыемна, то перад сабою бачыў Марыну. Чамусьці мне не хацелася, каб яна думала пра мяне нядобра.

Звычайна пасля абеду Собіч гадзіны дзве аддаваў вытворчасці. Абавязкова кожны дзень ён бываў, як кажуць, на тэрыторыі, як бы ён быў не галоўным бухгалтарам, а галоўным інжынерам. Спачатку мяне гэта абурала, і я запісаў заўвагу ў свой рэвізорскі сшытак, як факт парушэння працоўнага распарадку дня. Але скора зразумеў, што гэта давала яму перавагу, якой да гэтага часу я не бачыў ні ў аднаго работніка яго прафесіі: ён ведаў вытворчасць як найлепшы гаспадар і свой аддзел з пасіўнага адлюстравальніка падзей ператварыў у актыўнага ўдзельніка вытворчасці.

Я ўпершыню ўбачыў, што бухгалтэрыя непасрэдна ўдзельнічае ў жыцці прадпрыемства, і адзначыў гэта як наватарства.

Каб не траціць марна часу, я не стаў чакаць Собіча з яго вытворчай пагулянкі, а пайшоў адразу да дырэктара. Пасля звычайных у такім разе размоў: — Ну, як справы? Скончылі? Многа напісалі на нас? — дырэктар уважліва прачытаў акт і, ні слова не кажучы, выняў сваю самапіску і падпісаў.

— Ад праўды нікуды не дзенешся,— сказаў ён,— а без грахоў ніяк не выходзіць. Ну, але добра, што праверылі нарэшце. А то — так даўно нас не рэвізавалі, што аж неспакойна было на душы.

З лёгкім сэрцам я пайшоў да Собіча.

5

От тут мяне і напаткала нечаканасць. Прачытаў акт Собіч, паглядзеў на мяне, падумаў крыху дый кажа:

— Не буду я падпісваць вашага акта.

Я аслупянеў:

— Чаму?

— Не буду. Лічу, што ваш акт няправільны.

— Дазвольце, дырэктар жа падпісаў.

— Ну што ж — яго права. А я падпісваць не буду.

— З чым жа вы не згодны? — пытаюся я.

— З усім згодзен. Тое, што вы напісалі,— усё правільна: і парушэнні, і незаконна — усё на месцы. Але ў вашым акце няма адной, самай неабходнай драбніцы: не сказана, чаму гэта зроблена — ці то гэта наша нядбайнасць, ці то вытворчая неабходнасць. А гэта рэчы істотна розныя, і без гэтага ваш акт не поўны. Ён няправільна арыентуе.

— Дазвольце, дык рэвізія і не ставіць такой мэты.

— От у гэтым і ўся бяда. А трэба, каб абавязкова паставіла.

— Схема рэвізіі не патрабуе такога аналізу.

— Якраз от у гэтым я карэнным чынам і не згодзен з метадамі рэвізій: вы канстатуеце, а тлумачыць і аналізаваць баіцеся, бо не хочаце браць на сябе адказнасці.

Мне здавалася, што такой сваёй гаворкай Собіч адводзіць справу ўбок, абыходзіць нейкія законы.

— Бачыце, усе законы...

— Законы адны,— перабіў мяне Собіч,— як для вас, так і для нас. Мы ж таксама добра ведаем іх і імі кіруемся. І аднак жа выкананне аднаго і таго ж закону ставіць нас з вамі на розныя пазіцыі.

— Не разумею вас.

— Вось вам прыклад з вашага ж акта. Вы пішаце, што мы незаконна звыдаткавалі з касы грошы, купіўшы сена на старане.

— Правільна.

— Але вы не сказалі, якія прычыны выклікалі такую неабходнасць, і не далі сваё ацэнкі як дзяржаўны чалавек. Бо тое, што грошы скарыстаны не з тае кішэні,— гэта фармальная старана, а тое, на што яны скарыстаны ці чаму скарыстаны,— больш важная старана. Галоўная старана.

— Навошта ж займацца гэтым рэвізору?

— Ды проста таму, што вы не маеце права пісаць у акт таго, у чым самі не разабраліся і на што не маеце свае думкі.

— Я запісаў факт.

— Не, вы запісалі толькі адну яго старану. Вось слухайце.— Собіч зірнуў быў у акт, але тут жа адсунуў яго.— Па характару вытворчасці наша прадпрыемства павінна мець жывую цяглавую сілу, скажам, чатыры галавы коней. Як і належыць, па-гаспадарску, з самае восені мы забяспечылі сябе фуражом на гэтае пагалоўе: і аўсом, і сенам. Здавалася б — нармальна.

— Нармальна.

— І от уявіце сабе: у пачатку зімы трэст перадае нам, скажам, яшчэ чатыры галавы. Ясна, што ў такім выпадку фуражу на вясну нам ужо не хопіць. І па дзяржаўнай лініі мы яго таксама дастаць цяпер не можам. Коні пачынаюць прападаць. Што вы тут будзеце рабіць, таварыш рэвізор, калі на хвілінку перастанеце быць фармалістам?

Доўга не думаючы, я адказаў, што гэта справа далёка не бухгалтара і няхай пра гэта думае той, каму належыць. Хто ў гэтым вінаваты.

— Словам — мая хата з краю. Самы бяздушны бюракратызм. Няхай гіне дабро, а вы пільнуецеся літары закону. А я палічыў, што якраз гэта можа быць злачынствам, і даў дазвол на дзве тысячы рублёў, каб выратаваць пагалоўе. Правільнае было маё распараджэнне?

Прызнацца, я адчуваў, што Собіч усё-такі ў нечым мае рацыю. Але такая пастаноўка пытання была мне да таго новая, што я яшчэ не паспеў як след разабрацца ў ёй. Я толькі ведаў, што мне, як рэвізору, пагадзіцца з гэтым нельга.

— Другі факт таксама варты таго, каб яго прааналізаваць,— далей гаварыў Собіч.— Вы адзначаеце як пахвалу,

што за апошні час мы маем вялікія поспехі: сістэматычна перавыконваем планы і нават зніжаем сабекошт прадукцыі. Павучальным жа ў гэтым факце можа быць тое, што якраз інтарэсы вытворчасці вымусілі нас недаздаць выручкі ў дзяржаўны банк.

— Якім жа гэта чынам?

— Мы былі перад такімі дзікімі пагрозамі, што фармальны момант не прыходзілася браць да ўвагі. Выратаваць нас мог толькі неадкладны аварыйны рамонт.

Увайшла Марына. Відаць было, што наша гаворка не толькі цікавіла яе, а хвалявала. Палажыўшы перад Собічам дакументы на подпіс, яна пастаяла і звярнулася да мяне:

— Можа, каб вы трошкі больш любілі вытворчасць, то маглі б ведаць, што нам таксама бывае цяжкавата,— сказала яна.— Рамонт аварыйны, а матэрыялаў няма. Калі чакаць іх па планавай лініі, то гэта будзе не надта скора, а чакаць нельга. От як тут зрабіць? — глядзела яна на мяне дапытліва.

Што мне было ёй сказаць? Лепш бы яна не заходзіла. Лепш бы не пыталася і не глядзела такімі добрымі і яснымі вачыма. Але я ведаў, што зайшла яна знарок, каб памагчы тут Собічу. Яна як бы адчувала, што мне будзе цяжка не паслухаць яе.

— Вас павінны цікавіць толькі законы,— аднак суха сказаў я.

— Законы дзяржаўнай мэтазгоднасці і дзяржаўнага сэнсу,— горача запярэчыў Собіч.— Фігуруючы законамі, вы абыходзіце іх, не заўважаючы нават, што пачынаеце тармазіць, губіць жывую справу. Занадта на розных адлегласцях стаім мы ад вытворчасці, таварыш рэвізор.

Ад хвалявання Собіч пашукаў папярос.

— От таму я і не хачу падпісваць вашага акта. Каб, можа, хоць гэтым прымусіць вашых кіраўнікоў наверсе нарэшце задумацца над тым, што даўно пара навучыцца паважаць агульную справу і хвалявацца,— горача і гнеўна скончыў Собіч.

— У гэтым ваша нязгода? Яна вельмі нязначная, каб надаваць ёй такое прынцыповае значэнне.

— Вельмі значная! — уздыхнуў Собіч.— У ёй жа ўся сутнасць, удумайцеся толькі. Я, напрыклад, як галоўны бухгалтар павінен ведаць ваша дакладнае азначэнне: злачынствам ці не злачынствам трэба лічыць тое, што вы запісалі ў акт. Гэта яснасць мне неабходна. Яна неабходна

таксама і вам, а яе ў вас няма. Без гэтага вы не маеце права ацэньваць нашай работы.

Пакуль у нас ішла ўся гэта гаворка, я быў упэўнены, што гэта проста звычайная палеміка, якая часамі бывае ў такіх выпадках, і што пасля яе Собіч усё роўна падпіша акт. Фармальна ў яго не было права не падпісаць яго, ды, уласна, у нашай справе гэта асаблівага значэння і не мае. Але ўсё ж адразу я адчуў сур'ёзнасць і недарэчнасць свайго становішча: гэта падрывала аўтарытэт мае справы. Прывезці і падаць свайму начальніку знясл аўлены акт? Якая ж цана маёй рэвізіі і што за рэвізор з мяне! Злосць мяне ўзяла і абурэнне. Падумаеш, фігура якая, тэарэтык новы знайшоўся. Не, мала-такі я наскроб на яго ў сваім акце! Падалікатнічаў.

— Не думаю, каб вас гэта магло выручыць,— рэзка сказаў я.— Мабыць, прыйдзецца прысл аць да вас комплексную рэвізію, акт якой вы нарэшце прызнаеце,— сказаў я, ледзь не задыхаючыся, але ўсё ж як мага спакайней.

Не развітаўшыся, я выйшаў з кабінета. Марыны ўжо тут не было. Я сустрэўся з яе вачыма, калі праходзіў праз бухгалтэрыю. Мне здалося, што вочы яе гаварылі: «Як шкода, што так недарэчна выйшла. От мы больш і не пабачымся з вамі. Але ж у гэтым вінаваты не мы. Толькі вы вінаваты ў гэтым...»

6

Вось і канец усяе гісторыі. Толькі канец нечаканы. Начальству свайму я здаў акт. Праз дзён колькі прыйшлі і «Заўвагі да акта рэвізіі» ад Собіча, у якіх ён выказаў свае погляды і на акт, і на метады рэвізіі яшчэ больш смела. Начальніка рэвізійнага аддзела ўсё гэта ані кропелькі не кранула, ён астаўся незадаволены толькі мною.

— Як жа вы маглі дапусціць, каб і акт знясл авілі, ды яшчэ і трактаты пісалі? Панібрацтва, мабыць, завялі там. Ваша ж рэвізія не мае ніякага аўтарытэту,— дакараў мяне мой начальнік.

І тут я зразумеў, што абараняцца ад гэтага магу толькі з пазіцый Собіча. Тое, што мой начальнік нават не захацеў звярнуць увагі на чужыя думкі і хваляванні, аж пакрыўдзіла мяне. Я з абурэннем заявіў, што мы не маем права не прыслухоўвацца да людзей, штоператвараемся ў бюракратаў і бяздушных фармалістаў, што метады нашых рэвізій даўно састарэлі і самі мы даўно адсталі ад таго, ча-

му навучыліся і чаго дамагліся добрыя людзі, што мы ўпарта не хочам быць разам з наватарамі.

Словам, я паўтарыў Собічавы думкі і быў прыемна здзіўлены, што паўтарыў іх ад душы, як свае.

Мяне чакала новая камандзіроўка, але я адмовіўся ад яе. Я падаў заяву з просьбай вызваліць мяне ад работы рэвізора ў сувязі з тым, што думаю перамяніць профіль свае спецыяльнасці, наблізіўшы яе да вытворчасці. Не таму, што я раптам разлюбіў сваю работу ці яна мне здалася нікчэмнаю, не — работа ўсякая і пачэсная, і патрэбная, а тым больш рэвізорская. Але мне такі захацелася пашырыць і свой кругагляд, і практыку, а галоўнае — стаць бліжэй да жывых працэсаў дзейнасці. Ну і, вядома, мне здавалася, што так я буду бліжэй і да Марыны. Не ведаю чаму, але я быў упэўнены, што сустрэўся з ёю нездарма.

Цяпер у мяне новая работа. І цяпер ужо ездзяць рэвізаваць мяне.

Можа не надта здзіўлю, калі скажу, што з Собічам з таго часу мы сталі найлепшымі сябрамі і цяпер от я еду яго праведаць.

ЯК СПЯВАЛІ ПЕСНЮ

Да Аксені Барнацкай, добрай, паважанай калгасніцы, нечакана прыехаў у госці малодшы брат яе Уладыслаў, саўгасаўскі галоўны інжынер на далёкіх цалінных землях. Разам з Уладыславам прыехала і жонка яго Station Станіслава, настаўніца, жанчына прыветлівая, яшчэ маладая. На застолле сабралася ўся Аксеніна сям'я, не такая ўжо і вялікая: два сыны, нявестка, дачка. Прыбегла і цётка Хрысціна, высокая, яшчэ жвавая і непаседлівая жанчына, некалі Уладыслава хросная маці.

Аксеня стаўляе і стаўляе на стол. Хоць там паўнютка ўсяго ўжо — і пітва, і закускі,— але Аксені здаецца, што для такіх дарагіх гасцей яна мала яшчэ нагатавала. Яна то садзіцца за стол, то зноў падымаецца і знікае ў кухні ці бразгае пасудкам у шафе. Яна прымае адзін наедак, ставіць другі.

— Хоць бы ж напісалі ці тэлеграму адбілі,— кажа Аксеня.— А то трэба ж: як гром з яснага неба. Я ж бы парсючка закалола хоць... Ну, закусвайце ж, піце, дарагія мае. Уладыська, Стаська... Не выпіты ж чаркі.

— І п'ём, і закусваем, Аксенька, стараемся,— кажа Уладысь, усаджваючы сястру каля сябе.— У цябе тут столькі нагатавана, што... хіба асіліш?

— Уладысь, не мудруй! — звонка, цераз увесь стол, кажа цётка Хрысціна.— Тут ты не надта вялікі гаспадар, не тое што там у сябе, у саўгасе. Кажуць табе піць — то і пі! Дый песню пара ўжо заспяваць.

— Правільна, цётка Хрысціна!

— Давайце вып'ем, дзядзечка!

Стол паўнюткі талерак з усялякім наедкам: ружовымі, аж празрыстымі скрылькамі нарэзана палядвіца; у цвёрдых драбках кілбасы пабліскваюць кропелькі густога, даўно выстаенага рубінавага туку; так і ляжыць на ўсю талерку нарэзаны на косыя скібачкі белы, свае работы, сыр; у бляшанках з паадхільванымі вечкамі стаяць кансервы з фабрычным духам тамату ці алею; селядзец, услany тонкімі колцамі цыбулі, абліты воцатавую слязою; памідоры з цёмна-бліскучымі чырвонымі бакамі; гуркі з халаднаватым бляскам расолу і пахам кухмарскіх прыпраў. Безліч дабра. Між талерак стаяць і малыя і вялікія пляшкі. Над сталом падымаюцца духмяныя пахі.

Аксеня сядзіць поруч з братам. Яна кладзе руку на спінку яго крэсла і глядзіць збоку, стараючыся знайсці ў ім перамены. За пачатак параўнанняў яна бярэ той час, калі Уладысь тут партызаніў. Праўда, тады бачыла яна яго рэдка. Ён быў тады шчуплы, часта не брыты, і вельмі ж не пасавала, што калі ён прыходзіў, дык пад кажухом ці ватоўкаю былі заўсёды ў яго то пісталеты, то гранаты. Пасля гэтага Аксеня бачыць брата ў ваеннай форме, калі пасля дэмабілізацыі з арміі ён заехаў пагасцяваць. Тады ўжо ён быў зусім не такі — выбрыты, чысты, падпяразаны афіцэрскім рамянём і нават як бы вышэйшы. Тры дні пагасцяваўшы, Уладысь падаўся на свой завод, у Магілёў, і зноў было дзіўна бачыць: інжынер, а — у ваеннай форме. А з завода, нават не прыехаўшы развітацца, апынуўся на цалінных землях. І от цяпер сядзіць перад ёю зноў зусім новы: у сінім гарнітуры, папаўнеў, на скронях і на патыліцы праблісквае зусім непатрэбная сівізна. Аксеня як бы толькі цяпер заўважае, што брат у яе даўно дарослы і нават пажылы мужчына.

— Гэта ж мы вельмі даўно не бачыліся з табою, братка,— кажа Аксеня.

— Прабач, сястрыца, не мог,— угадваючы сабе папрок, кажа Уладыслаў.— От і цяпер, каб не спатрэбілася быць

на Мінскім трактарным, то і яшчэ з гадок можа не бачыліся б... Ну, вядома, Стася адразу ж, як толькі дазналася пра камандзіроўку, ужо не магла супакоіцца: паеду і паеду разам. Яна ў мяне ахвотніца гасцяваць... Не, праўда, яна здорава занудзілася. Прыйшлося ўзяць невялічкі адпачынак.

— Ці доўга ж пабудзеш, братка?

— З тыдзень. Найбольш паўтара. Больш права не маю.

— Няўжо ж так спяшаешся? Ты зірні — дзеці ж з цябе воч не зводзяць. Яны ж заждаліся цябе.

Уладыслаў падымае галаву: праўда — як радасна! Усе ж сабраліся дзеля яго. Ты кажаш — дзеці? Хіба ж гэта дзеці, сястра? Рабочы народ! Ну, вот сядзіць поруч самы малодшы, Пятрусь. Увесь круглы: як твар, так і плечы, так і рукі, на грудзях аж не сыходзіцца сарочка — дужы хлапчына, трактарыст. Поруч з ім Віктар — рослы, плячысты мужчына, з віхраватым чубам, з сінімі вачыма і з калодкамі ўзнагарод на вайсковай, пра вялікія святы зберажонай гімнасцёрцы — брыгадзір трактарнай брыгады. З другога боку ў Станіславы цётка Хрысціна — яна то нахіляецца, каб нешта шапнуць, то выпростваецца і звонка смяецца. А на далёкім канцы стала, супроць Уладыслава — Зіна, Віктарава жонка,— звенавая па льну. Поўная і румяная, спакойна і велічна сядзіць яна, трымаючы на руках дзіцянё таго святога ўзросту, якому хапае яшчэ толькі таго, каб надзецца ў распашонкі. Ва ўсёй паставе яе поўна паважнасці і нейкага страшнага, недаступнага хараства, мабыць, дадзенага ёй мацярынствам. Яна вымае грудзі, і малое ўжо смокча губкамі, шукае іх, а знайшоўшы, заплюшчвае вочы і самаздаволена месіць і месіць ручкамі. Зіна сядзіць, як царыца, і нават на Людачку глядзіць аднымі вачыма, не нагінаючы галавы.

— У цябе залатыя кадры, Аксеня,— кажа Уладыслаў і глядзіць на застолле ў зачараванні.

— Не скарджуся, Уладысь,— шчасліва ўсміхаецца Аксеня.— Можа і не ведаеце: Зіна ж у нас герой — і ордэн, і медаль мае. А Віктар дэпутат аж на вобласць.

— Ці не залішне вы хваліцеся, мама? — пачуўшы размову, нечаканым баском гаворыць Віктар і папраўляе гімнасцёрку, шмаргнуўшы пальцам пад рамянём.

— За тваю дзяржаву, Аксеня! — кажа Уладыслаў.— У цябе ж тут цэлая дзяржава,— падымае ён руку, паказваючы на застолле.— Што ж — вып'ем!

Чаркі падымаюцца над сталом. Рукі ўжо не слухаюцца, каб стукнуцца ўпэўнена, і кроплі паблісківаюць і падаюць на стол, на закускі.

— А цяпер песню! — кажа Станіслава.

Цётка Хрысціна, не чакаючы, каб нехта пераняў, высокім і надта звінючым голасам зацягвае «Зялёны дубочак». Дружна падхопліваюць галасы другую палавіну куплета:

Куды вецер вее,
Туды й галлё гнецца.

Уладыслаў закусвае, памахваючы галавою ў такт песні. Пятрусь моршчыцца больш за ўсіх і чаркі не дапівае. Ён хоча дастаць хоць маленькі скрылёк цудадзейнага халаднаватага гурочка, але скрылёк усё саслізгвае і аддэльца.

«Хоць бы не ап'янець,— думае сам сабе Пятрусь,— а то дзядзька Уладысь хто ведае, што падумае. Зараз я такі пагавару з ім, зараз раскажу. Эх, каб ён толькі згадзіўся! Маглі б разам і паехаць»,— думае Пятрусь. Ён хоча стаць толькі такім, як дзядзька Уладысь, і быць разам з дзядзькам Уладысем яму цяпер самая большая мара. Ён адсоўвае недапітую чарку, каб часам не разліць яе, і бліжэй падсоўваецца да дзядзькі Уладыся. Але тут жа, адцісνуўшы Петруся ад стала, цягнецца да дзядзькі Уладыся Віктараў чуб.

— ...Мы ўжо пробавалі так і гэтак, і нічога ў нас не выходзіць. Мабыць, нешта не да канца прадумаў я, дзядзька Уладысь.

— Праверым, Віктар,— кажа Уладыслаў.

Да самаходнага камбайна Віктар прыдумаў прыстасаванне, каб збіраць каласы, што астаюцца ў іржэўніку, але выходзіць не вельмі чыста. Гэтае прыстасаванне не дае Віктару быту, і пра гэта ён гаворыць з дзядзькам Уладысем ад самага пачатку сустрэчы, просячы яго памагчы.

— Праверым. Зробім чарцёж, вылічым, не хвалюйся,— кажа дзядзька Уладысь.— Бо думка твая дарагая, Віктар. О, калі гэта выйдзе...

— От я ж і кажу...

— Кінь ты, Віктар, пусці, дай жа мне пагаварыць хоць хвілінку! От прычапіўся,— адхіляе рукою Віктараву чупрыну Пятрусь.

Пераплыву рэчку,
Сяду на брусочку,—

тапклява выцягвае цётка Хрысціна.

Чуб у Віктара разлахмаціўся, налазіць на лоб. Але ён упарта навісае перад Пятрусём, адціскаючы яго ад дзядзькі Уладыся.

— Віктар, чакай! — просіць Пятрусь.— Ну на хвілінку перастань, дай мне пагаварыць крыху... Дзядзька Уладысь,— кажа ён, ужо адціснуўшы Віктара.— Я вас вельмі прашу — забярыце мяне з сабою.

— Як гэта? — глядзіць на яго Уладыслаў, за шчакой трымаючы паляндвіцу.

— Ну з сабой, на цаліну.

— Чакай, чакай! — кажа Уладыслаў і перастае жаваць.

— Калі ехалі ў нас на цаліну, дык мяне не было дома, я быў у Любані на курсах механізатараў,— стараецца растлумачыць Пятрусь.

— Ну?

Пятрусь зусім блізка нагінаецца да вуха дзядзькі Уладыся, бо шумна, а моцна гаварыць ён не хоча. Ён добра бачыць і брытую дзядзькаву шчаку, і скроні з дробнымі іскаркамі сівізны, і ружовыя, далікатна ўмятыя маршчынкі на шыі, і валасы на вуху, і здаецца Петрусю, што ўсё гэта можа быць толькі ў дзядзькі Уладыся і што гэта дзядзьку Уладысю вельмі да твару.

— Дзядзечка Уладысь, я вельмі вас прашу... Мне так хочацца,— шэпча Пятрусь.

— А што скажа мама? — праслухаўшы, пытаецца Уладыслаў і пачынае далей жаваць паляндвіцу.

— Тое, што і вы. Абы вы захацелі.

— А дырэктар саўгаса?

Віктараў чуб зноў цягнецца да дзядзькі Уладыся, але Пятрусь адціскае яго плячом. Ён шэпча дзядзьку Уладысю ўсё тую ж сваю просьбу:

— Калі б вы самі сказалі дырэктару саўгаса, што гэта вельмі патрэбна...

— Гм... Здорава ты, Пятрусь, надумаў,— кажа Уладыслаў.— Што ж — можна папробаваць... Мне гэта самому нават падабаецца, Пятрусь.

— Ой, як бы добра было, дзядзечка! — толькі і можа сказаць Пятрусь.

— Аксеня! — падзывае Уладыслаў сястру.— Пятрусь хоча ехаць разам з намі — ты чула?

— Мамачка, толькі вы...

— І забяры ты яго, Уладыська,— мабыць, даўно ўжо ведаючы сынавы думкі, кажа Аксеня.— Ён жа мне быту

не дае. А пры табе, я знаю, што ён чалавекам стане. Але не ведаю, ці пусцяць яго.

— Пусцяць! Толькі няхай дзядзька Уладысь сам скажа.

Не заўважылі, хто наліў чаркі, але Аксеня просіць выпіць.

Зноў над сталамі падымаюцца рукі і не пападаюць, каб стукнуцца, і кроплі, паблiскваючы, падаюць на стол.

— Чакайце! — крычыць цётка Хрысціна.— Чакайце! Вып'ем, але толькі адно дамаўленне: каб Уладыслаў заспяваў песню.

— Правільна!

Уладыслаў падымаецца і выцягвае над сталом руку. Вядома, ён заспявае. Сваю ўлюбёную. Толькі — чорт! — як жа яна пачынаецца? Скажы ты, забыўся.

— Стойце, ну як жа яна? Ну, от — партызанскія сёстры там...

— Ой, бярозы ды сосны! — падказвае Пятрусь.

— Во! — Уладыслаў, усё так жа выцягнуўшы руку, як бы збіраючыся дырыжыраваць, зацягвае трошкі хрыплавата і нізка:

Ой, бярозы ды сосны,
Партызанскія сёстры,
Ой, шумлівы ты лес малады!

Застолле глядзіць на Уладыслава і маўчыць, як бы ацэньваючы, а ці з таго голасу пачата песня? Уладыслаў вытрымаў паўзу, і калі гэтак жа нізка і хрыплавата зацягнуў зноў, адразу падхапілі ўсе галасы:

Толькі сэрцам пачую
Вашу песню лясную
Ды успомню былыя гады.

Шырока, магутна паплыла песня. Але ў песні вылучаюцца два галасы — Петрусёў і Віктараў. Відаць, што браты спявалі гэтую песню не раз. І як толькі ў песню ўліліся Пятрусь з Віктарам, стала ясна, што нікому далучацца да песні не трэба: яе трэба слухаць. І неўзаметку ў ёй асталіся толькі Пятрусь з Віктарам. Як пачаўся куплет, іх галасы тут жа разлучыліся і кожны пацягнуў па-свойму, але так, што не мог гучаць без другога.

Ды успомню пажары,
І варожыя хмары,
І завеі халодных вятроў,
І слату, і нягоды,
І начныя паходы,
І агні партызанскіх кастроў,—

спаборнічалі два галасы. Віктар цягнуў мелодыю нізка, мяккім, густым барытонам, падпёршы нахіленую галаву далонямі рукі. А Пятрусь адхінуўся на спінку крэсла, абхапіў яе там рукамі, заплюшчыў паднятыя ўгору вочы, і голас яго звінеў недзе высока, так, што, здавалася, ніколі не спаткаецца з Віктаравым. Здавалася, што песня вырвалася ў далёкі гушчар палёў і Віктараў голас каціўся там рэхам, а Петрусёў — бясконца звінеў і звінеў у высі паднябесся.

Край любімы мой, родны,
Ты навекі свабодны,
За цябе я у бітву хадзіў,
Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб прыгожымі кветкамі цвіў,—

лунаюць два галасы — высокі і нізкі,— разлучаючыся і шукаючы адзін аднаго.

Адышлі тыя годы,—

не дачакаўшыся канца паўзы, варочаючыся ад сваіх думуспамінаў, пачынае Уладыслаў і падымае галаву так рэзка, што валасы адкідваюцца назад,—

Адгрымелі паходы,
Толькі пушча за полем шуміць.

І зноў зліліся, сашчапіліся і плывуць два галасы: адзін — шумам і рэхам дуброў, другі — у бяскрайняй высі паднябесся, і не могуць, не могуць ніяк разлучыцца і плывуць без канца.

Скончылі песню. Уладыслаў сеў у крэсла і рукой прыгладзіў чупрыну. Пятрусь расплюшчыў вочы, на ўсіх паглядзеў і ўсміхнуўся, так светла, як сонца. Віктар паправіў свой чуб і ўздыхнуў. Людачка заснула на руках, і Зіна асцярожна нацягнула на грудзі край блузкі. Цётка Хрысціна папраўіла вузел хусткі пад падбародкам.

— От як спяваюць у нас, Стасечка.

— Найлепшая песня! — кажа Уладыслаў.— Не ведаю, чаму так люблю яе: можа таму, што сам сябе чую ў ёй... Ну, то давайце яшчэ па чарачцы вып'ем. За добрую песню. За гэтую песню... Сястрыца, не хадзі, нічога не трэба, тут жа ўсяго хапае.

— Піце, ешце, дарагія мае,— шчаслівая, кажа Аксеня. Яна стаіць, каб усіх бачыць: і Уладыся, і Стасю, і сваіх дзяцей, і твар яе і ўсміхаецца, і плача. Тут і радасць, і

гордасць, і разгубленасць, і трывога, як гэта часта бывае, калі шчасце такое вялікае, што яго пачынаеш баяцца.

Усе гамоняць, гудуць. Толькі Зіна сядзіць адна на сваім далёкім канцы стала, яе чарка стаіць некранутая за ўвесь час. Хто падумае асудзіць? Яна маці, і апрача Людачкі ў яе цяпер бадай што нікога няма больш на свеце. Але песня кранулася нават яе дзяцінства.

— А ці памятаеце вы, дзядзька Уладысь, як я вам прыбегла ды сказала, што ў сяло наехалі паліцаі? Тады ж вас траха не захапілі,— начакаўшы хвіліну суцішку, гаворыць Зіна, нарэшце радая, што і яна знайшла чым умяшацца ў гаворку.

Уладыслаў глядзіць на яе, як бы толькі цяпер зразумеўшы, што гэта ж тое самае замурзанае дзеўчанё, якое тады стрымгалоў, засопшыся, прыбегла да цёткі Хрысціны, дзе ён чытаў народу «Праўду», крыкнуўшы, каб ён ратаваўся. Не пазнаючы, ён цяпер глядзіць на Зіну, як бы ўпершыню бачыць яе. Зіна сядзіць высока, велічнапроста, на руках пагойдваючы сонную Людачку. Замурзанае дзеўчанё... жанчына... маці... хто б мог сказаць?

— А праўда ж, Зіна... Каб не ты, то можа цяпер і не спяваў бы я разам з вамі...

Задумаўшыся, Уладыслаў ярка бачыць тыя, прапетыя ў песні, часы. Сон гэта? Ціява? Памяць мае дзіўную ўласцівасць — паказваць усе грані жыцця разам, сціраючы лёгкія пераходы явы і сну. Больш за ўсё, аднак, памяць трымае нейкую долю імгнення, калі Уладыслаў, лежачы, бачыць залітую сонцам шашу, выбух на ёй і пасля — як імчыць на яго чужы, жахам перакошаны твар, на якім відны толькі адны суцэльныя вочы. У руках у Уладыслава тузаецца кулямёт, і па тым, што ён тузаецца, Уладыслаў ведае, што ён страляе і што гэта ад яго плешчацца і крычыць у чужых вачах жах. Твары падымаюцца і падаюць, падымаюцца і падаюць... можа адзін, можа два — можа безліч... І пасля — стаіць немая цішыня, шуміць толькі адна векавечная пушча...

Памяць мае дзіўную ўласцівасць — сціраць лёгкія пераходы явы. І раптам перад духоўнымі вачыма Уладыслава стаіць другая цішыня — цішыня бяскрайняй далі спелых палёў. Палеткі яго Краснагорскага саўгаса. Плывуць жоўтыя цяжкія хвалі пшаніцы — як мора — без краю-канца. Сонца. Спрадвечная бездань блакітнага неба. Па дарозе, што ляжыць недзе на дне гэтага пшанічнага мора, імчыць ГАЗ-69. Ён то хаваецца ў збажыне, то зноў паяў-

ляецца шэрым брызентавым кузавам, пакідаючы за сабою лёгкі слядок паднятага пылу. Вымахнуўшы на самае высокае месца, «газік» спыняецца. Нячутна грукнуўшы дзверцамі, з машыны выходзіць Андрэй Кірнажыцкі, дырэктар саўгаса. Без шапкі, бліснуўшы на сонцы вялікімі залысінамі, якія адціснулі на самае цемя шматок віхрастай шавялюры, ён ставіць далонь над вачыма і азірае разлегласць. Наўкруга, як толькі можа акінуць вока, плыве і плыве збажына, чуць-чуть зеленаватая ў лагчынах і ўжо чыста-жоўтая на пагорках.

— Не ў час ты паехаў, Уладыслаў Міхалавіч, ой, не ў час ты паехаў,— у думках чуе Уладыслаў, як гаворыць Андрэй Кірнажыцкі, аглядаючы разлегласць, і глядзіць разам з дырэктарам.— Ты бачыш, колькі ў нас з табою сёлета работы? Глядзі, ураджай які, а? Праз два дні на Высокім Яры можна пускаць камбайны.

— То брыгады ж гатовы, Андрэй Данілавіч. Хіба мы з вамі дзе памыліліся? — у думках адказвае Уладыслаў, памятаючы, што перад ад'ездам, загадзя, яны як мае быць падрыхтаваліся да прыборкі.

— Памыліліся, Уладыслаў Міхалавіч. У самым галоўным памыліліся: можам не паспець управіцца — ураджай куды большы, як мы з вамі думалі. Тут жа кожны каласок залаты.

— Я зараз з'езджу пагляджу, Андрэй Данілавіч. Той шырокі масіў пад Самадумаўкамі, мабыць, ужо зусім гатовы,— у думках гаворыць Уладыслаў.

— Папрашу, Уладыслаў Міхалавіч. Скокніце туды разам з аграномам. Каб нам дзе не спаткнуцца. Толькі вы не хвалюйцеся... Чаго вы ўжо хвалюецеся, Уладыслаў Міхалавіч?

Сцепануўшыся ад дум, Уладыслаў і сапраўды заўважае, што ў яго часта б'ецца сэрца. Што там робіцца цяпер у яго саўгасе? Дзе, чым заняты Андрэй Кірнажыцкі? Ці ўсё добра ў брыгадах? Ці развезена як мае быць гаручае? Ці няма якіх замінак? Мабыць, цяжэй за ўсё будзе брыгадзе на Высокім Яры, там жа... Эх, праўда, трэба было б самому там цяпер быць. Папраўдзе, не ў час паехаў.

— От што, Віктар,— кажа Уладыслаў раптам незнаёмым строгім голасам.— Давай тваім чарцяжом зоймемся сёння. Зараз жа, бо мне няма часу. А ты, Пятрусь, рыхтуйся, каб заўтра паехаць. Пойдзем, дамовімся і — заўтра ў дарогу. Самалётам.

— Уладыська, то ты ж казаў, што хоць з тыдзень па-

будзеш,— спалохана ўскінуўшы вочы, кажа Аксеня.— Як жа гэта, братка?

— Не магу, Аксенька, не гневайся. Трэба быць дома. Стася, калі хоча, то няхай пабудзе.

— Ну што ты, Уладысь, як жа я буду аставацца? Паедзем разам,— гаворыць Станіслава і пачынае прыгладжваць валасы, як бы збіраючыся ўжо ў дарогу.

— Ну от, то давайце падымем па апошняй чарцы. Налівай, Віктар, па поўнай. Вып'ем за жыццё, за шчасце, за яшчэ лепшыя сустрэчы. Аксенька, сястрыца, не плач...

Чаркі звіняць, стукаючы адна аб адну; пабліскваюць і падаюць кроплі. Аксеня выцірае слязу, не гора, а — шчаслівай, харошай тугі. Пятрусь свеціцца радасцю, ён гатоў цяпер падскокваць, куляцца — збылася яго найпякнейшая мара. Нават Зіна падымае сваю някранутую чарку — хоць кроплю, а яна такі вып'е.

Абвёўшы ўсіх вачыма, хрыплавата і нізка, як бы сам сабе, Уладыслаў зноў зацягвае словы толькі што скончанай песні, якая яшчэ звініць і звініць у ім:

Край любімы мой, родны,
Ты навекі свабодны,
За цябе я у бітву хадзіў.

І зноў падхопліваюць Петрусёў і Віктараў — высокі і нізкі — два галасы і, сплёўшыся, плывуць і плывуць, разлучаючыся і шукаючы адзін аднаго:

Каб ніколі, ніколі
Ты не быў у няволі,
Каб прыгожымі кветкамі цвіў.

І за гэты тост высока падымаюцца празрыстыя поўныя чаркі...

НАТАЛЯ

Ганне Скрыган

ЧАСЦІНА ПЕРШАЯ

1

Наталя памірала.

Яна добра ведала гэта сама, і, аднак, не было ў яе ні страху, ні пратэсту. Так заўсёды, мабыць, бывае з чалавекам, калі ён траціць надзею. А адкуль жа ўзяць тых

надзей, калі яна от чатыры месяцы як ляжыць у гэтай палаце і не чуе ні кропелькі палёгкі? Яна слабне ўсё больш і больш.

Паволі цягнецца дзень за днём, і ўсё тыя ж бальнічныя ложкі, белыя сцены, белыя халаты прыслужнікаў, часамі слабы стогн хворых, а найбольш — маўклівае, ціхае ляжанне. Якая пакута — гэтая павольная смерць! Бо і не баліць жа нічога. Проста слабасць і абыякавасць да ўсяго. І ўсё нешта толькі тоненька і бясконца звініць. Ці то сцены такія звінючыя, ці паветра, ці так, можа, і заўсёды было, толькі яна не заўважала гэтага, калі была здаровая.

І бясконца доўга цягнецца марудны, белы, спрэс аднолькавы дзень. Наогул усё стала вельмі павольнае. Павольна людзі гавораць, павольна ходзяць, павольна і ціха ляжаць. Гэтая павольнасць і ў ёй, і вакол яе. Нават здаецца, што гэта не праўда, а сон. Вось хоча яна паварушыць нагою, а тая не слухаецца — як не свая. Падыме руку, а яна такая цяжкая, як налітая нечым вельмі жалезным, і калі апусціць яе — адразу лёгка падае назад. Нават неяк добра робіцца, калі яна так лёгка падае. Адале — стома, як пасля вялізнай работы.

А калі памрэ яна? Сёння, заўтра, паслязаўтра? Няхай сабе і сёння, абы скарэй ужо, каб пра ўсё забыць. Не, страшна аднаго: што ніхто, ніхто не ведае, што яна ляжыць вось у гэтай белай палаце, у гэтым далёкім азіяцкім гарадку і памірае адна. А ў яе ж ёсць свае, родныя, сям'я. Яе чакаюць, думаюць пра яе, спадзяюцца, што вось скончыцца вайна і яна вернецца дадому. І яны нават не будуць ведаць, як яна загінула. Божачка, чаго нарабіла гэтая вайна! Хто б мог думаць пра нейкую эвакуацыю? Дзе ўсе цяпер, што з імі? Ці ведаюць, што яна думае пра іх?

Даўно так востра не ўспаміналася жыццё. Наталя заплакала, ды так і заснула з мокрым, знясіленым тварам.

2

Паволі цягнецца белы, напоўнены бясконцым тоненькім звонам дзень. Наталя папрасіла ў нянькі, каб тая дала ёй люстэрка. Нянька доўга не хацела даваць, але Наталя вельмі ж прасіла. Захацелася паглядзець на сябе. А калі зірнула — жахнулася. У люстэрку яна ўбачыла толькі вочы, дый то не свае — у глыбокіх ямах, шырока

расплюшчаныя і такія ясныя, што наскрозь прасвечваліся. Нос завостраны, тонкі, таксама чужы. Лоб высокі, нейкі сцямнелы, пукаты; шчокі праваліліся, тарчаць адны вострыя сківіцы. Гэта не твар, а чэрап, якім звычайна малююць смерць. Яна ведала, што замест рук і ног у яе пааставаліся косці — доўгія, надта цяжкія косці. Але ж яна думала, што твар у яе той самы — з матаваю загарэлаю скураю, з румянымі губамі, з русымі валасамі, што адразу над ілбом падымаліся ледзьве значнымі хвалямі, з вачыма, вакол якіх таілася вечна гатовая заіскрыцца ўсмешка. Аж яна цяпер выглядае як здань з таго свету.

І хто ведае, чаму так бывае, але цяпер Наталі зрабілася страшна: ёй вельмі захацелася жыць. Яе ахапіў жах. Няўжо яна павінна памерці? А як жа будуць жыць людзі без яе, як будуць гаварыць, думаць, смяяцца ці плакаць, спяваць песні, нешта рабіць, нечага дамагацца, нечага бясконца хацець? Як жа гэта яна не ведацьме ўсяго таго, што называецца жыццём, што з кожным днём мяняецца, іначае, каб усё лепшаць і харашэць? Як жа гэта яна не будзе думаць, не будзе сярод людзей? Гэта ж усё так хораша, так важна, нават вечна! Няўжо ж яна не ўбачыць больш свае дачкі?..

— Пастойце,— сказала яна доктару, калі той абходзіў палату, слаба ловячы яго за руку. Яна хацела сказаць скоранька, але слова выгаварылася вельмі павольна — «пас-стой-йце». — Пастойце, — паўтарыла яна. — Дарагі доктар, зрабіце мне апошнюю ласку. Навошта вам са мною важдацца.

— Не хочаце жыць? — адразу здагадаўся доктар і, хоць не дзяржала яна яго больш за руку, супяўся.

— Я не выжыву, доктар. Навошта, каб я толькі пакутавала? Дайце мне якой атруты. Або хоць скажыце, што я буду жыць!

— А хто вам сказаў, што вы не выжывеце? — Доктар паднёс табурэтку і прысеў каля Наталі.— Ну, хто вам сказаў?

— Я сама ведаю, доктар. Я бачыла сябе ў люстэрку. Такія ўжо не жывуць.

— Эх, маладзіца,— засмяяўся доктар. Можа, яму нават не было смешна, але ён так засмяяўся, нібы сапраўды Наталя сказала найсмяшнейшае глупства. Смяяліся яго тоўстыя губы, старэчы твар, маршчыны каля воч, нават жывот тросся ад смеху.— Паміраць надумалася, от дурная!

— Доктар, я вас прашу, памажыце мне. Няхай гэта ўсё скарэй кончыцца.

— Колькі год табе? — запытаўся доктар.

— Дваццаць шэсць.

— Ну, от бачыш. А вунь той бабцы, што каля акна ляжыць,— на сёмы дзесятак пайшло, а яна жыць просіцца. Брыдка, маладая жанчына, брыдка! — сказаў раптам злосна доктар.— Каб я больш не чуў гэтага! Ты ў мяне яшчэ танцаваць будзеш. Чуеш?

Добры танец, калі косці бразгаюць адна аб адну. Доктар пайшоў, а ў вушах у Наталі зноў падняўся тоненькі-тоненькі звон. Звінела столь, звінелі сцены, і ўсё стала ў нейкай глухой белай ваце: і чужыя галасы, і стук крыві ў сваіх скронях, і свае думкі — мяккія, павольныя і глухія. Захацелася спаць.

3

А доктар вярнуўся ў свой пакой і доўга сядзеў, задумаўшыся, над сталом. Што ён мог зрабіць? Трэба лякарствы. Трэба нармальныя бальнічныя харчы. А дзе іх узяць? І тое і другое на фронце. Нават лепшыя дактары — там. Якая гэта страшэнная хвароба, калі нервы стаміліся, калі не хочуць больш змагацца і цела не можа ачуняць! Дзе ўзяць патрэбную арганізму маленькую кроплю дыэты? Папраўдзе страшна.

Лякарствы ён пастараецца дастаць чаго б там ні каштавала. Ён паедзе сам у Ташкент, ён аблазіць там усё, што можа. Сходзіць, нарэшце, у ваенны шпіталь, няўжо і ў іх не дастане? Не, ён выпрасіць. А от дзе ўзяць масла, малака? На чым зварыць курыны булён, дзе дастаць пячонкі? А дзе яна возьме гэтых тысяч, каб купіць усё? Што яна можа прадаць?

Доктар зноў пайшоў хадзіць — па кабінетах, па калідоры, па кладоўцы, па кухні,— абы нешта рабіць. Зноў пайшоў па палатах.

Наталя спала. Ён падышоў на пальчыках, паглядзеў ёй у твар. «Ты ў мяне будзеш яшчэ танцаваць»,— горка падумаў пра сваю казённую фразу. А што ён мог ёй сказаць? Чым мог памагчы? Сваёю верою? Ён верыць у жыццё і змагаецца за яго, але ж ён ведае і законы смерці.

Тая самая бабка, на якую спаслаўся доктар, гаворачы з Наталяй, пальцам паззвала яго. Рукой загадала сесці, нагнуцца да яе.

— Ты зманіў ёй, доктар, скажы! — вачыма паказала яна на Наталю. Твар яе быў маленькі, зморшчаны, губы западалі ў рот, і гаварыла яна неяк мякка, нібы словы зліпаліся адно з адным.— Ты не бойся, добры чалавек, яна спіць, не пачуе.

Доктар агледзеў палату. Спрэс белыя ложкі, і ўсюды пад коўдрамі лініі худых рук, ног. Сапраўды, можа, спяць людзі, можа, думаюць — кожны пра сваё.

— Што ж я зманіў, цётачка Багуцкая?

— Слухай сюды, доктар: ты не вылечыш яе. Я хачу памагчы табе.

— Як жа гэта, цётачка Багуцкая?

— У мяне тут і дачка і ўнучкі, добры чалавек. Яны мне ўсяго носяць — і масла, і яек, і ўсякага наедку прыносяць мне поўна. Наталі ты не паправіш без гэтага. Ёй няма каму памагчы, і яна зачахне.

— Я разумею, цётачка Багуцкая.

— Не балабонь, перш паслухай. Нічога ёй не кажы, бо яна тады не возьме. Бяры майго ўсяго колькі хочаш. Калі трэба, мне ўсяго прынясуць. От так, добры чалавек. Ты ж ёй сказаў, што жыць будзе, то так і зрабі.

Доктар знайшоў бабчыну сухую руку, пагладзіў. Часта чалавечымі словамі нельга сказаць таго, што скажаш маўчаннем.

...Праз два месяцы Наталя першы раз паднялася і ціхенька дабралася да акна. Яна ішла вельмі доўга, не верачы, што можа пераступаць нагамі, дакранацца рукамі да халоднай белай сцяны. Да шыбы цягнулася тоненькая галінка акацыі, і адзін малады лісток намагаўся дакрануцца да шкла. За акном цвіў сад, у кветках яго з адной на адну пералятала пчала, торкаючыся рыльцам глыбока між тычынак то ў адным, то ў другім месцы. Свяціла сонца з бясконца далёкага, яснага неба. Шчабяталі птушкі, была вясна. За садовай агароджай прасвечвалася вуліца, і па ёй хадзілі людзі, кожны сваім крокам, хто скоранька, абганяючы другіх, хто паволі, мабыць, кожны з сваімі чалавечымі клопатамі. Божухна! — зноў жыццё, тое самае, даўно не бачанае, даўно не адчуванае жыццё!..

Ад усяго гэтага на Наталю так многа лінулася радасці, што яна абамлела і бразнулася на падлогу.

ЧАСЦІНА ДРУГАЯ

1

Наталя зрабіла памылку: яна не сказала Казіміру, што ў яе была дачка. Быў муж, але няма яго — хіба мала людзей забрала вайна. Словам, няма, і навошта пра гэта гаварыць. Навошта корпацца ў тым, чаго не вернеш. А можа,— ці варта нават варочаць.

— Асталася адна,— сказала яна Казіміру.

— Мабыць жа, цяжка?

— А што ж зробіш.

Наталя працавала на заводзе ў аддзеле капітальнага будаўніцтва. Іменна там першы раз і ўбачыў яе Казімір. Ён зайшоў папытацца, чаму так доўга аддзел не дае актаў-працантовак на будоўлю. Начальнік, дабрадушны, ледзь крануты сівізною інжынер, растлумачыў невялікую затрымку і паабяцаўся заўтра ж здаць. Тым больш што ён сам зацікаўлены ў гэтым: калі не паступяць ад завода грошы, то яму не будзе чым расплаціцца з рабочымі. Гаворка цягнулася нядоўга, але за гэты час Казімір паспеў сагледзець кантору і ў дальшым кутку за чарцёжным сталом заўважыў Наталю. Так жа бывае, што часамі ўбачыш упершыню чалавека, і невядома чаму ён западзе табе ў душу. Наталя чарціла, паглынутая нейкай далёкай, толькі ёй адной вядомай увагай, нават не падняла галавы, не зірнула на Казіміра. Казімір пайшоў, увесь дзень займаўся малымі і вялікімі справамі, а Наталін профіль не пакідаў яго.

Прыехаў Казімір на завод ад главка на рэвізію на пятнаццаць дзён, а калі капнуўся — няма як і рэвізаваць. У бухгалтэрыі ўсё запушчана ды заблытана так, што не ведаеш, дзе знайсці канец, дзе пачатак. Гэта было бадай што нармальна: усе кваліфікаваныя работнікі, нават сам галоўбух, былі на фронце. Работа бухгалтэрыі лягла на плечы маладых дзяўчатак, якія раней хаця б умелі разнесці праводку па картках, выпісаць накладную або зрабіць рэестр дакументаў. Каго ж можна было вінаваціць, што замянілі яны цяпер бухгалтараў, узяўшы работу сабе не пад сілу? Даў Казімір у главк тэлеграму, каб адцягнулі камандзіроўку яшчэ дзён на пятнаццаць, бо трэба ж памагчы людзям, навучыць іх хоць самаму неабходнаму ў іх рабоце. Камандзіроўку адцягнулі, а калі і яшчэ пятнаццаці дзён не хапіла — загадалі астацца, аж пакуль ра-

бота канторы не стане нармальнай. Так і астаўся Казімір на заводзе за галоўнага бухгалтара, нават невядома на які час. А ўцягнуўся ў работу, прывык да людзей, і здалося, што іначай не магло нават і быць.

Не ўмеў заляцацца Казімір, а Наталя не пакідала трывожыць яго. Не так каб рэдка ён і сустракаўся з ёю — то ў сталоўцы, то на заводскім двары, то ў дырэктарскай пачакальні,— але ні разу не выпадала як след пагаварыць. Казімір за гэта наракаў толькі на сябе — не ўмеў. У другіх лёгка гэта выходзіла:у свой час ласкава ўсміхнецца, скажа камплімент, знойдзе нейкае лёгкае слова, ад якога і пачнецца патрэбная плынь, а ў Казіміра здольнасці гэтай не было. Не навучыўся за свае трыццаць сем год, не было калі. Ды з Наталяй і гаворка павінна быць нейкая адмысловая. Толькі шчырая. «З Наталяй нельга пустазвоніць,— думаў Казімір.— З ёю нельга гаварыць абы-што, абы-як на бягу, як гэта робяць з другімі. З Наталяю трэба гаварыць так, каб яна ўсяго цябе зразумела. Ёй трэба расказаць усяго сябе адразу».

Што збіраўся расказаць Наталі Казімір, ён і сам не ведаў. Але ён адчуваў, што яму трэба было, каб яна была поруч, каб ён мог усяго сябе або хоць некаторую долю аддаваць ёй. Няхай бы іменна яна ведала, што ў яго ў вайне ў Бабруйску загінула ўся сям'я. І што іменна таму цяпер больш як калі яму хочацца, каб нехта быў поруч. А то такая звярыная туга адзіноты. Трэба, каб нехта ведаў пра гэта. Але Казіміру было ясна, што гэты «нехта» мог быць толькі Наталяй. Больш нікога ён не пусціць у сваю душу.

Ён часта заседжваўся на рабоце. Тут ён мог падумаць і пра работу, і пра сваё жыццё. І аднойчы здарылася, што ў такі от запознены час ён сустрэўся з Наталяй.

Як гэта бадай што заўсёды бывае, пасля хваробы арганізм прагавіта хапаецца жыць. Не заўважыла Наталя, як у яе зноў пакруглелі плечы, на твары паявілася тая ж матавая свежасць загару, уваскрэсла ўсмешка, засвяціліся вочы. Гэтак жа хараша па валасах пабеглі павольныя хвалі. Стала нават паўней, як была.

За прахаднымі варотамі Наталя з некім разгаварылася, павярнулася ісці і адразу ж наткнулася на Казіміра.

— Прабачце, траха не збіла вас з ног,— здзіўлена бліснула яна вачыма, папраўдзе збянтэжыўшыся.

Якраз быў выпадак пажартаваць, а гэтым і завязаць гаворку, разам пайсці.

— У жыцці часта нават хочацца, каб хто збіў — не з ног, дык хоць з панталыку,— сказаў Казімір.

— Вашага брата вельмі цяжка збіць з панталыку,— весела падхапіла жарт Наталя.

— Як гэта?

— Бо ў бухгалтара, а тым больш у галоўнага, павінна быць усё дакладна: і разлічана, і пералічана.

— Ваша праўда,— уздыхнуў Казімір.— Вось гэта, мабыць, больш за ўсё і шкодзіць мне.

— Не, гэта, мабыць, вельмі памагае.

— Горкая памылка, Наталя Ігнатаўна. Да таго шкодзіць, што калі нават я каго і пакахаю, то баюся яму сказаць пра гэта.

Наталя ішла вельмі порстка і лёгка, так, што ўвесь час забягала наперад і паварочвалася назад, калі гаварыла з Казімірам. Казімір як бы даганяў яе і ніяк не мог дагнаць. Яна была ў цёмна-зялёным плацці і ў басаножках на загарэлых нагах. Па русых, закінутых назад валасах яе плылі ледзьве значныя хвалі.

— А вы не бойцеся, а скажыце,— павярнулася, нібы чакаючы, Наталя.— І пабачыце, што будзе ўсё проста. А можа, ад вас якраз і чакаюць, каб вы сказалі.

— Ну, дапусцім, каб вам хто сказаў?

— Мне — не трэба,— раптам строга сказала Наталя і нават не павярнулася.— Я гэтага не чакаю... Ну, вось я і дома, бывайце здаровы.

Не паспеў Казімір апамятацца, як Наталя лёгка і порстка ўзбегла на высокі ганак, рыўком адчыніла дзверы і знікла за імі, нават не азірнуўшыся.

2

Як мог зразумець гэтую размову Казімір? Усяляк. То яму здавалася, што гэтая размова павінна крыўдзіць яго: Наталя нават не захацела з ім размаўляць. Яна адразу дала зразумець, што ён ёй не патрэбен. Яна старанілася яго. «Мне — не трэба»,— успамінаў ён яе словы, і яму здавалася, што яны былі сказаны нават са злосцю. «Я гэтага не чакаю»,— сказала яна, і Казіміру здавалася, што ў гэтым была нават насмешка. Яму ўспаміналася, як Наталя ўвесь час па дарозе вырывалася наперад, і гэта можна было зразумець так, што яна хацела як мага скарэй уцячы ад яго. «Мне трэба перастаць думаць пра яе,— сам сабе гаварыў Казімір.— Гэта вельмі гадка — надаражацца

сабою, калі на цябе нават не хочуць глядзець. Я ж не хлапчанё, і мне павінна быць брыдка. Добра. Кончана. Сустрэну, кіўну галавою — добры дзень — бывайце здаровы — і хопіць. Гэта нават лепш, што так адразу стала ўсё ясна»,— думаў Казімір.

То раптам пачынала здавацца зусім наадварот: што Наталя давала яму многа надзеі. Не, можа, гэта не так сказана: не надзеі, а — ну, проста, што ўсё ж яна вылучае яго ад другіх. І як толькі пачынаў сябе так настройваць Казімір, то зусім у іншым святле рысавалася зноў Наталя. І тое, што ў той першы дзень у аддзеле капітальнага будаўніцтва ў яе быў такі задуманы профіль — было нездарма. І тое, што кожны раз пры сустрэчах яна вітаецца з ім неяк асабліва — без усмешкі і як бы з трывогай — і пасля апускае галаву, нібы хочучы кожны раз нешта ў сабе ад гэтага пакінуць,— таксама нешта значыць. Ён зноў успамінаў тую ж размову па дарозе, і цяпер у ёй нічога не было крыўднага, а — наадварот — у ёй было нешта вельмі харошае, чаго на першы погляд можна нават і не заўважыць. От жа спяшалася яна тады, а ўсё ж не пакідала яго: не-не дый павернецца, дый пачакае. «А можа, ад вас якраз і чакаюць, каб вы сказалі»,— успамінаў Казімір ужо другія словы, і яны мелі для яго вялікі сэнс. «А вы не бойцеся, а скажыце»,— гаварыла яна, і было ясна, што яна ведала, пра што можа сказаць Казімір. Не, яна вельмі харошая, вельмі слаўная. Было б нават смешна, каб яна адразу сказала: «Ах, дарагі Казімір, я так рада!» Гэта было б куды горш, як у раманах. Яна вельмі чыстая, вельмі высокая. «У вас усё павінна быць і разлічана і пералічана»,— успамінаў ён і пагаджаўся, што гэта была перасцярога: Наталя магла прыняць толькі шчырасць. Так яно і трэба. Іменна такой ён і бачыць Наталю.

І паступова Наталя запоўніла ўсяго яго. Яна жыла каля яго, разам з ім, умешвалася ў яго думы, ёю была пранізана ўся яго работа. Яна гаварыла з ім, раілася, памагала яго рабоце, поруч сядзела за сталом, побач ішла ў дарозе.

Не, тады ў іх не кончылася гаворка, але яна больш і не патрэбна.

— Ты бачыш, як нам добра з табою, Наталя, а ты так доўга старанілася мяне,— гаварыў Казімір, у думках ставячы Наталю поруч.

— Мы заўсёды былі разам, Казімір, толькі ты доўга не заўважаў гэтага,— адказвала Наталя.

— Мне здаецца, што я ўсё жыццё шукаў цябе і толькі от цяпер знайшоў. Чаму я раней не прыехаў сюды?

— Можа, якраз раней і не трэба было прыязджаць,— гаварыла Наталя.— Можа, тады ты і не знайшоў бы мяне.

— Чаму, Наталя?

— Я тады яшчэ больш баялася б цябе. Ты бачыў, як доўга я баялася цябе?

— А ты кажаш, што заўсёды была разам са мною?

— Гэта я толькі хацела так. Але я была вельмі нядобрая, Казімір.

— Што ты кажаш, Наталя, пакінь!

— А ты ведаеш, хто я?

— Не ведаю. І не хачу ведаць. Ты самая лепшая, от хто ты. Ты самая патрэбная мне, Наталя. Куды ты ідзеш?.. Пачакай!..

Мары расплываліся, аставалася ява, і Казімір адчуваў, як калоціцца яго сэрца, бо Наталі не было, было толькі адно яго каханне да яе. І з кожным днём усё большае.

Мара не была падобна на яву, і Казімір пачынаў баяцца явы. Ён стараўся не сустракацца з Наталяй. Але не гаварыць з ёю ён не меў сілы, гэта стала патрэбай яго душы. Ён з ёю спрачаўся, сварыўся, дакараў за бессардэчнасць, гневаўся, абураўся — яна была вораг яму. Ён гаварыў ёй самыя ласкавыя словы, павяраў усе думы свае, расказваў усю сваю тугу, усю радасць — яна была найбліжэйшым сябрам яго. Толькі Наталі не было, і, каб падмяніць яву,— усё гэта пісаў ён на паперы. Каб гаварыць з ёю — ён схіляўся над лісткамі, астаючыся адзін у свае доўгія вечары.

— А ты ведаеш, хто я? — пыталася ў яго тая Наталя, з якой ён гаварыў на паперы.

— Не ведаю,— адказваў той, выдуманай, Наталі Казімір.— Але ты самая лепшая, самая патрэбная мне, Наталя. Куды ты ідзеш?.. Пачакай!

— Пачакай, Наталя,— гаварыў выдуманай Наталі Казімір.— Паслухай. Ты ведаеш, што ў кожнага чалавека ёсць патрэба абавязкова раскрыцца перад другім? Без гэтага няма чалавека, без гэтага ён — нішто. І ўсё жыццё ён шукае таго, перад кім будзе мець права паспавядацца. Што гэта — сяброўства, каханне? — не знаю. Рэлігія вельмі хітра скарыстала гэтую патрэбу чалавека раскрывацца перад другім як споведзь. Нават у самых цяжкіх грахах сваіх, нават у злачынствах на споведзі прызнаецца чалавек.

І яму тады становіцца лягчэй. Ён нават робіцца тады чысцейшы. Але ж не перад кожным можна рабіць такую споведзь. Толькі перад тым, у каго верыш больш, як у сябе. Таго, каму хочацца паспавядацца, чалавек шукае ўсё жыццё сваё. А ці ведаеш ты, Наталя, што я кожны дзень гавару з табою, што ўсяго сябе я раскрыў перад табою ўжо даўно...

Лісткоў, у якіх аставаліся Казіміравы думкі, рабілася ўсё больш і больш. Яны ляжалі ў шуфлядзе яго стала. Казімір ведаў, што ён не аддасць іх Наталі і яна не будзе ведаць ні пра адно яго слова. Тым больш што і Наталя пазбягала яго — гэта бачыў ён ясна.

Аднойчы ішла яна насустрач па вуліцы, і ён добра заўважыў, што, убачыўшы яго, яна завярнула ў першую ж краму.

Але вымушана была яна прынесці акт на подпіс, і Казімір раптам наважыў, што лісткі ён аддасць.

— Адну хвілінку,—сказаў ён і, выняўшы з шуфляды, загарнуў лісткі ў паперу.— Як член рэдкалегіі вы паглядзіце, ці варта чаго мая пісаніна. А пасля мне скажаце. Добра?

— Добра,— адказала Наталя, кладучы пакецік у тарбэльку.

— Толькі абавязкова скажаце мне,— трывожна зірнуў у вочы Казімір.

— Ну, а як жа — абавязкова,— сказала яна сваім страгаватым голасам.— Нават аберагу тайну аўтарства,— пажартавала яна з той жа строгасцю і пайшла сваёй лёгкай і порсткай хадою.

Але ні заўтра, ні пазаўтра і ні разу пасля Наталя не напомніла пра лісткі. Яны сталі толькі лягчэй сустракацца — віталіся і нават маглі сказаць адно аднаму які жарт. Але пра лісткі маўчалі. Так, як бы Казімір не даваў, а Наталя не брала іх.

Можа, яна не чытала? Можа, забылася пра іх?

Неяк раз ён знарок пачакаў, пакуль яна выйдзе пасля работы. Яна выйшла запознена і здзівілася, убачыўшы яго, але твар яе на імгненне засвяціўся.

— Трошкі запазнілася, канчала чарцёж,— сказала яна, нібы ведаючы, што ён чакаў яе.

Яны пайшлі па заводскай вуліцы, абсаджанай маладымі прысадамі.

— Вы бачыце — восень. І лісты пачынаюць падаць. Праўда, хораша? Цяпер бы ў лес, на паляванне.

— Хіба любіце?

— А як жа... Не, але я не пра тое, Наталя Ігнатаўна. Вы хоць што-небудзь мне павінны сказаць.

Наталя нахмурыла бровы. Зірнула сабе пад ногі і так прайшла некалькі крокаў. Яна ведала, пра што пытаецца Казімір.

— Я не магу нічога вам сказаць, Казімір Антонавіч.

— Вы павінны сказаць. Хоць бы тое, каб я больш не трывожыў вас.

— Не магу. Нічога не скажу. Вы не зразумееце мяне.

3

Наталя прачытала лісткі таго ж вечара. Не, нават днём прачытала яна іх. Прыйшла да сябе ў аддзел, разгарнула пакецік і на першых жа словах зразумела, што гэта не газетны допіс. Яна пачула, як шчакам яе стала горача, і азірнулася — ці не глядзяць на яе. Сэрца застукала моцна, так, што здавалася, нават чуюць другія. Яна прачытала толькі некалькі радкоў і больш не адважылася: гэта можна будзе чытаць толькі тады, калі нікога не будзе. Але яна ўсё зразумела. Яна сама даўно чакала гэтага. Чакала і — баялася.

Дома яна прачытала ўсё адным духам, і здалося, што ўсё гэта яшчэ няпраўда. Прачытала яшчэ раз і задумалася. Ужо змрокі ляглі на вуліцы, у пакоі стала цёмна, а Наталя сядзела ўсё ў тым жа крэсле, апусціўшы галаву ў рукі. Калі падняла галаву, на вуліцы гарэў ліхтар, бледнае святло яго клалася на падлогу, вырысоўваючы квадрат акна. Гэтае святло лілося на Наталіны плечы, слаба іскрылася ў валасах. Як зганяючы сон, Наталя пагладзіла лоб і паківала галавою туды-сюды, туды-сюды, так, як ківаюць, калі хочуць сказаць — не!

Не, не магла яна зрабіць гэтага.

У пасцелі ўжо яна зноў прачытала ўсё спачатку. І калі пагасіла святло — старалася сказаць Казіміру, чаму не можа прыняць яго ўвагі. Яна таксама размаўляла з ім. Ён таксама быў поруч з ёю. Ёй было вельмі добра, што ён быў поруч, але яна баялася яго. Шчырасць? Як яна верыла ў яе, але ж от паламалася ў яе гэтая вера. «Ты ведаеш, што ў кожнага чалавека ёсць патрэба абавязкова раскрыцца перад другім»,— успамінала яна прачытаныя радкі. «Ведаю,— адказвала яна,— а мне хіба не хочацца гэтага? Толькі я зняверылася, Казімір, і мне цяпер вельмі цяжка

адкрыць сябе. І як жа адкрыешся, калі ёсць нешта такое, што цяжэй за грэх,—сваё сумленне. Калі яго нельга раскрыць, бо самой гэта страшна. Лепш пакінь мяне, Казімір. Я баюся сама сябе, баюся цябе, баюся ўсяго таго, што называецца сям'ёй. Ты ведаеш, што ў мяне была дачка, Казімір? От бачыш, не ведаеш. А ці ведаеш ты, што я нават не знаю, ці жывая яна? Як жа я магу адкрыцца табе, што я такая маці? Дык от жа слухай. Я кахала яго, але вельмі скора дазналася, што наша жыццё не ўдалося. Чаму? Я не вінавата ў тым, Казімір. Я кахала, як сляпая, уся, без астатку, бо не ўмею дзяліць сябе напалам. І вось аднойчы ён вельмі пакрыўдзіў мяне. Ён прыйшоў п'яны і выцер губы чужой жаночай хустачкай. Я нічога не сказала яму, бо не верыць не ўмела. А пасля да мяне прыйшла жанчына і сказала, што я адабрала ў яе мужа. Што ў іх ёсць дзіця і цяпер яно будзе без бацькі. Яны пажаніліся яшчэ ў інстытуце, але яна была недзе доўга на практыцы. І ў мяне было дзіця, Казімір. Я сказала жанчыне, што мужа вярну ёй. Я забрала Людачку і пайшла да маткі. Ён прасіў вярнуцца, кляўся, бажыўся, але верыць больш я ўжо не магла. Я ненавідзела яго гэтак жа шчыра, без астатку, як без астатку кахала. Ён больш не існаваў для мяне: ён выгараў у сэрцы разам з болем крыўды і ганьбы. З таго часу згарэла ў мяне і вера, Казімір. Я стала баяцца людзей, старанілася іх ласкі, каб не ведаць, што ў свеце, апроч шчырасці, ёсць і мярзота.

Я баялася, каб не адзічэць, Казімір, і кінулася ў работу. Пакінуўшы Людачку на маму, я паехала з экспедыцыяй па праектаванні гарадоў. Гэта ж мая любімая работа — мензула, нівелір, планшэт, калька і прасторы зямлі, запісаныя на паперу лініямі і матэматычнымі знакамі. Рабіла я гэта яшчэ і таму, што хацела, каб не бачыць яго. І тут, мабыць, была другая мая памылка: я страціла сям'ю. Пачалася вайна, экспедыцыя распалася, дадому вярнуцца я ўжо не магла.

Каб не астацца пры немцах, маці пусцілася ў эвакуацыю. Яна спадзявалася знайсці мяне, везла мне Людачку. Але яна загінула па дарозе, Казімір, ад самалётных расстрэлаў. Вось бачыш — калі загінула разам з ёю і Людачка, дык я нават не ведаю, дзе яна пахавана. Я не хачу ў гэта верыць. Мне трэба яшчэ знайсці яго, бо я ведаю, што ён часта бываў у мамы, можа, ён і папраўдзе любіў дачку. Не можа быць, каб ён не ведаў пра яе, але яго я шукаць не магу. Гэта вышэй за мае сілы.

Дык вось ты бачыш, якая я, Казімір? Ты бачыш, якая я маці? Мне пра гэта нельга сказаць не толькі табе, мне пра гэта страшна сазнацца нават самой. Ты мяне адразу знелюбіў бы за гэта. Не, Казімір, на споведзі гавораць не ўсё.

Можа, ты падслухаў, што мне таксама цяжка адной, але ж я не магу прыняць цябе. Дарага заплаціла я за веру сваю і баюся, што больш не буду такой, як была. Я буду азірацца, буду насцерагацца — гэта будзе пакута і мне і табе. Я буду ашукваць, бо буду не ўся з табою, а я так не ўмею, Казімір.

Дзякую, што ты абудзіў у мне добрыя чалавечыя хваляванні, але я не магу працягнуць табе рукі. І я нічога не раскажу табе, не трэба. Навошта, каб ты знаў, што я не варта таго, каб ты кахаў мяне».

Толькі пад раніцу заснула Наталя, ведаючы, што Казіміру яна можа сказаць толькі адзінае слова — не!

4

Гадзіне а дзевятай Казімір варочаўся з партвучобы. Дарога ад гаркома да завода была даволі доўгая. Казімір не сеў на аўтобус — захацелася прайсці, абдумаць новыя акалічнасці ў сваім жыцці. Настрой быў двоякі: было ў ім трошкі тугі і была тая радасная трывога, якая заўсёды апаноўвае чалавека, калі перад ім адкрываюцца новыя далячыні.

Глаўк прыслаў ліст, у якім прасіў, каб Казімір вылучыў кандыдатуру на пасаду галоўнага бухгалтара, бо ў вызваленым Бабруйску трэба аднаўляць работу на заводзе і яму, Казіміру, трэба будзе вярнуцца туды. Казіміру было сумна, бо ён тут здружыўся з народам, прывык да яго, і цяпер не хацелася пакідаць і гэтых мілых дзяўчатак, якіх ён панавучваў сапраўднай рабоце, і свае канторы, і свайго стала з прывычнаю лямпаю на ім, з паперамі то на подпіс, то для адказу, то для тэрміновага выканання. Усё гэта стала блізкім, патрэбным, звязаным кроўна з заводам, з яго жыццём, якое дыктавалася таксама патрэбамі фронту. Шкода стала пакідаць дырэктара, інжынераў, начальнікаў цэхаў, з якімі не раз прыходзілася і сварыцца і мірыцца, як гэта заўсёды бывае ў дачыненнях галоўбухаў і гаспадарнікаў.

Шкода было рабочага Карымава, што аднойчы ледзь не папусціў у Казіміра яго ж прэсам, калі ў касе доўга не

было грошай на заработную плату. Шкода было пакідаць Наталю...

У гэтай плыні думак была туга. Радасна і трывожна было, наадварот, ад таго, што ён вернецца на свой завод. У думках ён бачыў, як пад'язджае да Бабруйска, прыглядаецца да яго абрысаў, як пазнае і не пазнае яго. Вось знаёмыя вуліцы, дамы, плошчы, і хочацца ўбачыць і пазнаць людзей. І вось завод з яго карпусамі — галоўным, вапнавым, механічным, са складамі гатовай прадукцыі — высокімі круглымі цыстэрнамі, да якіх па эстакадах праз увесь двор ад галоўнага корпуса цягнуцца металічныя трубаправоды. Вось корпус заводакіраўніцтва, кабінет дырэктара, кантора бухгалтэрыі, планавага аддзела, аддзела забеспячэння і збыту. Розумам Казімір знае, што там цяпер можа быць усё не тое, але ён уяўляе і таго ж дырэктара, які выходзіць аж з-за стала, каб прывітацца і абняць яго, і таго ж галоўнага інжынера, маўклівага з бародкай чалавека, і начальнікаў аддзелаў, і лабарантаў. У бухгалтэрыі стаяць тыя ж сталы, тыя ж картатэкі, і ён чуе шоргат арыфмометра. Да яго ў кабінет заходзіць яго ж намеснік Уладзімір Бернасевіч; высокі, кучаравы, ён усміхаецца сваёй вечна здзіўленай усмешкай і працягвае руку.

— А божа мой! — кажа Бернасевіч, здзіўлена падымаючы бровы.— Колькі ж гадоў мы не бачыліся, ну як жа маешся, дзе быў?

Казімір пацепвае плячыма і толькі цяпер заўважае, што гэта ад холаду. Ноч. Не вельмі густа гараць ліхтары, кладучы на вуліцу плямы святла, больш ясныя, толькі каля самых слупоў і вельмі бляклыя, перамешаныя з туманом наводдаль. Азіяцкая зіма, дзе снег толькі для прыклёпу выпадзе ўночы, каб раскіснуць у туман і зрабіць зямлю сырой, волкай, упляскаць у яе паасыпаныя лісты. Нядобрая, азызлая зіма, і не мароз, а вось гэтая тумановая слата прабіраецца аж да касцей. Толькі схамянуўшыся ад дум, Казімір папраўдзе чуе, што яго працінае гэтая волкая сырасць і на спіне ные параненая асколкам снарада лапатка. Яшчэ не так позна, а тут, на гэтай далёкай вуліцы, ужо мала людзей. Калі хто пройдзе — падэшвы доўга чмякаюць па абмакрэлым тратуары. Не паспеўшы апасці, амярцвелыя лісты акацыі здаюцца павырэзванымі з іржавай бляхі: на іх бледна паблісківаюць кропелькі расы. Сяды-тады яны падаюць на тратуар, на плечы.

У главук Казімір даў рэкамендацыю. На пасаду галоўнага бухгалтара ён параіў прызначыць Азізава, які вяр-

нуўся з фронту без нагі. Заўтра ён пачне пацiху перадаваць яму справы. У намеснікі няхай сабе возьме Шуру Дзядову — дзяўчына вельмі варта таго, каб яе павышаць. Трэба будзе сяго-таго, вядома, пераставіць. Ну, ды цяпер лёгка — на групу па зарплаце таксама вярнуўся франтавік...

Словам, Казімір жыў ужо новым жыццём. Бадай што год прайшоў непрыметна. Цяпер ён адчуваў сябе, як госць, якому і пагасцяваць яшчэ хацелася б і дадому трэба спяшацца. Але, як яму здавалася, у яго яшчэ многа асталося ўсялякай недаробленай работы — дзе што пачатае аформіць, дзе паказаць, дзе расказаць, дзе параіць, як павінна ісці далей. Ад гэтых сваіх новых дум ён прыбавіў хады і на паваротцы, нават не задумаўшыся, павярнуў на завод. Ён пасядзіць там у цішыні і цяпле. Падпіша банкаўскія дакументы на заўтра, якія, ён ведае, падрыхтавалі і палажылі яму на стол. Прагледзіць і падпіша баланс, калькуляцыі, усе формы гадавой справаздачы, якую толькі паспелі закончыць і якую ён сам жа павязе ў главк.

Але ва ўсіх гэтых клопатах і думах увесь час жыло пачуццё нейкай нявыгашанай трывогі. І ў адчуванні добрай развітальнай тугі, і ў яўленні новай будучай дзейнасці, якой ён пачынаў поўніцца загадзя, увесь час жыла Наталя.

Дзе і чым цяпер занята яна? Спіць? Чытае кнігу? Адна? А ці адна? Ну, што ж, можа, і не адна. І нават напэўна, што не адна. Але ж гэта справа яе — яна сама сабе гаспадыня. От развітаюся, і —быццам нічога і не было. Быццам і не сустракаўся. Толькі трохі сорамна — лісткі гэтыя. Навошта было пісаць іх? Навошта перадаваць? Як хлапчук які. І чаму ўсё ж не адказала?

І раптам Казіміру захацелася пайсці і развітацца з Наталяй. Каб не думала, што ён на яе гневаецца. Ён жа нічым не пакрыўдзіў яе, і няхай астанецца ў яе добрая памяць аб ім.

Казімір павярнуў назад, але чым бліжэй падыходзіў да таго дома з высокім ганкам, тым больш брала сумняванне: а ці добра ён робіць? «Навошта дэманстрацыя,— думаў ён,— я ж магу развітацца і на рабоце. Яшчэ не раз пабачуся. Тым больш што ўжо ноч. А яна падумае бог ведае што».

Крокаў колькі не дайшоўшы да дома, Казімір павярнуўся і рашуча пайшоў на завод. Ад такога яснага рашэння стала спакойна на душы. «Не забыць праверыць, ці падрыхтавалі дакументы на пазыку пад гатовую прадук-

цыю»,— думаў Казімір, уяўляючы, як зараз зойдзе ў кабінет, сядзе за свой стол, закурыць, сагрэецца.

Гулка прайшоў Казімір па пустым калідоры, асветленым ад беражлівасці адной цьмянай лямпачкай. Каля аддзела капітальнага будаўніцтва ён спыніўся. Так, нічога не думаючы, націснуў на дзверы, і яны адчыніліся. Ён спыніўся ўражаны: за сваім сталом, пад высокай чарцёжнай лямпай, угнуўшыся, сядзела Наталя, і плечы яе ўздрыгвалі. Яна плакала.

— Што з вамі, Наталя? Што сталася? Можа, якое няшчасце? — пытаўся Казімір, нагінаючыся і кранаючыся яе плеч.

Наталя падняла твар, мокры, гарачы і зусім не такі, як прывык бачыць Казімір,— бездапаможны, пакорлівы.

— Нічога,— сказала яна, шукаючы хустачкі — то ў рукаве, то на грудзях за блузкай.— Мне вельмі цяжка.

— Вас пакрыўдзілі? У вас непрыемнасці? Дома ці на рабоце?

Наталя кіўнула галавою: не.

— Цяжка,— паўтарыла яна.— У мяне была сям'я. І нікога няма. Нікога не асталося. Няхай бы хоць дзеці былі ў мяне. Няхай бы была ў мяне дачка...

Казімір сціснуў Наталіну руку і пацалаваў яе. Потым стаў цалаваць лоб, скроні, губы, мокрыя і салёныя ад слёз.

ЧАСЦІНА ТРЭЦЯЯ

1

Наталя зрабіла памылку, не сказаўшы Казіміру, што ў яе была дачка. Быў муж, ды няма яго, хіба мала параскідала людзей вайна, папакідала жанчын удовамі? Цяпер няма ў яе мужа. І няма чаго пра гэта ўспамінаць.

— Нам трэба жыць спачатку, Казімір,— сказала яна.— Аберагаць тое, што належыць нам. А тое, што прайшло,— гэта не наша, і нам пра яго ніколі не трэба ўспамінаць. Добра?

Так пражыла Наталя дванаццаць год.

2

Не толькі шчаслівай, а самай шчаслівай лічыла сябе Наталя. Гэтае шчасце вымяралася не тым, што ў сям'і быў дастатак, што не было сварак, п'янства, разбэшчанасці.

Шчасце было ў тым, што яны былі вельмі патрэбны адно аднаму, што патрэбен быў клопат, рупесак, што ва ўсім адчувалася вера, спагада, нешта такое, чым запоўнена ўсё жыццё.

Казімір, тады ж пераехаўшы на свой завод, працаваў на ім, заўсёды захапляючыся і любячы яго. Часамі главк пасылаў яго на рэвізію на другія заводы: у Канск, у Таўду, у Лысьву. Наталя нават гэтыя паездкі любіла, бо Казімір прыязджаў з іх нейкі новы, яшчэ больш любы ёй.

Адчуванне поўнай сямейнай удачы давалі таксама дзеці: Стасіку ішоў дзесяты год, Святланцы — восьмы. Наталя любіла іх выпраўляць у школу, пра кожнага непакоячыся, кожнага аглядаючы, а пасля чакаць — з хвіліны на хвіліну, з хваліны на хвіліну,— аж пакуль не паяўляліся яны ў дзвярах, прыносячы з сабою шум, гаману, свае дзіцячыя клопаты. Любіла чакаць Казіміра, каб тут ужо сесці разам, паабедаць, пагаварыць пра ўсе тыя справы, якімі як бы падводзіцца пэўная рыса дня.

— Ты пад'еў? — звычайна пыталася Наталя.

— Госпадзі, ну а як жа.

— А можа, яшчэ шкляначку кампоту?

— Ды што ты, не магу.

— Ну ідзі адпачні.

Выпадалі вечары, поўныя нейкай асаблівай хатняй утульнасці, і Наталі хацелася ўспомніць і нанава перабраць усё самае лепшае, што ляжала ў закутках памяці.

— Не, як гэта магло здарыцца, што ты прыехаў і от мы сустрэліся,— гаварыла Наталя, хочучы пабыць хоць хвіліну там, у сваіх успамінах.

— А ты ж мудравала — памятаеш? — знарок хочучы, каб ахвотней хадзілася па далёкіх сцежках памяці, жартаўліва падцвельваў Наталю Казімір.

— Не, мудрошчаў там ніякіх не было,— не хацела заварочваць у гэты завулак Наталя.

— Чакай,— Казіміру таксама захацелася высветліць некаторыя акалічнасці.— А калі ўсё ж ты заўважыла мяне? Я дык адразу — як убачыў цябе ў тваім кутку. Ты нават воч тады не падняла.

— Не падняла, а ўсё роўна ўсё бачыла. Як ты доўга глядзеў на мяне — бачыла. Лепш кажучы, я гэта проста адчувала.

— Ну, добра. А от чаму ўсё-такі на тыя лісткі не хацела адказаць?

— Я баялася, Казімір. Мне думалася, што ўсе, усе вы, мужчыны... вельмі нядобрыя.

— І каб я тады не зайшоў да цябе ўвечары, то так бы мы і раз'ехаліся, праўда ж?

— От, можа, таму я і плакала. Але ў мяне ўжо ўсё было надумана. Я сама ў сабе ўсё перажыла. І ведаеш, хто памог мне?

— Хто?

— Памятаеш Ніну, дырэктараву сакратарку, кучаравая такая, поўная? Яна.

— Як жа гэта?

— Яна расказала мне, як каля цябе ўвіхалася: у кіно вадзіла, у госці да сябе запрашала. Старалася. Было гэта?

— Было,— сазнаваўся Казімір.— Бо да цябе ж не даступіцца было.

— Ну от я і надумала. «Ах, так! — сказала я сабе,— не аддам жа! Не дачакаешся!» Так што твая Нінка памагла мне.

Казімір рагатаў. Нават жартам гаворачы «твая Нінка», Наталя натапырвалася, у вачах пабліскваў гнеўны агеньчык. Гэта нават падабалася Казіміру.

І калі ўспаміны затухалі, і калі гэтымі ўспамінамі як бы зноў абнаўлялася і абмалоджвалася жыццё, радая, поўная шчасця, Наталя гаварыла:

— Я нават не ўяўляю, як гэта магла б жыць без цябе. Як гэта магло б быць, каб мы былі чужыя або не ведалі б адно аднаго. Не магу нават гэтага думаць.

І потым, як бы ставячы зноў усё на сваё месца пасля таго, як усё было прагледжана і перабрана, гаварыла:

— Колькі я ні гляджу на другіх, то ўсё роўна ў іх не так, як у нас, Казімір. Мне здаецца, што ў нас лепш за ўсіх. Лепш за ўсіх, Казімір, а?

3

Але гэта была адна старана Наталінага жыцця. Другой стараны жыцця Наталя не паказвала нікому, нават ад самой сябе хавала яе. Гэтай другой стараной жыцця была дачка.

Першыя часы Наталя была ўпэўнена, што дачка ў яе загінула разам з маткаю. У гэтым было хоць нейкае лагічнае супакаенне. Але думкі не спыняліся на гэтым. Думкі пыталіся ў Наталі — а ці добрая ты маці, што ты не ўпэўнена ў гэтым, бо ты нават не ведаеш, дзе і як пахавана

твая дачка? Тады пачыналіся сумняванні. І сумняванні падмацоўваліся тымі акалічнасцямі, што паблізу маткі мог жа быць і ён. Яна ведала, што ён вельмі часта заходзіў праведаць дачку. Ён такі любіў яе. Ён прыносіў ёй цацкі, прысмакі. То ці мог тады ён у апошнюю хвіліну пакінуць іх? І ці абавязкова, каб разам з маткаю загінула і дачка? А можа, яна дзе асталася на людзях? Можа, нават дзе ён падабраў яе?

Тады, на першым часе, яна атрымала пісьмо ад жанчыны, з якой ехала маці, і тая пісала, што са старымі пахавалі многа і дзяцей. Гэта засланіла тады ўсё, напоўніўшы яе адчаем, пачуццём абыякавасці, крыўды на свой лёс аж да таго, што ёй не хацелася нікому нават падаць пра сябе голасу. Што сказаць ім, чым пахваліцца, хіба сваімі няшчасцямі? Не, лепш няхай ніхто нічога не ведае пра яе. Але з часам, як пачалі тачыць сумняванні, яна жахнулася сама, што так зрабіла. Ёй цяпер было душна і цесна, страшна перад сабою, перад усім светам, перад Казімірам.

Як толькі Наталя пакахала Казіміра, яна не сказала яму пра сваю сям'ю. Не сказала, па-першае, таму, што не хацела расказваць пра свой боль і абразу, пра тое, што нехта так злосна пакрыўдзіў яе. Ёй было брыдка гаварыць пра гэта. Гордасць — таксама жаночае хараство. На тым жыцці яна паставіла крыж і не захацела ўспамінаць пра яго. Няхай лепш Казімір думае, што так, як і ўсе, яна была шчаслівая і што гэтае шчасце забрала вайна. Гэта была першая памылка. Не сказала, па-другое, таму, што, страціўшы раз веру ў чалавечую праўду, гэтак жа баялася і Казіміра, доўга не давяраючы яму свае душы. Не сказала яшчэ і таму, што, закрэсліўшы жыццё сваё з тым, не хацела, каб яно лажылася ценем на іх з Казімірам жыццё. Яна аберагала гэтае жыццё як магла. І па меры таго як усё часцей і часцей прыходзіла вера ў тое, што недзе можа жыць дачка, станавілася ўсё цяжэй і цяжэй сказаць пра гэта Казіміру. Бо ён павінен быў ведаць пра гэта з першага дня. Значыць, прыходзілася таіць усё гэта толькі ў сабе.

І з часам, прыходзячы дахаты, усё часцей пачынаў заўважаць Казімір нешта вельмі незнаёмае ў Наталі: засмучаны твар, сляды душэўнай трывогі, часамі сляды нядаўніх, старанна выцертых слёз. Бывала, што Наталя плакала над прачытанай кнігай або ў кіно.

— Што з табою, Наталя, ты нешта перажываеш? — пытаўся тады Казімір.

— Я не магу, калі дзе паказваюць маленькіх дзяцей ці

сірат. Мне гэта цяжка, Казімір. Ты не вадзі мяне на такія карціны.

Аднойчы ўсе яны былі дома, збіраліся папалуднаваць, як на ніжнім паверсе ў калідоры пачуўся немы дзіцячы крык. Дзіця крычала высока, рэзка, захлібіста, няйначай, як з ім было нейкае няшчасце. Наталя кінулася ў дзверы, адным махам зляцела па ўсходах уніз, і праз момант ужо чуваць было, як яна з некім сварылася: нехта адказваў ёй глуха, нехаця, але злосна, а плач заціх, відаць, дзіця завялі ў кватэру. Вярнуўшыся, Наталя ўся дрыжала.

— Што такое? — пытаўся трывожна Казімір.

— Звяры! Звяры, а не людзі,— задыхаючыся, гаварыла Наталя.— Дзяўчынка гуляла на двара, а Зямніцкая выскачыла, схапіла за валасы і пачала біць, госпадзі, як біла, што дзіця аж пасінела. Той пара было збірацца ў школу, а яна загулялася. Толькі падумаць! Ты разумееш, яна ёй не родная — мачыха! — дык от са свету гатова збыць. Не, гэтага я так не пакіну, я пайду ў суд, я... Каб ты толькі чуў: я палажыла яе ў пасцель, а яна ўсё ўсхліпвае: або ўцяку, або жыць не буду. Да чаго давялі дзіця! Яно ж вырасце з пакалечанаю душою.

Наталя адчувала сябе як злачынец. Перад кім? Перад сабою, перад памяццю дачкі, перад Казімірам — яна не ўсведамляла. Можа, перад усімі разам на свеце. Але ёй было ўсё цяжэй і цяжэй насіць гэтую кару ў сабе самой.

«У кожнага чалавека ёсць патрэба абавязкова раскрыцца перад другім»,— успаміпала Наталя некалі сказаныя Казімірам словы. «А калі ёсць нешта такое, што цяжэй за грэх,— сваё сумленне, і ў ім нават перад сабою цяжка сазнацца»,— успаміпала Наталя свае думкі. Яна адчувала, што тая памылка яе прывяла да самага страшнага — да адзіноты, калі ты хаваеш сябе ад другіх.

«Не, спавядацца трэба да канца,— думала Наталя.— А іначай гэта будзе доўгая, вечная кара».

4

Не заўважаючы таго, што яна ашуквае не толькі Казіміра, а ашуквае нават сябе, Наталя гаварыла:

— Мы з табою проста злачынцы, Казімір. Жывём, як хутаранцы ці як адшчапенцы. Замкнуліся ў сабе і нават не ведаем — а можа, у нас дзе якая і радня асталася.

— У мяне нікога не асталося, Наталя, я гэта ведаю. А ў цябе калі ёсць, то даўно пара пашукаць.

— У першыя часы я пісала ўсюды, але нідзе нікога не аказалася. Ну, але ж...

— От іменна — людзі былі параскіданы па ўсім свеце. А цяпер жа... абавязкова трэба зноў пашукаць. А можа, і цябе дзе хто чакае.

Наталя ажывілася. Яна атрымала нібы афіцыйны дазвол заглянуць у сваё мінулае. Але дзе шукаць яго? Гэта ж далёкае юнацтва. Гады маглі даўно перайначыць лёс кожнага, кожнаму даць свой шлях, сваё месца. Сябровак яна, вядома, не знойдзе. Родных? Хто ж мог астацца? Хіба адна толькі цётка Мальвіна.

Наталя добра разумела, што толькі цётка Мальвіна ёй і патрэбна, бо толькі яна магла знаць пра яго. Цётка Мальвіна любіла Наталю вельмі і, вярнуўшыся з фронту, куды пайшла санітарыць з першых дзён вайны, не магла не шукаць яе. І, напэўна ж, магла шукаць і праз яго. Калі б Наталя знайшла яе, то тады нарэшце стала б спакойнай.

Дарагая, мілая цётка Мальвіна! Каб ты ведала, як мне хочацца бачыць цябе. Табе — я ўсё, усё расказала б. Ты мяне зразумела б адразу, я гэта ведаю. Я ніколі нічога не таіла ад цябе. Дзе ты цяпер? Ты ніколі не мела свайго сталага месца — з дзядзькам Прахорам вы вечна падарожнічалі па краіне з канца ў канец, то на новыя будоўлі, то на новыя пошукі,— і я не вінавата, што дасюль не магла знайсці цябе. А праз другіх я шукаць цябе не хацела, бо ўсё баялася, каб не наткнуцца на яго. Я не хачу, каб ён ведаў пра мяне. Калі ён жывы, то няхай лепш думае, што я загінула,— я не дам яму знаць пра сябе нізавошта. Ты за гэта занадта не сварыся на мяне, дарагая цётка Мальвіна.

Час ад часу Наталя прыгадвала, дзе быў у яе хто блізкі, пісала ім — хто маўчаў, хто адказваў, але гэтыя адказы не цікавілі яе. У іх былі пабочныя, вельмі далёкія ад яе інтарэсы: той памёр, той ажаніўся, тыя недзе раз'ехаліся па свеце. І толькі. Спакойныя паведамленні, у якіх няма ні жывых пачуццяў, ні хвалявання. Наталя рвала гэтыя лісты з адчуваннем нейкай прыкрай злосці,— яны толькі палохаюць яе, толькі непатрэбна вярэдзяць спадзяванні.

Успомніла Наталя яшчэ адзін адрас, зусім безнадзейны: недзе ў Кашыне жыла далёкая радня дзядзькі Прахора — старэнькая цётка Маня. Цётка Маня помнілася Наталі па сваёй звяглівай дабраце, па старэчай прыдзірлівай строгасці, па куфрах, акованых палоскамі жалеза, у якіх было поўна таго дабра, якое даўно выйшла з ужытку і мо-

ды, але якое звычайна берагуць для нашчадкаў. У такіх куфрах звычайна ляжыць і папера, з якой нашчадкі павінны будуць даведацца, што каму адказана з гэтага дабра. Ці жыва яна, цётка Маня? Госпадзі, цяперся гэта было — дзе ж ёй жыць! Але захацелася, каб сумленне хоць тут было чыстае да канца — Наталя напісала і ёй.

І от — так жа бывае! — неўзабаве Наталя атрымала два лісты.

5

Была нядзеля. Сонечны, добры дзень ранняй восені. Седзячы на канапе ля нізенькага століка, Казімір чытаў газеты. Дзеці гулялі на вуліцы. У Наталі, як звычайна ў гаспадыні ў святочны дзень, было безліч дробнага клопату: то заслаць, то прыбраць, то выцерці пыл, то падумаць, што згатаваць паесці. Тым больш што збіраліся ўсёй сям'ёй схадзіць на Бярэзіну і трэба было нарыхтаваць чаго ўзяць з сабою. На ўвесь дзень.

— Можа, я што памог бы табе? Ты скажы, гэта ж будзе скарэй,— як заўсёды адчуваючы сябе няёмка, калі бачыў, што не можа чым-небудзь карысным заняцца, гаварыў Казімір.

— Адпачывай. Упраўлюся, паспеем.

У дзвярах зазваніў званок. Наталя адчыніла, сказала некаму «дзякуй», тут жа вярнулася з двума лістамі ў руках і, бледная, села на канапу.

Пісала цётка Маня. Божа мой,— жывая, хто б мог падумаць! Наталя чытала вельмі скоранька, прабягала міма ўсё непатрэбных, усё непатрэбных слоў: рада, што знайшлася, чаму так доўга маўчала... якава ў цябе сям'я, я ўжо зусім старая, жыву пры ўнучцы... Нарэшце, вось і патрэбнае: цётка Мальвіна з дзядзькам Прахорам цяпер у Яраслаўлі, доўга іх не было чуваць... Цётка Мальвіна не раз па табе плакала, я ёй зараз жа пра цябе дам тэлеграму...

У Наталі дрыжалі рукі — другі ліст быў ад цёткі Мальвіны. Гэта яна пазнала адразу невядома па чым — можа, па сваім хваляванні. І па гэтых першых словах: «Дарагая мая Наталька, дзе ж ты была?..»

Вось гэта і было ўсё, чаго чакала Наталя. Твар яе гарэў, губы яна прыкусіла, каб не заплакаць. Усё-ўсё, кожнае слова тут было патрэбнае. «Не магла знайсці, бо ў цябе ж, выходзіць, новае прозвішча... Але ж ніколі не ве-

рылася, што ты магла загінуць... А цяпер скажу пра самае галоўнае для цябе — ці ведаеш ты, што Людачка твая жывая. Як магла ты зрабіць, каб дачка нічога не ведала пра цябе...»

Наталя ўскрыкнула тым страшным голасам, якім могуць крычаць толькі маткі па сваіх дзецях, і закрыла твар рукамі, захлібнуўшыся ў рыданні.

Казімір толькі цяпер заўважыў на Наталіных каленях лісты.

Ад нечаканасці ён не паспеў апамятацца і толькі бачыў, як брызнулі між пальцаў Наталіных слёзы і сутаргава закалаціліся плечы.

— Што з табою? — разгублена папытаўся ён.

Наталя выхапіла з рукава хустачку, выцерла слёзы і, усхліпваючы і рыдаючы, зноў прыпала да ліста. Яна чытала, не перастаючы плакаць; слёзы цяклі па шчаках, аблівалі губы і падалі на ліст. Хустачка тут жа стала мокрая, яна не высушвала шчок, а толькі развозіла слёзы па твары. «Божа мой!» — ускрыквала Наталя і тут жа хапалася чытаць ліст далей.

— Што з табою, Наталя?

Але Наталя не чула, пра што пытаецца ў яе Казімір. Яна не бачыла нават ліста. Нейкім новым, невядомым ёй пачуццём яна як бы ўгадвала ўсё тое, што ў ім напісана... «Ён не сышоўся з той першай жанчынай — ажаніўся нанава. Я не ведаю, добрая яна ці благая, можа, яна найлепшая, хоць гэта бывае рэдка, але ж ты разумееш, як дзіцяці цяжка адно тое, што ў яго няма роднае маткі. Горш за ўсё, што Людачка не ведае людскіх трагедый і не ведае, як думаць пра цябе: хто ты ёй, ці была ты ў яе і як пакінула яе... Ён яе вельмі любіць, мабыць, сам адчуваючы перад ёю сваю віну... Ёй пятнаццаць гадоў, а яна ні разу не адчула матчынай ласкі. Ёй сказалі, што маткі ў яе няма, але сваім дзіцячым чыстым сэрцам яна не верыць у гэта і спадзяецца, што яшчэ цябе знойдзе. Я сказала ёй, што ў яе была самая лепшая маці на свеце. Я старалася зрабіць так, каб яна ніколі нічым не магла папікнуць цябе...»

Рыданні душылі Наталю. Яна ўпала тварам у калені, заціснуўшы ў руках мокры пакамечаны ліст, і плечы яе калаціліся так, што Казіміру зрабілася страшна.

— Наталя, Наталька, што такое, скажы! Што з табою, скажы, Наталя! — сціскаючы плечы рукамі, сіліўся супакоіць яе Казімір.

У страшэнным горы і адчаі Наталя паўтарала толькі «божа мой!», яшчэ больш пужаючы Казіміра. Ён не ведаў, што рабіць, што падумаць, чым памагчы, адчуваючы толькі адно: што здарылася нейкае непапраўнае няшчасце.

Нарэшце Наталя падняла твар, і Казімір не пазнаў яго. Так выглядаюць толькі пасля страшэнных, нечалавечых пакут.

— Казімір,— сказала Наталя, мяшаючы з рыданнямі словы.— Я нічога не казала табе, хацела, каб ты быў спакойны: у мяне ёсць дачка.

— Як так? — здзіўлена папытаўся Казімір.

— Я хацела, каб табе было добра, каб ты нічым не мог папракнуць мяне,— гаварыла Наталя.— Я нават не ведала, што яна жывая.

— Што ты кажаш? — яшчэ больш здзівіўся Казімір. Ён устаў. Ён не паспеў яшчэ разабрацца ў гэтай нечаканасці і не верыў сабе — ці праўда гэта?

Першае адчуванне было тое, што ён уявіў маленькае, кінутае дзіця, і ў гэтым было нешта нядобрае, грэшнае. Але тут жа ён зразумеў, што гэта звязана з Наталяй, і яму стала непрыемна і балюча. Не паспела акрэсліцца гэтае адчуванне, як узнікла новае: што ўсё гэта звязана з ім. Чаму Наталя зрабіла так, чаму дасюль не сказала? Не верыла? Баялася? То хто ж ён ёй такі? То ці ж можа быць каханне, калі няма веры? Як гэта нядобра і крыўдна. Незаслужана яго зняважыў блізкі, родны чалавек. Перад ім была не тая Наталя, якую ён ведаў увесь час. Хто ж яна такая? Была не адна Наталя, а былі дзве. Другую ён убачыў цяпер упершыню. Каторая Наталя была з ім? Каторую Наталю ён ведаў? Што — яна ашуквала яго ці аберагала? Бессардэчнасць гэта ці мужнасць? Што — яна стала цяпер лепшая ці горшая? Ён хадзіў па пакоі, адчуваючы, што здарылася нешта вельмі важнае ў яго жыцці. Што яшчэ не ўсё ясна. Што недзе ў сабе яму трэба зразумець нешта яшчэ большае. Наталя зрабіла вельмі дрэнны, вельмі дрэнны ўчынак. Але перад кім? Перад ім, перад тым невядомым, малым дзіцянём? Ці перад усімі?

Ці толькі перад сабою?

— Ты... як жа ты магла, Наталя,— суняўся ён перад ёю.— Якая ж ты нехарошая. Якая ты... што ты нарабіла, Наталя!

Можа, за ўсё жыццё ў Наталі не было патрэбы абараніцца. Можа, за ўсё жыццё не было смеласці абараніць сваё права мацеры.

— Не гавары нічога, Казімір! — рашуча і злосна бліснулі яе вочы.— Не чапай! Я ведаю, што я нягодніца, і за свой грэх буду адказваць сама. Я ведаю, што табе будзе цяжка чужое дзіця, але я забяру яе. Можаш не прагаянць — я сама пайду ад цябе, Казімір, але ўсе дзеці будуць са мною. Я не буду табе дакучаць нічым.

Тое нешта яшчэ большае, што трэба было зразумець Казіміру, ён паволі пазнаваў. Перад ім была новая Наталя. Не, не новая, але такая, якой ёй яшчэ не ведаў. Яна была яшчэ лепшая, яшчэ даражэйшая яму. Ён дзівіўся, толькі цяпер дазнаўшыся, колькі пакут яна выцерпела дзеля яго.

— Я не буду нічога ад цябе дамагацца, Казімір,— казала Наталя, нібы гаворачы сама з сабою.— Я нічога не гаварыла табе, бо нічога ў сваім жыцці не магла паправіць. Ведай толькі адно, што за ўсё наша з табою жыццё я ні на адну хвілінку не адчувала сябе спакойнай. Ты нават не ведаеш, колькі ўпотай ад цябе выплакана мною слёз. Думаеш, я была шчаслівая? Я крала гэтае шчасце ад цябе, ад сябе, ад усіх людзей, бо не мела права быць шчаслівай. Ты можаш ненавідзець мяне, можаш плюнуць мне ў твар, ад гэтага мне будзе толькі лягчэй.

— Ах, якая ж нехарошая ты, Наталя,— паўтарыў Казімір. Наталя гнеўна бліснула вачыма: не, таго, што яна лічыць святым, яна бэсціць не дасць! Яна памкнулася нешта сказаць, можа, крыўднае, можа, дзёрзкае, нешта апошняе, але Казімір перабіў яе.— Я не сварыцца на цябе збіраюся і не праганяць цябе. Зараз жа збірайся і едзь па дачку! — сказаў ён раптам строга.— Чуеш? Трэба ехаць па яе неадкладна!

Наталя здзіўлена паглядзела на Казіміра. Ці гэтага яна чакала? Ці праўда гэта? Ці можа гэта быць? Ці няма тут насмешкі, здзеку, знявагі? Ці можна ёй у гэта верыць? Але Казімір падышоў, узяў яе галаву ў свае рукі, прытуліў да сябе.

— Як жа ты магла маўчаць і пакутаваць? Яна ж даўно магла быць разам з намі. Гэта ж будзе такое...— Казімір задумаўся, можа, шукаючы слоў, можа, нешта ўспамінаючы.— Гэта ж будзе такое шчасце дзіцяці, толькі падумаць. Знайсці родную матку, а? Ах, якая ж ты дурная, Наталя.

Зноў закалаціліся Наталіны плечы, але гэта ўжо ад сапраўднага чалавечага шчасця.

Казімір праводзіў Наталю на цягнік. Наталя была свежая, румяная, вочы яе гарэлі тым агнём, які бывае заўсёды, калі чалавек ахоплены трывожнай узрушанасцю.

— Я нават не ведаю, як яна выглядае, Казімір,— гаварыла Наталя.— Я, мабыць, не пазнаю яе. Пакінула трохгадовым дзіцем, а сустрэну пятнаццацігадовай дзяўчынай. Як мы сустрэнемся? Што я скажу? Як яна на мяне паглядзіць? Я вельмі хвалююся, Казімір.

— Ну от табе маеш, не трэба. Пабачыш, што ўсё будзе добра. Вельмі добра.

— А раптам — не аддадуць?

— Як гэта не аддадуць? — нават абурыўся Казімір.— Ды, нарэшце, гэта глупства: яна будзе рашаць сама.

Наталя то ўкладала на палку рэчы, то перастаўляла іх; то адкрывала сумку, то закрывала; то зашпільвала на сабе кофтачку, то, як ад гарачыні, расшпільвала яе. Ох, як гэта цяжка цярпець, калі хочацца, каб час праляцеў як адно імгненне. Ну, хоць бы ўжо крануўся цягнік!..

Казімір ішоў дахаты паволі-паволі. Стаяла перад вачыма ўсё, што прайшло за гэты дзень. А які ён быў вялікі. Ён пачынаўся недзе адтуль, можа, ад першага знаёмства з Наталяй. Бо ён сёння як бы нанава сустрэўся з Наталяй і нешта вельмі важнае пазнаў у жыцці. Што — ён не хацеў разбірацца ў ім, але на душы было цёпла, светла, так, нібы спачатку пачыналася і жыццё, і каханне, і ўсе трывогі і радасці, звязаныя з ім. От цяпер ён будзе чакаць Наталю так, як чакаў першых сустрэч, з тым жа маладым хваляваннем.

«Мне здаецца, што ў нас лепш за ўсіх»,— успамінаў ён Наталіны словы і ў думках адказаў ёй:

— Харошая ты мая Наталя, пакутніца ты мая дурненькая,— цяпер у нас папраўдзе будзе ўсё найлепш.

НАД ГАЕМ КРУЖЫЛІ БУСЛЫ

У нядзелю раненька Ігнат вывеў веласіпед з сянец. Дзень меўся быць найлепшы. На двары пад вішнямі, дзе ўчора купаліся куры, на разгрэбенай зямлі ляжала яшчэ вільгаць.

— То я з'езджу, Яніна. Чуеш?

За плоцікам ў градах паднялася жанчына ў паркалевым халаце, расквечаным пад рамонкі. Абтрасаючы ўробленыя ў зямлю рукі, пераступаючы бучны цяўнік, яна падышла да веснічак. Тыльным бокам далоні, каб з пальцаў не асыпаўся пясок, дакранулася да касынкі, папраўляючы яе. Вельмі пасаваў ёй загар на руках, на адкрытым рагавічку грудзей, нейкі спелы, гарачы. Бровы ў яе былі высокія, як здзіўленыя. Яна зірнула на Ігната таксама як бы дзівячыся, што ён нават у спартыўным будзённым гарнітуры такі зграбны і ладны. Твар толькі для другіх суровы і чэрствы, а для яе — самы даступны.

— З'ездзі, Ігнатка,— сказала яна.— Толькі не баўся доўга.

— Ну, мне там бавіцца няма чаго.

— Яна спіць?

— Спіць. Ты яе не будзі. Пакуль прачнецца, то я і вярнуся.

— Ну едзь.

Ігнат спакаваў на багажніку згорнутую турысцкую кайстру, апусціў на яе дужку. Павярнуў веласіпед да адчыненай брамкі, ускочыў у сядло і пакаціў з двара, пакідаючы на доле свежы роўны слядок.

Ён праехаў сяло, мінуў масток, насланы новымі дошкамі, веласіпед прайшоў па ім без шуму. Падняўся на ўзгорак, адкуль адкрылася ўсё калгаснае наваколле. Пад лесам у жоўтым жыце хадзілі два камбайны, па палявых дарогах снавалі машыны: порстка, весела, з подскакам — у поле, і з асцярогаю, натужна гудучы,— у свіран. Усюды ішла работа, і на хвіліну Ігнат пачуў сябе няёмка: у такі гарачы час ён займаецца бог ведае якім глупствам. Як на тое з-за павароткі на дарогу выехала фурманка. Ігнат пазнаў запраўшчыка дзядзьку Антона: на возе ляжала бочка з саляркаю.

— Дзень добры, аграном! Ці далёка? — папытаўся дзядзька Антон, параўняўшыся.— Тпру!

— Невялікі клопат у мястэчку. Зараз вярнуся.

— То ў мяне да цябе просьба, аграном: купі там пачкаў з два «Беламору».

— Добра, дзядзька Антон, прывязу.

У мястэчку Ігнат наўскасяк перасек пляц, на якім у цяньку ад старое царквы стаяла некалькі вазоў з параспраганымі коньмі, пад'ехаў да раймага. Прыставіў веласіпед да сцяны каля ганка, пашкадаваўшы, што ў нас нязма завядзёнкі на гэты від транспарту рабіць стаянак. Та-

кая драбяза: збіць пры сцяне рагавік з рэдка пастаўленых планак, каб можна было паміж іх уткнуць пярэдняе кола веласіпеда — няхай стаіць. А то прыходзіцца прымошчваць бокам, а нехта другі прымосціць да твайго, а тады трэці, чацвёрты — паспрабуй потым дастаць свайго, не параскідаўшы другіх. І вучыцца ёсць у каго: уся Прыбалта з такімі стаянкамі.

— А-а, Ігнат бацькавіч! — абарваў Ігнатаў гаспадарлівы роздум нечы голас. З прыступак ганка спускаўся раённы заатэхнік з пакункам пад локцем, загарэлы, без шапкі, з палавымі ад сонца валасамі.— Даўно не бачыліся, як пажываецца? Нешта купіць збіраешся?

— Ды, разумееш, дачка ў мяне імяніннiца сёння і сёлета ў школу ідзе першы раз. Ну то трэба ж, каб астаўся нейкі знак.

— Рэзонна, рэзонна! Пазнаю заядлага сем'яніна... Ой ты! — весела памахаў пальцам перад сабою заатэхнік і пайшоў, разрагатаўшыся, бог ведае на што намякаючы.

Народу ў краме было не так багата. Найболыш жанкі; яны тоўпіліся каля аддзела з крамнінаю, мацалі, прымервалі на сябе, прыкідваючы яе да грудзей перад люстэркам,— ці да твару. Улучыўшы хвілінку, Ігнат расказаў крамніцы сваю патрэбу і пачаў выбіраць з таго, што яна палажыла перад ім на палок. Ён выбраў туфлікі, чорныя, з кутасамі на шнурках, але перадумаў і памяняў на чырвоныя. Выбраў сукенку ў белую палоску па сінім полі, тады другую, школьную, а тады фартушок да яе з шырокімі крылкамі. Крамніца падала гарнітур бялізны — і гэта палажыў у свой пак.

— Што яшчэ трэба? — папытаўся бездапаможна.

— Каснікі.

— Ну, пэўна ж, давайце і каснікі.

— Партфелік. Ці ранец.

— Давайце партфелік.

Нарэшце крамніца ўсё спакавала, а Ігнат яшчэ стаяў, успамінаючы, ці не забыўся чаго.

— Баюся раіць, але мне здаецца, што вы не ўсё яшчэ купілі,— сказала крамніца.

— А што?

— Трэба ж было і жонцы нешта ўзяць.

— Божа мой, якая вы малайчына. Абавязкова! А што б вы параілі?

Крамніца прайшла туды, у жаночы канец, перакінула па паліцы адзін скрутак крамніны, другі, нарэшце пала-

жыла на палок і разгарнула. Па чорным полі ішлі танюсенькія срэбныя павуцінкі, як бы выблісквалі з самой чарнаты. Прыкінула сабе да грудзей, зірнула на Ігната, на жанок.

— Ой, як хораша,— уздыхнула адна з іх.

— Не настаўніца будзе, а царыца.

На хвіліну Ігнат уявіў Яніну ў гэтакім плацці. І чамусьці іменна так, як бачыў сёння, калі ішла яна да яго за веснічкамі. Гэта было нямаладу як здорава. Краса! Толькі такое плацце Яніне і трэба! Даўно пара было набраць.

— Давайце,— сказаў ён.

Усе пакупкі ён спакаваў у кайстру. Дужка багажніка не прыкрывалася, прыйшлося зверху ўвязаць яшчэ шпагатом. Заехаў у прадуктовую краму, набраў цукерак, печыва — і гэта спакаваў у багажнік. І ўжо калі пусціўся ў дарогу, успомніў дзядзьку Антона. Вярнуўся па «Беламор».

За мястэчкам думкамі адразу апынуўся ў калгасе. Здалося, што забавіўся ён бог ведае як доўга, а там ён можа вельмі патрэбен; можа якая няўпраўка і яго чакаюць. Сам таго не заўважаючы, націснуў на педалі.

На дарозе людзей цяпер пабольшала. Хто спяшаўся яшчэ ў мястэчка, хто варочаўся ўжо дадому. Адны пехатою, другія, гэтак жа, як і ён, на веласіпедах з пакункамі, прывязанымі на багажніках. Двое, хлопец і светлавалосая дзяўчына, не то спаткаліся, не то развітваліся, стаялі пры самай абочыне, і дзяўчына, мабыць, не хацела на людзі паказваць твару, усё адварочвалася ў поле. Прайшоў самаскід з грымучымі жалезнымі бочкамі, заслаўшы пасля сябе дарогу гарачым, гаркавым пылам.

Ігнат падумаў, што яму куды спакайней будзе ехаць па сцежцы, якая пачнецца зараз праз параснік і выведзе нацянькі к калгаснай дарозе.

Як толькі параўняўся ўзлесак, Ігнат гайдануўся па набітым следзе цераз канаву. Ціха і мякка пайшоў веласіпед.

Сцежка вяла то паміж арэхавага кустаўя, то выбягала на прагалкі, усыпаныя чырвонымі і белымі галоўкамі пахкага дзяцельніку. Ігнат мімволі падумаў, што сельскія людзі занадта прывыкаюць да прыроды і не бачаць, колькі вакол іх хараства. От быў бы ён гарадскі, дык у такія мясціны прыехаў бы адпачываць. З сям'ёю. На цэлы месяц. У цень. У траву. У пахошчы і птушыныя песні. Ну, няхай сабе не тут, дык трохі далей, дзе стаяць векавечныя

дубы, а пад імі разасланы падаткі дыван муравы. І рэчка, што цячэ за імі, з крутымі берагамі, падмытымі пад самае карэнне.

За гэтымі думкамі Ігнат і не заўважыў, як нагнаў жанчыну. Яна ішла наперадзе вельмі паволі, як бы каго чакаючы. Заўсёды ёсць нешта загадкава-таямнічае, калі бачыш жанчыну, ды яшчэ там, дзе не спадзяваеш, ды яшчэ адну. Ігнат збіраўся яе абмінуць, але паспеў адзначыць нейкую трывожную зграбнасць яе фігуры, хады. І тут жа пазнаў і злякаўся. Яна саступіла са сцежкі і выставіла руку, перагароджваючы дарогу.

— Пачакай, Ігнат,— сказала яна патрабавальна. І калі Ігнат саскочыў і паставіў веласіпед перад сабою, сказала з пакораю:— Я бачыла, што ты быў у мястэчку, і ведала, што паедзеш сюдэю. Чакала цябе. Усё думаю, можа ты мне што-небудзь скажаш.

— Я табе ўсё сказаў, Антоля. Мы ўсё перагаварылі з табою, навошта ж зноў варочацца.

— Няўжо ж ты такі бессардэчны?

— Не, Антоля, бессардэчны быў не я. І можа якраз табе пра гэта не варта ўспамінаць.

Сцежка не так далёка зайшла ў кустаўё, сям-там за прагалкамі прасвечвала дарога. Відно было, як там прайшла жанчына ў белай хустцы з хатулём за плячыма, як з трэскам прамчаўся матацыкл, пусціўшы за сабою сіні дымок. Каб не быць у прасветліне, жанчына дакранулася да руля, як бы просячы, каб Ігнат правёў веласіпед далей.

— Я была перад табою вінавата і не баюся сазнацца,— сказала яна.— Дык хіба ж ты не бачыш, як я за гэта пакутую?

— Цяпер нічога ўжо не паправіш,— сказаў Ігнат.— Усё ў нашым жыцці зрабілася так, як трэба. Як ты хацела. У цябе ёсць свая сям'я, муж, які даў табе і прытулак, і шчасце.

— Не было ў мяне шчасця! — горача запярэчыла жанчына.— І мужа таго, што ты кажаш, няма. Я кінула яго, ты сам пра гэта ведаеш, і другі год хажу за табою, як цень. Няўжо гэтага мала, каб ты паверыў, што мне больш нічога не трэба?

Яна памаўчала, супакойваючы дыханне.

— Я зрабіла тады нядобра, гадка,— цішэй сказала яна,— але ж гэта не з ахвоты ці радасці — гора прытужы-

ла мяне. Ну, няхай не будзем гаварыць пра мяне, дык жа я ратавала сына.

— Дзякую, Антоля, ты вельмі ўратавала яго. Аж да таго, што дала яму і чужое прозвішча.

Сцежка спускалася ў перасохлую ручаінку, на дне якой ляжала пруцце, кінутае, мабыць, вясною, а цяпер утоптанае, пачарнелае. На камялёк пруціны, што вытыркаў над травою, села маленькая птушачка, весела цвыркнула, махнула два разы хвосцікам і ўспырхнула, паляцела на куст. Ігнат пачакаў, каб жанчына прайшла наперад па гэтай сухой ручаінцы, не сазнаючыся, што яму яшчэ раз хочацца зірнуць на яе хаду, на паставу. Пасля ручаіны яны пайшлі поруч, яна па сцежцы, а ён збоку, ведучы веласіпед па траве. Высокія сцяблiны слёзак, вызвоньваючы, перабіралі па спіцах.

— А што я магла зрабіць? — прасіла жанчына.— Хіба табе лепш было б, каб ён астаўся бяздомнікам, невукам ці вырас якім бандытам? Ты ж ведаеш, што магло быць і са мною, і з ім пасля цябе... А ён жа цяпер, дзякуй богу, вучыцца ў тэхнікуме. Як маглі, мы засцерагаліся, а ты кажаш — прытулак. Нішто сабе прытулак, калі табе свет не міл.

Параснік мінаўся, сцежка выводзіла па палянку, за якой пачынаўся дубовы гай. Ужо адсюль відны былі высокія сівыя ствалы з няроўнымі, карабатымі сукамі і густымі кронамі, засень ад якіх у глыбіні пераходзіла ад сініх да цёмных таноў.

Ігнат прыпыніўся, паправіў веласіпед, як бы збіраючыся паехаць.

— Я ведаю, гэта ўсё Яніна,— сказала жанчына.— Ух, як я ненавіджу яе, гадаўку. Падсцерагла-такі. Усё жыццё яна падсцерагала мяне!

— Яніны ты не чапай,— сказаў Ігнат. Ён зноў бачыў, як сёння ішла яна да яго на градах з уробленымі ў зямлю рукамі, як глядзела з-пад высокіх броў, просячы не бавіцца.— Яніны ты не чапай,— сказаў ён.— Яна перад табою святая.

— Нішто сабе святая — раскашуецца на маім горы. А колькі яна цябе кляла — не ведаеш? З першага дня, як мы пажаніліся, яна стала маім ворагам. Уся кіпела ад злосці. Нават з сяла была з'ехала, каб не настаўнічаць разам са мною, ты ж памятаеш?

Ігнат памятаў. Памятаў і другое: шэры, золкі ранак на глухім тупіку станцыі, ланцуг вагонаў, загнаных на

далёкі пуць. Бог ведае навошта, дзеля якога сэнсу яму выпала на долю зазнаць, што такое людская няслава і этапныя шляхі ў невядомы свет. Маўклівая калона людзей і ціхая, як крадучыся, каманда канвою. Калі яго выклікалі, ён аддзяліўся ад натоўпу і ўжо каля вагона павярнуўся, каб апошні раз азірнуць тое, з чым развітваўся можа навечна. З ранішняга сутоння выступалі толькі цьмяныя абрысы вакзала, сілуэт воданапорнай вежы ды ўгадваліся палоскі правадоў, усё адно як абверчаныя мохам. Ужо крануўшыся прыступак, на апошняй хвіліне, ён паспеў угледзець постаць, што стаяла наводдаль за пуцямі, аддзеленая канвоем, з клумкам у руках. Ён хацеў у ёй прызнаць Антолю і жахнуўся — стаяла Яніна, яна махнула яму рукою.

Першае, што яго пранізала,— гэта страх за Антолю: што з ёю, чаму не прыйшла сама? Стараючыся, каб не адціснулі з тамбура, ён лавіў Яніны жэсты (будзь спакойны, усё добра) і сам сіліўся перадаць толькі адно: што ён не вінаваты. Яніна махнула галавою — паняла. Божачка, як гэта важна,— яна ж перадасць! — каб ведала хоць Антоля, што за ім няма ніякай віны.

А пасля, калі іх распакавалі па вагонах і эшалон крануўся з месца, начальнік этапа перадаў яму пакунак. Ігнат пазнаў: той пакунак, які дзяржала ў руках Яніна. У пакунку былі валёнкі, цёплыя шкарпэткі і зімовая шапка. Укрыўшыся ад усіх, ён заплакаў. Як, адкуль, якім спосабам яна магла дазнацца пра сённяшні ранак, каб хоць Яніну прыслаць на гэтае сумнае развітанне?

І яшчэ памятаў Ігнат: як туды, у далёкі сібірскі край, прыйшоў першы ліст. Ён таксама быў ад Яніны. З яго Ігнат дазнаўся, што Антолі ў яго больш няма. Што на развітанне прыходзіла Яніна не ад Анатолі, а сама, і пакунак, над якім ён плакаў, быў не ад Антолі. На другі ж тыдзень пасля яго бяды яна весела выйшла замуж.

— Яніны ты не чапай,— сказаў ён яшчэ раз.

— Гадаўка яна! Не магу! Век буду праклінаць яе!

Ігнат паставіў веласіпед на сцежку.

— Ідзі, Антоля,— сказаў ён.— Ты далёка адышла ўжо, ідзі.

— Куды я пайду? Навошта і куды я пайду? Як сляпая, я магу хадзіць толькі за табою... Божа мой, чаго я нарабіла! Няўжо хоць гэтым я не замаліла перад табою ўсіх грахоў?

Яна стаяла перад ім, пакорліва расціраючы ў руках сцяблінку мятліцы. Пальцы ў яе дрыжалі, у вачах стаялі сухія слёзы, губы торгаліся ў горнасці.

Каб ён не глядзеў на яе, яна адвярнулася, стаўшы зусім блізка плячыма. Яна была намнога ніжэй за яго. Зверху ён бачыў яе каштановыя валасы, пасмачку, што, выбіўшыся, хацела ўпасці на лоб, адкрытае плячо. Прайшоўся па выразе плацця, убачыў грудзі, раздзеленыя цёмнаю лагчынкаю ў цесным станіку, і пачуў, як у скронях пачала шумець кроў...

Трэба было з месца скрануць веласіпед, але Антоля вельмі блізка стаяла пры ім. Пажмаканая сцяблінка мятліцы ўпала на дол. Аднекуль у небе праплылі два буслы і пачалі кружыць над дубовым гаем...

СПАСЦІЖЭННЕ

СПАСЦІЖЭННЕ

1

Можа дзякуючы памяці мы маем магчымасць адзначаць рух часу.

Я ведаў, што па маёй зямлі прайшлі спусташэнні і смерць, але ў памяці непачапаным аставалася ўсё так, як я пакінуў: і горад з яго ціхай мурожнай Маркаўскай вуліцай за паркам Горкага, і людзі, і іх аблічча, і галасы.

Усё ў памяці ўваскрасала тысячы разоў як жывое, з фізічным адчуваннем выявы і гукаў, і ўсё аказалася няпраўдай. Аказалася, што ўсё тое, з чым жыў ты як з самай блізкай надзеяй на рэальны свет, даўно не існуе, яго навечна забраў з сабою час. Тое, што бачыў я цяпер, было падобна на сон ці на добрую казку, з якой мы павучаемся марыць.

Кругом быў сон: і Прывакзальная плошча, на якую клалася ўсё неба, і вуліцы, шырыня і прастор якіх не месціліся ні ў якую яву, і Алесь Пальчэўскі з яго жонкаю Тамараю, што адразу прытулілі мяне, уступіўшы вузенькую бакоўку на Красівай вуліцы, і ціхая радасць, што недзе тут хадзіла мая маладосць, і трывогі за самае галоўнае, самае найпершае: хто тут цяпер я? Як сустрэнуся з сябрамі, калі яны дзе асталіся.

Двое, я ведаў, ходзяць у добрай народнай славе, колькі часу таму назад я пасылаў ім тэлеграмы, вычытаўшы з газет, што яны пашанаваны ордэнам Леніна. Мне была гордасць за іх, нібы і я быў нечым спрычынены да іхняй славы. Нават у тэлеграфісткі з нашай пошты акругліліся вочы ад нечаканасці, што я знаюся з такімі людзьмі. Засмуцілі ці парадавалі іх мае віншаванні?

Сном было і тое, што так доўга не быў тут, што недзе за спінаю асталіся далёкія прасторы, ходжаныя і няходжаныя дарогі, зімы і леты, невялічкая забытая хатка на ўзлессі, якое называлася Камаровым, дзе я ўсю восень вартаваў ссыпаную ў капцы залатую пшаніцу і дзе сярод хараства, якое так шчодра, ідучы на спачын, раскідае прырода, асталося многа маіх нікому не расказаных дум...

2

Дома пісьменніка на старым месцы няма. Ён месціцца па ціхай даўняй вуліцы, у асабняку, уціснутым у зялёны садок. У ніжнім паверсе музей Янкі Купалы, мне ж трэба падняцца наверх па ўсходах з другога ганка, з двара.

Пажылая жанчына сказала, што яшчэ рана, нікога няма, але, здаецца, прыйшоў Міхась Калачынскі. Калі я зайшоў, ён не паспеў яшчэ зняць свайго шэрага габардзінавага макінтоша, стоячы, чытаў нейкую паперку, успёршыся на стол рукамі. На мяне зірнуў быстра, з дзівом: хто я такі і чаго заявіўся без папытання? Але тут жа павітаўся, падаўшы руку, калі я сказаў пра сябе. Папытаўся, калі я прыехаў, ці не натаміўся ў дарозе. Мне была прыемна спакойная прастата, роўны, упэўнены голас, нейкая добрая спагада ў ім. Прыемны быў твар з круглымі мяккімі лініямі, у якіх я доўга сіліўся разгадаць нешта мне вельмі знаёмае. Аказалася, якраз вось такі, круглы і мяккі падбародак быў у Кузьмы Чорнага. Мне стала яшчэ лепш на душы. Распрануўшыся, Калачынскі даланёю прыгладзіў рэдкія, падаткія валасы, але за стол не сеў, астаўся стаяць пры акне разам са мною. Я заўважыў, што неўпрыкмет ён разглядае мяне. Ну што ж, нармальна, гэтаксама, мабыць, зрабіў бы і я. Між тым ён распытваў: адзін я прыехаў ці з сям'ёю, наогул, што ў мяне за сям'я, ці падабаецца мне новы Мінск.

Ён правёў мяне з кабінета да самых усходаў, але на апошняй хвіліне затрымаў.

— Паслухайце,— сказаў ён,— у вас нічога няма з сабою вашага, напісанага, каб пачытаць?

Я зразумеў. Ні па абліччы, ні па тандэтным і даўно немодным адзеўку я ніяк не выглядаў на пісьменніка.

— Не,— сказаў я,— няма.

— Ну, але ж вы патроху там пісалі?

Як жа сказаць, што пра тое, пра што ён хоча ведаць, ён не мае ніякага ўяўлення, што я сам трывожуся, не ведаючы, што з мяне будзе: можа зусім адвыкла рука. Вядома, гэта, мабыць, вельмі важна, каб пры аднаўленні паказаць нейкі знак нястрачанай прафесіі, але нічога напісанага ў мяне няма. Некалькі няўпэўненых накідаў, планаў, беглых партрэтаў, зробленых на гарачую руку толькі пасля таго ўжо, як Аня прынесла ў МТС тую паперку, не могуць служыць такім знакам. Што ж мне паказваць?

— Я разумею,— між тым гаварыў Калачынскі,— вам няёмка чужому чалавеку паказваць нешта там не даведзенае да ладу, але мая цікавасць мае чыста спартыўны інтэрас.

— Не,— сказаў я.— Нічога няма ў мяне. Не пісаў.

Па ўсходах падняўся невысокі паўнаваты чалавек, гадоў можа трохі больш за трыццаць, але з цяжкаватым дыханнем. Ён зірнуў бегла на мяне, на Калачынскага, як бы пытаючыся, чаго мы тут стаімо і хто такі ў гэтай кампаніі я, хацеў прайсці далей, але Калачынскі сказаў:

— Гэта Шамякін, першы намеснік старшыні Саюза,— а калі Шамякін недаўмёна зірнуў на яго, патлумачыў, хто такі я.

Шамякін моцна сціснуў маю руку, засвяціўся такой цёплай, свойскай усмешкай, так проста і хораша зірнуў на мяне, што я раптам пачуў сябе самім сабою. Так, як бы я стаў роўны з ім, а значыць, і роўны з усімі. Перш-на́перш Шамякін папытаўся, ці атрымаў я ад яго ліст, тады папрасіў прабачыць, што так запазніўся з адказам.

— Ведаеце, быў на курорце,— гаварыў ён, яшчэ не асіліўшы цяжкаватасці ў дыханні,— і толькі вярнуўшыся, мог адказаць вам. Вельмі дзякую за вашы заўвагі. І ў пісьме, і вось тут зноў кажу, што дзіўлюся, як гэта вы маглі, столькі часу не чуючы мовы, зберагчы такое тонкае адчуванне яе. А?

Гісторыя з пісьмом трохі засмучала мяне. Яна спрычынілася не вельмі ўдала. Па дарозе ў Мінск, у Краснаярску, зусім выпадкова, ад выпадковых людзей Пальчэўскі даведаўся пра мяне. Што я ў гэтых мясцінах. З дарогі ён напісаў паштоўку, а ўжо з Мінска прыслаў некалькі бандэроляў з газетамі і часопісамі. За многа гадоў я першы раз бачыў беларускія выданні і ўпершыню пачуў беларускае слова — ад самога сябе. І, памятаю, не то ў «Беларусі», не то ў «Маладосці» была надрукавана нізка кароткіх апавяданняў Івана Шамякіна. У адным з апавяданняў гераіня расказвала падарожніку пра сваё жыццё. Мне здалося, што яна, сялянка, павінна была б гаварыць не такою моваю. Я падмяніў ёй дыялог, даўшы другі лад сказу і другія, як мне здавалася, больш блізкія яе вобразу словы. Зрабіў і нейкія іншыя заўвагі. Выйшла нешта падобнае на рэцэнзію, і я паслаў яе аўтару. Цяпер мне было няёмка ўдвая за тое пісьмо. Першае, калі я яго пісаў, то адтуль, з свае далечыні, уяўляў, што Шамякін — гэта нейкі зусім малады хлапчына, які яшчэ толькі намацвае сваю

дарогу да літаратуры. Аж аказалася, што і ён, і Калачынскі, і ўсе тыя, пра каго чуў і каго бачыў, што гэта людзі, у якіх за плячыма ўжо і розныя спецыяльнасці, і вайна, і салідныя тамы кніг. Другое, я не ведаў, што Шамякін ходзіць у першых намесніках старшыні. Мне было непамысна, калі я думаў, што мой учынак можна цяпер тлумачыць як нейкі тонка разлічаны ход.

Я стаяў, скованы гэтай сваёй няёмкасцю, але Шамякін не даваў ёй застояцца. Ён распытваў пра дарогу, дзе і ў каго я спыніўся, ці не маю ў чым патрэбы. Мабыць, добра ведаючы, што мне найбольш карціць, сказаў, што Броўка цяпер у невялікім ад'ездзе і як толькі вернецца — адразу ж будзе склікаены прэзідыум.

— І адновім вас у Саюзе,— сказаў ён.— Я думаю, што ўсё будзе добра, так што вы не хвалюйцеся, а?

Вельмі невялікая, па сутнасці, беглая размова, але я пайшоў зусім іншы — з адчуваннем нейкага добрага, даўно не веданага спакою і пэўнасці.

3

І з гэтай часіны зноў пачалася для мяне бацькаўшчына.

Удоўж і ўпоперак я аббегаў горад, абхадзіў мясціны, якія чымсьці былі мне блізкія і дарагія. І ўсё памятаў, што нечага як бы яшчэ не асмельваюся зрабіць. Зайшоў у пісьменніцкую бібліятэку да вечнай кніжнай гаспадыні Мар'і Хайноўскай і як бы няўзнак папытаўся, ці тут Заір Азгур.

— А от мы зараз пазвонім яму дахаты і даведаемся.

Яна ўся была абложана кнігамі, нават тэлефон на стале прыйшлося адкопваць ад кніг. Пакуль яна набірала нумар, я чуў, як у мяне білася сэрца: мела ці не мела права дзівіцца тая наша тэлеграфістка?

Азгур доўга не мог зразумець, хто з ім гаворыць. Потым на хвіліну я пачуў у трубцы замяшанне, потым паспешлівыя запытанні, дзе я, адкуль званю, потым тлумачэнні, як і куды мне ісці.

— Я буду чакаць цябе, я выйду на вуліцу, чуеш?

Неўзабаве з падарожжа вярнуўся Броўка, я ніяк не мог пагадзіцца, што па ім так густа прайшла сівізна. Радавала, што хоць тая самая асталася рухавасць і непасрэднасць, той самы неспакойны, гарачы голас і тыя самыя мяккія рукі. Не, тэлеграма таксама яго не засмуціла, была толькі бяда, што не мог адказаць на яе.

На прэзідыуме ўбачыў гэтак жа памечаных усімі знакамі гадоў Крапіву, Лынькова, Глебку, Гурскага, было добра ад іх поціску рук. Убачыў і тых, пра каго толькі чуў,— Пестрака, Мележа, Панчанку, аказваецца, усе яны таксама ўжо ў гадах. Ах, як жа многа мне цяпер трэба ўсяго пазнаваць. Не толькі людзей, пра якіх нават уяўлення не мела мая памяць, а і таго, што імі зроблена. Усюды, на кожным кроку, нават вучыцца думаць.

Не ведаю, хто намысліў, але мне ўжо была нагаворана работа: рэдактарам мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве. Гэта было і добра, і страшна: ці здолею, ці спраўлюся? Дасканаласць літаратурнай прафесіі вырасла куды як высока, а сам я... Але трывогі гэтыя адышлі на другі план. На тым жа прэзідыуме вынеслі і яшчэ адну пастанову: перш-наперш паслаць на адпачынак у Дом творчасці. У выдавецтве я пакінуў толькі заяву, просячы пачакаць з маім прызначэннем. Адпачынак на ціпыні, у лесе, быў мне вельмі патрэбен: якраз там я мог бы прывесці да ладу тыя накіды, пра якія не сказаў Калачынскаму.

РАЗВІТАННЕ

1

Гэтая гісторыя пачынаецца з тых цяжкіх дзён, калі на нашу краіну напаў люты вораг. У далёкі сібірскі шпіталь прывезлі чарговую партыю параненых. Адзін з іх, капітан Андрэй Сушынскі, спрэс абкручаны бінтамі, доўгі час быў непрытомны. Ні ў кога не аставалася жаднай надзеі, што ён выжыве.

Лена тут была ў эвакуацыі, працавала на абаронным заводзе. Завод гэты браў шэфства над шпіталем. Звычайна шэфы памагалі ва ўсіх гаспадарскіх клопатах: дзяжурылі на кухні, мылі вокны і посуд, прыбіралі палаты, паласкалі бінты. А яшчэ больш рабілі тое, што памагала раненым адчуваць на сабе звычайны чалавечы клопат: чыталі газеты і пісьмы з дому або пад дыктоўку пісалі дадому ці таварышам на фронт.

Якраз Лена дзяжурыла ў той час, калі прывезлі Сушынскага. Яна памагала яго пераносіць, класці на апе-

рацыйны стол. Бачыла, як падалі і падалі ў таз акрываўленыя шматкі бінтоў. І толькі адзін раз пачула, як ён застагнаў.

Дзён колькі ён трызніў. Крычаў нейкую каманду, на некага сварыўся. Было страшна нават глядзець, адкуль у яго бярэцца столькі сілы, каб аж калаціўся ложак. Лена баялася, што ён паздзірае бінты і зноў пойдзе кроў, паадкрываюцца раны.

І часта зваў жанчыну — Таню. Хто была гэтая Таня — невядома. Але зваў ён яе ласкава. У нечым папракаў яе, на нешта скардзіўся.

— Не хачу нічога знаць... Таня! Не, не, ты не зробіш гэтага!.. Добра, я сустрэну... А чаму не страляюць?.. Агонь! Агонь!..— і нічога ўжо нельга было разабраць.

Папраўляўся ён вельмі цяжка. На твары, там, дзе паздымалі бінты, расла рыжая шчаціна, прабіваючыся праз луску мёртвай скуры, што яшчэ не аддзялілася ад ран. Найбольш ён моўчкі ляжаў або спаў і доўга нават не заўважаў, што цэлымі вечарамі каля яго ложка праседжвала Лена.

Калі ў яго ўжо ставала сілы на ўвагу, дактары дазволілі прачытаць пісьмы, якіх за гэты час назбіралася шмат. Лена загадзя перагледзела іх, каб ведаць, ці няма там чаго такога, што магло б хваляваць яго. Чытанне расцягнула на некалькі дзён, не даючы надта стамляцца. Але здавалася, што ён чакаў нечага другога, большага, чым тое, што пісалася ў пісьмах.

— Усё? — звычайна перапытваў ён.

— Усё. Можа хочаце каму адпісаць? Я напішу, толькі скажыце што.

— Не трэба.

Аднаго разу прыйшло пісьмо і ад Тані. Лена прачытала яго на хаду, у калідоры. Таня пісала з фронту, не ведаючы, што ён у шпіталі, і пісьмо доўга блудзіла, пакуль знайшло свой адрас. Коратка яна прасіла прабачэння, што замест радасці прыносіць яму смутак. Вельмі коратка тлумачыла свой учынак: фронт — гэта на кожным кроку смерць, і навошта звязваць сябе, каб не пакарыстацца тым, што дадзена чалавеку на радасць. Прасіла не чакаць і не спадзявацца на яе — яна ўжо звязала свой лёс. «Можа гэта ненадоўга, я магу загінуць кожную хвіліну, ты ж сам ведаеш гэтае пекла перадавой, але я хачу, каб ты памятаў, што я цябе любіла як магла. Твая Таня».

Лена не прачытала гэтага пісьма Сушынскаму, хоць добра разумела, што іменна аб ім кожны раз пытаюцца яго вочы. Яна схавала гэтае пісьмо і ўсёю душою ўзненавідзела невядомую ёй Таню.

Прайшла зіма, настала доўгачаканая кароткая сібірская вясна. За вокнамі ў агародчыку выскачыла густая сакавітая і нейкая надта порсткая трава. Яна расла буйна, спяшаючыся, і найбольш начамі, каб на раніцу здзівіць чалавечае вока: ага, паглядзі, якая я стала! Пачало прыпякаць сонца, на двор паадчынялі вокны, і адразу стала чутно, што паявіліся птушкі: колькі іх шчабятлівых галасоў уварвалася ў палату!

Сушынскі ўжо мог хадзіць. Праўда, на мыліцах, але гэта не страшна — галоўнае, ён адчуваў, што не будзе калекам. Усё выратавалі яму: ногі, рукі; выратавалі твар, няхай са шрамамі, але ж не такі ўжо і знявечаны. Трохі яшчэ стамляецца галава, трохі слабая памяць, але ж і гэта пройдзе. Ён верыць у гэта, бо ён малады і дужы.

Цяпер ён ужо можа пайсці пахадзіць па калідоры, выйсці на веранду ці ў садок пасядзець на лаўцы. Найбольш, ведама, у садок, каб бачыць, як прыходзіць Лена. Тыя дні, калі яна не бывае, нейкія шэрыя і нудныя, і ён не ведае, што яму рабіць. Як бы няма тут ні сонца, ні птушыных песень. Але вось бразнула брамка, і паказалася Лена. Яна ў лёгкім веснавым паліце, і галава нават без касынкі — з цёплымі бялявымі валасамі. Вось яна адразу і ўбачыла яго, і ўсміхнулася яму. І адразу ўвесь садок заліло сонца.

— Добры дзень,— кажа яна і падыходзіць да яго.— Як пачуваеце сябе? Скора станеце зусім здаровы?

— Думаю, скора выпішуся. Проста ўжо грэх аставацца тут.

— А мыліцы?

— Ну што ж, пахаджу трохі на мыліцах. На фронт мне ўсё роўна не ехаць, туды я ўжо спісаны. А так — здаровы.

— Вельмі рада за вас... Значыць, цяпер ужо можаце самі чытаць?

— Ну пэўна ж,— кажа Сушынскі, разумеючы, што яму напамінаюць той час, калі ён быў ледзьве жывы.— Я буду памятаць ваш клопат.

— Наце! — Лена перадае яму пісьмо.— Цяпер вам ужо можна знаць.

Гэта пісьмо ад Тані. Невядома за што, але Лена цяпер

глядзіць на Сушынскага з нялюбасцю: вось, падзівіцеся, якая ў вас сяброўка.

— Ну і добра,— кажа Сушынскі, прачытаўшы і разарваўшы пісьмо на шматкі.— Дзякую, што зберагді. Цяпер, па крайняй меры, я чысты перад вамі.

— Чаму перада мною?

— Мне трэба быць чыстым толькі перад вамі, Лена.

Калі Сушынскага выпісалі, Лена пайшла яго правесці. Яны ішлі па вуліцы вельмі паволі. У кіцелі з пагонамі, чыста выбрыты і ўзрушаны, ён быў зусім нейкі новы, як бы даўно вядомы і невядомы. Гэта было нават прыемна. Апіраючыся на мыліцу, ён стараўся ісці трошкі зводдаль.

— Ну вось, паедзеце недзе, можа ўспомніце калі і мяне.

— Я нікуды не паеду.

— Як?

— А так. Заводаў тут многа, работы хопіць, я — інжынер-канструктар. Адразу ж пайду дзе-небудзь і афармляцца.

— Дзе жыць будзеце?

— Не ведаю яшчэ.

— Сядзем.— Яны ішлі праз парк, у якім асталася адна, нікому цяпер не патрэбная лаўка.— Многа вам хадзіць яшчэ няможна.

Яны сядзелі доўга, зразумеўшы, што да гэтага гаварылі вельмі мала. І было гэта прыемна, і было трывожна, што нешта кончылася і ў кожнага павінна пачацца нешта другое. І таго, што кончылася, было шкода.

— Праз вас я не магу нікуды ехаць, Лена. Вы чуеце гэта?

— Чую. І ведаю. І мне не хочацца, каб вы куды ехалі, Андрэй.

— Я хачу быць каля вас зусім блізка.

Лена маўчыць. Маўчыць і чакае Андрэй. Ужо зусім цёмна — агнёў няма, бо гэта раскоша не для ваеннага часу. Толькі недзе далёка два разы нецярпліва-рэзка азваўся паравоз.

— Я ведаю, пра што вы гаворыце, Андрэй. Але я не магу зрабіць гэтага. Я люблю другога чалавека. Больш за вас.

— Хто ён?

— Яго тут няма.

— Ён вас чакае?

— Не ведаю.

— Дзе ён?

— На фронце.

— Жывы?

— Не знаю. Я яго можа больш ніколі не пабачу. Толькі два пісьмы было ад яго.

Доўга маўчаць, думаючы кожны сваё. Бо ў кожнага свой лёс, сваё жыццё і свае трывогі.

— Ён вас вельмі любіў?

— Я любіла яго.

Яшчэ памаўчала. Сказала:

— Я ўсё жыццё буду яго любіць. Нават мёртвага.

— А я буду любіць вас вось такую, Лена.

— Нават калі б я выйшла замуж і потым даведалася, што ён жывы, я пайшла б да яго, Андрэй.

— Я гэта чую, Лена. І яшчэ больш люблю вас...

2

Той другі чалавек быў Мікалай. Сюды ён прывёз эвакуіраваны завод. Завод пачалі будаваць сярод снегу, між раскарчованай тайгі. Яшчэ не было ні сцен, ні страхі, гула завея, траішчаў мароз, а станкі пад чыстым небам ужо круціліся, бо нельга было прапускаць ні аднаго дня, каб не працаваць на абарону. Жылі ў палатках пад брызентам, у зямлянках, у бараках, збітых з дошак, абложаных саломаю. Толькі пад вясну паявіліся дамкі і цёплыя баракі, стала нешта такое, што можна было назваць кватэрамі. Мікалай быў галоўным механікам, Лена лабаранткай, як хімічка па адукацыі, хоць інстытута скончыць ёй не ўдалося.

Ах, якія гэта былі цяжкія і харошыя дні! Вечна ў рабоце, вечна ў клопатах, у нястачы і з вечна ясным адчуваннем высокай адказнасці, што твой лёс зліты з лёсам Радзімы. І сярод такіх мужных, суровых, простых і чулых людзей. Мікалай, здавалася, ніколі не ведаў стомы, ніхто не сказаў бы, на якой змене ён адпачывае, бо ў цэху, сярод замеці і пургі, ён паяўляўся ў любы час дня і ночы.

Першы раз сустрэліся яны вельмі нядружна. Мікалай прыйшоў у дашчаную канторку лабараторыі і раскрычаўся на Лену, што яна затрымлівае аналізы. Завод павінен даваць фронту толькі самую лепшую, самую новую і нечаканую зброю, трэба тысячу разоў шукаць варыянтаў яе надзейнасці, тысячу разоў мяняць тэхналагічны працэс,

а гэты тэхналагічны працэс залежыць ад Лены. Нябрыты, худы, з блішчастымі ад бессані вачыма, ён стаяў перад ёю і гаварыў, усё роўна як сек жалеза:

— Вы ж не дзяўчынка, павінны зразумець: кожная прамаруджаная хвіліна — гэта крок ворага па нашай зямлі.

— Добра, Мікалай Гаўрылавіч,— сказала Лена.— Я сёння не буду спаць, але зраблю.

І да гэтага яна ўжо не спала некалькі начэй, ледзьве стаяла на нагах, худзенькая, знясіленая, наапашкі накінуўшы рэдзенькае паліто. Устаўляючы ў гняздо прабірку, яна хіснулася і, каб не паказаць гэтага, прыхілілася да сцяны.

Доўга і цяжка паглядзеў на яе Мікалай і пайшоў. А праз хвіліну вярнуўся. Ён прынёс нейкую старую злямчаную ватоўку і адкрытую бляшанку кансерваў. Дзе толькі ён дастаў?

— У вас тут холадна,— сказаў ён,— абкруціце ногі. А гэта — перакусіце. А то я, мабыць, не з таго пачаў.

Больш ён ніколі не крычаў на Лену. Калі было што цяжка, ён сам прыходзіў і памагаў — і на гэта ў яго ставала часу. А калі завод ужо быў гатовы і лабараторыя перайшла ў новае памяшканне, ён неяк зайшоў, паглядзеў і задумаўся. Было лета, за акном, размораная сонцам, млела тайга. Сярод яе ляжала дарога, і па ёй, цяжка нагружаныя, ішлі і ішлі грузавікі.

— Ты падумай, Лена,— сказаў ён, гледзячы ў акно,— як бы гэта было хораша, каб не вайна.— Падышоў ззаду, палажыў на плечы ёй рукі і доўга стаяў, а Лена слухала гэтыя шырокія цёплыя рукі.— Ты ведаеш, пра што я думаю? — І сам жа адказаў:— Што калі-небудзь у нас будзе маленькі дамок, няхай сабе самы маленькі — звычайная кватэрка,— і ты будзеш у ім гаспадыня. І я заўсёды магчыму абнімаць гэтыя плечы. Ты чуеш, Лена?

— Чую, Мікалай. Я заўсёды цябе чую, нават калі цябе няма са мною.

— Але цяпер гэтага няможна яшчэ,— сказаў ён.— Мы не ўсё яшчэ зрабілі, каб так думаць.

Толькі пасля Лена зразумела гэтыя словы. Неяк яна зайшла да яго ў канторку. На рабочым століку ляжала пісьмо на імя народнага камісара абароны.

— Што гэта? — аж спужалася Лена.

— Ты разумееш, я іначай не магу. Тут усё ёсць, і людзі, і... вось і ты навучылася, і другія. Цяпер ужо я там

больш патрэбен, як тут. Ты зразумей мяне, Лена. Неяк я гаварыў з табою пра хараство, якім грэшна любавацца, пакуль ходзіць па зямлі смерць. Пра наш дом, а яго трэба абараніць... Ты чаго маўчыш, Лена?

— Я думаю пра тое, што сябе ненавіджу. Што мажа і ты не павінен любіць мяне. Бо ў мяне не стае сілы прасіцца, каб пайсці разам з табою. Туды ідуць толькі смелыя і дужыя, а я баюся чужое смерці і калецтва. Сама магу памерці не задумаўшыся, а бачыць усё... Але помні, што я буду пры табе кожную хвіліну.

Праз месяц Лена праводзіла Мікалая на вакзал. Пасля атрымала два пісьмы. І ўсё. І больш нічога не ведала пра яго. Ведала яго апошні крок: пайшоў на адказнае заданне. І яшчэ ведала: каб быў жывы — напісаў бы.

3

Прайшлі гады. Лена з Андрэем жыла ў Мінску, які любіла з дзяцінства. Скончыла інстытут, стала інжынерам і радавалася, што нарэшце магла называцца спецыялістам. Яна ўмела захапляцца ўсім: і жыццём, і работаю. Андрэй ведаў гэтую яе трапятлівасць і любіў слухаць, калі яна, прыйшоўшы з работы, яшчэ не астыўшы ад яе, спяшалася падзяліцца якой-небудзь сваёй радасцю.

— Толькі падумай, Андрэй: спрадвеку мы выкідалі на глум усякія лігніны, астачу ад нафты ды бог ведае колькі другога дабра, называючы ўсё гэта адкідамі і не ведаючы, куды дзяваць іх. А цяпер хімія з усяго гэтага робіць цуды.

— Няйначай як і ты зрабіла нейкае адкрыццё?

— Не. Я толькі пераконваюся, што чалавек можа адкрываць без канца. Што прыродзе ён можа дыктаваць свае законы. Мы сёння выпрабоўвалі пластмасы, якія куды мацней за самую лепшую сталь. Ты чуеш, Андрэй? Чаму ты не радуешся, галоўны канструктар, хіба гэта не адкрывае і перад вамі новых перспектыў?

— Ну як жа, Леначка, і чую і радуюся. І чакаю, калі папраўдзе мы пачнём праектаваць цэлыя агрэгаты з вашых палімераў. Нам бы хацелася, каб яны былі чыстыя, як шкло, і наскрозь прасвечваліся.

— А ну цябе, ты ўсё жартуеш.

— Ніякіх жартаў няма. Так яно і будзе. Мы стаімо на парозе таго, што тэхніка зрастаецца з кібернетыкаю, што машына робіцца нечым падобнай на жывы арганізм. А раз

так, то вельмі важна, каб мы бачылі і ўсё тое, што робіцца ў ёй усярэдзіне.

Час загойвае ўсякія раны, гэта праўда. Але бывае, што ад тых ран астаюцца рубцы, якіх не можа згладзіць ніякі час. Іншы раз мы гаворым вельмі неасцярожныя словы, не ведаючы, што нехта другі, блізкі, будзе памятаць іх усё жыццё. Гэтыя словы сказала некалі Лена. «Нават мёртвага яго буду любіць»,— сказала яна. Лена сама даўно забыла гэтыя словы. Яны былі сказаны ў хвіліну душэўнай стомы і разгубленасці, але Андрэя яны скрозь як бы перасцерагалі, як бы напаміналі пра нейкую небяспеку. Часамі яму здавалася, што ён незаконна заняў чужое месца, на якое мае права нехта другі, лепшы. «Калі б я выйшла замуж і потым даведалася, што ён жывы, я пайшла б да яго»,— сказала тады яшчэ Лена. Хто ён, той другі, Андрэй не ведаў, але іначай не ўяўляў сабе, як чалавека незвычайнай дабраты, розуму і душэўнага хараства. І ён аберагаў Лену, загадзя адгадваючы кожны яе душэўны рух, кожнае жаданне. Быў з ёю ласкавы, чулы, як бы ўсё памятаючы, што яна зрабіла дзеля яго нейкую ахвяру.

І ўсё было б добра, каб не прыехала ў госці Андрэева сястра. Як гэта часта бывае, усе нечаканасці адбываюцца бадай што ў самую апошнюю хвіліну. За тры дні было перагаворана бог ведае колькі: і пра тое, што Андрэю варта было б з'ездзіць на курорт, бо яшчэ дае сябе знаць кантузія, і пра Леніну работу, і пра новую кватэру, якую яны маюць атрымаць. Лена паплакала, успомніўшы сваё гора: летась памерла ў іх трохгадовая дачка. І вось Волька ад'язджала. Перад дарогай сабраліся пасядзець, і Андрэй сказаў:

— Ну от і зноў паедзеш, Волечка, на свой Урал. Ах, як я па ім занудзіўся, проста аж перад вачыма стаіць.

— А ты прыязджай да нас. Не, чакайце, а чаму б вам не прыехаць разам? Праўда, Леначка, адпачылі б у нас, развесяліліся. У нас так хараша. І прырода якая! Проста бярыце адпачынак і прыязджайце. Лепш як на курорт.

— А што, я б згадзілася. Давай, Андрэй.

— Гм... Спакуслівая рэч.

— Не, папраўдзе. Лена паглядзіць на наш Урал, я пазнаёмлю яе з нашай хіміяй. А цябе — з заводам, з дырэктарам. У нас цяпер новы — нехта Астанін. Дзелавы такі, Мікалай Гаўрылавіч.

— Як? — перапытала Лена.

Толькі Андрэй улавіў у Леніным голасе трывогу.

— Завод у вас харошы, я знаю. Пабываць на ім проста нават трэба,— пастараўся ён спакойна павесці далей гаворку.

— А Астанін гэты даўно ўжо ў вас? — між тым назад вярнулася Лена.

— Ды нешта каля года.

Андрэй зразумеў, што пра таго чалавека Лене хочацца знаць куды больш. І ведаў, што ёй цяжка пытацца. І, як заўсёды, захацеў памагчы ёй.

— Што ён, малады? — Папытаўся ён.— Як выглядае?

— Прыблізна тваіх гадоў, можа трохі старэйшы.

— І сям'я ў яго? Вялікая?

— Не, адзін. Маці толькі з ім. Была, кажуць, жонка, ды разышліся. Што ў іх такое, не знаю — пакінула яго.

На нейкі час прымоўклі.

— Дык што — чакаць вас? Абавязкова прыязджайце. Гэта проста любата, як будзе хораша!

— Не, Волечка, я пажартавала,— сказала Лена.— Не будзе нам часу на такую паездку.

Як бы сабе ні было, а Лену гэтая гаворка ўстрывожыла. Хоць яна сабе ніколі не прызнавалася, але Мікалай увесь час жыў у яе памяці. Мабыць, у кожнага чалавека ў жыцці ёсць такія хвіліны, якія нечым вельмі дарагі. Можа гэта маладосць, можа першыя ўражанні і пачуцці, чысціні якіх нішто не можа ні зацямніць, ні запляміць. Вобраз Мікалая нічым не пагражаў Андрэю, гэтага яна не баялася. Андрэй быў нечым вельмі сваім, кроўным і дарагім, без чаго нават нельга мысліць сябе. А Мікалай — зусім іншае, патрэбнае, як добрая казка ці мара. Усё, што харошае было ў Лене,— гэта было як бы ад тых успамінаў, ад той сустрэчы. І цяпер, калі Лена даведалася, што ён жывы, усё з новай сілаю ўваскрэсла. Хацелася ў нечым як бы апраўдацца перад ім.

Неяк пад вечар яна чакала Андрэя з работы і падышла да акна. І раптам перад вачыма пранеслася ўсё іх жыццё. Бінты і закарэлая кроў, пранізаная шчацінкамі барады, пісьмы, якія чытала яму, і тое, ад Тані. І як ён парваў тое пісьмо. Парк, цёмная лаўка, на якой сядзелі яны, збіраючыся развітацца, і далёкі трывожны гудок паравоза. Гудкі заўсёды прарочаць дарогу і нясуць развітанне. А мог бы паехаць і цяпер быў бы зусім чужы ёй. Лена нават спужалася гэтага — як часта ў жыцці ўсё залежыць ад якойнебудзь хвіліны: яна ж магла тады проста падаць руку, і ўсё.

За вокнамі спакойным і далёкім бляскам гарэлі агні горада, роўнымі пункцірамі пазначаючы вуліцы. Чутачку лявей, у парку, яны параскіданы мітусь і адсвечваюць над лістотай угору, як полымя. Калі глядзець на гэтыя агні доўга, яны зліваюцца ў плямы і, здаецца, гудуць і шугаюць, як на ветры... І от ужо не гэтыя агні бачыць Лена перад сабою — другія, калі раскладалі яны вогнішчы сярод пургі, каб абагрэць закарчанелыя рукі. Вось тайга і дарога з яе, па якой ідуць і ідуць цяжка нагружаныя машыны. Тая цесная лабараторыя і Мікалаевы шырокія цёплыя рукі.

«Мікалай,— шэпча Лена, гледзячы ў агні і чуючы і цяпер тыя рукі,— не ведаю, як зваць цябе — дарагі, ці харошы, ці любы. Ці можа чужы. Колькі гадоў я не ведала, дзе ты і што з табою. Што ж, так можа трэба, але мне хацелася б, каб ты ведаў толькі адно — я ні ў чым не вінавата перад табою. І каб не ўспамінаў нядобра пра мяне.

Можа ты думаеш, што я чаго прашу ў цябе? Не, нічога я не прашу ў цябе, Мікалай, бо не маю права гэта рабіць — я шчаслівая. Гэта праўда — самая шчаслівая, і можа з таго мне яшчэ больш няёмка перад табою. Мне хочацца сказаць табе толькі вялікі дзякуй. За тое, што пакінуў у мне самыя светлыя пачуцці, навучыў верыць, любіць і паважаць людзей, ведаць цану жыцця, служыць яго святым ідэалам. Усё, што ў мне ёсць харошага, я ведаю — гэта ад цябе, Мікалай, бо, на цябе гледзячы, я гэтаму вучылася. То быў такі час, што я магла б не адзержацца, і мяне лёгка можна было зрабіць чым хочаш. А ты зрабіў маю душу чыстай і праўдзівай. Не бойся, я не сябе гэтым хвалю, а цябе».

Прыйшоўшы, Андрэй пачаў расказваць, чаму запазніўся. У іх была нарада — прынялі вельмі важны заказ на завод, трэба было памеркаваць, як яго лепш выканаць. Але Лена слухала нехаця, па твары прабягаў цень заклапочанасці.

— Што з табою, Лена? — папытаўся ён.

— Я хачу табе нешта сказаць, Андрэй. Ты не будзеш гневацца, калі я напішу Мікалаю пісьмо?

У Андрэя, як ад удару, сціснуліся бровы.

— Ну што ж... напішы.

Лена доўга паглядзела на Андрэя і расплакалася.

— Ты не любіш мяне, Андрэй,— сказала яна.— Чаму ты не можаш сказаць, каб я не рабіла гэтага? Чаму не можаш забараніць?

— Я веру табе, Лена.

— А мне гэтага мала! Я хачу, каб ты быў са мною строгі. Я ніколі не чую над сабою твае волі, як бы табе ўсё роўна, што я раблю і як жыву. Чаму ты мне ніколі не загадаеш, не скажаш сілаю? Няхай бы я сабе бунтавала, няхай бы працівілася, але мне было б лягчэй, бо я чула б тваю руку, магла на яе абаперціся. Няўжо ты думаеш, што я мацней і дужэй за цябе?

— Ты хочаш, каб я быў падобны на каго другога? — папытаўся Андрэй.

Лена доўга ўслухоўвалася ў гэтыя словы, баючыся ў іх нейкай далёкай праўды. Нарэшце сказала, як бы ачуўшыся:

— Не, Андрэй, не трэба гэтага. Будзь толькі сабою, такі, як ты ёсць. Я сама нядобрая, не злуйся на мяне. І я не буду пісаць, дый не трэба гэтага.

4

Уражанняў ад нарады было многа. Перад хімічнай навукай ставіліся задачы, пра якія яшчэ нядаўна ніхто нават і не думаў. Яна павінна забяспечыць народную гаспадарку сінтэтычнымі матэрыяламі, самымі таннымі і самымі трывалымі, якіх няма ў прыродзе. Вучоныя павінны адкрываць законы і спосабы, па якіх палімеры мянялі б свае структуры і давалі кожны раз толькі патрэбныя якасці. Каб з іх можна было выrабляць матэрыялы цвярдзей за алмазы, каб аўтамабільныя шыны служылі вечна, каб з пластмас рабілі станкі і дамы, гадзіннікі і ракеты. На гэтай нарадзе Лена бачыла вялікіх вучоных, чула іх прамовы. Але галоўнае хваляванне, мабыць, было ў самой атмасферы: нарада праходзіла ў Крамлі, у той зале, з якой звязана ўся гісторыя дзяржавы.

Сёння Лена ад'язджала дадому. Білет быў на руках, але да цягніка аставалася многа часу, і трэба было як мага разумней скарыстаць яго. Яна намеціла пабыць у Траццякоўцы, бо ні разу не дазваляла сабе абмінуць яе, і паспець пабегаць па магазінах: купіць сабе якой навіны на плацце і, галоўнае, пашукаць чаго ў падарунак Андрэю. Яна заўсёды што-небудзь прывозіла яму з дарогі. А цяпер тым больш, калі на душы было так хораша, хацелася і яму зрабіць нейкую радасць.

Спакаваўшы рэчы і падрыхтаваўшы, каб яны былі напашэве, яна пабегла ў буфет, што быў тут жа на два-

наццатым наверсе яе гасцініцы. Заказала лёгкае снеданне і села за круглы столік перад акном. Ранак быў цудоўны — чырвонымі і шэрымі дахамі, выступамі сцен, старадаўнімі вежамі і куртатымі спічакамі ў далёкую смугу ўліваўся пейзаж Масквы.

— Гэты стыль даўно аджыў сваё,— пачула Лена гаворку ззаду.— Такім стылем цяпер працаваць нельга.

Яна ўспомніла, што, калі зайшла сюды, за суседнім столікам сядзела двое мужчын, толькі яна не звярнула на іх жаднай увагі.

— Мы ў камандзіроўцы, Віктар Міхайлавіч,— адказаў другі голас.— Я думаю, што гэтай гаворкі нам хапае і дома.

Лене здалося, што гэта вельмі знаёмы голас. Кажуць, чалавек можа мяняцца аблiччам, характарам, але голас у яго ніколі не мяняецца. «Гэта ж Мікалай,— падумала Лена,— яго голас . Божа мой, чаму ж я не паглядзела на іх?»

У гэтую часіну Лена забыла пра ўсё — што ёй трэба нешта рабіць, некуды спяшацца. Яна чакала, пакуль загаворыць зноў гэты голас. Можа яна памылілася, можа ёй здалося? Вось і сустрэча, такая нечаканая. Што яна скажа яму? І ці рад будзе ён? Ці пазнае? І як жа ёй зрабіць — узяць зараз і падысці да яго? А можа ён сам от падымецца і падыдзе? Можа пазнае? А можа ён пазнаў яе ўжо, калі яна ішла, і чакае зручнай хвіліны? Абы толькі пайшоў ад яго гэты другі чалавек. Што гэта за чалавек і навошта ён? Ці можа ёй павярнуцца, як бы знячэўку, каб ён яе ўгледзеў, калі яшчэ не бачыў? А можа — не ён?

— Гэта нават лепш, што мы не дома,— адказаў першы голас.— Здалёк, збоку ўсё становіцца відней. Нават на самога сябе можна паглядзець інача, Мікалай Гаўрылавіч.

Цяпер Лена ўжо не магла сумнявацца, што гэта ён. Не, яна не будзе чакаць, зараз устане і падыдзе.

— А ў гэтым няма ніякае патрэбы, Віктар Міхалавіч,— запярэчыў Мікалаеў голас.— Я не ўмею азірацца на бакі. Я прывык думаць і ўсё рашаць сам, адзін. Усё браць на сябе і сам адказваць, і ніякіх дарадчыкаў мне не трэба. Вы, мой парторг, павінны былі б ведаць пра гэта.

«У іх нейкая сур'ёзная гаворка. Не, трэба трошкі пачакаць»,— падумала Лена.

— Патрэба вельмі вялікая,— гаварыў далей голас таго, што зваўся Віктарам Міхалавічам.— Я сам, я адзін, мой завод, мой парторг, мае людзі,— вы гаворыце такія небяспечныя словы і хочаце, каб я не трывожыўся. Не, мне тры-

вожна, бо людзі пачынаюць стараніцца вас. Яны баяцца вашай грубасці і глухаты.

Лена перш толькі чакала, калі кончыцца гэтая гаворка, але міжволі пачала прыслухоўвацца. Што ж гэта такое? Хіба Мікалай у чым правінаваціўся? Як жа так можа быць?

— Ясна! — з далікатнай зласлівасцю ў голасе сказаў Мікалай.— Вы хочаце, каб я з усімі запанібрата вітаўся за руку, хадзіў на вяселлі, на хрэсьбіны, абдымаўся і цалаваўся, і тады будзе адна мілата. Я глухі і грубы, бо выгнаў з кабінета Варкова — правільна! Абазваў смаркачом камсамольскага культработніка і загадаў зняць іх сігналку, у якой яны павучалі мяне, як кіраваць,— правільна! Вядома, я разумею, што гэта зроблена не без вашага благаславення. Я зняў з работы інжынера Гарунова...

— Дарэчы,— перабіў Віктар Міхалавіч,— вы павінны яго аднавіць, бо абышліся з ім несправядліва. Тэхніка-эканамічны савет праверыў яго выкладкі, памылка іменна ваша, бо вы распарадзіліся змяніць тэхналагічны працэс.

— Я сваіх загадаў не адменьваю! — строга і нават гнеўна запярэчыў Мікалай.— У мяне план, завод, яго слава, а вы хочаце, каб я займаўся сантыментамі. Падумаеш, падзея якая — чалавека пакрыўдзілі. Выжыве! Так рабіў і так буду рабіць і ўмешвацца не дазволю. І нагул пра гэта кончым, Віктар Міхалавіч, калі не хочаце сварыцца.

— Не, сварыцца я не хачу, Мікалай Гаўрылавіч, гэта нічога не дасць. Мне толькі горка падумаць, што вы самі пад сабою падводзіце рысу. А вы ж былі мужным чалавекам. І гаворка наша на гэтым, вядома, не скончана.

Якія толькі нечаканасці не падпільноўваюць людзей. І як бы дорага Лена дала, каб не чуць гэтай гаворкі. Яна паднялася і, стараючыся не паказаць твару, скоранька пайшла да дзвярэй. Бакавым зрокам на нейкае імгненне яна ўбачыла, што Мікалай зірнуў на яе і ўвесь страпянуўся — пазнаў. Вельмі скоранька ёй хацелася прайсці міма. Але яна пачула, як рыпнула крэсла і як Мікалай падняўся і пайшоў за ёю. За дзвярыма ледзь не подбежкам яна кінулася па калідоры. Ён быў доўгі, услань мяккай ружоваю зялёнай дарожкай. І Лена чула за сабою Мікалаевы крокі.

— Лена! — слаба гукнуў Мікалай.

«Гэта не ён,— сама сабе гаварыла Лена.— Не ён, а нехта чужы, нядобры. Госпадзі, як ён сябе спустошыў. Лепш бы я не бачыла гэтага, лепш бы не знала».

Да ліфта трэба было прабегчы цераз нізкі, прасторны, вылажаны жоўтым бліпчастым паркетам хол. У паркеце адсвечваліся ножкі крэслаў, халодныя грані калонаў, гронкі вясёлкавых бра. Той канец хола быў далёка. І можа ліфта якраз не будзе, яго прыйдзецца чакаць, і Мікалай паспее падысці. Лена крута павярнула ўлева, ведаючы, што тут жа ўніз ідуць усходы. Яна не бачыла, але спінаю чула, што Мікалаевы крокі яе насцігаюць. У галаве сама сабою ішла гарачая, мітуслівая работа мозгу, і невядома адкуль, па якой сувязі, у гэтай палахлівай мітуслівасці прабліснуў Андрэй.

— Лена! — яшчэ раз гукнуў Мікалай.

Але яна была ўжо на ўсходах. Вось яна дабегла да пляцоўкі, павярнулася і, не падымаючы галавы, угледзела, як зверху суняўся Мікалай. Яна бачыла толькі яго ногі, што стаялі на самым краі перад усходамі.

Як бы не чуючы, яна пайшла далей, уніз, яшчэ спяшаючыся, але ўжо спакайнеючы. Нешта скончылася. Харошае ці благое, яна не знала. Дый хто можа знаць, што дае чалавеку развітанне. Занадта нечаканая была гэтая сустрэча, каб можна было так лёгка разабрацца ў ёй.

СПАСЦІЖЭННЕ

(працяг)

4

Памятаю, доўга не мог прывыкнуць, што я рэдактар. Мне было прывычна, што дзень мой з самага ранку пачынаўся тлумам, гаманою: нехта выпісваў матэрыялы на будоўлю; нехта дамагаўся новых спяцовак; неадкладнага афармлення патрабавалі касавыя і банкаўскія аперацыі; некага трэба было адправіць у камандзіроўку; ад некага прыняць справаздачу. Там быў увесь дзень мой распланаваны і разлічаны: дзе якую ўвагу аддаць электрастанцыі, дзе млыну, дзе шахце, дзе будоўлі воданапорнай вежы. Тут жа з самага ранку я прыходзіў у цішыню, каб сесці за свой стол у кутку пакоя і паглыбіцца ў рукапісы. Тут абступалі мяне вобразы другія — з раманаў, аповесцей, апавяданняў,— і я не мог з імі спрачацца, як там, у сябе ў камунгасе, бо за кожным з іх стаяў аўтар, гаспадар, і слу-

халіся гэтыя вобразы не мяне, а яго, нават калі ім гэтага і не хацелася. Часамі мне было з імі добра, я разумеў іх, быў іх аднамыснікам, памагатым, калі яны неслі ў сабе звычайныя чалавечыя ўчынкі, жэсты і думкі; часамі ж усё тое, што яны рабілі і як думалі, аддавала фальшам, і было за іх крыўдна і няёмка, як за жывых. Мабыць, седзячы за тым сваім ціхім выдавецкім сталом, я нарабіў нямала нетактоўнасці і памылак, на першым часе маючы справу не з аўтарамі, а з вобразамі. Мабыць, не мала каго пакрыўдзіў, гаворачы праўду ў вочы. Пазней навучыўся гаварыць яе іначай, кожны раз любы ўчынак прымерваючы да сябе і памятаючы, што людзі чакаюць адзін ад аднаго толькі дабра. І памятаючы, што зло робіцца вельмі лёгка, нават можна не заўважыць, зрабіўшы яго. Вядома, бывае, што праўда робіць вялікі боль, можа не меншы, як крыўда, і яе трэба гаварыць асцярожна. Усе свае няўдачы я перажываў удвая, часамі позна даходзячы, што мне іх рабіць асабліва нельга; нораз я адчуваў на сабе зычліва-насцярожанае вока сяброў-рэдактараў: ці чую я літаратуру? Чалавечая спагада і ўвага вельмі патрэбны, аднак жа, калі яны залішне відны, то падкрэсліваюць далячынь.

Я ні ад кога не пачуў далечыні. Наадварот, я сам дзівіўся людзей. Усё хацелася, каб ніхто ў мне, калі чакае добрага, не памыліўся. А між тым у «ЛіМе» надрукавалася першае апавяданне. Праўда, Алесь Бачыла доўга хадзіў каля таго апавядання, усё перакройваючы яго на свой лад. Мне не хацелася папраўляць яго, яно ўсё яшчэ было свежае, папраўкі маглі парушыць танальнасць. Пазней, астыўшы, я нераз яго правіў сам, бачачы, што ў ім многа лішнятага, неадсеянага матэрыялу. Лёгка пусціў апавяданне ў «Беларусі» Кастусь Кірэенка, аднак далікатна даўшы зразумець, што ў ім таксама я залішне многа пра што хачу сказаць. Мабыць, усе нашы памылкі ад таго, што мы недзе пераходзім грань. Часамі да самых простых ісцін мы даходзім запозна.

Няйначай як дзеля таго, каб я больш уваходзіў у каляіну жыцця, мяне пасылалі ў камандзіроўкі. На свае вочы я ўсюды бачыў яшчэ не загоеныя раны вайны, сляды дзікіх спусташэнняў, удоўства, калецтва. Брацкія, яшчэ без помнікаў і абеліскаў, магілы. Часамі адзінокія, маўклівыя курганкі паўз дарогу, з агароджаю і без агароджы, з надпісам на драўляным слупку, што тут пахаваны невядомы салдат. Колькі іх, невядомых, рабіла той гераічны подзвіг, каб даць мне права сёння хадзіць па зямлі? Нераз

з свае далёкае далечыні я прасіўся, каб памерці разам з імі... Я бываў у гарадах майго дзяцінства і ў тых, што ўз'ядналіся з маёй бацькаўшчынай пасля скасавання несправядлівых граніц. Па старажытных мурах, па выслізганым бруку, па цяжкіх плітах тратуараў чыталася іх гісторыя. Я глядзеў на іх шырокімі вачыма: і Гродня, і Брэст, і Пінск — усё гэта старонкі барацьбы, якія мне былі вядомы толькі з кніг ці з газет. Цяпер па гэтых дарогах усё як бы чыталася мною нанава. Гісторыя мужнасці.

Я ўспамінаў сястру сваю Ульяну, да якой, вярнуўшыся, завітаў на першым жа часе. Вайна ў яе забрала ўсіх сыноў. Яе самую вялі на расстрэл за тое, што не хацела ўдаць сваіх людзей. Па дарозе з сяла на могілкі, а тады далей, у паплавы, яе вялі шасцёра, і яна ўвесь час чула, як у яе спіну ўнізваецца халоднае вастрыё штыка. Трэба было толькі адно: прызнаць, што ў спіску, які ёй паказалі, усе семнаццаць чалавек камуністы і партызаны. У спіску былі і камуністы і партызаны. Былі нават тыя, праз каго загінуў яе муж Даніла, найсумленнейшы чалавек. Але ці пра гэта трэба было цяпер памятаць? Яна вытрывала ўсе страхі, усе здзекі, усе каманды не азірацца, усе павароты то ў поле, то ў панылае бязлюддзе паплавоў, усё далей ад воч, ад сяла, пад наведзенымі буламі смерці, цвёрда памятаючы толькі адно, што ні пад якімі страхамі не павінна назваць ні аднаго таго прозвішча. Усіх зберагчы.

— Дык от, братка, пасля таго часта адбірае ў мяне то ногі, то як не свая робіцца паясніца,— казала Ульяна.

Тады яна не чула яшчэ ўсяе бяды. Па невялікім часе зусім адабрала ў яе і паясніцу, і ногі. Прыкаваная да пасцелі на многа гадоў, яна, аднак, ва ўсім вяла рэй, ведала, чым жыве свет, раіла людзям, як жыць, як берагчы калгас, любіць зямлю. І ўсім наказвала шанаваць партыю. Больш за ўсё дзівіла мяне гэтая яе мудрасць.

Усім сваім жыццём, складам мыслі, душою Ульяна і мяне вучыла дабраце і мужнасці.

НАРАЧАНСКІ ЧАРАЎНІК

Здаецца, гэта было зусім нядаўна, калі ў нашым каралішчавіцкім Доме творчасці жылося і працавалася зусім іначай. Цяпер рэдка каго з пісьменнікаў там убачыш, шмат у каго, дзякуй богу, завяліся свае лецішчы, працаваць можна дома, а бывала, бадай што ўся творчая работа праходзіла там. Прыязджалі найбольш увосень ці ўзімку, а ўлетку чаргавалі работу з адпачынкам. Работа звычайна займала першую палавіну дня, а пасля полудня хто чытаў, хто выходзіў на палянаачку перад домам прабавіць час у размовах, хто, гукнуўшы сабак, пускаўся па лясных сцежках у грыбную ці ягадную вандроўку, а хто, пабраўшы кіі, выходзіў на гравійку, робячы шпацыр аж да самай рэчкі, у час якога, звычайна, прадумвалася тое, што не вытанцоўвалася за пісьмовым сталом. Тут гулялася вельмі добра: бывала, ідзеш, як у глыбока прасечаным сярод лесу зялёным тунелі, зверху накрытым палоскаю блакітнага неба, а шэрая нітка дарогі то ўзбяжыць на пагорак, то апусціцца ў нізовінку.

Праведаць каралішчавіцкіх творцаў часамі наязджаў і Міхась Лынькоў. Такая падзея адразу набывала сваю прыкмету: на палянцы перад домам раптам паяўляўся абярэмак хмызняку. Неўзабаве абярэмак вырастаў у ладную кучу ламачча, потым нехта прывалакаў корч, а яшчэ нехта — добрую сухастоіну. І ўсе ўжо ведалі, што перад домам будзе раскладзена вогнішча.

Раскладалі агонь і без Лынькова, але што гэта быў за агонь — смехата, на яго нават мала хто збіраўся. А лынькоўскі агонь — гэта рытуал, чарадзейства, гіпноз. Можна падбіраць бог ведае колькі высокіх слоў, але яны мала перададуць адчуванне сапраўднага набажэнства, якому аддавалася ў такія часіны ўся істота Міхася Лынькова. Усё жыло ў нейкім узнёсла-зачараваным руху: вочы, твар, пастава ў бронзавых водблісках полымя.

Я перапыню апісанне гэтага свяшчэннадзейства, бо толькі што зрабіў даволі шчаслівую памылку. Звычайна, калі пішаш пра нейкую нагоду ці з'яву і ведаеш, што прыблізна гэтакай жа справай заняты і нехта другі, стараешся пільнавацца добрага такту і не чытаць яго. Але вось у газеце ўбачыў успаміны Янкі Брыля і не ўтрымаў, прачытаў. І добра зрабіў. Аказваецца, пра многае, што я збіраўся гаварыць, вельмі кампактна і добра сказана Брылём — пра тыя ж вогнішчы і карчы; пра нарачанскае

катанне на лодцы; пра чуласць, дабрату, спагадласць і рыцарскую чэснасць Лынькова. Нямала на сабе я адчуў гэтыя яго душэўныя якасці і лічу, што Брыль як бы і за мяне ўдзячна расказаў пра ўсё гэта. Я ж тым часам пастараюся ўспомніць што-небудзь іншае.

Але не, чутачку ўсё ж паспрабую затрымацца: у Лынькова было яшчэ адно, як цяпер кажуць, хобі — фатаграфаванне праз агонь. У тых жа Каралішчавічах Лынькоў некалькі разоў ставіў мяне з дачкою на той бок вогнішча, доўга прыладжваўся, то падымаючы апарат над галавою, то цяжка прысаджваўся, відаць, перамагаючы боль у нагах, каб падцікаваць хвілінку і зняць нас у гарачым паветры, што празрыста дрыжала над агнём. Але выходзіла ўсё нешта не так як трэба — можа быў не той агонь, не тое паветра ці занадта многа збіралася людзей. Лынькоў зашпіліў апарат і сказаў:

— Давай, уюнаш, адсюль паедзем.

Лынькоўскі шафёр на лынькоўскай «Пабедзе» павярнуў па гравійцы направа, мінуў адзін пагорачак, другі, цераз неглыбокую канаўку крутнуў яшчэ раз направа, на вузенькую лесавую дарожку, і спыніўся на палянанчцы, поўнай нейкага зацішнага, паэтычнага хараства, нават са смаловым карчом пасярэдзіне. З якою ахвотаю сваім маленькім гуртам мы збіралі па лесе сухі хмызняк, перасохлыя аскабалкі! Якое цудоўнае, у меру празрыстае і ціхае было наша вогнішча! І на якога добрага і шчаслівага чараўніка быў падобен Міхась Лынькоў! Ён пстрыкаў і пстрыкаў апаратам праз вогнішча, ласкава буркочучы:

— Малайцы! Яшчэ трошачкі ўбок ступіце, ага, вось так. Птушанятка маленькае, як цябе там,— Галачка? — чутачку больш прытуліся да таткі. Ну вось! Не-не, яшчэ разок станьце!..

*

Дадому да Лынькова мяне прывяла нейкая дзелавая патрэба. Няйначай гэта ў той раз, калі Дзяржаўнае выдавецтва даручыла мне весці «Бібліятэчку беларускага нарыса і апавядання». Трэба было перагаварыць з Лыньковым пра запланаваную яго кніжку «Агні Танганьікі», бо сам ён не вельмі рупіўся, каб папасці ў той план. Я, ведама, і пачаў з дзелавой размовы.

— Пачакай, дарагі ўюнаш, усё паспеем зрабіць, перш давай пасядзім трошкі, ты ж у мяне ў гасцях першы раз.

Рабочы пакой у Лынькова быў не так і вялікі, але

ўтульны, з балконам у ціхі двор. У ім не было нічога лішняга: пісьмовы стол, два крэслы, канапа і аж да столі ўстаўленыя кнігамі стэлажы, што займалі спрэс дзве сцяны. Стэлажы зашклёны так, што кожная палічка ў кожнай секцыі мела свае, як кажуць, аўтаномныя дзверцы, яны неяк хітра адчыняліся знізу, утопліваліся ў стэлаж, падымаючыся над палічкаю казырком і даючы зручны доступ да кніг. На адной з круглых точаных ручак на такіх дзверцах вісеў начэплены на плечкі гаспадароў гарнітур. (Пазней я пераканаўся, што на гэтым месцы, каб быць напашэве, ён вісеў заўсёды).

— ...Ды можа я табе што-небудзь пакажу ці раскажу, мой дарагі інак Іаане,— далей вёў сваю гаворку Лынькоў. Ён называў мяне то ўюнаш, то інак Іаане.

З ніжніх шафак, што служылі стэлажам за тумбачкі, Лынькоў пачаў вымаць перавязаныя папкі, вялікія канверты з чорнай храбусткой паперы. З іх ён выкладаў на стол то малыя, то вялікія фотаздымкі з не нашымі гарадамі і пейзажамі, з не нашымі людзьмі і з не нашым гарачым сонцам. Пра кожны фотаздымак Лынькоў нешта расказваў, і гэтыя расказы і фотаздымкі вадзілі мяне бог ведае дзе — па Стакгольме і Капенгагене, па Амстэрдаме і Рыме; я пралятаў над Грэцыяй, Турцыяй, Іранам, рабіў вымушаныя прыпынкі ў нейкіх неспадзеўных мясцінах. Больш за ўсё я вандраваў па Індыі, гэтаму мне памагала экзотыка, набытая з розных кніг і чутак — пра змеяў, што танцуюць пад музыку, факіраў, ёгаў. Якраз, здаецца, тады Лынькоў ці то рыхтаваў, ці то пісаў ужо свае ўспаміны «З зарубежных вандровак», і яму, відаць, было вельмі дарэчы сёе-тое аднавіць з сваіх дыпламатычных ваяжоў.

Потым паявіўся праектар, я мяняў у ім здымак за здымкам і мог, як кажуць, прадметна пабываць у розных краінах, пабачыць самыя найвыдатнейшыя цуды свету — вадапады, піраміды, храмы, музеі, масты...

Потым на стале паявіліся сувеніры. Чаго толькі там не было: самыя дзівотлівыя вырабы ад значкоў аж да чорных бліскучастых чарцей.

Потым паявілася Соф'я Захараўна і ўсё перапыніла:

— Мабыць, ты чалавека бязбожна натаміў,— гэта да Лынькова. А тады да мяне: — Давайце лепш пяройдзем у сталавальню...

Ужо дома я беражліва выняў з партфеля сувеніры, без якіх Лынькоў не мог мяне адпусціць: індыйскую цы-

гарэтніцу і асадку. Цыгарэтніца зроблена з сандалавага дрэва яна і да гэтага часу вылучае нейкі бальзамічны пах, міжволі рысуючы ў уяўленні вобразы далёкай, але нечым мілай і спакуслівай Індыі. Асадка вытачана з косці, і мне здаецца, што абавязкова з слановай, яна звінчваецца з дзвюх частак: у свідравіну ў ніжняй устаўлены ажурны слупок, ім павінна зацiскацца пяро; на верхняй, спусцістай, вытачана некалькі мяккіх круглаватых патаўшчэнняў, самы ж верх пераходзіць у танюсенькі спічак, нагадваючы нечым усходнюю рытуальную архітэктуру.

*

Хочацца і яшчэ адным выпадкам расказаць пра далікатнасць душы Міхася Лынькова. Але і расказванне гэтае патрабуе далікатнасці.

У свой час Дзяржаўнае выдавецтва даручыла мне рэдагаваць раман Лынькова «Векапомныя дні». Мяне гэта не на жарт злякала. Па многіх прычынах. Першае, на рэдактарскую работу я прыйшоў пасля даволі доўгага перапынку і не вельмі быў упэўнены, што ўсё ў мяне ідзе да ладу. Другое, ад самага таго маладнякоўства, калі мы былі на з'ездзе і нават сфатаграфаваліся разам на двары Інбелкульта (на задняй высокай лаўцы пры чырвонай цаглянай сцяне, Лынькоў у шынялі з папяросаю ў адстаўленай руцэ, я, поруч, у кажушку і ў вясёлай кепачцы), ад таго даўняга часу я ўспрымаў Лынькова толькі як свайго літаратурнага настаўніка,— то ці меў я права быць яго рэдактарам? Лынькоўскія апавяданні «Гой», «Над Бугам», «Андрэй Лятун», «Баян», «Сінія галіфэ», такія ўзнёслыя і рамантычныя, былі мне як музыка. Калі крытыка часам называла Лынькова прадстаўніком беларускай арнаментальнай прозы, то я ганарыўся, што і мяне часамі называлі арнаменталістам, не ўдаючыся ў сутнасць — добра гэта ці блага. І раптам — быць яго рэдактарам! Трэцяе, я ніколі не быў раманістам, творы шырокага плану мне проціпаказаны, а тут раман на чатыры ці можа на пяць кніг! Ды ці згодзіцца на гэта сам Лынькоў? Але ўваходзіць у пакой рэдакцыі галоўны рэдактар выдавецтва Янка Шарахоўскі і, убачыўшы маю збянтэжанасць, кажа:

— Міхал Ціханавіч ведае, і ты, пане-браце, не трапячыся.

Але ўсё роўна я неспакойны: мне трэба пачуць гэта ад самога Лынькова.

— Уюнаш, усё нармальна,— сказаў Лынькоў, калі я з ім пабачыўся. Мы з ім прайшліся па выдавецкім вузенькім калідоры, і ён, як звычайна перасыпаючы гаворку царкоўнаславянізмамі, тлумачыў: — Тут у нас з табою патрэбна вось якая прадмова, дарагі інак Іаане: гэты мой раман-эпапея, а калі сказаць высокім штылем, дык раман-апупея, пісаўся многі леты і зімы, і натуральна, што ён высіліў мяне да крывінкі. Я, уюнаш, добра разумею, што там будзе многа лішніцы, і ты не будзеш ведаць, што з ёю рабіць. А мне якраз і трэба, каб ты не баяўся. Я тваю руку ведаю, дзярзай, уюнаш, а я буду ўпаваць на тваю літасць, а найпача на строгасць. Дзярзай, кажу!

Прыйшлося дзярзаць. Але ўсе заўвагі і алоўкавую ахвочасць на палях рукапісу я паказаў Лынькову. На маё дзіва ён толькі сказаў:

— Уюнаш, усё ў норме.

І вось пасля некаторага часу, калі раман выйшаў з друку, Лынькоў падхапіў мяне на сваю «Пабеду» і завёз на нарачанскае лецішча.

Тут я баюся расказваць многа, бо было ўсё нармальна Лынькоўскае і, мабыць, усім вядомае. Было выношванне з хлеўшка і начэпліванне на лодку матора, добрасумленнае тлумачэнне, якія найлепшыя якасці мае «Віхор», а якія «Масква», што адзін з іх трэба збыць, а другі набыць; было катанне па возеры з заездам на востраў, чароды качак, якія то ўзляталі, патрывожаныя намі, то зноў садзіліся на ваду і аніяк нас ужо не баяліся; была перавозка карчоў на бераг, тое самае чарадзейнае вогнішча, за якое сябры назвалі Лынькова нарачанскім чараўніком; была вячэра ў сцішаным адвячоркавым доме з высокімі светлымі пляшкамі нетутэйшага віна на стале, якое гаспадар наліваў у такія ж высокія і светлыя келіхі.

— Давай, дарагі інак Іаане, падымем сіі чашы ды пабачым, якімі акрыдамі і дзікім мёдам, сабраным з тутэйшых угоддзяў, участуе нас прападобная Соф'я Захараўна.

Як звычайна, ішла нейкая гаворка, ішоў час. Я ўсё чакаў, што Лынькоў нейкім чынам упомніць «Векапомныя дні» — цяпер, мабыць, аўтарская думка пра іх усталявалася, выявілася тое, чым можна радавацца, і тое, што засмучае.

У мяне між тым у душы ўвесь час жыла трывога, ці не парушыў я ў тым маім рэдагаванні меры добрага чалавечага і прафесійнага такту. Няйначай трывога была відна, бо Соф'я Захараўна знайшла спосаб перапыніць яе.

Яна, мабыць, разумела, што зручней за ўсё такую тонкую аперацыю належыць выканаць ёй.

— Памятаю, як вы хваляваліся, калі браліся за рэдагаванне Міхасёвага рамана,— сказала яна.— А цяпер жа намечана выдаць яго ў Маскве. Дык Міхась сядзіць і ўсё падціскае і падціскае яго.

Усё. Божухна, колькі найчуйнейшай дыпламатыі ў гэтых жанчын! Яна выручыла і мяне і падбіла Лынькова нарэшце супакоіць мае трывогі.

— Некалі, уюнаш Іаане, я сказаў табе, што ўсё ў норме. Гэтак яно і ёсць, ты дзярзнуў вельмі добра. То можа давай хоць цяпер зробім божаскую справу ды акрэпім святою вадзічкаю тое наша дзярзанне. Налей з гэтай добрай нагоды, дарагая Соф'я Захараўна, паўней нашы келіхі.

КРОЎНАСЦЬ

Дзякуючы многім акалічнасцям — і рамантычна-гераічнай акрасе юначых гадоў і вучобе ў сельска-гаспадарчым тэхнікуме, дзе ўпершыню дакрануўся да перадавых ідэй часу, няхай сабе хоць толькі кніжна, і далейшай ужо практычнай дзейнасці дзяржавы — вельмі даўно я адчуў духоўную прыналежнасць да партыі. І калі пазней розныя, даволі сур'ёзныя няроўнасці лёсу не пахіснулі адчування гэтай прыналежнасці, захацелася замацаваць яе і фактычным актам. Я азірнуўся на пражытае — хто найбольш мяне адчувае? І хто найбольш упэўнены ў мне? Не па гадах доўгага супольнага ці рознага існавання, а пачысціні веры і сэрца.

Лынькоў зразумеў мяне з першага слова.

— Уюнаш,— сказаў ён,— можаш не сумнявацца. Надумаў ты правільна. А другую рэкамендацыю дасць Ілья Гурскі, тут ён — сумленны. Я, калі хочаш ведаць, проста чакаў, што ты надумаеш іменна гэтак.

ТРОШКІ ДАЛЁКІХ ЗГАДАК

Паважаная Мар'я Якаваўна! Нямала ўжо часу таму назад па тэлефоне Вы вельмі асцярожна папыталіся, ці не мог бы я хоць колькі слоў сказаць пра Ілью Гурскага. Вы заспелі мяне знянацку: У мне яшчэ не астыла адчуванне,

што гаварыць пра яго можна толькі як пра жывога. І раптам усё, што ты ведаў пра чалавека, стала як бы нейкаю недарэчнасцю ці няпраўдаю. І я сказаў, што хачу трошкі пачакаць.

Як праходзіць усё на свеце, прайшло нарэшце і гэтае маё здранцвенне.

Ілью Гурскага я ведаў даўно, недзе, мабыць, з дваццаць дзевятага ці трыццатага года. Але вельмі здалёк, проста па чутках, што ёсць такі чалавек, даволі малады, але ўжо бывалы: прайшоў рабочую загартоўку на Абухаўскім заводзе ў Петраградзе, ваяваў на розных франтах супроць ворагаў Савецкае дзяржавы і быў паранены, цяпер робіць у наркамасветы на пасадзе старшыні галоўмастацтва.

І аднаго разу, памятаю, у Дом пісьменніка зайшоў незнаёмы чалавек. Пісьменнікі там тапталіся часта, бадай што ўсіх іх я ведаў, а гэтага не бачыў ні разу. Шчуплы, стройнай постаці, з інтэлігентнымі, тонкімі рысамі твару. У лёгкім цёмным паліце. Ціхім, але як бы спрактыкавана-дзелавым голасам ён некага папытаўся і прайшоў далей, у бакавы пакой.

І нехта сказаў:

— Ілья Гурскі. Драматург.

Потым паяўляўся ён у Доме часцей і часцей. Ішоў час, у тэатрах ставіліся яго п'есы, ён жа па-ранейшаму працаваў на адказных пасадах, звязаных з мастацтвам, тэатрам, літаратураю. Перад гэтым, памятаю, нейкі час рабіў галоўлітам. Але скажу, што найбольш яркі вобраз Гурскага таго часу ў маёй памяці звязаны з Вамі, Мар'я Якаваўна. Лепш кажучы, не звязаны, а падкрэслены Вамі. Гэта, калі аднаго разу ў той жа Дом пісьменніка Гурскі зайшоў разам з Вамі.

Перш за ўсё я быў здзіўлены тым, што ён зайшоў з жанчынаю, бо мне ён уяўляўся толькі адзінокі. А другое, што жанчына аказалася нават яго жонкаю, пра гэта тут жа, як ветрам, прабегла чутка. Не дзіва, што я глядзеў на Вас як зачараваны. Вы стаялі поруч з ім тоненькая, пышна-светлавалосая, зусім-зусім маладая, падобная на вясну. Ці на музыку. Толькі вочы — не мяккія. Нават строгія. І тут жа зноў, бог ведае якім ветрам, прабегла другая чутка, што Вы — настаўніца. Гэта кінула зусім іншае святло і на Гурскага: нечакана я ні то ўбачыў, ні то ўявіў, што ён таксама настаўнік. Усё ў ім ад гэтай добрай прафесіі: і ціха-ўдумлівая гаворка (мне заўсёды здавалася, што яму

нялёгка выгаварыць першае слова), і манера трымацца, і нават пісьменніцтва — аддаць сябе людзям. Мне падумалася, што абое вы, мабыць, вельмі шчаслівыя людзі.

*

З таго часу, як Гурскі стаў рэдактарам «Літаратуры і мастацтва», гэтая прафесія замацавалася за ім на ўсё жыццё. Па сутнасці, з таго часу і я больш блізка пазнаўся з ім, бо таксама рабіў у «ЛіМе».

У тыя далёкія дні рэдакцыя мясцілася на другім паверсе Дома пісьменніка ў двух пакоях: большы пакой — агульны, а за ім — куткавы — рэдактараў кабінет.

У рэдакцыі нас працавала трох: Міхал Блісцінаў, Барыс Мікуліч і я. Нашым абавязкам было рабіць газету ад пачатку да канца. Мы арганізоўвалі матэрыял, апрацоўвалі яго або пісалі самі, рабілі макет вёрсткі, вычытвалі. На Блісцінаве, апроч таго, ляжалі абавязкі сакратара, ён прывозіў нам і зарплату з выдавецтва; на мне — стыль. Чацвёртым чалавекам была машыністка Соня Ялава, якая мяне скрозь дзівіла, што друкавала бясконцаю аўтаматнаю чаргою, любіла рабіць гэта пад дыктоўку і глядзела не на клавішы, а ў адзінае наша вечна замурзанае акно, хоць тое ўпіралася ў глухую мураваную сцяну суседняга дома.

У такім жа пакоі на ніжнім паверсе, дзе месціліся работнікі апарата, сядзела другая машыністка, на выгляд не маладая, з няласкавым, цёмным і панурым тварам, з татарскаю смуглявасцю і з татарскім гучаннем у прозвішчы, туды, вывучыўшы цыклічнасць у прылівах і адлівах наведнікаў, часта спускаўся Мікуліч, лёгка і весела несучы сваю шчаслівую, як бы песенную красу і юначасць. І ўжо ўсіх нас дзівіла ніколі і нікім не разгаданая тайна — чаму і па якіх законах бывае, што ў душах людскіх не прызнаюць несумяшчальнасці рай і пекла.

Прашу прабачыць: у рэдакцыі быў яшчэ адзін чалавек — Міхась Модаль. Ён рабіў намеснікам рэдактара, на яго клопаце ляжалі ўсе перадавіцы, але з найбольшаю ахвотаю ён спецыялізаваўся на тэатральных рэцэнзіях і аглядах. Гэта, як кажуць, было яго хобі.

Ілья Гурскі прыходзіў на работу акуратна, па строга заведзеным парадку. Калі меўся дзе затрымацца па справах — пра гэта гаварыў загадзя. Павітаўшыся, звычайна пытаўся, ці няма якіх нядобрых навін, іх, вядома, не было, і ён, не спяшаючыся, праходзіў у кабінет. Ён ніколі не

спяшаўся: ні ў гаворцы, ні ў рабоце, і гэтая манера роўнага, спакойнага, але ўпэўненага рытму перадавалася і нам.

Не ведаю, як дома, у сям'і, але на рабоце Гурскі быў просты, даступны і строгі. Я не памятаю выпадку, каб у нас, у рэдакцыі, у прысутнасці рэдактара была нейкая панібрацкая размова з жартамі або, як гэта часта бывае, з анекдотамі. Прыватнай блізкасці ён не дапускаў. Прынамсі, мы адчувалі, што службовае і асабістае пры ім ніяк не можа кантактавацца. Затое я не памятаю выпадку, каб ён на каго накрычаў, зрабіў каму вымову, пакрыўдзіў каго. Не скажу, каб у нас ужо ўсё ішло ідэальна, бывала, што запознішся дастаць матэрыял, не паспееш апрацаваць яго. Ілья Гурскі выслухае і папытаецца:

— А што ў нас ёсць на замену?

Не ў «вас» скажа, а ў «нас», як бы лічачы і сябе хаўруснікам нашае непаваротлівасці. Такія хвіліны нам былі цяжэй за вымову.

Адзін нязручны выпадак я асабліва памятаю, бо нейкім чынам ён зачапляў і мяне. Я напісаў артыкул пра апавяданне, як звычайна маракуючы на крытыку за яе абыякавасць да самага старажытнага жанру літаратуры. Артыкул выйшаў доўгі, на цэлую старонку. Каб ажывіць яго, намерыліся даць нешта накшталт ілюстрацыі: разбіць раздзельчыкі зарысоўкамі, мастак Анатоль Волкаў зрабіў востры, дасціпны шарж на мяне. А калі назаўтра ўзялі ў рукі газету, на старонку нельга было глядзець, да таго яна была шэрая, нудная, сляпая. Усё афармленне таямніча знікла, і бог ведае хто прыдумаў самае тупое тлумачэнне: на нашу газету не хапіла цынку. Дзён колькі Гурскі хадзіў цёмны, панылы, нам хацелася праваліцца скрозь зямлю. Нас гняло самае прыкрае ўсведамленне: мы не спраўдзілі яго паверкі на нас.

Аднаго разу Гурскі пазваў мяне ў кабінет і паказаў вельмі невясёлае пісьмо. Настаўнікі з Любані пісалі, што днямі ў іхнім мястэчку, у клубе, выступаў Янка Скрыган і вельмі неэтычна паводзіў сябе. На запытанні, чаму ён гэтак незразумела і цяжка піша, ён адказаў: «Вам трэба дарасці да таго, каб умець чытаць мяне». І настаўнікі прасілі абмеркаваць Скрыгановы паводзіны сярод пісьменнікаў.

— Што ж ты там нарабіў? — папытаўся Гурскі, ні то са шкадобаю, ні то з трывогаю гледзячы на мяне.

— Я ў Любані ніколі не быў,— сказаў я, аглушаны няпраўдаю гэтага пісьма.

— Як так? — адразу патушыўшы ў вачах трывогу, папытаўся Гурскі.

— У Любані я ніколі не быў,— цвёрда і ўжо весела паўтарыў я.— Але цяпер вельмі хацеў бы пабыць, разам з вамі, каб і вы, і тамтэйшыя настаўнікі ўпэўніліся, што ў іх быў не я, а нейкі шарлатан.

У Любані я папраўдзе ніколі не быў, і мне вельмі хацелася, каб Гурскі сказаў: — Ну што ж, з'ездзім, перакаваемся,— і каб мы зараз жа паехалі.

Але Гурскі сказаў зусім іначай.

— Ну то ідзі спакойна працуй, нікуды нам ехаць не трэба,— сказаў ён.

*

Сустрэўся я з Гурскім праз многа гадоў, але так, што таго перапынку як бы і не было. У Доме пісьменніка збіраўся прэзідыум Саюза, Гурскі павітаўся і сказаў:

— Ты от што, можа маеш што друкаваць, то прынось да нас, у «Беларусь».

І першым жа апавяданнем «Дакументальная рэвізія» я даў яму клопату. Па невялікім часе, як яно было надрукавана, нехта з рэдакцыі пазваніў, каб я зайшоў да іх.

Гурскі сядзеў у светлым пакоі, за даволі ладным, цяжкім, на тыя часы модным ампірным сталом, пастаўленым трошкі наўскасяк, каб зручней падала з акна святло. Спакойна павітаўся, спакойна палажыў перада мною пісьмо, надрукаванае не надта роўным шрыфтам.

Начальнік гродзенскага кантрольна-рэвізійнага ўпраўлення вінаваціў рэдакцыю часопіса, што яна надрукавала шкодны матэрыял. «Автор старается протянуть мнение тех элементов хозяйственников, которые стараются распоясавшись игнорировать правительственные решения»,— гаварылася ў пісьме. «И не тактичны к очерку иллюстрации, в частности та, что показывает перед зеркалом Марину Борисовну и на втором плане ревизора, у которого только и дела, что любоваться тем, как она приводит себя в порядок»,— гаварылася далей.

На той час я быў добра дасведчаны ў бухгалтарскіх і рэвізорскіх справах, выпісваў часопіс «Бухгалтерский учет», у якім глыбока, тактоўна і разумна асвятляліся пытанні бухгалтарскага ўліку і рэвізорскай практыкі, і таму сказаў Гурскаму:

— Дазвольце я сам напішу адказ таварышу начальніку гродзенскага КРУ.

— Я, браце Яне,— сказаў Гурскі,— папрасіў цябе зайсці не таму, што спужаўся пісьма, а каб сказаць табе дзякуй. Не часта бывае, каб мастацкае слова актыўна ўмяшалася ў жыццё. Менавіта гэтаму я рад. А калі табе хочацца самому адказаць на чыноўніцкую фанаберыю, дык зрабі ласку.

*

Найбольш блізка мы пазналіся з Гурскім на ніве літаратурнай. Рэч у тым, што я быў рэдактарам яго рамана «У агні», калі ён друкаваўся ў Дзяржаўным выдавецтве, а потым трылогіі «Вецер веку» — у часопісе «Полымя». Яна друкавалася некалькі гадоў запар самастойнымі раманамі: «Мір хацінам», «Улада Саветам» і «Народжаная бурай».

Вось тут, прызнаюся, Мар'я Якаваўна, мы працавалі з Гурскім не надта лагодна. Як вядома, аўтарскія і рэдактарскія ўсталяванні не заўсёды ўмеюць лёгка паразумецца. Прыходзілася і спрачацца, і або нешта дарабляць, або нечага цурацца. Нашы сустрэчы падобны былі на бясконцыя дыскусіі, ад якіх заўсёды бывае і прыемна і мулка. Гурскі не любіў саступаць, прынамсі, не спяшаўся ўжыцца ў нейкае непрадбачанае меркаванне, і гэта мне, скажу шчыра, падабалася. Бо часамі бываюць такія аўтары, якія дазваляюць правіць сябе як хочаш, абы толькі рукапіс быў хутчэй падпісаны ў друк. Гэта, звычайна, вельмі пасрэдныя аўтары, у іхніх рукапісах бадай што ніколі няма таго, што трэба абараняць.

Як у ўсякай творчай рабоце, бывалі ў нас і грахі. Адзін такі грэх Вы, мабыць, добра памятаеце, Мар'я Якаваўна. Гэта, калі ў нас аставаліся апошнія раздзелы рамана «У агні». Назаўтра быў выхадны дзень, і Гурскі сказаў:

— Дарагі Яне, не хочацца, каб прападаў цалюткі дзень, прыходзь заўтра да мяне дадому. То можа мы і скончым.

Вы тады жылі на вуліцы Якуба Коласа, кабінет у Гурскага быў вузенькі, месціўся ў ім толькі пісьмовы стол ды канапка. Мы пасядзелі доўга і вельмі плённа: і напрацаваліся, і наспрачаліся, і да ачмурэння накурыліся.

— Ну вось,— сказаў Гурскі,— усякая добрая справа патрабуе і добрага афармлення...

Гэта ж скрозь так бывае, што ўсякае рэдактарства мае свой традыцыйны канчатак, толькі ніхто пра гэта не піша:

не дай божа, каб пра мяне, грэшнага, сказалі, што я грэшнік.

Я не буду апісваць, Мар'я Якаваўна, нашай працы далей, за вашым сталом, скажу толькі, што яна ішла куды весялей і ахвотней.

Потым Гурскі баяўся пускаць мяне аднаго дадому. Але на вуліцы мы пераканаліся, што абодва яшчэ дужыя хлопцы, і паволі, з добрым роздумам, я пайшоў адзін. Балазе ўночы не відно, як хто ходзіць...

*

Вось і ўсе далёкія згадкі, Мар'я Якаваўна. На адной з кніг Ільі Гурскага, якія стаяць у мяне на паліцы сярод іншых дарчых кніг, ёсць такі надпіс: «На добрую памяць. Ад усяго сэрца. Шчыра дарую. Ілья Гурскі».

Не магу не сказаць пра самае дарагое, што ён мне падараваў: патрэбу шмат у чым быць падобным да яго. У чысціні пачуццяў, перакананняў і ўчынкаў. Ён быў глыбока партыйны. І ў гэтым мне хочацца быць падобным да яго.

Пра гэта я сказаў яму самому ў вельмі харошы, урачысты для яго дзень, калі ў рэстаране «Беларусь» ён сабраў сяброў, на сваё сямідзесяцігоддзе, і поруч з ім, у сваёй ужо не веснавой, а ў восеньскай мілай красе сядзелі Вы, Мар'я Якаваўна, і мы падымалі за вас віншавальныя чаркі.

ЛІСТ НЕ БУДЗЕ АДАСЛАНЫ

Дзядзька Бядуля, я перад Вамі вельмі вінаваты. Паслухайце, што прычынілася са мною. Вось у маіх руках запрашэнне на вечар, прысвечаны дзевяностагоддзю з дня Вашага нараджэння. Ён меўся быць, як і належыць па календары, 27 красавіка 1976 года ў вельмі прыветным Доме мастацтваў, што некалі — памятаеце? — зваўся Юбілейным домам. У свой час у ім мясціўся этнаграфічны музей, потым Дзяржаўная бібліятэка. А потым яго падвысілі, адкапаўшы цокальны паверх, зрабілі там клуб з усімі наменклатурамі, што належыць мецць клубам, а ўнізе кавярню, даволі-такі ладную, шмат хто туды забягае. Я ведаю, што гэтакімі рэчамі Вы не займаліся, і таму распісваць не буду, а павяду гаворку далей.

У запрашальным білеце напісана праграма вечара. Напісана, што ўступнае слова на ім скажа Іван Чыгрынаў — ён цяпер у нас за сакратара Саюза пісьменнікаў, нішто сабе хлопец і добры пісьменнік. Даклад «Жыццё і творчасць Змітрака Бядулі» прачытае кандыдат філалагічных навук Віктар Каваленка (таксама Вы яго не ведалі, разумная галава), і, нарэшце, з успамінамі пра Вас выступяць пісьменнікі і дзеячы культуры. А на заключэнне будзе мастацкая частка. На гэтым жа білеце такое знаёмае і блізкае сэрцу Ваша аблічча — графічны партрэт, аўтар якога, на жаль, невядомы. Чамусьці не заведзена ў нас называць, хто рабіў, напрыклад, вокладку на часопісы «Полымя», «Новый мир» ці, скажам, «Наш современник». Часамі мы не ведаем, чыё фота ці рысунак змешчаны ў нейкай кнізе або чыя пастаўлена недзе скульптура. А гэтым, бывае, карыстаюцца несумленнікі ці няўмекі.

Я таксама падакляраваў выступіць на Вашым вечары, і вось прычынілася такая нечаканасць, што...

Але чакайце, лепш я ўсё раскажу з самага далёкага пачатку.

*

Памятаю, я ніколі не спадзяваў, што нейкае звычайнае слова або некалькі спалучаных слоў могуць гэтак скалануць душу. «На зачарованых гонях» — вось якія былі гэтыя словы. Чаму яны мяне ўразілі? Першае: бо яны былі як бы з нашае хаты, з таго спрадвечнага скарбу, які завецца матчынаю моваю. А другое — я і сам не ведаю: мабыць, тое, што яны неслі ў сабе як бы нейкую трапяткую тайну. Чалавек ўсё жыццё на нешта спадзяецца: на тое, чаго няма, але ў што трэба верыць. Гоні — гэта ж зямля! І вось яна зачараваная: чым жа спатоліць яна адвечную чалавечую веру? Якія трэба знайсці заклёны, каб усё жыццё поруч з чалавекам ішла толькі добрасць і не было бяды? Вось якім сэнсам дыхнула на мяне назва Вашае кнігі. І аж да гэтага часу я памятаю такія шэдэўры з яе, як «Малыя дрывасекі», «Пяць лыжак заціркі», «Летапісцы», «Гора ўдавы Сымоніхі». Не, не знайшлося чараў, каб і малыя, і вялікія жыхары з Вашы апавяданняў тады, на тым далёкім Вашым часе, пазналіся з добрым лёсам.

З гэтае кнігі я і палюбіў Вас, дзядзька Бядуля. Бо тое, што пісалася ў ёй, я бачыў на свае вочы: і ў нашых Труха-

навічах, і ў Гарадзішчах, і ў Гольчычах. Краналася гэта і нашае сям'і.

Нейкім чынам я знайшоў і Вашы «Абразкі», выдадзеныя ў Пецярбурзе ў 1913 годзе самаахвярным выдавецтвам «Загляне сонца і ў нашаваконца», і ці не там толькі ўпершыню прачытаў Вашу імпрэсію «Пяюць начлежнікі», ад якой і да гэтага часу чую і тую ноч, і начлежныя галасы, і звон цугляў, і хрумстанне коньмі ахаладзелай роснай травы.

А яшчэ памятаю Вашы вершы. Вы падпісвалі іх прозвішчам Ясакар. У іх многа было казачнага і таксама таямнічага, і нават вусцішнага, ад чаго хацелася чытаць іх больш і больш — яны нечым палохалі і некуды заварожліва звалі. А можа галоўная вабнасць вершаў была ў самім прозвішчы? Памятаю, перад Слуцкам ішлі старыя прысады: высокія таполі з вузка сціснутым галлём і спічастаю вяршыняю. Цяпер я ведаю, што яны завуцца пірамідальнымі, а тады за іх імклівае хараство і нейкую паэтычную нетутэйшасць я называў іх Вашым прозвішчам — ясакарамі. Ці мала ў чым, бывае, мы памыляемся і вельмі шкадуем, што тая памылка не асталася праўдаю.

*

Мне вельмі не ставала таго, што я Вас ніколі не бачыў. І вось нарэшце я прыехаў у Мінск. Я ўжо сам нешта патроху крэмзаў, і калі што больш-менш удавалася, то з падзякаю ў сэрцы памятаў, што на празаічную пуцявіну мяне скрозь падбівалі кнігі дзядзькі Коласа і Вашы. Праўда, на той час напаткаў мяне грэх: па розных прычынах, а найбольш, мабыць, ад браку элементарнай літаратурнай падрыхтаванасці я схаўрусаваўся з тутэйшым нашым футурызмам, далёкім складу мае душы. Вельмі пашкодзіў ён мне, збіваючы на манернасць і крык, але трэба быць справядлівым — шмат чаму і навучыў: навучыў лаканічнасці, строгасці і дысцыпліне слова.

Не памятаю, дзе я Вас упершыню ўбачыў, памятаю толькі, што доўга на Вас глядзеў. Невысокі ростам, у чорным гарнітуры, з пышна-кучараваю галавою, з характэрным тварам, на якім асабліва вылучаліся вочы і губы. Вы стаялі на вуліцы і гаварылі з больш высокім за Вас чалавекам. Разам з ім Вы і пайшлі, ступаючы вельмі мякка, гаварылі нямоцна, падкрэсліваючы свае словы скупым, нясмелым жэстам рукі. Вы як бы клапаціліся, хаця б не

пакрыўдзіць субяседніка няласкавым тонам ці якім неасцярожным словам. І ў Вашых велікаватых вачах і ў поўных губах было столькі цішыні і добрасці, што міжволі падумалася: вось таму і ў творах Вашых так многа паэзіі. Можа я памыляюся, можа, дзе трэба, Вы былі і строгі і нават жорсткі, бо трэба прызнацца, што без гэтакай якасці абыходзіцца пакуль што проста нельга.

Потым прыкмячаць Вас я стаў усё часцей і часцей, мне было прыемна, што Вы як бы вылучалі мяне нейкаю асаблівою ўвагаю. Часам я бачыў Вас разам з Мар'яй Ісакаўнай і доўга глядзеў Вам услед, бо ў Вашай лучнасці было нешта не зусім звычайнае: яна была высокая, стройная, прыгожая нейкаю нетутэйшаю, як бы пужліваю прыгажосцю, і нястрымна імклівая. Пра Ваша рамантычнае, як бы нетутэйшае каханне і сямейную ладнасць хадзілі прыгожыя чуткі, і гэта яшчэ больш вылучала Вас з агульнае прывычнасці.

Я схіляўся перад рамантыкай і Вашай дзейнасці: Вы былі рэдактарам такіх часопісаў, як «Зоркі», «Наш край», пісалі артыкулы пра народную творчасць, выяўленчае мастацтва, тэатральныя справы і стан грамадскай думкі на Беларусі. Вы былі пісьменнікам вялікай мары, гэта значыць, абуджалі сацыяльную і нацыянальную свядомасць народа.

Ва ўсе часы людскога высокага рушэння гэтакая чыннасць слушна прызнаецца найпачэснейшаю.

*

Не памятаю, ці гаварыў я калі з Вамі пра Вашага «Салаўя». Я задыхнуўся, прачытаўшы гэтую аповесць. За такою лірычнаю ласкавасцю і душэўнасцю гэтулькі народнага гора, суровай адвагі і — сацыяльнай несправядлівасці і жорсткасці часу. І аднак жа, нягледзячы на зусім іншую напоўненасць, нейкі пярэгалас яе адчуваўся з далёкімі і мілымі мне «Начлежнікамі». Колькі разоў, у розных рэдакцыях, перачытваў я вось гэты пачатак:

«Вясна.

Дазвольце чытачу маляваць вясну па свайму густу.

Салоўка спявае.

Ці варта чапаць гэту маленькую шэрую птушачку?»

Праз колькі радкоў, вар'іруючы далей гэты пачатак, Вы зноў — і раз, і другі — як бы пыталіся ў чытача пра маленькую шэрую птушачку — ці варта яе чапаць. Мне

гэта вельмі імпанавала, хацелася і самому вось гэтак жа пісаць.

Ад Вашага «Салаўя» было добра і Вам, і Вашым чытачам. Вы хадзілі як бы нейкі памаладзелы. І от жа зусім нечакана — «Язэп Крушынскі». Гэта было вельмі, як кажуць, законна, бо Вам, як і шмат каму (і тады, і цяпер), хацелася моваю душы дакрануцца да сучаснасці. Але (і тады, і цяпер) рабіць гэта вельмі цяжка. Вульгарна-сацыялагічныя крытыкі пачалі Вас рэзка вучыць, як трэба пісаць, а кожны (і тады, і цяпер) можа пісаць толькі па-свойму, і таму другі том «Крушынскага», які Вы паспрабавалі пісаць не па-свойму, даў Вам асабліва многа клопату. Вы вельмі чулліва пераносілі ўсе заслужаныя і незаслужаныя нараканні. Вы сталі хмурны, прыцішаны, нават разгублены. Вашы дзівосна адкрытыя вочы як бы ўсім гаварылі: «Божухна, што я нарабіў!» І Вы папраўлялі і папраўлялі свайго «Крушынскага», але гэтым ні кропелькі не паправілі бяды, бо мастацтва не пераносіць фальшу. І з таго часу нейкая ціхая, насцярожаная трывога не пакідала Вас. Вы як бы нават асцерагаліся гаварыць з людзьмі.

— Дзяньдобры, дзяньдобры,— сказалі Вы аднаго разу мне бегла. Потым спахапіліся, што нявартa ўдаваць, нібы Вы на мяне за што сярдзітыя, вярнуліся і падалі мяккую руку.— Ну як жа пажываеце, скажэце? — папыталіся Вы.— Нешта, мабыць, важнае пішаце, бо мала дзе вас відно? — Вы развіталіся, але зноў вярнуліся і заклапочана зірнулі на мяне.— Слухайце, дык вы, кажуць, ажаніліся? Ну то віншую і скажу, што вельмі добра зрабілі, спарней пойдзе работа...

*

Вельмі шкадую, што ніколі з Вамі не параіўся наконт адной рэчы. Бо аж да гэтага часу не ўпэўнены, што правільна пішу Ваша імя.

Звычайна, калі я пішу, то абавязкова правяраю фразу на голас. Не кніжную, а народную, бытавую фразу. Я павінен уявіць, як скажа яе нехта другі. Вось на маёй Случчыне звычайна гаварылі: «Прыйшоў Змітрок», але — «Няма Змітра», «Скажы Змітру», «Параімся са Змітром». І мне здаецца, што форма, у якой цяпер скланяецца Ваша імя — Змітрака, Змітраку, Змітраком,— не народная, а кніжная. Можа я і памыляюся, бо каб сцвярджаць гэта, трэба ведаць жывую гаворку ўсіх куткоў Беларусі.

Ды гэта, па сутнасці, не мае і значэння, бо так прывыклася і ніхто нічога мяняць не будзе. Мяне цікавіць тут бок чыста мовазнаўчы: правільна ці няправільна я адчуваю законы формаўтварэння слова. І ўсё ж часамі вельмі хочацца падскочыць у той Ваш Пасадзец і паслухаць — як жа гавораць людзі.

*

Мяне часта не пакідае трывога, хаця б усё, што звязана з Вамі, не загінула ці не перайначылася. У нашым «Вячэрнім Мінску» (як бачыце, у нас даўно ўжо ёсць свая вячэрняя газета, дый, трэба сказаць, вельмі неблагая, калі не лічыць, што некаму ў ёй цяжка даецца мова). У «Вячэрнім Мінску» надрукавана фота дома, у якім Вы калісь жылі. Днямі я хадзіў паглядзець на той дом: ён стаіць сярод садоў бадай што на самым пачатку вуліцы Льва Талстога, драўляны, яшчэ здаровы і ладны, на высокім падмурку, на два высокія ганкі, з шырокімі вокнамі і шыферным дахам. На рагу да сцяны прыбіта мемарыяльная дошка, на якой напісана, што Вы жылі там у 1915—1918 гадах, а з Вашых і чужых успамінаў вядома, што пэўны час разам з Вамі там кватараваў і Максім Багдановіч. Дом яшчэ трывалы, калі яму патрэбна якая направа, то яе лёгка зрабіць: параскідаць самадзейныя прыбудоўкі і прыгарадкі, якія тут майстраваў кожны новы гаспадар.

Дарагі дзядзька Бядуля, каб Вы ведалі, як разбудаваўся наш Мінск! Вы не пазналі б яго, ён стаў не толькі прыгожы, а і вялікі. Дайшла чарга і да Вашага Завакзалля: то там, то там над садамі падняліся лёгкія гмахі як бы сплеценыя з блакітнае вышыні і адных толькі вокан. Я зарадаваўся гэтаму, але тут жа і спахмурнеў. Я ўбачыў, што нядаўна тут папрацаваў бульдозер: за домам відна расчышчаная пляцоўка, мабыць, пад бытоўкі, якія звычайна ставяцца пры ўсіх салідных будоўлях, а па садах і агародах, распіхваючы іх у бакі, лягла шырокая палоса свежа наварочанае зямлі — толькі што пракладаная лінія падземнае гаспадаркі. Прызнаюся, я спужаўся: я зразумеў, што Вашаму дамку асталося жыць тут вельмі нядоўга.

Але я не даў волі гэтай панікёрскай думцы, мне захацелася падумаць зусім іначай. І тут жа перад маім унутраным зрокам паўстала зусім новая вуліца Льва Талстога, шырокая, чыстая, забудаваная прасторнымі, лёгка ўскінутымі ў неба дамамі, а сярод іх, унізе,— непачапаны

астравок кучаравае зеляніны колішняга саду, і ў ім, атулены цёмным кіпенем бэзу, Ваш дамок. Да яго вяла дарожка, абсаджаная маладымі арабінамі, на рагу мармуровым спакоем бялела тая самая мемарыяльная дошка, а над ганкам прыбіта шыльда: «Літаратурны музей класікаў беларускай літаратуры Максіма Багдановіча і Змітрака Бядулі».

Вось што можа стацца з Вашым домам, дзядзька Бядуля. Бо гэта ж, мабыць, адзіная рэліквія, звязаная з Вамі, што асталася пасля вайны, і тым больш яна дарагая. Ёсць, праўда, вуліца, якой нададзена Ваша імя, ладная вуліца, па сутнасці, у цэнтры, і плошча пры ёй. Я гэтаму вельмі рад. Але калі быць справядлівым, то Ваша імя законна мог бы насіць Даўгінаўскі гасцінец, гэтак дзівосна ўплецены ў рамантыку Вашай біяграфіі.

*

Не ведаю чаму, але часцей за ўсё ўспамінаецца мне наша апошняя сустрэча. Гэта было ў 1936 годзе, мы святкавалі гадавіну Вялікага Кастрычніка, пісьменніцкая калона была невялікая, але дружная.

Быў ціхі, хмурнаваты і нават халаднаваты восеньскі дзень, мы ішлі па выслізганым бруку не вельмі тады шырокай Савецкай вуліцы, абапал на тратуарах стаялі цесныя натоўпы людзей — пажылых, падлеткаў, жанок з дзецьмі на руках, то там, то там ігралі аркестры, над калонамі луналі сцягі, партрэты, транспаранты, гучалі песні. Мы то прыцішвалі хаду, калі натыкаліся на пярэднія, нечым прыпыненыя калоны, то чуць не бяжком спяшаліся, каб нагнаць іх і запоўніць разрыў, і кожны раз пераблытвалі свае рады. І сталася так, што пасля чарговай вось такой перабежкі мы апынуліся поруч з Вамі.

— Ой, дзяньдобры, дзяньдобры! — весела і ахвоча абазваліся Вы і, як мне здалося, асабліва прыязна зірнулі на мяне.— А-а, дык з вамі і яшчэ нехта! — хітравата ўскрыкнулі Вы, слізгануўшы позіркам міма майго пляча,— мабыць, той, каго вы гэтак доўга ад мяне хавалі? Ну то давайце знаёміцца.

Дзень быў ціхі, хмурнаваты. Па спіне пачала прабягаць ліпучая золкасць. Далей мы пайшлі разам, перакідваючыся беглымі словамі, пацепваючы плячыма. Ды так за гаворкаю і не згледзелі, як параўняліся з трыбунаю — прайшлі міма кіраўнікоў, узрушана віталі ўзмахамі рук,

падхапілі бясконцую хвалю «ўра», а потым апынуліся ў цішыні і зразумелі, што можна разыходзіцца. І мы і далей, усё гэтак жа абы-што гаворачы, пайшлі разам з Вамі. І недзе ўжо толькі каля Саду прафінтэрна я асмеліўся на адчайную прамову.

— Дарагі дзядзька Бядуля,— сказаў я, зірнуўшы ў Вашы чыстыя паўнаватыя вочы,— толькі ўчора зусім выпадкова ў магазіне я ўбачыў нейкае зусім новае віно, якое завецца «Салхіна», і купіў дзве пляшкі. У вінах я не знаюся, не ведаю, чаго яно варта, можа вельмі добрае, можа вельмі благое, і от мы просім Вас, даражэнькі дзядзечка Бядуля, каб мы разам зайшлі да нас і пакаштавалі таго віна. Калі яно будзе добрае — разап'ём да дна, калі благое — адставім убок і дастанем чаго іншага. Не спяшайцеся дадому, мы перш сагрэемся, а потым Вас правядзём, усё будзе спакойна, нармальна, а? Вы не ведаеце, як нам хочацца, каб Вы зайшлі. А? Сёння ж такое свята!

Упрошвалі мы Вас наперабой. Вы спалохана паднялі бровы, расставілі перад сабою далонямі ўверх рукі, як бы гаворачы: «Добрыя мае, што ж вы са мною робіце?» — і тут жа пакорліва сказалі:

— А што вы думаеце, можа і праўда варта зайсці? Бо вы ж гэтак сімпатычна просіце.

Ой, якая гуллівая ўсмешка прабегла па Вашым твары!

Я не буду расказваць, як даверліва і ахвоча Вы ўвайшлі ў наш дом на нашай ціхай Маркаўскай вуліцы, як весела селі за стол, не ведаю, ад душы ці для прыклёпу цмокалі языком, каштуючы тое «Салхіна», мне дык, папраўдзе кажучы, яно не падабалася, нейкае задушліва салодкае, а з салодкім, прызнаюся, я не хаўрусую і цяпер; як бясконца мы гаварылі,— божачка, як душэўна Вы гаварылі пра літаратуру! — і Вы нарэшце сказалі, што ў вас наперадзе вельмі важная работа: трэба напісаць біяграфічны раман, у якім будзе сказана ўсё галоўнае — і пра сябе, і пра Беларусь, якую Вы любіце найадданейшаю любоўю.

Не буду расказваць, як ішоў час, як перш спалохана і жаласліва тулілася да шыбы галінка клёну з нашага саду і на ёй трапяталі тры рудыя, пакарабачаныя, яшчэ не апалыя лісты, а тады як шчытна прыліпла да вокан цямноцце, і Вы, ужо пры электрычным святле, седзячы на канапе, як чарадзей, чыталі нейкія даўнія, як бы біблейскія вершы і расказвалі гісторыі, нешта з якіх я пазнаваў пазней у Вашай «Сярэбранай табакерцы».

Вось пра што я збіраўся расказаць на Вашым юбілейным вечары, дзядзька Бядуля. Але вінаваты ў тым, што не мог зрабіць гэтага.

Нават ніякавата прызнацца, што прычынілася са мною. На маленькім лістку паперы я напісаў парадак думак, каб сказаць іх найкарацей. Яшчэ з гадзіну заставалася часу, а ў мяне з самай раніцы ламала косці, у галаве цяжка гуло, як бы там нехта беспярэстанку круціў ашалелыя жорны. Я ведаў, што пачынаецца грып, але загадаў сабе ў гэта не верыць, перасеў на канапу і ў думках уявіў і залу, поўную людзей, і сцэну з урачыстым прэзідыумам, і... вельмі выразна ўбачыў, што да мяне падыходзіце Вы...

Вунь якая прычына, чаму я не паказаўся на Вашым вечары, дзядзька Бядуля. Той грып уламжыў мяне тыдні на два. І вось, каб хоць трошкі апраўдацца, пішу Вам гэты ліст. Толькі шкода, што ён ніколі не будзе адасланы.

РЭКВІЕМ

Змітрок Астапенка кватараваў у Заваказллі непадалёк ад мяне. Аднаго разу, калі я зайшоў да яго, ён папытаўся:

— Што табе гаворыць такая назва: «Запалім люлькі»?

Некалькі хвілін я падумаў. Я заўсёды любіў чужыя добрыя назвы, гэтая бясспрэчна падабалася мне. У ёй быў малюнак. Мне ўяўляўся адзінокі пакой, вечар, і за маўклівым сталом, не запальваючы святла, сядзяць даўнія сябры. Можа пасля вялікіх дарог і доўгіх разлук яны сабраліся, каб усё дарагое кожнаму ўспомніць. Мужчынскія ўспаміны, якія праз усе выпрабаванні лёсу праносяць суровую вернасць. І ў тых успамінах абавязкова будзе вобраз жанчыны... Я так і сказаў: вельмі добрая назва.

— На вершы ці на прозу?

— На вершы. А можа нават і на прозу. На такі суровы марскі раман.

Астапенка хадзіў па пакоі, мне здавалася, нават не вельмі мяне слухаючы. Высокі, сухатвары, узрушаны нейкаю неспакойнаю думкаю.

— Трохі ўгадаў,— сказаў ён.— Пакуль што гэта нізка вершаў, але так я збіраюся назваць усю кнігу. Новую, вядома. Толькі яшчэ не ведаю, куды яна мяне завядзе... Мора, пра якое ты гаворыш, таксама мяне спакушае, якраз мне і трэба мужныя, суровыя людзі.

Невядома па якой сувязі Астапенка раптам успомніў, як быў на граніцы з Польшчаю. Сваю «Ноч на станцыі Негарэлае».

Ах, не ў гэтым жа справа, што ёсць Беларусь
На Усходзе й на Захадзе!..
Справа не ў гэтым!
Гэта станцыя ставіць глухую мяжу
Для ўсяго невыказна вялікага свету!
І калі ўяўляю, што там, за мяжой,
Вісне чорная ночка ў колеры сажы,
Мне шкада не адной Беларусі маёй,
А падзелены свет неабсяжны.

— Ты разумееш, аж страшна,— сказаў ён сваім ціхім голасам.— Паласаты слуп, ступіў за яго, і — канец! Адзін толькі крок дзеліць свет напалам...

*

Нейкі пэўны час, памятаю, я заўважыў, што Астапенка мала дзе бываў, стаў задуменны, заклапочана-ўзрушаны. Мог сустрэцца твар у твар на вуліцы, але не пазнаць і прайсці міма. Мог радасна пацiснуць руку, пачаць вельмі жывую размову і тут жа забыцца на яе, недагаварыць і пабегчы. У мяне ён раптам папытаўся, ці не хачу я пабыць у Германіі. Чаго? Навошта? Якім чынам?

— Ах, гэта я так сабе. Давай пойдзем да мяне, ды я табе пачытаю новыя вершы.

Але вершаў ён не чытаў, а, як толькі зачыніў дзверы, здзівіў новым пытаннем: ці хачу я пабачыць усё, што робіцца ў яго ў доме?

— Не разумею,— пацiснуў я плячыма.

— Ну вось так: зараз рассунуцца сцены, і ты ўбачыш усіх жыхароў гэтага дома, можа каторага нават за не вельмі прыстойным заняткам. Хочаш?

— Нейкая ў цябе сёння буйная фантазія.

— Чаму буйная? Нармальная! Проста ты не ведаеш, што я зрабіў вялікае адкрыцце. Я разгадаў таямніцу жыцця матэрыі, і ў маіх руках цяпер вельмі страшная сіла. Я магу ў любым парадку сінтэзаваць атамы, а значыць, маёй волі няма канца. Магу ўсюды быць, усё знаць, усё бачыць, лёгка разбураць усё тое, што чалавеку на шкоду, і гэтак жа лёгка аднаўляць. Калі яно трэба.

Я паглядзеў на Астапенку з няяснаю трывогаю. Падобных жартаў ад яго я ніколі не чуў, і калі гэта жарт, то дзеля чаго ён? Астапенка хадзіў па пакоі мяккаю,

украдліваю хадою, раптам як бы заспяшаўшыся. Твар сухі, рэзка акрэсленыя губы, прамы нос, нешта татарскае ў сківіцах. У чорных, тонка прычэсаных валасах акуратны, цвёрды прабор з правага боку.

— Ну што, паверыў? — суняўся ён перада мною. Вочы цёмна-карыя, вузкія, бадай што да самых зрэнкаў прыкрыты млявымі павекамі. І таму, што яны так прыкрыты, у іх вечна тоіцца нешта як бы не зусім табе даверанае. Папытаўся і дазволіў паявіцца на губах хітраватай, таксама скупой, усмешцы.— Ты як хочаш, а я павінен верыць, бо іначай у мяне нічога не выйдзе. Пішу раман,— паясніў ён.— Першая частка ўжо гатова. Хачу даць назву «Вызваленне сіл», а можа яшчэ перадумаю... Тайну атама адкрыў не я, а мой герой, і сваім сакрэтам ён хоча знішчыць стары свет. І ўжо колькі часу, як я сам сябе баюся, усё здаецца, што не ён, а я валодаю гэтаю страшнаю тайнаю.

Ён сеў у крэсла і бегла расказаў некалькі эпізодаў. Усе падзеі развіваюцца ў Германіі, дзе на той час пачынаў асталёўвацца фашызм. Мяне, памятаю, дзівілі не сюжэтныя ходы, самыя неймаверныя па страхаце і смеласці, а тое, што герой найдасканалейшым чынам ведаў Берлін. Вуліцы, плошчы, помнікі, службовыя цэнтры, глухія куткі. Ведаў, як прайсці да іх найкарацейшым спосабам. Ведаў, якім ліфтам і на які паверх падняцца, каб з некім пабачыцца ці заблытаць сляды.

— Чакай,— перапыніў я яго,— горад ты таксама выдумляеш? Бо калі чытацьме немец, то адразу зловіць цябе на падмане.

Зноў па Астапенкавых губах прабегла лёгкая хітраватая ўсмешка.

— Калі б мяне скінулі з неба ўночы ў любым пункце, і сказалі, што трэба пайсці ў нейкі другі любы пункт, я зрабіў бы гэта лёгка, ні ў кога не пытаючыся,— сказаў ён.— Берлін я ведаю, як самы правaверны берлінец, ніколі там не бываўшы.

*

...Трыццаць другі год быў вельмі цяжкі. Бывала, па дарозе дадому, пачынаючы ад Віленскага рынку і да самага вакзала, усю восень я бачыў, як уздоўж тратуараў, уціскаючыся ў цень ад дамоў ці агароджаў, маспіліся маўклівыя, зняможаныя людзі, найбольш жанкі, або цэ-

лымі сем'ямі, з дзецьмі, параскладаўшы на доле ўвесь свой скарб: коўдры, ручнікі, падушкі, вышываныя строі, каптуры, сувоі палатна — выбірай што хочаш, толькі дай кавалак хлеба, ці круп, ці збажыны. То быў засушлівы год, асабліва на Украіне. Нялёгка было і ў нас.

Зайшоў неяк тае восені да мяне Астапенка. Мы засядзеліся доўга. Пара было ісці ў горад, каб дзе павячэраць. Але Астапенка сказаў, што атрымаў з дому пасылку, і запрасіў да сябе.

— Я пайду папрашу гаспадыні, каб яна чаго згатавала — бульбы падсмажыла ці яечню спякла. Ну, а да чаю ёсць сала, масла. Так што ты праз паўгадзінкі прыходзь. Роўна праз паўгадзіны,— паўтарыў ён і пайшоў сваёю дробнаю мяккаю хадою.

Праз паўгадзіны я быў у Астапенкі, але дзверы ў яго пакой не адчыніліся. У цёмны калідор выглянула гаспадыня і сказала, што Змітрака дома няма.

— Быў, забягаў толькі што,— паясніла яна..— Палажыў свае кніжкі, паперы і некуды скоранька пабег.

Я пастаяў хвілін колькі каля брамкі і ціха пабрыў у горад. Перайшоў вузкі, доўгі масток над чыгуначнымі пуцямі, Прывакзальную плошчу, колішні Віленскі рынак, перароблены ў сквер, з яшчэ маладымі кволымі дрэўцамі. Жоўты свежы пясок на дарожцы перасыпаўся пад нагамі. З вуліцы Карла Маркса павярнуў на Урыцкага і застыў, здзіўлены. На рагу стаяў Астапенка і, выцягнуўшы шыю, паверх людскіх галоў некуды далёка ўзіраўся.

— Змітрок! — гукнуў я.

Ён пудка зірнуў на мяне, шырока здзівіў вочы і схапіўся за галаву.

— Божачка мой,— сказаў ён,— памарока нейкая найшла на мяне. Гэта ж ты быў у мяне?

— У цябе.

— Ну от жа — як пярун спаліў памяць. Разумееш, мне трэба тут аднаго чалавека сустрэць,— ён вінавата ўсміхнуўся,— успомніў, прыйшоўшы ад цябе. Ну і пабег, і, мабыць, спазніўся...

Ён зноў выцягнуў шыю і заклапочана азірнуў вуліцу. І нават не заўважыў, калі я яго пакінуў.

*

...Потым я бачыўся з Астапенкам пры акалічнасцях іншых. Ішла вайна, мы былі ў глыбокім тыле. Аднаго

разу ён зайшоў да мяне — худы, зняможаны, у вачах тузаўся адчай.

— Што сталася з табою, Змітрок? — папытаўся я.— Гэтак жа можна і зусім згібець!

— Разумееш, надакучыла, далей так няможна,— сказаў ён.— Я мушу нешта зрабіць. Я павінен заняцца нечым больш карысным і важным.

Неўзабаве я паехаў на будоўлю, з Астапенкам больш не бачыўся. Няраз думаў пра яго, распытваў у людзей, але слядоў не знаходзіў.

Пачуў я пра яго ўжо толькі ў Мінску. І зразумеў, якой карыснай работы ён шукаў. Мяне здзівіла не смеласць яго ўчынку, а веліч. Ён дамогся, каб папасці на той бок фронту, у варожы тыл, і загінуў, выконваючы спецзаданне. Мне ўспомніўся той вечар, калі чытаў ён «Ноч на станцыі Негарэлае», і той яго боль, што свет падзелены папалам...

*

На сцяне ў Саюзе пісьменнікаў вісіць белая мармуровая дошка з прозвішчамі, напісанымі залатымі літарамі, усіх тых, хто ў Айчынную вайну аддаў сваё жыццё за бацькаўшчыну. Сярод іх і імя Змітрака Астапенкі. Як шкода, што невядома яго магіла, каб можна было схадзіць да яе і зрабіць тое, чаго не ўдалося пры жыцці,— развітацца з ім.

МОЙ СУСЕД ІВАН МЕЛЕЖ

> О лёс мой, выказацца дай,
> не забяры мяне заўчасна
> у тую далеч, дзе так часта
> мне сніцца будзе любы край.
>
> *Алесь Каско*

Я пачаў ужо восьмы дзесятак свайго веку. Іван Мележ быў маладзей за мяне на шаснаццаць гадоў. І катора пара як няма яго. Гэта страх як несправядліва. Ён напісаў вельмі добрыя кнігі, на жаль, самай галоўнай не скончыў. Трэба спяшацца расказаць пра яго хоць трохі з таго, што ведаю.

1

Найперш мне помніцца бераг рэчкі за нашым Караліщчавіцкім лесам. Летнім сонечным днём там збіралася бадай што ўсё насельніцтва Дома творчасці. Туды ж па нядзелях наязджалі пісьменнікі-гараджане, да сем'яў або праведаць таварышаў.

Найчасцей на сваіх «Пабедах» наязджалі двое: Андрэй Макаёнак і Іван Мележ. Падскокваў Алесь Кучар, чамусьці ён выбіраў час, калі купальшчыкаў было мала, або пад канец, калі бераг ужо бадай што пуставаў. Ён любіў купацца адзін, але да мяне далучаўся ахвотна. Пакружыўшы раз-другі на самай быстрыні, ён спыняўся і, стоячы па грудзі ў вадзе, разводзячы яе перад сабою рукамі, распытваў, як жылося і выжылася мне ў мае доўгія і далёкія адсюль гады. Мы з ім зналіся даўно, калі ўбіралася ў громкую славу крытыка, і я разумеў, што чалавеку часам бывае патрэбна дакрануцца як да свае, так і да чужое памяці.

Макаёнак паяўляўся шумна, ставіў сваю «Пабеду» пры самым беразе, на хаду з некім вітаўся, некаму перадаваў гарадскі паклон, тут жа раздзяваўся, загарэлы, дужы і ладны целам, купаўся, а тады або прысаджваўся да нечай кампаніі, або расчыняў у машыне насцеж усе дзверцы і пачынаў яе мыць.

Іван Мележ прыязджаў зусім іначай. Ён паяўляўся неўзаметку, ставіў машыну блізка дзе да кустоў, далей ад берага і ад тлуму. Ціха вітаўся з знаёмымі, часам падыходзіў да іх, а найчасцей падыходзілі да яго. Я ніколі не бачыў, каб ён купаўся ці нават каб, раздзеўшыся, пасядзеў на сонцы. Наадварот, ён шукаў цішыні і ценю. Уся манера яго — і гаварыць, і быць на адзіноце — была нейкая роздумная, я б сказаў, рамантычна-сузіральная ці спакойна-філасофская. І міжволі з усіх, хто тут паяўляўся, мая ўвага падала найперш на яго.

Я заўважыў, што за шклом, на задняй палічцы ў яго машыне кожны раз ляжала тая самая, даволі тоўстая кніга. Неяк праходзячы міма, я міжволі нагнуўся над тою палічкаю і прачытаў: «Іван Мележ. Мінскі напрамак».

— Як бачу, дык вы заядлы аматар кніг,— пачуў я над сабою Мележаў голас.

— Прашу прабачыць,— сканфузіўся я.

Мележ прыязна, чутачку схіліўшы набок галаву, усміхнуўся. І папытаўся:

— Не чыталі?

— Не,— прызнаўся я.

— Шкада. Я думаў, што, можа, вы дасце якія свае заўвагі. Мне, як чалавеку, у якім вы пазналі аўтара,— зноў з падкрэсленай прыязнасцю сказаў Мележ,— хацелася б ведаць, ці ўсё ў ёй ладна. Ваша ж прозвішча Скры́ган?

Часта хто мае прозвішча вымаўляе з няправільным націскам. Звычайна, я папраўляю. Часамі гэта памагае, часамі не. Але не хацелася, каб памыляўся іменна Мележ.

— Не,— сказаў я, стараючыся не саступаць з жартоўнага тону.— Трошкі іначай — Скрыга́н.

Мележ падняў здзіўлена бровы і якую хвіліну памаўчаў.

— А чаму вы думаеце, што ваша версія слушная? — папытаўся ён.

Я сказаў, што ў нашым сяле Труханавічах з гэтакім націскам завуць усіх Скрыганоў. А мясцовае вымаўленне трэба лічыць, мабыць, самым законным.

— Безумоўна,— адразу згадзіўся Мележ.— Вось што,— сказаў ён праз хвілінку.— Як бачу, дык мы з вамі і бачыцца і гаварыць будзем яшчэ няраз. А цяпер давайце пакатаемся. Я вас павяжу па самых прыгожых тутэйшых дарогах.

Толькі цяпер, калі Мележ уходжваўся каля машыны — праціраў лабавое шкло, папраўляў люстэрка, потым сядаў за руль,— я здзіўлена заўважыў, што ненатуральна высока і востра падымаецца ў яго адно плячо, што ўвесь час ён стараецца берагчы правую руку. Тады я яшчэ не ведаў пра яго цяжкае раненне ў вайне і вялікае намаганне шпітальных хірургаў, каб выратаваць яму гэтую руку.

2

Потым даволі доўгі час мы жылі з ім у адным доме. У адным пад'ездзе: ён на чацвёртым паверсе, а я над ім — на пятым. Так што мелі час і набачыцца, і нагаварыцца, і намаўчацца.

Бывала, пачуецца ад яго тэлефон:

— Што робіш?

Найчасцей хатні мой час быў заняты работаю службоваю, бо ў «Полымі» было цяжка дабраць дзелавой часіны. Народу набіралася шмат, было душна, тлумна; адны заходзілі, бо мелі нейкі дзелавы інтэрас, а другія проста каб

прабавіць весела час: бываюць жа такія веселуны, што не адарвешся, слухаючы іх. І звычайна рэдактарскае чытанне я браў дадому. Мележ лічыў гэтакі занятак выпадковым і несур'ёзным і таму пытаўся далей:

— То, можа, я зайду?

Або:

— То, можа, зойдзеш да мяне?

Ну і заходзілі як калі: то ён да мяне, то я да яго. Найперш падам варыянт, калі да яго заходзіў я, каб заадно расказаць і пра яго кабінет.

У тым вельмі салідным на выгляд доме з грунтоўнаю муроўкаю і грунтоўным метражом была, аднак, не надта ўдалая планіроўка — пакоі доўгія, вузкія, у іх цяжка было ўтульна ці хоць бы зручна размясціцца. Высокае паняцце эстэтычнага я вельмі добра разумеў у Мележа — адзначыў гэта з першага ж разу, пераступіўшы парог яго пакоя. Бо мне самому ўсё жыццё не давалі спакою дзве звычайныя чалавечыя слабасці: жытло і рабочае месца ў ім. За ідэал рабочага месца мне служыць пісьмовы стол у Доме творчасці ў Дубултах. Божухна, якая гэта раскоша! Зручны. Шырокі, прасторны, на ім, як бы на воку, перад табою ўсе твае думкі, уся плынь твора, яго лёгка і прыемна пісаць. Міжволі ўспомніцца, што адзін час была мода на сталы з тоненькімі, як пруткі, ножкамі: сядзеш да яго пісаць, а ён задрыжыць ад першага дотыку. Не разумею, чаму мода найчасцей ідзе насуперак разумнаму? Здавалася б, наадварот: яна павінна несці высокі сэнс!

Звычайна ў тым доме, у нашым пад'ездзе, бадай што ўсе пісьменнікі пад рабочае месца займалі дальшы, куткавы, зацішны пакой. І бадай што аднолькава размяшчаліся ў ім. Або стол ставілі да акна і сядзелі, як сляпыя, перад сцяною чужога дома на той бок вуліцы, а ўвесь прастор пакоя аставаўся за спінаю, ззаду, анічым не дакранаючыся да твае мыслі. Або сядзелі бокам да акна, ставячы стол удоўж пакоя, яшчэ больш падкрэсліваючы яго даўжыню, з адною толькі перавагаю, што вочы маглі больш прасторна раскідацца на бакі і ззаду не было пустаты. Гэтакая кампаноўка выглядала трохі па-чыноўніцку, але хто скажа, што чыноўнікі не разбіраюцца ў кабінетным камфорце?

Мележ самым крутым чынам парушыў гэтакі стандарт. Усю сцяну ад вуліцы ён зацягнуў масіўнаю, але мяккаю цёмна-зялёнаю драпіроўкаю; пісьмовы стол, не тутэйшы, лакаваны цёмна-рудым колерам, з авальнымі краямі,

з угнутым паглыбленнем для рабочага месца, з палічкамі ў тарцовых сценках пад кнігі, што скрозь трэба мець напашэве,— гэтакі універсальны, даволі кампактны стол, адсунуўшы яго надалей ад драпіроўкі, ён паставіў так, каб сядзець тварам на кабінет. Перад сталом, з краю, чуткачку наўскасяк пастаўлена крэсла, каб мог пасядзець госць, калі часам зойдзе. Па сценах некалькі стэлажоў, не спрэс прысунутых адзін да аднаго, каб ураджвала багацце кніг, а з прагалінамі, занятымі то крэслам, прыткнутым як бы знячэўку, то канапаю. І на крэслы, і на канапу накінуты дываны, таксама як бы знячэўку, бегла, нават не зраўняны краі і не ўмяты складкі. І зусім перамяніўся пакой, ён стаў цёплы, зручны, куды карацейшы, тут як бы спрадвеку пасялілася ўтульнасць і цішыня. З першага ж позірку я зразумеў, што тут спатрэбіўся высокі Мележаў густ. Увесь тлум вонкавага свету аставаўся за драпіроўкаю, а тут — свой свет, свая святая святасць.

Няйначай, як Мележу патрэбна было часамі з дня рабіць ноч, і гэтаму таксама памагала драпіроўка. Затуліў сцяну цяжкаю апонаю, і калі ласка — ноч! Слугавала гэтаму і высока на сцяне ўмайстраванае прыладдзе дзённага святла: у любы час шкляныя, цнатліва-сцішаныя трубачкі нясмела ажываюць, разліваючы па пакоі млечнабялюткае роўнае святло. Толькі дзівіла элементарнае парушэнне законаў асвятлення — з правай рукі. Тут ужо прыйшлося здагадвацца: значыцца, раней стол стаяў тварам да акна, як у другіх. Вельмі няўрымслівая гэта рэч — знайсці душэўны лад з сваім наваколлем.

3

Ніколі ні ў кога я не бачыў такіх датклівых адносін да работы, як у Мележа. Калі ён пісаў, то да ўсяго астатняга быў сляпы, глухі — як загіпнатызаваны. І калі вы хоць нечым выказалі душэўнасць і спагаду таму, чым ён быў заняты, ён вельмі лёгка давяраўся вам. Ён не мог, каб не падзяліцца кожнаю хвілінаю свае няпэўнасці ці трывогі. Ці ўдачы. Учора, напрыклад, мог прачытаць новы раздзел ці кавалак з напісанага, упэўніцца, што ён зроблены, як кажуць, на самым высокім эмацыянальным, псіхалагічным, этнаграфічным, філасофскім, моўным і яшчэ якім там прафесійна-пісьменніцкім узроўні, што пасля гэтага можна спакойна і шчасліва пайсці спаць,— але назаўтра пад вечар зноў пытаўся, ці можна зайсці. І гаворка і су-

мнівы пачыналіся нанава, бо ўчарашнія старонкі рукапісу былі пакрэмзаны, скрэслены паметамі, і дробным, круглявым Мележавым почыркам былі ўпісаны папраўкі або тэкст быў напісаны новы.

Звычайна тое, што чытаў Мележ, было паслядоўным ходам твора. Але аднаго разу ён прачытаў раздзел, які вельмі здзівіў мяне. Ён выпадаў з паслядоўнасці, быў непадрыхтаваны ні падзеямі, ні логікай руху, знаёмыя былі толькі імёны. У нядаўна чытаным раздзеле я перажываў за Васіля Дзятліка, што яму пачынае перабіваць дарогу да Ганны Яўхім Глушак. Запомніўся малюнак, калі Ганна жала жыта, адале адышлася ад сваіх і ўзмежкам падалася к лесу. Яўхім цікаваў за ёю; ладуючы з бацькам свой воз снапоў, прыкінуў, што яна магла пайсці ў маліны. І, улучыўшы хвіліну, схітраваўшы перад бацькам, што нагледзеў арэшынак на абручы і што трэба іх ссекчы, таксама сігануў у лес. Можа, гэтак ярка і не запомніўся б той малюнак, калі б не сустрэлася тут Яўхіму Хадоська. Яна чула душою, што Яўхім пакідае яе.

— «Я грубая»,— з адчаем гаварыла яна.

— «Нагуляла, значыцца?.. Цяпер шукаеш, хто вінаваты?..»

Ух, які хцівы нягоднік быў гэты чалавек! Не хацелася, ой як не хацелася, каб у свае цянёты ўбэрсаў яе Яўхім, каб прыняла яго Ганна! І стала лягчэй, калі гэтак і выйшла, калі з разбітаю храпаю пайшоў ад яе Яўхім.

А цяпер Мележ чытаў нешта зусім другое:

«Ганна сядзела на возе, над незачыненай трунай, як бы абдымала яе рукой. Галава яе была схілена, сонца паблісквала ў шаўкавістых валасах, пасма якіх, непрыбраная, звешвалася на лоб. Вочы яе, сухія, гарачыя, нязводна глядзелі на малую: Верачка, блізкая і недасяжная, ляжала сярод валошак, пакладзеных Сцяпанам. Другія суткі не зводзіла Ганна вачэй з роднага тварыка, не верыла, не магла згадзіцца, што неўзабаве тварык гэты мусіць назаўсёды знікнуць.

...Ганна рабіла ўсё як у бяспамяцці, толькі вочы жылі, з нямой пяшчотай і скрухай глядзелі, не адрываючыся ад малой. Яна моўчкі стаяла з мачыхай, калі здымалі труну, ставілі на зямлю, калі поп казаў штосьці, моўчкі, паслухмяна падышла развітацца з малой. Прытулілася да тварыка, хвіліну паляжала побач, але, як мачыха ўзяла за плячо, паслухмяна паднялася. Калі ж бацька ўзяў века і хацеў накрыць дамавінку, з Ганны бяспамяцць як бы спала

раптам. Яна як бы ажыла, у момант, нібы пры бляску маланкі, убачыла пясок, гліну, цёмпую зеўру ямы, убачыла, даўмела нанова, жахнулася — вырвалася з рук мачыхі, поўная роспачы і нястрымнай сілы, з крыкам кінулася да труны:

— Не!

Яна ўпала на зямлю, абхапіла дамавіну, прынікла да малой. Шаптала, задыхалася ад гора, ад любасці:

— Не дам, не дам дочачку маю! Кветачку маю! Мальвачку маю!.. Не дам! Не дам! Вяргінечку маю, півонечку маю малую! Не дам! Не дам!!!»

Не хапала сілы слухаць, нельга было даўмецца, якія акалічнасці напаткалі Ганну. Што здарылася? Дзе дзеўся Васіль Дзятлік? Калі і як было, і ці было яно, Ганніна замужоўства? Але я набраўся цярплівасці не перапыняць, праслухаў урывак да канца.

— Адкуль гэта? — пытаўся я.

Мележ памаўчаў. Потым як бы сам сабе вінавата ўсміхнуўся.

— Гэта ўжо з другой кнігі.

— Дык жа не скончана яшчэ першая?

— Не скончапа. Да канца першай далёка яшчэ.

І якое было мне дзіва, калі я дазнаўся, што Мележ можа пісаць, не пільнуючыся паслядоўнасці твора. Пісаць тыя мясціны, якія найбольш гатовы ў галаве, прадуманы, перажыты душою — у канцы гэта ці ўсярэдзіне кнігі,— а потым ужо кампанаваць іх, устаўляючы кожную на сваё месца. Міжволі з болем падумалася, колькі мною загублена найдаражэйшых, найярчэйшых эпізодаў, карцін, парыванняў душы толькі таму, што на сваім свежым часе я не запісаў іх, чакаў, калі прыйдзе чарга на іх законнае месца. І яны бляклі, мізарнелі і патухалі, стаўшы дакорам, як злачынства, невядома навошта зробленае табою...

4

Затое мне знаёмы быў клопат з назвамі твораў. І ўдзень і ў ночы; і ў сне і наяве. Беспярэстанку яны варушацца і кіпяць у галаве. То паяўляюцца і знікаюць, то перайначваюцца, кожны раз набываючы другую акрасу.

У Мележа іх было некалькі спіскаў. «Палеская хроніка» яшчэ была толькі задумана, а назвы ўжо прыдумляліся. Адна з першых была «Людзі на балоце»; прызнаю-

ся, яна мне не вельмі падабалася: не хацелася, каб эмацыянальна людзей зацепьвала балота, якое ў маёй біяграфіі вельмі ж далося ў знакі. Потым ішлі назвы з характарыстыкаю Палесся: «Туманы над багнаю», «Навальніца над полем». У розным спалучэнні вар'іраваліся словы з такімі сімваламі, як «бераг», «асака», «раска», «завеі». Напрыклад, «За асакою бераг». Безліч розных прымернікаў. Як відаць, назвы рабіліся з запасам на ўвесь цыкл «Хронікі», бо «Подыхам навальніцы» назваўся потым другі том, «Завеі» дасталіся трэцяму, праўда, з дадаткам адзнакі часу: «Завеі. Снежань».

Першы том аставаўся без канчатковай назвы да самай апошняй хвіліны. Толькі перад здачаю рамана ў набор, пасля пакутлівых ваганняў Мележ напісаў на тытульнай старонцы: «Людзі на балоце». І раптам лёгка ўздыхнуў, супакоіўшы сябе філасофскаю пігулкаю, што калі будзе добрая кніга, то да назвы адразу прывыкнецца.

5

Цяпер раскажу пра выпадак, які здарыўся аднаго разу, калі пасля тэлефоннага званка Мележ зайшоў да мяне. Звычайна я саступаў яму месца за сталом, заўважыўшы, што ён там чуўся больш утульна. Перад гэтым я чытаў «Мінскі напрамак» — першы том новага выдання, падпісаны аўтарам мне як падарунак. Мележ адразу пазнаў разгорнутую на стале сваю кнігу, стрымана, але здаволена ўсміхнуўся, сказаўшы, што яму вельмі прыемна заспець суседа за такім неспадзеўным заняткам, як чытанне яго, аўтаравай кнігі.

— Вось цяпер нарэшце ты скажаш мне і свае заўвагі,— успомніў ён колішнюю размову.

Ён перагарнуў старонку-другую назад і твар яго спахмурнеў. На старонках простым алоўкам былі пароблены мае паметы: ці то падкрэслены радкі ў тэксце, ці на палях пастаўлены пытальнікі і напісана якое слова ці разгорнутая заўвага. Я ведаў, як хваравіта прымае Мележ любое чужое ўмяшанне ў сваю работу, як лёгка яго можа параніць любая неасцярожнасць, і мне стала непамысна. А Мележ тым часам адгортваў і адгортваў старонкі назад. У кожную заўвагу ўчытваўся, у кожны мой знак узіраўся. Нарэшце абхапіў галаву ўзлакочанымі на стол рукамі і застыў, нават забыўшы, што сядзіць не за сваім сталом.

Доўга мы праседзелі вось гэтак моўчкі, я бог ведае што перажыў.

— Ну што ж, усё правільна, дарагі Яне,— сказаў ён.— Я ўвесь час гэты свой раман папраўляю, гэтае выданне таксама папраўлена. Галоўным чынам дапісваю, абчалавечваю, калі можна гэтак сказаць, вобраз генерала Чарняхоўскага. А мова, ты ж яе найперш і падкрэсліў, каюся, мною тут недагледжана. Кніжная. Нават не кніжная, а — газетная! У гэтым уся й бяда. Вельмі цяжка мне было адмовіцца ад уяўлення, што ваенную рэч трэба пісаць моваю службовае сферы. Апраўдваючыся, што ваенная тэрміналогія ў нас не распрацавана. А хто ж будзе распрацоўваць яе, калі не мы? На жаль, позна я спахапіўся, а папраўляць усю кнігу — гэта ж усё роўна як пісаць яе нанава. Няма калі.

Я прызнаўся, што лічу, што яго «Людзі на балоце» — гэта класічны ўзор таго, як мова робіць герояў твора жывымі людзьмі. Ні аднаго фальшывага слова, а адсюль і зробленага жэсту, позы. Нават Вераччыну дамавінку Сцяпан убраў валошкамі. Не кніжнымі васількамі, якія я ўпершыню пачуў толькі ў Багдановічавых «Слуцкіх ткачыхах» і доўга думаў, што кветкі гэта нетутэйшыя. А тымі краскамі, што ведаў з дзяцінства, бо іх таксама звалі ў нас валошкаю.

— Праўда? Нідзе ніякага фальшу? — раптам ажывеў Мележаў твар, і вельмі зычліва, чыста і даверліва засвяціліся яго вочы.

Ён пайшоў, не сказаўшы на гэты раз, чаго заходзіў, якая да мяне была ў яго патрэба. Але праз паўгадзіны пазваніў зноў:

— Яне, дарагі! I я, дый ты цяпер, я ведаю, працаваць не будзеш. Давай трохі паездзім па наваколлі, як рабілі гэта нераз, калі трэба было знайсці добры спакой. Спускайся, я іду заводзіць машыну.

Ездзілі мы доўга і многа. Мележ добра ведаў дарогі гэтага, як ён сказаў, наваколля. Ён выбіраў тыя, што завуцца сценкамі або прасёлкамі, праз цяперашнюю малую патрэбу ў жывым цягле закінутымі часамі да таго, што пачалі зарастаць травою, толькі дзе-нідзе прасвечваліся яшчэ калісь убітыя каляіны ды пасярэдзіне іх угадваўся конскі след. Такія дарогі апавіты вечнай паэзіяй, яны звычайна ідуць па мяжы лесу і поля або сенажаці, і ты, сунуўшыся, можаш зачаравана глядзець, як у бясконцым палетку плыве і плыве збажына...

Прыблізна ў гэтакай мясціне Мележ і спыніўся: на паваротцы з высокага пагорка выскачыў на дарогу краёк бору, можна сказаць, рэштка колішняга бору з медзянымі стваламі гонкіх хваін, з падсушанымі доле на сонечных лапінах пярэстымі плямамі моху, чабору і верасу. Лёгка мы знайшлі мясціну з густым ценем у кустах, што буйна выраслі за дарогаю на колішніх глінішчах, і апусціліся ў ласкавы халадок травы.

— Пісьменніку абавязкова трэба мець машыну,— сказаў Мележ,— яна дае куды больш поўнае адчуванне свету. Калі не баяцца гіпербалы, дык можна сказаць, што пісьменнік без машыны — гэта чалавек у творчым сэнсе адсталы, не сучасны, ён не можа як след разабрацца нават у сённяшнім дні. Гавару гэта з свае практыкі.

Я мог толькі згадзіцца з гэтакім меркаваннем, асабліва пасля сённяшняга падарожжа. Але Мележ тут жа перамяніў тэму.

— Дык ты кажаш, ві ў адным слове не чутно фальшу? — Відаць, увесь час ён не забываўся на нашу размову.— А гэта мне вельмі дорага.

Лёгка пайшла ў нас гаворка аб мове, асабліва цяперашняй. Што яна стала багатая, граматная, гнуткая, але што народную аснову яе вельмі ж калечаць неахайнікі. То калькаю, то хадульнаю будоваю фразы. Пісьменнік павінен вучыцца мове кожны дзень! Што было б лагічна, каб інстытут мовазнаўства меў сектар культуры мовы, які даваў бы свае рэкамендацыі або свае перасцярогі. Абараняў бы і лексіку, якая з'яўляецца духоўным багаццем народа, мудра назбіраным за ўсю яго гісторыю. Ці ёсць, напрыклад, патрэба такія народныя словы, як «лужок», «кубак» — падменьваць «чашкаю» і «лужайкаю»? Калі людзей усё жыццё звалі Аленаю і Прахорам, то чаму стала лепш зваць іх Алёнаю і Прохарам? Што толькі праз нашу неахайнасць мове надаецца ненатуральнасць і хадульнасць.

— Усё гэта лёгка можна было б прапусціць міма ўвагі як выпадковасць ці як памылку,— гаварыў Мележ.— Дык жа яна, зафіксаваная недзе ў картках таго ж інстытута мовазнаўства, потым стане нормаю.

Гэтакая гаворка была нам па душы. Можа, у ёй была нават нейкая няслушнасць, але гэта апічым не стала нам на шкоду. Тым больш што я адчуваў, што асабліва па душы яна была Мележу: тады ўвесь ён жыў у моўнай атмасферы сваіх «Людзей на балоце».

6

Ён ніколі не скардзіўся на здароўе. І разам з тым на вуліцы, калі ты мог з ім сустрэцца, перасцярожліва паказваў жэстам, што яму гаварыць нельга. І прабачліва як бы прасіў вачыма: «Ты, калі ласка, гавары, я буду слухаць цябе, але мне — няможна». Гэтак было не толькі ўзімку, у халады, ці ў сырую восень, а нават улетку. І было дзівам бачыць, як гэты высокі, ладны, прыгожы чалавек, элегантна апранены — у драпавым паліце або ў светлым габардзінавым макінтошы, у светла-рудой шапцы-вушанцы або ў чорным берэце, гэтакі ветлівы і далікатны,— было дзівам, як ён стараецца не трапляць людзям на вочы з-за свайго глухога частага кашлю, з-за патрэбы настаўляць вышэй каўнер і цёплым шалікам тоўста ўкручваць шыю, рукою затульваць дыханне. І ён з'язджаў з дому то ў Крым, то ў Трускавец, то яшчэ куды на цэлыя месяцы. Збоку гледзячы, можна было падумаць, што чалавек раскашуе, гойсае па курортах, а ён шукаў мясцін, дзе можна было б, на ўсё забыўшыся, працаваць, пераклаўшы клопаты аб здароўі на медыцыну або хоць на лекавы фактар клімату. Каб самому не думаць, апроч работы, ні аб чым.

Вось як пісаліся Мележам яго «Людзі на балоце». Апошнім разам, памятаю, паехаў ён у Ялту ўшчэнт высілены, схуднелы, з настроем невясёлым. Зайшоў у рэдакцыю развітацца і папрасіць, каб планавалі ў часопісе месца.

— На ўсякі выпадак майце мяне на чарзе,— сказаў ён.— А потым — пабачыце. Бо хто яго ведае: можа, у мяне нічога людскага і не выйшла.

Па немалым часе ён напісаў з Ялты, што рукапіс рамана выслаў. І не ўтрываў, каб не перасцерагчыся ў тым, што лічыў асабліва важным.

«Зазіраючы наперад,— пісаў ён,— думаю, што ў Вас, напэўна, будуць нейкія сумненні наконт таго, як даваць гаворку героям. Я наважыўся перадаць некаторыя асаблівасці гаворкі палешукоў, але пастараюся зрабіць гэта як мага асцярожна,— каб не абцяжарваць задачу чытачу, які наважыцца ўзяць у рукі маю кніжку... Табе, як ураджэнцу цэнтральнай Беларусі і чалавеку, які любіць чыстую літаратурную і правільную мову, гэтыя асаблівасці, можа быць, не спадабаюцца, але я думаю, што ў тых сціплых адхіленнях, якія я асмеліўся дапусціць у адпа-

веднасці з жывой палескай мовай, яны неабходны. Яны — частка агульнага каларыту беларускага нашага краю, які я люблю разам з яго рэкамі, лясамі і балотамі. Думаю, што не толькі вучоныя-дыялектолагі, але і наш брат-празаік не можа быць зусім абыякавым да таго, як гаварылі вякамі і гавораць людзі вялікай часткі нашай зямлі».

Прыблізна вось што напісаў я Івану Мележу ў Ялту. Што раман мною прачытаны за дзве ночы дома — замест сну: ці не найлепшая гэта рэцэнзія? Што ён — бясспрэчная ўдача, чытаецца, як самы сённяшні, самы сучасны. Што людзі ў ім як жывыя, за іх, як за жывых, перажываеш. Раману я прарочыў шчаслівую долю і дзякаваў за хвіліны чытацкага майго хвалявання.

Я, мабыць, не пераступлю такту, калі падам і яшчэ колькі мясцін з лістоў, якія вельмі добра перадаюць стан новага Мележавага самаадчування.

«Твой ліст аб рамане — адна з самых радасных для мяне вестак з родных мясцін за многія і многія месяцы. Прызнаюся, чытаў і чытаў я яго, прыглядаўся, нібы хацеў яшчэ раз пераканацца, што ўсё так і напісана, як прачытаў зразу»,— пісаў ён у чэрвені 1961 года.

«...У мяне жыла і яшчэ жыве нейкая асцярога да кнігі, да яе лёсу, усё яшчэ жыву чаканнем — як будзе далей, усё правяраю сябе...

Але разам з тым у гэтым чаканні, у гэтай асцярожнасці тваё добрае слова мяне цешыць і робіць смялейшым. Праца, за якую я ўзяўся, не вельмі ўдзячная, не вельмі лёгкая ў наш час, калі ўсюды толькі і гаворкі — аб сучаснасці, але я не магу не рабіць яе — яна мне дарагая, як самае дарагое ў сэрцы. Я калісьці напісаў кнігу пра лейтэнантаў і генералаў, пра герояў, а цяпер мяне вабіць зямля, поле, хаты нашы, я думаю, што гэтыя простыя, у нечым наіўныя, у нечым мудрыя гарапашнікі-людзі і ёсць аснова жыцця. З іх бяруць пачатак, імі ўзрошчаны першыя парасткі, якія далі і пяцігодкі, і сямігодку, і спадарожнік, і касмічны карабель «Усход»...

Усе мы — чалавекі, Янка, і ўсіх нас часта — часцей, як трэба, мабыць,— трывожаць сумненні. Неаднойчы ў мяне была такая думка, што, можа, залішне глыбока ўлез у «балота», выбраў такую доўгую дарогу па багне. Думалася часам, можа, гэта нецікава другім, не вельмі патрэбна, а ты (я), дзівак, пнешся, гнешся, марнуеш на гэта гады, здароўе, жыццё... Таму твой ліст — не проста доб-

ры ліст, гэта слова таварыша, якое памагае ісці, падтрымлівае, дае сілы, большай упэўненасці.

Дзякуй табе! Пасля твайго ліста так захацелася сесці за стол, павесці гаворку далей!..»

7

Ён скрозь шукаў цішыні. Усюды: дома, у дарозе, пры рабоце, на адпачынку. Асабліва патрэбна была яна за рабочым сталом. Ён памяняў кватэру, але без асаблівай удачы. Я быў на той кватэры, апрошчана-строгай, халодна-чыстай, бачыў усе пакоі, нечым падобныя адзін на адзін, чамусьці здавалася, што ў іх павінны быць насцеж паадчыняны ўсе дзверы. Бачыў новы кабінет: Мележ сядзеў за тым самым сталом, які тут здаваўся чамусьці лішнім: на тых самых стэлажах кнігі стаялі як напаказ, пазорыста, але зусім не душэўна. За вокнамі час ад часу з грукатам праходзіў трамвай, на выездзе з плошчы Свабоды ён доўга і тонка звінеў, і я бачыў, як кожны гэтакі раз па Мележавым твары праходзіў боль.

Добра, што нядоўга яму прыйшлося там бедаваць.

Потым ён жыў на вуліцы Янкі Купалы. На добрай, спакойнай, малаязджалай вуліцы. Паўз яе цякла гэтакая ж спакойная рэчка, а за ёю зелянеў ціхатою Дзіцячы парк. На гэты раз Мележ сядзеў на засланай стракатым пледам канапе, скрыжаваўшы на грудзях рукі, і пытаўся, пытаўся ў мяне, як жыву, што раблю, чаму мала пішу. Прасторны кабінет яго быў напоўнены нейкім вельмі чыстым, высокім святлом, можа, ад шырокага тут акна, а можа, ад душэўнага ладу, што праступаў праз скупую Мележаву ўсмешку. Я ніколі не бачыў, каб Мележ адкрыта, свабодна, уголас смяяўся, яму ішла толькі вось гэтакая скупая, можна сказаць, хатняя ўсмешка.

— Ты вельмі добра зрабіў, што завітаў да мяне,— сказаў ён на развітанне.— І заходзь, калі ласка, часцей. А то так стала — усё некалі і ўсё некалі нават сустрэцца.

ПАСЛЯ РАЗВІТАННЯ

Нас з ім бадай што разам напаткала бяда. Калі па нейкім немалым часе я нарэшце апрытомнеў, то першае, што слаба дайшло да ўсведамлення: у ложку насупраць мяне ляжыць Алесь Пальчэўскі. Аднак у памяці гэта толькі

зафіксавалася, не пакінуўшы ні здзіўлення, ні трывогі. Адчуванні прыйшлі пазней, калі я пачаў у сім-тым разбірацца. Да мяне дайшло, што Пальчэўскаму вельмі блага: яму адабрала мову, паралізавала частку цела. Кожны раз, прачнуўшыся ад свайго частага засынання, з нейкаю палахліваю прымхлівасцю ў душы я бачыў, што на мяне з падушкі глядзяць Алесевы ціхія вочы. Як бы чаго пытаюцца. Як бы хочуць нешта сказаць.

Хвароба цякла вельмі няроўна. Часам наставалі хвіліны палёгкі, калі здавалася, што трывожыцца няма чаго, што бяда пройдзе, як праходзіла ўжо няраз. Аднаго разу ён мяне зусім абнадзеіў. Калі я адужэў да таго, што мог падымацца на ложку, захацелася самому пабрыцца. Разетка была тут жа ў сцяне. Вельмі няўпэўнена хадзіла брытва па нясвежай барадзе, млела, не набраўшыся яшчэ сілы, рука. Калі я скончыў, Алесь мармытнуў нейкае слова і кісцю правае рукі паказаў на сваю бараду. Я зразумеў. Першы раз я ступіў з пасцелі і, апіраючыся на тумбачку, перасеў да яго на ложак. Брытва мая, сетачная, не брала яго барады, яна патрабавала кароткага воласу, і ён, тым жа слабым жэстам рукі паказаў, што ў яго ў тумбачцы ляжыць свая брытва.

Потым настаў даволі доўгі час упартага, маўклівага забыцця. Потым яго перасялілі — падкаціўся гэты страшны бальнічны тапчан на мяккіх гумовых колах і спакойна павёз яго за дзверы. У палаце стала нязвычна, нават трывожна ціха.

Назаўтра ўранні я выйшаў у калідор, каб наведацца да Алеся. Дзверы ў яго палату былі прачынены, але ў ёй стаяла толькі прытуленае да сцяны крэсла і бялела чыста засланая пустая пасцель.

*

Пакрысе прыпамінаюцца і прыпамінаюцца нашы маладыя гады. Пісаць ён пачаў яшчэ на рабфаку, першае апавяданне «Ахвяра» надрукаваў у «Маладым аратым» у 1926 годзе. Быў высокі, тонкі, белабрысы. І худы: на выцягнутым вострым твары відны былі адны толькі вочы.

Ён не хацеў нідзе вытыркацца, але цягнуўся да грамадскае работы. Апроч удзелу ў рэдкалегіі быў членам усякіх камісій, прафкома, студкома. Хадзіў лёгка, любіў таварышаванне, але ў кампаніі, як гэта бывае сярод студэнтаў, каб пільнавацца нейкага свайго гурту, не лез, пасля заняткаў спяшаўся дадому. Трохі не пасавала да яго

таварыскае натуры гэтакая нехлапечая дамавітасць. Думалася ўсяк: чалавек прыйшоў з рабфака, трэба многа наганяць па вучобе ці хоць бы старацца, каб не адстаць. Або тое, што быў з беднае сям'і, розных дастаткаў з дому не чакаў, прыходзілася выбіраць часу і на падработкі. Не апошняя прычына бачылася і ў яго суровай самадысцыпліне, бо пісьменніцтва не кантактуецца з марнатраўствам. Нарэшце сярод прычын адкрылася самая нечаканая: аказалася, ён быў жанаты. Аднак жа рэдка калі яго можна было бачыць з жонкаю: мілавідная маладая жанчына з кучаравымі валасамі колеру спелае пшаніцы, Мура. Я адразу апраўдаў і яго дамавітасць, і праняўся нейкаю адмысловаю, новаю да яго павагаю.

Жыў ён у Завакзаллі, на Красівай вуліцы. Чаму яна гэтак звалася, астаецца тайнаю, бо нічога «красівага» ў ёй не было. Яна выходзіла бадай што за горад, была падобна больш на выселкі. Ад другіх яе вылучала хіба толькі тое, што дамоў стаяла больш новых, дашчаныя тратуары, калі ідзеш па іх, не ўгіналіся, стройным шнурам яшчэ стаялі платы. Яе чамусьці аблюбавалі паэты. На ёй ці поблізу яе, у тым, як цяпер кажуць, рэгіёне ў розныя часы — хто больш, хто менш — пражывалі Васіль Каваль і Сымон Баранавых, Змітрок Астапенка і Юлі Таўбін.

Я таксама жыў у Завакзаллі, адразу за чыгункаю, мне чутны былі ўсе перастукі па рэйках і гудкі. Часта па дарозе дадому з універсітэта Алесь забягаў да мяне пасядзець, папрастарэкаваць, пачытаць новыя вершы.

Вершы ён пісаў найбольш дзіцячыя, я ж, ведама, стаяў за прозу, тым больш што з яе ён і пачынаў.

— А яно, мабыць, гэтак і пойдзе,— не адразу згаджаўся ён.— Бо ў мяне ў Прусінаве, гэтак жа як у Кузьмы Чорнага, і радні з паўсяла набярэцца, і здарэнняў усякіх хапае, можна пісаць бог ведае колькі. А ў вершах жа мала што скажаш.

Як бачым, ужо тады творчая практыка Кузьмы Чорнага настаўляла нас. І праўда, у Алесевых творах пад рознымі псеўданімамі і ў розных, далёка не тутэйшых сітуацыях, таксама неўзаметку пасяляліся прусінаўскія дзядкі і бабулі.

*

Бывае парода людзей, сапраўднае чалавечае хараство якім надае старасць. Усё мяняецца ў іх — і хада, і пастава, і манера трымацца, і аблічча. Вось з такой пароды і

быў Алесь Пальчэўскі. І калі з чалавекам жывеш поруч, гэтакіх перамен не надта і бачыш. Але жыццё распараджаецца так, што часамі самыя лепшыя сябры не бачацца доўгімі гадамі.

Сустрэўшыся, першае, што ён папытаўся: дзе я жыву.

— Ды нідзе яшчэ, трэба шукаць.

— Хадзем да мяне. Мы толькі ўдваіх з жонкаю, месца хопіць.

Ён зноў жыў на Красівай вуліцы. Праўда, яе стала не пазнаць: усё кругом абсялілася, стала цясней, і сама вуліца як бы павузела і пацямнела.

Дом драўляны, яшчэ ладны, на дзве палавіны. Адну з іх займаюць Пальчэўскія. Вялікі пакой і бакоўку. Чыстата, прыбранасць. З бакоўкі выходзіць незнаёмая мне жанчына, жонка. Тамара Цулукідзе. Артыстка? А-а, прыпамінаю: славуты грузінскі тэатр з не менш славутым яго рэжысёрам-рэфарматарам Сандро Ахметэлі і, вядома, таленавітымі артыстамі. Здаецца, такое прозвішча нават чуў: у кіно Ната Вачнадзе, а ў тэатры — Цулукідзе. Прыглядаюся: сімпатычная невысокая жанчына з пунсова-жадлівымі грузінскімі губамі; чую — класічна чыстая руская мова. Яна паказвае мне на бакоўку: калі ласка, пакуль знойдзеце, займайце. Алесь з гасціннаю ўсмешкаю ківае галавою: будзь як дома.

Час ішоў. Потым ён жыў на вуліцы Карла Лібкнехта, потым — на Чарнышэўскага. Цяпер яму было куды лягчэй пільнавацца заведзенага парадку: з раніцы — у сябе за сталом, з абеда — на службе, а вечар — на людзей. І ўсё расцвітала і ўсіх дзівіла яго чалавечая краса. Мажны, высокі, плячысты, ладны,— дзе ён усяго гэтага набіраўся? У свабодна адкінутых назад валасах з густым снегам сівізны — спакойная, як бы прафесарская сталасць. У высокай паставе галавы — велічнасць, у няспешнай хадзе — паважнасць. Нос — з гарбінкаю. Адкуль узялася ў яго, у прусінаўскага кроўнага мужыка, гэтакая пародзістая арыстакратычная гарбінка?

Ён любіў, калі ў яго бывалі людзі. Іх было бог ведае колькі, Алесевых прыхаджан: сябры, знаёмыя, радня. Калі, бывала, я нейкі час не акажуся, ён званіў:

— Ну дзе ты дзеўся? Што там робіш? Нічога? То скарэй жа прыходзь! Ты хіба забыўся, што прагуляў?

Гэта пра шахматы. Страшэнна любіў. Часам ззываў цэлы гурт, на выкідку, на дзве дошкі: мяне, Хомчанку і Мяжэвіча. Калі прагульваў — перажываў.

Апошнім часам дактарамі яму было забаронена гуляць. Таксама перажываў.

Забаронена было і працаваць, гэта асабліва яго мучыла. І мне здаецца, што тут ён вінаваты: ці не прысаджваўся ўсё-такі цішком да стала? І мог гэтым сабе пашкодзіць.

*

Пасля бацькоў асталася ў Прусінаве хата. Яна не гадзілася пад лецішча, стаяла бадай што пасярод сяла, пры самай вуліцы, не было тут ні зацішку, ні ўтульнасці. Але не мог Алесь, каб забыцца на гнездзішча. Разоў колькі ездзіў туды ў тое Прусінава, дастаў матэрыялаў, знайшоў майстроў, даў грошай — папраўляйце. Хаты стала не пазнаць: пераслана падлога, памяняны вокны і дзверы, абшаляваны сцены, шыферам накрыта страха. Нават усярэдзіне памяняўся план: ад варыстае печы дзверы разыходзяцца ў абедзве палавіны, каб і там і там можна было зацішна працаваць.

Але не прыпамінаю я, каб Алесь надоўга ездзіў туды.

Апроч бацькоўскай хаты агледзеў ён і могілкі. На канцы сяла стаялі яны, занядбаныя, запушчаныя: за раскіданаю агароджаю пасвіліся цяляты, варочалі лычамі зямлю свінні. Зноў пачаўся Алесеў клопат — з сельсаветам, з матэрыяламі, з цеслярамі.

Памятаю, ішлі мы з ім ад чыгуначнае станцыі Коласава да Прусінава пехатою. Гэтакі пахучы смаловы лес, гэтакая паэтычная дарога, не сталбавая, а прасёлкавая, што заўсёды вывіваецца па нейкіх толькі ёй вядомых жадунках, каб за кожным паваротам паказваць вам новыя дзівы. Мы стараліся ісці не дарогаю, каб не пападаць у раз'езджаныя, пылныя каляіны, а чуць-чуць збочвалі ў лес і вельмі шкадавалі, што ніхто не пратаптаў тут сцежкі: як жа добра ідзецца тут па мяккім імху, па слізкай, сухой рудой ігліцы, і толькі адно замінае: што сюдтуд трэба выварочвацца, каб якая малая, гарэзліва-дзёрзкая хвойка не сцебанула цябе па вачах ці не падрапала твару. Я сказаў, што калі б тут хадзіў гэтак часта, як ён, то даўно працерабіў бы дарожку: і самому якая была б зручната і людзі дзякавалі б.

Праз колькі часу, зноў запрашаючы ў Прусінава, Алесь сказаў, што дарожку ён працерабіў.

— Не мані,— сказаў я.— Гэта вельмі цяжкая работа — праз увесь лес.

— Дык табе ж даецца права праверыць,— хітравата ўсміхнуўся ён.

Аказваецца, папраўдзе дарожка была працярэблена: ён знайшоў ахвотнікаў, падлеткаў, заплаціў.

Ён быў вельмі чулы сэрцам, даверлівы, з ім лёгка было таварышаваць. Жыў у дастатку, і вельмі незвычайныя ў яго былі адносіны да грошай. Раскідацца ён імі не любіў, быў ашчадны, ведаў, як кажуць, цану капейцы, але з лёгкім сэрцам і распускаў іх. У яго было многа пляменнікаў, далёкай і блізкай радні, і ўсе рады былі ад дзядзечкі Алеся запамагчыся. І пазычаў, часам нават мала знаёмым людзям. Пазычаў і мне. Ён ведаў, што я меўся збыць адзін клопат, але ўсё адкладваў і адкладваў. Аднаго разу ён і папытаўся, чаму не раблю.

— Ат, пачакаецца,— сказаў я абыякава.

— Што, мабыць, грошай няма? То колькі табе трэба? Тысячу хопіць!

У яго была проста патрэба рабіць каму-небудзь дабро. І сам быў бы з найшчаслівейшых, калі б не адна акалічнасць.

У маім апавяданні «Над гаем кружылі буслы» ёсць сітуацыя, блізкая той, якую пражыў Пальчэўскі. Натуральна, што я не мог друкаваць яго, не прачытаўшы Алесю. Там адна з гераінь, калі яе муж аказаўся ў бядзе, як мага барджэй адцуралася яго, выйшла замуж за другога, перапісала на яго сына, дала яму новае прозвішча.

Алесь доўга маўчаў пасля таго, як я скончыў чытаць. Глыбока ўздыхнуў.

— Ён цяпер ужо сталы мужчына,— сказаў ён.— Мае сваю сям'ю і добрую работу. Сяк-так упрасіў яго, прыязджаў сюды. Але гаворкі ў нас не выйшла. Гэтак чужым і паехаў.

*

Не хочацца канчаць успамін пра яго сумна. Тым больш што ён сам не любіў ныцця, на яго гледзячы хацелася жыць гэтак, як ён — жыццялюбна, чалавечна, з адкрытым тварам. Бывала, ён вельмі любіў простыя, усім вядомыя жарты. Званіў па тэлефоне і падробленым голасам прыдумляў якую-небудзь гісторыю: што вам па нейкай справе конча трэба з'явіцца ў выканком або ў міліцыю, у такі і такі пакой. Яго мілае шальмоўства звычайна я адразу ж разгадваў, але аднаго разу папаўся-такі. Пазванілі з домакіраўніцтва, даволі строга: што каторы месяц у мяне не

аплачана кватэра. Як так! — настаўбурчыўся я,— тут нешта наблытана, у мяне ўсе квіткі...

— Дык вось мы ж і просім зайсці да нас з квіткамі, таварыш Скрыган.

— Зараз жа зайду!

Тут толькі Алесь разрагатаўся. Божа, як хораша ўмеў ён рагатаць! Здаецца, што я нават бачыў на тым канцы тэлефона, як рагоча ён: шчыра, па-дзіцячы шчасліва, высока закінуўшы назад зусім белую сваю галаву.

САМАЯ ДОЎГАЯ ДРУЖБА

Мне Пятрусь Броўка — гэта цэлае жыццё. Пяцьдзесят чатыры гады таварышавання, веры адзін аднаму, патрэбы ў духоўным кантактаванні. Мне нават здаецца, што мы ніколі не разлучаліся, хоць быў адзін доўгі і вельмі страшны перапынак.

Пачалося з таго, што ў 1926 годзе з Расонаў я прыехаў у газету «Чырвоная Полаччына» — друкавацца. Там і пазнаўся з адказным сакратаром рэдакцыі Петрусём Броўкам. Малады, трапяткі, няўрымслівы; вясёлы, ахвочы на жарт. Ён жа і надрукаваў у газеце маё ці не першае ў прозе практыкаванне «Таіса».

Потым у гэтай жа газеце я і працаваў разам з ім.

Потым паехалі мы ў Мінск — вучыцца, кватаравалі ў адным жа доме ў Завакзаллі. Універсітэт, слынныя педагогі — Замоцін, Піятуховіч, Вальфсон, Саўсун, Бабарэка, Бузук, Фохт. Вучыліся і шукалі сваіх дарог у літаратуры. Гэта было куды цяжэй, як вучыцца. Вакол нас — самі па сабе, не ведаючы нас і не падазраючы пра нашы пошукі — існавалі літаратурныя кірункі: рамантызм, сімвалізм, імажынізм, футурызм, канструктывізм, акмеізм, імпрэсіянізм, кожны з іх дражніў нас сваёю непазнанасцю, а мы конча павінны былі мець свой, наш кірунак, прымеркаваны да пазнавання нашага жыцця.

Гэта было вунь як даўно — напачатку.

А потым стыкнуліся і на завяршэнні. Калі я пусціўся ўжо быў у нажыты адпачынак, а Броўка распачаў дванаццацітомную Беларускую Савецкую Энцыклапедыю. Ён сказаў мне:

— Памажы. Ты ж ведаеш, энцыклапедычнага стылю ў нас няма, яго трэба рабіць. Каб ён быў і навуковы і про-

сты. Эканомны, сціснуты — і кожнаму даступны. Каб мова ў нас была не адарвана ад народнай. Абавязкова каб была народная аснова! Бяры на сябе мову энцыклапедыі. Я табе веру.

Дзякую яму за тую чыстую яго веру. Хоць задача была да таго цяжкая, што няраз мне прыходзіў на думку той доўгі страшны перапынак. Ад мовы ж нашай адвучвалі вякамі.

Пра Петруся Броўку вельмі нялёгка гаварыць: ён быў занадта звычайны. Ён не ўмеў вылучацца сярод другіх: быў просты, даступны, роўны кожнаму. Гэтак жыў, гэтак і пісаў — без вымудраў, без выкрунтасаў, шчыра і ясна. Яму вельмі прыстала годнасць народнага паэта рэспублікі.

Ён быў добры, чулы, тактоўны. Умеў бачыць чужую бяду. Любіў памагаць другім, калі нешта абяцаў — абавязкова помніў гэта. Думаю, шмат хто з пісьменнікаў не забывае Броўкавай душэўнасці.

Я таксама памятаю. Хоць часамі выходзіла так, што ў дачыненні да мяне нешта ён мог зрабіць не так, як хацеў. Бывалі, на жаль, такія тонкія хвіліны. Але што ж зробіш: нават грахі ўмеюць ціха прыжывацца ў мінуласці, калі яны не завуцца памылкамі.

Ён не быў помслівы. Як у кожнага, у яго былі непрыхільнікі, але ён стараўся з усімі быць роўным. Больш таго — нават абараняў, калі бачыў, што нехта да іх несправядлівы.

Калі мы вымаўляем слова камуніст, то ў яго сэнс укладаем усё самае ідэальнае. Сярод ідэальнага конча мы бачым самую чыстую рыцарскую сумленнасць, высакародную партыйнасць і бескампрамісную прынцыповасць. Хіба не было ўсяго гэтага ў Броўкі? Проста мы цяпер бачым, што ён быў мудры.

Як у кожнага з нас, у яго, ведама ж, былі свае хвіліны і адчаю, і роспачы, і неспакою і творчых трывог. Былі і трывогі, што давала яму хвароба. Але дзе і калі Броўка паказаў гэта на людзі? Хто, дзе і калі бачыў разгубленасць і смутак на Броўкавым твары? Божа, які гэта быў аптыміст, жыццялюб і весялун! Там, дзе ён паяўляўся, рабілася цёпла, хораша на душы і лёгка.

Смерць выдатных людзей заўсёды з'яўляецца ўрокам для жывых. Робіцца вельмі відно, што нам ёсць чаму вучыцца ў іх.

СПАСЦІЖЭННЕ

(працяг)

5

Едучы ў Мінск, я яшчэ не ведаў, астануся ў ім ці не. Так і Ані сказаў: чакай — напішу: або вярнуся, або і табе прыйдзецца пускацца ў дарогу.

Я вельмі не люблю абыякавых адносін да абавязку. І да свае работы прывык: бачыў у ёй і плён, і элементы творчасці, і спосаб грамадзянскага ўдзелу ў жыцці. Але як толькі атрымаў права на шырокі свет, мяне і пацягнула ў яго. Мне хацелася большага размаху. Практыка ў мяне была: Ферганскі завод № 15, сланца-хімічны камбінат «Ківіылі» ў Эстоніі, маштаб якога можна пазнаць хоць бы з таго, што адна бухгалтарская парафія ў ім налічвала больш за пяцьдзесят чалавек. Пад час ад'езду я меў некалькі запрашэнняў на работу. Апроч усяго іншага, мне важна было мець новае месца жыхарства, каб не надта хадзіла за мной мая біяграфія. Вельмі ж цяжка было з ёю на віду ў людзей. На пасаду галоўбуха я меў запрашэнне ад мінусінскага будаўнічага ўпраўлення № 5, але нешта не вельмі гарнула мяне туды. У мяне было перакананне, што будаўнічыя адзінкі такога тыпу патрабуюць многа пустога клопату і не маюць вялікай самастойнасці. Куды больш мела спакусы запрашэнне на Брацкую ГЭС. Ад аднаго гэтага слова займала дух: і маштабы, і рамантыка.

«...Брацкае будаўніча-мантажнае ўпраўленне знаходзіцца ў г. Брацку Іркуцкай вобл., размешчана на р. Ангара, зносіны па чыг. ад г. Краснаярска да ст. Тайшэт — па Сібірскай магістралі, а ад ст. Тайшэт да г. Брацка — па новай — Тайшэт-Ленскай чыг. Пра сваю згоду прашу паведаміць неадкладна»,— пісалася ў запрашэнні галоўнага бухгалтара Краснаярсклеспрамбуда У. Нікольскага.

Па ўласцівай усім людзям патрэбе заахвочваць сваю будучыню часамі я марыў, як, вярнуўшыся з Мінска пасля аднаўлення ў Саюзе пісьменнікаў, буду працаваць недзе там, на той Брацкай ГЭС, няхай сабе не галоўным бухгалтарам, як у Мінусінску, а толькі старшым, як гаварылася ў брацкім запрашэнні, і ніхто не будзе ведаць, што я не толькі бухгалтар, а яшчэ і пісьменнік. Дазнаюцца недзе пасля, калі выйдзе ў мяне новая кніга, і тым больш гэта будзе незвычайна і прыемна. Нешта падобнае са мною ўжо

раз было. Начальнік нашай шахты Франц Шубарчык, колішні маркшэйдэр львоўскіх радовішчаў каменнага вугалю, папрасіў, каб я яму паказаў апошнюю заяву, якую напаткаў такі шчаслівы лёс. Мы можам прыпісваць магічныя ўласцівасці самым нязначным з'явам, думаючы, што яны памаглі нечым спраўдзіць нашы спадзяванні. Толькі з заявы Шубарчык дазнаўся, што я колішні пісьменнік, і быў вельмі збянтэжаны. «Як жа так? — гаварыў ён.— Я нічога не ведаў і столькі з вамі па рабоце сварыўся, і ўсё мацярком ды мацярком...»

Як талстоўскі Аленін з «Казакоў», я жыў уяўленнем свае работы ў Сібіры бадай што да самай Масквы. Мне ўсё рысаваліся нашы, цяпер далёкія, пейзажы і палеткі, наша дзялянка поля за гарою, дзе мы саджалі бульбу і дзе аднойчы Аня, пайшоўшы абкопваць, не знайшла яе, села на палявой дарозе і расплакалася, і суцешылася, і рассмяялася толькі тады, калі я, прыехаўшы пазней на веласіпедзе, сказаў ёй, што яна сядзіць і плача на сваёй дзялянцы. То ўяўлялася заблытаная сваімі калідорамі і павыгароджванымі фанернымі кабінетамі кантора Краснаярсклеспрамбуда на глухой бакавой вуліцы ў Краснаярску, і высокі, рана пасівелы, стомлены і худы галоўбух яе Нікольскі, які гаварыў са мною ціхім, хваравітым голасам, і мне здавалася, што ён робіць гэта ад спачування, бо я сам прыйшоў да яго, калоцячыся ў грыпознай ліхаманцы. То рысаваліся карціны таго Брацка, і ўсюды, дзе вадзіла мяне ўяўленне, я бачыў снягі, бясконца сіняе неба над галавою і чуў густы, векавечны, трывожны шум тайгі. Усе гэтыя ўяўныя карціны і ўспаміны пакінулі мяне пасля Масквы, калі раптам і па пейзажах за вагоннымі вокнамі, і па людзях, і па іх гаворцы, і па нечым вельмі нераспазнаным адчуў, што мяне кругом абступае родны дом, і Сібір пачала ўяўляцца вельмі далёка. Я зразумеў, што развітаўся з ёю назаўсёды.

6

Неяк напрадвесні ў камунгас да мяне прыходзіў чалавек наймацца на работу. Гадоў за сорак, з пышнай, крутой шавялюрай колеру сівой бронзы, густымі брывамі і цяжкім паглядам воч — Саакян. Я сказаў, што мне няма куды наймаць, усе пасады заняты, людзі з работаю спраўляюцца.

— Ты неразумны чалавек,— сказаў Саакян.— Я пра-

цую вартаўніком на нафтабазе ў МТС, і мне надакучыла гэтая работа. Чаму ў цябе ў касірках павінна хадзіць Волька Федарэнка, калі ў яе ёсць свой палюбоўнік Цітоў? І чаму ў рахаўніках у цябе працуе гэты нягоднік Гордзін, які шальмуе толькі на самога сябе? Любога з іх можаш прагнаць, калі маеш сумленне.

Вядома, я нікога не прагнаў і Саакяна на работу не ўзяў. І от цяпер Аня пісала, што Саакян не дае ёй быту. Запыніўшы на вуліцы, ён вельмі спагадліва пацісиуў ёй рукі, сказаў, што заўсёды спачуваў ёй і спачувае цяпер, што падзяляе яе гора і будзе шчаслівы, калі яна згодзіцца знайсці свой прытулак у яго сэрцы. Рэч у тым, сказаў Саакян, што муж ваш самы мярзотны і паганы чалавек на зямлі. Ён ніколі не кахаў і не кахае вас, цярпеў толькі таму, што вы былі яму патрэбна як прыслуга, як наймічка. Ён да вас больш ніколі не вернецца і да сябе не пазаве, ён рад, што нарэшце шчасліва развітаўся з вамі.

Я разумеў, што гэта Саакянава помста мне, што Аня не верыць гэтаму, і разам з тым ведаў, што спакой яе парушаны, што доўга выпрабоўваць яе веры і цярплівасці нельга. Трэба было шукаць кватэры і перабіраць сям'ю. А з кватэрамі вельмі цяжка. У горадзе яшчэ многа руін, многа пазарастаных быльнягом і крапівою дзядзінцаў; за пустымі вокнамі сцен галоўнага корпуса універсітэта, дзе я вучыўся, на вышыні трэцяга паверха відна ацалелая ад колішняй столі пакарэжаная жалезная бэлька, і там, дзе яна вытыркае з сцяны, на грудку першатрушчаная цэглы нясмела прымасцілася і распусціла зялёныя лісткі маленькая бярозка...

І вось пайшлі дні пошукаў. Памятаю, якая гэта была цяжкая работа хадзіць з двара ў двор, з вуліцы ў вуліцу па тых адрасах, што нехта параіць табе, сустракаць насцярожлівыя або запабеглівыя вочы раздабрэлых мяшчанак, слухаць іх завучана-прытворную мову не то спагады, не то ўступчывасці: «У мяне ўжо загаворана, але калі вы не пастаіце за цаною, то саступлю гэты пакойчык вам, бо задатку не брала. Ах, вы з сям'ёю? Не, то за такую цану не магу».

Першая наша гаспадыня была жанчына высокай пастаці, чорнага воласу, удава. Дамок яе, з агародам і садам, стаяў за глухою, высокаю брамкаю. Было ёй гадоў за трыццаць, аднак жыла яна ўжо толькі тым, што прайшло. Колішнім шляхецтвам, колішняй красой тонкага профіля, колішняй славай, што была спявачкаю эстрады, называлася

актрысаю, ездзіла на гастролі. Бог знае што здарылася з ёю, няйначай, што душу пакалечыла таксама вайна, але ўсё гэта аказалася прамяняным на клопаты, вельмі далёкія ад мастацтва: каб штораніцы бегчы на Камароўскі рынак то з кошыкам вішань, то з бярэмем свежанарваных, яшчэ расяным холадам пранізаных кветак. Яна далікатна сустрэла маю сям'ю і вельмі далікатна растлумачыла, што нам забаронена. Забаронена моцна гаварыць у доме, шпарка хадзіць; не пырскаць вады на кухні, паліць керагаз і ўмывацца толькі на двары; класціся спаць не пазней адзінаццаці, не рыпець і не стукаць дзвярыма.

Пасля былі ў нас розныя гаспадыні, з рознымі прымхамі і вантурамі. Адна з іх называла нас міленькімі, часта хварэла на галаву і тады кляла ўвесь свет, заадно і нас, што мы знарок нарабілі чаду. Другая, сухая і цёмная, як мумія, з нацягнутай жоўтай скурай на выпетралых руках, мела гадоў за семдзесят веку, бог ведае куды і навошта запасіла грошы, марыла сябе голадам, жывячыся размочанымі сухарамі, а, не ўтрываўшы, калі Аня гатавала абед, прасіла чым-небудзь участавацца, пасля кволілася жыватом і крычала, што яе абкармілі. Але чамусьці мне больш памятаецца апошняя наша гаспадыня — Мар'я Мароз. Не таму, што яна была папраўдзе лепшая за другіх, а што з яе домам звязаны нейкі добры плён маіх спраў. У гэтым доме я рыхтаваў зноў сваю першую кнігу, з гэтага дома пераехаў на кватэру, выдзеленую па тэрміновай чарзе райвыканкомам.

7

У Мар'і Мароз было добра тым, што яна ні ў што не ўмешвалася. У нас быў свой парадак ці непарадак, свая ўладкаванасць ці неўладкаванасць; мы маглі ўсю ноч днявагаць або ўвесь дзень адсыпацца. У нас быў канец дома з кухняй, прымайстраванай у ацепленым ганку, свой хлявушок, каля якога зімою я пілаваў дровы, распырскваючы жоўтае пілавінне ў мяккі цукровы снег, а пасля калоў іх, са смачным гаханнем пускаючы сякеру, і, намарожаныя, яны разляталіся з нейкім ахвочым звонам.

У выдавецтве ўключылі ў план кнігу; я разумеў, што ўсё гэта было зроблена чужымі добрымі людзьмі: і каб уключылася ў дзейную работу імя, і каб памагчы мне ўмацавацца. Я прагледзеў старыя кніжкі, і мне стала сумна:

многае і па сутнасці, і па выкананні асталося ў тым далёкім часе літаратурнага маленства і сляпых пошукаў. Тое, што можна было вярнуць, трэба было перарабляць.

Не ведаю, чым дарагі тыя хвіліны, калі хочаш, каб даўжэй працягнуліся дні. Удзень я чытаў у выдавецтве рукапісы, а ўвечары, дачакаўшыся, калі ўсе ўлягуцца, садзіўся за стол. Пад гэты час у маім жытле сабралася многа народу, прыехалі з сёл хто на сезонныя работы, хто на курсы. Каб дайсці да століка, прыткнутага пры акне да пасцелі, трэба было пераступіць нечыя рукі ці ногі. Я абстаўляў кнігамі ці газетамі лямпу, каб святло падала толькі на ліст паперы, і — мяне абступалі мае старыя вобразы — Алеся, Наталя, Таіса, Цымбал, Караневіч, вытанчаны паручнік Гжэцкі,— з імі я пускаўся ў далёкія светы, змагаўся, перамагаў і знясільваўся, кахаў і ненавідзеў, траціў надзею і спадзяваўся, і варочаўся ў свой пакой, калі ў шчыліны аканіц прабіваўся ўжо золак.

Так прыйшла вясна, настала лета, восень...

На работу я хадзіў, выбіраючы самыя кароткія дарогі, па нейкіх дворышках, па сутачках і завулках. У чужых дварах, за плоцікамі і кветнікамі спелі ягады, цвілі і ўсыпаліся пладамі сады. У нечы двор вялі сцежкі вузкія, аблямаваныя мурожнаю травою, у нечы шырокія, з брамкамі, за якімі знікалі сляды «Масквічоў» ці «Пабед». Я ведаў, па якіх пуцінах і ў якія дамы ходзяць жанкі, як яны адзеты і што ў іх за клопат; у якіх мужчыны і што ў іх за прафесіі. Ведаў, дзе часта чуцён раяль... Пераходзіў Пераносную вуліцу з новымі, высока-чысцюткімі дамамі, з чысцюткімі фіранкамі ў вокнах. І — як жа гарнула мяне за чужыя веснічкі, за чужыя вокны, у чужыя сады: заўсёды хочацца зірнуць у загадку чужога жыцця.

Я думаў, што творчасць — гэта таксама загадка і шчасце, калі ты нешта добрае адкрыеш людзям...

МАЦІ

Мястэчка разбіта на дзве палавіны вузкай забалочанай лугавінай. Па ёй насыпана высокая дарога з драўляным мосцікам. На гэтым баку, ад поля, стаіць стары парк, каплічка ды жыве некалькі хутаранцаў. Па сутнасці, усё мястэчка там, на гары, якую абляпілі вясёлыя домікі. Тую палавіну так і завуць — цэнтр.

Адтуль, з цэнтра, ад тых вясёлых домікаў да мосціка спускалася маладая жанчына. Сустрэўшыся, мабыць, з сяброўкаю, яна сунялася. Жаночыя размовы ліпучыя — слова за слова, навіна за навіною,— азірнулася жанчына, аж яе хлопчык ужо далёка адбег па дарозе. Маленькаму — гадоў чатырох,— яму ўсё на свеце было цікава і нова. Ён бег, мякка махаў ручкамі — калашмаценькі ў шырокіх сваіх вясновых штоніках і ў пухнатай шапачцы. З гары было бегчы лёгка, і здавалася, што ўвесь час яго ножкі ў чырвоных чаравічках астаюцца ззаду. Перад ім мільгануў стракаты матылёк, і хлопчык пачаў лавіць яго, бегаючы то ўлева, то ўправа — вельмі ж рэзкія павароты рабіў матылёк, увесь час пырскаючы трапяткімі колерамі ад сваіх дзівосных крылкаў.

Усё гэта мне добра запомнілася пасля таго, як я пачуў крык жанчыны. Кінуўшы сяброўку, яна бегла сюды і крычала:

— Божа мой, Вацік! Што ты робіш, стой, не бегай, Вацік!

Я не разумеў, чаго крычала жанчына. Ну што такое, калі дзіця гуляе? Яму ж весела, нічога не пагражае, а матылёк гэтакі прыгожы і гэтак блізка скача перад вачыма! Але жанчына так бегла і столькі было жаху ў яе крыку, што я суняўся.

— Што ты робіш, Вацік,— машына ідзе! Ой, госпадзі!

Я азірнуўся. Сапраўды, з гары ад парку порстка імчала грузавая машына.

— Стой, кажу, не бегай, божа мой, Вацік! — паўтараючы ўсё адны і тыя ж словы, задыхалася і бегла жанчына.

Я стаў каля хлопчыка так, каб засланіць сабою дарогу і перасцерагчы на выпадак, калі б ён захацеў бегчы на сярэдзіну. Я быў спакойны: дарога шырокая, шафёр здалёк бачыць, што трэба ехаць асцярожна.

Жанчына падбегла, схапіла дзіця за ручкі і скаранька адцягнула ўбок. Яна сварылася, крычала; ёй хацелася ўшчунуць, але замест таго яна прысела каля яго і то абівала яму палітэчка, то папраўляла шапачку.

— Што ты робіш з мамаю, свавольнік! — ужо з ласкаваю грозьбаю гаварыла яна, і ў голасе чутны былі слёзы.— Ці ты хочаш, каб мама памерла ад цябе? Цябе ж траха машына не пераехала.

І пачала цалаваць, аберуч схапіўшы галоўку.

Нарэшце яна апамяталася, устала і зірнула на мяне.

— Дзякую вам... Я вельмі спужалася. Вы прабачце мне...

Яна не была прыгожая, але ўзрушанасць і яшчэ не патушаная трывога — і гэты палахлівы бляск воч, і дрыжанне ў губах, што пераходзіла ад плачу да радасці, і гарачая чырвань твару, і ўсмешка запозненай сарамлівасці, і нейкая найчысцейшая жаночая шчырасць рабілі яе вельмі прыгожаю. Скоранька яна пачала папраўляць валасы — таксама як бы спалоханыя, параскіданыя па твары,— падтыкаючы іх пад лёгкі зялёны шалік. Рукі ў яе яшчэ дрыжалі.

— Толькі падумайце,— захацелася ёй растлумачыць нейкую сваю вінаватасць,— па дарозе гуляюць дзеці, а шафёр ляціць як чорт, мабыць, п'яны. Бачыце, машына як віляе, а ён немаведама як гоніць яе,— сказала яна, глыбока верачы ў тое, што гаворыць.

Я зірнуў на машыну. Яна толькі што праехала паўз нас. Не, гэта была няпраўда. Шафёр ехаў як мае быць, асцярожна, паволі — нават вельмі асцярожна. Мне здалося, што лепшага шафёра не можа і быць.

Жанчына сказала няпраўду, але ад гэтага здалася мне яшчэ прыгажэй. Так магла сказаць толькі маці, якой даражэй за ўсе праўды на свеце — яе дзіця.

ЖЫВУ АДНА З СЫНАМ

Нічога я не ведаў пра яе. Ніколі не бачыў і, ведама, не пабачу. Гэта ўсё натуральна, як і ў тысячы выпадкаў, калі чужы лёс не кранаецца нас. Але вось прачытаў у газеце яе допіс, што жыве яна ў Таджыкістане, на Паміры, працуе на высакагорнай гідраметэастанцыі, далёка ад свайго краю. «А газеты не прыходзяць»,— такі быў загаловак яе допісу. *Пра ўсё, што дзеецца ў нас дома,*— скардзілася яна,— *я даведваюся з газет, якія выпісваю з Беларусі. Край наш суровы, доўга стаіць нялётнае надвор'е, і цяжка перадаць, з якою нецярплівасцю чакаеш самалёта з поштаю. Кожны нумар газеты мне ўсё роўна як подых роднага ветрыку. Але...*

Усюды гэтае нядобрае «але». Як жа можна астудзіць чужую радасць, нават не ведаючы чалавека, не сказаўшы яму ні слова. *За першым нумарам ЛіМа я атрымала чацвёрты, потым сёмы, дзесяты — аж чатыры яго экземпляры*

замест недасланых чарговых ранейшых,— пісала яна.— *Відаць, недзе там, на адсылцы, працуюць людзі з халоднымі рукамі...*

Я думаю пра гэтую далёкую жанчыну. Што яна маладая, мужная, смелая, што яе паклікала ў свет рамантыка подзвігу, гэтак характэрная нашаму часу; што дома ў яе, у Беларусі, недзе жыве добрая, ласкавая маці, што часта сняцца ёй і спагадлівыя матчыны рукі, і цёплая пасцель. Нездарма ж так трывожна чакае яна з дому навін. Я паслаў ёй сваю кнігу, захапляючыся і яе адвагаю, і яе рамантыкаю, і разам з ёю абураючыся людскою нячуласцю.

Але вось захацела яна падзякаваць, прыслала пісьмо. *У мяне ў роднай маёй Беларусі няма нікога, і я ніколі не чакаю лістоў*,— напісала яна.— *Толькі нецярпліва чакаю пошты. І раптам — Ваша кніга...*

Вельмі прыемна, калі чалавеку дасі хоць невялікую радасць. А яна пісала, што гэтая радасць была ў яе без меры. Што кніга ёй была самым дарагім падарункам, бо з радзімы. Калі яна распакавала бандэроль, на гэтую падзею збегліся ўсе, хто тут быў: паштавік, чалавек тры суседзяў з гор. А ёй ад гордасці і шчасця хацелася плакаць...

Я нарадзілася на беларускай зямлі, але родных сваіх не памятаю, усіх забрала вайна. У сорак пятым мне было пяць гадоў, мне даў прытулак Лагойскі дзіцячы дом. Чатыры класы я скончыла на сваёй роднай мове. Потым — тры гады бальніцы ў Нова-Беліцы, потым — лячэнне... Таджыкістан...

Вось як далёка гэта і ад спагадлівых рук, і ад цёплай пасцелі. Вайна! Аж да гэтага часу ў людскім лёсе яна абзываецца бядою і горам. Яна пасеяла сіроцтва, пакалечыла дзяцінства, пакінула ў душах вечна адкрытыя раны.

Ужо дзевяць гадоў я працую ў гідраметэаслужбе, а да гэтага часу чатыры — на тэкстыльным камбінаце. Шаснаццаць гадоў, як з Беларусі. Жыву адна з сынам сярод гор і мару толькі пра тое, каб зірнуць на родныя мясціны...

Яна падпісалася: Волька Булатава. Мабыць, прозвішча ўжо не яе, нездарма ж гэта горкая прыкмета: жыву адна з сынам сярод гор. Аднак жа ні пра што няма скаргі, толькі маўклівы, ласкавы боль, які ідзе поруч з ёю, мабыць, ад самага яе дзяцінства — сум па роднай зямлі...

СЛЕПАТА

У прыморскім санаторыі на Каўказе за адным сталом са мною абедала маладая жанчына Вера. Я знаў, што яна піяністка, што адпачывала пасля гастрольных падарожжаў, і глыбока-трывожна паважаў яе.

Яна звычайна прыходзіла крыху пазней за другіх, віталася сціплым уклонам галавы і садзілася на край стала. Яна трымала сябе строга і сціпла, гаварыла скупа, але душэўна і разумна, заўсёды пакідаючы пасля сябе такое адчуванне, што хацелася зноў скарэй бачыць яе. У яе была нейкая адмысловая жаночая чароўнасць і гожасць, каторая не кідаецца ў вочы, а пазнаецца разам з самім чалавекам. Бываюць жа такія людзі, што, сустрэўшыся нечакана, надоўга ў душы пакідаюць свой след.

Часамі мы рабілі з ёю невялікія падарожжы па наваколлі. Штораніцы сустракаліся на беразе: я прыходзіў з усходам сонца і заставаў яе ўжо там. Адна перад морам, скінуўшы махрасты халат на яшчэ стылы ад ночы пясок, яна займалася гімнастыкаю. Мы віталіся, махаючы над галавою рукамі, і яна мне крычала:

— Вы доўга любіце спаць, дарагі таварыш! Марнуеце час! Не шкадуеце, што міма праходзіць гэтулькі хараства!

І праўда, можа гэта ад яе, кругом было хораша. Мы купаліся ў ранішняй марской свежай вадзе, і мне здавалася самым лепшым, што пругкія плыні абмываюць разам мяне і яе. Пасля мы выціраліся прапахлымі морам ручнікамі, цяпер сыходзіліся ўжо блізка, зноў гаварылі адно аднаму «добрай раніцы» і варочаліся дахаты, калі нашы калегі яшчэ толькі ўставалі з пасцеляў. На снеданні я зноў бачыўся з Вераю: яна як бы спяшалася насустрач майму позірку. Калі ж за сталом яе крэсла было доўга пустое, я нудзіўся і чакаў яе.

— Трохі запазнілася, прашу прабачыць. Забавілася на практыкаванні,— звычайна гаварыла яна ў такія часы, як бы папраўдзе была перада мною ў чым вінавата.

Аднаго разу з калегам мы ляжалі на гарачым беразе і жмурыліся ад сонца, разглядаючы на гарызонце лёгкі дымок парахода. Калега без ніякае прычыны сказаў:

— А слаўная жанчына твая суседка.

— Вера? — папытаўся я.

— Але. Толькі шкода, што ў яе гэтак з вокам. Такая прыгожая і — няшчасны чалавек.

— А што ў яе з вокам? — здзівіўся я.

— Яно пакалечана. Хіба ты не бачыў, што калі яна глядзіць, то трошкі прыжмурваецца, каб роўныя былі павекі? І заўсёды стаіць трошкі бокам, каб не відно было калецтва: не хоча паказаць скроні.

— Гэта не ў Веры! — рэзка не згадзіўся я.— Можа ты думаеш пра каго другога?

— Як? Хіба ты дасюль і не бачыў? — весела зарагатаў мой калега і пачаў пацяшацца з мае няўважлівасці.

Сустрэўшыся з Вераю, я знарок пільна ўгледзеўся ў твар. Вера заўважыла гэта, спалохана махнула вейкамі, нечакана павярнулася так, каб відна была правая скроня, і шумна прыкусіла край губы, нібы зацінаючы нейкі глыбокі боль. Ад куточка вока, там, дзе кладзецца першая маршчынка мудрае чалавечае сталасці, як след выкручастай, ядавіта-шпаркай змейкі, цягнуўся тоненькі шрам, хаваючыся пад лёгкай кудзеркай на скроні,— след дотыку смерці, след вайны.

Нешта чыстае, высокае і святое кранулася мяне. Самая харошая, харашэй за ўсіх на свеце была гэтая жанчына.

І пасля, калі б я ні сустракаўся з Вераю, перада мною міжволі ўсплываў твар калегі, і мне здавалася, што вочы яго засцілае страшная чалавечая слепата.

ПЕСНЯ СОЛЬВЕЙГ

Лістапад. Млявы восеньскі дзень з кроплямі начной вільгаці на голым счарнелым галлі прывакзальнага парку.

Утрапёна хаджу па выкручастых вузенькіх вуліцах старога горада. Некалі я трохі бываў тут: з сланца-хімічнага камбіната ўКівіылях прыязджаў са справаздачамі ў міністэрства, часамі бываў на якіх нарадах. І ніколі не дабраў часу агледзець увесь горад з яго стромымі дахамі капліц і ратуш, з цёмным жалезам флюгераў на спічаках званіц, з вежаю Доўгага Германа ў Вышгарадзе, на якой дзень і ноч трапечацца сцяг.

Толькі падумаць, як нам шкодзіць спяшанне! Так і не дабраўшы часу на агледзіны, я не меў магчымасці бываць тут больш за дваццаць гадоў. І вось хаджу, анямеўшы ад дзіва, як бы чытаю кнігу, з старонкамі якой пера-

гортваюцца вякі, што пахавалі ў сабе далёкія чалавечыя лёсы. А поруч сённяшні лёгкі, імклівы Талін...

Але гэтай асалодзе я аддаўся пасля. А першае, што зрабіў: папытаўся, як прайсці да Батарэі — магутнай цытадэлі часоў Кацярыны, колішняга кадэцкага корпуса,— з вокан якой заўсёды відзён быў цьмяны холад Фінскага заліва.

Аднаго разу недзе тут над сценамі праплыла, як сон, ціхая музыка: нехта далёка на піяніне іграў грыгаўскую «Песню Сольвейг», абуджаючы ў душы боль страты, адчай і бясконцую просьбу...

ХЛОПЕЦ У ВЕЛЬВЕТАВАЙ КУРТЦЫ

Увесь клопат, што належаў па камандзіроўцы, быў спраўлены, да адлёту заставалася шмат часу, і я мог пусціць яго на тое, каб нарэшце як след агледзець горад.

Я ведаў толькі колішні цэнтр, і цяпер, апынуўшыся за яго межамі, радасна дзіўлюся той нечаканасці, што горад і на вуліцы Гагарына, і на Пярнускай, што ўсюды ён гэтакі непаўторна маляўнічы, сярод самай свежай сучаснасці збярог сваё шматвяковае аблічча: і вечна сіняе неба над сабою, і непазбыўны пах мора, і будынкі, то ўтульна-інтымныя, то строгія і суровыя, падобныя на далёкія старажытныя за́мкі.

І нечакана пры самай вуліцы, на яе мяккім павароце ўправа — мемарыяльная сцяна з шэра-жоўтага каменю, з вечным агнём перад ёю. Каля падножжа сцяны, на ўсю яе шырыню, дзве прыступкі, спрэс укладзеныя кветкамі: вянкі, перавітыя жалобнымі стужкамі, кветкі ў вазонах, букеты, пакладзеныя цесна адзін пры адным, каліўцы гваздзікаў, цвёрдыя, свежыя, на іх як бы чуцён яшчэ дотык чалавечых рук. Тут стаіць урачыстая цішыня, як і заўсёды ў мясцінах, дзе трэба схіліцца ў пашане да памяці тых, хто абараніў нам бацькаўшчыну.

На сцяне залатымі літарамі напісаны імёны тут пахаваных. Палкоўнік (такі і такі)... маёр... лейтэнант...

«І двое невядомых»,— сказана апошнім радком. Мая жальба асабліва чуйна абазвалася на гэтыя словы. Колькі іх, невядомых магіл, бачыў я за сціплымі агароджамі пры дарогах у сябе дома. Кожны чацвёрты на маёй Беларусі загінуў вось гэтак жа дзеля жывых, дзеля нас...

На часе вось гэтакага майго одуму аднекуль наявіўся і стаў паперадзе мяне юнак гадоў семнаццаці. Я непрыязна зірнуў на яго туга нацягнутыя на сцёгнах джынсы сіне-злінялага колеру, на рудую вельветавую, у локцях вышмуленую куртку, на доўгія валасы, што нерасчэсанымі, раскіданымі пасмамі клаліся на каўнер гэтай вельветавай курткі... Бяздумныя вырадкі! Нігілісты, дашчэнту прынятыя заморскаю транзістарнаю хваробаю! Як ён можа стаяць тут, на гэтым святым месцы, як можа глядзець на кветкі, прынесеныя сюды аднадумцамі мёртвых? Зараз, пад тыя дзікія мелодыі, што жывуць у яго ў галаве, ён пачне трэсціся і падрыгваць нагамі, на смех чытаючы прозвішчы, выбітыя золатам на граніце сцяны. Я намерыўся адразу ж даць волю свайму абурэнню, калі хлопец памкнецца зрабіць хоць нешта, падобнае на непрыстойнасць ці бестактоўнасць.

І я ўвесь насцярожыўся, бо хлопец яшчэ бліжэй ступіў да сцяны. Але ён стаў на калена, паправіў букет, што быў заціснуты другімі, выпрастаў галоўку цюльпана, трошку ўжо знясіленую, пералажыў яго ў больш вільготнае месца, выраўняў істужку вянка, загнутую ветрам, каб чыталіся словы. Разаслаў яе на далані і надоўга застыў, як бы молячыся ці даючы маўклівую прысягу.

Устаўшы, ён памалу пабрыў у завулак, угнуўшы сваю валасатую, такую нерасчэсаную, пакамлычаную і такую мілую галаву.

ЗАПРАШЭННЕ ДА ТАНЦАЎ

Як бы хацелася, каб некаторых учынкаў, што мы зрабілі ў нашым жыцці, не існавала.

Я працаваў у газеце. Аднаго разу нам перадалі, што ў тэхнікуме будзе вечар, на які запрашаюць і нас, хлопцаў з рэдакцыі.

Тэхнікум мясціўся далёка за рэчкаю. Трэба было перайсці вузкі, высланы каструбаватымі дошкамі мост, высока падняты над вадою, а тады пайсці доўгаю вуліцаю, павярнуць направа на другую такую ж доўгую і вузкую, у канцы якой стаіць старажытная царква. Вечар ляжаў цёплы, мяккі, змрок гусцеў шпарка, старыя купчастыя прысады вуліцу рабілі зусім цёмнаю. Нарэшце налева весела засвяціліся вокны тэхнікума, высвятліўшы і нізкі

фарбаваны плоцік перад імі, і кусты бэзу, і вышарганыя дошкі тратуараў, і выслізганае круглае каменне пукатага бруку. І вось дзверы ў залу, проста з цёмнага надворку на яркае святло — у цяпло чалавечых галасоў, кінутых насустрач позіркаў, усмешак, хваляванняў. На дзяўчатах строі, прычоскі; у кожнае нешта сваё, самае прыгожае, шчырае, і ты ўвесь поўнішся трапяткім і шчаслівым чаканнем...

На сцэне паказвалі драматычныя абразкі, дэкламавалі вершы, ладзілі скокі, спявалі песні — і на адзін голас, і дуэтам. Усяго патроху, цяпер бы гэта назвалі самадзейнасцю. Нарэшце заслона апусцілася, на краёк сцэны ўскочыў светлавалосы хлапчына ў вышыванай кашулі навыпуск, падперазанай поясам з кутасамі, спушчанымі з левага боку, і, выставіўшы перад сабою руку, крыкнуў:

— А цяпер — танцы!

У адно імгненне лаўкі і пазвязваныя між сабою ў пляцёнкі крэслы былі ссунуты да сцен, на сярэдзіне расхінулася шырокае гала. Нехта пры сцэне паставіў блакітны зэдаль, аднекуль узяўся і сеў на ім гарманіст. Па зале прайшлася першая трывожная хваля вальса; закружыліся пары.

Я таксама нагледзеў дзяўчыну. Пры сцяне, каб не надта замінаць руху, у тых састаўленых радком крэслах, сярод другіх, што чакалі, мабыць, свайго запрашэння, сядзела і тая, што спыніла на сабе маю ўвагу. У цёмна-вішнёвай сукенцы з брыжастым каўнерыкам, з чутачку прыўзнятаю каштановаю прычоскаю. На твары як бы нейкае здзіўленне ці стрыманая насцярожанасць. Тая прыгажосць, што асабліва падабалася мне. Яна сядзела, узлакаціўшыся на спінку пастаўленага перад сабою крэсла. Я падышоў і пашаноўна, як умеў, схіліў галаву і запрасіў на вальс.

— Я не танцую,— строга, і нават, як здалося, гнеўна сказала дзяўчына.

І адмова, і тон, якім яна была зроблена, мяне вельмі пакрыўдзілі. Міжволі я падумаў: калі б падышоў хлопец рослы, ладны, красун сабою, нябось, адразу паднялася б, а мне, вось такому, не надта здатнаму і паказному, калі ласка — асадзі назад. І захацелася гэтакаю крыўдаю і адказаць ёй.

— Ранавата ж вы фанабэрыі нахапаліся, цырымонная панначка,— сказаў я, знарок уставіўшы і грэблівую «фа-

набэрыю» і «цырымонную панначку», каб яна хоць праз гэта адчула, якое нядобрае і злое яе характво.

Увесь вечар я стараўся сябе супакоіць, але боль крыўды не патухаў. Час ад часу, кружачыся ў танцы з другімі, цяпер ужо без душы, усё роўна як адбываючы павіннасць, пазіраў я на тыя крэслы, дзе сядзела дзяўчына, і помсліва радаваўся, што сядзела яна адна. Гэтак ёй і трэба, думаў я, няхай цяпер нацешыцца сваім гонарам.

І вось настаў канец вечара. Гарманіст шырока расцягнуў мяхі, зайграўшы марша. Зала заварушылася новым рухам: разагрэтыя, разрумяненыя, шчасліва натомленыя, усе пачалі кіравацца да дзвярэй, сёй-той нават не паспеў яшчэ апусціць злучаных танцамі рук. Але я і цяпер непрыязна зірнуў на дзяўчыну. Яна не спяшалася, чакаючы, пакуль выйдуць другія.

І калі ў дзвярах заставалася ўжо некалькі чалавек, яна адкінула правую руку за спінкі крэслаў, дастала адтуль дзве мыліцы і, падставіўшы іх чорнымі цыратавымі галоўкамі пад пахі, апошняя пайшла з залы на сваіх нежывых нагах.

ЦНОТА

Перад выхадным днём мы трошкі паспяшаліся зняцца з работы, каб раней за другіх паспець у лазню.

І праўда, толькі што памылася жаночая брыгада, мы шумна ўварваліся ў прылазнік і пачалі напярэхваткі раздзявацца і разбіраць ра́жкі. І калі ўжо добрая палавіна нас была ў мыйным аддзяленні, на парозе паявіўся чырвоны і блішчасты ад поту механік і крыкнуў:

— Стойце, яшчэ не ўсе жанкі памыліся! Там жанкі яшчэ мыюцца, стойце!

Толькі цяпер мы ўбачылі, што дзверы ў парыльню зачынены. Гэта як сцебанула хлопцаў, яны загалёкалі, засвісталі, паднялі страшэнны вэрхал, радыя, што можна весела пасвавоіць. І кожнаму хацелася быць наперадзе ў гэтым свавольстве. Нехта крыкнуў ура, нехта на мокрай, слізкай падлозе пусціўся ўпрысядкі, нехта высока ўскінуў голас, сыпануўшы юрлівымі прыпеўкамі. Самы ж буйны вісус і раскол Міця Харчанка, рабаціністы і агніста-рыжы, па-мядзведжы валасаты і крываногі, з поўнаю ражкаю падбег да парыльні, немаведама дзеля якой рызыкі абдаў сябе ледзяною вадою і забарабаніў кулакамі ў дзверы:

— Гэй, красуні, адчыніце! Пусціце і нас пагрэцца!

Падбеглі і другія і пастараліся не адстаць ад свайго верхавода.

— Дарагія і харошыя жанчынкі, выходзьце да нас, весялей будзе!

— Адчыняйце, пакуль мы не ўзлаваліся!

— Мы ж тут вас так любім, што...

Вядома, кожны дадаваў якое-небудзь нядобрае ці слізкае слова, стараўся як мага вастрэй паказаць свой досціп.

Як гэта часта бывае — недзе глыбока ў сабе мы вельмі любім жанчыну, беражліва ў сэрцы носім яе вобраз, шэпчам ёй самыя патаемныя нашы словы, усё жыццё шукаем яе пяшчоты і ласкі. І як гэта часта бывае — на людзях мы можам учыніць ёй крыўду і самы вялікі боль. Можа мы баімося, што, іначай, прынізім свой мужчынскі гонар, думаючы, што мужчына — гэта толькі грубая, звярыная сіла. І можа, думаючы гэтак, не хочам паказаць перад другімі саміх сябе сапраўдных — чулых і добрых, здольных і кахаць, і скарацца. Хто яго ведае, чаму так бывае, толькі тут зухаватасць і свавольства пачалі пераступаць меру. Кожны лічыў за геройства прыдумаць якую-небудзь брыдасць, каб мацней абразіць тых, невядомых.

— Не трэба ўпрошваць, давайце высадзім дзверы! — не ўтаймоўваўся адзін.

— Навошта? Яны нікуды не дзенуцца, дзверы ж толькі адны,— раіў другі.

Ніхто не ведаў, колькі іх там, хто яны, і гэта яшчэ больш падбівала рызыкантаў. Нарэшце нехта прыдумаў яшчэ адзін спосаб пацехі:

— Запірай, Зміцер, адсюль дзверы на завалу!

— Правільна, а мы забяром іх адзежу. Во будзе кіно!

Не ўсім падабалася такая раз'юшаная дураслівасць. Тым больш што і было іх нямнога — чалавек чатырох,— тых рызыкантаў.

— Хлопцы, перастаньце, гэта ўжо не жарты, а хуліганства,— сказаў нехта з нас, каму ўжо было цяжка маўчаць.— Давайце адыдземся ад дзвярэй, адвернемся, а яны няхай пройдуць ды адзенуцца.

Гэта не памагло. Тады не ўтрываў Мігула Паўлік, заўсёды ціхі і пакорлівы хлапчына, Харчанкаў напарнік.

— Як вам не брыдка, што вы робіце! — сказаў ён, гледзячы ў Харчанкавы шэра-ледзяныя вочы.— Можа там каторая вам у маткі гадзіцца, а вы зубаскаліце!

— То няхай абзавуцца! — разрагатаўся Харчанка.

Але за дзвярыма маўчалі. Было аж нядобра ад такога глухога маўчання. Што яны там думалі? Чаго чакалі? Ім жа і папраўдзе няма куды дзецца, яны ўсё роўна павінны будуць выйсці праз гэтыя дзверы і прайсціся, як пад нажамі, пад цынічнымі і бессаромнымі позіркамі чужых воч.

Свавольства ўсё большала і брыдчэла. І раптам зашчапка там нясмела бразнула і дзверы прачыніліся. Сцяўшыся і прыкрыўшы грудзі рукамі, порстка выйшла адтуль дзяўчына. На адно імгненне яна спынілася, як бы злякаўшыся перад нейкай самай страшнай небяспекай, тады глыбока і адчайна ўздыхнула, нежывым, бязвольным рухам упусціла да долу рукі і, выпрастаўшыся і высока ўскінуўшы галаву, каб нікога не бачыць, пайшла на натоўп, не саромеючыся, што ўсім відно яе адкрытае цела, ногі, жывот, куточак мяккага ценю пад ім, дзярката настаўленыя, яшчэ зусім дзяўчачыя грудзі з сінявата-бледнай, ледзьве значной жылкай, што няроўна збягала недзе з-пад пахі к маленькаму, баязліва сцятаму, сунічна-дымчастаму сыску.

І натоўп расступіўся, заціх і закамянеў.

Дзяўчына прайшла, але імгненне раптам убачанага дзіва — чалавечай чысціні, хараства і цноты — яшчэ стаяла перад кожным, як дакор, што ім сёння бяздумна зроблена нешта вельмі нядобрае.

НОЧ

Толькі што вярнуўся з праходкі, думаў, што лясныя сцежкі супакояць, і вось сяджу за сталом, гляджу, як за акном калышуцца цяжкія яловыя лапкі, а сэрца не пакідае боль, не пакідае боль. Нашто і чаго я сюды прыехаў? Не, я ведаю, навошта і чаго прыехаў: думаў, што на гэтым далёкім лецішчы спакойна закончу праект. І вось паявілася яна...

Мабыць, усё жыццё чалавек нечага шукае і ніколі не перастае чакаць яго. Я думаў, што не маю права на гэта. Не ведаў, што і ў майго сэрца свае, мне не вядомыя законы.

Раніцаю я ўбачыў яе ў вестыбюлі, і майго прывітання яна пастаралася не заўважыць. Села да тэлефона і пачала скоранька набіраць нумар. Чакаючы, пакуль я прайду.

Учора я сказаў сабе, што сёння паеду адсюль. Што

мне нельга больш аставацца тут ні хвіліны. А сёння бачу, што гэтага зрабіць не магу. Часамі трэба быць і на папялішчы. На папялішча ходзяць, каб памятаць, што наўкруга ідзе жыццё. І што яго трэба любіць тым больш, чым яно цяжэй. І што боль — гэта таксама жыццё.

Іменна ўчора я адчуў, як скоранька агонь ператварыўся ў папялішча. І ўсё-такі мяне пацягнула туды. Ужо вельмі познім часам, між цёмнага лесу знаходзячы сцежкі напамяць, як злодзей, я пачаў пракрадацца да яе дома. Думаў, толькі зірну, як у яе акне гарыць святло. А потым — рвануў яе дзверы. У пасцелі яна чытала кнігу. Я ніколі не бачыў, каб гэтулькі пекнаты было ў твары ад зляканых воч. Адчайна са спінкі крэсла яна схапіла свой мілы, галубовымі гарошынамі ўсыпаны халат і заціснула яго ў скрыжаваных на гру́дзях руках. На ражку стала ляжаў забыты карабок папярос, стаяла глянцава-чорная попельніца з нервова прытушанымі недакуркамі ў ёй. Па пакоі плаваў пах нядаўняга дыму. Гэта было нова і нязвычна, бо мяне яна прасіла не курыць пры ёй. Мяне апанавала трывога.

Некалькі дзён таму назад яна першы раз сказала пра яго. Сусед па лецішчы, зайшоў пазнаёміцца. Адразу нагаварыў бог ведае колькі кампліментаў...

Яшчэ зусім нядаўна мы хадзілі з ёю на праходку. Выйшлі з лесу — адкрыліся ціхія восеньскія палеткі, далёка ўстаўленыя сціртамі ўжо счарнелага зверху сена,— і прылеснаю дарожкаю пайшлі да самай рэчкі. Божа, колькі ў сэрцы маім было вясны! Стройная, дасціпная, поўная нейкай адмысловай жаночай зграбнасці, уся насцярожаная жаданнем быць аддана чулай і разуметай, яна ішла то паперадзе мяне па забытай восеньскай каляіне, у пшанічна ласкавых, чуць кранутых хвалямі валасах, у белай кофтачцы, у цёмнай у меру вузкай спадніцы, і я любаваўся і яе стройнасцю, і яе маладосцю, і зграбнаю лёгкаю хадою, сам робячыся і маладым і як бы крылатым; то ішла са мною поруч, і я мог трымаць яе руку, адчуваць яе пададкую пругкасць, цалаваць пальцы, чутачку з насцярогаю паглядаючы на шырокі шлюбны пярсцёнак. Яна чытала Блока, яго поўныя гарачай смагі вершы, Маякоўскага, даўно ўсімі забытыя пародыі Архангельскага і яшчэ бог ведае колькі ўсякіх вершаў, чамусьці, як здавалася, самых найхарашэйшых і чымсьці як бы звязаных з яе такім загадкавым — з пушкінскай далечыні — і такім жадана-трывожным імем. Я ўспамінаў радкі з Ахматавай:

Мне дали имя при крещенье — Анна,
Сладчайшее для губ людских и слуха,—

у думках падменьваючы імя Анна неспадзеўна ласкавым і пявуча мілым Ідалія.

Але ўчора нешта перамянілася ў ёй.

— Я вас вельмі прашу, пакіньце мяне,— сказала яна ўчора.— Пакіньце мяне, я вас вельмі прашу.

Як жа я мог не заўважыць, што ён прыгожы, складны, такі прыемны чужому воку мужчына? Як мог не заўважыць, што яго машына часта стаіць каля яе дома? І толькі ўчора ўбачыў, што і яна зусім іншая. Мы пайшлі паглядзець на пчэльнік, выбраўшы светлую дарогу насустрач сонцу, але і ступала яна, і гаварыла неяк адчужана, жыла нечым другім, раптам стаўшы стомленай, і была вельмі рада, калі мы вярнуліся, улілася ў кампанію ахвоча і весела. Па дарозе я папытаўся, ці можна будзе калі-небудзь напомніць ёй пра сябе пісьмом?

— Калі ласка, Арсень Раманавіч,— сказала яна.— У мяне многа сяброў, якія заўсёды віншуюць мяне — і з святам, і з днём нараджэння.

Я дастаў запісную кніжку, каб яна напісала свой адрас, але яна сказала, што ў яе вельмі непрыгожы почырк і яна не хоча пакідаць яго ў маёй кніжцы.

Цяпер і гэта прыпомнілася мне, каб напоўніць душу яшчэ большай трывогай.

— Позна ўжо, Арсень Раманавіч, пакіньце мяне,— прасіла яна, прыгожая, стройная, спакуслівa чужая, прыкрываючы грудзі мілым лёгкім халатам.— Пакіньце мяне, я вас вельмі прашу...

І вось — і гэты нядбала забыты карабок папярос, і нервова ўмятыя ў попельніцу недакуркі, і пах нядаўняга дыму, і зляканы спалох, і просьба пакінуць яе,—усё гэта нядобрым хмелем кінулася мне ў галаву. Я ступіў да яе пасцелі і, нягледзячы на спалох і пратэст, схапіў яе галаву, знайшоў губы і пачаў цалаваць... Што рабілася са мною! Я не мог адарвацца, як бы ў тых губах была атрута...

Кароткае шчасце дакранулася да мяне. Як апошні прамень перад захадам сонца. За акном лес, ён паволі шуміць, як бы хочучы супакоіць мой боль, такі пакутлівы і такі жаданы, так даўно не знаны мною. І я не ведаю, як мне за гэта — праклінаць ці дзякаваць ёй.

У СТАРЫМ ДОМЕ

Яна адчыніла дзверы і сумелася. Перакінуўшы цераз руку плашч, на ганку стаяў чалавек і глядзеў на яе з трывожным чаканнем. Нешта знаёмае, але далёкае было ў паставе яго галавы, у адкрытым ілбе, у вачах, што глядзелі чутачку прыжмурана. Нарэшце, калі ён, як бы прызнаўшы, усміхнуўся — і яна адразу пазнала і гэтую ўсмешку, і паставу галавы, і манеру глядзець трошачкі спадылба.

— Кастусь! Няўжо гэта ты? Ну дык заходзь жа, заходзь, чаго мы стаімо. Божа мой, хто б мог чакаць!

І тут жа яна ўся замітусілася, успомніўшы, што не прыбрана, што на ёй хатні халат, раскіданая прычоска, на нагах пантоплі. Правёўшы ў пакой, сказала: «Пачакай, я зараз» і знікла ў бакоўцы, баючыся нават аглянуцца.

Ён азірнуў пакой. Здавалася, усё ў ім было так, як і некалі: старадаўняя канапа з патрэсканым скураным сядзеннем, два глыбокія крэслы, абабітыя калісьці яркім, а цяпер вышмуленым аксамітам, у адным кутку этажэрка з пакуль што паложанымі газетамі, часопісамі, у другім — пальма ў дубовай кадушцы з зацвярдзелым бляскам на шырокіх цяжкіх лістах. За вокнамі тыя самыя густыя кусты бэзу, ад якіх у пакоі як бы вечна спачывае зялёны халаднаваты цень. Усё гэта на яго дыхнула знаёмай даўняй утульнасцю. Толькі пісьмовы столік пры сцяне, з кнігамі і стосам вучнёўскіх сшыткаў на ім, быў тут новы і парушаў тую даўнасць.

Яна ўвайшла порстка, паружавелая, свежая, і ён здзівіўся, што ёй вельмі пасуе і гэтая жвавасць, і незнаёмая ў ёй папаўнеласць, і плацце спакойнага тону, што надало ёй строгую сціпласць, і прычоска, што невядома нават чым так ажывіла ўвесь твар. «Якая яна яшчэ маладая,— падумаў ён.— І якая прыгожая, я нават і не мысліў сабе».

— Дык чаго ж ты стаіш, сядай,— сказала яна.— Нават плашча з рукі не зняў, давай сюды. Я так рада, што ты зайшоў.

Яна павесіла плашч, паказала на крэсла перад канапаю, сама села ў другое, уціснуўшыся ў цень пад пальму, каб лепш было глядзець адтуль.

— Я так рада, што ты зайшоў. Проста не верыцца.

— Я ведаеш колькі шукаў цябе? Яшчэ ўчора прыехаў і пусціўся на вашу вуліцу. Іду і нічога пазнаць не магу. Я памятаў, што тут у вас, як у сяле: у кожнага свой дамок з дворыкам, з брамкаю, з агародчыкам, з вішнёвым

садам, як у даўнейшым мяшчанскім прыгарадзе. Аж тут панастаўлялі камяніц, разбудаваліся, усё і старое і новае перамешана. Я ішоў і баяўся, што не знайду ніякага следу.

— Бо ты ж даўно не быў тут.

— Колькі ж гэта мы не бачыліся? Гадоў з дваццаць, мабыць?

— Больш, Кастусь. Я цябе доўга не магла пазнаць.

— Але, я бачыў. І сам быў збянтэжыўся.

— Як жа ты тут аказаўся? Дзе жывеш? Што робіш?

— Знарок прыехаў. Быў на поўдні, лячыўся, адпачываў. А жыву ў Сібіры, там цяпер работы дай божа. Ну і падумаў: я ж тут, па нашых сібірскіх маштабах, зусім блізка, дай зраблю гэты крук.

Яна глядзела на яго твар, дзівячыся, колькі новых, незнаёмых рысак напісалі на ім гады. Лоб стаў большы, на ім смела падняліся залысіны, на скронях асцярожныя іскаркі сівізны. Вочы пасушэлі, навучыліся глядзець строга, яна пазнавала і не пазнавала іх бляск.

— Я так часта ўспаміпала цябе.

— Я доўга блудзіў, усё шукаў Гэлінага дома. Знайшоў адзін, але доўга не мог прызнаць: прыціснуты камяніцамі, ён стаў маленькі, адзінокі. І як бы не так стаіць. Той стаяў удоўж вуліцы, а гэты — упоперак.

— Упоперак ён і стаяў.

— Ну от бачыш, забыўся. Але, гляджу, ганак — той. Шырокі, зашклёны, ты ж яго памятаеш?

— Памятаю, Кастусь, яшчэ і як.

— Ну от, з гадзіну кружыў каля яго. Хацеў у каго папытацца, але падумаў: навошта? Усё роўна я ж ведаю, што яе няма.

Ён перачакаў, спадзеючыся, што яна скажа, тут ці не тут Гэля. Але яна прамаўчала.

— Ну, тады пайшоў шукаць цябе.

— Я вельмі рада, Кастусь. Я так часта ўспаміпала цябе.

Пасля яны сядзелі за сталом. Яна сабрала закуску з памідорамі свайго догляду, з маласольнымі гурочкамі, вяндлінай, паставіла пляшку віна, якое зберагала на самы дарагі выпадак. На дварэ ўжо быў вечар, даўно былі зачынены аканіцы, на ўсе лямпкі ў пакоі гарэла святло. Было ўсё перагаворана, успомнена, а ім здавалася, што яны яшчэ і не гаварылі.

— Памятаеш могілкі, гэта ж недзе недалёка ад вас? Увечары — таямнічасць, помнікі, агароджы, густыя кусты,

раса, і мы да позняй ночы любілі гуляць там. І нейкі хлопец часта круціўся каля вас, я ўжо забыўся, хто ён. Ён усё любіў бегаць навыперадкі.

— А помніш клуб Крэйнаса? Мы там ставілі «Паўлінку», і ты іграў Якіма Сароку?

— Ага. За Паўлінку была Гэля.

— Бо ты ж так хацеў. А яна ўпіралася. Каб не цалавацца з табою.

— А як першы раз сустрэўся з вамі, памятаеш? Вы ўдзвюх прыйшлі ў тэхнікумаўскі інтэрнат да нашых дзяўчат. Я нават не ведаў, што вы зналіся з імі. І я зайшоў да іх нечага і аж збянтэжыўся: стаіце вы, абедзве тоненькія, зграбненькія, здавалася, што ў вачах у вас свеціць сонца, мяне аж асляпіла. І Гэля ні з сяго ні з таго запрасіла мяне на вечарынку. Вядома, я адразу згадзіўся. Памятаеш тую вечарынку ў яе?

— Памятаю, а як жа. Таго вечара я ніколі не забуду.

— Ну вось. А пасля я ні дзень, ні ноч не знаходзіў сабе месца. Не мог без яе быць ні хвіліны. І аднойчы мы за нешта былі пасварыліся. За што толькі мы сварыліся, госпадзі! Якое самае найдрабнейшае глупства, а яна ўскіпіць, павернецца і пойдзе. Пасля не раз яна так рабіла. І я цэлыя дні прастойваў каля яе дома, каб дапільнаваць, калі яна выйдзе. І на вуліцы ўсё шукаў яе, думаў сустрэну. Пройдзе якая дзяўчына, хоць чутачку русявая, у лёгкай сукенцы, і я думаю, што гэта яна, даганяю. Зірну ў твар, божа мой,— пачвара! Тады ўсе мне здаваліся пачварамі. Пра цябе не кажу, ты была яе самая блізкая сяброўка, значыць, гэтак жа сама харошая.

Па вуліцы прайшла машына, мабыць, нечым цяжка нагружаная, ад яе натужнага гудзення тоненька зазвінелі шыбы. Каб перачакаць гэтае гудзенне, яны памаўчалі. Ён падняў келіх, адпіў з яго.

— Я ўсё памятаю, і вашы сваркі, і замірэнні,— сказала яна, счакаўшы.— Нічога не забыла. Не лёгка мне даваліся яны.

— І ўсё-такі гэта было хораша. Што хочаш гавары, а гэта было хораша, Зося. І той ганак, якога я сёння шукаў. Аднойчы мы доўга гулялі, я правёў яе дадому, і ў гэтым ганку мы яшчэ бог ведае колькі стаялі. А назаўтра я ўсё не мог даўмецца, чаму ў яе на губе чорная плямка. А калі дадумаў, то быў без меры шчаслівы. Мне хацелася, каб усе бачылі ў яе гэтую чорную плямку, каб усе ведалі, што гэта я цалаваў Гэлю.

— І гэта я памятаю, Кастусь. Я табе кажу, я ўсё ведала можа больш за яе. Нават памятаю, як ты запрасіў яе на вяселле, калі ў цябе выходзіла замуж сястра. Яна адна не паехала, сказала, каб ты запрасіў і мяне. Мы ехалі ў санях, зіма, мароз, усё чакалі, калі ж пакажацца ваша сяло. І баяліся, каб не паадмарожваць шчок, закрываліся так, што відны былі адны толькі вочы, і нам цяжка было рагатаць. І тады ты ўсю ноч танцаваў з ёю.

— Але, але. Памятаю. Яна вельмі лёгка танцавала.

— Яна ўся была лёгкая,— сказала яна раптам жорстка.— Усё ёй давалася вельмі лёгка.

Настала часіна, калі кожнаму захацелася пабыць з самім сабою. Маладосць, як бы яна ні была пражыта, ніколі не пакідае нас. Ад яе на ўсё жыццё мы нясём і свежасць, і шуканні, і трывогу душы, і ласку сэрца. І бясконца хочам яе паўтараць. З гадамі мы становімся мудрэй і кажам сабе, што цяпер бы нешта паправілі, нешта зрабілі іначай, але гэтая папраўка на мудрасць — толькі суцеха. Нічога не паправілі б, бо маладосць не любіць гатовых дарог. Можа ў тым і ўсё хараство яе, што яна вучыць нашу сталасць.

Ён папытаўся, ці не асталося ў яе фотакартак. З этажэркі яна дастала зацямнелы альбом з медзянымі зашчапкамі. Там былі пажылыя людзі — яе бацькі, сваякі, бабулі і дзядкі,— яны сядзелі ў строгіх позах з павыцягванымі на каленях рукамі; былі дзеці-сысункі на разасланых пялёнках, у мацярок на руках; былі сябры і сяброўкі, далёкія знаёмыя, парамі і ў гурце, цывільныя і ваенныя, у ватоўках і ў шлюбных строях, з позамі заліхвацкімі і млявымі. Яна спрабавала тлумачыць, што гэта за людзі, якая з кім ступень сваяўства ці знакамосці, але ён нецярпліва гартаў старонкі далей і далей. Нарэшце ўбачыў-такі яе. Ну вядома, вось такія былі ў яе і ўсмешка, і здзіўленыя вочы, і чутачку пухлявая ніжняя губа, і недаступная ласкавасць, і строгасць.

— Ты даўно бачыла яе? — папытаўся ён і загарнуў альбом.— Едучы сюды, у душы я спадзяваўся, што сустрэнуся з ёю.

— Даўно, Кастусь. Разы два яна прыязджала, але вельмі накоратка. Ну і нешта не зусім у нас ладзілася з ёю. Яна ж выйшла замуж, ты ведаеш?

— Ведаю. Мне здаецца, што я сам вінаваты ў гэтым. Каб я тады не паехаў...

— Не, Кастусь, мабыць, ты добра зрабіў, што паехаў.

— Чаму?

— Яна таго кінула.
— Ну што ж, бываюць няўдачы.
— Не, не кажы ты, Кастусь. Пасля гэтых няўдач было ў яе бог ведае колькі. З год яна пабыла адна, нікога і бачыць не хацела. Адале пачала як бы спяшацца, не разбіралася ні ў кім і ні ў чым. Як лёгка сыходзілася, так лёгка і пакідала. Я ж кажу, уся яна была лёгкая, мне было вельмі шкода яе. Яна стала нейкая бессардэчная, ліхая ў душы. Бывала, скажаш ёй: «Што ты робіш, Гэля, апамятайся», а яна здзівіць вочы, паверне плячом: «А што ж тут такое, калі яны мне не па душы».
Ён уздыхнуў, нахмурыўся, пагладзіў рукою лоб.
— А пасля тут паявіўся нейкі начальнік з торфу, з вырабатак. Пажылы ўжо, суровы такі, ні віду ў яго, ні складу. Бог ведае што сталася з ёю — паехала з ім. Жывуць недзе на балоце, пад Бабруйскам. Двое дзяцей у іх. Ну, прыязджала, зайшла да мяне на часінку. Я не бачыла, каб яна была шчаслівая.
Ён выпіў келіх да дна, падняўся, прайшоў па пакоі. Пагладзіў тугі пальмавы ліст. Зноў апусціўся ў крэсла.
— Ну добра, раскажы пра сябе, Зося. Я так і не папытаўся дагэтуль.
— Пра сябе... Што ж расказваць? Як бачыш, жыву адна. Муж загінуў у вайну, тут жа ў нас была партызанская зона. Я таксама была звязана з лесам, але выкруцілася, ніхто не выдаў. Выгадавала дзвюх дочак, і вельмі шчаслівая. Абедзве ўжо выйшлі ў людзі. Адна ў Ленінградзе жыве, замужам, інжынер. Другая ў Мінску, канчае кансерваторыю. Ты бачыш, які багаты ў мяне дом? А сама настаўнічаю, сваю работу люблю. Чаго ж мне больш хацець?
— А ў мяне сям'я не ўдалася, Зося. Ну, як табе сказаць: ёсць дастатак, пашана, ёсць жонка і сын, а шчасця няма. От я ў Сібіры, гадоў з дзесяць ужо, галоўным інжынерам, будую плаціны, электрастанцыі, а яны — у Маскве. І нішто нас не цягне адно да аднаго, нішто не звязвае, як чужыя.
— Гэта ж цяжка, Кастусь.
— Вельмі. А што ж зробіш?
Ён задумаўся, але, відаць, не над гэтым сваім горам. Нешта другое жыло ў ім. Прыжмураныя вочы не тужылі, а марылі. І паступова твар яго праясніўся, а на губы лягла ціхая ўсмешка.
— Не, усё было добра ў нас тады, усё было добра. Гэля

любіла мяне, я знаю. Калі я паехаў, яна плакала. І... я пасля ўжо дазнаўся, што яна вяла дзённік. І пісала ў ім пра мяне... Можа, каб я ведаў пра гэта раней, то ўсё было б інача́й.

— Ты пра многае не ведаў, Кастусь. Можа і добра нават.

Было ўжо за поўнач, калі ён зняў з вешалкі плашч.

— Ну, бывай здарова, Зося. Я сёння шчаслівы. Вельмі шчаслівы. Што пабачыў цябе, што мы пагаварылі. Можа калі сустрэнеш Гэлю — не злуй на яе. Перадай маё прывітанне. Скажы, што быў, хацеў яе бачыць. Яна ўсё зразумее...

Калі ён пайшоў, яна доўга яшчэ сядзела адна. Яна яшчэ як бы гаварыла з ім. Ты ўсё пераблытаў, Кастусь, ты нічога не ведаеш і не памятаеш, гаварыла яна. Не яна, а я плакала, калі ты паехаў. Не яна, а я запрашала цябе на вечарынку. І за ўсе вашы сваркі і прымірэнні перажывала не яна, а я. Ты не ведаеш і таго, з якім горам я паехала на тое вяселле, калі знала, што запрашаў ты мяне толькі дзеля яе. Ты кажаш, што каля нас часта круціўся нейкі хлопец. А не ведаеш, што ён два гады хадзіў за мною, а я на яго глядзець не хацела. І на другі ж дзень, як ты паехаў, выйшла за яго замуж. І не яна, а я пісала дзённік...

МЕСЯЧНАЯ НОЧ

1

На саменькім ранку дэпутатка сельсавета, не адчыняючы веснічак, крыкнула ў двор:

— Волька, ты дома? Выйдзі-тка сюды!

Двор быў невялічкі, відаць, толькі ўчора звечара чыста падмецены — на доле значны былі яшчэ палоскі ад веніка, туга зляжалыя за ноч. У канцы хаты — дрывотнік, а за ім — скіданы з аполкаў хлевушок. Карытца з дробненькімі слядамі парасячых капытоў каля яго. Да хлевушка прытыкае рэдзенькі пляцень, і за ім відна густая, лапушыстая блытаніна зялёных град. Адтуль жа сюды, на двор, весела дзівяцца тры высокія сланечнікі.

Волька выйшла з адчыненых сянец, відаць, сабраная на работу: у ботах, вельмі зграбных на яе нагах, у шарсцяной чорнай кофтачцы з дзвюма чырвонымі палоскамі

ўпоперак грудзей і ў лёгкай хустцы, завязанай вузлікам зверху, над самым ілбом, каб толькі не разбягаліся валасы. Яна зірнула на дэпутатку не вельмі прыязна.

— Ты мяне звала, Ганна?

— Але. Вазьмі чалавека на пастой. Экспедыцыя тут рабіцьме ў нашым сельсавеце, дык можа з месяц пажыць ім недзе трэба. Можа знойдзецца месца дзе прытуліць аднаго.

Поруч з Ганнаю стаяў чалавек — загарэлы, абветраны, у ватоўцы і ў аблавушцы з адным апушчаным вухам, вышмуленай і злямчанай, бо, відаць, не раз яна служыла і за падушку. Ён паставіў на зямлю невялікі, аздоблены бліщчастымі зашчапкамі куфэрак, зняў з пляча і прыставіў да плота трыножкі, такія, як бываюць у фатографаў, можа хіба толькі большыя, жаўтаватага дубовага колеру, з вострымі жалезнымі наканечнікамі. За плячыма ў яго вісеў рэчавы мяшок, не вельмі поўны.

— Ну што ж, хадзем,— сказала Волька, агледзеўшы чалавека.

Хата, відаць, будавалася да часу, няйначай як да яе збіраліся прыбудаваць ці нанава перасыпаць яе і павялічыць, ды так і забыліся. І ўсярэдзіне яна была невялікая, з нізкімі вокнамі. Спераду кухня, а за ёю на ўсю сцяну адгароджана бакоўка, вузкая і доўгая, як каморка. У гэтым кутку, што пры дзвярах, аж два акны — на вуліцу і ў двор; тут жа столік, накрыты махрастым абрусам, з вазонам кволага пакаёвага папаратніку на ім, і два крэслы. Далей, па сцяне, адзежная шафа, а за ёю, у глыбокім цяню другога канца,— ложак, засланы ружоваю капаю. І больш нічога. І больш як бы нічога і не трэба.

— Ну от,— сказала Волька, рассунуўшы фіранку ў гэтую бакоўку і паказваючы яе чалавеку,— будзем як-небудзь мясціцца. Там мой ложак, а тут адсунем столік і паставім тапчанчык вам. Ёсць недзе, валяецца на гарышчы. Бо больш нідзе і месца няма.

— А хіба вы адна жывяце?

— Адна.

— Гм...

Чалавек ступіў за фіранку, больш строга азірнуў бакоўку, як бы вымерваючы, ці стане тут той тапчанчык. Выйшаў на кухню і тут агледзеў, але лепшага месца, мабыць, не знайшоў, вярнуўся назад. Волька кінула вокам на яго кірзавыя боты, на картовыя штаны, павыцягваныя ў каленях.

— Уладзімір Навумавіч! — пазваў нехта з вуліцы.— Даганяйце нас, мы пайшлі!

— Ну што ж, няхай так,— сказаў чалавек, падагнаны гэтым крыкам, скінуў свой рэчавы мяшок, паставіў яго ў бакоўку і выйшаў.

Увесь дзень Волька рабіла ў полі з адчуваннем нейкага новага рупеску. «Эх, дакука на маю галаву»,— думала яна, аднак жа пад вечар скарэй пайшла дахаты. Злазіла на гарышча, дастала тапчан, выцерла яго, але ў хату не панесла. «Не вялікі пан, і сам паставіць». Агледзела, што на раніцу няма гатовых дроў, пачала калоць іх.

— Ого! — пачула яна за сабою голас.— Не, гэта не ваша работа. Давайце сюды!

Не пытаючыся, ён узяў з рук у яе сякеру і пачаў гваздаць палена за паленам. Яны разляталіся папалам лёгка, ахвоча, як лучына, нават з нейкім вясёлым звонам. Нават тыя кручаныя ды сукаватыя, што яна была паадкідала, і тыя трашчалі, рыпелі на суках, клычыліся, але ўсё роўна паддаваліся пад размашыстай, вострай сілай яго рук.

— Не трэба так многа, хопіць ужо,— сказала Волька.

— Як гэта хопіць? Не, тут вы ўжо мне не памагайце.

Волька пайшла ў хату, уключыла святло ў бакоўцы. Перастаўіла столік, пацiснула да шафы крэслы. Прынесла тапчан — якраз ён стаў ад сцяны да сцяны. Што ж паслаць? У яго ж нічога свайго няма. Недзе ў сенцах валяецца сяннік, добра, што да гэтага часу не вытрасла яго. Ну, а зверху што? Пастаяла, падумала. Уздыхнула і адразу як бы заспяшалася. З шафы дастала два прасцірадлы, навалачку, свежыя, з чуць халаднаватым палатняным пахам. Слала, а ўсярэдзіне нешта працівілася гэтаму: у сваёй хаце яна збірае пасцель чужому, невядомаму мужчыну. І раптам так стала горка на душы — дакуль гэта будзе цягнуцца? Скрозь, усюды — сама, адна. Спрахла б яно, такое жыццё!

2

Вельмі спустошыў яе душу Сцяпан.

На сяле ён паявіўся гады праз два пасля вайны, з рыжым чубам і з вечна гатовымі на вясёлую ўсмешку вачыма. Аднак тое, што ён паявіўся, заўважылі не па чубу і вясёлых вачах, а па песні. Аднойчы ўвечары яна праплыла праз усё сяло, ад аднаго канца да другога, дзе стаяў калгасны клуб.

Эх, дарогі, пыл да туман,
Халада, трывогі да сцяпной бур'ян,—

жалілася песня, агалашаючы разлегласць нейкім удалым адчаем. З гэтага часу песня звінела ўсюды — на полі, на дарогах, вечарамі і зранку,— усюды, дзе быў Сцяпан. Але песню гэтую любілі больш мужчыны, яна ім была радней, а Сцяпану хацелася другога — каб уздыхалі жанкі. І неўзабаве паявілася новая.

Пасею гурочі
Блізка над вадою.
Сама буду паліваці
Дробнаю слязою,—

зноў скардзіўся Сцяпанаў голас, кранаючы душу тугою і ласкавым болем. Увечары, калі Сцяпан быў на сяле, на песню збіраліся ўсе — хто паслухаць, а хто памагчы, але ўсё роўна Сцяпанаў голас быў самы высокі; тую «дробную слязу» ён выцягваў на самай танюсенькай валасінцы так, што можна было задыхнуцца. Выцягнуўшы апошнюю ноту і перавёўшы дух, ён, на ўсіх гледзячы і ўсміхаючыся, як бы гаварыў вачыма: «От як трэба спяваць. Хто яшчэ так выцягне, як я?» Што і гаварыць, самы першы хлопец на сяле быў Сцяпан.

Нельга сказаць, каб не закрануў ён і Вольчынага дзявочага сэрца. Толькі яна не падавала знаку, як бы не чула, як бы праходзіла міма, хоць ведала, што можа больш за ўсё дзеля яе і хоча выставіцца Сцяпан. Ёй было трохі і страшна і яго зухаватасці, і яго вясёлай ахвочасці да бегла́й чаркі, і таго, што вельмі да многіх гарнуўся яго падатлівы чуб. І можа міма ўсё яно і прайшло б, каб не той дурны вечар, калі яна даўжэй за ўсіх забавілася на сенажаці, вярнуўшыся па хустку, якую забыла пад кустом. Ужо добра змерклася, калі на лугавой дарозе яе абагнаў грузавік. Адтуль гукнулі, каб яна садзілася, грузавік прыпыніўся, але яна пазнала Сцяпанаў голас і крыкнула, што не паедзе. Машына пайшла далей, але Волька бачыла, як з кузава саскочыў Сцяпан.

— Ты думаеш, што я толькі вясёлы пустабрэх ды баламут? — ціха жаліўся ён па дарозе.— А не ведаеш, што ў мяне на душы. Ні дзень, ні ноч ты не выходзіш з мае галавы.

— А гуляеш з другімі, думаеш, я не ведаю? — папікнула Волька.

Непадалёк ад дарогі чарнела капа сена.

— Давай паседзімо ды хоць пагаворым з табою як людзі,— сказаў Сцяпан.

Што ж, не часта даецца паслухаць чужую споведзь. Сцяпан выскубнуў колькі ахапкаў сена, раскінуў іх па доле. Волька прысела. Сена было мурожнае, яно абдавала гарачым пахам і трывожна п'яніла.

— З другімі,— гаварыў Сцяпан.— А што мне рабіць, калі ты такая прынцэса, нават глядзець на мяне не хочаш. Зараз яшчэ папікнеш і за тое, што п'ю? А чаму, дык ведаць не хочаш? Тут дашчэнту сап'ешся, калі табе свет не міл.

Волька ўціскалася ў сена ад гарачага, блізкага дыхання. Сцяпан усё бліжэй і бліжэй спускаў над ёю свой чуб.

— Пусці, перастань,— гаварыла Волька, не даючы наблізіцца яго вачам.

— Я загіну без цябе, чуеш?

— Пусці, перастань. Не смей, кажу, чуеш! — паўтарала Волька, з усяе сілы адпіхваючы яго грудзі. І раптам задыхнулася і абхапіла за шыю...

Яны пачалі будаваць гэтую маленькую хатку, спадзеючыся, што, як адужэюць, паставяць новую, прасторную і светлую. Песні спяваць Сцяпан перастаў, пайшоў на цяслярку. Але ненадоўга хапіла такой самавітасці, яго цягнула пакрасавацца на людзях. Зноў пачуліся на сяле «гурочкі». Усё часцей і часцей Сцяпан пачаў прападаць аж за поўнач, ад работы адбіўся, дадому прыходзіў п'яны. І на самы той час, калі Волька хадзіла ўцяжку, ён злыгаўся з нейкім вербаўшчыкам і, весела ўсміхнуўшыся, махнуў аж у Карэлію. «Пачакай, зараблю грошай, вярнуся, і тады мы станем жыць з табою ўсім на дзіва»,— сказаў ён Вольцы. Волька яшчэ спадзявалася. Але вярнуўся ён праз паўгода нават без чамадана, у чым стаіць, зачарнелы і выпетралы — мабыць, усё ад тае ж гарэлкі. Яшчэ два гады прашлындаў, наймаючыся то ў сельпо, то ў прамкамбінат на якую беглую работу. Сноўдаўся, як сугней, зацяты і цёмны, ні сем'янін, ні работнік, як бы ў яго нават не было ні дачкі, ні жонкі. Волька ўжо добра ведала, што шчасця свайго яна не знайшла. «Лепш бы я была адна,— думала Волька.— Лепш бы ён мяне зусім пакінуў». Раптам ён знік і прыслаў пісьмо аж з-пад самай Залатой Тайгі. Цяпер ён пісаў, што збіраецца зарабіць на золаце, але Волька ўжо не верыла. Яна толькі баялася, каб ён, барані божа, папраўдзе не ўзяў ды зноў не вярнуўся. Не сябе ёй было шкода, а дачкі — навошта дзіцяці ведаць,

што ў яго такі бацька. Гэтак у трывозе пражыла Волька ўсе гады. Марынка пайшла ў школу, і тут нечакана адкрылася, што яна вельмі любіць музыку. У школе было піяніна, і каля таго піяніна яна прападала ўсе часы. Так бы яно можа і кончылася адною пацехаю, каб не прыехалі артысты даваць канцэрт. Яны паслухалі Марынку і забралі з сабою ў Мінск.

Ах, якая непрыветлівая стала гэтая хата, калі Волька асталася ў ёй зусім адна. «Да якога ж часу будзе гэта?» — пыталася яна ў сябе. Самае горшае было ў тым, што яна ведала, што сама вінавата. Хіба не бачыла яна, як заўсёды шукае, каб сустрэцца з яе вачыма, Ігнат Кутылоўскі? Хіба не перасцігаў яе на ўсіх дарогах Змітрок Азярыцкі, спагадліва намякаючы, што ёй адной цяжка — ні сена няма каму нарабіць на зіму, ні загадзя назапасіць дроў? Адзін удавец, а ў другога жонка-весялуха, толькі, мабыць, не надта весела ад гэтага было Змітру. Але Волька вельмі баялася таго, што зазнала за Сцяпанам, яна не верыла цяпер ні сабе, ні людзям.

3

Першыя дні Волька прыглядалася да новага чалавека. Вельмі ж ён быў лішні ў хаце. Яна даўно прывыкла да свае адзіноты, ведала, што яе дзень як пачнецца, так і пройдзе спакойна, а цяпер трэба было скрозь памятаць, што ёсць нехта чужы. Зранку яна старалася раней падняцца, з апаскаю глядзела на яго пасцель і скоранька адзявалася, пакуль ён не прачнуўся. Увечары рупілася прыбегчы загадзя дадому, як бы ў яе набралася там бог ведае колькі работы. Пакарміць парася, падаіць карову — гэта было няўзнак, але ж хацелася насвежа памыць падлогу, ухадзіцца за́відна ў хаце, паглядзець, ці ўсюды чыста, ці не пазаношваліся фіранкі. Ды падумаць, што згатаваць на сняданне, на абед, на вячэру. Усё ж такі гэта чужы чалавек, трэба, каб ён блага не падумаў.

Ён быў нейкі дзіўны. Найбольш маўчаў, як бы чым быў вельмі заняты. І толькі на трэці дзень папытаўся, калі яна паставіла снедаць:

— Скажыце, а як вас зваць? Што Волька, то я ведаю, а як па бацьку?

— А па бацьку і не трэба, мы да гэтага не прывучаны. Проста Волька, і ўсё.

— Добра. Тады вы і мяне так завіце — Уладзімір. Ну

восьmы і пазнаёміліся. А мне гэта падабаецца: працей і нават харашэй — цётка Волька, дзядзька Уладзімір. Праўда, трохі няёмка: так называць можна трохі старэйшага, а мы з вамі бадай што ў адных гадах. Але гэта дзела прывычкі: можна без цёткі і дзядзькі. Ну дык вось, Волька, сядайце снедаць.

— Ды я паснедала ўжо.

— Мала што! А мне аднаму нудна. Я не прывык без кампаніі. Сядайце, калі ласка.

Прыйшлося сесці. І з гэтага дня Волька за стол садзілася разам з ім.

Ён ішоў у поле на ўвесь дзень. Дазнаўшыся, што там яны нават не абедаюць, Волька давала яму з сабою кавалачак сала, пляшку малака. Ён перш не хацеў браць, але Волька нават не пыталася, клала ўсё гэта ў кішэню ватоўкі.

Іх было чалавек восем. Кватаравалі яны на сяле, у каго прастарней было ў хаце. Кожнае раніцы калгас ім даваў машыну, каб завезці на работу. У падмогу сабе яны панаймалі селавых хлапчукоў, і тыя яшчэ досвіткам чакалі іх каля сельсавета. У полі геадэзісты даставалі з куфэркаў тэадаліты, ставілі іх на ножкі, пачыналі ўдоўж і ўпоперак мераць палетак, а хлапчукі цягалі мерныя стужкі, забівалі ў зямлю колікі, кожны раз пераносячы іх на новыя гоні. Весялосці ў гэтым было не так і многа, але затое колькі гонару! Расказаць на сяле, што самі глядзелі ў тыя тэадаліты, хоць здалёк памарыць, што можа і самі стануць геадэзістамі,— гэта не жарты.

Увечары ён садзіўся працаваць. З палявое торбачкі вымаў доўгія лісткі паперы, паспісваныя і ўдоўж, і ўпоперак, і наўскасяк, раскладаў іх на стале і пачынаў чарціць. Волька ўжо ведала, што гэтыя вузкія лісткі называюцца а́брысамі, а тое, чым ён займаецца цяпер,— камеральнай работай. Усё, што ім зроблена за дзень там, у полі, з гэтага абрыса трэба перавесці ў чарцёж.

Папраўдзе ён быў вельмі дзіўны. Калі што рабіў, то нічога як бы і не бачыў. Сам сабе нешта шаптаў, сам з сабою раіўся. Вольцы было ў навіну глядзець на яго работу.

— Вось так, значыць: тут дарога, а тут ручаіна,— гаварыў ён з сабою.— Добра. Так і запішам: шаснаццаць-два... Дык вы робіце на таку? — тут жа пытаўся ён у Волькі, але адказу не чакаў.— А тут — трыццаць і чатыры... Ну і як ураджай?

— Ураджай сёлета добры.

— Так. А тут узгорак... Управіцеся самі?

— Ды ўправімся. Машын цяпер многа... Ну, а вось гэта, што вы чэрціце,— гэта таксама калгасу трэба? — папыталася Волька.

— Тут рэльеф мяняецца. Так. Кірунак адзінаццаць градусаў... Ці трэба калгасу, кажаце? — Ён зірнуў на Вольку, але ўсё роўна як бы не бачыў яе, гаварыў з некім другім.— Гэта найвялікшае гістарычнае глупства, якое паўтаралі з веку ў век ва ўсіх кнігах і вучоныя і невукі, што Беларусь — край балот, галечы, каўтуна і мякіны. Няпраўда! Хлусня! Наша зямля вельмі багатая, толькі не было каму, як добраму доктару, праслухаць яе. А калі праслухалі, дык сказалі: тут трэба будаваць вялікі горад.

— Як? У нас, у гэтай глушэчы, будзе горад? — здзівілася Волька.

— Ды яшчэ які! Шырокі, прасторны, сонечны, з садамі, з паркамі. Сюды панаязджае многа людзей — калі ласка, жывіце, працуйце і праслаўляйце свой край. Тут, у вашай зямлі, знойдзена столькі багацця, што яго хопіць на сотні гадоў.

— Нейкую няпраўду вы гаворыце. Мабыць, думаеце пасмяяцца з мяне.

— Не, Волька, не смяюся. Праўда. Тут будуць шахты, пастануць заводы, закіпіць работа. Словам, глушэчы вашае, як вы кажаце, больш няма. От як.

Ён нагнуўся над чарцяжом, як бы тут жа забыўся, пра што гаварыў. Вольцы стала раптам вельмі крыўдна. Зноў успомніўся Сцяпан. Куды, чаго ён паехаў у свет? Чаго яму тут не хапала? Чым ён даражыў і што бачыў перад сабою? Што і каго любіў? Толькі самога сябе. Нават не, і самога сябе не любіў — нікога. Ні людзей, ні работы, ні гэтага месца. Хіба ж не мог ён, як гэты чалавек, от так жыць, каб і другіх некуды зваць за сабою? Чужы, зусім тут невядомы, а от жа дбае, каб нешта добрае зрабіць на зямлі. Якая шчаслівая, мабыць, у яго сям'я. І жонка шчаслівая якая...

Волька ўздыхнула, зірнула на сваю хату. Каб не гэты чалавек, што схіліўся над сталом пад лямпкаю, выбіраючы месца, каб не падаў свой цень на чарцёж, дык хоць уцякай адсюль. Яна ўспомніла, што нанач няма вады, бразнула вёдрамі.

— Чакайце, што вы робіце — дайце сюды!

Ён не даў Вольцы пайсці. Узяў з рук вёдры і пайшоў

сам. А вярнуўшыся, панёс іх цераз усю хату, паставіў каля стала і сеў за работу. Волька ціха перанесла іх у мыцельнік.

— Дык от, і вы будзеце жыць у тым горадзе,— сказаў ён, як бы і не было перапынку ў гаворцы.— Толькі шкода: ніхто нават і не ўспомніць, што той горад пачынаецца ад нас. Ад гэтых вось чарцяжоў.

— Добрых людзей ніколі не забываюць,— сказала Волька.

Толькі цяпер ён як бы ачуўся і здагадаўся, што перад ім Волька. Падняў галаву і здзівіўся, што першы раз бачыць яе рукі з роўным тугім загарам, карсаж спадніцы на жываце, грудзі, гатовыя да нейкага ўпартага, дзёрзскага бунту, і... сустрэўся вачыма.

— Ну, хопіць,— сказаў ён, згортваючы чарцёж.— На сёння хопіць... Я вас не разумею, Волька. Не разумею, чаму вы жывяце адна. Гэта нядобра. І несправядліва.

— Што ж зробіш. Не ўсім роўна выпадае шчасце. А пра гэта гаварыць не варта,— сказала Волька і пайшла ў бакоўку.

4

Ён жыў ужо тры тыдні. Неяк зранку, прыбіраючы ў хаце, Волька наткнулася на яго мяшок, наспех кінуты пад тапчан. Хацела прыбраць яго далей, але зверху пазнала сарочку, якую ён сёння, мабыць, перамяніў. Яна падумала, што нядобра поркацца ў чужых рэчах, але тут жа выцягнула тую сарочку, перабрала і другое, што было ў мяшку. Збегала да Дубоўскай Кацярыны, папрасіла, каб яны на гумне на якую часіну абышліся без яе, бо яна трошкі запозніцца. Памыла гэтую кашулю, майку, насавыя хустачкі, развесіла на вяроўцы, нацягнутай цераз двор, каб яны скарэй прасохлі на ветры. Яшчэ сыраватыя адпрасавала, згарнула, палажыла стосікам на тапчан паверх коўдры.

У гумне рабілі бадай што адны жанкі. Па ўсім таку яны паразбіраліся на купкі — каму хто бліжэй па сэрцы. Варушылі зерне, каб яно падсыхала, равейвалі, сартавалі. Зерне ляжала кучамі — сыпучае, ядранае, цяжкае, ад яго пахла гаркавым халаднаватым пылам.

Калі Волька прыйшла, яе напарніцы — Дубоўская Кацярына і Лісавета Азярыцкая — адпачывалі, чакаючы новай машыны з поля.

— Садзіся, звенавая, аддыхні,— сустрэла яе Кацярына, лежачы ў зерні.

— Як жа мне аддыхаць, калі я яшчэ не нарабілася.

— Ат, у цябе цяпер работы многа,— весела паспачувала Лісавета: нехта ўжо бачыў, як у Вольчыным двары сушылася бялізна.— І абмыць, і накарміць, і самога дагледзець.

— Ну дык ён жа адзін, хто ж яму зробіць,— хацелася апраўдацца Вольцы.

Лісавета любіла гаворку смачную. Яна выцягнулася па ўсёй кучы зерня, уплыўшы ў яго, раскінуўшы рукі. Аблёгшы, плацце вылепіла ўсю яе фігуру.

— Нарэшце і ты дачакалася, Волька. Уся ночка твая,— дадала яна і хрустка пацягнулася.— Эх, люблю, калі любяць.

— Ну і як ён — нішто? — хітра бліснула вачыма Кацярына.

Вольцы было брыдка ад такой гаворкі. Але на злосць захацелася, каб яны верылі ў няпраўду, каб хоць раз пазайздросцілі ёй.

— Харошы чалавек,— сказала яна.

Лісавета, рэзка махнуўшыся, села. Спалохана разбырзнуўшыся, зярняты кучкаю сабраліся ў жалабку яе прыполу.

— Але ж ён не вечна будзе тут,— сказала яна.— От кончыцца работа — і паедзе. А можа твой тут астанецца?

— Чаго ж яму аставацца. Ён жа пры службе.

— Мала што. Трэба ўмець прываражыць. Эх, не на мяне ён нарваўся — прысох бы.

Прыйшла машына, ссыпала зерне і паехала зноў у поле. Насустрач ёй ішла другая, натужна гудучы. З узгорка адсюль далёка відна была разлегласць — поле густых спелых жытоў, сярод якіх усё як бы блудзілі і ніяк не маглі сустрэцца адзін з адным два камбайны, справа — тарфяныя распрацоўкі, парэзаныя чорнымі канавамі, а злева — паплавы і за імі чубок сіняга лесу. Недзе пад тым лесам і ходзіць ён увесь дзень...

Увечары ён ужо быў дома, калі Волька вярнулася з работы.

— Што ж вы мне нарабілі, Волька? — За фіранкаю відно было, як ён стаяў на калене, завязваючы мяшок.— Я сам збіраўся заняцца гэтай санітарыяй, нават раней дадому прыйшоў.

— Навошта ж вам гэта рабіць?

— Ну а як жа? Я так прывык.

— Мала што. У вас работы хапае. А мне брыдка было б. Волька зняла кофтачку і якраз збіралася павесіць яе на цвік, як пачула, што ён дакрануўся да яе плеч. Яна сцепанулася і застыла. Божа мой, як пранізаў яе гэты дотык.

Ён, мабыць, сам адчуў гэта і сумеўся. Рукі яго толькі на адну хвіліну затрымаліся на плячах і, як бы падумаўшы, паволі апалі.

— Вельмі харошая вы, Волька. Дзякую,— сказаў ён.

5

Волька і сама ведала, што будзе ён тут не вечна. І вось ён не прыйшоў. Яна доўга не прымала са стала вячэры. Ну што ж, можа дзе затрымаўся з сваімі людзьмі, а можа ў сельсавеце, бо яны ж часта туды заходзяць. Выйшла на вуліцу — ого, дык жа зусім позна ўжо, ні ў кога нават няма агнёў. Прайшла да сельсавета, але і там у вокнах было цёмна. А вуліца заліта месячным бляскам, і так ціха-ціха ўсюды. Яна вярнулася дадому і, не прыбіраючы са стала, патушыла святло.

Проста дзіва, як гэта яна дасюль і не знала, што так нядобра і вусцішна ў хаце, калі ў ёй нікога няма. Ці можа гэта ад месяца? Ад гэтай мярцвянай віднаты? Яна раздзелася, як за гэты час прывыкла, скоранька складаючы ўсё на крэсле за шафу. Лягла ў пасцель, але так і не магла замгнуць воч. Закінуўшы рукі за галаў, глядзела, як па столі ходзяць, то блекнучы, то гусцеючы, цені. Мабыць, па небе снуюць воблакі. Паплылі, чапляючыся адзін за адзін, успаміны. То Кацярына з Лісаветаю на зерні, то той далёкі чубок лесу за паплавамі. Чамусьці падумалася, што і цяпер ён там. Раскладзена вогнішча, і ён сіліцца заснуць, укрыўшыся з галавою пад тою ватоўкаю.

Пасля думала пра дачку. Гэтая думка цягнулася доўга. Хацелася ўявіць, што там за лагер гэты Артэк, куды яе паслалі са школы як лепшую піянерку. А тады хацелася ўявіць яе ўжо дарослаю, як яна будзе іграць перад людзьмі, са сцэны, але гэта ніяк не ўдавалася. Бо гэта абавязкова быў горад, нейкі далёкі, вялікі горад і вялікая зала, і поўна людзей, і воплескі, і толькі далёка на сцэне яе Марынка кланяецца, і так далёка, што яе нават не відно. Толькі відно, што яна шчаслівая, бо інакш не было б так поўна воплескаў...

Недзе забрахаў сабака, і ўсе думкі абарваліся. Волька спужалася, успомніўшы, што яна адна. Раптам здалося, што за акном па вуліцы нехта прайшоў і шаснуўся ў браму. Волька ўскочыла і кінулася к акну. А што, калі, не дай божа, гэта Сцяпан? Яна аж амярцвела. Але на вуліцы было ціха, зусім ціха, як гэта ўжо бывае пад раніцу.

6

Прыйшоў ён праз два дні.

— Ну от, мабыць, мяне і не чакалі ўжо?

— Дзе ж гэта вы так запрапасціліся?

— Начавалі ў тым сяле, што за ляском. Далёка мы ўжо зайшлі, адтуль нам куды зручней хадзіць. Прыйдзецца пераехаць.

— Ну што ж, такая ваша служба.

Ён хадзіў па хаце: наперад — назад, наперад — назад, як бы ўжо спяшаўся.

— Але, служба не надта вясёлая. Зіму на месцы, а як толькі сышоў снег — так і ў поле. Эх, колькі я сваімі нагамі папамераў зямлі! І ўсё-такі люблю сваю работу.

— Што ж тут любіць? — не згадзілася Волька. Але куды больш хацелася сказаць пра другое. Дазнацца пра больш важнае.— Так можна і сям'і адцурацца,— сказала яна.

— Не, любіць ёсць што. Сонца, вецер, лясы, прасторы — уся прыгажосць зямлі з яе раніцамі і вечарамі, росамі і дажджамі скрозь на тваім веку. А колькі харошых людзей пабачыш! І прывыкнеш да іх. От мне і вас шкода пакідаць, Волька. А сям'і, на жаль, у мяне няма.

— На людзях вы ўсе так гаворыце.

— Не, не на людзях. Толькі летась жонка пакінула. Я скрось не дома, ёй трэба весялейшае жыццё. Весялейшы, ведама, знайшоўся лёгка. Ну і бог з ёю, яна можа і правільна зрабіла.

«Дык і ў яго не так добра, як я думала,— здзівілася Волька.— От як можна ашукацца».

Сёння ён не сеў за стол працаваць. Паскладаў усё ў сваю палявую торбачку, павесіў на цвік, каб была напашэве на раніцу. Мяшок таксама паставіў каля сцяны. Волька пайшла спаць, а ён усё хадзіў па кухні, як бы на астатак яму трэба было нешта дадумаць.

Нарэшце і ён выключыў святло.

І сёння была такая ж месячная ноч. Волька ўсё бачы-

ла ў бакоўцы — крэслы, стол, вазон кволага мяккага папаратніку, цьмяную пляму сука ў бэльцы на столі, нават даччыну картку на сцяне. Толькі ў яе кутку было цямней, можа таму, што засланяла шафа.

Волька бачыла, як ён увайшоў. Мабыць, думаючы, што яна ўжо спіць, ён увайшоў асцярожна, стараючыся не рабіць груку. Памацаў пасцель, адгарнуў коўдру, скінуў кашулю. Пастаяў крыху і падышоў да акна. Адсунуў фіранку, узлакаціўся на падаконнік і пачаў глядзець на вуліцу. У месячным святле відно было нават, як лоб яго ўціснуўся ў шыбу.

Доўга глядзеў. А тады падышоў да тапчана, падумаў і — павярнуўся. У Волькі захаладала сэрца: здалося, што ён хацеў ступіць да яе. Але не — лёг. Волька глыбока ўздыхнула.

— Не спіце яшчэ, Волька?

— Не.

— І мне спаць не хочацца.

Волька маўчала.

— На вуліцы хоць іголкі збірай,— гаварыў ён.— У такую ноч мне хочацца некуды ісці — хоць на край свету. Ісці і ісці, а наперадзе нешта вусцішнае, невядомае, і ўсё нечага як бы чакаеш. І нешта ўсё хочаш зразумець. Люблю, калі думаецца.

— А я баюся такой ночы. Вельмі трывогі многа. Асабліва калі адна.

— Ну, але, але.

«Няўжо ён хацеў падысці? — думала Волька.— Ці можа мне толькі здалося? А што б я рабіла, каб ён падышоў?»

— А мы з вамі так ні разу і не пагаварылі.

— Яно можа і лепш. Ды няма чаго мне і расказваць.

— Ну, гэта няпраўда. У кожнага чалавека — гэта ж цэлае жыццё. І каб не было чаго гаварыць.

— Пра мяне вам, мабыць, другія расказвалі.

— Ды расказвалі. Ён — вернецца?

— Не дай божачка, каб вярнуўся.

Ён уздыхнуў. На месяц, мабыць, набегла хмара — раптам цёмная хваля праплыла па бакоўцы, як бы жывая: перш пакаўзнулася па падлозе, а тады паднялася вышэй, закрыла столь, сцены, вокны. Мяккая, густая, нават, здавалася, чутно было, як яна кранулася твару. І адкацілася. Зноў стаў відзён яго ложак.

«Што б я рабіла, каб ён падышоў? — зноў пыталася ў

сябе Волька.— Прагнала б? Не, нічога не магла б я зрабіць з сабою. Няхай бы так і было».

— Падабаецца мне ваш старшыня. Разоў колькі прыязджаў да нас, талкавіты, відаць, чалавек. Ужо думае, як яму павярнуць гаспадарку, калі стане тут горад. Трэба ж, кажа, падумаць, што тут будзе многа людзей. Мне ж іх карміць прыйдзецца, кажа.

— Добры чалавек. Мы самі рады, што яго выбралі.

За вокнамі плыла ноч, а яны гаварылі і гаварылі так, як гавораць на розвіт, успамінаючы то адно, то другое, часамі нават нічым не звязанае. Або нават маўчалі.

— А вам не нудна без дачкі, што нават і ўлетку не бачылі яе?

— Нудна. Да школы яна вернецца яшчэ, пабудзе крыху ў мяне.

Зноў памаўчалі. Як бы слухалі цішыню.

— Хлапчукі вашы ўсё просяцца, каб мы іх пакінулі з сабою. Вельмі шустрыя хлопцы. Але дзе ж ім хадзіць адсюль такую далеч? Прыйдзецца там новых наймаць.

«Ніколі не думала, што і ў яго можа быць такое гора ў сям'і. Што ж там за жонка ў яго, вільня нейкая?»

— А вы яе вельмі любілі? — асмелілася папытацца Волька.

— Любіў.

— А каб вярнулася — падаравалі б?

— Яна не вернецца.

Ціха. Ідзе і ідзе час. На кухні ходзікі вельмі роўна адлічваюць ноч. Нехта прайшоў па вуліцы. Удваіх. Нават чутно было, як яны шапталіся.

Ну от, заўтра ён і пойдзе. А яна зноў астанецца адна. А хто ж ён ёй? Ніхто. Чужы чалавек, і толькі. А от жа астанецца нешта ад яго добрае. Такое, што пасля будзеш успамінаць і сумаваць па ім. І чакаць...

Ён, мабыць, ужо спіць. А можа думае што. Маўчыць. Ці гэта ўжо досвітак, ці месяц так ярка свеціць? Усё, усё віднюсенька. Яго боты пры дзвярах, на крэсле — кашуля. Коўдра на ім, са звешаным ражком у нагах. Краёк прасціradла, пакамечаны, апушчаны ўніз. На жоўтай падлозе пазы між дошак і цемнаватыя кропкі цвікоў.

— Вы не спіце яшчэ, Волька?

— Не, Уладзімір.

Апушчаны ўніз краёк прасціradла паварушыўся. Зноў у грудзях у Волькі стала цесна... Але не, ён толькі паправіў коўдру.

— Добрай ночы.

— Добрай ночы...

Ідзе і ідзе час. Па доле праходзяць то густыя цені, то хвалі святла. А Волька не спіць. І не можа заснуць. Дый ён, закінуўшы рукі за галаў, глядзіць у акно, так што нават відно, як блішчаць яго вочы.

НЯМІГА

Звычайная праходка па горадзе. Сакавік семдзесят пятага года. Паўз Тэатр оперы і балета, цераз парк з помнікам Марату Казею. Потым па Інтэрнацыянальнай, паўз «Журавінку», гэтую сімпатычную кавярню, назву якой прыдумаў не менш сімпатычны Іван Шамякін. А за ёю Гандлёвая вуліца. Зірнуў на яе і зарадаваўся: аказваецца, яе ломяць. Дамы з паздзіраным, іржавым жалеззем дахаў, з павыстаўлянымі вокнамі, з апусцелымі дварамі. Божухна, як я рады, калі бачу, што нешта ломяць! Гэта значыць, што будзе ставіцца нешта новае, па-сёняшняму свежае і, ведама, найхарашэйшае.

Гэтак я хадзіў і радаваўся, калі ламалі Нямігу. Не, няпраўда, перш трывожыўся і смуткаваў. Але папярэдзе было пісьмо ў высокую ўстанову з просьбаю зберагчы яе як летапісны помнік, як музей, як адзіную гістарычную мясціну, што асталася ў Мінску ад вайны. Пісьмо тое разам з другімі падпісаў і я. Потым пачаў яшчэ часцей хадзіць на Нямігу. З трывогаю, нават з болем: як памагчы ёй ад немінучага згінення? Тут жа, пад вуліцаю, узятая ў бетонныя трубы, цячэ колішняя, у летапісах упомненая рэчка, на якой, як мяркуюць, прайшла Нямігская бітва 1067 года. Гэтая дата і лічыцца днём нараджэння Мінска, хоць фактычна, напэўна, ён заснаваны ў куды ранейшых, невядомых лясных вяках. Кажу лясных, бо не ўяўляю сабе старажытнага Мінска інакш, як сярод глухіх бясконцых лясоў, часамі забалочаных, знакам чаго аж да апошняга часу аставаліся Татарскія агароды.

Прадчуваючы немінучы скон Нямігі, я і хадзіў на яе бадай штодня. Вузкая, па колішнім рэчышчы выгнутая вуліца, нізкія, па вокны ўсмоктаныя ў зямлю дамы, глухія брукаваныя двары, што відны за скляпеністымі, умураванымі між дамоў брамамі. Тут нават у паветры як бы цур-

чыць старадаўнасць, нават гаворка нейкая іншая, раздумна-павольная, як бы прыглушаная вякамі.

І аднаго разу, прыйшоўшы сюды, за таўсматым будынкам колішняй сінагогі, перарobленым у сховішча архіва, бадай што на самым пачатку вуліцы я ўбачыў як бы сапраўдную чалавечую рану: палавіна дома, нягледзячы на сцяжы і падпоркі, адкалолася і аб'ехала ўніз кучаю мяккае, сапрэлае гліны, а сцены з краёў, дзе прайшоў разрыў, чырванелі як бы свежым, парваным мясам і абцякалі крывёю...

На тое пісьмо быў адказ, зроблены на падставе археалагічна-архітэктурных доследаў: што Нямігі зберагчы нельга, што лепш і разумней забудаваць яе нанава як вуліцу найноўшай перспектывы, а на музейны куток пакінуць вуліцу Мікалая Астроўскага, сёе-тое ў ёй нават дабудаваўшы пад старажытнасць. Я пачуў, што адказ праўдзівы, і ўжо з новым усведамленнем непазбежнасці пайшоў на Нямігу. На свае вочы я ўбачыў, што і папраўдзе ёй трэба памагаць калі не ў абароне, то ў паміранні. Я разумеў гэта па-чалавечы спагадліва, але ўсё роўна як бы чуў маўклівы голас дакору: што занадта рана адмаўляюся ад свайго подпісу.

І я, прымірыўшы сэрца, стараўся як бы спакойна глядзець, калі наехала на Нямігу поўна тэхнікі, і яна, равучы і скрыгочучы, падымаючы пыл і гаркава-салодкі пах цвілі, пачала пляжыць і мясіць раптам апусцелыя і такія сіратліва-сцішаныя і спалохана-прыземленыя дамкі.

Мне ўспомнілася Плошча Леніна. Лепш кажучы, тая мясціна, дзе пасля лягла спакойна-разумная плошча. Там таксама завіхалася тэхніка, асабліва каля дома, у крамяную чырвань якога ўпіраўся праспект. Я загледзеўся на экскаватаршчыка, машына якога ў рабоце проста шалела, ад яе не паспявалі ад'язджаць напакаваныя грузавікі. На імгненне нашы вочы сустрэліся, экскаватаршчык зухавата міргнуў мне, я кіўнуў галавою, як бы сказаўшы «ну, брат, і здорава ж!», і жэстам паказаў, што хацеў бы сесці да яго ў кабіну. Высыпаючы чарговы коўш, ён на нейкую хвіліну даўжэй затрымаў яго над кузавам грузавіка, і гэтага мне хапіла, каб апынуцца на цыратавым сядзенні каля яго.

Нешта я ў яго пытаўся, нешта ён мне адказваў, за рухам і грукатам нельга было разабраць слоў, я круціўся разам з ім у кабіне, перад маімі вачыма мільгалі то куча раструшчанай цэглы і рог неразбітай сцяны, то напятыя

жылы тросаў, падняты ў паветра коўш, твар шафёра, што падганяе пад яго новую машыну. Я трапіў у свет нейкага імклівага, прыўзнятага хараства, ад якога займала дух.

Не ведаю, колькі часу цягнулася б маё такое ўзнёслае ўтрапенне, каб не чалавек, што паявіўся ў полі зроку і даў знак экскаватаршчыку спыніцца. Ён кінуў строгі позірк на экскаватаршчыка, далікатна мне растлумачыў, што я парушаю правілы тэхнікі бяспекі, і далікатна папрасіў пакінуць кабіну.

— Ведаеце,— сказаў ён, адвёўшы мяне ўбок, каб мы не зіналі бясконцаму тут руху і грукату,— работа ўдарная і вельмі спешная, на экскаватары наш лепшы машыніст, ён астаўся рабіць на другую змену і нават, здаецца, дзеля весялосці трошкі ўзяў. Так што...

— Я таксама трошкі ўзяў,— сказаў я весела, каб апраўдаць і свой узнёслы настрой, і экскаватаршчыка, і ўвесь гэты грукат і шаленства руху.— Дзякую,— сказаў я.— І яму, і вам.

Дома на мяне зірнулі і ахнулі. Я пайшоў на праходку ў белым ільняным гарнітуры, нядаўна купленым, святочным, ён быў увесь абляпаны мазутам.

— Скідай,— сказала Ганначка,— і можаш купляць сабе новы. Гэтага я ўжо ўсё роўна не дачышчуся...

Там быў у мяне зусім іншы настрой. Там знішчаўся звычайны, ацалелы куточак местачковага Мінска. А тут жа Няміга! І хоць я разумеў непазбежнасць, а боль шкадавання усё-такі не патухаў. Гэтыя два пачуцці — непазбежнасці і шкадавання — жылі ў мне разам. Наогул, бадай што заўсёды, калі да мяне дакранаецца нешта важнае, на роўным праве жывуць у мне два пачуцці — яны павінны змагацца, турбаваць і трывожыць мяне.

Ад Нямігі асталося толькі тры дамы на правым баку колішняй вуліцы, на іх вокнах зяркала бялелі накрухмаленыя фіранкі. Але я прыходзіў сюды ўжо толькі як бы глядзець успаміны. Вачыма памяці я бачыў, дзе была крама з кашулямі і гальштукамі; тут я набыў цёплую робу ў клетку, па падыспадзе каўняра якой было вышыта «Moda polska», і ў ёй вельмі зручна я адчуваў сябе за рабочым сталом. Далей ішла аптэка, маленькая, цесная, але ў ёй заўсёды можна было знайсці патрэбныя лекі. Потым стаяў камісійны магазін; мы з Ганначкаю сюды няраз прыходзілі, шукаючы то добрага жакета, то туфляў, то яшчэ

якога абуцця ці адзеўку. Пасля была крама ўжытковых тавараў, сярод якіх я памятаў толькі гузікі, панашываныя як прымернікі на жоўтых кардонках. У прадуктовым магазіне купляў арэхі-фундук, якія любіла наша Галачка, калі вучылася ў школе. Недзе тут жа ў глыбіні двара, сціснутага мураванкамі, стаяў нізкі драўляны дамок з мемарыяльнаю шыльдаю, прыбітаю на выцвілай шалёўцы. Шыльда расказвала, што ў гэтым дамку жыла сям'я Герасіменкаў, і ў часы нямецка-фашысцкай акупацыі тут была явачная кватэра падпольшчыкаў. Я прыходзіў сюды няраз, мяне цягнула патрэба хоць уяўленнем апынуцца ў атмасферы, дзе кожны крок барацьбы з'яўляўся гераізмам. Подпольшчыкамі ў Герасіменкаў была ўся сям'я, нават малалетняя дачка Люся. Яна наглядала за кватэраю, калі ў бацькі збіраліся аднадумцы, перадавала, куды трэба, медыкаменты, пераходвала падпольную літаратуру. І калі ўсю сям'ю арыштавалі, Люся ўпоравень з дарослымі гераічна перанесла ўсе здзекі і катаванні, разам з дарослымі, з мацераю яе кінулі і ў душагубку.

Потым, недзе з правага боку, пачыналася Віцебская вуліца, і недзе адразу за рогам мясцілася на ёй майстэрня, у якой я, набыўшы машынапіску, мяняў нямецкі алфавіт на беларускі. Потым у машынцы лопнуў валік, і я прыходзіў сюды пытацца, ці можна памагчы бядзе. Дадому да мяне прыйшоў сімпатычны хлапчына, ён памяняў валік, перачысціў і змазаў аліваю ўсю машынку і не сказаў, колькі за ўсё гэта я маю яму заплаціць. Памятаючы, як нячэсна абышоўся са мною перастаноўшчык шрыфту, я вельмі непрыязна зірнуў і на гэтага хлопца і расплаціўся скупа. Я думаў, хлопец запратэстуе, але ён пайшоў, нічым не паказаўшы, што мой учынак нялюдскі. Праз які час я пусціўся шукаць яго, каб паправіць памылку, але аказалася, што майстэрня пераехала недзе на трактарны ці аўтамабільны завод, хлопцаў след знік.

І вось па немалым часе я зноў рабіў сваю вечаровую праходку. Ад Старажоўскае вуліцы, па Горкага, паўз Тэатр оперы і балета, міма даволі ладнага дома, на якім прыбіта мармуровая шыльда з паведамленнем, што ў ім нарадзіўся Максім Багдановіч, у што я не веру, бо гэта няпраўда. У той час, калі на свет паявіўся Багдановіч, тут маглі стаяць толькі вясковыя дамкі, нават не дамкі, а хаткі, і надпіс, каб ён выглядаў праўдзіва, павінен быў бы

чытацца так: «На гэтым месцы стаяла хаціна, у якой нарадзіўся класік беларускае літаратуры Максім Багдановіч»...

Паволі я пайшоў далей. Я люблю тутэйшыя мясціны нават за адны іхнія назвы. Траецкая Гара, Пярэспа, Старавіленская, Замчышча. Далёкая, ніякім уяўленнем не пазнаная даўнасць. Ходзячы тут, мне хочацца марыць аб тым, як будзе выглядаць мой горад праз колькі вялікага ці малога часу. Можа, нават тады, калі мяне ўжо не будзе. Ён вельмі разбудуецца будоўляю самага смелага характва. Але ён не забудзе зберагчы таго, што завецца самым сакраментальным словам — спадчына. На Нямізе, на самым яе сутоку з Свіслаччу, будзе стаяць велічны манумент — спічасты абеліск або стэла з удзячным надпісам, што тут пахавана летапісная рэчка, якая служыла працавітым мінчанам нялёгкую службу.

Фантазія вяла мяне і далей. Не меншаю пашанаю будзе атулены і Верхні горад, пасля Нямігі, здаецца, самая запаветная мясціна, дзе асталася старажытнасць, і яна, рэстаўрыраваная (не адрамантаваная пад старажытнасць, як гэта сям-там робіцца, а рэстаўрыраваная сумленна, каб была ўзноўлена атмасфера часу), і яна, рэстаўрыраваная, сваёю тагачаснаю сутнасцю раскажа, як і чым жылі тут колішнія мінчане. Кусочак горада, ператвораны ў музей. Вуліцы і двары забрукаваны не колатым, а круглым гладкім каменем; нецяперашнія шыльды і ліхтары, нетутэйшая ціхасць, бо цяперашніх машын тут не бывае. Памалу, з пашанотаю ходзяць тут людзі. Вунь старасвецкая кавярня з поўнай этнаграфіяй звычаёвасці і начыння; вунь майстэрні народных рамёстваў; вунь зборня, у якой можна пачуць старадаўнія песні і музыку, паглядзець старадаўнія скокі. Пісьменнікі тут могуць сустрэцца з сваімі чытачамі, артысты — з паклоннікамі таленту. Лектары раскажуць гісторыю горада і дзяржавы, людскога змагання і перамог. Каб чалавек, выйшаўшы з гэтага музея, пачуў, як намнога ён узбагаціўся душою. У гандлёвых радах, рупна адбудаваных пры ўваходзе ў гэтае царства мінулага, можна набыць сувеніры, тутэйшыя вырабы, кнігі...

Вось у якім одуме я кіраваўся да Нямігі. Але за Паркаваю магістраллю вуліцу перагарадзіў густы чалавечы натоўп: наперадзе стаяў ланцуг міліцыянераў і далей ісці не пускаў. Не трэба было ніякага намагання, каб тут жа дазнацца, што на Нямізе будуць узрываць апошнія дамы і міліцыя ачапіла ўвесь квартал. Натоўп глуха гаманіў,

калыхаўся, націскаў. Я заўсёды люблю нечаканасці, нават стыхію. Як бура, завіруха, навальніца, маланка, узбунтаваныя перакаты грому. Памятаю, у маладосці я быў у каханае дзяўчыны, за вокнамі пачаўся дождж, ён перайшоў у страшэнны лівень, на вуліцы цякло мора вады, і я не ўтрываў, развітаўся з каханаю і пусціўся пехатою цераз увесь горад дадому. Мне было вусцішна і весела, што вада залівае твар, слепіць вочы, халаднаватымі цуркамі сцякае па целе. Дома я не менш весела мяняў бялізну, радуючыся яе ласкавасці, сухой яе цеплыні, і смяяўся самым шчаслівым смехам, калі ўбачыў, што ў наручным гадзінніку пад шклом поўна вады і стрэлкі не могуць у ёй скрануцца. Гэтакая ж зухаватасць — патрэба абавязкова дазнацца, што робіцца там, наперадзе — напала на мяне і цяпер, і я прабіўся да міліцэйскага ачаплення, і, беручыся ўсё ўлева і ўлева, апынуўся сярод нейкіх двароў. Цеснымі судачкамі і глухімі пералазамі, між дашчаных хлевушкоў і сметнікаў, пужаючы чужых адзічэлых катоў, я выбраўся на высокі, крута абрэзаны бульдозерамі ўзгорак, у які колісь упіраліся двары разбураных камяніц. Адсюль мне добра адкрылася аголеная, ачышчаная ад людскога руху вуліца. Там гаспадарыла некалькі чалавек, адразу можна было пазнаць, што падрыўнікі. Яны то паяўляліся, то знікалі ў дамах, і нарэшце адзін з іх, што стаяў наводдаль на тратуары, махнуў рукою, і ўсе заспяшаліся і знарок павольным трухам пабеглі да міліцэйскага ачаплення.

— Ну, госпадзі, блаславі! — сказаў нехта каля мяне, і я не зразумеў, з ухвалаю гэта ці са шкадобаю.

Я павярнуўся, каб зірнуць на чалавека, і здзівіўся, што тут стаіць ужо безліч народу.

— Можа, тут дзе і золатца асталося ў каго.

— І дзіва́ няма ніякага, тут жа ўсё купецтва тулілася, можа, дзе і замуравана.

— А я скажу, нікому яна і не замінала, гэтая Няміга.

Я пачуў, як на гэтае чужое шкадаванне слухмяна абазвалася маё сэрца. Але я не дазволіў сабе апамятацца.

Калі падрыўнікі разбегліся, настала ціхуткая цішыня. Яна цягнулася страшэнна доўга, гэтая кароценькая хвіліна чакання, і калі ўсё ж выбух здарыўся, ён усіх здзівіў нечаканасцю. Тры глухія выбухі як бы прыўзнялі тыя дамы, потым як бы апусцілі, і тады сцены пачалі падаць і развальвацца. І тут жа, прарваўшыся аднекуль з сярэдзіны, усю карціну пачало ўкрываць густое, цёмна-рудое воблака пылу, перш рассцілаючыся па доле, а тады тугімі, як

бы цеснымі клубамі падымаючыся ўгору і распаўзаючыся ўшыркі...

Вось такое было ў мяне развітанне з Нямігаю. У маёй запісной кніжцы назначана і дата: трыццаць першага мая семдзесят чацвёртага года.

А цяпер жнівень семдзесят пятага. Цяпер я тут бываю ад часу да часу. Рэдка. Як бы і няма чаго.

Але днямі зазірнуў. Чыстая, шырокая вуліца, бясконцы чалавечы рух, далёка аднесеныя тратуары. А за імі, наабапал, лёгкая рунь засеенай травы.

І раптам зарадаваўся новаю, нейкаю светлаю і ласкаваю радасцю. Ад Кацярынінскае царквы, помніка архітэктуры семнаццатага стагоддзя, узятага дзяржаваю пад сваю ахову, ішлі высока пастаўленыя шчыты будаўнічай агароджы, пафарбаваныя ў лёгкі нябесны колер. На шчытах, што стаяць на павароце ў вуліцу Мікалая Астроўскага, вісіць шыльда: «Праезд закрыты». А збоку, трошкі вышэй, у тонкай рамцы другая: «Будаўніцтва комплексу жылых і гандлёвых будынкаў «Няміга». Праектны інстытут «Мінскпраект». Вядзе работы БУ-8 трэста № 4 камбіната «Мінскпраект». Нач. участка Піліповіч А. І., прараб Ушакоў В. В.».

І наверсе, над тэкстам, фотапанарама. Новая Няміга.

Божухна, якое гэта хараство!

І я рад. І за тое, што бачыў старую Нямігу і шкадаваў яе, і за тое, якая яна будзе, і нават за тое, што пры мне яна пачне будавацца. Што яшчэ заспею яе.

Толькі — хаця б не памянялі назвы. І каб напісана было не Нямігская вуліца, а так, як гавораць: Няміга.

ДАТКНЕННЕ

ІМГНЕННЕ

Я ішоў па вуліцы, глыбока задумаўшыся. Я думаў пра апавяданне, якое збіраўся пісаць. У ім павінен быў паміраць дзядок, а яму яшчэ вельмі хацелася жыць. Старэнькі, ён стараўся не прапускаць ні аднаго фізкультурнага парада, каб палюбавацца на спрыт і хараство чалавечага цела. Ён лічыў за найгоршую недарэчнасць, што чалавек павінен паміраць. І якраз тады, калі ў самай красе яго розум, калі ён многа чаго бачыў, многа чаму навучыўся і многа якога глупства цяпер не паўтарыў бы.

Усе мы, вядома, патрошку робім глупства і кажам, што гэта нашы памылкі. Але можа калі б іх не было, то не было б у нас і радасці пошукаў і плёну ад знойдзенага. Нехта мудры сказаў: дурасць служыць розуму за тачыла. Тут нешта ёсць ад глыбокай праўды, калі, вядома, не надта часта вастрыцца на тым асялку.

І вось у апавяданні дзядок паміраў. Я добра бачыў яго апошнія хвіліны. Ён ужо цяжка дыша. Яму не хапае паветра. Вакол яго людзі — знаёмыя, блізкія, сваякі. Нехта кажа, што трэба пазваць доктара. Усе ведаюць, што доктар тут не паможа, але ўсім як бы становіцца лягчэй. Усё роўна як бы нехта згадзіўся ўзяць на сябе частку невядома чые віны. Нават у самую безнадзейную хвіліну нам памагае трымацца надзея.

Але дзеда гэта не ратуе. Так павінна быць у апавяданні. У думках я стаўлю сябе на яго месца. Гэта мне цяжка дыхаць. Гэта мне не хапае паветра. І мне шкода, што ўсяго, што мяне акружае, я не буду больш бачыць...

І вось у гэтую хвіліну ўнутранай работы ўяўлення на рагу вуліцы выбліснула прарэзлівым сігналам і чырвоным крыжам машына «хуткай дапамогі». Я рвануўся бегчы. На адно малюсенькае імгненне ўсведамленню здалося, што машына памчала да мяне. Што там ужо, мабыць,— канец.

І калі ўяўленне вярнулася ў рэальны свет, я пачуў, як дрыжаць мае калені, як моцна б'ецца сэрца.

Я азірнуўся. І гэтулькі шчасця было, што наўкруга жыве ўвесь дасюль не пазнаны мною навакольны свет, такі патрэбны мне ў вечнай, штодня новай і новай сваёй красе. І калі сустрэўся мне прыяцель, я сказаў, перабіваючы яго:

— Як хораша! Ты толькі паглядзі, як кругом хораша! Чаму ты не радуешся?

ІНТЭРВ'Ю

Люблю чытаць запісныя кніжкі, успаміны, мемуары, маргіналіі, нават інтэрв'ю. Усюды шукаючы шчырасці. І быў вельмі разгублены, калі і да мяне звярнуўся чалавек, папрасіўшы гэтай самай шчырасці.

— *Як пісаліся вашы першыя апавяданні*? — папытаўся гэты чалавек, сказаўшы, што ён з'яўляецца карэспандэнтам «Маладосці».

— Дзіва: як пісаліся? Проста, бралася папера, аловак, жыла ў галаве думка... Але адкуль жа ўзялося тое, што захацела легчы на паперу?

Шчыра скажу: калі б не Янка Купала, Якуб Колас і Змітрок Бядуля, то наўрад ці паявілася б у мяне патрэба нешта пісаць самому. Іхнія вершы кранапі душу. Я і пачынаў з вершаў. Але ўвесь час мне здавалася, што вершам я магу выказаць толькі настрой, крыўду, гнеў, замілаванасць, нават нарысаваць пейзаж, а мне хацелася перадаць рух, падзею. Хоць вачыма маленства, але я ўжо сёе-тое бачыў: імперыялістычную і грамадзянскую вайну, Кастрычніцкую рэвалюцыю, нямецкую і польскую акупацыю. Усё гэта недзе жыло ў мне і нясмела прасілася ў слова.

— *Хацелася б, каб вы расказалі пра домысел у вашых апавяданнях*,— кажа карэспандэнт.

— Цяжкаватая рэч. Не вельмі я з ім ладжу, з домыслам. Я вельмі прывязаны да матэрыялу, і мне шкода парушаць яго верагоднасць, дамешваць да яго выдумку. Аднак жа без домыслу няма мастацкага твора. І ён, ведама, памагае і мне. Калі больш, калі менш. Часамі толькі каб падняць рэальны матэрыял да ступені мастацкага. А часамі з'яўляючыся асноваю твора.

Аднак жа ўся сутнасць у тым, што домысел — гэта не толькі ўмець дадаваць, а куды больш — умець выкінуць лішняе. Ачысціць ад выпадковага, дробнага, бледнага з назапашанага матэрыялу. Прыблізна гэтак пісаліся «Наталя», «След гумовых шын», «Паваротак ля сасны», «У Кірылы на хутары».

Бывае, ведама, што з домыслу пачынаецца сама ідэя твора. І тады яна сама збірае вакол сябе матэрыял. І самую фактуру, і назіранні, уражанні, погляды на рэчы, плынь думак, жэсты, рысы характараў і шмат чаго іншага, у той, вядома, меры, у якой гэта адпавядае замыслу. Гэтак пісаліся «Месячная ноч», «У старым доме», «Карла», «Развітанне», «Над гаем кружылі буслы».

З «Буслámі» выйшла ў мяне няўпраўка. Паводле замыслу гэта было зусім не такое апавяданне і звалася інакай: «Выхадны дзень». Яно было пра калгаснага старшыню, на матэрыяле фактычным. Але, мабыць, таму, што сітуацыя мела надта вузкі, лакальны характар, апавяданне не захацела стаць з'явай мастацтва, яно фальшывіла. Я яго знішчыў, пакінуўшы толькі першую старонку. У ёй было нешта мне мілае — партрэт Яніны. З год гэты партрэт не даваў мне быту: яго трэба было выкарыстаць у нейкім іншым творы. Але ён нікуды не месціўся, нікуды не падыходзіў. І тады ўсю сітуацыю «Буслоў» я прыдумаў выключна дзеля Яніны.

— *Ці ёсць у вас сваё любімае апавяданне?*

— Гм... Баюся, каб, адказваючы на гэтае пытанне, не парушыць суадносін шчырасці і такту. Дый наогул наўрад ці можна тут сказаць нешта пэўнае. Рэч у тым, што часта гэта справа густу, а густ мяняецца ад многіх акалічнасцей: часу, гадоў, грамадскіх ідэалаў, духоўнага фармавання.

— *А любімыя пісьменнікі?*

— Пра Купалу, Коласа і Бядулю я ўжо сказаў. Пэўны час пасля сваімі рамантычнымі апавяданнямі хвалявалі мяне такія непадобныя пісьменнікі, як Іван Тургенеў і Максім Горкі. Быў перыяд, калі за вяршыню дасціпнасці я лічыў апавяданні Ісака Бабеля і Юрыя Алешы. «Аповесці пра жыццё» і «Залатая ружа» далі мне Паустоўскага, адкрыўшы, што чароўная мілата яго твораў у вельмі незалежным, свабодным мастацкім мысленні.

Але ёсць у мяне галоўны чараўнік, у апавяданні якога ўваходзіш, як у храм,— Іван Бунін. Ён заўсёды мяне гіпнатызаваў, нават не ведаю чым, мабыць, тайнаю рабіць

чытача саўдзельнікам нейкай вельмі блізкай яму трывогі. Бунінскі домысел працуе галоўным чынам на тое, каб абмінаць непатрэбнае. Я не ведаю другога пісьменніка з такою гранічнаю нагрузкаю на тэкст.

— *Што такое апавяданне як жанр, на вашу думку?* — пытаецца далей карэспандэнт.

— Здаецца, усе пытанні лёгкія, але адказваць на іх цяжка. Тым больш што на ўсё гэта ёсць агульнае вызначэнне, і боязна фармуляваць свае прыватныя меркаванні. Твор эпічна-апавядальнай літаратуры, невялікі памерам, з нямногімі персанажамі, са строгім і дынамічным сюжэтам,— прыблізна так выглядае агульнае вызначэнне. Ці згодзен я з ім? Як кажуць, у аснове. Практычна апавяданне ў гэтыя рамкі не месціцца. Асабліва цяперашняе. І ў Буніна, і ў Паустоўскага якраз найменш дынамічнасці ў сюжэце, часам яго наогул няма, а між тым нешта трымае іхнія апавяданні на высокім мастацкім напружанні. Няйначай як гэтае «нешта» і складае тайны майстэрства, духоўны яго субстрат.

У маім разуменні апавяданне — гэта вельмі сканцэнтраваная ў фокусе нейкая адна з'ява жыцця. І таму, як у сувеніры, у ім павінна быць своеасаблівасць, характэрнасць.

Часта пішуць доўгія, пухлыя апавяданні, напаўняючы іх неабавязковымі, другараднымі падрабязнасцямі, дазваляючы персанажам без канца балбатаць, але гэта ўжо не апавяданне, а расслабленая аповесць. На жаль, часамі і пішуцца так аповесці, калі не хапае сілы напісаць апавяданне.

Хачу закрануць модную з'яву апошняга часу. Часта ў друку паяўляюцца замалёўкі, ці, як кажуць, эссэ, што на нашай мове азначае нарыс, накід, даволі безаблічнага, сузіральнага характару, і называюць гэтыя замалёўкі навеламі. Мне здаецца, гэта неправамерна. Усё-такі за навелаю павінна аставацца яе, няхай сабе ўмоўная, але вельмі пэўная асаблівасць: энергічнасць, кароткасць, дасціпнасць і нечаканасць развязкі.

— *Яшчэ адно запытанне: які сэнс вы ўкладаеце ў паняцце майстэрства?*

— Майстэрства — гэта не толькі сума прыёмаў. Светапогляд, філасофія сцвярджальнага руху, глыбокае пранікненне ў з'яву, культура мыслення, культура прафесіі, якой павінны быць добра вядомы такія рэчы, як чалавечыя пачуцці, адчуванне меры і такту ў выяўленчых сродках, сва-

боднае кіраванне сілаю слова і многія іншыя рэчы, што складаюць творчую індывідуальнасць пісьменніка,— вось тое, што спадарожнічае майстэрству.

— *Дазвольце яшчэ адно, на гэты раз папраўдзе апошняе пытанне. У вас ёсць нейкія свае прывычкі ў рабоце, свае эстэтычныя погляды, выяўленчыя сродкі; вы бываеце давольны або недавольны сабою, любіце працаваць удзень або ўночы. Ці не можаце расказаць і пра гэта?*

— У кожнага, ведама, свае схільнасці і густы. Я, напрыклад, думаю, што мы ў прозе недаацэньваем публіцыстычнасці. Яна надае твору актыўнасць, грамадзянскую страснасць, мужнасць. Паэзія ў гэтым сэнсе куды смялей за прозу, яна не баіцца пафасу клічнікаў. Алесь Бачыла, напрыклад, мог у паэзіі сказаць «Радзіма мая дарагая», а мы ў прозе як бы саромеемся такіх высокіх слоў. Праўда, тут трэба адна ўмова: публіцыстычнасць у прозе павінна быць душэўная, лірычная. Але строгая.

Што яшчэ магу сказаць? Некалі працаваў уночы. Цяпер перайшоў на дзень і гэтым страціў куды больш за палавіну поспеху і працавітасці.

Доўга шукаю пачатку. За няўдалым пачаткам звычайна ідзе фальш.

Ведаю: калі што не выходзіць — трэба пахадзіць. Наогул, калі ходзіш, лепш думаецца. Я быў бы куды шчаслівейшы, каб можна было пісаць ходзячы.

Люблю ўяўляць чужое жыццё, калі ўвечары гляджу на чужыя асветленыя вокны.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

Гэтая кніга пісалася шмат гадоў. Яна то дапаўнялася новымі раздзеламі ці новымі мастацкімі вобразамі і характарамі, то ачышчалася ад таго, што здавалася неарганічным.

Няраз перайначвалася яе кампаноўка, удакладняўся змест, мянялася назва. Не мяняўся толькі замысел, увесь час больш акрэсліваючыся і выспяваючы,— зрабіць кнігу так, каб яна чыталася як адзін чалавечы лёс на тым вялікім патрыятычным шляху, якім прайшоў мой сучаснік і кожны з нас па-свойму, непаўторна, і не змяніў кроку, калі было нават вельмі цяжка. У кнізе пераплецены лініі

асабістага лёсу і лініі персанажаў; мне здавалася, што гэта надасць большай душэўнасці.

Буду рад, калі старонкі гэтай кнігі знойдуць водгук у чытачовай душы ці ў некага абудзяць добры роздум.

ТАЙНЫ

Аднаго разу ў вечары, дома, па тэлефоне жаночы малады галасок папытаўся, ці я гэта той пісьменнік, які напісаў апавяданне «Факір Іяма». Той самы, прызнаўся я, і ў сваю чаргу папытаўся: каго і чаму гэта цікавіць?

— Я дачка тае жанчыны, пра якую вы гэтак хораша напісалі. Скажыце, усё, што вы пра яе напісалі — гэта праўда?

Адказаць было цяжка, бо было відно, што пытанне задаецца нездарма. Яно выклікана нейкай незнаёмай мне сітуацыяй. І мабыць, важнай. Я сказаў, што ў аснове апавяданне заснавана на праўдзе, але, паколькі яно зроблена як твор мастацкі, то ў ім ёсць і пэўная доля вымыслу. Хоць бы дзеля таго, каб звязаць між сабою мясціны фактычныя.

— Вы вельмі хораша напісалі пра маю маму,— гаварыла тым часам тэлефонная субяседніца.— І прыгажосць, і абаяльнасць, і чыстае, усё роўна як незямное каханне. Чалавек з гэтакімі якасцямі павінен быць душэўны, чулы, далікатны, а ў мае мамы нічога гэтага няма.

— Што здарылася? — папытаўся я.

— Пасля таго, як памёр наш татка, яе проста як падмянілі. Яна мяне ўзненавідзела. Разумееце, я выйшла замуж, неўзабаве будзе дзіця, а яна праганяе нас з дому. У нас трохпакаёвая кватэра, лецішча, усюды прастору хоць танцуй, а яна кіпіць: каб вашага й духу тут не было! Я не ведаю, што з ёю робіцца, усё роўна як я ёй чужая.

Я быў ашаломлены. Я папытаўся:

— Што мне трэба зрабіць? Як заступіцца за вас?

— Ніяк. Не трэба. Проста я хачу, каб вы ведалі, што памыліліся ў вашай гераіні. Што яна не варта вашага ўслаўлення.

Надоўга мяне вывела са спакою гэтая размова. Я спрабаваў дадумаць, якім чынам маладая жанчына наткнула-

ся на маё апавяданне. Як пазнала, што яго гераіняй з'яўляецца яе маці, бо ў творы яе імя перайначана. І навошта начала шукаць аўтара, калі ад усякіх яго паслуг адмовілася. Не дзеля таго ж толькі, каб сказаць, што гераіня не варта ўслаўлення. Прычына тут нейкая большая. Глыбейшая. У яе званку міжволі я пачуў сабе папрок, мяне як бы звінавацілі, што нечым я прычыніўся да чужое бяды. Нечаканасцю мяне здзівілі словы «Я дачка тае жанчыны», бо ніколі не чуў пра дачку ў той сям'і. І зусім трывожна прагучала параўнанне «усё роўна як я ёй чужая».

Я пачаў успамінаць далёкае наша знаёмства. Факіра Іяму, пажылога, са стомленым тварам чалавека, яго памочніцу па сцэне, вельмі маладую, мілую, папраўдзе абаяльную жанчыну, што на маё дзіва аказалася і яго жонкаю, якую ён па-юначы ўлюбёна зваў Мар'янкаю; наша нечаканае сяброўства, што перайшло ў сямейную дружбу. Потым яе адзіноту і гора, калі неспадзеўна Іяма знік і душэўнае суцяшэнне яна знаходзіла ў нашым доме.

Пасля кожная з нашых сем'яў выбрала сваю дарогу, мы развіталіся надоўга. Але мне скрозь здавалася, што лёс надарыў Мар'яну не зусім звычайнай, можна сказаць, выключнай сустрэчаю, вартаю таго, каб надаць ёй літаратурную форму. Я напісаў апавяданне. Я быў упэўнены, што гераіня, калі недзе жыве, пра гэта нават не дазнаецца, бо літаратура ніколі не была яе стыхіяй. А калі і дазнаецца, то можа будзе толькі рада: на яе біяграфію гэта не кіне ніякай ганьбы. Наадварот, аздобіць яе.

І якое ж было мне дзіва, калі аднаго разу, на плошчы Якуба Коласа, сышоўшы з трамвая, я твар у твар стыкнуўся з ёю. Ведама, быў рад, што гады як бы нават не закранулі яе. Наадварот, надалі ёй нейкай новай, надзіва ласкавай і спакойна-ўдумлівай вабнасці. Яна расказала, што ў свой час Рыгор Апанасавіч быў запрошаны ў Ташкент на работу па профілю яго навуковай дзейнасці, і яны пражылі там дванаццаць гадоў. А цяпер ужо два гады як зноў у Мінску, таксама на цікавай рабоце. У іх добрая кватэра, лецішча пад Крыжоўкаю, жывуць спакойна, як і калісь. Толькі з сэрцам у яго нядобра.

Нечаканая гэта сустрэча ўзрушыла мяне, неяк па-святочнаму памаладзіла, і я сказаў:

— Дарагая Мар'яна Тодараўна, вы ж, мабыць, і не ведаеце, што я напісаў пра вас апавяданне?

— Дзе? Як? — мне здалося, што з трывогаю папыталася яна.

Я сказаў, што яшчэ друкуецца.

— Я вас вельмі прашу,— яшчэ з большаю трывогаю сказала яна,— зрабіце так, каб пра гэта не ведаў Рыгор Апанасавіч.

Гэта была першая загадка, неразгаданая мною і дагэтуль.

Але ж трэба расказаць і пра Рыгора Апанасавіча. Пасля таго як знік Іяма, мне выпадкова сустрэўся добры стары прыяцель, зямляк, у свой час мы разам вучыліся ў тэхнікуме, Рыгор Дробыш. Ён скончыў Горы-Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, спецыялізаваўся ў Ленінградзе, цяпер вярнуўся ў Беларусь на работу. Паскардзіўся на сваю бяду: жонка з ім не паехала, асталася там пры бацьках з малою дачкою. Словам, пакінула яго. Яму жывецца адзінока, непамысна, няўтульна.

— Хочаш, я цябе ажаню? — сказаў я.

— Папраўдзе? — павесялеў ён.

— А што — паспрабуем. Прыходзь да мяне ў чацвер. Завуць яе Мар'яна: яна прыйдзе да мае жонкі, а ты да мяне. Паседзімо, папрастарэкуем. Яна таксама была замужам.

Мой дакляруиак спраўдзіўся надзіва хутка і лёгка. Прыяцель, пайшоўшы правесці яе дадому, прывёў да сябе. Гэтак выходзіла яна замуж і за Іяму.

Няўжо ж тое далёкае падабенства стаяла як цень? Бо мне нават падалося, што яна аберагалася, каб мы цяпер не сустрэліся з Рыгорам Апанасавічам. І вельмі шкода, што я сам міжволі адхіліў магчымасць гэтай сустрэчы.

Я пільна спяшаўся на неадкладны візіт. Толькі я ўскочыў на падножку тралейбуса, як мяне аклікнуў чужы, але, здалося, знаёмы голас з тратуара. Рыгор Апанасавіч настойліва, словам і жэстам прасіў не ехаць, пачакаць, яму трэба конча перагаварыць са мною. Не магу я, дарагі Рыгор, гаварыў я таксама словам і жэстам, вельмі спяшаюся, другім разам, сазвонімся. Гэтак я і паехаў, неспакойна думаючы, што колішні добры сябар нешта важнае хацеў мне сказаць. Можа, нечым адкрыцца. Можа, параіцца перад нейкім адчайным крокам. Людзям жа вельмі часта не стае блізкага чалавека, каб у нечым паспавядацца. І не паспеў.

На другі дзень ён памёр дома, званячы па тэлефоне ў Ленінград.

ШУКАННІ

1

Бадай што ўсё, зробленае мною, гэта нейкая частачка самога сябе. Самае негістарычнае апавяданне ў мяне «Пры вогнішчы» і самае небіяграфічнае «Таіса», бо адно нічога не мае ад гісторыі, а другое ад біяграфіі. Проста выдумка: у першым выпадку — ад бытавой літаратурнай традыцыі, у другім — ад гераічнай рамантыкі. Усё ж астатняе хоць нечым ды прывязана да біяграфіі.

«Затока ў бурах» — гэта наша сяло Труханавічы так, як я яго разумеў дзіцячымі гадамі на пачатку першай вайны і рэвалюцыі, з яго людзьмі і падзеямі, праўда, падфарбаванымі рамантыкай. Апавяданні трыццатых гадоў — гэта вынік камандзіровак па Случчыне. Прычым з адным персанажам здарыўся канфуз.

Быў у мяне родны дзядзька Сяргей. Мілы, добры, душэўны чалавек. Такі каларытны і яркі, што сам прасіўся ў апавяданне. У яго былі свае манеры, жэсты, усмешка, гаворка. Ні з кім яго нельга было зблытаць. І от, пішучы «Зялёныя шкарпэткі» і хочучы ярчэй паказаць тып не то кулака, не то падкулачніка, я спісаў яго з дзядзькі Сяргея. Праз нейкі час, будучы ў камандзіроўцы ў тых мясцінах, заехаў да Ульяны. Звычайна, як толькі я прыязджаў, зараз жа прыбягаў і дзядзька Сяргей. А на гэты раз яго не было.

— Чаму ж гэта дзядзька Сяргей не ідзе? — папытаўся я ў Ульяны.

— Чаго ж ён пойдзе, калі ты яго так збэсціў!

Падвёў тыпаж і яшчэ раз, праўда, у другім плане.

Як толькі я пачаў пісаць «Скажы адно слова», зразумеў, што раблю памылку. Мая гераіня Галя нечым была падобна на другую жанчыну, на гераіню другое мае аповесці. І я ведаў чаму: я пісаў яе з таго самага партрэта. Той партрэт мне быў добра вядомы, здавалася, што я выкарыстаў яго не поўна і дазволіў сабе не шукаць новага арыгінала. І от яўнае падабенства, а гэта вельмі нядобра.

«Нічога,— сказаў я сам сабе.— Буду пісаць так, як пачаў, а як кончу — папраўлю. Дам ёй другія рысы».

Але як скончыў, зразумеў, што паправіць нічога нельга. Рэч у тым, што пад гэты характар пісалася ўся атмасфера, бо іначай не было б праўдзівасці, і каб цяпер паправіць характар гераіні, трэба было папраўляць літаральна ўсё:

свет яе дачыненняў, вобразы, учынкі, мяняць ключ апавядальнасці — іначай кажучы, пісаць аповесць нанава, зусім другой танальнасці.

Першы раз здарылася са мною такая памылка, і яна толькі найлепш падкрэсліла, якая гэта арганічная з'ява — мастацкая рэч.

І пераканаўся яшчэ ў адным: найцяжэй пісаць, калі фактычны матэрыял ляжыць вельмі блізка і калі яго больш як трэба. Для рамана гэта можа і нядрэнна, яго можна скарыстаць недзе на хаду, як фон, як атмасферу, нарэшце, як дэталь, а ў апавяданні з ім цяжка. Так было ў «Паваротку каля хвоі». Гэта быў жывы матэрыял і жывы чалавек. Так і звався ён папраўдзе — Якаў Міхайлавіч Майбарада. Я не мог змяніць яму ні імя, ні прозвішча, бо здавалася, што не здолею тады і напісаць яго. Я пісаў гэтае апавяданне многа разоў — і кожны раз бачыў, што мне цяжка павярнуцца ў матэрыяле. Усё, здаецца, трэба, бо ўсё гэта майбарадаўскае, а калі паглядзіш — апавядання няма, у ім цесна і душна, як у пакоі, застаўленым непатрэбнай мэбляю і дрындушкамі. І я выкідаў і выкідаў з яго ўсё, што патрэбна было Майбарадзе, але не патрэбна апавяданню. Характар яго ўсё вузеў, але рабіўся больш акрэслены і яркі. Я нават вельмі баяўся, што калі-небудзь гэтае апавяданне прачытае сам Майбарада і запратэстуе. І меў бы рацыю, бо, нарэшце, у апавяданні стаў ужо не Майбарада, а тып — тое, што апавяданню і трэба.

Яшчэ горш было з «Наталяй». Пісаў я яе з душою. Матэрыял быў фактычны, добра вядомы, аставалася толькі ісці за ім. Характар вырысоўваўся праўдзіва, атмасфера спрыяла адзінству. Не заўсёды так лёгка ўдаецца, каб напісанае адпавядала замыслу. Бывае, што і падзеі, і характары так бунтуюць, так не хочуць лажыцца ў намечаны табою план, што ты вымушан ламаць замысел. Героі пачынаюць дыктаваць табе свае ўмовы, ты, нарэшце, здаешся, пускаеш іх туды, куды яны хочуць, і пасля дзівішся: выйшла лепш, як ты думаў, яны больш за цябе разумелі логіку свае ролі. У «Наталі» гэтага не здарылася, матэрыял лажыўся вельмі пакорліва. І вось калі я скончыў, перапісаў нанава і перачытаў як старонні чалавек, у мяне апусціліся рукі. Гэта быў не мастацкі твор, а вельмі добрасумленна зробленая інфармацыя. Пераказ падзей, праз якія прайшло чужое жыццё. Гладка, роўна, спакойна. У аповесці не было ні бур, ні канфліктаў, уся яна выглядала нейк занадта лагічна і занадта правільна. Яна не

магла хваляваць, бо ўся свяцілася, яе канец быў загадзя відзён.

Я пачаў шукаць прычыны, чаму ж мяне напаткала няўдача. У сабе, ды тым больш у свежай рабоце, не так лёгка і разабрацца. Я спрабаваў перайначыць кампазіцыю, усё нератасаваць, нераставіць — не намагала. Падумаў, што ўся бяда ў мастацкіх сродках: не здолеў данесці, не закрануў глыбінь душы, не знайшоў яркіх фабраў — не, і гэта не выручала. А прычына была не ў прыёмах, а ў самой сутнасці: я вельмі блізка пільнаваўся праўды факта.

Зразумеўшы гэта, я пачаў пісаць «Наталю» нанава. І паварот зрабіў зусім невялікі. Калі ў першым варыянце Наталя, выходзячы замуж за Казіміра, расказала яму ўсё сваё жыццё, то ў другім варыянце яна не сазналася, што ў яе была дачка. Так многа крыўды ў яе было на мінулае, што яна хацела не знаць, забыць яго. «Нам трэба жыць спачатку, Казімір. Аберагаць тое, што належыць нам. А тое, што прайшло,— гэта не наша, і нам пра яго ніколі не трэба ўспамінаць»,— сказала яна Казіміру. Такім невялікім паваротам я паставіў Наталю ў канфлікт з самой сабою, надаў аповесці ўнутраны рух. Бо пасля, калі загояцца яе душэўныя раны, яна пачне думаць пра дачку і стане шукаць яе. І рабіць гэта будзе цяжка, бо ўвесь час не даваціьме спакою правінка, што пра гэта не ведае Казімір. Такім чынам, мне заадно ўдаецца паставіць і важнае маральнае пытанне: чалавечай шчырасці і чысціні. Аповесць, такім чынам, не толькі перадае факт, а робіць абагульненне.

2

Бунтуюць героі і не слухаюцца аўтара вельмі часта. Так было ў «Развітанні», з якім я доўга не мог саўладаць. У ім замысел быў зусім не такі: як жанчына, сустрэўшыся з чалавекам праз многа гадоў, не магла даравацъ сабе памылкі, што звязала свой лёс з другім, чужым ёй па душы. Матэрыял таксама быў добра знаёмы. Але як я ні стараўся — сустрэўшыся, гэтыя людзі не знаходзілі, што ім гаварыць. У іхніх адносінах быў фальш, я не ведаў, чым запоўніць іх душэўную пустату. Толькі пасля зразумеў прычыну: я выкінуў з іх жыцця вялікі прамежак часу, і гэтая пустата пазбаўляла вобразы паўнаты, натуральнасці. Па-за апавяданнем асталіся вельмі важныя акалічнасці — логіка часу і логіка руху. І вось парадокс: жыццёвы ма-

тэрыял не захацеў набываць жыццёвай праўды. Што б ні рабілі мае героі, я бачыў, што робяць яны гэта не самі, а пад маім прымусам. Прыйшлося шукаць новага павароту, які не супярэчыў бы логіцы развіцця. Гэтым паваротам стаў канфлікт другі: час умяшаўся ў лёс людзей, і яны сталі розныя. Я хацеў, каб яны сустрэліся як сябры, а яны ачужэлі. Ад замыслу не асталося нічога. Тут прататыпы не пазналі б сябе, але яны з'явіліся прычынай апавядання, як бы базай яму.

Але затое пазнала б сябе гераіня «Месячнай ночы» Волька, праўда, не так вонкава, як па біяграфіі і атмасферы. Гэта была Ганна Бараўлёва, у якой я з год прастаяў на кватэры. Мне шкода было, што плюгавец-муж так жорстка абышоўся з яе душою. Вядома, я апаэтызаваў гэтую жанчыну, бо ў ёй бачыў і лёс другіх, даверлівасць якіх так часта натыкаецца на незаслужаныя выпрабаванні. У гэтым апавяданні мне вельмі не даваўся другі чалавек — геадэзіст. Ён павінен быў, сам не ведаючы таго, абудзіць у ёй новую веру. Трэба было знайсці яму характар, меру яго паводзін, пэўную грань такту ў умовах, не зусім звычайных. Ён выходзіў у мяне то больш рэзкі і гуллівы, то занадта бязгрэшны і дзівакаваты. Перайначваў я гэты вобраз многа разоў. Хацелася, каб за гранню такту чытач бачыў жывыя чалавечыя парыванні. Перад тым як палюбіць яго Волька, трэба было, каб палюбіў і паверыў яму чытач.

Мужа яе, Сцяпана, я не ведаў і ніколі не бачыў. Спісаў я яго з чалавека зусім выпадковага, да Волькі ён не меў ніякага дачынення. Быў такі Мікалай Салавей, ён прыехаў у наша сяло даўгалыгі, чубасты, з юрлівымі вачыма і хітраю ўсмешкаю. Сказаўшы, што некалі быў карабельным механікам, ён лёгка ўладзіўся рабіць у МТС. З першага ж вечара і зазвінела над сялом яго галасная песня. І няйначай як гэтаю песняю ён зачараваў маладую настаўніцу Стасю. Яе выключылі з камсамола, з настаўнікаў, яе выраклася старая, занадта прававерная маці, і нічога не памагло. Яна пайшла за Салаўём як сляпая. А праз паўгода, для ўсіх неспадзявана, на пяці чамаданах да Салаўя прыкаціла, як стаенная кабыла, гладкая жонка. І Салавей, нявінна бліснуўшы вачыма, падзякаваў Стасі за прытулак, за ласку і весела выгнаў. Ух, які гэта быў натрэніраваны печаны гад.

Нават такое маленькае апавяданне, як «Слепата», мела сваю гераіню. Гэта была звычайная жанчына, я нават не ведаў, як яе зваць. Толькі мой знаёмы звярнуў на яе маю ўвагу. Ён сказаў: «Такая прыгожая жанчына і — няшчасны чалавек. Ты бачыў, што ў яе пакалечана вока?» Мне яна здавалася вельмі прыгожая душою. І я падумаў: чаму ён не бачыць у ёй чалавека, а толькі калецтва? З гэтага і нарадзілася апавяданне. І знарок захацелася зрабіць так, каб прыгажосць яе была высокая, мужная. Я напісаў зусім другую жанчыну, бо мяне цікавіў не партрэт, а думка: як часта мы забываемся, што чалавек прыгожы перш за ўсё ўнутраным хараством.

СУГУЧЧА

Яна пазваніла па тэлефоне. Сказала, што газета «Звязда» хоча пагутарыць са мною. Цераз яе — няштатную карэспандэнтку газеты.

— *У альманаху «Слуцкія песняры» за 1926 год паявіліся вершы, падпісаныя нязвыклым імем Янка Пірат. Гэта былі першыя, калі я не памыляюся, Вашы друкаваныя творы. З гісторыі вядома, што на Прыпяці ў старадаўнія часы былі піраты, даволі своеасаблівы, вясёлы і дзёрзкі народ. Можа, малады паэт адчуў сябе іх далёкім патомкам?*

— Вядома, як і шмат хто з празаікаў, я таксама пачынаў з вершаў. Спачатку класічна строгіх, бо першымі паэтамі, якіх чытаў, былі Пушкін (таўшчэзны том выбранага), Лермантаў і Байран. Потым гэта захапленне змянілася свежымі павевамі часу — маладнякоўскім раскаваным вершам, якога патрабавала новая тэматыка.

Псеўданім «Пірат» не з'яўляўся водгукам далёкай гісторыі Беларусі. У аглядным мінулым на Беларусі мораў не было, значыцца, не было і піратаў. У нас цяклі магутныя рэкі, думаю, што на іх таксама сваволіў «вясёлы і дзёрзкі народ», але зваўся ён, няйначай, па-тутэйшаму — разбойнікамі і расколамі. На жаль, «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» слова «раскол» у сэнсе «разбой» не фіксуе. Гэтак жа як не фіксуе і другіх слоў, без якіх цяж-

ка адчуць і наш побыт, і зусім недалёкае мінулае. Уся наша літаратура, напрыклад, карысталася і карыстаецца словам «Абразкі»,— своеасаблівым нацыянальным вызначэннем жанру, але ў слоўніку яно адсутнічае. У прастамоўі часта абходны ліст завуць «абежнікам»,— каларыйнае, ёмістае слова,— але цяперашні чытач без слоўніка не здагадаецца, што ў лексіцы першых гадоў савецкага будаўніцтва гэтым словам зваўся «цыркуляр».

Прычына майго «пірацтва» ў тым, як успрымалася сучаснасць. Маладая літаратура не ўтойвала свае мэты: усё старое разбурыць, будаваць усё новае.

Па натуры я быў рамантык. Байранаўскі бунт духу мне імпанаваў. Наіўна? Бясспрэчна. Да таго ж не мала значыла і традыцыя выступаць у літаратуры пад псеўданімам — Мацей Бурачок, Ядвігін Ш.,— бо для дзяржаўных і асветніцкіх спраў мова беларуская была забаронена. Пазней перайшлі псеўданімы да нашых класікаў — Янка Купала, Якуб Колас, Цётка. Потым і да іх змены, але ўжо ў якасці моды — Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі, Кузьма Чорны, Язэп Пушча, Алесь Дудар — усе псеўданімы.

— У «піратах» Вы хадзілі нядоўга, але рамантычны пачатак, імкненне зазірнуць у глыбіні чалавечай прыроды, разгадаць таямніцы нябачнага руху душы да гэтага часу асталіся ў вашай творчасці. Янка Пірат ператварыўся ў Янку Відука. Чым сёння можаце растлумачыць прычыны і сутнасць гэтай метамарфозы? Што новага прынёс Янка Відук?

— Вельмі скора я зразумеў, што сімвал майго псеўданіма памылковы. Не толькі таму, што перанесены ён быў з чужой глебы, а па самай сутнасці: справа не ў разбурэнні, а ў стварэнні. Асабліва востра я адчуваў няслушнасць свайго псеўданіма, калі ўспамінаў, як у нашым сяле Труханавічах раптам вельмі многа паявілася паперы. Рознае. Вырваных старонак з кніг і самі кнігі, часамі ў старых, але раскошных пераплётах, часамі ўжо без пераплётаў. Тоўстая, трывалая папера ішла на ўсякія хатнія патрэбы, ёю распальвалі печы, загортвалі харчы ў дарогу; тонкія старонкі ішлі на курэнне. Была асаблівая зухаватасць у тым, каб у кампаніі, на вуліцы, прынародна дастаць з кішэні штаноў ці з-за пазухі цэлы жмут выхапленых з кнігі старонак, не спяшаючыся адарваць краёчак, памяць яго ў пальцах, скласці жалабком, насыпаць туды махоркі, скруціць папяросу і нарэшце паднесці да рота, на зубах раз-

жаваць, каб яна цупка склеілася. Нярэдка ў гаспадарскім ужытку паяўляліся паперы, падобныя на рукапісы, пісаныя буйнымі літарамі, помніцца цёмна-сіняватая водцень іх. І кнігі, і паперы былі з бібліятэкі недалёкага панскага маёнтка.

Прыблізна гэтакае я бачыў і ў Слуцку, на Трайчанах. У манастырскіх сценах туліўся сельскагаспадарчы тэхнікум. Аднае раніцы мы ішлі на заняткі міма царквы, дзверы яе былі шырока расчынены ў цемень, на цвінтары валяліся растрыбушаныя фаліянты, вялікія і малыя друкаваныя і пісаныя лісты паперы, вецер ганяў іх па цвінтары.

Часта ўспамінаў я гэтыя карціны. Разбураць лёгка. А раптам сярод тых папер загінулі нейкія найдаражэйшыя знакі нашай гісторыі?

Якое ж слова знайсці, каб выказаць новы сімвал?

У нашым агародзе, у траве, каля плота кожны год сама сабою вырастала несамавітая раслінка. На высокім тоненькім сцябліку невялікія даўгаватыя, шэрыя галоўкі з дзірачкамі каля самай шапачкі. Калі макаўкі спелі, іх калаціў і прыгінаў да зямлі вецер, і драбнюсенькае насенне праз дзірачкі высыпалася. Дзікі мак. Гэты мак-самасейка мае народную назву відук. Мяне спакусіла закладзеная ў ім ідэя самазахавання віду, каб скарыстаць яе ў якасці новага псеўданіма. Такім чынам паявіўся Відук.

Малады народ цяпер нават не ведае такога слова. Асабліва лёгка забывае народныя словы вясковая моладзь, якую не навучылі любіць зямлю, яна перабягае ў горад. Сувязі з вёскаю, праўда, у яе астаюцца, але часта толькі па меркантыльных меркаваннях: адтуль у горад лёгка плывуць «дары прыроды», часамі істотная падмога на «Жыгулі». У 1970 годзе выйшаў у свет даведнік «Пісьменнікі Савецкай Беларусі», у ім быў названы і мой псеўданім. Але ці то рэдактар, ці карэктар (падазраю, што чалавек вясковы) палічыў, што ў слове зроблена памылка і паправіў: напісаў «Віадук».

Аднак натурфіласофская сутнасць майго новага псеўданіма, што сімвалізаваў бясконцасць жыцця, нядоўга служыла справе. Падстава была самая простая: навошта ўцякаць ад самога сябе?

— Свой творчы шлях вы пачалі з вершаў. Чаму так часта здараецца, што з «царства паэзіі» шмат хто пераходзіць да прозы? У прыватнасці — Вы?

— Таксама звязана з рамантыкаю першых гадоў Савецкага ладу жыцця. Маладая літаратура ярка дзялілася на два спосабы адлюстравання рэчаіснасці: паэзія выказвала пачуцці і настроі, яна славіла, апявала, звала; проза — расказвала пра будні і гераічныя справы рэвалюцыі, паказвала іх. Гэта мне было бліжэй. Прыклад — апавяданне «Таіса».

— Як пяецца ў песні: «нішто не мінае без следу». І паэзія юных гадоў не пакідае мудрай спеласці празаіка. Яна прысутнічае не толькі ў інтанацыйна-музычальнай фразе, у гранічна сціснутым стылі, у маляўнічасці мовы, але і ў цэлай ідэйна-вобразнай сістэме. Што такое «паэзія ў прозе»?

— Гм... Здаецца, вы ж самі і адказалі на пытанне. Па-першае,— вельмі слушна! — «нішто не мінае без следу». Мяне і цяпер хвалюе паэзія, дзе б яна ні была: і ў вершах, і ў прозе. Ну так, і ў вершах, бо не ў кожным вершы прысутнічае паэзія. Пісаць вершы можа навучыцца кожны, але не дай божа чытаць іх, калі яны не кранаюць душы, нікуды не завуць, не абуджаюць ніякіх жаданняў. Любых: пакутаваць, кахаць, ненавідзець, ісці на подзвіг, радавацца, смуткаваць. Па-другое, вы самі называеце элементы, якія даюць адчуванне паэзіі: інтанацыйна-музыкальная фраза, гранічная сціснутасць стыля (гэта значыць, прысутнасць толькі неабходнага), мова. У аснове, вядома, перш за ўсё мова. Сіла мастацкага твора ў тайне слоў, у меры іх эстэтычнай слушнасці ў фразе.

Тым часам, гаворачы ўсё гэта, я маю на ўвазе апавяданне. Мае патрабаванні да яго часта мяняліся, кожны раз патрабуючы ўсё большай жорсткасці. Па-першае, яно павінна быць пра нешта важнае, сацыяльна-ўзрушлівае, глыбока чалавечнае. Па-другое, павінна быць кароткае, за эталон лічу 6—9 машынапісных старонак. Па-трэцяе, галоўным элементам мастацкага даследавання павінен быць унутраны свет чалавека.

— Калі па-сапраўднаму вы адчулі сябе пісьменнікам: калі выйшла ў свет ваша першая кніга ці пасля, калі прыйшло чытацкае прызнанне? Калі і як зразумелі, што менавіта літаратура — ваша прызванне?

— Ніколі. Ні пасля першай, ні пасля апошняй кнігі. Часта, калі ў мяне не ўсё ладзіцца ў рабоце, я думаю, што пісьменнікам стаў выпадкова. Што было б куды больш

толку, калі б я стаў, дапусцім, інжынерам. Або будаўніком, канструктарам, вышукальнікам. Па схільнасці я пайшоў у бацьку, ён вельмі любіў будаваць. Мог паставіць дом, але раптам перадумаць, што не тым бокам ён павернуты да сонца, тут жа разабраць яго і пачаць будаваць нанава. Патрэба да пераробак скрозь не дае быту і мне. Супакойваю сябе тым, што ў пісьменніцкім рамястве гэтак і трэба, што спакойным быць нельга.

— *Хто з беларускіх пісьменнікаў найбольш прычыніўся да фармавання ў вас пісьменніка?*

— Пасля таго як мне адкрылася, што існуе беларуская літаратура — Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля. Прычым Купала фармаваў у мне грамадзянскія пачуцці, Максім Багдановіч культуру формы.

— *Дзесьці я чытала, што для вас Бунін «самы вялікі чараўнік». І чары яго — у сугучнасці. Што вам дала, чаму навучыла проза Буніна?*

— Схільнасць, захапленне, густы дыктуе нам узрост. У свой далёкі час я быў вельмі спакойны да Льва Талстога, а захлёбваўся Дастаеўскім. Потым прыйшоў час грандыёзнасці Талстога і боязі Дастаеўскага. Доўга быў абыякавы да Чэхава, выключна з-за яго філасофскай умеркаванасці, а цяпер кожны раз душою гарнуся да яго кніг.

А Бунін быў роўна блізкім заўсёды. Чытаю яго павольі, спыняючыся, каб падумаць. Добра гэта, калі над кнігаю хочацца думаць. Гэта і ёсць духоўнасць. Наша хваляванне, выклікана мастацкім творам,— хіба гэта не сугучча? Мне здаецца, што і вучыцца ў Буніна нельга, можна толькі кожны раз дзівіцца — як гэта ён можа? Такое ўражанне, што самая важная работа ў Буніна — умець абыходзіцца без лішняга тэксту.

ШУКАННІ

(працяг)

3

На нейкім пэўным часе я прыгледзеўся да адной з'явы. Каля калгасаў пачалі туліцца спекулянты. Лічыліся калгаснікамі толькі для віду. То там, то там па дарозе бачыш іх з кошыкамі, прыкідваюцца бедненькімі, няшчаснымі. Мяне скрозь аж працінала ад гэтага тыпу людзей. Захацелася неяк паказаць іх, распрануць, каб усе бачылі, хто яны. Але не знаходзіў формы. Гэта прасілася больш на фельетон, а да фельетонаў я не надта здатны.

І от аднаго разу еxаў я з Мядзеля ў Вілейку. Па дарозе ў аўтобус зайшоў кантралёр. Адна кабеціна з кошыкам аж спужалася:

— А божачкі, дзе ж мой білет!

— Шукай, цётачка, шукай,— сказаў кантралёр.

Бедавала кабеціна, бедавала, шукаючы таго білета то ў кішэнях, то ў запазусе, ды так і праехала ўсю дарогу. А калі выйшла, то нехта сказаў:

— Шпікулянтка. Грошай чортведама колькі, а от так і стараецца надармак праехаць.

Замысел «У Кірылы на хутары» жыў у мне больш за трыццаць гадоў. Матэрыял мяне непакоіў неадступна, бо ў ім былі ўсе адзнакі, каб стаць апавяданнем: гераічнасць, таямнічасць, нечаканасць і напружанасць, нарэшце, ён меў рэвалюцыйную аснову. І быў добра вядомы, бо ўсё гэта рабілася на хутары ў майго бацькі. Сапраўды, у часе белапольскай акупацыі ў нас жыў падпольшчык, які для канспірацыі наладзіў пактарню і рабіў галандскія сыры. Бацька пра гэта ведаў. Калі прыйшлі нашы часці, гэты чалавек вельмі дзякаваў бацьку за прытулак.

— Ат, што там,— сказаў бацька.— Дзякуй богу, што ўсё добра абышлося.

Дык от, быў гераічны матэрыял, а апавяданне не выходзіла, нечага не хапала яму.

Аднаго разу, будучы ў адпачынку, я хадзіў па лесе з прыяцелем і расказваў яму пра сваё гора. А расказваючы, неўзаметку адхіліўся ад праўды: паводле майго расказу выходзіла, што бацька не ведаў пра падпольную работу

свайго кватаранта. Тут жа я зразумеў, што гэта і ёсць тое, чаго мне не хапала.

Ніяк не магу патлумачыць сабе адной з'явы. Расказваючы, як хадзіў да пана Ёдкі, я ўтаіў адну дэталь. Я сказаў, што толькі на адыходзінах заўважыў кветнік каля ганка, сонечны гадзіннік і ўткнуты ў яго лазовы пруцік замест шпянька. А гэта не зусім праўда. Я заўважыў не кветнік і не гадзіннік: увага мая была да астатку забрана маладым чалавекам, які пад'ехаў сюды верхам на бліпчастай гнядой танканогай жарабіцы, што ўся пад ім аж хадзіла ў нейкім імклівым, спружыновым парыве. Малады чалавек, адзеты вытанчана і дасціпна, у брыджах і ў лайкавых пальчатках, зграбна седзячы ў высокім рыпучым сядле, сказаў пану Ёдку, што хоча праехаць яшчэ пад лясок, і тут жа, торкнуўшы ў бок кабыліцы выгінастым лакаваным стэкам, пагарцаваў па зялёным двары ўздоўж густога цёмнага парку за стайні, у поле. Гэта ў пана Ёдкі гасцяваў яго пляменнік.

Не так даўно я адкрыў, што на гэтага маладога чалавека падобен пан Гжэцкі з «Таісы», камандзір карнікаў з «У Кірылы на хутары», што і кабыліца, вельмі падобная на гэтую, ходзіць па маіх апавяданнях. «Фурман за лейцы стрымліваў сытую жарабіцу» («След гумовых шын»); «Пад пярэднім, паручнікам, аж гарцавала танканогая, бліпчастай гнядой масці кабыліца» («У Кірылы на хутары»); «Ён ездзіў на падгалістай гнядой кабыліцы... навесіўшы на руку стэк, абвіты палоскамі чырвонай лакіраванай скуры» («Таіса»).

Што для апавяданняў часоў інтэрвенцыі я браў вобразы з свайго маленства, я нават не думаў. Таксама як не думаў, чаму не напісалася, што ў пана Ёдкі бачыў маладога чалавека. Мабыць, у творчай лабараторыі ёсць свая падсвядомая этыка: браць для работы тое, што ў памяці ляжыць як бы таемна.

4

Самому цяжка пазнаць, што варта большай, а што меншай увагі, але да напісанага ставішся не роўна. Нечым мне бліжэй да сэрца «След гумовых шын», «Наталя», «Месячная ноч», «Таіса», «У Кірылы на хутары», «У старым доме», «Над гаем кружылі буслы». Не магу паскардзіцца, што халодны да «Развітання», нават да «Слепаты». Нешта блізкае сабе знаходжу ў «Паваротку каля хвоі».

Можа мне і не ўдалося напісаць так, як усё гэта бачыў у сваім уяўленні, бо напісанае не заўсёды адпавядае строга замыслу. З таго чужога ўяўленага жыцця пісьменніку прыходзіцца браць толькі невялікія долі, часамі проста які штрых або найбольш яркую рысу характару, а ўсё астатняе ідзе на глум.

І бывае, што напісаў нешта, скончыў, а яно не пакідае цябе. Значыцца, не ўсё сказаў, што хацеў, не ўсё назапашанае выкарыстаў. Такія адносіны ў мяне да «Наталі».

Быў я вельмі рад выпадку з «Дакументальнай рэвізіяй». З'явілася апавяданне вынікам маіх нагляданняў за рэвізорамі, якія правяралі мяне няраз. Былі ўсякія: і разумныя, удумлівыя, і проста жалезабетонныя параграфы з інструкцый. У гэтай апошняй катэгорыі было вельмі многа тупога апломбу: я рэвізор, і ты перада мною дрыжы!

Пасля таго як апавяданне было надрукавана ў «Беларусі», у рэдакцыю прыйшло пісьмо з пратэстам. Пратэст прыслаў кантралёр-рэвізор Міністэрства фінансаў СССР па Гродзенскай вобласці.

«Как видно из содержания очерка,— пісалася ў гэтым пісьме,— автор очень поверхностно знаком с ревизионной работой, но главное не в этом. По-моему, автор решил навести ревизию правительственных решений, которые призваны и обязывают руководителей хозяйственных организаций соблюдать существующие законоположения...

Считаю очерк вредным. И не тактичны к очерку иллюстрации, в частности, та, что показывает перед зеркалом Марину Борисовну и на втором плане ревизора, у которого только и дела что любоваться тем, как она приводит себя в порядок.

Вредно и то, что автор старается протянуть мнение тех элементов хозяйственников, которые стараются, распоясавшись, игнарировать правительственные решения... По-моему, редакция просто не проконсультировалась со специалистами и мимо воли разделила мнение автора».

Мне стала ясна, што гэта піша чыноўнік і бюракрат куды больш за таго, што я паказаў у апавяданні. Яго закранула не сутнасць справы, а ведамасны гонар: нехта асмеліўся зачапіць рэвізора. І чуцён той жа самы грэблівы тон: не дырэктар, не кіраўнік прадпрыемства, а «хозяйственники», «распоясавшиеся элементы». І галоўная абраза, што ў ілюстрацыях рэвізор паказаны не на першым, а на другім плане. Ну як жа гэта можна!

— Што рабіць? — папыталіся ў мяне ў рэдакцыі.

Я папрасіў, каб мне дазволілі даць адказ самому. Але не паспеў я яшчэ гэтага зрабіць, як прыйшоў новы пратэст, цяпер ужо калектыўны. І яшчэ больш грозны.

Няёмка, што я крыху паўтараюся, бо пра гэты выпадак упомніў, пішучы пра Ілью Гурскага, але думаю, што паўтор не пашкодзіць, бо тут сказана трошкі шырэй.

Адказ я пастараўся даць спакойны, але грунтоўны. Я спаслаўся на тыя ж самыя законы, на часопіс «Бухгалтерский учет», дзе рэвізорская работа трактуецца куды глыбей, як гэта ўяўляў сабе гродзенскі таварыш. Мабыць, зразумеўшы, што гаворка пайшла, як кажуць, на прафесійным узроўні, абаронцы ведамаснай недатыкальнасці замоўклі.

Пасля гэтага я яшчэ раз пераканаўся, што пісьменнік павінен добра ведаць тое, пра што піша. Каб ён памятаў, што творы — гэта таксама яго біяграфія, а біяграфіяй трэба даражыць.

1926—1984

КАМЕНТАРЫІ

У першы том Выбраных твораў Яна Скрыгана ўваходзіць аповесць «Кругі». Гісторыя яе стварэння складаная і доўгая. Напачатку яна звалася «Свая аповесць», упершыню была змешчана ў «Полымі» № 2 за 1963 год. У першым выданні, у кнізе, названай яе найменнем «Свая аповесць» (выд. Беларусь, 1964 год), паявіліся ў ёй раздзелы з назвамі: «Круг першы», «Круг другі», «Круг трэці» і «Круг чацвёрты» з падзагалоўкам «Шуканні». Далейшае канструкцыйнае ўдакладненне аповесць набыла ў выданні 1969 года (выд. Беларусь): яна займела канчатковую назву «Кругі» і новую, адмысловую структуру. Адпаведна гэтаму канчаткова аформіліся і раздзелы, яны замацаваліся назвамі: круг першы — «Парог», круг другі — «Світанак», круг трэці — «Трывогі» і круг чацвёрты — «Сугучча». (У гэтым выданні 1985 года апошні раздзел названы іначай, больш па-філасофску апраўдана — «Спасціжэнне»). Дадаўся і раздзел замест эпілога — «Дакткненне». Па лініі зместу ў аповесць укампанаваны асобныя мастацкія творы, блізкія ёй па духу, часе і эмацыянальным гучанні, пісаныя дзеля яе як бы загадзя. Яны становяцца яе ўнутранаю патрэбаю.

ЗМЕСТ

Роднасць лёсу і песні 5

КРУГІ

Памяць зямлі 11

Круг першы. ПАРОГ

Парог 13
Шорсткая дарога 20
Пры вогнішчы 25
Парог *(працяг)* 36
У хроснага бацькі 47
Два немцы 51
Таіса 53
След гумовых шып 64
Дно душы 68
Настаўнік 71
Парог *(працяг)* 72
У Кірылы на хутары 80

Круг другі. СВІТАНАК

Світанак 100
Госці з Мінска 101
Світанак *(працяг)* 104
Смага 112
Непатрэбны чалавек 122
Гордасць 128
Некалькі хвілін чужога жыцця 133
Дзядзька Ціпка 139
Надпіс на кнізе 145
Ранішнія росы 149
Сяргей Фамін і яшчэ нехта 159
Пабітая шашалем кніга 164
Світанак *(працяг)* 166
Восем смертнікаў 174
Факір Іяма 179

Круг трэці. ТРЫВОГІ

Трывогі 191
Конны двор 198
Мой дэпутат 208
Трывогі *(працяг)* 214
Дом № 9 217
Няспраўджанае калегаванне 223
Каляровы аловак 228
Біяграфія 230
Падпраўленае прозвішча 234
Пасля доўгіх разлук сустракацца не трэба . . 236
Рукі на кляновым лісце 238
Дакументальная рэвізія 246
Як спявалі песню 256
Наталя 265
Над гаем кружылі буслы 291

Круг чацвёрты. СПАСЦІЖЭННЕ

Спасціжэнне 299
Развітанне 303
Спасціжэнне *(працяг)* 316
Нарачанскі чараўнік 319
Кроўнасць 324
Трошкі далёкіх згадак 324
Ліст не будзе адасланы 330
Рэквіем 338
Мой сусед Іван Мележ 342
Пасля развітання 354
Самая доўгая дружба 360
Спасціжэнне *(працяг)* 362
Маці 366
Жыву адна з сынам 368
Слепата 370
Песня Сольвейг 371
Хлопец у вельветавай куртцы 372
Запрашэнне да танцаў 373
Цнота 375
Ноч 377
У старым доме 380
Месячная ноч 385
Няміга 399

Дасказ. ДАТКНЕННЕ

Імгненне 406
Інтэрв'ю 407

Пасляслоўе 410
Тайны 411
Шуканні 414
Сутучча 418
Шуканні *(працяг)* 423

Каментарыі 427

Скрыган Я.

С 45 Выбраныя творы: У 2-х т. Т. 1. Кругі: Аповесць/[Аўт. прадм. А. Жук].— Мн.: Маст. літ., 1985.— 430 с., 8 л. іл., 1 л. партр.

У пер.: 2 р. 10 к.

Ян Скрыган належыць да старэйшага пакалення беларускіх савецкіх пісьменнікаў. Літаратурная дзейнасць яго пачалася ў 1924 годзе.

У першы том уваходзіць аўтабіяграфічная аповесць «Кругі».

С $\frac{4702120200-125}{М302(05)-85}$ 128—85

ББК 84Бел7
Бел 2

ИВАН АЛЕКСЕЕВИЧ
СКРЫГАН

**Избранные произведения
в двух томах**

Том 1

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар А. Дз. Куліш
Мастак Л. Я. Прагін
Мастацкі рэдактар В. П. Жыжэнка
Тэхнічны рэдактар Л. М. Шлапо
Карэктар А. Т. Глушчанка

ІБ № 2206
Здадзена ў набор 25.10.84. Падп. да друку 11.07.85. АТ 12255. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 22,68+0,95 укл. Ум. фарб.-адб. 26,46. Ул.-выд. арк. 24,64. Тыраж 4800 экз. Зак. 834. Цена 2 р. 10 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.













«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

